Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Установа адукацыі “Гомельскі дзяржаўны
ўніверсітэт імя Францыска Скарыны”

Нясвіжскі раённы выканаўчы камітэт

# Нясвіжскага краю напеў векавы

*Народная духоўная культура Нясвіжчыны*

Пад агульнай рэдакцыяй
В. С. Новак (гал. рэд.),
В. К. Шынкарэнка, А. А. Кастрыцы, С. А. Вяргеенка

Нясвіж
Нясвіжская ўзбуйненая друкарня імя С. Буднага
2012

УДК 39(476.1)
ББК 63.529(4Беи-4Мин)
Х

*Рэкамендавана навукова-тэхнічным саветам установы адукацыі
“Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны”
23 лістапада 2012 г., пратакол № 9*

*Пад агульнай рэдакцыяй В. С. Новак (гал. рэд.),
В. К. Шынкарэнка, А. А. Кастрыцы, С. В. Вяргеенка*

*Рэцэнзенты: галоўны навуковы супрацоўнік аддзела фалькларыстыкі і культуры славянскіх народаў ДНУ “Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі” А.С. Ліс;
вядучы навуковы супрацоўнік аддзела народазнаўства ДНУ “Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі” Г.І. Каспяровіч*

Х **Нясвіжскага краю напеў векавы :** фальклор.-этнаграф. зб. / пад агул. рэд. В.С. Новак. – Нясвіж : Нясвіжская ўзбуйненая друкарня імя С. Буднага, 2012. – 272 с.
ISBN

У кнізе прадстаўлены архіўныя і экспедыцыйныя запісы фальклорна-этнаграфічных матэрыялаў Нясвіжчыны, ахарактарызаваны рэгіянальна-лакальныя асаблівасці фальклорна-этнаграфічных і міфалагічных з’яў, прааналізаваны вобразна-выяўленчыя магчымасці народна-песеннай спадчыны.

Зварот да вытокаў народнай мудрасці дазволіць чытачу больш глыбока ўсвядоміць і асэнсаваць самабытныя духоўныя скарбы продкаў, пазнаёміцца з іх уяўленнямі пра навакольны свет.

Гэта выданне будзе карысным і цікавым для работнікаў устаноў культуры, этнографаў, фалькларыстаў, настаўнікаў, студэнтаў і школьнікаў, для ўсіх аматараў традыцыйнай культуры беларусаў.

**УДК 39(476.1)**
**ББК 63.529(4Беи-4Мин)**

**ISBN**

© Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны, 2012
© Афармленне. МАУП «Нясвіжская ўзбуйненая друкарня імя. С. Буднага», 2012

*УА “Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны” выказвае словы шчырай удзячнасці старшыні Нясвіжскага раённага выканаўчага камітэта Івану Іванавічу Крупко, начальніку аддзела культуры Аляксандру Віктаравічу Кругліку, начальніку аддзела ідэалагічнай работы Міхаілу Міхайлавічу Мацэлю, супрацоўнікам аддзела культуры і аддзела ідэалагічнай работы Нясвіжскага раённага выканаўчага камітэта за вялікую дапамогу ў арганізацыі і правядзенні ў ліпені 2012 года фальклорна-этнаграфічнай экспедыцыі на тэрыторыі раёна.*



## АЎТАРСКІ КАЛЕКТЫЎ

*Дземідзенка Алег Міхайлавіч – доктар тэхнічных навук, прафесар, прарэктар па навуковай рабоце Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Францыска Скарыны;*

*Новак Валянціна Станіславаўна – доктар філалагічных навук, прафесар, загадчык кафедры беларускай культуры і фалькларыстыкі Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Францыска Скарыны;*

*Шынкарэнка Вольга Карпаўна – доктар філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускай літаратуры Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Францыска Скарыны;*

*Валодзіна Таццяна Васільеўна – доктар філалагічных навук, загадчык аддзела фалькларыстыкі і культуры славянскіх народаў ДНУ "Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі";*

*Ненадавец Аляксей Міхайлавіч – доктар філалагічных навук, прафесар, загадчык кафедры грамадскіх дысцыплін Бабруйскага філіяла УА "Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт";*

*Кастрыца Алена Аляксандраўна – кандыдат філалагічных навук, дацэнт, дацэнт кафедры беларускай культуры і фалькларыстыкі Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Францыска Скарыны;*

*Вяргеенка Святлана Анатольеўна – кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускай культуры і фалькларыстыкі Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Францыска Скарыны;*

*Алфёрава Алена Генадзьеўна – кандыдат філалагічных навук, загадчык сектара духоўных традыцый у народнай архітэктуры аддзела архітэктуры ДНУ "Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі";*

*Кавалёва Рыма Мадэстаўна – кандыдат філалагічных навук, дацэнт, дацэнт кафедры тэорыі літаратуры УА "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт";*

*Прыемка Вольга Віктараўна – кандыдат філалагічных навук, дацэнт, дацэнт кафедры тэорыі літаратуры УА "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт";*

*Ізотава Вольга Вітальеўна – кандыдат філалагічных навук, старшы выкладчык кафедры тэорыі і практыкі англійскай мовы УА "Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт";*

*Боганева Алена Міхайлаўна – навуковы супрацоўнік сектара этналінгвістыкі і фальклору ДНУ "Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі";*

*Цяпкова Таццяна Канстанцінаўна – малодшы навуковы супрацоўнік аддзела фалькларыстыкі і культуры славянскіх народаў ДНУ "Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі";*

*Дубяк Тамара Мікалаеўна – рэдактар газеты "Гомельскі ўніверсітэт";*

*Мартыненка Алена Мікалаеўна – карэспандэнт газеты "Гомельскі ўніверсітэт";*

*Кананец Вольга Алегаўна – студэнтка УА "Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў".*







# Дарагія сябры!



Вы трымаеце ў руках кнігу, якая апавядае аб духоўнасці жыхароў Нясвіжа і Нясвіжчыны.

Госці і жыхары кажуць, што наш горад нельга не любіць. Калі пабудзеш тут хоць раз, потым сумуеш па яго вуліцах і завулках, парках, чарадзе азёр, архітэктурных помніках... Вандраваць па гэтым музеі пад адкрытым небам можна бясконца. Колькі ні глядзі на велічныя фасады палаца і сціплыя старэнькія домікі – не надакучыць. Такая прыгажосць, такая вытанчанасць...

Менавіта тут, на Нясвіжчыне, можна дакрануцца душой да культуры нашай Бацькаўшчыны, пранікнуцца велічным пачуццём любові да яе.

У студзені 2012 года на адкрыцці свята "Нясвіж – культурная сталіца Беларусі 2012 года", усе прамоўцы аднадушна адзначылі: дэ-юрэ мы сёння надалі ганаровы тытул гораду, але на самой справе Нясвіж быў, ёсць і яшчэ на доўгія гады будзе заставацца культурнай сталіцай нашай краіны, няхай і некаранаванай.

За сваю шматвяковую гісторыю Нясвіж пражыў такое багатае і насычанае падзеямі і імёнамі жыццё, што яму могуць пазайздросціць многія больш буйныя і старажытныя гарады нашай краіны. А сёння, як і ўсе яны, Нясвіж жыве насычаным на добрыя справы жыццём, яго жыхары, ушаноўваючы гісторыю, мясцовыя абрады, звычаі, песні, клапоцяцца пра будучыню.

Гэта кніга пра непаўторныя скарбы неўміручай народнай творчасці, надзвычай паэтычныя, дасціпныя, глыбакадумныя. Аб гэтым і сведчаць запісы фальклорна-этнаграфічных матэрыялаў, якія склалі змест дадзенага выдання. Захаванне духоўнай культуры нашых продкаў – высакародная справа нашчадкаў. У сувязі з гэтым Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка, віншуючы работнікаў культуры з прафесійным святам, адзначыў: "Самабытная нацыянальная культура з'яўляецца адным з краевугольных камянёў у фундаменце беларускай дзяржаўнасці, той неадольнай сілай, якая аб'ядноўвае ўсіх нас і напаўняе сэнсам і любоўю да велічнай і прыгожай Айчыны".

З павагай да чытачоў
старшыня Нясвіжскага
раённага выканаўчага камітэта

І.І. Крупко



*А.М. Дземідзенка,*
*прарэктар па навуковай рабоце*
*ўстановы адукацыі "Гомельскі*
*дзяржаўны ўніверсітэт*
*імя Францыска Скарыны",*
*доктар тэхнічных навук, прафесар*

Гісторыка-культурная спадчына – неад'емная частка агульначалавечай культуры, сродак фарміравання і развіцця грамадства, сховішча гістарычнай памяці. Праблема яе вывучэння ў сучасных умовах набыла асобую актуальнасць, бо, як адзначаў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка, без нацыянальнай культуры не можа быць суверэннай і квітнеючай дзяржавы.

Вялікая праца па адраджэнні традыцыйнай духоўнай культуры беларусаў праводзіцца ва ўстанове адукацыі "Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны". Выкладчыкамі філалагічнага факультэта штогод арганізоўваюцца экспедыцыі ў розныя рэгіёны нашай краіны, каб сабраць і захаваць каштоўныя ўзоры народна-паэтычнай спадчыны. Вынік гэтай працы – выдадзеныя і падрыхтаваныя да друку зборнікі па традыцыйнай духоўнай культуры.

Сёлета шляхі фальклорнай экспедыцыі былі накіраваны на Нясвіжчыну. І гэта невыпадкова. Нясвіж прызнаны культурнай сталіцай Беларусі ў 2012 годзе. Гэта падзея – яскравае сведчанне таго, што тут бруіць, не перасыхае крыніца народных талентаў, якая знітоўвае мінулае і сучаснае, далучае новыя пакаленні да спрадвечных народных скарбаў.

Захаванне матэрыяльных каштоўнасцей Нясвіжа адбываецца на дзяржаўным і сусветным узроўнях. Так, палацава-паркавы ансамбль і іншыя помнікі ўвайшлі ў Нацыянальны гісторыка-культурны музей-запаведнік, а рашэннем Міждзяржаўнага камітэта па захаванні культурнай і прыроднай спадчыны ЮНЭСКА ўнесены ў Спіс сусветнай спадчыны чалавецтва. Унікальным з'яўляецца і паркавы комплекс былой рэзідэнцыі князёў Радзівілаў, падобных якому ў рэспубліцы няма. Такая ўвага дзяржавы і сусветнай супольнасці невыпадковая, бо менавіта ў музейных экспазіцыях можна прасачыць самае каштоўнае, што ёсць у народа – яго гісторыю.

Нясвіжская зямля – старажытны, запаведны і самабытны край, адзін з прыгажэйшых і непаўторнейшых куточкаў нашай Радзімы з багатай гісторыяй. Тут адвеку жылі і жывуць прыгожыя душой і справамі людзі: шчодрыя і сціплыя, працавітыя і добрыя, таленавітыя і мужныя. Яны ганарацца духоўнай спадчынай сваіх продкаў, шануюць, паважаюць, захоўваюць народныя традыцыі.

Падчас сустрэч з мясцовымі інфарматарамі студэнты-філолагі разам з выкладчыкамі зрабілі шмат цікавых запісаў каляндарных і сямейных абрадавых свят, замоў, легенд, паданняў, песень, прыказак, прымавак, прыпевак, прыкмет і павер'яў. Сабраныя матэрыялы сведчаць аб багацці і адметнасці вусна-паэтычнай творчасці Нясвіжчыны. Таму зусім невыпадкова, што побыт, традыцыі гэтай зямлі і па сённяшні дзень прыцягваюць увагу даследчыкаў.

На працягу некалькіх летніх тыдняў удзельнікі фальклорнай экспедыцыі рупліва збіралі дыяменты народнай культуры, што знайшло адлюстраванне на старонках гэтага выдання.





***Валянціна Новак***

# МЯСЦОВАЯ СПЕЦЫФІКА КАЛЯНДАРНА-АБРАДАВАГА ФАЛЬКЛОРУ НЯСВІЖЧЫНЫ

Каляндарна-абрадавы фальклор Нясвіжчыны, які з'яўляецца арганічнай часткай фальклорна-этнаграфічнай спадчынай беларусаў, складаецца з чатырох цыклаў земляробчага календара – гэта зімовы, веснавы, летні, восеньскі. Асаблівым багаццем рытуалаў і разнастайнасцю лакальна-рэгіянальных праяў адрозніваецца зімовы перыяд, якому папярэднічала Піліпаўка.

Шасцітыднёвы Піліпаўскі пост на тэрыторыі Нясвіжскага краю, як і ў іншых рэгіёнах Беларусі, вызначаўся калектыўным прадзівам, калі на вячоркі ў якой-небудзь хаце збіраліся, пралі кудзелю, бо, "Піліп, кажуць, дзяцей адзяе" (в. Аношкі). У духоўным жыцці мясцовых жыхароў падчас Піліпаўкі мелі месца своеасаблівыя забавы моладзі, калі "шылі мяшочкі і сыпалі туды попел. І гэта вот як хлопцы папрыходзяць к нам на вячоркі, дык мы ім і папрышчэплівалі мяшочкі на спіну, да адзёжы ззаду" (в. Карцэвічы). Было прынята рыхтаваць посныя стравы: "там мачанку якую з грыбамі варылі, булачкі пяклі. Усё гэта было на прастым масле" (в. Аношкі).

У структуры святкавання Каляд у вёсках Нясвіжскага раёна вылучаліся тры куцці: першая куцця – посная, другая куцця – "Шчадрэц", трэцяя куцця – галодная (на Крашчэнне). Той факт, што святкавалі тры куцці, пацвердзілі жыхары в. Альхоўка: "Ёсць куцця першая, другая, трэцяя" (запісана ад Вальчык Анастасіі Іванаўны, 1927 г.н.). На кожную куццю варылі кашу, якой імкнуліся не толькі самі гаспадары і дзеці пачаставацца, але і "ўсяму даюць, для таго каб Бог памагаў" (в. Аношкі). У некаторых вёсках кашу варылі з ячменнай крупы ("Ну, вараць звычайна: крупа ячменная" – в. Грыцкавічы, "Куццю варылі з ячменю" – в. Жанкавічы, "А куццю дык яшчэ і цяпер вараць з ячменнай крупы" – в. Лявонавічы), а ў некаторых вёсках рыхтавалі кашу з пярлоўкі, напрыклад, некаторыя жыхары в. Карцэвічы выкарыстоўвалі ячменныя, а яшчэ і пярловыя крупы. Рэшткі куцці было прынята аддаваць свойскай жывёле: "Як недаядалі, то назаўтра аддавалі скаціне" (в. Аношкі). Жыхары з в. Лявонавічы, калі заканчвалася калядная вячэра, раніцай выносілі сена, што ляжала пад абрусам, і аддавалі жывёле, "каб здаровыя былі, каб радзілася, пладзілася".

Заслугоўваюць увагі сведчанні мясцовых жыхароў аб нараджэнні Ісуса Хрыста на сене: "Сена на стол кладуць, пакрываюць скацерцю, бо Ісус Хрыстос у яслях радзіўся і пагэтаму ложаць усё на стол з сенам" (в. Новы Сноў). Адметнай у каляднай традыцыі Нясвіжчыны была такая дэталь, як захоўванне на покуці на працягу ўсяго перыяду калядных святкаванняў невялікага "снапка з жыта", які называлі "калядой". "Некалі сенца накладуць на стол, на покуць звяжуць "каляду" і кашу паставяць" (в. Аношкі). З жыта звязвалі "каляду" і ў в. Жанкавічы. У в. Вайнілавічы вечарам напярэдадні Ражаства прыносілі ў хату сена, "такое сенца клалі ў яшчычак і ставілі туды гэту кашку, свянцонаю вадзічкай папырскаем, памолімся над ёю". Паводле ўспамінаў жыхароў в. Карцэвічы, "абязацельна звязвалі снапок з жыта. Так вот ставілі на покуць на нізу ўжэ той снапок і туды клалі сенца". У в. Грыцкавічы таксама на покуць ставілі невялікі сноп жыта: "Звяжацца такі малы снапочак з жытам і на покуці паставіцца. Ён пастаіць да таго, як свята скончыцца".

У адрозненне ад іншых мясцовасцей Беларусі, менавіта ў вёсках Нясвіжскага раёна рыхтавалі на покуці спецыяльнае месца для гаршка з кашай, якое называлі "звязаць каляду". Даследчыкі традыцыйнай мастацкай культуры Цэнтральнай Беларусі слушна адзначылі, што "агульнасямейная перадкалядная вячэра (Першая куцця) мела шэраг рэгіянальных і лакальных асаблівасцей. Так, для гаршка з куццёй рабілі спецыяльнае месца на стале, куды падсцілалі сена, ставілі рэшата, у якім з сена вілі своеасаблівае гняздо ("каляду"). У паўднёва-заходніх раёнах адным з галоўных атрыбутаў перадкаляднага застолля быў неабмалочаны сноп (такая ж традыцыя характэрна і для Палесся)" [1, с. 31].

Амаль паўсюдна на тэрыторыі Нясвіжскага раёна арганічна спалучанымі былі і язычніцкі абрад калядавання, і хрысціянскі абрад хаджэння з зоркай. Як адзначылі жыхары в. Аношкі, у іх мясцовасці на Шчадрэц і "кру-

цыць звязду”, і ходзяць калядоўшчыкі з казой. Называлі гэты час, “пад стары Новы год – 13 январа – на Кукольнікі” (в. Аношкі), удзельнікаў калядных абыходаў – кукольнікамі. У гэтым выяўляюцца рэгіянальна-лакальныя адметнасці калядна-навагодняга комплексу Нясвіжчыны.

Жыхары Нясвіжчыны адзначалі, што звычайна на Каляды па хатах ходзіць святар, які іх асвячае: “Бацюшка ходзіць на Каляды, хату свеціць. У кожную хату заходзіць” (в. Альхоўка). У народнай свядомасці ўстойліва замацаваліся ўяўленні аб калядна-навагодніх святкаваннях як важным святочным перыядзе, калі забаранялася выконваць тыя ці іншыя гаспадарчыя работы. Наадварот, ухваляліся наведванне царквы, малітоўныя цырымоніі: “Ну, у гэта свята трэба ў цэркаў хадзіць маліцца, нічога не рабіць” (в. Альхоўка).

У час калядных абыходаў, як правіла, удзельнічалі тры групы калядоўшчыкаў: дарослыя, моладзь і дзеці: “Паіграюць – вынясеш ім за гэта хто каўбасу, хто дасць булку хлеба, хто гарэлку вынясе… Вось пабудуць яны, і другія прыходзяць… Патом гэтыя пайшлі, трэція прыходзяць. За ноч тры парціі прыйдзе” (в. Аношкі). Паўсюдна калядоўшчыкаў чакалі як самых жаданых і ганаровых гасцей: “Кагда яны прыходзілі – это было добрай прыкметай” (в. Лань).

Абходнае шэсце калядоўшчыкаў і іншых у многіх вёсках, напрыклад, у вёсках Новы Сноў і Альбянка вядома пад устойлівай назвай “хадзіць па калядзе”, “хадзіць з калядою”. Заўважым, што ў звычаі пераапранання калядоўшчыкаў важнае месца адводзілася наступным маскам: “казы”, “ваўка”, “мядведзя”, “сабакі”, “Бабы Ягі”, “нячыстай сілы” і інш., аднак пераважаюць маскіраваныя абходы з пудзілам “казы” або з пераапранутым чалавекам у выглядзе “казы”.

Многія жыхары Нясвіжчыны засведчылі, што на Куццю заўсёды звярталіся да продкаў. Гэта знайшло яскравае адлюстраванне ў рытуальных дыялогах “заклікання марозу” на калядную вячэру (“Мароз зазывалі, гаварылі: “Прыходзь, мароз, куццю есці!” – в. Жанкавічы), запрашэння “дзядоў” (“Абязацельна зазывалі дзядоў” – в. Жанкавічы). Устанаўленне такога кантакту з духамі памерлых важна было для спрыяння ў гаспадарчых справах для забеспячэння дабрабыту, захавання “повязі” пакаленняў.

Важным кампанентам калядна-навагодняй абраднасці з’яўляўся рытуал заклінання неўрадлівага дрэва: у в. Грыцкавічы на другую куццю (Шчадрэц) гаспадар ноччу падыходзіў да тых пладовых дрэў, што не пладаносілі, і гаварыў: “Устань, ачніся, Хрыстос нарадзіўся!” На следуюшчы год гэтае дрэва пачынае пладаносіць. З магіяй пладавітасці былі звязаны ў в. Лань і наступныя сімвалічныя дзеянні: “Абвязвалі кожную яблыню саломай, а таксама і забор”. Пасля заканчэння калядных святкаванняў салому “знімалі і спальвалі, каб быў харошы ўраджай і каб усё дурное выйшла з хутару” (в. Лань).

Адметнасцю калядна-навагодніх святкаванняў у шматлікіх вёсках з’яўляліся вячоркі (“складкі”, “запрошона”): “А ўжэ як пачыналіся празднікі Калядкі, мы збіраліся ў адной хаце. У нас хата была такая бальшая….” (в. Лань). Важнае месца адводзілася на вячорках гульням шлюбнай скіраванасці. Напрыклад, у в. Слаўкава гулялі ў гульню “Вішаньку зрываць”, сутнасць якой заключалася ў тым, што малады чалавек імкнуўся выбраць сабе да пары дзяўчыну: хлопец намагаўся пацалаваць яе, а “дзяўчына стаіць на табурэтцы, а ён во на плечукі апіраецца, каб абаперціся, падскочыць, каб яе пацалаваць”. Іншы раз даволі своеасабліва вырашалася пытанне аб шлюбе непасрэдна падчас калядных абходаў (другая куцця): рассцілалі дарожку ад хаты хлопца да хаты дзяўчыны, “стараліся ў дом зайсці, штоб увараваць што-небудзь (ці качаргу, ілі падушку) і занесці дамой. Назаўтра ўстрачаліся радзіцелі, знакоміліся” (в. Лань).

Са шчырай усмешкай і цеплынёй успаміналі мясцовыя жыхары, як яны варажылі пра сваё будучае ў гэты час. Запісаныя матэрыялы па варажбе, звязанай з другой куццёй, засведчылі самыя разнастайныя магічныя спосабы вызначыць свой лёс, якія, хоць і набылі сёння забаўляльны характар, але не зніклі яшчэ з сучаснага побыту. Звычайна варажылі з выкарыстаннем наступнай прадметнай атрыбутыкі: зерне, люстэрка, аладкі, воск, абутак і інш.

Трэцюю куццю адзначалі на Вадохрышча (Крашчэнне) (19 студзеня па новым стылі). У





в. Вайнілавічы яна вядома пад назвай “Тры каралі”. Магічнае значэнне надавалі асвечанай вадзе, якую захоўвалі на працягу ўсяго года, апырсквалі ёю хату, гаспадарчыя пабудовы, карысталіся пры розных захворваннях (в. Лявонавічы), “штоб добра было, хто п’е, каб здароўе было” (в. Аношкі). У агульнай структуры калядна-навагодняга комплексу сустрэлася такая адметная з’ява, як адносіць “каляду” на дуб, там гэта пудзіла прывязвалі” (в. Альхоўка). На вялікі жаль, падрабязных тлумачэнняў гэтай цікавай з’явы не пашчасціла запісаць, аднак можна выказаць меркаванне, што гэта сімвалічнае развітанне з зімой, з Калядамі. Адзначым, што аналагічны абрад “Каляду на дуба цягнуць” бытуе і сёння ў в. Навіны Бярэзінскага раёна.

Сціплыя звесткі былі запісаны пра Масленіцу, якую называлі “блінная”, “Улассе”. Асноўныя структурныя кампаненты масленічнай абраднасці – гэта выпяканне бліноў, развядзенне вогнішча і спальванне чучала, што сімвалізавала засцярогу ад звышнатуральнага ўздзеяння нячыстай сілы (“прагнаць злога духа” – в. Лань), катанне на конях, варажба “на першым бліне”, а таксама бытаваў звычай прасіць прабачэння ў радні. Адметнай масленічнай з’явай у вёсках Нясвіжскага раёна з’яўлялася катанне на конях, якое звязвалі з магіяй ураджайнасці ільну: “Каталіся на доўгі лён” (в. Лань). Жыхары з в. Альхоўка таксама пацвердзілі, што ў іх вёсцы “ездзілі на кані, каб лён доўгі рос”. У в. Качановічы, паводле ўспамінаў жыхароў, на атрыманне добрага ўраджаю ільну ўплываў звычай хаджэння ў госці: “Счыталось: к каму в госці заходзіш, у таго лучшэ будзе лён”. У в. Лань “катанне на конях” мела шлюбную сімволіку: “Дзе дзяўчына была, заязжалі ў двор, жэлалі, каб замуж вышла, каб дома ўсё было”.

Адзначым, што агульнаславянскі звычай масленічнай калодкі на тэрыторыі Нясвіжскага раёна сустрэўся толькі ў адзінкавых запісах і з іншай семантыкай абрадавых дзеянняў. “Палена на вяроўцы”, якое выступала ў якасці масленічнай калодкі, з’яўлялася своеасаблівым выкупам для незамужняй дзяўчыны: “Калі ў хаце была дзяўчына незамужняя, калодку давалі як выкуп” (г. Нясвіж).

У адрозненне ад іншых рэгіёнаў Беларусі, дзе абрад гукання вясны з’яўляўся спецыфічна адметнай з’явай, як напрыклад, на Гомельшчыне, на тэрыторыі Нясвіжчыны не захавалася яркіх успамінаў пра тое, як тут гукалі вясну. Але ў вёсках Аношкі, Карцэвічы, Лявонавічы прыгадвалі вядомыя ў этнічнай традыцыі абрадавыя моманты: печыва ў выглядзе птушак, якім частавалі дзяцей (в. Аношкі), выбіранне высокага месца для заклікання хутчэйшага прыходу вясны (в. Карцэвічы), запальванне вогнішча (Альхоўка), выбар дзяўчыны на ролю вясны. З пярэднем свята “Благавешчанне” жыхары Нясвіжчыны звязваюць шматлікія забароны на тыя ці іншыя гаспадарчыя работы на зямлі, не дазвалялася ў гэты час працаваць на агародах: “Не трогалі зямлю ў нас да Благавешчання” (в. Вайнілавічы).

Велікодны абрадавы комплекс Нясвіжчыны вылучаецца ўстойлівасцю захавання асноўных структурных кампанентаў: падрыхтоўка абрадавага хлеба (гэта “булкі”, “пірагі”), фарбаванне яек у чырвоны колер (“Яйца красілі цыбулькаю, а калі траур, то не красілі”– в. Смалічы), звычай “гуляць у біткі” (“У біткі гулялі”– в. Аношкі), асвячэнне ў царкве “паскі” і іншых відаў страў (“Вазілі раней у цэркву ў каробцы, плеценай лазою і саломкі. Цэлу каробку накладуць: і хлеба, і мяса, і кілбасы” – в. Слаўкава), наведванне начной царкоўнай службы, абходныя шэсці “кукольнікаў” (валачобнікаў), прыкметы і павер’і, звязаныя з Вялікаднём (“Калі разламаецца булка, калі дастанеш з печы, то кажуць, што нехта памрэ”; “Свянцонае яйка разразаем на кусочкі і ўсе елі, а шкарлупкі курам аддавалі, каб куркі няслісь лучш» – в. Аношкі), выкананне велікодных песень. Магічнае значэнне надавалі асвечанаму велікоднаму яйку, якое прынята было падчас святочнага застолля з’есці першым (“Першым на Вялікдзень нада з’есць яечка свянцонае” – в. Аношкі).

Мясцовыя жыхары выкарыстоўвалі велікоднае яйка ў рытуалах варажбы пра свой будучы лёс, а з гэтай мэтай і перакідвалі яго праз хату: “Ужэ як не разаб’ецца яйцо, то ўжэ будзеш доўга жыць” (в. Аношкі). Шкарлупіны пасвечаных яек, лічылася, могуць уплываць на пладавітасць свойскай птушкі, невыпадкова іх аддавалі курам, каб яны “няслісь лучшэ” (в. Аношкі). Шкарлупінам ад велікоднага яйка

надавалі таксама ахоўнае магічнае значэнне – іх клалі ў зерне, прызначанае для сяўбы: “Шкарлупку ад яйка асвенчанага кідалі ў зярно, штобы зярно не палягло” (в. Карцэвічы). Паводле сведчанняў мясцовых жыхароў, ролю кукольнікаў выконвалі не толькі дарослыя, але і дзеці, вылучаліся тры полаўзроставыя гурты: старыя людзі, маладыя хлопцы і дзяўчаты (у некаторых вёсках – толькі хлопцы), дзеці (“Раньшэ хадзілі дзеці па яйцо і булку” – в. Вайнілавічы). Кукольнікі выконвалі пад вокнамі хат песні, як “святыя”, так і адрасаваныя, напрыклад, паненцы (в. Смалічы), гаспадару і гаспадыні (в. Лань). Шанаванне продкаў – важны момант у побыце і традыцыйнай культуры жыхароў. Менавіта на Вялікдзень было прынята наведваць магілкі памерлых родзічаў: “На могілкі хадзілі. Ну, перад Вялікаднём прыбіраць хадзілі. А на Вялікдзень ужо хадзілі, яйца красныя лажылі” (в. Аношкі). Што датычыць велікодных песень, то варта пагадзіцца з меркаваннем даследчыцы Л.М. Салавей, якая слушна адзначыла, што “на Вялікдзень і Каляды спявалі ў асноўным песні рэлігійнага зместу, што з’яўляецца прыкметай замяшчэння старажытнага рэпертуару” [2, с. 565].

Юраўскае свята, якое мела жывёлагадоўчую і земляробчую скіраванасць, было вядома паўсюдна на тэрыторыі Нясвіжчыны і вылучалася адметнымі лакальнымі асаблівасцямі. Сярод важных юраўскіх абрадаў Нясвіжчыны вылучаліся такія абрады, як абрад першага выгану жывёлы ў поле і абрад абыходу нівы. Адзначым, што найперш абрад першага выгану жывёлы ў поле суправаджаўся сімвалічнымі дзеяннямі, звязанымі з вярбой: “Б’юць па карове ўжэ тою вярбою і кажуць: “Не я б’ю, верба б’е, за тыдзень Вялікдзень” (в. Аношкі). Звычай першага выгану жывёлы ў поле ператвараўся ва ўрачыстую цырымонію, важнае месца ў якой адводзілася царкоўнай службе: “У цэркаў хадзілі. Абедня правілася. Пабылі ў цэркве, прыдзем дадому. Кароў выганялі раніцай” (в. Лявонавічы). Сярод ахоўна-магічных рытуалаў, скіраваных на захаванне свойскай жывёлы і павышэнне яе пладавітасці, вылучаюцца наступныя: абход з вярбою двара, абкладванне варот крапівой, каб “нічога дрэннага не было” (в. Лань), пасцёбванне кароў галінкамі вярбы, “штоб не хварэла, штоб здаровая была” (в. Сычэва), падвешванне на рогі каровы “сумкі свянцонай” (в. Грыцкавічы), каб не “баялася”, мыццё юраўскай расой кароў, каб “у іх было шмат малака” (в. Лань), закопванне замка, каб “воўк не накінуўся на жывёлу” (в. Казлы), качанне па юраўскай расе, каб “ізбавіцца ад розных хвароб” – в. Лявонавічы), магічныя дзеянні з яйкамі, у прыватнасці, іх закопванне пад падлогай (“гаспадар браў яйкі, абыходзіў скот і клаў іх пад падлогу”– в. Лань), “Лажылі яйка, каб карова пераступіла. І ім абкатвалі карову” – в. Казлы).

Звычайна пасля таго як калектыўна выгналі жывёлу ў поле, наладжвалі застолле: “Сабіраліся ўсім сялом, выганялі кароў, потым сабіраўся стол” (в. Вайнілавічы). Фарбаванне яек на Юр’е ў чырвоны колер, як і на Вялікдзень, – адметная дэталь у мясцовай абраднасці: “На Юр’я яйца фарбуюць, але ж нікому не даюць, самі ядуць” (в. Альхоўка). Абрадавыя дзеянні, звязаныя з абыходам поля на Юр’е, былі скіраваны на забеспячэнне добрай ураджайнасці палеткаў, таму “на Юр’я гэта рана ўставалі, абходзілі свае паля, каб быў ураджай” (в. Лань). Што датычыць юраўскага абрадавага комплексу, які меў аграрна-магічную скіраванасць, то варта падкрэсліць, што самы важны рытуал быў звязаны з абходам поля (“мужчыны некалі палі абыходзілі” – в. Малева). Жыхары Нясвіжчыны верылі ў магічную сілу касцей, якія засталіся ад велікодных мясных страў: “Старэйшыя людзі косткі ўтыкалі ў зямлю навокала” (в. Грыцкавічы). У гэтай жа мясцовасці абыходзілі вакол поля і закопвалі ў зямлю яечныя шкарлупіны, каб “быў добры ўраджай”. Жыхары в. Казлы засведчылі, што ў іх вёсцы адбываўся абрадавы звычай, звязаны з велічаннем Юр’я як апекуна жывёлагадоўлі і земляробства: “Бралі каня, украшалі яго, засцілалі белай просцілкай. Садзілі Юр’я. Надзявалі ціпа маску. А Юр’я быў такі весь у доспехах”.

Упрыгожванне зелянінай хаты і падвор’я – цэнтральны момант у святкаванні Тройцы (Сёмухі). Яскрава выражаны ў траецкай абраднасці культ расліннасці выяўляецца ў яе шырокім выкарыстанні ў абрадавай практыцы мясцовых жыхароў, наданні магічных уласцівасцей дрэвам, раслінам, кветкам, ва





ўшанаванні ўсёй зеляніны, з якой былі звязаны дастатак і сямейнае шчасце. Паводле народных сведчанняў, упрыгожвалі падвор’і бярозкамі, клёнам, ліпай, галінкамі іншых дрэў. Магічнае прызначэнне зеляніны ў розных лакальных традыцыях мела выразны дыферэнцыраваны характар: напрыклад, у в. Смалічы галінкі ліпы ўтыкалі, каб засцерагчы сваё жыллё, каб “бура хаты не тронула” (в. Смалічы). З мэтай засцярогі гаспадаркі ад звышнатуральнага ўздзеяння выкарыстоўвалі зеляніну ў в. Аношкі: “Гэта зеленцо палезно, каб хазяйство сахраняць”. Жыхары в. Лань, расказваючы пра Тройцу, падкрэслівалі, што ў іх мясцовасці галінкі бярозы “ў сарай ставілі, каб усё добра было”.

Прыкметнай з’явай у традыцыйнай культуры жыхароў з’яўляецца Купалле. Асноўныя структурныя моманты купальскай абраднасці наступныя: запальванне вогнішча, спальванне кола, скокі праз касцёр, абліванне вадой, пошукі папараці-кветкі, пляценне вянкоў, варажба дзяўчат пра лёс на вянках, збор лекавых траў і іх асвячэнне, засцярогі ад ведзьмы (раскладванне крапівы на варотах), спальванне пудзіла ведзьмы, бясчынствы з боку моладзі (“А хлопцы залезуць на гору і паложаць на комін сцякло. Пачнуць печ тапіць, і ўвесь дым ідзе ў хату”– в. Лань; “А былі яшчэ такія людзі, якія хадзілі па сялу і рабілі ўрэд: то калітку знімуць каму-небудзь і знясуць у другое месца, то забор паваляць” – в. Слаўкава), ваджэнне карагодаў вакол купальскага вогнішча і выкананне купальскіх песень, якія адрозніваліся адметнымі напевамі, “нагадвалі тужлівае галашэнне” [2, с. 564].

Сціплыя звесткі захаваліся ў памяці мясцовых жыхароў пра жніўныя абрады і песні. Зыходзячы з успамінаў саміх носьбітаў, спачатку ў некаторых вёсках адзначалі зажынкі (“На зажынкі абычна каждая жанчына выжне снапок, паставіць яго ў хаце на покуці” – в. Сычэва), дажынкі (“А на дажынках жнуць, тады кучачку пакінуць на полі, хлеб, соль, памоляцца і ўсё” – в. Лань). Клопаты вяскоўцаў падчас выканання рытуалаў на зажынках і дажынках былі звязаны найперш з будучым ураджаем зерневых культур, таму і асвячалі каласы, захоўвалі іх на працягу года, а зерне з іх клалі потым у насеннае зерне, каб “расло вялікае” (в. Альбянка).

Народны каляндар Нясвіжчыны, як бачым, захоўваючы агульнаэтнічную аснову, вылучаецца адметнымі рысамі і дэманструе, нягледзячы на ўрбанізаванасць дадзенай тэрыторыі, непаўторную самабытнасць мясцовай традыцыйнай культуры, архаічны характар асобных абрадавых з’яў, цесную повязь язычніцкіх і хрысціянскіх элементаў.

## Спіс літаратуры


1. Традыцыйная мастацкая культура Беларусаў. У 6 т. Т. 5. Цэнтральная Беларусь. У 2 кн. Кн.1 / В.І. Басько [і інш.]; ідэя і агул. Рэдагаванне Т.Б. Варфаламеевай. – Мн.: Выш. Шк., 2010. – 847 с.].

2. Салавей, Л.М. Ля вытокаў Ззяючай, Светлай (вусна-паэтычная творчасць Нясвіжчыны) / Л.М. Салавей // Памяць: Гіст.-дакум. Хроніка Нясвіжскага раёна / Рэд. кал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд. ) і інш.; Маст. Э.Э. Жакевіч. – Мн.: БелЭн, 2001. – 632 с.




# КАЛЯНДАРНА – АБРАДАВЫ ФАЛЬКЛОР

## ЗІМОВЫ ЦЫКЛ

### Піліпаўка

На Піліпаўку пралі, церлі, трапалі, часалі, прыбіралі ўсё. Піліп, кажуць, дзяцей адзяе.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Сінькевіч Вольгі Віктараўны, 1927 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Каменка Нясвіжскага р-на).*

У Піліпаўку ў нас ніхто не жэніцца. Усе ж законаў дзяржацца.

*Запісана ў в. Вайнілавічы*
*ад Камлач Яніны Валянцінаўны, 1936 г.н.*

Ну, гэта ж ужо пост Піліпаўкай называецца. Кажуць, скаромнага не нада есці. На малако эканомія. Семя таўклі ў ступе.

*Запісана ў в. Грыцкавічы*
*ад Заяц (Пятроўскай) Марыі Антонаўны, 1937 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Мацылеўшчына Нясвіжскага р-на).*

Хадзілі з мамаю на вячоркі. Бралі ўсё з сабой, вышывалі там, пралі, вязалі. У адной пабудзем хаце, потым у другую ідзем.

*Запісана ў в. Карцэвічы*
*ад Асіповіч Вольгі Дзмітрыеўны, 1954 г.н.*

Начнецца Піліпаўка, так ужо тады пост пачынаецца. Так мы ж хадзілі і пралі з кудзеляю, а ўжэ як начынаецца пост Піліпавы, мы шылі мяшочкі і сыпалі туды попел. І гэта вот як хлопцы папрыходзяць к нам на вячоркі, дык мы ім папрышчэпліваем мяшочкі на спіну, да адзёжы ззаду.

*Запісана ў в. Карцэвічы*
*ад Крыўко Наталлі Мікалаеўны, 1934 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Малева Нясвіжскага р-на).*

Гэта некалі называлі: “Піліп дзяцей адзяе”. Некалі на Піліпаўку ткалі, пралі. Ноч вялікая была. Не было ж тады магчымасці, як цяпер, у магазіне купіць. Гэта яшчэ быў пост.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Лях Марыі Сільвестраўны, 1943 г.н.*

Ну, Піліпаўка – это гэтакае самае цяжкае время, таму што тады дзень малы саўсім. Пасмурно. Ну, Піліпаўка – это пост перад Калядамі. Это пост, надо всё посныя стравы такія прыбіраць: там мачанку якую з грыбамі варылі, булачкі пяклі. Усё гэта было на посным масле. Гуляў этакіх у пост няма. Вечарам заняты сваімі дзяламі.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Маркевіч Аляксандры Уладзіміраўны,1938 г.н.*

Ну, на Піліпаўку некалі не танцавалі, не спявалі. Гэта быў як пост. Вось. Ні банкетаў не рабілі ніякіх. Хадзілі на вячоркі, пралі кудзелю, маладзёж сабіралася, а каб музыка была, то не, не было.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Гадун Ядвігі Уладзіміраўны, 1929 г.н.*

Піліпаўка – гэта вялікі пост, трэба пасціць. На Піліпаўку прадуць, потым ужо кросны робяць, на лета гэтыя палотны на рэчку нясуць – выбельваюць.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Жук Леаніды Іванаўны, 1938 г.н.*

Наступает пост перед Раждзеством Хрыстовым. Кажуць: “І воўк у Піліпаўку нема вые”. Патаму, што самыя марозы былі. Знаю некалькі блюд, якія ў Піліпаўку елі: семя льняное на скаварадзе, а туда лук крышылі і вады дабаўлялі, і макалі картошачку. Укусна была. Эта блюда “клында” называецца.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Халецкай Яўгеніі Іванаўны, 1932 г.н.*

Піліпаўка – гэта пост Піліпавы такі. Некалі пралі, ткалі ў саракавыя-пяцьдзесятыя годы, на вячоркі хадзілі.

*Запісана ў в. Малева*
*ад Ігнатчык Валянціны Усеваладаўны, 1941 г.н.*

Піліпаўка – гэта заўсёды было 6 нядзель перад Калядамі. На Піліпаўку раней былі марозы. Піліпаўка – гэта пост перад Калядамі. Пасцілі 2 дні ў нядзелю, пасцілі абычна ў сераду і пятніцу. У пятніцу таму, што ў гэты дзень Хрыста замучылі.

*Запісана ў в. Слаўкава*
*ад Харытонавай Чаславы Барыславаўны., 1946 г.н.*

### Каляды

Трынаццатага января, перад гэтым святам хадзілі варажыць. Клалі пад падушку тапор, бабка – бутылку, грошы. Каму што пападзець, такі і мужык будзе. Тапор – ляснік, бутылка – п’яніца.

Прыносілі ў дванаццаць часоў вядро з вадою, закрывалі яго пад замок, нанач астаўлялі. Хто прыйдзе адкрые, той і будзе жыць з дзяўчынай.

*Запісана ў в. Нялепава*
*ад Сафівулінай Еўфрасінні Васільеўны, 1941 г.н*

На Шчадрэц некалі пяклі пад вечар бліны. Помню, мама пячэ бліны, я першага адкушу і на сметнік іду. Варажылі: у якім баку сабака забрэша, туды і пойдзеш замуж.

*Запісана ў в. Вайнілавічы*
*ад Волкавай Марыі Уладзіміраўны, 1931 г.н.*

На Каляды ходзяць дзеці, папярадзяюцца, ходзяць са звяздою, паюць. Гадалі на Каляды: пад падушку лажылі рашчоску і фанцікі ўсякія на хлопцаў лажылі. Ставілі місачку з вадою і дашчэчачку рабілі, ціпа мосцік. Ну, і снілася, што хлопцы цераз мосцік пераводзяць. Варылі адну куццю. Ставілі на покуць у красны вугалочак, дзе іконка. У каго карова была, то сенка лажылі, каб карова здаровенькая была.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Качуры Таццяны Паўлаўны, 1948 г.н.*

Варылі куццю. У чыгунчык сыпеш крупу і ставіш у печку. Крупу пярловую вараць, а як на стол ставяць, мак сыплюць – на стол ставяць. Пад чыгунок на стол клалі сена і ставілі гэту кашу на покуць, пад іконаю. На стале павінна быць 12 страў. Калі куццю недаядалі, то яе курам аддавалі.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Раманоўскай (Богдан) Ніны Сцяпанаўны, 1946 г.н.*

Есць куцця першая, другая, трэцяя. Бацюшка ходзіць на Каляды, хату свеціць. У кожную хату заходзіць.

*Запісана ў в. Альхоўка*
*ад Вальчык Анастасіі Іванаўны, 1927 г.н.*

Куццю варылі і посную, і прэсную. Была першая куцця посная, нічога ў ей не было. Яе ставілі на покуць, на сена ў гаршочык. Другая куцця называлася ў нас “шчадрэц”. На “шчадрэц” хадзілі са звяздою, спявалі, танцавалі. Трэццяя куцця была “галодная”.

*Запісана ў в. Альхоўка*
*ад Драчан (Асіповіч) Надзеі Сцяпанаўны, 1932 г.н.*

Коляды ёсць у нас. Мы іх атмячаем, нічога не робім тагда, у цэркаў хадзілі.

Ну, у гэта свята трэба ў цэркаў хадзіць маліцца, нічога не рабіць. На эта свята вось гэты крэст (паказвае на яго) ставілі. Ва ўрэмя вайны нам казалі, што трэба паставіць крэст і выткаць на яго ручнік. Сабраліся ўсе і зрабілі крэст, і вы знаеце, хутка скончылася вайна, да гэта было, і скончылася благапалучна.

*Запісана ў в. Альхоўка*
*ад Кузьмовай Тамары Герасімаўны, 1928 г.н.*

Кашу варым і ставім на покуць. Усяму даюць, для таго каб Бог памагаў. Калі Шчадрэц быў, куццю варылі ўжо з жырам. Хадзілі “шчодрыкі”. На Каляды гадалі. Гадалі як хто здумае, і бацінак перакідалі праз плот.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Акулік Марыі Уладзіміраўны, 1944 г.н.*

Куццю варылі. Некалі сенца накладуць на стол, на покуць звяжуць “каляду” і кашу паставяць. Яе з ячняй варылі крупы. Шчодрыкі спявалі, звязду насілі.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Антановіч Веры Валяр’янаўны, 1933 г.н.*

Ну, калісьці на Каляды куццю варылі і цяпер некаторыя вараць, кісель робяць. Шчадраваць хадзілі, казу вадзілі, зорку насілі, пераадзяваліся. Давалі ім што ёсць. Яны ведаюць, куды ідуць, калі к багатым, то яны ідуць, а к бедным – не. Што ёсць, тое і даюць: каўбаса дык каўбасу. На Каляды спявалі песні.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Бабко Ірыны Васільеўны, 1946 г.н.*

Першая куцця посная, а другая ўжэ не посная. Другая ўжэ вясёлая куцця, ужэ “шчадрэц”. Гадаюць маладыя. Гаданняў было многа: забор абдымалі, калі цот, то замуж выйдзе дзяўчына. Драва бралі: еслі да пары, то выйдзе замуж. У маім дзяцінстве зорку насілі, а цяпер не. Дзеці спявалі, хадзілі па вёсцы з хаты ў хату.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Гадун Алены Вікенцьеўны, 1924 г.н*

Каляды ў нас былі. Маладзёжы тады арава. Танцы.

Куццю варылі. На покуць ставілі, там ікона стаяла, туды і куццю. Вся сям’я ела. Шчадрэц быў, але мала. Была так заведзена, але мы не

хадзілі. Маладзёж збярэцца і хадзілі. Выпіўку давалі. Прыдуць вот, круцяць звязду, іграюць на гармошцы. Кукольнікі мы іх называем. Песню пяюць "Добры вечар, шчодры вечар…". Свет у хаце выключаюць, каб было цёмна, а там звязда, аганькі свецяцца, і круцяць звязду, з Новым годам паздраўляюць. Адзенецца хто-небудзь казой, другі – сабакам. Паіграюць – вынясеш ім за гэта: хто каўбасу, хто дасць булку хлеба, хто гарэлку вынясе, такой быў у іх абычай. Вось пабудуць яны, і другія прыходзяць: перадзеліся, таксама патанцавалі танцы, і ім далі выпіць за гэта. Патом гэтыя пайшлі, трэція прыходзяць. За ноч тры парціі пройдзе. Гэта пад стары Новы год – 13 января на "Кукольнікі". Там ужо якія дзеці прыйдуць, ім якіх канфет даеш за гэта. Прыйдуць пад акно: "Можна к вам? Можна паздраўляць?" Ну, такой абычай быў, заведзяно так было.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Захарчука Уладзіміра Міхайлавіча, 1931 г.н.*

Хадзілі калядоўшчыкі. Дзеўкі гадаюць: палілі бумажкі пры сцяне, прылажыла рукой і адрываеш руку, што пакажацца, тое і будзе.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Майсеня Тацџяны Антонаўны, 1936 г.н.*

Абязацельна куццю варылі. З ячменю звычайна варылі куццю. Куццю варылі перад Калядамі, на Шчадрэц. Шчодры хадзілі, з гармонікам хадзілі, а мы ім давалі яблыкі, калбасы. Каледаваць хадзілі і дарослыя, і дзеці. Некалі гадалі.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Пракарына Івана Уладзіміравіча, 1938 г.н.*

Варылі куццю, а перад Калядамі пост быў. Сем блюд трэба шоб было на стале. Кампот варылі, пяклі аладачкі, рабілі квас. Пасцілі потым. Калядку бацька рабіў із жыта. Гэта нясём ужэ: хто калядку, хто жытца. І садзімося ўжо, куццю ямо. Як недаядалі, то назаўтра аддавалі скаціне. Калядаваць хадзілі. Было тры куцці. Перша – посная, друга – не посная, трэця – посная. У цэркаўку ездзілі. Як з цэркві прыходзім, то ўжэ садзімося.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Сінькевіч Вольгі Віктараўны, 1927 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Каменка Нясвіжскага р-на).*

Трэба было ж у куццю браць ячмень, які сушылі. Потым яго ўжо ў ступы гэтакія клалі, ды ўжэ і намочаць, і таўкачамі таўклі, і сена на стол клалі. Варылі кашу і клалі на покуці сена, хлеба і кашу тую ўжэ, а назаўтра ўжэ, калі бацькі прыдуць, то есці тую кашу ўжэ даюць. Як недаядалі вечарам, то назаўтра з жырам на скаварадзе паджараць. Тры куцці было: перад Калядамі, Новым годам, а тады Тры Карале. Цяпер жэ гэта Крашчэнне.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Шарапа Анастасіі Сцяпанаўны, 1933 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Каменка Нясвіжскага р-на).*

Некалі от, я одзін раз запомніла, каледовалі ў нас, а мы жылі ў старой хаці, окна ж не вельмі завешваліся, не было чым. Шчэ ж я мала была і от прыходзяць са звездой. Рабілі з сіта ці з обода, і там ставіўся некі фанарык, ззаду заклейвалася і пяціраговая звязда была. Некалі ж не хадзілі ў хату, а стаялі пад окном. Куццю на Каляды рабілі абязацельно. Куццю тую варылі. Прыносілі сена, клалі на стол і выцягалі гэта сена. На яго абязацельно ставілі рэшата ці сіта і гаршчок той, што на покуці. Это на першу куццю, якую рабілі з ячменнай крупы, мялі мак, мёдам салодзілі. Другая куцця называлася "шчадрэц", шчодрая куцця, бо на першу куццю елі поснае ўсё, а ўжэ на другую куццю ўсё елі, і мясное, і ўсякае. А ўжэ трэцця куцця посная была. А яшчэ бувае хто скажэ: "Мароз, Мароз, хадзі куццю есці". Малы які, бывае, скажэ для смеху: "Мароз, Мароз, хадзі куццю есці". Некалі ж вокны былі замерзлые, замерзлые, у хаце холадно, не так цепло.

*Запісана ў в. Вайнілавічы*
*ад Волкавай Марыі Уладзіміраўны, 1931 г.н.*

Самае першае адзначалі Раждзество Хрістова 6-7 января. Гэта самы бальшы празнік. Потым эта Новы год 14 января, 19 января – гэта ўжэ Крэшчэніе: асвянчаюць ваду, ходзяць на возера, раньшэ хадзілі і зараз набіраюць у бітоны. Набіраем яе, абліваемся ёй, п'ём наташчак. Запомніце, што нікагда не замярзае на марозе, муцені не дае. Толькі з обшчай пасуды не піць. Куццю, канешне, варылі: к Раждзеству, Новаму году і Крышчэнню. Такое сенца клалі ў яшчычак і ставілі туды гэту кашку, свянцонаю вадзічкай папырскаем, памолімся над её. І жывотным давалі кашы, гэта ж усё асвенчанае. Свінні, куры лучшэ расці будуць.





Втарую куццю елі з усім, і з калбасой, і з салам. Шчодрыкі хадзілі, маладзёж абычна.

*Запісана ў в. Вайнілавічы*
*ад Камлач Вольгі Іванаўны, 1934 г.н.*

Куцця была перад Калядамі. Было тры разных куцці. Першая ж – гэта посная з 6 на 7 января. Назаўтра посную куццю не елі, на скавараду лажылі, туды жыру, не выкідала ж вон. Курам трэба даць, каб добра нясліся. Раньшэ маладыя насілі звязду, спявалі песні. Заходзілі ў хату, спявалі песні, а я ім грошы давала.

Другая куцця ўжо была з жырам, костачку туды кідаюць. Шчодрыкі хадзілі, вадзілі казу. Трэба было даць грошы казе.

*Запісана ў в. Вайнілавічы*
*ад Камлач Яніны Валянцінаўны, 1936 г.н.*

Абязацельно варылі куццю. Прыносілі сена, і куццю вараць. Есць куцця посная, а на другую куццю варылі цэлую калбасу, каб авечкі акаціліся па многа ягнят. А перад куццёй, на Шчадрэца, гэта калі девачкі гадалі, хадзілі па вуліцы, паймаюць за руку і спрашваюць: "Ты што сёння кушаў?", а ён кажа: "Кашу з салодкай вадою".

*Запісана ў в. Вайнілавічы*
*ад Кіпець Тамары Рыгораўны, 1926 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Асмолава Нясвіжскі р-н).*

На Коляды варылі куццю, другая куцця была на Новы год. У гаршчках варылі. Пасядам, ямо. Усіх было тры куцці. Першая – на Коляды, другая – на Новы год, тады на Крашчэнне, тады ўжо ўсе праводзім Коляды. Старыя збіраліся ў хаце. На першую куццю варылі верашчаку, а на другую – з кілбасой. Дзяўчаты гадалі, кавалераў шукалі. Па хатам хадзілі калядоўшчыкі з казою і зоркаю.

*Запісана ў в. Вайнілавічы*
*ад Кіпець Уладзіміра Рыгоравіча, 1926 г.н.*

Ну, а як жа вараць куццю! Ну, вараць звычайна: крупа ячменная, звараць ваду, кідаюць крупу, атрымліваецца кашка, сыплем сольку, а патом у посны вечар ядуць. Ставіцца куцця на покуць. Можна пакласці сена пад яго крышку. Звяжацца такі малы снапочак з жытам і на покуці паставіцца. Яно пастаіць да таго, як свята скончыцца.

*Запісана ў в. Грыцкевічы*
*ад Рыштоўскай (Дамашык) Алены Юльянаўны, 1925 г.н.*

Да Колядаў прыбіраюцца. Раней лепей як-та было. Варылі куццю, а зацем ставілі на сена.

*Запісана ў в. Грыцкевічы*
*ад Заяц (Пятроўскай) Марыі Антонаўны, 1937 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Мацылеўшчына Нясвіжскага р-на).*

Варылі куццю. Кіпяцілі воду, а тады засыпалі крупы, тады памешвалі, тады яна стане густая. Было тры куцці. Празнавалі, харашо празнавалі. На куццю абязацельна зазывалі дзядоў. Куццю ставілі на покуць. З жыта звязвалі каляду. Сенца паложыш. Куццю каля сенца ставілі. Мароз зазывалі, казалі: "Прыходзь, мароз, куццю есці!" Калі сенца ў хату ўносілі, гаварылі: "Здраствуйце ў хату". Кукольнікі са звяздою ходзяць, прыбяруць яе.

*Запісана ў в. Жанкавічы*
*ад Карачун Ганны Трафімаўны, 1930 г.н.,*
*(раней пражывала ў в. Каменка Нясвіжскага р-на Мінскай вобласці).*

Посцілі перад Калядамі. Хадзілі дзеці. Куццю варылі. Вот сёння зварым куццю, а заўтра Коляды, ужо вечарам елі тую куццю. Ставілі на покуці. Звяжам з жыта пучок такі, тады бяром немножко сенца, і ўжо вечарам куццю на покуці становім. Паямо, і ставілі на покуці куццю тую. А назаўтра ямо усё. Куццю варылі з ячменю.

*Запісана ў в. Жанкавічы*
*ад Карачун Леаніды Уладзіміраўна, 1932 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Долкінды Нясвіжскага р-на Мінскай вобл.).*

Дома кашку варылі і куццю варылі, кампот з сушанымі яблыкамі. На Каляду варылі, на Шчадраца. Сена клалі на стол. Была вячэра. Дзяўчыны гадалі.

*Запісана ў в. Карцэвічы*
*ад Асіповіч Вольгі Дзмітрыеўны, 1954 г.н.*

Тры куцці варылі, тры разы: першую – на Каляды, тады – на Новы год, трэцяя куцця – на Крашчэнне. З ячменя рабілі куццю. Шчадраваць хадзілі не мы, мужчыны хадзілі і з батлеяй, звязду носяць, спяваюць. Што-нібудзь даеш: калбасу ці што, цяпер ужо з казой хадзілі, а раней не.

*Запісана ў в. Карцэвічы*
*ад Драчан Соф'і Адамаўны, 1924 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Альхоўка Нясвіжскага р-на).*

Атмячалі заўсёды Каляды. Госці хадзілі адны к адным, родственнікі. Куццю варылі, тры разы варылі. Куцця першая – 6 января, а тагды 13 і 18 на Тры каралі. Кашу варылі з пярловай крупы. Кашу ставілі на кут. Бралі сенца, гаршчочак і яшчэ снапок. Абязацельна звязывалі снапок з жыта. Так вот ставілі на покуць на нізу ўжэ той снапок і туды клалі сенца. Некалі хадзілі ў шчадрыцы на Тры каралі, звязду зробяць, прыстраівалі нейкія свечкі, прыбіралі прыгожай бумагай. Харашо было. Прыходзяць, песні спяваюць і што-небудзь давалі ім: і сала, і яіц, і калбасу, і булку. Сваю ж пяклі заўсёды. Спявалі шчадровыя песні.

*Запісана ў в. Карцэвічы*
*ад Крыўко Наталлі Мікалаеўны, 1934 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Малева Нясвіжскага р-на).*

Хадзілі з баянам, спявалі. Сабіралі тады па карзіне яічак, булак, мяса, калбасу давалі. Варылі куццю. Чэраз хату кідалі галош. Забор мералі. Гэтак варажылі, замуж калі пойдзеш. Бліны пяклі, сабаку пускалі. Блін, калі перш схваціць, замуж першая пойдзе. Пеўня ў хату пускалі, зерне сыпалі.

*Запісана ў в. Карцэвічы*
*ад Усовіч Надзеі Максімаўны, 1947 г.н.*

У нас была на Каляды куцця, перад Новым годам толька і на Крашчэнне. Тры куцці. Мы ўсе пярлоўку варылі. Хто з грэчкай, хто з рысам, а я з пярлоўкі кашу варыла. Гадалі дзяўчаты. Вышываць хадзілі, прасці хадзілі сёння ў адну хату, заўтра ў другую, пасняваем. Перад Калядамі не спявалі, бо пост быў. Вось калі Каляды адбудуць, тады ўжо мы спявалі.

*Запісана ў в. Карцэвічы*
*ад Цвірко Алены Пятроўны, 1941 г.н.*

Куццю варaць і цяпер. Раней, як бабкі былі нашыя, розную варылі, а цяпер не. Вадзілі казла нейкага, зробяць казу. Зробяць тую звязду, такую во красівую рабілі. Круцяць тую звязду, яна ўсялякімі агеньчыкамі пераліваецца. Хадзілі мужчыны, трохі хлопцы. Ваду свяцілі ў цэркве, гэту ваду трэба было піць, хочаш кажды дзень утрам наташчак. Бальны чалавек можа піць, і малых дзетак купаюць у той вадзе.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Жук Алены Мікалаеўны, 1969 г.н.*

Варaць куццю, ложыцца сена на стол, ён засцілаецца абрусам, і ставіцца абычная яда. Гадалі: еслі выцянеш длiннае сена, то парасце харошая трава.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Угляніц (Плакса) Таццяны Аркадзьеўны, 1967 г.н.*

Ну, куццю гэта ж на Коляды варaць. Сварым куццю, паставім на покуць, засланую сенам і абрусам. Сена ложаць для таго, каб быў добры ўраджай. Чысты абрус сімвалізуе чысціню, дабрыню. Ставяць абавязкова 13 страў, можна нават 24. Куцця варыцца з пярлоўкі, рыса. І калі ўжо садзяцца за стол вячэраць, трэба паспрабаваць 3 лыжкі гэтай кашы і паспрабаваць усе стравы, якія стаяць на стале. Робяць кісель абавязкова.

*Запісана ў в. Лань ад Ярмаліцкай*
*(Страшко) Людмілы Казіміраўны, 1937 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Дубейкі Нясвіжскага р-на).*

У нас тожэ святкуюць Каляды і з калядою ходзяць, і звязда такая. Паздараўляюць усіх. Куццю варылі тры разы. Первая раждзественская, посная, а другая гэта ўжэ была скаромная. Гэта перад чатырнаццатым, трынаццатым ужэ была не посная, скаромная куцця. Ужэ там усё прыбіралі, а так трэба прыбраць многа страў посных. Кашу варылі перловую. Цепер і грыцаву , і ўсяку варaць, а раней заўсёды перловую. Перловую кажды дзень варылі, а ўжэ з пшаніцы таўклі на празнікі, на нядзелю варылі пшанічную куццю. Кашу ставілі на покуць, сена прыносілі.

“Нясу каляду, добры вечар, шчодры вечар, едзе каляда ў хату”, – эта мой дзед, калі нясе каляду ў хату, то гаварыў, ужэ і я цяпер нясу ў місачку, а некалі дык ставілі такое рэшата, трэба было сенца туды на покуці пакласці. А тады ўжэ вечарам ядуць кашу. Можна было курам даваці. Курэй трэба карміць на куццю ў абручы ў кругленькам, каб куры нідзе не хаваліся нясціся. Гаспадары былі радыя, што іх прыходзілі паздраўляць. Паздраўлялі і хазяіна, і хазяйку.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Кароль Ніны Вячаславаўны, 1937 г.н.*

Некалі ж гадалі. Люстэрка паставяць, свечку запаляць. Гэта на Шчадрэц так гадалі. А куццю дык яшчэ і цяпер варaць з ячменнай крупы. Куццю пад покуцці ставілі на лавы. Як недаедалі, то аддавалі катом ці сабакам, курам в аснаўном. Як хто хоча. Сена клалі, бо Ісус Хрыстос радзіўся, то там жа сена было. От таго і пашло. Гадалі яшчэ так: то грэбень паложыш пад голаў, пад падушку. Блінца елі. Блінца хазяйка пячэ, а ты памажаш і выйдзеш на двор, туды, дзе сметнік скідаюць, і стаіш, і слухаеш, дзе які сабака забрэша. Мая дваюрадна сястра гадала гэтак: і забрахаў сабака, а маці прыйшла і кажа: “Пойдзеш за Сяргеевага, бо іхні сабака там забрахаў”. І пайшла.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Лепяцілы Ніны Уладзіміраўны, 1930 г.н.*

На Каляды куццю варылі. Варылі з ячменнай крупы. Гэта была посная куцця. Яна ж просто на вадзе была звараная. Клалі сена пад покуцці пад абразом. Лавы вялікія ж былі. Рэшата паставяць. Ну, а патом пааддаюць усё тое жывёле і сена аддаюць, каб здаровыя былі, каб радзілася, пладзілася. У нас ходзяць і гадаюць на Шчадрэца. Мы некалі хадзілі на вячоркі, то з-пад печы куру выцянем да насыпем кучу зярна. Ужо дзяўбе кура. Сыпалі зерне. Чыю кучку зерня курка начне першую дзяўбці – значыць, той першы замуж пойдзе, а як хлопец, то ажэніцца. Дзе ў яком баку сабака забрахала – значыць, у том баку жаніх. Пякуць аладкі. Сабака першу аладку схваціць і з’есць – той замуж першы пойдзе.

Хадзілі калядаваць з казою. Убяруць казу дэй прыходзяць, паскачуць, каза ўпадзе тут сярод хаты: “Дай сала, каб каза устала, о, каза не ўстае”.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Лях Марыі Сільвестраўны, 1943 г.н.*

Некалі сабіраліся на Каляды ў адну хату. Гасцей колькі, суседзяў, выпіваюць, спяваюць. Павыходзяць на двор, у гулянкі гуляюць, качаліся ў снягу. Кашу варылі з крупы ячменнай. Перад тым як у цэркву ехаць, кашу ставілі на покуць. Каробачку такую з сенам паложаць, і тэй гаршчэчак стаіць на покуці. Давалі жывёлам кашу, гэта ж святая куцця. Втарая куцця ўжо не гэтакая. Гуляюць так ужо: у снег кідаюцца. Коней запрагалі некалі, праязжалі па дзярэўні, на шыі шыночкі звіняць. Ездзілі і на першы дзень Каляд, і на Новы год, і на Крашчэнне, тры разы. Крашчэнне – ета едуць воду свенціць, у цэркві бяруць. Патом п’юць яе, варaць. Вады гэтай выліваць не можна. Вуглы ёй пырскаюць ў доме. Бацюшка не прыязжаў, самі пырскалі. Шчодры вечар быў. Маладыя хадзілі, пераапраналіся: хто каза, хто воўк, хто мядзведзь. Паздраўлялі ўжэ ж з празнікам. І ўжэ ж паюць песню “Ой, ну-ну, каза…”. І ўжо каза ўпала. І даюць кілбасу, каб каза ўстала. Ну, даюць, тады яна патанцуе. І патом к следуюшчаму дому ідуць, а тады збіраюцца ды гуляюць. Назбіраюць, хто гарэлкі дасць, хто булку, хто грошы, хто што. Збіраюцца хлопцы, барабан, музыку бяруць і пайшлі пець пад вакном: “Хрыстос Васкрэс, Хрыстос Васкрэс!” Ці можна песню вам запець? Яйца даюць, грошы. І ўсе і пайшлі ў другую хату. Толькі хлопцы і мужчыны ходзяць.

Варажылі. Сыплюць ячменя і там, і там, выходзяць куры: і чыю першую жменячку начнуць клюваць, тая дзеўка і замуж выйдзе першая. У зеркала глядзелі, грэбень пад падушкі клалі, сасніш кавалера – за тога і замуж выйдзеш. Пяклі блінцы, выносілі на вуліцу: і з якога боку сабака забрэша, з той стараны і кавалер прыйдзе. Забор абдымалі, скольки шчыкетаў возьмеш, то праз столькі часу замуж пойдзеш. У калодзеж вядро апускалі і браліся (я, ты, я, ты), апускалі вядро: і каторая перша бралася, выйдзе замуж першая, а котора астатняя, выйдзе замуж последняя. Первая і последняя выцягвалі ваду і абліваліся. Свечкі палілі, казалі: “Дзьмухай”. Каторая свечка быстрэй патухне, а каторая яшчэ доўга гарэць будзе, то апошняя выйдзе замуж.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Матус Яўгеніі Міхайлаўны, 1930 г.н.*

Хадзілі з звяздою некалі, дзеці круцілі яе. Казе вывернуць кажух да палку якую возьмуць. Як каза ўпадзе, то казалі: “Козачцы нямнога трэба, паўбочкі грэчкі і цэлы пірог, каб каза пашла ў парог”.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Шынгель Любові Іванаўны, 1926 г.н.*

У нас казалі: “Ходзяць па калядзе”. Маладыя сабяруцца, і старыя сабяруцца. А як жа, яшчэ куццю гатовілі, з пярлоўкі варым, пірагі пяклі, прыбіралі ў хаце. Што смачнейшае ставілі на стол, мяса адварвалі. На стале было сем ці восем страў. Сена на стол кладуць, па-

крываюць скацерцю, бо Ісус Хрыстос у яслях радзіўся, пагэтаму ложаць усё на стол з сенам. Маладыя, прыбраныя, пяюць, ходзяць, прыдумваюць што-та, маскі панадзяюць.

*Запісана ў в. Новы Сноў*
*ад Абрамовіч (Ярашэвіч) Станіславы Антонаўны 1938 г.н.*

У Каляды нада хадзіць да Новага года. Вывярнуць кажух, здзелаюць звязду і спяваюць песні святыя, а не абы-што, як цяпер.

*Запісана ў в. Слаўкава*
*ад Макавец Чаславы Вітольдаўны, 1943 г.н.*

Рабілі харошую звязду. У сярэдзіне ставілі свечачку, а яе (звязду) зробяць з рагамі, ну, як звязда з бумагі. Рабілі хлопцы. У сярэдзіне было неба з чатырох колераў: жоўты, зялёны, красны, сіні, потым усё посным маслам змазваюць.

У гаршках гліняных варылі куццю. Пярлоўкі не маглі купіць, то зерне таўклі ў ступах. Насыпаем і таўкачамі таўком: бах-бах-бах. Абязацельна трэба, каб тры гаршкі куцці варылася. Пад Новы год два гаршкі варылі. Была каша густая з малачком, з сахарам, з жырам кашу паджарваюць, з кілбасой.

На Коляды яшчэ варажылі, хто першы замуж пойдзе. Мама напячэ бліноў, тыя бліны кідалі сабаку: чый першы блін сабака возьме – тая дзеўка першая і замуж пойдзе. Сабака не па парадку бліны браў. А раз ён узяў і загроб блін у пясок, і тая дзеўчына памерла. Плот абдымалі: калі пара – замуж выйдзеш, калі не, то яшчэ пасядзіш у хаце. Як варажылі, то нельзя было гаварыць, бо абрад жа ўжэ пайшоў.

*Запісана ў в. Слаўкава*
*ад Шыкулы Яўгеніі Іосіфаўны, 1914 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Ракавічы Нясвіжскага р-на).*

На Каляды збіраліся, спявалі, танцавалі. Калядоўшчыкі хадзілі, па падлозе качаліся. Круцілі звязду і спявалі песні. Звязду рабілі з бумагі, хараша аблеплівалі, і каза была. Стараліся хадзіць пад вечар, падаркі давалі. Куццю варылі ў печах. Ставілі яе на вугал хаты, пад абраз. Куццю бралі асобенна дзяўчаты маладыя і лажылі ў бумажачку, а патом пад падушачку і чакалі, што сасняць. І хлопцы так рабілі. Куццю варылі тры разы.

*Запісана ў в. Смалічы*
*ад Гуцько Аляксандра Іванавіча, 1931 г.н.*

Да Каляд пасціліся сорак дзён, маладзёж не пасціла. У царкву хадзілі. Яшчэ варажылі. Цягалі куру з-пад печы. Як кура крычыць – свякроў будзе ліхая. Бралі ложачку чайную мукі, качалі галушачкі і давалі сабакам. Чыю першую сабака схваціць, тая і замуж пойдзе. Абнімалі рана плота. Еслі пару штыкецін абдымеш – будзеш у пары або за хлопца пойдзеш. Калі лішне будзе, то пойдзеш за ўдаўца ці замуж не выйдзеш. Прыносілі сена і варылі куццю ў гаршчочках. На покуце ставілі сена і гаршочак. Елі куццю посную і з сахарам. Вечарам мы яе елі з вадой сладкаю. Назаўтра ехалі ў цэркаў на сваіх конях, а як прыязжалі з цэрквы, то за засланкаю стаяла печаная калбаса. Куцця была смачная. Не шчадравалі ў нас.

*Запісана ў в. Смалічы*
*ад Шчурскай Ірыны Мікалаеўны, 1935 г.н.*

На Каляды песні спявалі. Дзяўчата маладыя варажылі. Плота абдымалі, драва насілі. Сколькі возьмеш дроў-паленцаў: чотнае чысло – будзеш замужам, а як не – так ужэ ж будзеш гуляць. Куццю на Каляды варылі адну, запрашалі дзядоў, родственнікаў, усіх памёршых.

*Запісана ў в. Сычэва*
*ад Казей Валянціны Паўлаўны, 1930 г.н.*

На Каляды варылі куццю. Як хто ўмеў, так той іварыў. Не адна куцця была, а тры. Ставілі на покуць. Яшчэ ж і да куцці варылі. Першая куцця была посная. На першую куццю мясногa ж нічога не елі. А на другую куццю варылі з мясам і з усім. А трэцяя куцця поснай не была, але шчыталася як посная.

*Запісана ў в. Сычэва*
*ад Комар Марыі Вікенцьеўны, 1941 г.н.*

Куццю варылі на Каляды. Першая посная была. Сена абязацельна лажылі ў рэшатках невялічкіх і чыгунок ставілі. У цэркву хадзілі. Нікога на куццю не запрашалі.

*Запісана ў в. Сычэва*
*ад Сандрос Вольгі Марцінаўны, 1929 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Андрушы Нясвіжскага р-на Мінскай вобл.).*

На Каляды варылі тры куцці. Першая была посная, а другая, мусіць, не. Адзін раз перад Калядамі куцця, другая – перад Новым годам і Шчадрацом, а трэцяя – перад Трыма каралямі. Падлажвалі сена: у каго карова была, каб ела, каб зрокаў не баялася. Куццю варылі так: замачвалі зерне, прамыем пярлоўку, памочым, а тады варым. Запрашалі дзядоў проста на вячэру.

*Запісана ў в. Сычэва*
*ад Юхноўскай Алены Антонаўны, 1935 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Малева Нясвіжскага р-на Мінскай вобл.).*

Каляды мы заўсёды святкуем. Тры разы варылі куццю. Першая куцця – Калядная, другая куцця – на Новы год, трэцяя куцця – на Крашчэнне.

Куццю варылі з ячменнай крупы. Зварыцца каша, тады вечарам куццю ставілі на стол. Вячэраем. Гаршок з куццёю ставілі на покуць. Хадзілі шчодрыкі. Хадзілі дзевачкі маленькія. Ім давалі канфет, пячэння. Козы былі людзі. Адзяваліся, ды каза прыходзіла з калядой. Паваліпася і прасіла калбасы. Папаюць, даём калбасу, што маем, то і даём.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Кавальчук Аляксандры Паўлаўны, 1931 г.н.*

Ну, Каляды больш вясёлы празнік. На Каляды гатуемся. Усякія стравы рабілі. Зразу ідзе першая куцця. Трэба каб было 12 страў. Каб яны былі посныя. Яна называлася посная. Ездзілі ў цэркаў на першы дзень. Тады ўжо спраўляеш куццю першую.

А шчадроўнікі прыходзяць на другую куццю. Як мы гаворым, на стары Новы год. Тады ўжо ходзяць каляднікі па хатах. Тады гэтым каляднікам і дзенькі даём, з прадуктаў – булку. Угашчаем, яны паспяваюць. У асноўным маладыя хадзілі. Перадзяваліся, і каза прыходзіла, і баба Яга, разныя былі, цыганка. Кажны вечар шчытаецца святы дзень. Вечарам нічога не рабілі. Так было да Крашчэння.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Маркевіч Аляксандры Уладзіміраўны, 1938 г.н.*

Раньшэ то былі каляднікі. Тата мой расказывал. Хадзілі з калядою, у хату ўваходзілі. Песні спявалі хараша, маладым жадалі замуж выйсці, а старыком долгай жызні жадалі. Хто што мог гаварылі. Хадзілі кукольнікі. Спявалі. Было некалі інцересно. А колькі раз варылі куццю? Рабілі тры куцці, адна куцця была посная. На куццю трэба што б было ўсё поснае, каб чарка была. Па сто грам выпівалі. Другая куцця была так, няпосная, а трэцяя зноў посная.

Першую куццю варылі толькі з ячменя. Патом каша становіцца на покуць. Гэта паследняя яда, можа кожны узяць яе па тры разы, той крупы. Тады гэтую крупу, казалі, трэба занесці курам. Бралі гэты абрус са стала, каб яны несліся ў адном месце, не разбягаліся.

На другую куццю ніхто не хадзіў. Ну, на первую хадзілі, спявалі песні.

*Запісана ў в. Альбянка*
*ад Гібчык Юзэфы Францаўны, 1931 г.н.*

У нас была бабушка, яна прыгатаўлівала ўсегда ўсім. І вот нас было трое ў сям'і. Вот я самая старшая. І вот варылі на куццю боб. Быў у нас яшчэ дзедушка. І вот кагда вечарам солнышка ўжо захадзіла, на поле дагарала, цямнела, ставілі нас траіх за стол, вот упрадзі печ, патом стол, а патом такая лаўка дзеравянная, і мы вот на гэтай лаўкі станавіліся. Нада было фартушкі падвязаць і дзяржаць, а дзед сеяў гэты боб. І патом гэты боб шчыталі, нада было калічаства ўзнавіць, і так ужо сям'і паказаць, сколькі там будзе ўдачы, якая прыбыль у сям'і. Тады гаварылі: "Цот ілі лішка".

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Санько Раісы Іванаўны, 1936 н.г.*

Усягда гатовіліся да Каляд, усё лепшае гатовім і бліны пяком, і булкі пяком. Тады да Раждзества пост есць. А потом ужо ўсё скаромнае, ужо і мяса, і калбасу гатовім. Збіраецца ўся сям'я: і дзеці, і дзедушкі, і бабушкі. Ну, усе, хто ў доме, і тады ўжо куццю варым – самае галоўнае. Было тры куцці: перва – шостага, а ўтарая ўжо трынаццатого, а трэцяя восемнаццатого. Первая постная яшчэ, а на другія ўжо можна ўсё есць. Куцця – самая лепшая яда, яна спрадвеку вякоў, і абязацельна перловая, ну, як няма перлоўкі, то – рысавая. Но самая глаўная – перловая. Дзеўкі гадалі: і вот калі мама пякла бліны першы раз, тады яны выходзілі на вуліцу і слухалі: з якога бока які звук, з таго боку і жаніх. Ці шлі вечарам і ў першага мужчыны спрашвалі імя, калі ён скажа, як завуць, эта будзе жаніх. Патом кідалі туфлі, там было напісана: багаты жаніх, бедны жаніх, п'яны жаніх. Лісточкі лажылі: первы, втары, трэцці. Мы так даходзілі да таго, не зналі што там. Адкрывалі там: каму рабочы, каму п'яніца, каму басяк. Хадзілі калядоўнікі.

Але не на первую куццю, а гэта трынаццатага перад Новым годам, чатырнаццатага ста-

ры год ужо, а тады ўжо трынаццатага хадзілі, ну, еслі ў дом прыносіш, то ўжо гэтак пелі хораша і паздраўлялі, раждзественскія гэтыя абрады ўсякія былі. І ўгашчалі абязацельна, ужо там дзеньгі дасі ілі што – гэта не счыталася, але абязацельна трэба было ўгасціць іх чым-та: ну, там ці водкай, ці віном, ці хто што мог піць. Калядныя песні ўсягда пасвяшчаліся гаспадыні, гаспадару. Паздраўлялі: "Добры вечар, гаспадару. Жэлаем дабра і штоб ўсё вялося, усё ў вас было, штоб жыто вялося, сало было".

*Запісана ў в. Лань*
*ад Салавей Ірыны Іосіфаўны, 1933 г.н.*

На Каляды многія не хадзілі, гэта пару чалавек хадзіла з звяздаю, гэта я помню. Я помню яе, што сіто, ну, вы ж ведаеце сеткі этыя, вот такія круглыя, вось гэтыя новыя, можа падраны былі дзе, іх выкідалі, а абалочка гэтая была, там устаўлялі свечкі, як яны там прыкраплялі іх, не знаю. Тыя свечкі прыкрапляліся, ну, тут недзе абажур быў відзім, патаму што там свечкі, ўстаноўленыя і запаленыя, яны былі прыкрэплены. Ну, яно круцілася ўсё. Там, значыць, рабілі корбу, хлопцы рабілі. Ды вось падойдуць пад акно ды будуць пытацца: "Ці вам песню заспяваць, ці так каляду падасце?" Ну, вот у каго, прымерно, бывае памрэ хтось ці што, ну, вы ж на тот мамент не спяваеце. Яны і так пададуць там, што маюць. Ну, каляда ж: то тое, то тое, то тое дадуць. А як каб ужо хочуць, штоб тыя дзеці паглядзелі каго, так просяць ужо, каб ужо спявалі. Вот яны і спявалі песню. Начыналася вось так: "Звязда яснее сонца ўсходзіць…" А як яно там далей канчалась..? Са звяздаю хадзілі маладыя хлопцы, тыя хлопцы самастаяцельныя, прымерна, ужо дваццаць год, ці, можа, армію адслужылі каторыя. Тады ж бралі пазней, гэта цяпер бяруць у армію малодшых. Самастаяцельныя хлопцы хадзілі. Ну, там назбіраюць ужэ і грошай, і калбасаў назбіраюць, гарэлкі купяць і ўжо начынаюць дзе-небудзь баляваць.

Ну, куццю ж варылі абыкнавенна, як рабілі маткі нашы, так і мы рабілі. Ну, абычно варат жа куццю. Адразу прыносяць сена, ужэ на куццю прыносяць на покуць сена трошку. У гаршку вараць куццю, і тады яна астыне, яе паставяць на покуць. Вечар, начынаюць ужэ вячэраць. Ну, прыпраўляюць чым хто як любіць. Гэта было куцці тры. На першую куццю ставілі, а на трэцюю выносілі, як кажуць. Першая, як мы кажам, куцця на Каляды 7 января, а тады ж ужо на Новы год другая (трынаццатага), а трэцяя куцця – дзевятнаццатага, на Вадохрышча. Ну, вот на тое Вадохрышча ўжо забіраюць і гэта сена выносяць.

*Запісана ў в. Малева*
*ад Высоцкай Тацціяны Сцяпанаўны, 1932 г.н.*

Кабанчыка ўбівалі, калбаска штоб была. Куцця была. Каляду ставілі на снапок, сена рыхтавалі. Тры была куцці. Першая была постная, а втарая і трэццяя – мясная. Сена пад абрус клалі, цягнулі патом яго адтуль. Выцягнуць длінная сена – будзе лён длінны. Каза была, спявалі. Калядоўшчыкі хадзілі са звяздой, дзелалі круг, прыстройвалі яго і спявалі. Дарослыя хадзілі калядаваць. Хадзілі мужчыны. Прыходзілі, спрашывалі: "Ці падасце каляду ці не?" Каму нада, прыносяць, а каму нельзя (жалоба якая), то пускаць не нада. Дзяўчаты на Каляды варажылі.

*Запісана ў в. Малева*
*Гацілы Міхаіла Дзмітрыевіча, 1920 г.н.*

Куцця была. Сена на стол лажылі. Трынаццатого января, перад втарым Новым годом, еслі маладыя людзі дружаць, рассцілалі дарожку ад дома хлопца да дома дзяўчыны і стараліся ў дом зайсці, штоб увараваць штонебудзь (ці качаргу, ілі падушку) і занесці дамой. Назаўтра ўстрачаліся радзіцелі, знакоміліся.

Сабаку аладкамі кармілі: чыю першую схваціць, значыць, тая дзеўка першая замуж выйдзе.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Шуковіч Галіны Міхайлаўны 1946 г.н.*

Хадзілі, калядавалі: хто яічак дасць, пірагоў, хто самагонкі. Паздраўлялі, песні спявалі, здароўя жалалі.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Васільевай Валянціны Уладзіміраўны, 1952 г.н.*

Быў спачатку перадкалядны пост. На Каляды былі танцы, патом, после Каляд, хадзілі шчадрыцы 13 января. Калядавалі, хто што даваў, у аснаўным давалі грошы, пелі:

*А ў нядзелю рана нам зара свяціла,*
*Божая маці сына нарадзіла.*





Еслі ябланя, вішня не дае ўраджай, то ў 12 часоў ночы хазяін на Шчадрэц ідзе і гавора: "Устань, ачніся, Хрыстос нарадзіўся". На следуюшчы год гэтае дрэва пачынае пладаносіць.

*Запісана ў в. Грыцкавічы*
*ад Заяц Станіславы Іванаўны, 1944 г.н.*

Было тры куцці. Адна куцця, перадкалядная, – шостага, другая – трынаццатага, а трэцяя куцця – васямнаццатага, перад Трыма каралямі.

Шостага числа да ўсходу сонца ставілася на стол куцця і з веніка бярозавага браўся дубчык і дзелалася калечка, у нас яго называлі "вітка". Дзелалася гэта для таго, каб ва врэмя двух нядзель можна было ставіць латкі (шыць). Як тая куцця ўжо зварылася, то яна ставіцца на покуць, дзе абразы вісяць. Вечарам, як на небе запаліцца першая зорка, тады садзіліся есці. Куцця далжна была быць посная. Яна магла быць з чым хочаш: з ізюмам, з макам, на любіцеля. На Шчадрэца – другая куцця. Вось тая ўжо магла таксама быць з чым хочаш.

Калядная світа – хто хоча, па жаланію, любы ўваходзіў у яе. Рабілі бальшы круг, там разныя фігуркі ўжо былі выразаныя, круціцца там, свеціць фанарыкам, гэта называлася "гвязда". Пераапраналіся ў каго хочаш: хочаш у Бабу Ягу, у каго хочаш. На куццю, якая шостага, калядаваць не хадзілі. Калядоўшчыкі звычайна пелі: "Добры вечар, шчодры вечар, ці песню заспяваць, ці так каляду падасце?".

Еслі ў чалавека ўсё нармальна ў хазяйстве, ён будзе казаць: "Спявайце", а еслі не, то гавараць: "Так падасі".

*Запісана ў в. Грыцкавічы*
*ад Заяц Станіславы Іванаўны, 1944 г.н.*

Сабіраліся дзеці, зналі што хто-та с кемта гуляе, нераўнадушны, вот яны дарожку пеплам прасыпалі ад дзяўчыны да хлопца. З горкі на санках каталіся.

На Каляды лічылі дзевяць лысых, каб мароз стаў меньшэ. Усіх знакомых, хто з лысінай, перачыслялі і называлі імёны.

*Запісана ў в. Малева*
*ад Васільевай Зінаіды Віктараўны, 1950 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Кукавічы Капыльскага р-на).*

На Каляды калядоўшчыкі хадзілі. Рабілі звязду да вот і хадзілі: мужчыны хадзілі і жанчыны. Тады пелі, танцавалі. "Казу" вадзілі. Ну, якая была "каза" – жанчына апраналася ў кажух навыварат і была за "казу".

Куцця рабілася абязацельна. Раней была ступа такая дзеравянная і качалка і рабілася ячменная куцця. Пад Каляды ўжо ў кажнай хаце таўклася. І з пшаніцы таўклася, і з ячменю. І абязацельна куццю ставілі на покуці. Ставілі пад яе рэшата з сенам. І так на другую, і на трэцюю. А тады сена даюць ужо жывёле.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Гадун Ядвігі Уладзіміраўны, 1929 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Лесуны Нясвіжскага р-на).*

Шостага января сустракаюць першую куццю – посную – і трэба, каб дванаццаць страў было. А ўжо назаўтра ідуць у цэркву ўсе людзі, тады ўжо калбасу пякуць, мачанку. І ўжо ідуць ў госці людзі.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Жук Леаніды Іванаўны, 1938 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Вайнілавічы Нясвіжскага р-на).*

На куццю посцяць, ужо і тады і вечарам ідуць на вячэрню ў цэркаў. А тады прыходзяць усе і ставяцца на стол усе посныя блюды. Дванаццаць, мо, блюдаў ставілі, але ўсе посныя: капуста тушаная, каша пярловая (была абязацельная), клынду яшчэ гатовілі. Вось грыбы, зялёны лук пeратушаць, вадою падальюць і падкалоцяць яго. І вось гэта была клында.

Яшчэ шчадровая куцця была, не посная. Усе елі мачанку і куццю з вухам.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Чычко Соф'і Рыгораўны, 1934 г.н.*

Куццю першую вараць з ячменнай, пярловай крупы – посную. Патом ручнік ілі скацерць засціляют на стол, сена ложаць, ставяць чугунок.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Каржанеўскай Антаніны Арыстархаўны, 1929 г.н.*

Двенаццаць страў варылі на куццю: вопервых, преждзе всего кампот з яблык, абязацельна каша – куцця. Таўклі ячмень і патом варылі ў печы. Былі такія гаршочкі з гліны. Пакупалі селёдку і прасілі, каб налілі сок з сялёдкі, дык называлі лёк. І абязацельна венегрет рабілі. Пяклі аладушкі на дражжах з пшанічнай мукі. Квас варылі, ну, многа чаго было, і кісель был з сушонай вішні абязацельна.

Помню, было ваджэнне “казы”. Хадзілі, звязду дзелалі. Тулуп выварачвалі, дзелалі “казу”. Абязацельна рогі дзелалі. І пець хадзілі. На другі, на трэцці дзень хадзілі. На первый не хадзілі. І давалі булку, калбасу, канфет. На Каляды абязацельна запякалі гуся з яблакамі-антонаўкамі. На Каляды ёлку ставілі. Абязацельна яблакамі ўкрашалі ёлку, а гэтыя шарыкі рэдкасць былі. Самі ўсё дзелалі, і Дзеда мароза зробім, пад ёлку ставім, і дзеці чакалі падаркі.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Халецкай Яўгеніі Іванаўны, 1932 г.н.*

Гарэлку ж пілі, у царкву хадзілі, мачанку варылі, каўбасу пяклі. Мачанка – гэта падліўка такая. Кумпякі пякуць, на куццю рыбу жаруць, сена сцеляць на стол. Ну, бліны пякуць, мак мнуць.

Была первая посная куцця, втарая была перад Новым годам, а паследняя – тожэ посная, перад Крашчэннем. На куццю спявалі.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Жук Зінаіды Канстанцінаўны, 1932 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Лесуны Нясвіжскага р-на).*

Мы абычна посцім перад Калядамі. Сёмага Каляды, а шостага ўжо куцця. Многа страў гатовім, страў дванаццаць – адзіннаццаць каб было на стале, і пачынаем садзіцца. Калі першая зорка загараеца на небе, тады садзімся вячэраць. Была каша, сялёдка, мачанка з грыбамі, бліны. Абычна поснае ўсё. Кісель варылі, кампот. Куцця была перад Калядамі, а патом перад Новым годам – чатырнаццатага, перад Крышчэннем – у нас васемнаццага. На Каляды, на першы дзень, калядоўшчыкі хадзілі. Што на стале было, то ім давалі. А яны спявалі песні.

*Запісана ў в. Малева*
*ад Верэмеевіч Яніны Дзмітрыеўны, 1938 г.н.*

У цэркаў хадзілі, булкі пяклі, гасцей чакалі, калядоўшчыкі хадзілі з казой, звязду рабілі.

*Запісана ў в. Малева*
*ад Гацілы Алены Веньямінаўны, 1933 г.н.*

Пасцілі, а патом Каляды ждалі. Заўсёды снапок рыхтавалі з жыта, звязвалі яго, прыносілі на покуць, засцілалі сена на палаценца. Кашу мама зварыць і туды кашу ставіць. А тады ранечка прыдзе, памоліцца мама. Яна і пірагоў напячэ, свечачку запаліць і кашу пачыналі даядаць, вечарам жа яе есці пачыналі. Каша была посная.

Хлопцы хадзілі са звяздою-калядою і песенкі пелі: “Добры вечар, шчодры вечар”. А іх абдарвалі, а яны падзякваюць і ўходзяць.

*Запісана ў в. Малева*
*ад Каладзінскай Валянціны Фёдараўны, 1931 г.н.*

Ну, каляду прыносілі ў хату. Жыта звязвалі ў снапок ды на покуць ставілі. Куццю варылі ў гаршку ды ставілі на покуць гэта ўсё. І стаяла цэлыя Каляды, а тады ўжо кончыліся Каляды – выносілі яго. Калядоўшчыкі хадзілі, хлопцы, дзеўкі са звяздою. Казу вадзілі.

*Запісана ў в. Малева*
*ад Гацілы Фаіны Іванаўны, 1928 г.н.*

Перад Калядамі пасцілі, кабана білі, гатовілі ўсё. Раней варылі ячменную куццю, ставілі на покуць, такая каляда была, снапочак такі, сена лажылі і ў угалку пад іконай ставілі кашу. Тады вечарам елі. Гатовілі многа: і мясныя блюда былі, і квас такі варылі. Была калядная куцця, калі к Новаму году, то таксама куццю рабілі. Хадзілі ў Каляды калядоўшчыкі, вадзілі казу, але ж не натуральную, яны самі перадзяваліся ў казу, прыхodзілі, спявалі. Дарылі ім жа ўсё. Рабілі зорку.

*Запісана ў в. Малева*
*ад Ігнатчык Валянціны Усеваладаўны, 1941 г.н.*

Я сама каталічка, у нас абрадаў такіх асоба няма. Куццю на Каляды варылі з пярлоўкі, была куцця і блінчыкі з макам і былі яшчэ грыбы. Вот такое ўсё было. Шчадроўшчыкі не вельмі хадзілі ў нас, я гэтых шчадроўшчыкаў ня вельмі знаю. У нас маладзёж хадзіла і спявала, шчадравалі трохі.

*Запісана ў в. Нялепава*
*ад Болтуць Станіславы Адамаўны, 1947 г.н.*

Ужэ як перад святам прыбіралі, ужэ на Каляды святкавалі і елі, булкі пяклі і ражкі пяклі, куццю варылі. Вада закіпіць, ды і зварыцца тая куцця. Куццю варылі з ячменя. Калі куцця аставалася, тады мы яе курам аддавалі, каб нясліся. Яшчэ на стол клалі сена пад абрус, каб вялася жывёла, а на трэці дзень ужэ выносілі каровам. Куццю рабілі таксама перад Новым годам. Прыходзілі на Каляды калядоўшчыкі, а раней мы самі збіраліся. Збяромся, я вот, прымерна, адзявала брукі і была за хлопца і іграла заўсёды на рашчосцы, выгравала танцы ўсе, і спявалі усё. Ужо брат мой адзяваў плацце, і ужэ ідзём удваіх з ім калядаваць. Гаварылі, каб былі здаровыя, каб ніколі не балелі. Спявалі калядкі. Пяклі бліны. Варажылі на Каляды.

*Запісана ў в. Грыцкавічы*
*ад Кандрацюк Антаніны Сцяпанаўны, 1939 г.н.*

Святкавалі Каляды, рыхтаваліся. Некалі ж газу не было, печы былі. У печы куццю варылі, наліснікі пяклі, мак церлі ў качалцы. Куццю з гатовай пярловай крупы гатавалі. Потым збіраліся ўсе вечарам, ставілі куццю на покуці, сенца лажылі, свечку запальвалі потым. А далей садзіліся за стол, гаварылі пацеры перад куццёй і тады ўжо дзяліліся аплаткамі. На стол пад скацёрку лажылі сена абавязкова. А потым яго ўжо жывёле заносілі.

Калядоўшчыкі хадзілі, спявалі. Са звяздою хадзілі і спявалі песенькі. За гэта ім капейкі давалі. Гармонік з сабою бралі, у каго быў.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Церахавец Уладзіславы Францаўны, 1938 г.н.*

Да Каляд людзі посцяць, а на Каляды кілбасу ўжэ ядзяць, квас вараць. У шчадрыцы са звяздой хадзілі. Звязду рабілі з бумагі, выражуць ды наклеюць яе на якія фанеркі ілі кардон і насілі гэдак. Вадзілі казу. Перадзяваліся, прыбіралі тых чучалаў, рукі накруцяць, робяць якую галаву, наложаць ці з чаго, ды ідзе ужэ каза ці конь, ці карова.

Рабілі куццю. Як перад Калядамі, то ў ступе таўкуць ячмень ды ўжэ куццю гэтую робяць. Куцця была адна. Эта яна на першыя святы, на Каляды. Ужэ навараць ды нясуць, на покуць сена паложаць і ўжо ў тым гаршку нясуць тую кашу, ставяць і каляду звяжуць (прынясуць з жыта снапок). А дзеці ўжэ наперабой, каб тое сабе пад каляду несці. Падлогу к Калядам і Вялікадню мылі, а як падлогу памыюць, дык ужэ сена прынясуць на куццю гэтую, насцелюць, а ўжэ дзеці перакідаюцца, патом у хаце ўсім весела, дзяцей было многа ў хаце. Сена сразу кладуць на покуці, а ўжэ як ядуць, то пад абрус. Тады садзяцца вячэраць. Спачатку была посная вячэра і сялёдку ужэ купляюць на куццю, і кашу тую вараць. Калі прыбіралі, то казалі, што трэба куццю курам даваць, каб нясліся.

На Новы год варажылі. Збяромся ўжо, паставяць люстэрка, сыпалі ячмень, прыносілі пеўня ці курыцу, хадзілі лічылі шчыкеціны (забор). Варажыла некалькі дзяўчат. Курыца тая падыдзе ды ў люстэрка глядзіцца. Ставілі воду, мусіць, якая першая нап’еццa вады, тады будзе мужык п’яніца. Варожылі, хто першая замуж выйдзе. Кідалі бот праз хату: у які бок наском ляжа, туды замуж пойдзе.

*Запісана ў в. Грыцкавічы*
*ад Рудой Таццяны Антонаўны, 1932 г.н.*

Да нас прыходзілі нарадныя дзеці і спявалі песні:

*Раждзество хрэстова,*
*Ангел прыляцеў.*
*Ён ляцеў па небу,*
*Людзям песні пеў,*
*Людзі ўвідалі*
*Яркую звязду,*
*Нізка пакланілісь*
*Ангелу, Хрэсту.*

Моладзь была пераапранута ў розных жывёл. Яны спявалі, танчылі і атрымлівалі за гэта салодкае і грошы. Людзі не скупіліся, хораша іх адарывалі падарункамі. На абрусе было шмат каляднай ежы. Дзяўчынкі гадалі на суженага. Яшчэ ў нас на шчодрыкі выбіралі прыгожую дзяўчынку, упрыгожвалі галоўку вянком, вадзілі яе па хатах. Спявалі з ёй калядкі:

*Шчодры, Шчодры,*
*Пабіліся вёдры.*

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Жукоўскай Зоі Аляксандраўны, 1933 г.н.*

На Каляды людзі ў касцюмах нячыстай сілы ходзяць па дамах і дварах, калядуюць, потым устраівают парад і весяляцца да раніцы.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Базарнавай Марыі Ігнацьеўны, 1922 г.н.*

Дзеці хозяць і шчадруюць. Пяюць песні, пераапранаюцца ў розных жывёл. Ноччу моладзь гадае. А на утра ходзяць усе засіваць, з Новым годам паздраўляюць. Засіваюць рознымі крупамі.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Скрыцкай Марыі Аляксандраўны, 1940 г.н.*

У асноўным моладзь гадала на Каляды.

На шчодрыкі я пекла бліны. Дзяўчына брала першы блін з пячы і станавілася пад акно хаты. Там было многа дзяцей, калі на дзіця пакрыквалі, то, лічылася, што яна не пойдзе замуж.

Яшчэ кідалі абутак цераз плот: і вось куды гэты абутак глядзіць носам, там жыве каханы.

Вось яшчэ як у нашай вёсцы гадалі на сужанага-ражанага. Бралі люстэрка, на яго баках ставілі свечы, стакан вады, у яго кідалі кальцо. Хто з'явіцца у люстэрцы, той і жаніх будзе.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Базарнавай Марыі Ігнацьеўны, 1922 г.н.*

У нас гавораць: "Калядункі". Прыходзілі ў асноўным дзіцяткі, але і хадзілі дарослыя! Расказваюць калядкі, танцуюць, пераапранаюцца ў казу і мядзведзя і ходзяць са звяздой, спяваюць песні гаспадарам, а за гэта давалі канфеты.

У нас было гаданне для дзяўчын: бралі палена з закрытымі вачыма, потом глядзелі, у каго якое было. Калі з сучкамі, то вялікая сямейка будзе, калі крывое, то страшна будзе, калі роўнае, то красівая, шчаслівая будзе.

Пад падушку лажылі грэбень для валос – у сне паяўляўся жаніх.

Гадалі на куцці… Дзяўчына брала ложку куцці, лажыла ў калашнію бацькі і клала гэтыя штаны пад падушку, і цэлы дзень ні з кім не гаварыла і ў сне павінна была ўбачыць мужа.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Чычко Антаніны Фамічны, 1926 г.н.*

О, Калядкі! Калядкі – гэта вялікія святкі. На Калядкі некалі посцілісь. Пачынаецца Піліпаў Пост 28 наябра. І з 28 наябра мы да 7 января ўсе пасціліся. Хадзілі ў цэркву. Цэрква далёка была. 20 кіламетраў пяшком ішлі. Хадзілі ўсе хлопцы, дзяўчаты ішлі чарадой цераз лес. Лес такі бальшы быў. Хадзілі ў Малева. Царква там была. Прыбіраліся к Калядам, некалі пралі, вышывалі. А ўжэ як начыналіся празднікі Калядкі, мы збіраліся ў адной хаце. У нас хата была такая бальшая ў Калядкі. Перад Калядамі пачыналася первая куцця. На гэту куццю гатовілі перлоўку, як мы называлі, ячменныя крупы. Такі быў закон, нада было штоб была перловачка. Яшчэ ў каждага павінен быць мёд. У нас быў мак, яго расціралі і кідалі ў мёд. Перловачка гэта была на канец вячэры. На вячэру прыбіралася 12 блюд, гэта з шостага на сёмае января. Ніхто ўжэ нікуды не хадзіў з шостага на сёмае. Гэта называлася "куцця". І тады ўжо кажуць: "Пасля кашы німа пашы". Кашы паелі з мёдам, памаліліся, канешна, і ўжо чакаем праздніка. Тады пачынаецца гулянне. Кажды дзень гулялі, кажды дзень збіраліся вечарам, на танцы хадзілі, а так хадзілі з калядою. А яшчэ перад куццёй шэстога января прыносілі ў хату сена. Прыносілі і раскладвалі сена ў Красны ўгалочак. У каждай хаце есць Красны угалочак. У яго лажылася булачка хлеба, ставілася куцця. А назаўтра ўжо забіралася. Устаеш рана, а мама, бо папы не было, бярэ куццю яшчэ да сонейка. А вечарам наадварым боб. Знаеце, што такое боб? Не знаеце! Такі во крупны, жоўты такі. Яго, гэтага бобу, ужо напарым шэстога і стаемо з прыполамі. Мама пойдзе ў хлеў. Гэтую куццю аддасць куркам. Былі зроблены такія абручыкі, як на кадушку, у іх няслісся куркі. Вось туды і кідалі куццю. І ўжо мама адтуль прыносіць боб, і мы ўжо трымаем прыполы, колькі будзе боба, столькі і будзе ў нас авечак. Сена лажылі на кажды стол. Як спасіцель радзіўся на сене, так і мы накрывалі скацерцю гэтае сена, і ляжала яно да 18 января, да Крышчэння. Гэта паследняя куцця. Таму што было тры куцці. На Новы год куццю варылі з хвастом свіным, тожа з ячменнымі крупамі, у часнасці, з перлоўкаю. Глядзелі, каб было зярно вялкае, каб каласы былі вялікія ў ячменя, у жыта, у пшаніцы. Такія прыметы былі. Хлопчыкі хадзілі, рабілі віфлеемскую звязду. У яе ставілі нейкія свечкі. Наробяць ігрушак, аганькоў. Пераліваецца ўсё, круціцца. Адзяваюцца, хто ў казу, хто зробіць лісу. І ходзяць, спяваюць калядныя песні. Хадзілі па хатах: хто што дасць. Некалі ж давалі булкі, калбасу, ветчыну.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Дзяпішчык Неанілы Ільінічны, 1937 г.н.*

Да свята Каляд раней рыхтаваліся так: пяклі пірагі, булкі, каўбасу пяклі дамашнюю деравенскую. Варылі куццю. Першая куцця – эта куцця на самыя Каляды, перад Калядамі. Другая куцця – эта перад Новым годам, старым Новым годам. А трэцяя куцця – эта перад Хрышчэннем.

Першая куцця посная і трэцяя куцця посная, а другая куцця была не посная, мясная. Куццю рыхтавалі ў аснаўном з ячменю, перловкі. Ну, і рабілі пшанічную (з пшаніцы) таксама, але больш ячмень.

Прыходзілі калядоўнікі з казой, звязду насілі (там лампачкі былі ўкручаны). Адзявалі кажух навыварат і пелі:

*Ой, Калядкі, Калядкі,*
*Божыя святкі…*

І пад окна прыходзілі, эта трэба было ім даваць, плаціць.

Пад абрус клалі сена, не салому, а сена. Ставілі яшчэ на покуце рэшата, сіта туда, тожэ клалі сена – эта как бы яслі Хрыстовы. Ісус Хрыстос радзіўся ў яслях ў Віфліеме. Эта сена – прызнак таго, што іменна не ў хаце, не ў доме, а ў хляве радзіўся Хрыстос. У гэта сіта ставілі чашачку, блюда якое ілі тарэлку з кашай-куццёй. Калядоўшчыкі звярталіся да гаспадароў: "Пані-гаспадар". І спявалі песню:

*Хрыстос радзіўся,*
*Бог ваплаціўся,*
*Ангелы спяваюць…*
*Пастыры іграюць,*
*Чуда-чуда абвяшчаюць.*

Калядоўшчыкі шчыра дзякавалі гаспадароў за падаркі.

Шчодры таксама праводзіліся. Да Шчодраў таксама варылі кашу і мяса ўжо ж разрашалася, і каўбаса была на куццю, а на самыя Калядкі і на Новы год шчодра было, усё ставілі на стол.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Падгайскай Вольгі Дзям'янаўны, 1930 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Лань Нясвіжскага р-на).*

На Каляды булкі пеклі, варылі куццю, кісель. Ну, варылі куццю так: крупы засыпалі ў чыгун і варылі. А вечарам ужэ прыносілі каляду, снапок жыта, клалі на стол сена. Клалі сюды на покуць і ставілі куццю, а тады ўжэ ішлі есці. Каляду прынясуць і ідуць есці. Гэта была посная куцця – першая. Хазяін выходзіў і клікаў мароз: "Мароз, мароз, хадзі куццю есці!"

Перапраналіся і ў казу, і ў мядзведзя. А яшчэ звязду насілі. Калядоўшчыкі, перш чым зайсці ў хату і калядаваць, яны прасілі дазволу: пане гаспадару, ці песню запець? І ўжо пелі потым: "Калядую, калядую, каўбасу чую, пане гаспадару".

Бываў таксама абрад "ваджэння казы". Заходзяць з казою ў хату, і каза ўпадзе. Дык у гаспадыні прасілі сала, каб каза ўстала: "Дай казе сала, каб каза ўстала".

Дзякавалі калядоўшчыкі, жадалі, каб хлеб урадзіўся ў полі, каб у хляве была ладна. Як хто прыдумае. Шчадроўнікі паскачуць, папяюць, хазяін іх ужо ладна ўгосціць, чым мае: хто сала, гуркі, хто чаго. Паблагадараць і пойдуць.

У Каляды запальвалі вогнішча. Неслі каляду на дуб, там гэта пудзіла прывязвалі.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Драчан Ірыны Міхайлаўны, 1933 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Альхоўка Нясвіжскага р-на).*

Ой, Каляды – гэта калі людзей было многа. І праходзілі этыя Каляды, і некалі мая мама поснае варыла, куццю варыла. А мы ўжо чакаем тых Каляд. Думалі калі, як булкі пакаштаваць. А сёння булкі во ядуць всякія. А мы не ведалі булкі, это после вайны было. Каляды праводзілі абыкнавенна. У хаце семкі шчолкаліся. Куццю варылі з ячменных круп, сена прыносілі ўжо і ставілі на покуці куццю. А тады ўжо на першы дзень (ужо ж некалі ў цэркаў хадзілі), калі ўжо з цэрквы прыходзілі, даставалі ўжо тую куццю. Ужэ па тры ложкі куцці елі, кіўбасу пякуць, скваркі ўжо пякуць, ну, што ўжо, што прыбіралі. Патом там ўжо некалькі ложак куцці кідалі курам – да будут добра несціся. Хадзілі калядоўшчыкі, і яны мяне адзін раз спалохалі. Я выходжваю ціха, а яны як загамоняць. Я ім дала канфеты. Дзеці прыходзяць і кажуць: "Можна вам спяваць?" А я кажу: "Гэта ж на першы дзень ужо. Наце канфеты". Яны нешта спявалі і пашлі ўжо.

А варажылі трынаццатага, на Новы год. Пойдзем накрадзем ужо гэтых дроў у хату, кінем ужэ на падлозе: як да пары, то ўжо добра, а як не, то не.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Лурко Марыі Уладзіміраўны, 1937 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Смалічы Нясвіжскага р-на).*

Варылі куццю. Паставіш ваду, вада закіпіць, абмыеш тую куццю, знаеш ужо колькі будзе на той чыгунік (мы называем яго чыгунік). У печы ў яго капаем кубачак

ці паўкубачка вады, сколька будзе. Кашу хочаш, забеленую зробіш. У баначку там сена лажылі, каб Каляда прыйшла есці.

Прыходзілі калядоўшчыкі, год ці два назад прыходзілі дзяўчаты. Хадзілі пераапранутыя ў казу, спявалі песні. Дзякавалі калядоўшчыкаў, угашчалі грушамі, яблакамі, што хочаш, дзеньгі дай.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Шынгель Наталлі Віктараўны, 1930 г.н.*

Каляды мы святкавалі абычно. Яшчэ, калі мой тато жыў, то эта ён на куццю першую ўжо стукаў у акно, казаў: "Мароз, мароз, ідзі куццю к нам есці! Не памарозь нашага жыта, пшаніцы і рознай пашніцы!" Была першая куцця посная, перад Ражжаством, а патом Шчадрэц быў, эта на Шчадрэца абычно хадзілі ўжэ гэтыя каляднікі. Перад Новым годам Шчадрэц быў. І ўжэ перад Крашчэннем трэцяя куцця была, тожэ посная куцця. На першую куццю ячменную, крупу бралі, суп з грыбамі, і напаследак абычно гатовілі з груш кампот. А на другую куццю там ужо было мясное ўсё: мясо тушанае, калбаса. Свая, пальцам пханая, калбаса і мясо, і сало – усё гэто ўжэ на Шчадрэца. А ўжэ паследняя куцця посная была, перад Хрышчэннем, таксамо я ж кажу, это ў нас як закон было: каша і суп з грыбамі, асобенно много грыбов ужэ ў супе.

На Хрышчэнне хадзілі ў цэркву. Як наўперад, то заўсёды выходзілі на возера, асобенна як вялікія маразы ўжо былі. Як сама мароз, выходзілі на возера, прабівалі палонку і бацюшко свенціў. Патом з гэтай рэчкі бралі ўсе воду. Ужэ паследнее урэм'я ўжо абычно ў цэркві бочка з вадою стаяла. Бацюшко памоліцца, пасвенціць, і ужэ ваду бралі ў цэркві. Бо былі как бы гэтакія случаі, калі праламываўся лёд, апасна было. Калядаваць мало хадзілі, па праўдзе сказаўшы, эта ўжо цяперачы дзетвара бывае прыходзіць. Абычно спявалі песні, была песня: "Добры вечар, шчодры вечар". Воду, якую свянцілі, як закон гэта было, яе дома дзяржаць і рано трэба нашча піць. Вось гэта закон было. Гаспадары дзякавалі калядоўшчыкаў, ежай абычно адорвалі.

*Запісана ў в. Альбянка*
*ад Санько Марыі Канстанцінаўны, 1926 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Карцэвічы Нясвіжскага р-на).*

Раней да Каляд рыхтаваліся так: хадзілі да касцёла, маліліся і абратна ішлі, прыбіралі стол харошы і святкавалі два дні. Каляды заўсегда былі ў нас дваццаць пятага дзекабра. Куццю варылі, каляда была, куплялі ў касцёле. Каляду і куццю варылі, і тады ўжо вечарам перад Калядою дваццаць чацвертаго засцілалі стол абрусом, пад абрус клалі сена, як гэткі Пан Езус радзіўся. Ну, і на сталы ўжо станавілі ўсё на свеце, і ўсе частаваліся. Спярва куццю з ячменнай крупы варылі – это куцця самая першая. Тады каляду куплялі ў касцёле. Тады каляду клалі на стол, ламалі, як сям'я была вялікая. І тую куццю клалі, і абрусам накрывалі сена, на абрус усё гэтае клалі. Гэта як нарадзіўся Ісус Хрыстос. Так гэта рабілі як абрад усё. На другую куццю гатавалі ўсё на свеце. На трэццю куццю гатавалі ўсё поснае. Рыбу жарылі тады, ну, поснае ўсё было, сала не прыбіралі. Было такое, што хрысцілі абязацельно ваду. Па воду хадзілі да касцёлу, у бутылкі бралі, дадому прыносілі. Хрышчэнне было кажды раз. Дажэ на Вялькануе вада ў нас свянцоная есць. І ў бацюшкі, і ў ксенза тожэ, гэтаю свянцонаю вадой абкрапляліі хату, будынкі ўсе крапілі, ну, і самі па глатку пілі. Пад час абкраплення будынкаў казалі "Отча наш".

Калядоўшчыкі тады хадзілі з гвяздаю. Тамака ўжо ў той гвяздзе анёл, усё на свеце, пан Езус маленькі ляжыць, ну, і спявалі песні калядныя. Калі калядавалі па вуліцы, апраналі кажух поўсцю наверх, гэта так абычно хлопцы рабілі. Ну, і пераадзяваліся ўсяк: і ў воўка, і ў мядзведзя. Калядоўшчыкі дазволу ў гаспадароў не прасілі, яны на вуліцы пад акно прыдуць, калядуюць, а як папросішся ўхату, могуць і ў хату прысці, паспяваюць, канешно, але ніхто ў хату не клікаў, абычно яны спявалі пад акном:

*Гвязда яснея новы находзі,*
*Станце по стэжэ буксень вам родзі,*
*Чым прынц зен сень выбірайце*
*Да ботлее поспешайце*
*Пшывітаць пана.*
*После зналезлі дзіцёнтка ў жлобе,*
*Пшыскемі знакі*
*Даны тобе*

Патом на ўліцу ім выносілі водку ці віно, ці каўбасу, усё на свеце выносілі.





На Каляды дзяўчаты звычайна варажылі: клалі пад падушку куццю, як лажыцца спаць. І павінна была сасніцца: вось як дзяўчатам кавалер сасніцца, значыць, гэта суджаны.

*Запісана ў в. Альбянка*
*ад Валчок Сафіі Ігнацьеўны, 1935 г.н.*

Да Каляд я рыхтуюся: вару куццю, я люблю гэта свята, заўсёды раблю аладачкі з макам, пшанічныя пяку, маленькія і макам запраўляю. Яшчэ рыбу раблю, жару там, прыпраўляю, ну, там яшчэ многа гэтак чаго раблю.

Я вару першую куццю, эта ўжэ больш яна посная, другая куцця жырная, пышная такая, больш страў варыцца. А ўжэ паследняя куцця, эта ўжэ як на Тры каралі, а Шчадрэц палучаецца жырны, на яго трэба кілбасы рабіць. Усяго куцці тры, ну, Шчадрэц ён не шчытаецца, но ўсё раўно, ты спатыкаеш Новы год, і ўжо спатканне Новага году, некалі эта ўпярод шчыталася ў нас, як куцця, но трэцяя куцця тады, як Тры каралі начынаюцца. Шостаго – Тры каралі, а пятаго – куцця. Куццю рыхтавалі з ячменных крупаў.

Сено абязацельно ложаць на стол. Тады як ужо кончыцца куцця трэцяя, я забірала это сено і несла карові, каб карова яго з'ела.

Ну, мароз клікалі на куццю: "Мароз, хадзі куццю есці!" І лыжку паставіш яму, і тарэлку паставіш, алі каб не вялікі, каб не марозіў моцна.

Калядоўшчыкі хадзілі па хутару, хадзілі спявалі песні з гвяздаю. Гвязду рабілі сваей работы, круціцца, а па ёй скачуць конікі. Мужчыны прыдуць, спяваюць, даеш ім тамака бутылку, кіўбасы кусок, ну, в обшчым, што прыбіраеш там патрохі. Бацька заўсёды клікаў, каб калядоўшчыкі зайшлі ка мне, каб не мінулі, я вельмі прасіла, хацела пагля дзець, як яны пяюць.

Гаспадары калядоўшчыкаў нічым ні частавалі, адно давалі ім торбу ў сумку, тое, што прыбрано, ім давалі ў торбу, а яны ўжо там, як кончуць свае танцы этые ўсе, пройдуць дзе яны, то тады яны ўжо самі частаваліся. Ну, тады ж не было гэтак раскошно, як цяперака, гэтаго не было.

Паставіш пад ложка міску і наверх ужэ эту трэсачку. Была на вячорках, ужо падрасла трохі, ужо ў паненкі бралася, ну, і прышлі ўжэ ад вячорак. Мне мама мая палажыла, падставіла пад ложка, я і не бачыла міску, і палажыла трэсачку, як кладачку. І я прысніла. Мяне з аднаго боку рэчкі хлопец правёў на другі бок рэчкі, ну, і што, я сюды замуж прышла, на гэты бок рэчкі. Хлопец смелы, з аднаго боку рэчкі перавёў на другі бок рэчкі. Як мяне ён вёў, ці ён мяне па вадзе вёў, але я на адном боку рэчкі была, а раптам аказалася на другім боку рэчкі і з тым хлопцам. І потым той хлопец прапаў. Ды ён скора і памёр.

*Запісана ў в. Альбянка*
*ад Татур Браніславы Францаўны, 1942 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Саска Ліпка Нясвіжскага р-на).*

Да Каляд калолі кабана, самагонку гналі, і ўжэ як Каляды начынаюцца, дык ужэ хадзілі ў госці. Сёння ідуць да адных там саседзей, заўтра да другіх, патом да трэцціх і гэтак усё свята, да самых Трох каралёў усе хадзілі, святкавалі. Збіраліся выпіць, закусіць там.

Варылі куццю на Каляды, і варылі куццю на Тры каралі. А на Новы год пяклі бліны, на стары Новы год, а куццю варылі вот перад Калядамі, у суботу варылі куццю. Прыносілі сена, клалі на столік і калядку ставілі (гэта звязаны снапок) на покуці.

Калядоўшчыкі гэта зараз трохі пачалі хадзіць, а раней не. Ну, перапраналіся калядоўшчыкі: хто ў Бабу Ягу, хто ў казу, хто ў чорта. Там былі і дзяўчаты, і жанчыны, і хлопцы былі. Казу вадзілі, чалавека перапраналі ў кажух з маскаю. Каб каза паднялася, гаспадары бутылку давалі, сала і маліліся, і казалі: "Паднімайся, каза!". Пасля калядоўшчыкі песні пелі, дзякавалі, каб добра ўрадзіла ўсё, ну, добра каб у хазяйстве ўсё вялося. На Новы год варажылі на блінах, лажылі іх, чый першы блін сабака з'есць, той і замуж выйдзе.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Хоміч Ганны Сцяпанаўны, 1944 г.н.*

На Каляды хадзілі і дзеці, і дзяўчата з клуба. Хадзілі са звяздой, з казой. Трэба хадзіць і казаць: "Дайце сала, каб каза ўстала". Ну, а мы ўжо частуем. Даем і сала, і кілбасу. Які пірог пячэш, то і частуеш, даеш дзецям грошы на канфеты.

*Запісана ў в. Цякалаўшчына*
*ад Кавальчук Валянціны Вікенцьеўны, 1950 г.н.*

Мы сабіраем музыку, дзяўчата збіраюцца. Хлопцы гарэлку нясуць, а дзяўчата – закуску. А наша хата вяліка была. Тату-нябожчыка

папросяць: "Пусці ўжо танцы зрабіць". Тата такі быў, як вам сказаць, не шкадаваў вот. "Хай ужо, хай паскачуць". Ужо ж з хаты усё выкідаем, сталы становім, вобшчэм, як вяселле рабілі. Хлопцы во ў дзвярах стаяць, як у клубе, у варотах, і кажуць: "Давай грошы". Там па дзесяць ці па дзве тысячы. Музыку ж гадзілі, трэба ж яе аплаціць. Абхода хаты не было, не шчадравалі. Некалі во мы яшчэ на хутары жылі, тата вучыў калядныя песні, гвязду рабілі, такая з абруча гэтага, як сіта, кругленькая. Тата выразаў, такія звёздачкі паробіць, у сярэдзіну свечку падпаліць, гарыць. Дак эта некалі. Добра, хораша з калядой. Эта спынілася мо дзе ў 53-ім годзе, я яшчэ малая, помню, была. Тады яшчэ спявалі, а цяпер маладзёжы той хватае. Некалі то гулялі. Ого! Дак мы кажам: гульня "Вішаньку зрываць". Адна табурэтка становіцца, і дзяўчына становіцца на табурэтку, каб высока была. Такія два хлопцы становяцца пасярэдзіне, трэці ўжо скача, каб пацалаваць дзеўчыну. Гэта казалі: "Вішаньку зрывае". Этат жа ўжо падскочыў, а другі ўжо ж не дасць рады падскочыць, пацалаваць. Яна стаіць на табурэтцы, а ён во на плечукі апіраецца, каб абаперціся, падскочыць, каб яе пацалаваць. Этую пацалавалі, другая становіцца. Калі не змог пацалаваць, кажуць: "Вот даўбак! Эта ты не хлопец, бо ты ж не даў рады, не змог пацалаваць дзеўку". Тады ўжо з яго смяюцца. Так вот гулялі, калі мінута была, не толькі на Шчадрэц. Некалі ж гэтых клубаў не было, па хатах цягаліся.

На Каляды варажылі. Адно некалі на Каляды ў студню сыпалі мак ужэ. Сыпем мак, хто ж ужэ намандруе. Яшчэ хлапцоў пісалі на бумажачках, там Стась, Ясь. Возьмеш так panaпісваеш, тады ўжо ідзеш каля студні і гавораш: "Сею мак, каб знаць з кім буду век каратаць". Тако во пасееш мак і ўжэ ідзеш дадому. Трэба ж каб ішоў у хату і ні з кім не гаварыў, бо як загаварыш, гэта ж ня можна. Да тады пад падушку ўсунуў руку і выцягваеш. Трэба выцягваць бумажкі, цёмна каб было, каб цябе ніхто і не бачыў.

*Запісана ў в. Слаўкава*
*ад Драздовіч Яніны Браніславаўны, 1947 г.н.*

На Куццю варылі кашу: вады нальюць, закіпіць, засыпаюць крупы, ставяць на чарэн. Куццю варылі ячменную. Сена клалі на стол, накрывалі і тады ўжо вячэралі. Калядоўшчыкі прыходзілі, пераапраналіся. Пастукаюць у дзверы, а потым ідуць у сені. Спяваюць. Усё ж з пакалення ў пакаленне перадаецца. Каўбасу давалі калядоўшчыкам, канфеты, булкі, ну, усё што было, тым і частавалі.

На Каляды была такая прымета, хто на першы дзень зайдзе ў хату: калі жанчына зайдзе першая, то авечэчка акоціцца, а як мужык, будзе бугайчык. Або кароўка ацеліцца, то будзе бычок.

Была і першая, і другая, і трэцяя куцця, першая – калядная, другая – багатая, трэцяя – шчодрая.

Шчадрэц таксама быў. Дзяўчаты гадалі. Ой, усяк гадалі. Як хто надумаецца, так і гадае. Я, напрыклад, гадала так раней. Як ужо клалася спаць, паставіла ваду ў кутку пад ложкам, ну, і ўжо загадвала, ужо каго сасню, той будзе праводзіць мяне чэраз рэчку, мосцік рабіла, паставіла палены на кубку, а маці ж не знала, што я загадала, яна некага настольніка шукала, як пхнула чэмадан і палілася вада, і нічога я не сніла. Ніякае варожбы ў мяне не атрымалася.

На Шчадрэца бліны мазалі і выходзілі на вуліцу, неслі на сметнік, і трэба было пачуць: у якой старане сабака загаўкае, у ту сторану замуж выйдзе.

Абнімалі шчыкеціну, абнімаеш, да ек лішка, то замуж не пойдзеш, а ек не лішка, то ўжэ замуж выйдзеш.

З дровамі таксама гадалі: бралі дзяўчаты з вуліцы дровы, не шчытаючы іх, і прыносілі ў хату: калі цотны будзе лік, то дзяўчына выйдзе замуж, а калі няцотны, то не выйдзе.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Шынгель Ганны Іванаўны, 1934 г.н.*

Чакаем ужо, рыхтуемся, поснэ ўсё варыла, куццю. Абыкнавенна Каляды святкавалі, посціраюць у хаце, семкі шчоўкаюць бабы, куццю варылі з ячменных круп і ставілі на покуць куццю. Тады ўжо на першы дзень ідом у цэркаў. Прыходзілі і елі куццю ўжэ па тры ложкі. Кладуць абрус, кідалі ўжо пад абрус сена. Гэта сімвал добрага ўраджаю. Хадзілі калядоўшчыкі, яны мяне спалохалі, тыя калядоўшчыкі, я ўвахожу, усё ціха, а тады как загамоняць. Я іду ў сені, прышлі яны, і ўпаў казёл серад віранды, спяваюць ужо, просяць дазволу: "Ці можна вам спяваць? Я кажу: "Спявайце, наце вось вам канфет". А яны ўжо і пашлі. Варажылі на Шчадрыца перад Новым годам, 14 снежня, пойдзем да накрадзем дроў, прынясом у хату да палім.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Гурко Марыі Адамаўны, 1945 г.н.*

Хадзілі калядавалі. Бывало, ек хто быў малодшы, пабяруць гармонікі, прыбіраюцца, ідуць ужо, стукаюць, а тады ўжо паюць, гуляюць, а мы ўжо пазавём і частуем. Варылі куццю.

Калі пост, то посну варылі куццю, грыбкі варылі, рабілі квас з грыбамі да падкалочваюць яго, а ек после, то ўжэ ўсё на стол прыбіраюць, много ўсяго напрыбіраюць: і птушак, і катлетаў, і галубцэ і ўсё. З куцці было: першую вельмі посцяць, посная, другая куцця – гэта перад Новым годам, ужэ хадзілі дзяўчата і варажылі: то волава вылівалі, то спявалі. Метал бяруць, баначку з консервачкі і трымаюць на агні, каб невялікі агонь гарэў, а той метал растопліваецца, і ў місачку вады, якую набіраюць, і плюх. Тады вылъецца ўжо то маладая, то малады, то што-небудзь такое. Адна кажа: "Дай, Бог, мусіць, я памру, бо ўсё мне вылілася сплош усё чорнае".

А трэйця ўжэ куцця, тожэ посная, калядоўшчыкамі былі старыя людзі. Вот у нас е адна жанчына, яна ек захацела выпіць, то і ішла ўжо калядаваць, мужчына з гармонікам хадзіў. Узялі полушубок і зрабілі доўгага жырафа і калядавалі.

Прыдуць калядоўшчыкі і зразу спеваюць, тады гуляюць,то гармонікам іграюць, то качаюцца.

*Запісана ў в. Казлы*
*ад Карачун Марыі Сямёнаўны, 1936 г.н.*

Адзяваюцца гэта ў казу на Каляды. Бывае, з гармонікам, з музыкай, з барабанам чалавек дзесяць, ходзяць спяваюць. Хто грошы дае, хто яйца, як заўсюды давалі крашаныя, хто булку, хто калбасу. Куццю варылі перад Калядамі. Куцця гэта была ўсюды посная, канечна. Варылі, хто з ізюмам, хто з посным маслам, з сахарам. Не можна было пробваць, калі шчырым постам пасцішся. Шчыры пост – гэта як ваду свенцяць у цэркві. Нічога нельга есці. У цэркаў хадзілі, возьмеш тую вадзічку свянчоную, дык тады можна было есці, там сялёдку, кашу. Вось так і гулялі.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Галабурды Яўгеніі Уласаўны, 1934 г.н.*

Музыку рабілі, хлопцы падхадзілі, збіраліся то на хутары, то ў хаце ў нас, то ў саседа. Збіраемся, вышываем, спяваем, танцуем, тры дні гулялі Коляды. Хадзілі па вуліцы, спявалі песні. Прыхадзілі дзеці з звяздою, пелі песні. Мы ужо давалі ім калбасы, грошы давалі, цукеркі. Раней хадзілі, выдзіралі лаўкі, пераварочвалі платы, а зараз такога не дзелаюць.

*Запісана ў в. Малева*
*ад Шах Зінаіды Антонаўны, 1928 г.н.*

Варылі куццю (посную), хто з макам, хто з посным маслам. Увечары сабіраліся і ўжо елі. Потым хадзілі, спявалі песні калядныя, нам хто грошы даваў, хто каўбасу, хто цукеркі. Дзяўчаты прыбіраліся пад русалак, пелі ўвечары песні.

*Запісана ў в. Нялепава*
*ад Захарэц Ірыны Васільеўны, 1932 г.н.*

Збіраліся ўвечары, хадзілі са звяздой, перадзяваліся ў казу, спявалі песні, давалі нам сала, кілбасы, водку.

*Запісана ў в. Нялепава*
*ад Буйко Таццяны Аляксандраўны, 1923 г.н.,*
*(раней пражывала ў в. Пагарэльцы Нясвіжскага р-на).*

Увечары на Калядкі заўсёды ждалі калядоўшчыкаў. Кагда яны прыходзілі – эта было добрай прыкметай. Стукалі ў окны, пелі песні, плясалі, шуцілі. Гаспадары частавалі рознымі падаркамі: гэта былі еда, грошы, гарэлка.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Коканавай Алены Вікенцьеўны, 1940 г.н.*

У нас куццю называлі "Вегілія". Перад Рождзеством варят абычна дванаццаць блюд дванаццi апосталам. Засцельвалі белую скацерць, пад яе падкладваюць сена. Пякуць аплатак, дзеляцца друг з другам. Сабіраемся чалавек дваццаць, колькі маглі, абменьваліся аплаткамі. Жэлалі здароўя, хто што, усяго добрага жадаюць.

Сена, якое клалі на стол, азначае, што Ісус

Хрыстос радзіўся ў стайне, як у песні: не было месца ў доме.

У дзяцінстве з атцом хадзілі са звяздой. Бралі рэшата, унутры гарыць свечка, верціцца па кругу, унутры фігуркі, выразалі іх із скуры, фігуркі тожа врашчаліся. Шчадравалі вечарам, стукалі ў вокны, і хазяева ўжо знаюць, што гэта ідуць шчодрыкі. Яны пелі песні, танцавалі, весялілі. Хазяева адорвалі іх падарункамі. Было харошай прыкметай, калі прыходзілі шчодрыкі.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Коканавай Алены Вікенцьеўны, 1940 г.н.*

Калядкі гулялі звычайна пад Шчадрэц на стары Новы год. Вадзілі па сялу казу, бо гэта сімвал благапалучча, і мядзведзя, бо гэта сімвал здароўя. Паздраўлялі ўсіх з Раждзеством Хрыстовым. Усе гулянні адбываліся каля возера.

У час Калядак абвязвалі кожную яблыню саломай (верацяном) і забор. Калі праходзілі Каляды, гэта ўсё знімалі і спальвалі, каб быў харошы ўраджай і каб усё дурное выйшла з хутару.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Клышко Наталлі Яўгенаўны, 1973 г.н.*

На Калядкі хадзілі калядоўшчыкі, звычайна пераапранутыя ў казу ці мядзведзя.

*Запісана ў в. Альхоўка*
*ад Вальчык Анастасіі Іванаўны, 1927 г.н.*

Калі прыходзяць калядоўшчыкі ў хату, кажуць: “Добры вечар! Шчодры вечар, пане гаспадар! Ці спіш, ці не спіш, ці дома не начуеш? Давай святкуй нас, гападар”.

*Запісана ў в. Грыцкавічы*
*ад Камко Марыі Іосіфаўны. 1942 г.н.*

Куцця варылася тры разы, звычайна з мёдам. Ставілі яе ў чырвоны кут пад іконай, а ікона павінна быць насупраць уваходу ў хату. Калі куцця не палучалась, яе скормлівалі свінням. Увечары, калі садзіліся за стол, каб есці куццю, гаспадар чытаў малітву.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Клышко Наталлі Яўгенаўны, 1973 г.н.*

На Калядкі варылі постную куццю, яе ставілі ў чырвоны вугал, на сена.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Токар Таісы Пятроўны. 1942 г.н.*

На куццю варылі пярлоўку, клалі куццю ў чырвоны вугал. Елі постныя стравы.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Лукаш Кацярыны Іосіфаўны, 1941 г.н.*

Куццю мы варылі з пярловай кашы, ставілі яе ў гаршочку ў печку. Куцця была посная – мы не елі жырнай ежы, мясная куцця – звычайна была на Крашчэнне. Ставілі куццю пад абразамі ў чырвоны вугал. А на стол пад скацерцю ўкладвалі сена, бо Хрыстос нарадзіўся ў саломе.

*Запісана ў в. Альхоўка*
*ад Вальчык Анастасіі Іванаўны, 1927 г.н.*

Куццю варылі шостага, называлі яе “постная куцця”, а ўжо куццю, якую гатавалі трынаццатага, называлі “багатая куцця”. Гатавалі ўжо дванаццаць страў, як дванаццаць апосталаў, ставілі 12 тарэлак. Былі дранікі, картошка, яічкі жарылі.

*Запісана ў в. Грыцкавічы*
*ад Захарэц Сафіі Мікалаеўны, 1941 г.н.*

На Каляды варылася тры куцці: першая куцця – посная, яна адзначалася перад Новым годам. Яе варылі з крупаў, дабаўлялі трошкі сахару. Другая куцця – мясная, багатая, на яе варылі і елі мяса, сала і розныя прысмакі. Трэццяя куцця (па-польску) называлася “Тры каралі”. На яе ў касцёле бралі свянцоны мел і па вуглах пісалі начальныя буквы гэтых трох каралей: “К” “М” “Б” (іх звалі Каспер, Мархер і Бальтаз), а пад імі ставілі год. Гэта былі тры святыя. На куццю запрашалі блізкіх і родных. Сена і салому на Каляды лажылі пад абрус, а потым аддавалі карове, каб яна здаровая была і не палохалася.

Раней дзеці апраналіся ў касцюмы і калядавалі. Спявалі песні пра Божае нараджэнне. Потым іх віншавалі, шанавалі гаспадароў, каб усё было добра: і ўраджай, і жывёла вялася. На абрад “Ваджэнне казы” пераапраналіся хлопцы ці дзяўчаткі ў казу. Потым спяваюць песенькі і гавораць: прашу даць сала, каб каза ўстала. Моладзь дзякавалі за песні цукеркамі і давалі грошы. Раней яшчэ хадзілі шчадроўнікі: і дзеці, і дарослыя спявалі пад вокнамі. Спявалі песні, напрыклад, “Добры вечар”:

*Добры вечар як сень маці,*
*Добра здраўя ў сваёй хаце.*

*Запісана ў в. Слаўкава*
*ад Харытонавай Чаславы Баляславаўны, 1946 г.н.*





На Каляды хадзілі па хатах з казою. Нясуць звязду, вядуць казу, і хлопцы пяюць. На Каляды было 3 куцці. Куццю рабілі: бралі ступню і таўклі ячмень, а таксама намачвалі яго. Сена клалі на куток, туды ставяць куццю і абліваюць свянцонай вадою. А потым сена аддаюць карове.

*Запісана ў в. Смалічы*
*ад Хмарук Людмілы Антонаўны, 1930 г.н.*

На Каляды рабілі звязду, вадзілі казу, прыбіралі яе і вадзілі. Прасілі падаць казе, як не пададуць, то яна падае.

*Запісана ў в. Казлы*
*ад Рабко Фаіны Антонаўны, 1942 г.н.*

Збіраліся ўсе ў клубе, перадзяваліся. Была каза, мядзведзь, дзед і баба, яны былі механошы. Была звязда. Хадзілі па хатах і калядавалі. Песні пелі:

*У нядзелю рана сонейка свяціла,*
*А божая маці сына нарадзіла.*
*Каляда, Каляда, сына нарадзіла.*

Гаспадара велічалі. Паказвалі маленькі канцэрт. Казалі: “Дайце сала, каб каза ўстала”. Калі куды не зойдзеш, на нас абіжаліся. Давалі шмат пачастункаў.

*Запісана ў в. Казлы*
*ад Яраш Галіны Палікарпаўны, 1950 г.н.*

На Каляды спявалі:

*Раждэыство Хрыстова, ангел прыляцеў.*
*Он лецел па небу, людзям песню пеў.*
*Все людзі, лікуйця,*
*Сей дзень таржыствуйце,*
*Дзень Хрыстова Раждзества.*
*Пастушкі ў пячэру раньшы ўсіх прышлі,*
*У яслях на саломе Госпада нашлі.*
*Стаялі, рыдалі, Хрыста праслаўлялі*
*І мацер его…*

На Каляды рабілі маскі і перадзяваліся. Хадзілі са звяздою хлопцы і дзяўчаты, іх яшчэ называлі кукольнікі:

*Вялік святой нам дзень настаў*
*Суславіць грубага Васіля*
*Хрыстос васкрэс,*
*Хрыстос васкрэс,*
*Хрыстос васкрэс…*

Хлопцы спявалі дзяўчатам песні:

*Добры вечар, панянэчка,*
*Хрыстос Госпадствены Божы,*
*Прошу я дэнкнуць нам як канэчка,*
*Прошу дэнкнуць нам як канэчка.*
*Хрыстос Госпадствены Божы.*
*Прошу паслушаць нашу навіну,*
*Прошу паслушаць нашу навіну,*
*Хрыстос Госпадствены Божы.*
*Што й гадзіна, той і навіна,*
*Што й гадзіна, той і навіна,*
*Хрыстос Госпадствены Божы.*
*Проша, паненка, выйсці к нам на ганак,*
*Просім, паненка, выйсці к нам на ганак,*
*Хрыстос Госпадствены Божа.*
*Проша вынесці нам падарак,*
*Просім вынесці нам падарак,*
*Хрыстос Госпадствены Божы.*
*Той падарак вельмі маленькі,*
*Той падарак вельмі маленькі,*
*Хрыстос Госпадствены Божы.*
*Сорак яек сорам даць,*
*Сорак яек сорам даць,*
*Хрыстос Госпадствены Божы.*
*Да пяцідзесяткаў просім пашукаць,*
*Да пяцідзесяткаў просім пашукаць…*

*Запісана ў в. Смалічы*
*ад Міронук Ірыны Пятроўны, 1936 г.н.*

На Каляды гадалі, хто першы выйдзе замуж. Трэба было абняць забор: калі ў пары, то выйдзеш, а калі не ў пары, то не.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Аксак Ганны Мікалаеўны, 1952 г.н.*

Сыпалі кучачкі зярна, ставілі ваду ў кружцы, зеркала ставілі і пускалі курыцу з хлева. Курыца та квокча-квокча, начынае дзяўбсці першую каторую кучку, тагды мы казалі: “Ты першая замуж пойдзеш”. Калі курыца нап’ецца вады, то мужык будзе п’яніца.

Ставілі рубель: і куды ўпадзе той рубель, туды ўжо замуж пойдзеш.

Галошы кідалі цераз сарай, а тагда бегалі і забіралі.

Шчыкеты абдымалі і гаварылі: “Кол, калішчо, кавалер, удавішчо”. Шчыталі тыя калы. Як удавішчо – так за ўдаўца выйдзеш замуж.

Бралі белу бумагу, тады на белу бумагу насыплеш жменьку попелу, тады налівалі вады

ў стакан і на той попел стаўлялі ваду і кальцо залатое кідалі ў ваду. І вот ставілі зеркала, запальвалі свечку перад іконаю. Прыйдзеш у 12 часоў ночы і глядзіш у тое кальцо – а там паяўляецца чалавек.

Пяклі аладкі і на сметнік бягуць, ядуць. У якім баку сабака забрэша – туды замуж пойдзеш.

У 12 часоў ночы трэба было лезці на гору пад комін. Пасля 12 будзеш спускацца на зямлю і ўбачыш свайго сужанага.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Аксак Валянціны Міхайлаўны, 1925 г.н.*

На Шчадрэца я гадаў. Мне было шаснаццаць год. Нада было на лістках напісаць імя дзевачак, скруціць іх у круцёлачку і палажыць пад падушку. А рана, калі праснешся, узяць адну бумажку: і якое імя пападзецца, тая і будзе тваёй жонкай.

Кагда на Шчадрэца дзевачкі гадалі, прывадзілі сабаку і пяклі бліны: чэй першы блін возьме сабака, тая першая выйдзе замуж.

На вуліцы кідалі цераз галаву бацінак: у якой старане прызямліцца бацінак, значыць, у тою сторану пойдзе замуж.

Калі дзевачкі выйдуць на вуліцу гадаць: в какой старане сабака будзет лаяць, тожэ в тую сторану пойдеш замуж.

*Запісана ў в. Вайнілавічы*
*ад Кіпець Уладзіміра Рыгоравіча, 1926 г.н.*

Гадалі. Снег палолі. Слухалі, дзе сабака забрэша, туды і замуж пойдзе. Што значыць "снег палоць"? Грабеш і слухаеш, дзе сабака загаўкае.

Была, што разуецца, кідае бот чэраз плот: у якую сторану ён носікам упадзе, туды замуж пойдзе.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Захарчука Уладзіміра Міхайлавіча, 1931 г.н.*

Напарстак бралі солі, напарстак бралі мукі, напарстак бралі вады, з етаго булачку спекці трэба і з'есці. А яна ж салёна-салёна палучаецца.

*Запісана ў в. Вайнілавічы*
*ад Волкавай Марыі Уладзіміраўны, 1931 г.н.*

Перад Калядамі девушкі гадалі: "Мы ў дзярэўні сабіраліся і выцягівалі курыцу з-пад прыпячка (з-пад ніза печы). Там сядзелі курыцы і петухі, усе сыпалі зерно ў кучкі, трэба было тога петуха ці курыцу выцянуць. І тады курыца чыю кучку первую клюне, тая першая выдзе замуж.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Санько Раісы Іванаўны, 1936 г.н.*

Варажыць так варажылі. Збіраюцца дзяўчата, давай курэй брaць у хату, хочуць паглядзець, каторыя замуж перш пойдуць. Ну, курыцу прынесуць у хату. Але ж гэта рабілі там, дзе не было бацькоў, або каб была матка адна. Ну, глаўнае, каб бацькі не бачылі, таму што крычаць, то што будуць тады рабіць. Ну, пускаюць. А тады сыплюць зерне: чыё зерне курыца пераскочыць, та ўжо замуж пойдзе. А праўда гэта, ці не праўда, хто яго знае?

Мы варажылі: ну, этыя каноплі бралі, бегалі пад калодзеж, сеялі. Трэба было пры калодзежы ўкругавую абыйсці і пасеяць каноплі. Ну, тады ўжо прысніцца той дзяўчыне яе ўхажор. Ну, гэта варажылі перад Новым годам, на трынаццатае.

*Запісана ў в. Малева*
*ад Высоцкай Таццяны Сцяпанаўны, 1932 г.н.*

Варажылі на Шчадрэца. Гадалі на плоце, на каждую дошку лічылі: "Кол, калец, кавалер, удавец". Што выпадзе, то і будзе. Калі "кол" выпадзе, то ўвогуле замуж не выйдзеш.

На Шчадрэца гадалі: у якім боку брэша сабака, там і замуж выйдзеш.

*Запісана ў в. Грыцкавічы*
*ад Заяц Станіславы Іванаўны, 1944 г.н.*

Возьмите чашку с водой, бросьте в нее щепоть золы, щепоть соли, щепоть сахару, свой волос и волос любимого человека. Утром посмотрите: если ваш волос и его вместе, так и жить вам вместе, если по разные стороны чашки – быть в разлуке, утонувший волос сулит смерть.

Чтобы увидеть во сне суженого или свою судьбу, надо трижды прочитать на ночь: "Понедельник со вторником, среда с четвергом, пятница с субботою, воскресенье-удовица, какой мне сон приснится? Дай мне, Боже, того повидать, с кем мне век вековать.

Надо было молча прийти на перекресток дорог, стать на колени, 9 раз прочитать молитву "Отче наш", затем оторвать листок подорожника со словами: "Ты, святой трыпутнік, ты стаіш пры дарозе, бачыш старога і малога, пакажы мне мілога". Домой нужно вернуться молча, листок подорожника положить под подушку. Перед сном девушки призывали на помощь месяц и загадывали на суженого так: "Месяц, месяц малады, у цябе рог залаты, ты ўвесь свет абыйдзі, а мне пару знайдзі, з кім мне век векаваць, каб ва сне павідаць.

*Запісана ў в. Малева*
*ад Гацілы Алены Веньямінаўны, 1935 г.н.*

Прыносілі ў хату куру, насыпалі зерне да ставілі куру на пол: ну, і чыю горку зерня першую кура падзяўбае, тая першая замуж пойдзе.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Гадун Ядвігі Уладзіміраўны, 1929 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Лесуны Нясвіжскага р-на).*

Раней, як маладыя былі, хадзілі і перад Калядамі, і варажылі на Шчадрыца. Усё рабілі: і драва кралі, і абдымалі забор. Вось, даляталі да забора, забор колькі абнімеш, тады шчытаеш: ці будзеш парна, ці няпарна. Як сем калоў абняў – будзеш адзіночкай, не пойдзеш замуж, а як шэсць – пойдзеш, будзеш у пары.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Чычко Соф'і Рыгораўны, 1934 г.н.*

Як Сачэльнік был, то дзевушкі обязацельно гадалі. Башмачок брасалі. Платок на стол рассцілалі, ставілі зеркало, дзве свечы ставілі і міску бралі, плавілі воск і сматрэлі, какіе фігуркі вылівалі, гдзе твой сужены. Ну, потом ещё бралі поленья: пойдзёш наберёш, не шчытаеш. Еслі парное получаецца, брэвёсцікі прінесёш, под печак положыш – значыць, будзеш парай. Чэрэз дом бросалі башмакі, на картах гадалі.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Халецкай Яўгеніі Іванаўны, 1932 г.н.*

Клалі пад кравaць дошчачкі, місачку з вадою, а тады дошчачку (гэта мы мосцік рабілі, каб ішоў хлопец) і верылі, што гэта ўжэ будзе ісці кавалер, гэта во і ўжо будзе відаць, што гэта свайго кавалера ў сне ўбачыш.

Заплятaлі раніцаю косы, зарання, і ўжэ тыя валасы запляцём і не чапаем да самага вечара, а ўжэ вечарам у дванаццаць часоў бежымо пад яблыню, трэба ж гэту ленту павесіць, а тады ўжэ будзеш ведаць, што прысніш хлопца. Я прысніла хлопца, што ён ад мяне адышоў, і праўда, адышоў.

А яшчэ рабілі гэтак: перад зеркалам станавіліся мы, і тады трэба задумаць перад гэтым зеркалам. Хай яно стаіць, а самому залезці на гору ў дванаццаць часоў ночы, з гары тады злазь – і там на гары ён будзе стаяць.

Пяклі бліны, і ўжэ тыя бліны, як спячэш раніцаю, то ўжо пад вечар ідзеш на двор і ясі: ды сабака забрэша там – пойдзеш замуж туды.

*Запісана ў в. Грыцкавічы*
*ад Кандрацюк Антаніны Сцяпанаўны, 1939 г.н.*

Выходзілі ў поле і кідалі боты: куды ўпадзе, у той бок і замуж выйдзеш.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Церахавец Уладзіславы Францаўны, 1938 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Завітая Нясвіжскага р-на).*

Збяромся ўжо, паставім люстэрка, сыпалі ячмень, прыносілі пеўня ці курыцу. Курыца тая падыдзе ды ў люстэрка глядзіцца. Ставілі воду, мусіць, якая першая нап'ецца вады, тады будзе мужык п`яніца. Варожылі, хто першая замуж выйдзе. Кідалі бот праз хату.

*Запісана ў в. Грыцкавічы*
*ад Рудой Таццяны Антонаўны, 1932 г.н.*

Калі хацелі даведацца пра мужа будучага, то кідалі бліны. Дзе сабака залае – у той бок замуж пойдзеш.

Пісалі на бумажачках імёны хлопцаў усякіх, пасля клалі пад падушку, патом адну выцягвалі раніцай… так, значыць, і будуць зваць твайго мужа.

*Запісана ў в. Цякалаўшчына*
*ад Кавальчук Валянціны Вікенцьеўны, 1950 г.н.*

Гадалі на люстэрку, клалі перад ім карткі, запальвалі свечку, прыгаворвалі, каб убачыць хлопца.

*Запісана ў в. Малева*
*ад Шах Зінаіды Антонаўны, 1928 г.н.*

Пускалі курэй праз парог, сыпалі зерне ў кучачкі: чыю першую пойдзе есці, тая дзяўчына першая пойдзе замуж. Падпальвалі бумагу на тарэлке, калі бумага згарала, то глядзелі, што будзе.

*Запісана ў в. Малева*
*ад Акулік Галіны Уладзіміраўны, 1947 г.н.*

Яйцо перакідалі цераз хату, куды ляжа

туды і дарога да сужанага. Кідалі праз вароты боты: у які бок пакажа нос, туды і пойдзе дзеўка замуж.

*Запісана ў в. Нялепава*
*ад Захарэц Ірыны Васільеўны, 1932 г.н.*

Пяклі булачкі, пускалі сабаку: чыю першу булачку з'есць, тая перша выйдзе замуж.

*Запісана ў в. Нялепава*
*ад Буйко Таццяны Аляксандраўны, 1923 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Пагарэльцы Нясвіжскага р-на).*

Гадалі на люстэрку. Паставілі люстэрка часам познім, свечкі запалілі і глядзелі, калі замуж выйдзеш, значыць, будзе малады выхадзіць, дык ад гэтага аж струпянееш. Нядобра, калі ты адна, але ж добра, калі дзяўчат шмат побач. Сядзіш і прыгаворваеш: "Суджаны, мой раджаны, прыхадзі закурыць". Кладзешся спаць і ня можна гаварыць, дык будзеш бачыць суджанага, хто прыдзе, будзе браць газету ды папяросу рабіць.

*Запісана ў в. Кіркаўшчына*
*ад Роўбы Тамары Емяльянаўны, 1938 г.н.*

Лепей гадаць там, дзе няма людзей, дзе ніхто не жыве, на чардаке, нада распусціць валасы, зняць пояс. Гавораць: "Суджаны, раджаны! Прыхадзі да мяне ўжынаць!" Потым з'яўляецца суджаны. Нужна сказаць: "Чур меня!" Ён знікне. Калі не скажаш – бяда будзе. Яшчэ гадаюць на ліст бумагі: дзержаць гэты ліст, а потым глядзяць ужо на цень. Што ўбачыш, тое і будзе. Уноч на Новы год дзеўкі ідуць да амбара ці кладавой: глядзяць у скважыну замка ды гавораць: "Чэрці, чэрці, не ўтаіце, мне мілага пакажыце".

*Запісана ў в. Лань*
*ад Галабурды Яўгеніі Уласаўны, 1934 г.н.*

Ліюць расплаўлены воск у ваду, загадываюць суджанага ці сваю судзьбу. Глядзяць на воск: у якую форму адальецца, тое і будзе. Калі ўбачыш труну – значыць, суджано ўмерці, а калі вянок – дык выйсці замуж. Дзеўчына кладзе пад пасцель мацеры скавародку, ды так, каб яна не ведала, ды кажа: "Суджаны-раджаны, прыдзі да цёшчы бліны есці". Калі маці прысніцца, што яна частуе блінамі якога-небудзь хлопца, то ён і будзе суджаны яе дачкі.

*Запісана ў в. Нялепава*
*ад Сафівулінай Еўфрасінні Васільеўны 1941 г.н.*

На Шчадрэц гадалі ўсю нядзелю. Ставілі стакан з вадой, надзявалі на нітачку залатое кальцо, дзёргалі над вадой: колькі раз кальцо стукне аб стакан у столькі год ты выйдзеш замуж. Бярэш ахапку пален: калі цотная колькасць пален, то выйдзеш замуж у гэтым годзе. Чэраз дом кідаеш обувь: у якую сторану нос паказвае, адтуль і прыйдзе жаніх. Нанач ставяць пад кравацць таз з вадой, каб прысніўся жаніх.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Клышко Наталлі Яўгенаўны, 1973 г.н.*

Перад Раждзеством девушка пад падушку ложыт кальцо, куклу, манету, соль. Кукла азначае, што будзе внебрачны рэбёнак, кальцо – замуж выйдзе, манета – багатства, соль – беднасць. На Раждзество абнімают забор: еслі цотнае чысло – выйдзе замуж у гэтым годзе. Девушкі насыпаюць па кучцы зярна: чыю першую кучу пачне клюваць курыца, тот первый замуж пайдзёт.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Габрыновіч Людмілы Мікалаеўны, 1952 г.н.*

На лаву клалі піражкі (сладкія, пышныя). Пускалі сабаку, перад гэтым добра накормяць яе. Калі сабака возьме піражок і ты паклала яго пад ікону, то гэты чалавек, чый быў піражок, скора памрэ, а калі на парог, то будзе ўсё добра.

*Запісана ў в. Грыцкавічы*
*ад Камко Марыі Іосіфаўны, 1942 г.н.*

Маладыя дзяўчаткі вадзічку ставілі пад кравацць і лажылі там лучынку – "кладачку". І сніцца, што яе хтосьці пераводзя цераз гэту кладку, значыць, за таго яна замуж пойдзя. Выходзілі ўвечар на двор і абдымалі плот: як абдымеш да пары, то будзеш у пары. Дзяўчаты пяклі аладачкі маленькія, і каждая клала на палу. Прыводзілі сабаку: і чыю сабака першую з'есць, тая і першая выйдзе замуж. Дзяўчаткі выходзілі на двор і кідалі сапожкі: у якую сторану ён упадзе носам, туды і пойдзеш замуж. Выходзілі на двор і слухалі: у якой старане брэша сабака, туды і замуж пойдзеш. Яшчэ сеялі каноплі ў студні і гаварылі: "Свёнты Андрэй, канопельку сей, дай, Божа, знаць, з кім буду век векаваць". І прысніцца жаніх.

*Запісана ў в. Слаўкава*
*ад Харытонавай Чаславы Баляславаўны., 1946 г.н.*





Бралі зеркала і залазілі на гору (у хаце). І прыгаворвалі нейкія словы. Дровы лічаць. Выходзіш, абдымаеш дровы: калі пападзе пара, то будзеш у пары.

*Запісана ў в. Смалічы*
*ад Хмарук Людмілы Антонаўны, 1930 г.н.*

Дзяўчаты абдымалі плот. Калі абдымеш чотнае, то будзеш у пары, а калі не чотнае, то за гэты год замуж не выйдзеш. Курэй ставілі пад печ'ю, цягалі куру ў хату за хвост. Калі кура крыклівая, то свякроў будзе сварлівая. Рабілі галушачкі з цеста, і кожная сваю кідала, хто першы ўхопіць, той першы замуж пойдзе. Гадалі на свечках. К 12 часам ночы, штоб было ўжо цёмна, яны з маім братам прыходзілі к нам, мяне выганялі з хаты. Ставяць 2 зеркалы, запальваюць 2 свечкі – паказваецца сілуэт. Замыкалі калодзеж, ключ ложаць пад падушку. У ва сне к табе прыходзіць сужаны і просіць ключа, каб адамкнуць калодзеж. Клалі міску, бралі ваду, лілі і лажылі лучынку на ваду і ставілі пад кравацць. Сон прысніваўся, што прыходзіў суджаны і прасіў: дай руку, перавядзі мяне чэраз кладку. Пяклі бліны і на сметнік ў канцы вуліцы высыпалі. Спячэ мама першы блін, і было патрэбна бегчы на той сметнік і слухаць, у якім баку забрэшаць сабакі: у яком баку забрахаў сабака, значыцца, у той бок пойдзеш замуж. Кідалі чэраз вароты бахіл гэты: у які бок носікам пакажа, туды і замуж пойдзеш. І дровы насілі, у суседзяў кралі. Набіралі бярвенне дроў, не лічачы, і прыносяць, лічаць: пара ці не пара.

*Запісана ў в. Смалічы*
*ад Міронычык Ірыны Пятроўны, 1936 г.н.*

Гадала я раз ў абшчажыціі: спекла блінец, палажыла на жывот і пабегла па карыдору: заўхоз встрэціўся, такі маленькі, худзенькі, точна як мой муж, і я не пыталася, я і так знала, што завуць яго Аркадзій (майго мужа звалі Аркадзій).

*Запісана ў в. Лань*
*ад Атрошчанка Анастасіі Аляксееўны, 1929 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Карма Добрушскага р- на).*

## Вадохрышча

Ваду бралі ды прыносяць дадому. Сахранялі гэту ваду.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Акулік Марыі Уладзіміраўны, 1944 г.н.*

Ваду свянцілі. Бацюшка прыходзіць, ходзіць па хатах, свянціць іх. Пырскалі вадой хату, хлявы, штоб добра было. Хто ваду п'е, каб здароўе было.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Антановіч Веры Валяр'янаўны, 1933 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Альхоўка Нясвіжскага р-на).*

На Вадохрышча абавязкова ваду свянцілі. Калі гэту ваду прыносілі дамой, то ёй крапілі хату і ставілі яе ў куток. Пользаваліся ёй у час хвароб.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Бабко Ірыны Васільеўны, 1946 г.н.*

Святкуюць Вадохрышча абычна. Ходзяць у цэркву, ваду свенцяць, а потым гэтай вадой хату акрапляюць, п'юць для здароўя.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Гадун Алены Вікенцьеўны, 1924 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Каменка Нясвіжскага р-на).*

У нас на Крашчэнне свенцяць свечкі тады і малююць хрэсцікі на ўхадных дзвярах, госці абычно ехалі ж на Крашчэнне і на Ушэсце.

*Запісана ў в. Вайнілавічы*
*ад Волкавай Марыі Уладзіміраўны, 1931 г.н.*

Хрышчэнне – гэта вялікае свята. Бацюшка ходзіць і свенціць кожную хату. Хрышчэнскай вадой я свянчу хату і сама п'ю гэту ваду, калі мне плоха, і на сябе лью. Некалі рысавалі хрэсцікі на хатах, сараях.

*Запісана ў в. Вайнілавічы*
*ад Камлач Яніны Валянцінаўны, 1936 г.н.*

Хрышчэнне – гэта 19 февраля, "Тры каралі" называюць. Хадзілі і воду крэсцілі, і цяпер ходзяць. З цэркві прыдуць ды п'юць ваду, патом сядзяць. Дзяўчаты гадалі. Лазілі на гору. У нас адзін хлопец лазіў. Любіў адну дзеўку, а яна не хацела за яго, дык ён залез на гару і запаліў свечку і сядзіць. Вот яна ідзе ў зеркалі. Ён тады закрыў зеркала, бо кажа, каб не закрыў, дык было б дрэнна яму. Праўда, ён ужо памёр, а яна жыве яшчэ. Гадалі тожа і калі шчыталі забор, і каля калодзежа. А вось я і сама гадала. Брала міску і ваду, паленца кладзеш такое, як кладку, і гаварыць нічога не трэба. Падложыш пад кравацць ужо і сніш. Калі ён перавёў цераз рэчку, то гэта, кажуць, абязацельна пажэнішся з ім. Яшчэ мы, калі былі маладыя, гадалі. Я яшчэ і не думала.

Ён за мяне старэйшы, дык я пасмяялася, ды і ўсё, а потым во прыйшлося што. Пісалі яшчэ запіскі, пад голаву клалі, пісалі імена. І тожа я напісала і пад падушку паклала. Рана ўстала і выцягваю. І я выцягнула запіску з імем свайго мужа. Ваду, што свянцілі на Хрышчэнне, п'юць, хаты свенцяць.

*Запісана ў в. Вайнілавічы*
*ад Кароль Ніны Вячаславаўны, 1937 г.н.*

На Крашчэнне святкавалі ўсе. Хадзілі ў цэркву. Свянцілі ваду. Дамоў неслі. Я яе ўтрам тры раза глыну патрошкі, а так хату свенцім. К нам бацюшка прыязжае з Нясвіжу. Свечачку ставілі ў стакан, зярна насыпалі і свечачку ў кожну комнату ставілі. Пасля Крашчэння, як выпісваем каляду на паследнюю куццю, то тагда малюем крыжыкі на дзвярах, выносім кашу і снапок той ў хлеў і вадой свянцонай пасвенцім у хляве ўсюду.

*Запісана ў в. Карцэвічы*
*ад Крыўко Наталлі Мікалаеўны, 1934 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Малева Нясвіжскага р-на)*

У цэркву пойдзем, вады свянцонай набяром. Хату пасвенцім усю, сараі пасвенцім. Тры крыжыкі намалюем на дзвярах, у хаце і ў сараі намалюем, дзе скаціна стаіць.

*Запісана ў в. Карцэвічы*
*ад Цвірко Алены Пятроўны, 1941 г.н.*

Сараі вадой пырскалі, у хаце пырскалі свянцонай вадой. Доўга вада зімой хранілася, а вясной прытухне, горача ж.

*Запісана ў в. Карцэвічы*
*ад Усовіч Надзеі Максімаўны, 1947 г.н.*

На Вадохрышча мы едам у цэркву. Молімся там і бяром свянцоную ваду. Потым едзем дадому. Гэтай вадой асвяшчаем хаты і хлеб.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Верамейчык Ядвігі Мікалаеўны, 1958 г.н.*

На Крашчэнне ваду у цэркве свенцяць. Тады ўжо калі пасвенцяць воду, ідом дадому. Пасвенціць трэба сарай, тады ідзем у хату. Самі возьмем і свенцім. Астатняя вада стаіць дальшэ. Бывае, што ў чалавека якая хвароба, вот саветуюць свянцоваю вадою ці абмыцца, ці папіць гэтай вады. Вада гэта будзе стаяць год, іна ніяк не спорціцца. Рысавалі свечкамі крэсцікі на дзвярах, асмальвалі іх.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Кавальчук Аляксандры Паўлаўны, 1931 г.н.*
*(раней пражывала ў в.Садовая Клецкага р-на).*

Ваду (а як жа) свянцілі. Прыносяць у бутылку дамой. У хаце стаіць гэта вада. Бацюшка ходзіць і свенціць.

*Запісана ў.в. Альбянка*
*ад Гібчык Юзэфы Францаўны, 1931 г.н.*

Надо, як лёд прабіваюць на Хрышчэнне, благаславіць. А як жа, у нас ваду свяцілі. Перад ядою выпіваюць. Прыходзяць дадому, дзеткам падстрыгаюць валасы, благаслаўляюць ею на здароўе.

*Запісана ў в. Альбянка*
*ад Шумейкі Ядвігі Міхайлаўны, 1929 г.н.*

## Масленіца

На Масленіцу бліны пякуць, карагоды водзяць, пяюць, гуляюць.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Раманоўскай (Богдан) Ніны Сцяпанаўны, 1946 г.н.*

Масленіца гэта блінная. Каталіся на конях. На Масленіцу надо было чем дальшэ праедзеш, цем лучшэ будзет лён. Каталісь па дзеревне, па хутарам. Счыталось: к каму в госці заходзіш, у таго лучшэ будзе лён.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Дзішук Галіны Марцінаўны, 1938 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Качановічы Нясвіжскага р-на).*

Святкавалі Масленіцу. У калхозах ездзілі на доўгі лён на канях. Можа, і цяпер хто ездзя.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Гадун Алены Вікенцьеўны, 1924 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Каменка Нясвіжскага р-на).*

На Масленіцу робяць усё: і бліны пякуць, і купаюцца, і маржуюцца.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Бабко Ірыны Васільеўны, 1946 г.н.*

Гавораць, што Масленіца масліць альбо размасліць зіму. Бліны пяклі. Тройкі коней у нас ездзілі.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Антановіч Веры Валяр'янаўны, 1933 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Альхоўка Нясвіжскага р-на).*

Дома пеклі бліны, гадалі, пад вокнамі хадзілі. Слухалі: а хто ідзе, а хто сядзіць. Яшчэ на Масленіцу вясну гукалі. Бывала, што і гадалі: штыкеты абнімалі. Нашчытаеш, з парай ці без пары будзеш. Спраўдзілась.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Шусты Марыі Антонаўны, 1940 г.н.*

На Масленку запрагалі коней у каго е. Ездзілі, песні спявалі.Чучала не палілі.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Кавальчук Аляксандры Паўлаўны, 1931 г.н.*

Масленіцу праводзілі, былі гулянні, вось дзе-небудзь і коні прыбраныя такія былі, павозкі такія ўкрашаныя, ігры арганізаваныя былі, каталіся на лыжах, бліны пяклі, праводзіліся саравнавання.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Салавей Марыі Міхайлаўны, 1947 г.н.,*
*Чыжык Соф'і Міхайлаўны, 1939 г.н.*

Масленіцу гулялі дзе-то, можа, у марце. Раньшэ ездзілі на конях і ўжо пелі песні ў дзярэўні. Дзе дзяўчына была, заязжалі ў двор, жэлалі, каб замуж вышла, каб дома ўсё было.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Салавей Ірыны Іосіфаўны, 1933 г.н.*

Спраўлялі ў нас Масленіцу, называлі "Улассе". Тады да абеда па хазяйству што справіліся. А после абеда запрагалі коней, надзяваліся такія званочкі, каторые называюцца "шанкі" і з гэтымі званочкамі ездзілі ў госці, ездзілі на сяле.

*Запісана ў в. Грыцкавічы*
*ад Заяц Станіславы Іванаўны, 1944 г.н.*

Ну, Масленіцу адзначалі. Запрагуць каня да насадзяць ужо дзяўчат і хлопцаў. І каталіся на доўгі лён. Ну, а тады бутылку паставяць і вып'юць, і паспяваюць, і патанцуюць. Ну, некалі так было, яшчэ як у маю маладосць было.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Чычко Соф'і Рыгораўны, 1934 г.н.*

Запрагалі на Масленіцу каня і ездзілі па сяле. Званкі прыцэпляюць на шыю каню і спяваюць.

*Запісана ў в. Малева*
*ад Каладзінскай Валянціны Фёдараўны, 1931 г.н.*

На Масленіцу на кані ездзілі, каня запрагалі ды на кані том едзе брат старэйшы, каталіся.

*Запісана ў в. Грыцкавічы*
*ад Кандрацюк Антаніны Сцяпанаўны, 1939 г.н.*

Гэта ў нас Масленіцу "Улассе" называлі ўжо. Гэта ўжэ на Улассе запрагуць каня і ўжо едуць, насядуць, хто ў госці куды, а хто і так сядуць, каб лён вялікі рос. Аб'ехаць трэба па полі ці па сяле. Пяклі бліны таксама.

*Запісана ў в. Грыцкавічы*
*ад Рудой Таццяны Антонаўны, 1932 г.н.*

Гэта Маслёнка наша. Мы пячом бліны. У нядзелю людзі просяць прабачэння ў сваёй радні, гэты тыдзень называюць "прашчонная нядзеля".

*Запісана ў в. Лань*
*ад Базарнавай Марыі Ігнацьеўны, 1922 г.н.*

Пачынаем Масленіцу празнаваць ў чацвер. Абавязкова п'ем гарэлку, пячом бліны, гаспадар разразае стопку бліноў крыж-накрыж. У бліны кладуць тварог, палліваюць малаком. Яшчэ ставяць на стол верашчаначку, гэта каўбаса, кавалкі курыцы і свініны, якія пасыпаюць мукой. Рабілі халадзец із ушэй парасяня. Калі наступае нядзеля, ядуць малочную ежу: малачко, сыр, тварог. Посуд моюць вельмі хораша, каб ён сняркаў. Прыбіраюць хатку. Моладзь спявала на качэлях.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Скрыцкай Марыі Аляксандраўны, 1940 г.н.*

Ох! Моладзь ўжо на Масленку гуляе! Хлопцы бегаюць з калодкай, гэта такое маленькае палена на вяроўцы. Калі ў хаце была дзяўчына незамужняя, калодку давалі як выкуп. У хаце частавалі гарэлкай і капустай.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Жукоўскай Зоі Аляксандраўны, 1933 г.н.*

Калісьці у нас рэчка была. І вельмі многа лёду. Заўсёды хлопцы станавілі такі бальшы столб. Да гэтага сталба рабілі такія кольца, каб яны круціліся. Некалі ж не было саначкаў, некалі рабілі самі саначкі. "Брычка" яны называліся: бо вялікія санкі рабілі, каб ездзіць. Трэба ж было дровы вазіць. І тады ужо на Масленіцу збіраемся ўсе, песні паём. Хлопцы запраглі коней, да на тых конях ездзілі на масленіцу далёка-далёка, каб лён вялікі быў.

Нарочна хлопцы яшчэ возьмуць і перавернуцца, каб мы ў гурбу паваліліся. Такія гулянні былі. Вельмі нам весела было.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Дзяніщчык Неанілы Ільінічны, 1937 г.н.*

А Масленіца, ну, ездзілі ж на конях, запрагалі і ездзілі дзе-нібудзь у госці. Абычно ў чацверг была Масленіца перад Вялікім пастом (на доўгі лён). Казалі: “Чым далей паедзіш, значыт, будзет лён расці, дужэйшы лён будзе”. Ну, палілі чучала, яго спальвалі на Масленіцу. Яго спальвалі – гэта значыць, злога духа праганялі. І вакруг гэтага чучала і кастра спявалі, танцавалі, патаму шта гэта паследнія дні, дзе можна танцаваць, а там ужо Вялікі пост наступае – сем нядзель.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Падгайскай Вольгі Дзям’янаўны, 1930 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Лань Нясвіжскага р-на).*

От после Каляд ідзе Мясаед. Як Пасха ранняя, то малы Мясаед, а як позняя Пасха, то вялікі Мясаед. Вот тады як прыпадзе, у Мясаед гуляюць, жэняцца і ўсякія дзень раждзенія гуляюць. А ў вялікі пост ужо нічога не спраўляюць. Масленка наступае, калі канчыцца Мясаед. Едуць на канях. Ужо ні песен, ні танцаў, нічога ў вялікі пост не рабілі. А тады ўжо Пасха прыйдзе.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Драчан Ірыны Міхайлаўны, 1933 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Альхоўка Нясвіжскага р-на).*

Святкавалі Масленку, каталіся вот, снегу было яшчэ многа, коні былі свае, важэчкі былі. І ўжо хочаш пакатацца, каня запрог і катайся. У гуньку харошу засцілалі цвяты і каталіся на Масленку. Бліны пяклі, гадалі на іх. Я і сама гадала. Кладзем мы там нейкія пісулькі, усякае такое эта во і гадалі. Халоднае гатавалі, знаю. Ну, сёння Масленіца, давай вып’ем, давай тое. Вот такія і святы былі ў нас, галубачкі мае.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Шынгель Наталлі Віктараўны, 1930 г.н.*

Некалі (мы яшчэ малыя былі) тата нас ужо на санях вазіў. Коні ж былі тады свае, сані былі, то ўжэ на доўгі лён на Масленіцу вазіў. На “доўгі лён” – гэта значыць, каб лён высокі рос, гэта важна было на доўгі лён праехацца. Нас траіх было ў таты дзяцей, і далекавата мы праехалі, і нас усіх тата ў снег абярнуў.

*Запісана ў в. Альбянка*
*ад Санько Марыі Канстанцінаўны, 1926 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Карцэвічы Нясвіжскага р-на).*

Бліны пяклі, канешна, пудзіла палілі, палілі кастры, варажылі на першым бліне: як лажышся спаць, кажаш: “Дай, Божа, сасніць…”. А ўжо як самастаяцельныя жылі з мужыкамі, то ўжэ не варажылі, нічога не рабілі.

*Запісана ў в. Альбянка*
*ад Валчок Сафіі Ігнацьеўны, 1935 г.н.*

Ну, на Масленіцу ўсе ж на конях ездзілі, там і маладзёж, і хлопцы, і дзяўчаты, так на конях ездзілі, бліны пяклі, угашчалі ўсіх блінамі. Пудзіла палілі на Масленіцу. Калі пудзіла палілі, то, можа, гэта значыла, што гэта ўжэ вясна наступае.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Хоміч Ганны Сцяпанаўны, 1944 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Каменка Нясвіжскага р-на).*

На Масленіцу едуць у Нясвіж, ездзяць на конях тамака. Я не была ні разу. Бліны пякуць на Масленіцу.

*Запісана ў в. Цякалаўшчына*
*ад Кавальчук Валянціны Вікенцьеўны, 1950 г.н.*

Ешчэ ек снег, то некалі гэтак было: каня запрагалі да кругом па вёсцы ездзілі, каб доўгі лён рос на Масленіцу. То качаюцца, то спяваюць.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Шынгель Ганны Іванаўны, 1934 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Смалічы Нясвіжскага р-на).*

На Масленіцу вазіліся, запрагалі каней, садзіліся на воз і каталіся. Пяклі бліны, гадалі, запальвалі чучала, праганялі зіму.

*Запісана ў в. Нялепава*
*ад Буйко Тацціны Аляксандраўны, 1923 г.н.*
*(пражывала раней у в. Пагарэльцы Нясвіжскага р-на).*

На Масленіцу спявалі песні, бабы крычалі на гарэ: “О-го-го-о-о”. Пякліся розныя бліны, варылі мачанку, усіх частавалі.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Тачылы Віталія Міхайлавіча, 1962 г.н.*

На Масленіцу пяклі бліны цэлы тыдзень, кожны дзень ці з новай крупы, ці з рознымі начынкамі. Ездзілі па вёсцы на кані, каб лён доўгі рос.

*Запісана ў в. Альхоўка*
*ад Вальчык Анастасіі Іванаўны, 1927 г.н.*

На Масленіцу хадзілі з гармонікам, спявалі песні гучна вельмі, пеклі бліны.

*Запісана ў в. Альхоўка*
*ад Драчан Надзеі Міхайлаўны. 1932 г.н.*

На Масленіцу пеклі бліны пшанічныя, мучныя, картофельныя. Угашчалі ўсіх.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Габрыновіч Людмілы Мікалаеўны, 1952 г.н.*

Заўсёды Масленіца была перад Пасхай (у марце). У вёсцы нашай не святкуюць.

*Запісана ў в. Слаўкава*
*ад Харытонавай Чаславы Баляславаўны, 1946 г.н.*

У вёсках на Масленіцу запрагалі коней (тройку), і моладзь садзілася ездзіць з горкі. Упрыгожвалі коней вяроўкамі красівымі. Спявалі песні. На провады зімы пугала палілі.

*Запісана ў в. Казлы*
*ад Рабко Фаіны Антонаўны, 1942 г.н.*

## ВЕСНАВЫ ЦЫКЛ

### Гуканне вясны

Птушачак выпякалі з цеста. Угашчалі дзетак імі. У лес гукаць вясну не хадзілі і касцёр не палілі, а чучала спальвалі.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Бабко Ірыны Васільеўны, 1946 г.н.*

Як яшчэ маладыя былі, то забіраліся высока, спявалі песні.

*Запісана ў в. Карцэвічы*
*ад Крыўко Наталлі Мікалаеўны, 1934 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Малева Нясвіжскага р-на).*

Усяк гукалі вясну, пелі: “Вясну чую,// Вол бушуе,// Вясну чуе.// Воран крача,// Сыра хоча.// Дзяўчо плача,// Сына хоча”.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Драчан Ірыны Міхайлаўны, 1933 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Альхоўка Нясвіжскага р-на).*

Рысавалі жураўлікаў і птушачак выпякалі, вучылі песні, заклічкі, у поле выходзілі і крычалі, падымалі свае жавараначкі, піражкі, што мамы ім выпякалі. Бралі дзяўчыну на ролю вясны, адзявалі яе, вяночак рабілі, спявалі песенку, песню вясны. Карэта была, на карэце зіма едзе, вязуць чучала зімы.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Шынгель Ганны Іванаўны, 1934 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Смалічы Нясвіжскага р-на).*

### Грамніцы

Празнавалі, гэта ж празнік вялікі. Прыказкі гаварылі: “На Грамніцы нап’еццa певень з лужыны вадзіцы, як нап’еццa на Грамніцы певень з лужыны вадзіцы, то на Юр’е вол наесца травіцы”. Пацеры гаварылі: “Госпадзі Ісусе Хрысце, сыне Божы, малітва радзі Прачыстае Мацеры, усіх святых, памілуй нас”. Тры разы гэта гавораць. Молімся і свечачку запалім. Свечку бяром на Грамніцу, на гэты год узяла, на наступны год іду ў цэркаў і зноў куплю свечку сабе. Печку палілі.

*Запісана ў в. Жанкавічы*
*ад Карачун Леаніды Уладзіміраўны, 1932 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Доўкінды Нясвіжскага р-на).*

Пагаворка ў нас такая была: “Як на Грамніцы нап’еццa певень вадзіцы, то на Юр’е карова ўжо травы наесца”. Абязацельна свечку свянцілі, мы і цяпер свенцім. Як граза бальшая, маланка сільная і гром – запальвалі свечку.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Акулік Марыі Уладзіміраўны, 1944 г.н.*

Бралі свянцонаю свечку, ёй на хатах крыжыкі малявалі. После Грамніц гэту свечку ставяць у вугалок і, лічылі, што яна ахраняе дом от голада і зла. Калі былі дажджы, тожа палілі свечку.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Гадун Алены Вікенцьеўны, 1924 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Каменка Нясвіжскага р-на).*

Грамніцы – палавіна зіміцы. Гэта 15 февраля. Жанчыны ходзяць у цэркаў і атмячаюць жа празнік гэты. Свечку запальвалі пры грозах.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Захарчука Уладзіміра Міхайлавіча, 1931 г.н.*

Свечку прыносілі. Палілі яе некаторыя, як быў гром.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Пасацкай Надзеі Міхайлаўны, 1924 г.н.*

Ну, свечкі, гавораць, шо як на Грамніцы запаляць, ды як трашчаць свечкі, то граза будзе, а як гараць ціхонько, спакойно, то, кажуць, не будзе. А як граза была, то запальвалі. Ды і цяпер жа мы грамнічныя свечкі запальваем.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Сінькевіч Вольгі Віктараўны, 1927 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Каменка Нясвіжскага р-на).*

Свечкі на Грамніцы свенцяць. Эта очань бальшы празнік, очань. Як грыміць гром, так бралі свечкі, ні так страшна было. Як ходзяць па каляде, так тожа запальваюць гэтыя свечы. Ну, так для спакою ў доме былі свечкі. Як памёр чалавек, свечкі палім. Малому дзіцяці пойдзеш і запаліш свечачку, абрэжаш 3 рады валосся і падпаліш іх.

*Запісана ў в. Вайнілавічы*
*ад Камлач Вольгі Іванаўны, 1934 г.н.*

На Грамніцы свяцілі свечкі ў цэркве, а потым дома рысавалі хрэсцікі на ўхадных дверах. Свечкі, як грыміць, палілі, спасаюць, кажуць, ад грому, закон быў такі, я і цяпер з дзяўчынай палю, калі так страшна грыміць.

*Запісана ў в. Вайнілавічы*
*ад Кароль Ніны Вячаславаўны, 1927 г.н.*

Грамніцы – палавіна зіміцы. Грамнічныя свечкі, калі гром, так запальваем.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Антановіч Веры Валяр'янаўны, 1933 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Альхоўка Нясвіжскага р-на).*

Усе свечкі куплялі грамнічныя. Прыйдзем і ў хаце папалім, ды і ўсё. Як грыміць, дык запальваем. Ці пакойніку, у хаце хто памрэ, так давалі свечку.

*Запісана ў в. Карцэвічы*
*ад Цвірко Алены Пятроўны, 1941 г.н.*

Абычна, як грыміць, паляць у хаце свечкі.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Лях Марыі Сільвестраўны, 1943 г.н.*

Грамніцы – палавіна зімніцы. Ездзілі ў цэркаў. З цэрквы прыедзем, усё там паядзім, паабедаем. Святкуюць, нічога ні робяць. У цэркві абязацельно куплялі свечы, грамнічныя свечы, это абязацельно куплялі. Куплялі ў запас. Ставілі ў цэркві і дадому іх куплялі. Прыносім свечы тады, калі моцна грыміць. Тады запальваем свечку.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Кавальчук Аляксандры Паўлаўны, 1931 г.н.*

## Соракі

Гэта было 40 мучанікаў: павесілі каго, каго закапалі. Посныя піражкі пяклі.

*Запісана ў в. Вайнілавічы*
*ад Камлач Вольгі Іванаўны, 1934 г.н.*

Некалі гаварылі, што кто-та мучаўся сорак дней. І гэта ўжэ назвалі так: празнік сарака мучанікаў. Пяклі піражкі.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Кавальчук Аляксандры Паўлаўны, 1931 г.н.*

## Благавешчанне

Старыя людзі казалі, што на Благавешчанне нават валасы расчэсваць не можна. На Благавешчанне нічога-нічога не можна рабіць. Да Благавешчання ніхто нічога на агародах не рабіў.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Акулік Марыі Уладзіміраўны, 1944 г.н.*

Гавораць, што да Благавешчання пташка гнязда не ўе.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Пасацкай Надзеі Міхайлаўны, 1924 г.н.*

9 апрэля ў нас Благавешчаніе. А чём эта назва свята гаварыт. Эта плахой празнік, эта прышла народу благая весць, какая-та бяда. Вот і пашло слова "Благавешчаніе". У народзе гаварят, што пціца гнязда не в'е.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Захарчука Уладзіміра Міхайлавіча, 1931 г.н.*

Благавешчанне – гэта вялікі празнік. Кажуць, што рабіць нічога нельзя. Нельзя расчэсвацца дзяўчыне. Я ўжо старалася не расчэсвацца, бо калі будеш расчэсвацца, то куры выграбуць што-небудзь на агародзе, можа і праўда яно. А яшчэ на Благавешчанне птушка гнязда не ўе.

*Запісана ў в. Вайнілавічы*
*ад Кароль Ніны Вячаславаўны, 1927 г.н.*

На Благавешчанне пташка гнязда не ўе, гэта ж празнік вялікі. У свята нельга працаваць.

*Запісана ў в. Вайнілавічы*
*ад Камлач Яніны Валянцінаўны, 1936 г.н.*





Птушка гнязда не в'е. Не трогалі зямлю ў нас да Благавешчання.

*Запісана ў в. Вайнілавічы*
*ад Запольскага Валянціна Валянцінавіча, 1957 г.н.*

Пціčка гняздечка не завівае, а дзевачка валосікаў не расчосвае. Таму ўжо вечарам рашчэшымся, платочак завяжам, каб не лезлі валасы. Стараемся не трогаць зямлю да Благавешчання.

*Запісана ў в. Вайнілавічы*
*ад Камлач Вольгі Іванаўны, 1934 г.н.*

Благавешчанне было 25 марта. Сеялі рассаду. Капусту сеялі. На Благавешчанне зярно вырасце. Благавешчанне – вялікае свята.

*Запісана ў в. Альбянка*
*ад Гібчык Юзэфы Францаўны, 1931 г.н.*

Благавешчанне бывае 25 марта. Ну, это тожэ бальшой празнік Мацер Божай, ён атмячаецца. На Благавешчанне дажэ птушка гнязда не ў'е. Гэто грэх. Да Благавешчання землю не трогалі. Пасля Благавешчання пачынаюць капаць.

*Запісана ў в. Альбянка*
*ад Шумейка Ядвігі Міхайлаўны, 1929 г.н.*

## Папяльцовая нядзеля

Перад Паскай, як пачынаецца пост у праваслаўных у панядзелак, а ў католікаў у срэду, у касцёле з вярбы паляць попел і пасыпаюць галавы, гэта значыць пачынаецца пост.

*Запісана ў в. Слаўкава*
*ад Харытонавай Чаславы Баляславаўны, 1946 г.н.*

## Вербная нядзеля

Ё Вербніца. Насілі вярбу ў цэркаў свянціць. Прыбіраем яе ды ўсё. А потым вісіць каля іконкі. Кажуць, трэба іх паліць потым.

*Запісана ў в. Карцэвічы*
*ад Цвірко Алены Пятроўны, 1941 г.н.*

Хадзілі ў цэркву вярбу свянціць, а потым гэту ветачку сахранялі. Гэтай вярбой першы раз скот выганялі. Гэтай ветачкай людзей білі і гаварылі: "Не я б'ю – вярба б'е, будзь здароў на сто год".

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Гадун Алены Вікенцьеўны, 1924 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Каменка Нясвіжскага р-на).*

На Вербную вярбу насілі свяціць, а патом ставілі яе за іконай, цяпер у нас у вазе стаіць. Гаварылі, што гэтай вярбой, старой вярбой (яна ж астаецца кожны год) першы раз выганяюць кароў. У поле, як выганяеш, гаварылі: "Не я б'ю, вярба б'е".

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Акулік Марыі Уладзіміраўны, 1944 г.н.*

Едзем у цэркву на Вербніцу. Вярбу ставілі, каб распусцілася. Убіраем яе ў кветачкі, суконныя ніткі. І калі ўжо рука баліць так навязвалі на руку. Свенціць бацюшка і хаваем гэтую вярбу за іконаю. Цэлы год ляжыць. Ей яшчэ пасвенцяць хату. Прыйдзеш у хату з цэрквы і ўжо, калі хто ёсць, б'еш вярбой і гаворыш: "Не я б'ю, вярба б'е, за тыдзень Вялікдзень, гані валоў на пашу".

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Матус Яўгеніі Міхайлаўны, 1930 г.н.*

Вярбу свецяць перад Паскай. Вярбу асвянчаюць, прыносяць дамой і ставяць на покуці, за іконай. Гаварылі: "Не я б'ю, вярба б'е". Чай з вярбы п'юць для здароўя.

*Запісана ў в. Вайнілавічы*
*ад Камлач Вольгі Іванаўны, 1934 г.н.*

Вербачку вырвем за нядзельку. Яна распусціцца. Гэту вербачку ўбяром і на Вербніцу едзем у цэркву, пасвенцім вербачку, і тагды, хто там дома е, і б'ём гэтаю вербачкай: "Не я б'ю, вярба б'е". Гэтакі закон быў. Тады гэтую вербачку ставім у пакоі. І стаіць ужэ да другой Вербніцы. І тады гэтую вербачку спалім і новую ставім на год.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Кавальчук Аляксандры Паўлаўны, 1931 г.н.*

Вербу нарэжым, калі яна расцвіла. Тады на вербную нядзелю ідом у касцёл. Тады молімся. Тады прыходзім дадому. Некалі мая мама гаварыла: "Верба б'е, не я б'ю, верба б'е за Вялікдзень".

*Запісана ў в. Альбянка*
*ад Гібчык Юзэфы Францаўны, 1931 г.н.*

Вербная нядзеля – гэта тыдзень перад Пасхай. Трэба ісці вербачку свянціць і то ж благаслаівіца. Б'ют этай вербачкай.

*Запісана ў в. Альбянка*
*ад Шумейка Ядвігі Міхайлаўны,1929 г.н.*

Асвянчалі ў царкве галінкі вярбы, неслі дадому ды казалі: "Не я б'ю, вярба б'е, за тыдзень Вялікдзень. Уставай рана, валы гані, мае займі".

*Запісана ў в. Сейлавічы*
*ад Хвіцько Вольгі Паўлаўны,*
*Таратуты Соф'і Мікалаеўны*
*Матэрыялы ўзяты з архіва Нясвіжскага раённага цэнтра народнай творчасці*

## Чысты Чацвер

Ужо к Чыстаму Чацвяргу ў нас было ўсё чыста: і двор падмецены, і ў хаце ўсё падмецена, усё-ўсё.

*Запісана ў в. Карцэвічы*
*ад Цвірко Алены Пятроўны, 1941 г.н.*

У Чысты Чацверг прыбіраюць хаты, памыюць, павымятаць усё трэба. Ходзяць на кладбішча. Людзі здалёк прыязджаюць на кладбішча к сваім продкам.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Гадун Алены Вікенцьеўны, 1924 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Каменка Нясвіжскага р-на).*

Так паложана штоб да Чыстага Чацвярга ты быў поўнасцю гатовы: усё вымецена, вычашчана, вымыта, занавешана.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Бабко Ірыны Васільеўны, 1946 г.н.*

Гэта ўжэ гатаваліся да Пасхі. Пасцілі. Дажэ шчырым постам я пасціла. Ужо гатаваліся, прыбіраліся, мылі там ўсё.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Сінькевіч Вольгі Віктараўны, 1927 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Каменка Нясвіжскага р-на).*

Гэта трэба каб было ўжо ўсё чыста, некалі вымывалі дзяжу, некалі дзежы былі такія, што хлеб пяклі.

*Запісана ў в. Вайнілавічы*
*ад Кароль Ніны Вячаславаўны, 1927 г.н.*

Некалі ў Чысты Чацверг хадзілі на рэчку мыцца, каб чыста ўсё было.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Матус Яўгеніі Міхайлаўны, 1930 г.н.*

Гэта трэба, каб чыста ўсё было перад Вялікдзеням. У цэркве бацюшка моліцца. Плашчаніцу выносяць.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Антановіч Веры Валяр'янаўны, 1933 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Альхоўка Нясвіжскага р-на).*

Перад Вялікаднём да Чацвярга трэба каб у хаце ўжэ ўсё было чыста, каб усё было памыта. А там ужо ў пятніцу, суботу ішлі ў цэркаў. У суботу абязацельна хадзілі, усеночная ж была.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Акулік Марыі Уладзіміраўны, 1944 г.н.*

Перад Паскай у Чысты Чацвер мама нас пабудзіць да захода сонца, і мы бягом бяжым на лужок, і там у вадзе паболтаемся, паплюхаемся і назад бяжым. І мама прыкажа, каб назад не аглядаліся, бяжыце зразу да хаты. Пабяжыш, памыешся гэта ўжо, каб балячак ніякіх не было, каб барадавак не было. Некалі з мамай хадзілі ў цэркву і запалім свечку тамака ўжо, і ідом да самай хаты, і ўсё гарыць свечка, дзяржыш рукой, каб ветрык не патушыў.

*Запісана ў в. Карцэвічы*
*ад Крыўко Наталлі Мікалаеўны, 1934 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Малева Нясвіжскага р-на).*

Чысты Чацвер – гэта ўжэ свята правілася ў цэркве. Людзі пасцілі, нічога не елі. Тры дні не елі. Да споведзі хадзілі. Плашчаніцу на Чысты Чацвер выносілі. Заўсёды называлі "Чысты чацвер". Усё убіралі ў даму, стараліся самі памыцца. Абязацельна на Чысты Чацвер мылі дзежку. Гаварылі, што дзежка ідзе у госці. Трэба было яе вымыць.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Кавальчук Аляксандры Паўлаўны, 1931 г.н.*

У Чысты Чацвер надо было, штоб было ўсё чыста. Прыбіраешся. Пятніца – святы дзень і субота.

*Запісана ў.в. Альбянка*
*ад Гібчык Юзэфы Францаўны, 1931 г.н.*

Перад Пасхай Чысты Чацвер. Да гэтага дня должно было ўсё быць прыбрана чысценька. З Чыстага Чацверга ўжо к Пасхі пачынаюць гатовіцца. Раней мылі дзяжу, каб была чыстая.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Маркевіч Аляксандры Уладзіміраўны, 1938 г.н.*

## Вялікдзень

Ну, рыхтуемся да Пасхі, мыюцца, кулічы, пасху дзелаем. Яйца красят в красный цвет, патаму шта эта кровь Божья. В біткі гралі, о, как інцересна было, бралі в рукі яйца і білі.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Дзішук Галіны Марцінаўны, 1938 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Качановічы Нясвіжскага р-на).*

На Вялікдзень нічога не рабілі, бо святы дзень. Абязацельна яйца красілі, пірагі пяклі. Яйца красілі шалухою па традзіцыі, а кагда траур, то ў галубой ілі жоўты ілі вабшчэ не красілі. Абязацельна ў печы пірагі пяклі. На Пасху мы не ідзём на могілкі, а ўжо ходзім патом на Радаўніцу. За нядзелю да Пасхі ідзём кладбішча ўбіраць. Валачобнікі ходзяць, паюць, а мы іх угашчаем.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Качуры Тацяны Паўлаўны, 1948 г.н.*

Пасха проходила у нас по Божиим законам, чтобы в каждом доме было все испечено, чтобы всё время пеклось свое, домашнее, выпечка была какая-нибудь. Яйца красили обязательно в красный цвет.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Праходы Святланы Міхайлаўны, 1950 г.н.*
*(раней пражывала ў г. Ветка Гомельскага р-на).*

Раней хадзілі на Пасху кукольнікі, мужчыны. Як калі прыходзілі: калі пяць, калі шэсць, калі восем чалавек. Яйца давалі. Песні пелі кукольнікі "Вялікдзень". Кукольнікі – гэта таму што ходзяць, песні спяваюць "Вялікдзень".

*Запісана ў в. Альхоўка*
*ад Вальчык Анастасіі Іванаўны, 1927 г.н.*

Вялікдзень – гэта свята, на якое некалі хадзілі кукольнікі, песні спявалі кукольныя: "Вялік святы нам дзень настаў…". Хадзілі кукольнікі, спявалі гэту песню. Ужо ў суботу варылі яйца і булкі пяклі, мяса абварвалі, хто што мог рабіў. Потым у цэркаў ідуць послі абеда, пад вечар у 4 часа.

*Запісана ў в. Альхоўка*
*ад Драчан (Грахоўскай) Людмілы Антонаўны, 1923 г.н.*

На Вялікдзень булкі пяклі, яйцы красілі. У хаце прыбіраліся да свята.

*Запісана ў в. Грыцкавічы*
*ад Заяц (Пятроўскай) Марыі Антонаўны, 1937 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Мацылеўшчына Нясвіжскага р-на).*

Ну, на Вялікдзень толькі яечкі пафарбуюць у красны цвет. Як хто ўмее, дак той пячэ пасху. У цэркаў ходзяць, як хто можа. Вечарам на ўсюночную трэба ўсё пасвянціць.

*Запісана ў в. Грыцкевічы*
*ад Рыштоўскай (Дамашык) Алены Юльянаўны, 1925 г.н.*

Празнавалі Пасху, гасцей устрачалі. У госці зазывалі. Калі гора ў гэты год, яйкі не красілі, а так красілі ў чырвоны цвет. Абязацельна пяклі булку: мука, малако, яічка. Разводзілі цеста, мясілі і пяклі. Хадзілі ў цэркаў, на кладбішча. У цэркаў хадзілі свянціць, насілі настольнічак.

Рано ўжо яйца пасвенцім, прыйдзем дадому, з'ядзім яечка свянцонае. А тады ўжо прыбіраем, булкі пяклі: бралі малачко свае кароўкі, муку, сахару, жыру трошкі. Клалі цеста ў бляхі, каб падходзіла. Тады клалі ў печ. Яечкам памажам іх.

*Запісана ў в. Жанкавічы*
*ад Карачун Леаніды Уладзіміраўны,1932 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Долкінды Нясвіжскага р-на).*

У Чысты Чацверг мыемся, прыбіраем хату, каб было ўсё ўжо чыста – к Чыстаму Чацвяргу.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Жук Алены Мікалаеўны, 1969 г.н.*

К Пасхе ёлку ў дама прыносілі, і былі такія бэлькі даўней у хаце. Пад паталком туды ёлку чаплялі, украшалі ўсю хату гэтымі ёлкамі. Яйца красілі ў красны колер.

*Запісана ў в. Альхоўка*
*ад Кузьміч (Мазан) Марыі Дзмітрыеўны, 1932 г.н.*

Ну, у гэта свята на Пасху трэба ў цэркаў хадзіць маліцца, нічога не рабіць. На эта свята вось гэты крэст (паказвае на яго) ставілі. Ва ўрэмя вайны нам казалі, што трэба нам паставіць крэст і выткаць на яго ручнік. Сабраліся ўсе і зрабілі ручнік, і павесілі на крэст, і вы знаеце, скончылася вайна. Да, гэта было, і скончылася благапалучна.

*Запісна ў в. Лань*
*ад Кузьмовай (Дашко) Тамары Герасімаўны, 1928 г.н.*

На Пасху нам пакупалі новые бацінкі, новае плацье. І мы с утра прахадзілі па хутарам, і нам каждый давал яічко, а потом мы сабіраліс цэлай гурбой і гулялі ў біткі. Яйца красіліс шалухой у жоўты цвет, а ў каго

ўмершые в доме, то красілі яйца в белый цвет. На могілкі хадзілі.

*Запісана ў в. Малева*
*ад Каліноўскай (Мелянько) Галіны Васільеўны, 1943 г.н.*

Вялікдзень – гэта вялікае свята. Ну, як яго адзначалі: прыбіралі, смачнейшыя блюды на стол ставілі, яйкі фарбавалі, патрэбна было фарбаваць у краснае, бо гэта вясёлы празнік. Калі пакойнік, то не фарбавалі ў красны цвет, ну, усё роўна бацюшка гаворыць, што далжны красіць, а калі хто памрэ, то не красілі або былі белыя, жоўтыя. Усё роўна трэба, каб красілі на Вялікдзень.

*Запісана ў в. Новы Споў*
*ад Гацкевіч (Рак) Ніны Іванаўны, 1941 г.н.*

На Вялікдзень у цэркву на ўсяночну хадзілі. Па хатах хадзілі кукольнікі як бы валачобнікі. Яйкі красілі ў красны цвет (з-за крові Ісуса Хрыста). Калі траур, то ў жоўценькі ці зялёненькі цвет красілі, у той цвет, яку купяць краску. Пірагі абязацельна пяклі перад Пасхай. У місачку маленькую лажылі тое, што ехалі свянціць у цэркву. Вазілі раней у цэркву ў каробцы, плеценай лазою з саломкі. Цэлу каробку накладуць: і хлеба, і мяса, і кілбасы. На Пасху прыбіраліся, ой-ёёёй, ой-ёёёй як! Гэто ўсё вязуць свянцаць. Вялікі празнік гэто быў. Як Вялікдзень, то да Праўднай нядзелі (нядзяля пасля Пасхі) ніхто нічога свянцонага не еў. Песні спявалі:

*Вялік святы нам дзень настаў,*
*Са славай сонца вассіяў,*
*Васкрэс на вечны свет,*
*На вечны свет.*

А ўжэ ў каго дзяўчата ў хаце, дак ужэ маладзёж хадзіла і гэтыя песні спявала, але ўжэ спявалі і дзеўцы:

*Добры вечар, і панянэчка,*
*Добры вечар, і панянэчка.*
*Прошэ адэмкнуць акеначка,*
*Прошэ адэмкнуць акеначка…*

*Запісана ў в. Слаўкава*
*ад Халоп Марыі Аляксандраўны, 1933 г.н.*

Вялікдзень адзначалі хораша. Пяклі булкі, пірагі. Было сваё малако, свая мука, верашчаку ці патраўку рабілі. У булкі ўкідалі масло ці жыр, сахар, а ў каго не было сахару, варылі сахарын, як дасць хто яблык. Яйцо красілі ў красны цвет, некаторыя гулялі ў біткі. Валачобнікі хадзілі з хлебам, больш хадзілі к родзічам: кумам і бабушкам.

*Запісана ў в. Слаўкава*
*ад Шыкулы Яўгеніі Іосіфаўны, 1914 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Ракавічы Нясвіжскага р-на).*

Яйца на Пасху варылі, песні спявалі. Яйца красілі цыбулькаю, а калі траур, то не красілі. У біткі гулялі. У каго яйцо крапчэйшае, то той многа набярэ яец. На Вялікдзень прыходзілі кукольнікі і спявалі песні. Іх адорвалі грашамі, гарэлкаю, віном. Інцярэсна было.

*Запісана ў в. Смалічы*
*ад Гуцько Аляксандра Іванавіча, 1931 г.н.*

Кукольнікі хадзілі ў кажну хату. Хто даваў што: хто даваў булкі, бальшынство давалі дзясятак яец. І з музыкай хадзілі і без музыкі. Гэта яны хадзілі абычна ў першы дзень Вялікадня пад вечар. У красны цвет яйкі красілі, а калі быў траур, то не красілі. Красілі шалухою ад цыбулі. Спявалі песню:

*Велікій Святой там дзень настаў,*
*Са славай грома васіяў.*
*Хрыстос Гасподзь – наш вечны свет,*
*Хрыстос Гасподзь,*
*Суботня ноч ліш прашла,*
*Зара ў нядзелю чуць узашла…*

*Запісана ў в. Смалічы*
*ад Шчурскай Ірыны Мікалаеўны, 1935 г.н.*

Яйцы цыбулькай красілі ў красны колер, а як было гора – не красілі. Паску пяклі, кулічы рабілі. Булкі пяклі абыкнавенна: рашчыняла, замешвала. У біткі ў нас не гулялі.

*Запісана ў в. Сычэва*
*ад Бараноўскай Марыі Фёдараўны, 1926 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Карцэвічы Нясвіжскага р-на).*

Сабіраліся на Пасху, гасцілі, песні пелі, на Вяліканне хадзілі – у валочне. Яйца красілі ў лупінах з цыбулі, а як у сям'і было гора, то не красілі. Булкі пяклі очань проста.

*Запісана ў в. Сычэва*
*ад Казей Валянціны Паўлаўны, 1930 г.н.*

Ну, як Пасху святкавалі, то спецыяльна прыбіраліся: яйца свянцілі, іх фарбавалі. Нашыя фарбавалі іх на краснае. Як быў траур, то вабшчэ не красілі. Булку, хто хацеў, той і пёк. А хто не мог, то куплялі. У біткі дзеці гулялі, старыя не гулялі. На могілкі хадзілі, насілі свянцонае, а патом ужо бацюшка сказаў, штоб свянцоную яду на могілкі не насілі, таму што вароны адно парасцягваюць па гэтых могілках. Я ўсё ўрэмя булку пякла. І мясо і кілбаса на сталe былі.

*Запісана ў в. Сычэва*
*ад Комар Марыі Вікенцьеўны, 1941 г.н.*

На Вялікдзень паехалі ў суботу і ўсё, што гатовілі, пасвянцілі, а ў нядзелю паелі. Калі ў сям'і было гора, то яйкі не красілі. На могілкі на Вялікдзень не ездзілі.

*Запісана ў в. Сычэва*
*ад Сандрос Вольгі Марцінаўны, 1929 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Андрушы Нясвіжскага р-на).*

На Вялікдзень збіралі яйца, красілі ў красны цвет, бо кроў Хрыста. А як быў траур, то ў чорны ці вабшчэ не красілі. Пасху пяклі. Гулялі ў біткі, хадзілі на могілкі, але цяпер бацюшкі сказалі не хадзіць, не насіць гэтыя яйца. Валачобнікі хадзілі, в аснавном гэта маладыя людзі былі.

*Запісана ў в. Сычэва*
*ад Юхноўскай Алены Антонаўны, 1935 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Малева Нясвіжскага р-на).*

Кукольнікі раней хадзілі на Вялікдзень і цяпер ходзяць. Ну, прыйдуць: "Паспяваць вам ці не?" Ну, паспяваюць, угосціш іх ды і ўсё. Ці дзеньгі дасі, ці булку. Фарбавалі яйкі ў красны колер. У мяне вот мама памерла, так мы год не красілі. Булкі пяклі. Калі разламаецца булка, калі дастанеш з печы, то кажуць, што нехта памрэ. Шкарлупку ад яйка асвенчанага кідалі ў зярно, штобы зярно не палягло.

*Запісана ў в. Карцэвічы*
*ад Цвірко Алены Пятроўны, 1941 г.н.*

Пяклі булкі, маці парасячы кумпяк у печы тушыць, яечка красілі ў цыбулі. Хадзілі, як і на Шчодры, пелі песні і ў хату заходзілі, паздраўлялі. Хадзілі на кладбішча і яечка насілі, і пячэнне. Першым на Вялікдзень нада з'есць яечка свянцонае. Шкарлупу нельзя выкідаць. Нада её курам аддаць, а соль свянцону каровам даць.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Майсеня Тацццяны Антонаўны, 1936 г.н.*
*(раней пражывала ў г. Нясвіж).*

Яечкі на стол ложуць. Первае нада з'есць яйцо, а потом ўсё астатняе. Ужо елі больш мясное, ужо ж пасціліся. Булачкі ядуць, водку п'юць, хто што можа. Яйкі фарбалі найбольш у красны колер. У біткі гулялі.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Гадун Алены Вікенцьеўны, 1924 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Каменка Нясвіжскага р-на).*

Вялікдзень – гэта праваслаўнае свята. На Вялікдзень панапіваюцца і песні пяюць, пачынаюць біцца. Красілі яйцы ў лукавай шалухе. Перад Вялікаднем хадзілі ў кукольнікі. Хадзілі адны мужчыны і начынаюць з канца сяла, і адные хлопцы. З сабой бяруць барабан і заходзяць у тую хату, дзе дзеўкі. Хадзілі чалавек дваццаць. Заходзім у першую хату, там два сталы, закусі на ўсіх сталох: напечана, нажарана, наварана і дзве бутылкі самагонкі. Прыходзяць сразу ў хату, становяцца каля парога і начынаюць пець велікодныя песні. Запелі песні пад музыку і сажаюць за стол усіх, і наліваюць. Выпілі, прыкусілі, падзякавалі гэтай хаце і пайшлі ў другую тожа, дзе дзеўкі. І во так началі звечара, і хадзілі па парадку ў кажду хату, дзе дзяўчаты. А дзяўчаты чакаюць цэлую ноч, пакуль не прыйдуць, ну, а потым цэлую ноч спалі.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Пракарына Івана Уладзіміравіча, 1938 г.н.*

Булкі пякуць і яечкі красяць у чырвоны колер. Яечкі на ўсяночнай свенцяць. Яечкі на ўсяночнаю прыносяць у прыгожай карзіначкі. З імі прыносяць кавалачак мяса, тот з чым будзе святкавацца святочны дзень. Прыносяць дадому, ложаць на стол ва ўсё прыгожае. Яйцо рэжуць на кавалачкі і з утра нада кожнаму чалавеку першае яйцо з'есці. Усе скарлупы аддаём курам, каб добра няслісь. Ходзяць кукольнікі і пяюць: "Добры вечар, святы вечар". Святыя песні пяюць, царкоўныя. Ходзяць дзеці па два – тры з торбачкамі, песні співаюць, і ім ужо даюць яйка, канфеты. На Вялікдзень ходзяць на кладбішча.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Бабко Ірыны Васільеўны, 1946 г.н.*

Красілі яйкі, але ж пасцілі некалі. Цяпер дык я і пашчу. Красілі, але ж есці ўсё раўно не трэба было. А назаўтра ж трэба было іці ў цэркаў. У нас усё бацька хадзіў. З цэрквы прыдзе, а тады ўжэ елі. Так жа ніхто не даваў.

А тады ўжэ бежымо па хатах. Красілі гэтак, як і цяпер: хто ў красны, хто ў які. Калі хто паміраў, то не красілі, а бацюшка кажа, што ўжэ трэба красіць у белы. Да году не красілі. На Пасху хадзілі так, як і калядавалі. Як цяпер у нас хадзілі на кладбішчэ, так і раней хадзілі. Эта не ў каждым сяле. У некатарым сяле ідуць ужэ на Радаўніцу. Цяпер называюць Радаўніца, а некалі Пакровы. Яечка фарбуюць і перакідаюць чэраз хату. Ужэ як не разаб'ецца яйцо, то ўжэ будзе доўга жыць.

*Вялік Святой нам дзень настал,*
*Хрыстос Гасподзь із мёртвых встал,*
*Хрыстос Гасподзь, наш вечный свет,*
*Хрыстос Васкрэс.*
*В суботу полнач прашла,*
*Зара в недзелю чуць ліш взышла,*
*Как ангел дверы гроба отвёрз,*
*Хрыстос Васкрэс.*
*Ту ночку жоны к гробу шлі*
*І міру цело не неслі с сабой.*
*Но там ужэ был гроб отвёрз,*
*Хрыстос Васкрэс.*
*Це жоны плакаць ліш началі,*
*Што цела в гробе не нашлі.*
*Вот смотраць: в гробе кто-та летае,*
*Хрыстос Васкрэс.*
*Там был блісцяшчы в рызах лік,*
*Пасланец Божы тот для ніх,*
*То светлы ангел был с небес,*
*Хрыстос Васкрэс.*

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Шарапы Анастасіі Сцяпанаўны, 1933 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Каменка Нясвіжскага р-на).*

Перад Паскай чацверг называюць Чысты Чацверг. Таму што ўсё ў доме, на двары даўжно быць убрана. У царкве была бальшая малітва. Свечы нясуць з царквы дамоў, прадымлялі вуглы хаты ёй.

*Запісана ў в. Вайнілавічы*
*ад Камлач Вольгі Іванаўны, 1934 г.н.*

Яйкі красілі ў цыбульніку, а як паміралі, то не красілі. На кладбішча хадзілі, яйка насілі, а не красілі. Бацюшко-то гаварыў, шо трэба красіць.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Сінькевіч Вольгі Віктараўны, 1927 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Каменка Нясвіжскага р-на).*

На першы дзень Вялікдня абычна былі ўсе па дамам, ніхто не хадзіў у госці, усе былі дома. На другі дзень ужо начыналі ўсе ў госці хадзіць. Святкавалі раней чатыры дні. Пасля Вялікадня ў сераду (шчыталася градавая серада) на зямлі нічога не рабілі. Называецца градавая серада, каб град не пабіў пасеваў. Нічога рабіць не трэба. На Вялікдзень паскі пяклі, яйцы красілі. Красілі ў красны, розавы цвет. Як хто-небудзь памрэ ў той год, пакойнік быў у хаце, тады не красілі яйцы ў красны, тады ў сіненькі ці ў зялёненькі цвет. На ў біткі абязацельна ігралі. Свянцонае яйка разразаем на кусочкі, і ўсе елі, а шкарлупкі курам аддавалі, каб куркі няслісь лучшэ. Тыдзень пасля Вялікадня называўся "Праўдная нядзеля". Хадзілі на кладбішча, кветкі насілі, калі трэба падправіць што, то падпраўлялі.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Акулік Марыі Уладзіміраўны, 1944 г.н.*

Пакушаюць усе, памоляцца, у царкву хадзілі вечарам. Яйкі свянцілі. Красілі ў красны цвет. Калі хто памрэ, бывала, так не красілі. Скурлупкі слажвалі ў ткань і лажылі: хто ў шкаф, хто куды. Вечарам кукольнікі хадзілі, пелі. І бабы хадзілі, і мужчыны, і дзеці, і дзеўкі. Ад дома к дому хадзілі. Хто яічка за гэта дасць, хто грошай, хто што.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Пасацкай Надзеі Міхайлаўны, 1924 г.н.*

Заўсёды на Паску красілі яйцы ў красны цвет. Набіраем з лука шалухі, а потым залівалі кіпятком. Калі памрэ хто, не паложана красіць, пакідалі тады белымі. На Паску хадзілі, як і шчодры, з гармошкамі, скрыпкаю. Ім давалі: хто грошы, хто калбасу, хто бутылачку, хто што мае.

*Запісана ў в. Карцэвічы*
*ад Крыўко Наталлі Мікалаеўны, 1934 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Малева Нясвіжскага р-на).*

Па беларускаму тыя, хто хадзілі па хатах – гэта кукольнікі, а па свяшчэннаму – валачобнікі. Людзі хадзілі і паздраўлялі хазяіваў з празднікам і спявалі свяшчэнную песню, і за гэта хазяівы і давалі яічкі. Захадзілі ў кажну хату.

*Запісана ў в. Вайнілавічы*
*ад Кіпець Уладзіміра Рыгоравіча, 1926 г.н.*

На Вялікдзень прыйдзеш з усяночнай, маці булкі пякла, яечка фарбавалі ў красны колер. На першы дзень прыходзяць пад вокны кукольнікі і спяваюць святыя песні, а калі ў хаці ёсць дзяўчына, то спяваюць песню "Паненку".

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Чайкі Вольгі Міхайлаўны, 1922 г.н.*

Усеночныя на Вялікдзень былі. Красілі яйкі. А як ужо ў каго хто памёр, тады ўжо не красілі, але свянцілі іх. Палупілі етыя яйцы, солі бралі і елі.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Матус Яўгеніі Міхайлаўны, 1930 г.н.*

На Паску ўсягда рыхтаваліся старанна, рыхтавалі багата розных страў: дзелалі кілбасы, мяса адварвалі, пеўня ўтушвалі, у каго што было. На Вялікдзень хадзілі заўсёды ў царкву і цяпер ходзім.

*Запісана ў в. Вайнілавічы*
*ад Кароль Ніны Вячаславаўны, 1927 г.н.*

Я хадзіла спяваць на Вялікдзень. Я сама хадзіла, калі святой дзень настаў. Святыя песні не можна ў просты дзень спяваць, як кажуць, грэх будзе. Хадзілі мы пад вечар і спявалі цэлу ноч. Надаюць гарэлкі і закускі, а назаўтра ўжо пілі і елі.

Спявалі пад кожным вакном. Мужыкі хадзілі з намі, не адны ж бабы. Калі я была малая, на Вялікдзень раніцай уставалі і глядзелі, як сонца грае.

Яшчэ пяклі булкі і свянцілі яйкі, но той чалавек не красіць, у каго памрэ хто, тады красяць у чорны цвет, або зусім не красяць. Шкарлупу я выкідала курам, тады куры лепш нясуцца. У суботу едуць свянціць яечкі, два – тры, колькі ў каго сям'я якая. Тады на тарэлачку пакрышаць яечка і загаўляюцца свянцонымі яйкамі, і ўсё тады ж ужо ядуць. Раньшэ хадзілі дзеці па яйцо і булку. Я сама хадзіла, назбіраю цэлую торбу.

*Запісана ў в. Вайнілавічы*
*ад Камлач Яніны Валянцінаўны, 1936 г.н.*

Вялікдзень празнавалі так: ніхто на гэта свята нічога не рабіў. Усе на дзярэўні кучамі сабіраліся і песні пелі, там застоллі такія рабілі, яйцы білі. Красілі яйцы абязацельна красным, красілі з лукам. А другія красілі сінім, калі хто памёр. Дажэ вабшчэ не красілі, толькі іх варылі або цямнейшым цветам красілі.

На Пасху хадзілі "кукольнікі". Называліся яны "кукольнікамі", таму што яны пелі, хадзілі і кукавалі як бы. Вот падходзяць к дому і гаварылі: "Адкрывай, гаспадар, дверы, прыйшлі ў госці к вам". Ну, гаспадар заклікае іх у хату. Угашчаюць іх, а яны песні паюць. Ім давалі ўсё, і ані ўжо там насабіраюць яйцы, закуску, ну, хто што дасць: хто грошы, хто яйцо. Хадзілі ў каждую хату пад утра ўжо. З ночы начыналі, а к каму і ўтрам толькі прыйдуць. Усё сяло пройдуць, усё. На кладбішча ўсе хадзілі на Пасху. Насілі яйцы красныя.

*Запісана ў в. Вайнілавічы*
*ад Запольскага Валянціна Валянцінавіча, 1957 г.н.*

Красілі на Пасху яйцы. Калі памірае хто, то год не крашу. А так былі заўсёды красныя яйцы.

*Запісана ў в. Карцэвічы*
*ад Усовіч Надзеі Максімаўны, 1947 г.н.*

Яйцы свенчаць, красяць. Разгаўляліся імі, елі пасля ўсеночнай. Сама перша утрам аблупліваюць яйцо, разразаюць яго на колькі душ у хаце і елі, а затым ужо ўсё астатняе. А перад Паскай, што хадзілі людзі, называлі іх "кукольнікі". Пелі песні каля каждай хаты. Давалі хто дзенег, хто калбасы. Пелі: "Вялік наш дзень настаў". Усё дзеляць потым. Яйцо астаўлялі на цэлы год. Год пройдзе, у зямельку закапаюць. Шкарлупу кідалі на агарод. Калі памёр хто ў сям'і, то красілі сінім цветам або саўсім белыя яйкі абвараць да і ўсё.

*Запісана ў в. Вайнілавічы*
*ад Камлач Вольгі Іванаўны, 1934 г.н.*

У цэркву хадзілі ж на ўсюночну, ішлі з вечара ў суботу і цэлу ноч былі ў цэркві, а калі прыходзілі з цэрквы, садзіліся снедаць ды спаць лажыліся аддыхнуць жа после цэркві. І на першы дзень недзелі ніхто нікуды не хадзіў, а хадзілі пад вечар кукольнікі. Обычно это былі маладые хлопцы, дзяўчаты ніколі не хадзілі. Ну, і одна пачка малодшэ, друга большэ. Оны под окном спявалі песні.

*Хрыстос Воскрэсе із мёртвых,*
*Смерцью смерць поправ…*

Ну, а потом дарылі ўжэ, хто што хацеў. Раней яблака давалі, яйца. Цепер, от як мы хадзілі, то стопку гарэлкі, хто яйца, хто сала,

хто грошы даваў. Некалі не адны прыходзілі, а адна пачка (чаловек 6-8), а то і 10, 20, а патом другая. Некалі ж гулялі маладзёж па кампаніях, цяпер усе адны. Яйкі красілі ў красны. Абычна ў сем'і, як хто ўміраў, то яйца совсем не красілі, а не дык красілі ўжо сенам, чуць-чуць яны жоўтыя бывалі. Утрам хадзілі на кладбішчэ, бралі яду, яйкі свячоныя і насілі туды, клалі. Бацюшка наш казаў, шо не трэба таке. Як устрэчающца, то казалі: "Хрыстос Воскрэсе", казалі 3 разы, некаторые-то і цалуюцца.

*Запісана ў в. Вайнілавічы*
*ад Волкавай Марыі Уладзіміраўны, 1931 г.н.,*

Да Вялікадня прыгатаўляліся ўсегда. Это ж вялікае свята. Прыбіралі ў хаце, чысцілі, мылі, хвіранкі новыя вешалі. У нас абычно ў красну суботу перад Вялікаднем заўсёды пад вечар усе сялом ідуць на кладбішчэ. Паляць свечкі кожны. Пасвенчанае яйка на Пасху, як снедаць садзіліся, першае з'ядалі. На Вялікдзень яйца хадзілі сабіраць "кукольнікі", яны спяваюць. А ўжэ ім даюць то яйца, то водку даюць.

## Паненка

*Добры вечар, пад аканэчке,*
*Хрыстос Воскрэсен Божы.*
*Проша адэццэ, пад аканэчке,*
*Хрыстос Воскрэсен Божы,*
*Проша выйсці к нам на ганак,*
*Хрыстос Воскрэсен Божы,*
*Нам падарок невялікі,*
*Хрыстос Воскрэсен Божы,*
*Нам падарок сорак яек,*
*Хрыстос Воскрэсен Божы,*
*Сыр бяленькі на тарэлкі,*
*Хрыстос Воскрэсен Божы,*
*Чарка гарэлкі для пачосткі*
*Хрыстос Воскрэсен Божы.*

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Лях Марыі Сільвестраўны, 1943 г.н.*

На Вялікдзень у красную суботу яечка варылі. Ідом у цэркаў свянціць. Красілі цыбуляй. Калі памёр хто, тады не красяць – белыя.

*Запісана ў в. Карцэвічы*
*ад Драчан Соф'і Адамаўны, 1924 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Альхоўка Нясвіжскага р-на).*

## Посная песня

*Через поле шырокае,*
*Через море глыбокае,*
*Алілуе, алілуе, алілуе.*
*Там лежала гібка кладка,*
*Кудой шла Божая матка,*
*Алілуе, алілуе, алілуе.*
*Ішла матка, рыдаючы,*
*Свайго сынка шукаючы,*
*Алілуе, алілуе, алілуе.*
*Ідзе полем, ідзе на другое,*
*На трэцее саступае,*
*Алілуе, алілуе, алілуе.*
*На трэцее саступае,*
*Трох ангелаў сустракае,*
*Алілуе, алілуе, алілуе.*
*Ой, та вы, тры ангелы,*
*Тры ангелы-апосталы,*
*Алілуе, алілуе, алілуе.*
*Ці не чулі вы, не бачылі*
*Майго сынка найменшага.*
*Алілуе, алілуе, алілуе.*
*Майго сынка найменшага,*
*Свайго Бога найвышшыга,*
*Алілуе, алілуе, алілуе.*
*Адзін кажа: "Я чуць не чуў".*
*Другі кажа: "Бачыць не бачыў".*
*Алілуе, алілуе, алілуе.*
*Трэці кажа: "Я сам там был,*
*Я сам там был, касцёл рубіл".*
*Алілуе, алілуе, алілуе.*
*Стоіт касцёл новусенькі,*
*Со всех сторон віднюсенька,*
*Алілуе, алілуе, алілуе.*
*В том косцёлі прыстол стоіт,*
*На прыстолі той сын ляжыць,*
*Алілуе, алілуе, алілуе.*
*Твайго сына жыды ўкралі,*
*Жыды ўкралі, замучылі,*
*Алілуе, алілуе, алілуе.*
*На крест ручкі распіналі,*
*Гваздзямі ножкі прыбівалі,*
*Алілуе, алілуе, алілуе.*
*Гваздзямі ножкі прыбівалі,*
*Серца дасталі,*
*Алілуе, алілуе, алілуе.*
*Пашла матка, рыдаючы,*
*Свайго сына шукаючы,*
*Алілуе, алілуе, алілуе.*

*Запісана ў в. Вайнілавічы*
*ад Камлач Яніны Валянцінаўны, 1936 г.н.*



Нясвіжскага краю напеў векавы

Пасха – празнік тожэ красівы. Гэта заўсёды прыбіраемся. Усё стараемся зрабіць: і булак напяком. Едзем у цэркву на ўсюночную вечарам. Едзем, часоў у дванаццаць пачынаем правіць. Пад дзень прыходзім дамоў. І тады ўжэ разгаўляемся, сразу свянцовыя яічкі паямо, у сольку памочым. Дзе хто вып'е сто грам. І тады аддыхаем. А после абеда апяць у цэркве службу правяць. Апяць ідом ў цэркву. Пабудзем, зноў прыдзем дадому. І празнувалі. Сядзім то на лаўках, то гулялі, то спявалі. Яйкі красілі тыя, у каго ніякай бяды не было, а ў каго хто памёр, то яйкі толькі варылі. Хадзілі старыя па хатах. Іх называлі "кукольнікамі", так красіва спявалі. Усё хадзілі па хатах. Пойдуць увечары і прыйдуць дамоў днём. Потым сабіраюцца, хто хадзіў, і гуляюць. Яны гаварылі: "Хрыстос Васкрэс!"

Гэтую песню "Вялікі святой нам дзень настаў" пелі пад кажным домам. Заходзілі ў дом. Хадзілі толькі мужчыны. Іх называлі кукольнікамі, таму што яны пелі песні.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Кавальчук Аляксандры Паўлаўны, 1931 г.н.*

Ну, як азначалі Вялікдзень? Рано ўтрам у 12 часоў службу адпраўлялі, у нас у 6 часоў. Ідуць у цэркаў, памоляцца. Тады ідуць дадому, яду свянцоную ставяць на стол. Першае ядуць свянцонае яйцо. А тады ўсё астальное: м'ясо, булкі, хлеб, соль, гэта ўсё свенцяць.

Яйка было абязацельно. Красяць на розныя цвята, самы лепшы цвет красны. Кажуць, нельзя красіць, калі хто памёр.

Гралі на ўбіткі. Ну, кукольнікі хадзілі, і цяперака яны ходзяць. Бяруць цэлую торбу: хто канфет, хто чаго, хто булкі. Кукольнікі – гэта маладыя дзяўчаты, хлопцы.

*Запісана ў в. Альбянка*
*ад Гібчык Юзэфы Францаўны, 1931 г.н.*

Пасху атмячаюць у цэркве, потым дагаварваюцца, назначаюць, калі атмячаюць. Абязацельна яйца красят, пасхі пякуць. Яйца красілі ў які хочаш цвет, але закон гласіць – у красны цвет.

Кукольнікі ходзяць пасля Пасхі, на другі ці на трэці дзень. Ходзіць маладзёж, ходзяць благаслаўляць.

*Запісана ў в. Альбянка*
*ад Шумейка Ядвігі Міхайлаўны, 1929 г.н.*

Пасха – ну, это ўжэ тожэ такое вялікае свята. Гатовіліся к Пасхі, блюда рыхтавалі, булкі пячом, кулічы. Тады ўжо вечарам у суботу едзем у цэркаў, на ўсеношную, як называлі. До 12 часоў служба ідзе. Патом асвяшчае бацюшка і нясом яйцо крашанае, булку, хто што мае.

Госці прыязжаюць. Красілі яйца ў красны колер. Вот еслі перад празнікамі ўмер хто-та ў сям'і, ужэ нельзя красіць.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Маркевіч Аляксандры Уладзіміраўны, 1938 г.н.*

У нас была гульня "У біткі". Білі яйца. Еслі маё пабілася, вы забіраеце, еслі ваша, то я забіраў. Правяралі, моцнае ці не, аб зубы таўкалі. А некаторыя набівалі воск ці смалу. Дырачку маленьку ў яйцэ прабівалі, выпівалі і лілі туды воск, і перад агнём грэлі, тады было крэпкае. Я такія не рабіў, перад Паскаю ўсю дзярэўню абходзіў, выбіраў крэпкія яйца. Красілі іх у красны цвет лукам. Калі хто паміраў у гэты год, то не красілі. Прыходзілі дзеці за валачоным. Давалі ім яйцы або кусок пірага. У гэты дзень хадзілі на могілкі. Бацюшка ў цэркві служыў, прыходзілі ўжэ ў абед, прымерно, ужэ шлі хто ў цэркву, а мы, хлопцы, яічкі білі каля цэркві.

*Запісана ў в. Малева*
*Гацілы Міхаіла Дзмітрыевіча, 1920 г.н.*

Некалі было інакш усё. Прыбіралі ў хатах, дварах. У суботу перад Вялікаднём (чырвоная субота) пяклі булкі і фарбавалі яйкі, да пахла па вуліцам булкамі. Увечары ішлі пад усяночную ў цэркву. А назаўтра хадзілі ў кукольнікі – хадзілі не толькі хлопцы, але і дзяўчата, і бабы, нават у мінулым годзе яны яшчэ хадзілі і спявалі, падыходзілі да хаты і казалі: "Хрыстос васкрэс!" (3 разы) і спявалі:

*Как ангелы на небесі,*
*Все радуйцеся на землі.*
*Все радуйцесь, весяліцесь,*
*Хрыстос васкрэс, Хрыстос васкрэс,*
*Хрыстос васкрэс!*
*В цэрквах лікуйце і в дамах,*
*Нам жызнь адкрыта в небесах.*
*Весяліцесь, все людзі, здзесь,*
*Хрыстос васкрэс, Хрыстос васкрэс,*
*Хрыстос васкрэс!*

Пасля выкання песні казалі:

*На гары Галгофе жыдове стаялі,*
*На красце Ісуса Хрыста распіналі,*
*Пад тым крастом маці стаяла*
*І жаласна гаварыла сыну:*
*– Сын мой вазлюбленный,*
*Сайдзі са краста.*
*– Маць мая родная, не плач, не рыдай.*
*Я ў тры дня васкрэсну,*
*Людзям радасць прынясу.*
*А вы гэту радасць знайце,*
*Валачоннага дайце.*
*Проша даць – не жалаваць,*
*Каб было за што падзякаваць.*

(частуюць гаспадары, нават клікалі ў хату кукольнікаў).

Спявалі песні паненцы:

А ці дома, дома, да паненачка,
Хрыстос васкрэс на ўвесь свет.
Дома, дома, да ні кажацца,
У каморы прыбіраецца.
Кладзе сукенку ўсё й харашэньку,
Кладзе чаравічкі ўсе й невялічкі.
Проша выйсці да на ганачак,
Наш падарак – сорак яек,
Сорак яек сорам даці,
Яшчэ дзесяткаў проша пашукаці,
Яшчэ дзесяткаў да тога кварту гарэлкі,
На закуску сыр бяленькі.

Дзеці малыя не хадзілі ў валачобнікі, хадзілі мужчыны. Пасля абыходу двароў збіраліся ў адной хаце і гулялі. Рэшткі ежы, што засталіся пасля, аддаваліся сабаку, у зямлю нічога не закапвалі. Свянцонае яйка з'ядалі абавязкова. Свянцонае яйка ніколі не неслі на могілкі. Раней на Вялікдзень на могілкі ніхто не ішоў, цяпер ідуць амаль усе. Некалі Радаўніцы не прызнавалі, гэта цяпер. На першы дзень Вялікдня ніхто ў госці не ішоў, на другі – у госці хадзілі.

*Запісана ў в. Сейлавічы*
*ад Хвіцько Вольгі Паўлаўны, 1932 г.н.,*
*Таратуты Соф'і Мікалаеўны, 1934 г.н.*
*Матэрыялы ўзяты з архіва Нясвіжскага раённага цэнтра народнай творчасці*

З дзецтва ўсегда называлі тых, хто хадзіў на Вялікдзень, "кукольнікі". Два гарманіста ў нас была ў дзярэўні. После абеда, часоў у пяць, яны сабіралі кампанію, чалавека чатыры і к вечару сталі хадзіць, песні пець. Яшчэ дзевушка хадзіла пад акном і пела пасхальныя песні. Іх зналі, і кажды дом іх ждал па ўсёй дзярэўні. Кагда прыхадзілі, ім давалі дзеньгі, яйца давалі пасхальныя і такія. У біткі не ігралі, пазней прышло гэта. Наражались, усё пакупалі новае, усем дзецям у сям'е. Эта как закон был пакупаць усё новае. Яйкі красілі ў красны цвет, толька лукам. Красны цвет абычна сімвалічэскі, праздпечны.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Шуковіч Галіны Міхайлаўны, 1946 г.н.*

Яйца фарбавалі ў які хочаш колер, у цыбулі. Калі чалавек памёр, фарбаваць нельга. Іншы раз зялёныя яйкі рабілі. У біткі ігралі на Вялікдзень.

*Запісана ў в. Грыцкавічы*
*ад Заяц Станіславы Іванаўны, 1944 г.н.*

А назаўтра пасля Вялікадня хадзілі кукольнікі. Песні спявалі. І дзяўчаты хадзілі, і хлопцы. І хазяіну, і хазяйцы спявалі. Кожны разочак хадзілі.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Гадун Ядвігі Уладзіміраўны, 1929 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Лесуны Нясвіжскага р-на).*

Перад Вялікаднем гэта вялікі пост. Усе посцяць. У Чысты Чацвер гэта ўжо трэба каб парадак увяздзе быў. Вялікая пятніца – ідом плашчаніцу цалаваць. А ў Красную суботу ўсяночная. У цэркві трэба стаяць. А адзін раз казалі людзі, што ў Кіркаўшчыне гэтыя кукольнікі ходзяць. Дык мой сын прывёз іх. Ну, дык яны паспявалі хараша.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Жук Леаніды Іванаўны, 1938 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Вайнілавічы Нясвіжскага р-на).*

Да Вялікдзеня заўсёды семдзесят дзён посту. Яйкі фарбавалі заўсёды ў шалупіньве цыбулі. Адно ўжэ як у царкаў ужэ пад усюночную прыдзем, ужэ кончыцца служба, я помню, мне, мо, гадоў пяць было, мой бацька спяваў у царкоўным хоры, і маці спявала, дык я ведаю тожэ, што хадзіла з імі ў царкаў заўсёды пад усюночную, то бацюшка ўжэ заўсёды даваў і фіялетавыя, і жоўтыя яйкі, но чым яны красілі, я ўжо гэтага не ведаю. Перад Пасхай заўсёды ўжо бацюшку неслі ці пяць дзесяткаў, ці тры дзесяткі. Людзі значылі яйкі, ён ужэ тады раздаваў дзецям. На Вялікдзень хадзілі кукольнікі, спявалі песні, ну, і ім давалі што-та:

*Вялік святой нам дзень настаў,*
*Ва славу з гроба засіяў*
*Хрыстос Васкрэс. (3 р.)*

*Запісана ў в. Лань*
*ад Чычко Соф'і Рыгораўны, 1934 г.н.*

Вялікдзень – гэта па луне апрэдзеляецца. Каждый год гэта перахадзяшчы празднік, каждый год па-новаму. Вялікдзень – гэта вялікае свята. Само слова "Вялікдзень" абазначае, што гэта вялікі дзень. Еслі кагда-та на Каляды ў Польшчы бедна жылі, цяжэло, на Каляды пяклі булкі із мукі молатай, то на Вялікдзень пяклі пірагі. Ужо яйца красілі, воскам мазалі, украшалі, разрысоўвалі, а патом лажылі ў шалуху лукавую. Дзе памажым воскам, дык ужо разнымі ўзорамі бралася гэтая краска. Садзіліся ўсёй сям'ёй, разгаўляліся. Пасціліс, пост быў. Шчыры называўся. Ваду пілі можа якую. Первы дзень на Вялікдзень гасцей не паложана было прыглашаць, а на другі дзень прыглашалі гасцей. Ужэ кум, кума прыходзілі, хто там дзяцей у каго крысціў.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Халецкай Яўгеніі Іванаўны, 1932 г.н.*

На Красную суботу ішлі ў цэркву пасвянціць. Хто што свянціў: і мяска, і каўбаску, і яйкі. А назаўтра рана садзяцца ўсе свае за стол і пачынаем свенчанае есці, а потым другое. У біткі маладыя гуляюць. Кукольнікі хадзілі. І ўдзень, і ўвечары прыходзілі. Паспяваюць, а ім трэба нешта даць.

*Запісана ў в. Малева*
*ад Верэмеевіч Яніны Дзмітрыеўны, 1938 г.н.*

Ходзяць па хатах, збіраюць валачобнае. У цэркаў едзем асвяшчаць яечка. Яйка фарбавалі ў лупінах цыбулі. Выпякалі пірагі. У біткі гуляем. Звычайна на першы дзень ідуць пад цэркаў і гуляюць, на другі дзень валачобнікі хадзілі.

*Запісана ў в. Малева*
*ад Гацілы Алены Веньямінаўны, 1933 г.н.*

Да гэтага свята Вялікдня пост. На пост нельга сварыцца. А на паследнім тыдні Чацвер Чысты: усё прыбіраем, самім абязацельна нада памыцца. А ў суботу пірагі пяком, яйца красілі, мяса варылі. На Вялікдзень мама прыходзіць з усяночнай, накрывае стол. І ўжо бралі свянцонае яйцо і пірага з'есці нада. А тады разгаўляемся. А патом дзеткі прыходзяць, мама абдарвае іх, і мы ходзім – нам даюць. А патом ходзяць кукольнікі, спяваюць, даём ім грошаў, яечак.

*Запісана ў в. Малева*
*ад Каладзінскай Валянціны Фёдараўны, 1931 г.н.*

Мужыкі яйцамі б'юцца. На трэці дзень кукольнікі ходзяць. Яны прыходзяць, малітвы спяваюць. А іх ужо абдарваеш. А на Вялікдзень усе сходзіліся, выбіралі яйца і гулялі. Як тваё разбілася – аддавай, а чужое – дак табе даюць.

*Запісана ў в. Малева*
*ад Алісіевіч Ніны Міхайлаўны, 1928 г.н.*

На Вялікдзень усё рабілі: варылі яйца, іх красілі, пірагі пяклі. Маладыя ў біткі гулялі.

*Запісана ў в. Малева*
*ад Гацілы Фаіны Іванаўны, 1928 г.н.*

Вялікдзень некалі красіва адзначаўся. Хадзілі на ўсюночную, гатовіліся, некалі не спалі. На Красную суботу ніхто не спаў, маладзёж ішла на ўсюночную, а радзіцелі ўжэ ж гатовілі, пеклі булкі. А раніцай ідзеш пасля ўсяночнай, жаваранацкі паюць, прыйшоў – стол накрыты, усе прыбіраліся. Яйкі фарбавалі лушпою з цыбулі. Гулялі ў біткі, хадзілі ў первый дзень Вялікадня ў цэркаў, маладзёж і пажылыя – усе, і там ужо выбівалі біткі: чыё крапчэйшае яйцо, той навыбівае. Весела некалі было.

*Запісана ў в. Малева*
*ад Ігнатчык Валянціны Усеваладаўны, 1941 г.н.*

Збіраліся раніцай у цэркві. Прыйдуць, пасвенцяць яічкі дак садзяцца, паядуць, а тады ў госці прыходзяць. Яйкі красілі ў красны колер. Толькі тыя, хто памрэ – да года тады красіць нельга. Гулялі ў біткі. Мой брат схітраваў, узяў дзіравянае зрабіў ды пакрасіў, дык як стукне, то ўсе пабітые яйкі. Валачобнікі ў нас хадзілі. Малыя прыходзілі, давалі ім яічкі, пірага якога. У Чысты Чацверг пасля абеда ўжэ нічога не рабілі, а да абеда дома што зробіш. Ужэ з самай раніцы ў Чысты Чацверг наша мама казала, каб усе памыліся. Мыліся ўсе.

*Запісана ў в. Грыцкавічы*
*ад Кандрацюк Антаніны Сцяпанаўны, 1939 г.н.*

Святкавалі Вялікдзень, абавязкова гэта было. Яйкі фарбавалі ў лушпінні з цыбулі. Ну, а як ў каго хто памёр, дык не красілі. Булкі пяклі. А вечарам ужо хадзілі ў кукольнікі. Гэта ўжо ў каго дзяўчына была незамужняя, дак паненцы ўжо яны спявалі.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Церахавец Уладзіславы Францаўны, 1938 г.н.*

Весела было. У кукольнікі хадзілі. Збяромся дзяўчаты і пайшлі ўжо, коўш бяром ці карзіну і пайшлі па хатах, спявалі. Даюць нам яец, булку, поўну карзіну назбіраем. Хадзілі, пелі, і я сама пела. Яйкі фарбавалі ва ўсякі колер, хто як ўздумае. А яшчэ мужчыны нешта рабілі тым яйцам, напіхалі нечым і тады ўжо б'юцца, а яйца цэлыя. Як хто памрэ, дак год ужо не красяць яйкі. Хадзілі на Вялікдзень на могілкі, пакладуць то яйца, гарэлкі нальюць да пастаяць: хто плача, хто смяецца.

*Запісана ў в. Грыцкавічы*
*ад Рудой Таццяны Антонаўны, 1932 г.н.*

Па-першае – пасцілі, сем нядзель пасцілі, гэта быў Вялікі пост. Гэта значыла, што ачышчаем арганізм свой да Паскі. Последняя нядзеля перад Паскай называлася "страстная нядзеля", і цяпер яна называецца так гэтая нядзеля ілі Вялікая нядзеля, Вялікі панядзелак, Вялікі аўторак, Вялікая серада, Вялікі чацвер ілі Чысты Чацвер.

Значыць, у чацвер да ўсходу сонца трэба было памыцца і ў хаце каб усё памыта было чыста, а там ужо да ўсходу сонца хазяева і дзяцей памыюць да Вялікай пятніцы. У Вяліку пятніцу ўжо пасцілі шчырым постам – эта значыць, вабшчэ нічога не елі да двух часоў дня. У два часа ішлі ў цэркву, выносілі плашчаніцу, тады ўжо там цалавалі эту плашчаніцу і ўжо пасля этага можна было паесці. Потым была красная субота. У красную суботу пяклі булкі, красілі яйца ў чырвоны колер, шалухой абычно красілі, шалухой цыбулі. У чырвоны колер красілі таму, што гэта была Хрыстова кроў. У гэтыя вялікія дні ні танцаваць, ні пець нельга было – эта пост быў на ўсё. Не сварыцца, а падобраму каб усе былі.

Паску выпякалі так: рашчынялі цеста, разводзілі цеста, дабаўлялі ванілін, каб пахі былі, і карыцу. Ну, в аснавном в каструлях выпякалі і на вярху крэсцік ставілі. І ў суботу неслі ўжо асвяшчаць у цэркаў, то часоў з двух пачыналася асвяшчэнне, патом усеночная. Хто не ўспеў пасвяціць, прыязжалі ілі прыхадзілі ўжо на ўсёночную з паскамі. І на ўсёночную маглі біцца ў яйкі. Потым хадзілі на могілкі. Трэба было разгавецца, з'есці пасвечанае яйка, першым з усёй яды. Яшчэ некаторыя насілі на магілкі яйцо, кусочак мяса, кусочак хлеба, і гэта ўсё павінна было быць свянцоным. Хадзілі валачобнікі з аркестрам, мужчыны хадзілі, ігралі і пелі песні аднавременна велікодныя:

*Вялік святой наш дзень настаў,*
*Ісус Хрыстос із гроба ўстаў,*
*Алей-ю-я, алей-ю-я,*
*Ісус Хрыстос із гроба ўстаў.*

Валачобнікі абычно стаялі пад акном і пелі, у хату не заходзілі.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Падгайскай Вольгі Дзям'янаўны, 1930 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Лань Нясвіжскага р-на).*

На Пасху хадзілі ў царкву. Кукольнікі хадзілі пад вокнамі і спявалі песні. Елі свянцоныя яйкі.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Габрыновіч Людмілы Мікалаеўны. 1952 г.н.*

На Пасху шчыры пост, пачынаецца з чацвярга, маліліся, свяцілі яйцо, булкі, сала, ваду.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Токар Таісы Пятроўны, 1942 г.н.*

На Пасху ўтрам свяцілі яйкі, булкі. Пеклі пірагі. На Пасху на кладбішча хадзіць нельга.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Лукаш Кацярыны Іосіфаўны, 1941 г.н.*

Вялікдзень – гэта вялікае свята. Таксама ўжо булкі пяклі. Яйкі красілі ў красны цвет, менавіта таму, што Ісус Хрыстос распяты быў. А калі ў хаце была смерць, то ні ў які цвет не фарбавалі, варылі і ўсё. Ой, некалі на Вялікдзень вы б па сялу не прайшлі. Ўжо часоў на дзевяць сяло гудзе. Мужчыны ўжо яйца білі, навыбіваюць іх сваім дзіцяткам. На могілкі ў нас ходзяць на Красную суботу. Ужо ж прыбіралі могілкі. І ў Красную суботу ідзем свечкі паліць. А яйца свянціць прыязжае ўжо бацюшка часоў у двенаццаць. Булкі пяклі, булачкі маленькія, хто мяска, хто кілбаску бярэ, бацюшка свенціць там. Раней кукольнікі хадзілі – мужчыны. О, як спявалі хораша! Ужо цэлу ноч гэтыя кукольнікі хадзілі.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Лурко Мырыі Уладзіміраўны,1937 г.н.*

Ну, да Вялікадня пост быў (сем тыдняў пост быў), а перад Вялікаднем у суботу ўжэ гатовіліся, ну, гатовілі ўжэ ўсякія смашныя стравы там, смажылі мяса і яйца красілі, і булкі пяклі, ну, і ў цэркаў хадзілі, свянцілі яйца і булкі. А тады ўжо раніцай уставалі, першым трэба было з'есці яйцо, а патом ужэ ўсё астальное.

Яйкі фарбавалі ў чырвоны колер. У чырвоны, можа, таму, што Красная субота. Калі ў хаце хто паміраў, яйкі красілі або ў белы, або ў сіні колер. Патом, калі пачаставаліся, хрыстосаваліся: "Хрыстос васкрэс. Ва ісціну васкрэс".

У біткі гулялі, ну, вот біліся. Выходзілі на вуліцу, многа людзей выходзіла з яйцамі. Адзін дзержа, другі б'е: чыё разбілася, той і аддае яйцо.

На могілкі хадзілі. Ну, перад Вялікаднем прыбіраць хадзілі. А на Вялікдзень ужо хадзілі, яйца красныя лажылі.

Раней кукольнікі хадзілі, ну, былі бабы гэтакія, яны песні пець хадзілі. Будучы ў хаце, благаслаўлялі, ну, ім давалі ўжо што з яды, угашчалі.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Хоміч Ганны Сцяпанаўны, 1944 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Каменка Нясвіжскага р-на).*

Мая бабушка, памерла ўжэ, і ў яе была такая кніга, вобшчым, пра багоў така. Вобшчым, там сказавалася так. От дапусцім картошка сеялася там, то на ўраджай зярна і пасхальнае яічка, каторае пакрашанае, трэба было палажыць у першую бароздку. От начынаеш там картошку заворваць, лажылі яечка ці ўвогуле на зярно лажылі. Вобшчым, каб харошы ўражай быў. Потым скажу пра вярбу там: "Не я б'ю – вярба б'е, за тыдзень Вялікдзень. Гані валы на пашу". Бацюшка пасвенціць лапачкі тыя вярбы вадою святою там ўжо, і там ўжо ідуць з іконачкай, і стаіць яна цэлы год. У цвяты ўбіраюць, вязуць да цэрквы, там свенціць бацюшка.

Яйкі фарбавалі ў які хочаш цвет. Калі паміраў чалавек, яйкі красілі ў чорны колер ці не красілі. Хадзілі на ўсеночную, як маладыя былі.

Першы дзень у яйца біліся. Поўна людзей нас ходзіць. Возьмеш яічка, паб'ёш тога, а давай мне сюды. На першы дзень, на магілкі, на кладбішча нясеш там ўжо булачку, но бацюшка сказаў, што нельзя насіць нічога. Хадзілі "кукольнікі". Ну, цяпер няма каму. Песні пад вокнамі пелі:

*Вялікі, святой нам дзень настаў,*
*Хрыстос ва гробу васіяў,*
*Хрыстос васкрэс! (3 р.)*

Быў пост перад Вялікаднём. Сялёдку на стол ставіць там нада. А ў Чысты Чацвер усё прыбіралі ў хаце. Патом ужо ідзе красная субота. У Красную суботу ўжо пірагі пяклі, мяса абварвалі там, кіўбасу, яічкі там, усё. Пасля ўсяночнай сразу яічка свянцонае на стол паложым, парэжам, солька там, хлебушэк. У первую очарадзь нада ўсё этае скушаць, па кусочку папробаваць, а патом ужо ўсё, угашчайся чым хочаш. На Паску трэба было папробаваць усе паскі на стале, якія прыносілі госці. І патом ужо рабі што хочаш, пі гарэлку, пей, гуляй.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Шынгель Наталлі Віктараўны, 1930 г.н.*

Трэба перад Вялікаднём пасціць. Старэнькім людзям як больш за шэсцьдзесят год, то разрышаюць пасціць ужэ ў пятнічку, а так заўсёды я пасціла ў сераду і пятніцу, два дні, само глаўно, што ўжо посціш. Ну, астальныя дні ўжо сяк-так. Трэба ж есці, бо трэба рабіць, як ходзіш на работу, нада вілы было цягаць і драбцы.

Яйкі фарбуюць заўсёды і цяпер у чырвоны колер – кроў Ісуса Хрыста. Калі памёр чалавек, яйкі ніяк не фарбуюць, яйка белае.

Пякуць булкі-паскі ў формачках альбо ў бляшках. Упрыгожваеш, нарысуеш там, дзе што ўскачаеш, ну, да напішаш там што-небудзь да яечкам там на версе памажаш, штоб блішчалі, ды ўсё бялком памажаш.

Ну, у біткі, як было больш людзей, то гулялі. А зараз што, людзей мало: тутака адна баба, другая там, усе старыя ўжэ, ды яна польская, а я руская, не сходзяцца нашыя біткі. Ну, я фарбую яйкі, бо прыязжаюць унукі сюды, бо трэба каб у бабы былі яйцы, то ўжо яны гуляюць.

Паскі хадзіла свяціць я ў касцёл, а як

жа ж. Іду, свячу яечка там, кусочак мяска, піражок маленькі пяку альбо купляю, як палянуюся спячы. На ўсеночную трэба ў касцёл ісці, а цяперака вечарам моляцца, ото перад Вялікаднём, і цэлу ноч быў зал адкрыты. Вось у гэты год была служба ў шэсць часоў раніцы і ішла да васьмі, хораша было ў касцёлі: моляцца, пяюць. Ну, пасля гэтага на могілкі паедзеш, адведаць сваіх родных, блізкіх. Нічога не нясуць на могілкі, не паложана ў нас, ксёндз прыказвае, што на могілкі нельга нічога несці. Ну, ксендз кажа, што не паложана гэта на могілкі ўсё насіць. Вот у рускіх носяць, а мы не носім – не паложано ў польскіх. Потым прыходзіш дамоў і трэба адгаўляцца. Вялікоднае яйка абіраеш, рэжаш яго на кусочкі, солькай свянцонаю пасвенціш, перш яечкі з'ясі, а пасля ўсё па парадку. Кукольнікі хадзілі. Дзеці бывала бегаюць, збіраюць гэта ўсё.

*Запісана ў в. Альбянка*
*ад Татур Браніслаўы Францаўны, 1942 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Саска Ліпка Нясвіжскага р-на).*

Ну, да Вялікадня сем нядзель посту, а тады ўжэ тожэ ідзем да касцёлу, там цэлую ноч ідзе імша, збіраецца народу столькі многа, а тады ўжэ прыходзім з касцёла, дзе і яйца свенцім, усё на свеце, тады ўжэ садзімся есці.

Яйкі фарбавалі ў красный колер, у красны – можа, таму, што Вяльканус, а калі хто памёр, то ваабшчэ не красілі або на цёмны колер красілі – сіні, хто ў каго памрэ. Мы ўсю жызнь красілі яйкі ў цыбулі, шалуху, збіралі і апарвалі, туды клалі яйцы, яны рабіліся харошыя, красныя. Булкі выпякалі, канешне, кожны раз. Рашчынялі цеста, пяклі, упрыгожвалі, рабілі як торт, гулялі яйкамі ў біткі, выбівалі. Як хто паб'е яйцо, значыць, ён забірае яго ад другога – выбіў.

На Вяльканус хадзілі кукольнікі, спявалі, а ім давалі: і яйка давалі, і водку давалі, і кіўбасу давалі там кукольнікам. Звычайна хадзілі маладыя дзяўчаты і хлопцы. Спявалі песні – васолы на Вяльканус. Кукольнікі ў гэты час жадалі гаспадару шчасця, долі, дабра жадалі. Хазяін дзякаваў, што яны прышлі, спасіба гаварыў. Каждый раз, сама главуна, шчасця жадалі.

*Запісана ў в. Альбянка*
*ад Валчок Сафіі Ігнацьеўны, 1935 г.н.*

Некалі на Вялікдзень хадзілі кукольнікі. Як пойдуць хлопцы (я яшчэ дзеўкай была), хадзілі, касцёльныя песні спявалі. Мой тата быў завадатар. Адны мужчыны хадзілі, спявалі касцёльныя песні. А дзе дзяўчына ёсць, дык спявалі песню "Добры вечар" дзяўчыне. Ужо ж усякі як прыйшоў, гэта ж Вялікдзень, бутэльку ўжо на стол ставілі, па чарцы ўжо вып'юць і то прыказуюць: "Ужо давайце лепш, як хто не хоча піць, ужо ў сумку забярэм гэтую бутэльку, і да каго зойдзем у хату, дык разгуляемся, павесялімся ўсе".

*Запісана ў в. Слаўкава*
*ад Драздовіч Яніны Браніславаўны, 1947 г.н.*

Рыхтаваліся, хату прыбіралі, пяклі кулічы (пост да гэтага быў), пасцілі. Ад Каляд да Вялікадня пост быў 6-7 нядзель. Чысцілі хаты, прыбіралі смецце. Два ці тры гады яшчэ назад хадзілі па хатам, я тожэ хадзіла, у нас група была фальклорная ў Смалічах. Ходзім па хатам. І ідзём ужо ў хату, здароваемся, гаворым: "Хрыстос васкрэс, ці рады вы нам?!" І спяваем: "Хрыстоў дзень настаў".

Фарбавалі яйкі ў чырвоны колер (у шалухе цыбулі). Калі смерць была ў хаце, то яйкі не фарбавалі, варылі белымі. Гэта ж жалоба, як вы будзеце весяліцца, ек жалоба ў хаце. Пірагі пяклі, тарты пяклі. У біткі гулялі, у цэркаў хадзілі, усяночная была. У нас на могілкі ходзяць, у нас не было раней такога абычаю, у Красную суботу, калі красяць яйца, людзі ідуць зараз і ставяць свечкі. Бацюшка гаворыць, што такога няма ў царкоўным, штоб у Красну суботу ішлі на могілкі. На Радаўніцу тожэ хадзілі. Бацюшка казаў, што не павінны пакідаць на могілках свянцонае яйцо, свенчаны пірог, таму што птушкі зляталіся і ўсё з'ядалі.

Валачобнікі хадзілі, я і сама хадзіла. Вот сабіраемся (цэлая кампанія), хто з гармошкай ці з баянамі, прыходзім у хату, здароваемся.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Шынгель Ганны Іванаўны, 1934 г.н.*

Ну, на Вялікдзень булкі пяклі і яйца красілі ў красны колер, таму што Ісус Хрыстос васкрэс і праліў сваю святую кроў. Калі ў хаце была смерць, то яек не фарбавалі, яны былі проста белымі, проста варылі. У біткі таксама гулялі, ой, некалі па сяле прайшла ў часоў 9, то і сяло гудзе, гэтыя яйца ўжо білі, ой, некалі





весела было. На могілкі ў нас хадзілі ў Красну суботу, прыбіралі ўжо, булкі пяклі, мяса, а потым бацюшка свенціць. Валачобнікі хадзілі, гэта былі мужчыны. Яны хадзілі і спявалі цэлу ноч. То ў тым сяле, то ў тым хадзілі гэтыя кукольнікі.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Гурко Марыі Адамаўны, 1945 г.н.*

Фарбавалі на Вялікдзень яйкі, это одно ек у каго смерць, то не фарбавалі, былі яны беленькіе.

Мы ўсе прыбіраемся, булкі пячом, мяса тушым. У біткі гулялі таксама. Ходзім на могілкі кажды раз.

*Запісана ў в. Казлы*
*ад Карачун Марыі Сямёнаўны, 1936 г.н.*

Пасціліся перад Вялікднём, прыходзілі ў цэркаў, выносілі плашчаніцу, у суботу ўвечары хадзілі яечкі свянціць, пеўчая бабуля песні пела ў цэркві. У чатыры часы хадзілі ўсё свянціць. Красілі яйкі ў лупінках цыбулі. Калі ў хаце хтосьці паміраў, то яйкі не красілі. Скарлупку ад свянцовага яечка не выкідвалі, а закопвалі на полі, каб быў ураджай.

*Запісана ў в. Малева*
*ад Шах Зінаіды Атонаўны, 1928 г.н.*

Пяклі на Пасху булкі, хадзілі ў суботу ў царкву. Красілі яечкі ў красны колер. Шкарлупку аддавалі курам. У пяць часоў свенцяць пасху.

*Запісана ў в. Малева*
*ад Акулік Галіны Уладзіміраўны, 1947 г.н.*

Калі пяклі на Пасху булкі, то прыгаворвалі: "Бог міленькі, дай, каб булкі ўдаліся". Яйкі красілі ў шалуху ад цыбулі.

*Запісана ў в. Нялепава*
*ад Захарэц Ірыны Васільеўны, 1932 г.н.*

Булкі на Пасху пяклі, пасціліся, яйкі красілі ў красны колер, шкарлупу ад яек курам аддавалі, у суботу бацюшка прыязжаў свяціць.

*Запісана ў в. Нялепава*
*ад Буйко Таццяны Аляксандраўны, 1923г.н.*

На Вялікдзень выпякалі булкі, пасціліся. Серада і пятніца – былі заўсюды, посныя дні, так называюць. Яйкі красілі, ды ні красілі, як памрэ хто. Прыбіраеш к Вялікадню ўсё. Пасху адносім у царкву, тут у Лані царква е. Прыязжае бацюшка ў суботу і свенціць. Збіраюцца людзі каля краста, і бацюшка свенціць ды расходзяцца дадому.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Галабурды Яўгеніі Уласаўны, 1934 г.н.*

Пасху вельмі ждалі ў дзецтве. Бралі ўкрашаныя карзінкі, хадзілі па вёсцы і гаварылі: "Хрыстос воскрес". Сабіралі карзінку розных падарункаў. Давалі свячоныя яйкі. Іх каталі з вяршыны ўніз, гулялі так. Білі яйкі, у каго не разбівалася, той выйграваў. Дзяліліся яйкамі.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Коканавай Алены Вікенцьеўны, 1940 г.н.*

На Вялікдзень хадзілі ў госці з гармонікам. Мяняліся пірагамі, гулялі, забаўляліся. Бегалі дзеці – "кукольнікі", спявалі песні, а іх потым угашчалі, адарвалі падарункамі. Яшчэ хадзілі ў лес завіваць бярозкі, папаратнік.

*Запісана ў в. Альхоўка*
*ад Драчан Надзеі Міхайлаўны, 1932 г.н.*

На Вялікдзень хадзілі на могілкі. Яшчэ кукольнікі песні спявалі, ім за гэта давалі ежу, свянцоныя яйкі, а яны спявалі песні. Яйкі былі фарбаваныя.

*Запісана ў в. Гусакі*
*ад Гесь Ніны Пятроўны, 1929 г.н.*

Маленне пачыналася з чацвярга. Яго яшчэ называлі "Вялікі Чацверг". Хадзілі ў касцёл. Сабіраліся вечарам абычна на пятніцу і зноў хадзілі ў касцёл. А ў суботу было ўжо і вечарам набажэнства, а ўвечары ўжо гулялі. Заўсёды красілі яйца, хто ў які колер жадае. Раней дзеці яшчэ яйкі распісвалі і абвязвалі ніткамі. Гатаваліся да празніка як умелі, пяклі пірагі, запякалі мяса, рабілі калбасы і катлеткі. Затым гаспадыні ішлі на ўсюночную ў цэркву. А ў цэркве і касцёле асвячалася ўжо ежа, і ўранні прыходзілі дадому і гулялі "на ў біткі". Калі прыходзілі ў госці, то былі павінны казаць "Хрыстос васкрэс", а гаспадар павінен быў адказаць "Ва ісціну васкрэс".

Валачобнікі таксама хадзілі і спявалі песні. Спачатку яны прасілі дазволу паспяваць, віншавалі са святам. Малым давалі яйкі і гулялі ў біткі. На гэты празнік раней яшчэ гатавалі саладуху. Трэба была жытняя мука, трэба было яе рашчыніць, а потым яна ад-

стайвалася, потым залівалася вадзічка, затым варылася, была яна сама жыдзенькая, яе можна было папіць і паесці з хлебам.

*Запісана ў в. Слаўкава*
*ад Харытонавай Чаславы Баляславаўны, 1946 г.н.*

## Радаўніца

На Радаўніцу да абеду хадзілі ў цэркаў, а пасля абеда ўжэ едзем свечкі ставіць, памолімся. А пасля абеда можна ўжэ ўсю работу рабіць дома.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Качура Тацціяны Паўлаўны, 1948 г.н.*

Святкавалі нядаўна гэтую Радаўніцу. На могілкі хадзілі памінаць.

*Запісана ў в. Грыцкавічы*
*ад Заяц (Пятроўскай) Марыі Антонаўны, 1937 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Мацылеўшчына Нясвіжскага р-на).*

Перад Радуніцай добра ўбіралі кладбішча: кветак насажаюць, пакрасяць усё. Красяць яечкі і нясуць на кладбішча. На магілкі кладуць яйкі і пару цукерак, моляцца і ідуць дамой.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Атрошчанка Анастасіі Аляксееўны, 1929 г.н.*

Моляцца, свецяць усё кладбішча, каждый к сваёй радне ходзяць. Бацюшка асвеціць, у цэркве моляцца, падаецца запіска. Сваіх умерлых людзі падаюць. На кладбішча ў нас ходзяць с утра, там не пяюць, не ядуць, потым свеціць бацюшка. Яйца ложаць. Ну, гаворыць бацюшка, каб не лажылі, а так ложаць і канфеты, яйца ложаць.

*Запісана ў в. Новы Сноў*
*ад Абрамовіч (Ярашэвіч) Станіславы Антонаўны, 1938 г.н.*

На Радаўніцу ў цэркву хадзілі, на кладбішча хадзілі, паміналі. А дома павячэраем і ўсё.

*Запісана ў в. Сычэва*
*ад Казей Валянціны Паўлаўны, 1930 г.н.*

На Радаўніцу паміналі памерлых, на могілкі хадзілі, яйкі і булкі клалі.

*Запісана ў в. Сычэва*
*ад Юхноўскай Алены Антонаўны, 1935 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Малева Нясвіжскага р-на).*

Некалі мы не хадзілі на кладбішча, гэта вось толькі гэтыя годы. Канфет там паложым, пастаім, паплачам да і ўсё.

*Запісана ў в. Карцэвічы*
*ад Цвірко Алены Пятроўны, 1941 г.н.*

На кладбішча ездзім, свечку запалім, памолімся каля магілкі, хто ў каго пахаваны. Некаторыя сабіраюцца і атмячаюць на кладбішчы.

*Запісана ў в. Карцэвічы*
*ад Крыўко Наталлі Мікалаеўны, 1934 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Малева Нясвіжскага р-на).*

На кладбішчы раз у год звалі бацюшку, штоб ён там маліўся. Гэта пасля Вялікадня да Радаўніцы бацюшка прыходзіў.

*Запісана ў в. Вайнілавічы*
*ад Запольскага Валянціна Валянцінавіча, 1957 г.н.*

Ну, у нас асоба не ходзяць на Радаўніцу на кладбішча, больш ходзяць на Міколу. Але ж людзі прыязжаюць.

*Запісана ў в. Карцэвічы*
*ад Усовіч Надзеі Максімаўны, 1947 г.н.*

Радаўніцу ў нас раней ніхто не азначаў. Гэта зараз так зрабілі.

*Запісана ў в. Вайнілавічы*
*ад Кіпець Тамары Рыгораўны, 1926 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Асмолава Нясвіжскага р-на).*

На Радуніцу ўсе ідуць на кладбішча. Памоляцца. Паабедаюць.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Кавальчук Аляксандры Паўлаўны, 1931 г.н.*

На Радаўніцу ўсе на кладбішча ідуць, падаюць запіскі. Свечачку ставяць, канфеты ложаць.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Драчан Ірыны Міхайлаўны, 1933 г.н.*

Хадзілі на Радаўніцу ў цэркаў. Да, гэта на Радаўніцу ідуць на кладбішча. Прыбіраюць кладбішча.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Маркевіч Аляксандры Уладзіміраўны,1938 г.н.*

Заўсёды на Радаўніцу ходзім на могілкі. Спачатку ў царкву, а дочка мая ў Мінску таксама ўспамінае ўсопшых. Я хадзіла на Радаўніцу на могілкі, бацюшка абышоў, пасвянціў.

*Запісана ў в. Казлы*
*ад Карачун Марыі Сямёнаўны, 1936 г.н.*



Нясвіжскага краю напеў векавы

## Юр'я

На Юр'е, первы дзень, кагда выганялі скот на пашу. На Юр'е всегда пастухам сумку прыбіралі. Поле абыходзілі, штоб расло ўсё добра. Іконку абязацельна бралі і чыталі малітвачку за ўражай.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Качуры Тацціяны Паўлаўны, 1948 г.н.*

На Юр'я яйца фарбуюць, але ж нікому не даюць, самі ядуць.

*Запісана ў в. Альхоўка*
*ад Вальчык Анастасіі Іванаўны, 1927 г.н.*

А як жа ж у нашай вёсцы Юр'я было. Ну, што рабілі, святкавалі, ё і песні пра Юр'я:

*Святы Юрый, дзе же ты бываў?*
*– У полі хадзіў, жыта радзіў.*

Абыходзілі поле з бацюшкам, назначалі дзень на Міколу. Заўсёды ў цэркві маліліся, бацюшка прыязджаў, хадзілі на кладбішча, запісвалі пакойнікаў, свяцілі магілкі. Вярбою выганялі кароў. На Юр'я фарбавалі яйцо.

*Запісана ў в. Альхоўка*
*ад Драчан (Грахоўскай) Людмілы Антонаўны, 1923 г.н.*

На Юр'е выганяем каровы першы раз у поле.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Акулік Марыі Уладзіміраўны, 1944 г.н.*

Кажуць у нас, што як певень нап'ецца вадзіцы, дык на Юр'е карова наесца травіцы.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Бабко Ірыны Васільеўны, 1946 г.н.*

На Юр'е выганяюць кароў на поле. Росу абходзілі. Сначала хазяін, а затым усе астатнія. Абходзілі толькі мужчыны.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Гадун Алены Вікенцьеўны, 1924 г.н.*

На Юр'е ўжэ карову выганяюць на пашу. Вярбою выганялі кароўкі.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Сінькевіч Вольгі Віктараўны, 1927 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Каменка Нясвіжскага р-на).*

Гэта ж шостага мая Юрэй. Выганялі ж некалі кароў. Гэта калі вербніца, свяцілі ж вярбу. І цяпер свецяць. Тую вярбу дзяржалі ў хаці. Цяпер ужэ возьмем і спалім, а некалі ж той вярбою карову выганялі. Б'юць па карове ўжэ тою вярбою: "Не я б'ю, вярба б'е, за тыдзень Вялікдзень". У цэркві стаю, вярбою ўжо б'юць. Па ком шлопаюць, дык так кажуць.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Шарапы Анастасіі Сцяпанаўны, 1933 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Каменка Нясвіжскага р-на).*

Кароў абычна выганялі ў первы дзень на Юр'е, ну, як сказаць, первы дзень пасля зімы. Кароў выпускаюць, яны б'юцца, не прывыкшыя яшчэ, бывала, хто новую купіў. Сабіраліся ўсім сялом, выганялі кароў, потым сабіраўся стол.

*Запісана ў в. Вайнілавічы*
*ад Запольскага Валянціна Валянцінавіча, 1957 г.н.*

Выганяюць на Юр'е на росы кароў першы раз. Стараліся босінькімі нагамі пабегаць па расе, мыліся.

*Запісана ў в. Вайнілавічы*
*ад Камлач Вольгі Іванаўны, 1934 г.н.*

Хадзілі на Юр'е мужчыны, бралі хлеб і гарэлку і хадзілі на Юр'я на поле, што яны там рабілі тыя мужчыны: абходвалі палеткі, авёс, штоб бура не паламала, штоб не палажыла. Гэтакі абрад быў. Рана ўставалі. На Юр'е першы раз выганялі на поле карову. Трэба свянцонай вярбой выгнаць карову са словамі:

*Не я б'ю, вярба б'е,*
*За тыдзень Вялікдзень.*
*Уставай рана, еж кашу,*
*Гані вала на пашу.*

Ну, эта тожа ўсіх білі ў хаце вярбою свянцонаю. Хто прыдзе ў госці, дык свянцонаю вярбою білі.

*Запісана ў в. Вайнілавічы*
*ад Кароль Ніны Вячаславаўны, 1927 г.н.*

На Юр'я былі танцы. Першы раз выганяюць у поле кароў. Старыя людзі хадзілі і свянцілі збожжа, каб расло ўсё хораша. На Юр'я трэба было раненька падаіць карову, пакуль сонейка ўсходзіць.

*Запісана ў в. Вайнілавічы*
*ад Кіпець Уладзіміра Рыгоравіча, 1926 г.н.*

Быў Юр'е, свята было, 6 гэта мая. Абычай такі быў прыходзілі саседзі на мяжу. Паўлітра

бралі мужчыны з сабою і атмячалі празнік. І ў гэты дзень выганялі кароў на росу. Каб здаровая скаціна была, каб усё добра было вясною, гэтакі абычай быў на Юр'е. Гэта 6 мая было.

*Запісана ў в. Вайнілавічы*
*ад Кіпець Тамары Рыгораўны, 1926 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Асмолава Нясвіжскага р-на).*

На Юр'е першы раз у поле кароў вярбою выганялі.

*Запісана ў в. Жанкавічы*
*ад Карачун Ганны Трафімаўны, 1930 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Каменка Нясвіжскага р-на).*

Кароў заўсёды выганялі на Юр'я. Вярбой выганялі. Пасцілі кароў па дварах.

*Запісана ў в. Карцэвічы*
*ад Асіповіч Вольгі Дзмітрыеўны, 1954 г.н.*

Нічога ніхто на Юр'е не рабіў. На Юр'е кароў на росу выганялі. Самі па расе бегалі.

*Запісана ў в. Карцэвічы*
*ад Драчан Соф'і Адамаўны, 1924 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Альхоўка Нясвіжскага р-на).*

Мы, канешне, святкуем Юр'я. На Юр'я быў закон выганяць кароў, абыйці сваю збажыну, жыта, пшаніцу. Трэба ўзяць вярбы дубчык і карову выганяць свянцоным дубчыкам, гэта такі закон быў. Па расе босыя бегалі.

*Запісана ў в. Карцэвічы*
*ад Крыўко Наталлі Мікалаеўны, 1934 г.н.*

На Юр'е выганялі карову ў поле. Ну, сабіралісь усім сялом там, усе сядзелі там, выпівалі, гульні былі. Перад парогам у хлеў клалі крапіву.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Шусты Марыі Антонаўны,1940 г.н.*

На Юр'я выганялі кароў у поле і білі вярбою.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Аксак Ганны Мікалаеўны, 1952 г.н.*

Першы раз на Юр'я кароў выганялі. Бралі мужчыны з сабою выпіць і закусіць, там ужэ гулялі. Хто вярбою выганяў, а хто палкамі. Як малая была, то помню, як пяклі сала, бралі скаварады, пяклі яйцы. Яйкі красілі ў чырвоны цвет, у цыбульнік гэты. Калі нябожчык, тады ўжо было яйцо белае, абыкнавеннае.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Лепяцілы Ніны Уладзіміраўны, 1930 г.н.*

Карову першы раз выганялі на Юр'я: хто вярбою, хто дубцом, хто на рогі завязваў трапку ад вачэй. У цэркві даюць просвітку, шо прыносілі дадому. Мы за сяло выганялі карову ўсе разам у адзін дзень. Хто, прымерна, прошлы год, на ком чарга закончылась, то апяць ужэ следушчы начынаў. Усе ішлі дадому, кароў пакідалі.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Лях Марыі Сільвестраўны, 1943 г.н.*

Выганялі на пашу кароў, на росу. Мужчыны выганялі, і тады ўжо збіраюцца саседзі і на полі па чарцы выпіваюць.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Матус Яўгеніі Міхайлаўны, 1930 г.н.*

Абыходзяць на Юр'е пашу, выганяюць кароў пасціць, бо трава маладая зялёная.

*Запісана ў в. Новы Сноў*
*ад Абрамовіч (Ярашэвіч) Станіславы Антонаўны 1938 г.н.*

Юр'я – празнік, святкавалі, але атмячалі не так знаменіта. Мама і папа красяць два яйцы. Гэты Юрый – гэта святы Георгій. Святы Георгій – гэта Пабеданосец. Папа ранелька ўставаў, браў хлеба, солі, 2-3 яйца і ідзе абыходзіць усё сваё поле, каб радзіла. У царкву ездзілі, у каго врэмя есць. Работы ў свята не рабілі. Выганялі заранне кароў на пашу. Трэба, каб на Юр'е прайшоў дожджык, каб кароўкі малачка многа давалі.

*Запісана ў в. Слаўкава*
*ад Халоп Марыі Аляксандраўны, 1933 г.н.*

На Юр'е ў цэркву пойдуць, памоляцца, каровак на поле выпускалі. Адмячалі вясной, скора после Пасхі. Казалі:

Юрый па полю хадзіў, а Мікола пытае:
– Дзе ж ты, Юрый, быў?
– Жыта, пшаніцу радзіў.
– Ты зарадзіў, але я праверу.

*Запісана ў в. Слаўкава*
*ад Шыкулы Яўгеніі Іосіфаўны, 1914 г.н.*

На Юр'е кароў заганялі на пашу, бралі гарэлку і закуску. Яшчэ пілі і танцавалі. Перад тым як выгнаць карову, білі вярбою, каб здарова была. Абыходзілі поле абязацельна. А як не абыходзілі, то браў папа каня і аб'язжаў свае дзялкі.

*Запісана ў в. Смалічы*
*ад Гуцько Аляксандра Іванавіча, 1931 г.н.*





Юр'е абыкнавенна святкавалі. Проста празнік і ўсё. Як позні Юрай, а трава ўжэ зялёна, то раней выганялі кароў. На Юрай усе сабіраліся і выганялі кароў, выпівалі на мяжы.

*Запісана ў в. Смалічы*
*ад Шчурскай Ірыны Мікалаеўны, 1935 г.н.*

На Юр'е выганялі карову, стукнуць вярбою, штоб не хварэла, штоб здаровая была. Некалі мужчыны абыдуць поле, сядуць у канцы, вып'юць.

*Запісана ў в. Сычэва*
*ад Бараноўскай Марыі Фёдараўны, 1926 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Карцэвічы Нясвіжскага р-на).*

Юр'е святкавалі абыкнавенна. Кароў выводзілі. Сколькі кароў – столькі і пастухоў нада. Бутылачку бралі, закуску.

*Запісана ў в. Сычэва*
*ад Казей Валянціны Паўлаўны, 1930 г.н.*

На Юр'е выганялі дамашніх кароў у поле. У нас ніхто поле не абыходзіў. Песні спявалі.

*Запісана ў в. Сычэва*
*ад Комар Марыі Вікенцьеўны, 1941 г.н.*

На Ю'ре яйцо зварылі, паелі і ўсё. Раней выганіш кароўку, яйцо падварыш, паясі на полі.

*Запісана ў в. Сычэва*
*ад Сандрос Вольгі Марцінаўны, 1929 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Андрушы Нясвіжскага р-на).*

Юр'е – гэта на шостае мая кароў выганялі. Поле на Юр'е абыходзілі старэйшыя людзі, бо яны ж разумнейшыя былі.

*Запісана ў в. Сычэва*
*ад Юхноўскай Алены Антонаўны, 1935 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Малева Нясвіжскага р-на).*

Было Юр'е – свята. У цэркаў хадзілі. Абедня правілася. Пабылі ў цэркве, прыдзем дадому. Кароў выганялі раніцай. Раненька да ўсходу сонца выганялі кароў пасціць. Вербачкаю білі. Хадзілі тыя, хто кароў пасціць. Усе бралі бутылку, і там яны атмячалі.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Кавальчук Аляксандры Паўлаўны, 1931 г.н.*

У праваслаўных ёсць гэта свята. Гаварылі, што на Юр'е выганяюць карову.

*Запісана ў в. Альбянка*
*ад Гібчык Юзэфы Францаўны, 1931 г.н.*

Выганялі карову першы раз на Юр'е. Там ужо мужчыны сабяруцца, па сто грам вып'юць і атмячаюць ужо Юр'е. Засцярагалі карову ад ведзьмы.

*Запісана ў в. Малева*
*Гаціла Міхаіла Дзмітрыевіча, 1920 г.н.*

Кажды праводзіў на шостага мая на Юр'е карову ў поле. Нейкія лентачкі на рага навязвалі.

*Запісана ў в. Малева*
*ад Васільевай Зінаіды Віктараўны, 1950 г.н.*

На Юр'я гэта рана ўставалі, абходзілі свае паля, каб быў ураджай. Кароў на Юр'я выганялі: бяруць вярбу, абыходзяць двор, а тады выганяюць жывёлу. Клалі на стоўбіках у варотах крапіву, каб нічога дрэннага не было.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Гадун Ядвігі Уладзіміраўны, 1929 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Лесуны Нясвіжскага р-на).*

На Юр'я (гэта некалі былі адзіналічнікі, не было калхозу) дак я знаю, мой тата, маці напячэ пірагоў, яец і сыра і кожны сваё поле абходзіць, і кусочык паложыць хлеба, сыра і яечка. На Юр'я свянцяць траву, каровам даюць. На Юр'я кароў выганяюць, ну, дак мы сядзем да абрус на стол засцелем, да страў пананосім, да п'ём, да гуляем. І спяваем, і гуляем.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Жук Леаніды Іванаўны, 1938 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Вайнілавічы Нясвіжскага р-на).*

Ну, як яшчэ некалі бацькі жылі нашы, на Юр'я заўсёды выйдзе бацька на поле і свянцонымі каласкамі накраст засеўкі зробіць.

Дзевятага дзекабра – Юр'я зімовы, а шостага мая – Юр'я вясновы.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Чычко Соф'і Рыгораўны, 1934 г.н.*

Некалі на Юр'е старыкі выганялі кароў, пастух быў, яму торбачку сабіралі.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Халецкай Яўгеніі Іванаўны, 1932 г.н.*

Юрэй – эта ў маі, шостага, і дзевушкі, і парні хадзілі на Юрэй да васхода сонца басіком па расе. Гаварацъ, што здаровым будзеш і на Юрэй первый раз кароў выганялі. Ужэ як харошая пара, гаварылі, харошы год на ўражай ужэ быў.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Каржанеўскай Антаніны Арыстархаўны, 1929 г.н.*

Выганялі заўсёды на Юр'я кароў пасвіць – першы дзень, гэта шостага мая.

*Запісана ў в. Малева*
*ад Верэмеевіч Яніны Дзмітрыеўны, 1938 г.н.*

На Юр'я святкавалі. На Юрэў дзень карову выганялі на пашу. Мужчыны некалі палі абыходзілі. Тато абходзіў мой вакол расы. На Юр'я кажан раз выганяюць жывёлу на расу. У нас на Юр'е на фэст ездзілі.

*Запісана ў в. Малева*
*ад Ігнатчык Валянціны Усеваладаўны, 1941 г.н.*

На Юр'е палі абыходзілі з яйцом, выганялі карову. Карову выганялі з ранку самага. Гаварылі словы, каб была добра да малако было. Выганялі карову пасвечанай вярбой. Каб засцерагчы ад ведзьмы, вешалі карове на аброжак сумку свянцону, тады карову выганялі, і тады карова не будзе баяцца, а ў хлеў кідалі крапіву, хлеў свенцілі.

*Запісана ў в. Грыцкавічы*
*ад Кандрацюк Антаніны Сцяпанаўны, 1939 г.н.*

Абыходзілі палі. На Юр'я, кажуць, трэба, каб было ў каждага дурня. Ну, гэта пра корм жывёлы. Выганяюць вясной кароў у поле. Выганялі ўсе, кажды сваю. Трэба, каб каждая пабыла. Потым рабілі на полі так званыя обшчыя "госці" – адзначалі ўжо першы дзень, як выганялі.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Церахавец Уладзіславы Францаўны, 1938 г.н.*

Кароў на Юр'е выганялі ў поле. Старэйшыя людзі косткі ўтыкалі ў зямлю навокала сваёй зямлі, што засталіся пасля Вялікадня. Карову на раніцу выганяюць, каб малака многа дала.

*Запісана ў в. Грыцкавічы*
*ад Рудой Таццяны Антонаўны, 1932 г.н.*

Юр'е – гэта свята 6 мая. Наша скаціна ўжо с'ела ўсю нашу ежу, і мы дацягвалі яе да першай траўкі. Гавараць: да Юр'я нам трэба карміць дурня, а пасля Юр'я хай сам корміцца. Гавораць, што раса на Юр'я калеча жывёлу: у кароў няма малака, маленькіх цялят робіць сляпымі, ўся жывёла гібне. Але еслі пасці скот і біць яго асвечанай вербай, то скот будзе пладавіты.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Базарнавай Марыі Ігнацьеўны, 1922 г.н.*

На Юр'е была лекарная раса, ёй мазалі вочы, калі яны балелі, кароў мылі расой, каб у іх было шмат малака. Ноччу выганялі скот, гаспадар маліўся, каб скот быў цэлы, браў яйкі, абыходзіў скот і клаў іх пад падлогу. Часаў скот па тры разы і потым аддаваў пасці іх. А пастушку даваў яйкі, муку, мяса і малако.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Дзянішчык Неанілы Ільінічны, 1937 г.н.*

Ну, вось, лажылі абрус на стол, запальвалі свячу і пасыпалі хлеб соллю. Маліліся. Скаціну мылі вадою. Бацька кланіўся пяцьдзясят разоў і гаварыў: "Бяры хлеб з соллю, глядзі скаціну, каб не здарылася дрэннага".

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Жукоўскай Зоі Аляксандраўны, 1933 г.н.*

На Юр'е што рабілі – выганялі каровы на расу раніцай, гаварылі: "На Юр'еву расу. Як на Юр'е раса, будзе добры ўраджай". І гаварылі: "Трэба пайці па расе і пакачацца на спіне, каб спіна не балела". Абыходзілі поле на Юр'е. Яшчэ помню, як абыходзіў мой ацец. На Юр'е выганялі карову, бо так прынята было, тады не было ні календароў, нічога.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Падгайскай Вольгі Дзям'янаўны, 1930 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Лань Нясвіжскага р-на).*

Карову заўсёды на Юр'е выганялі на пашу. Некаторыя кажуць, што падалі ў расу, і кажуць, што памагала. Гэтая назва свята праізашла, мабыць, ад нейкага святога Юрыя.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Лурко Мырыі Уладзіміраўны, 1937 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Смалічы Нясвіжскага р-на).*

На Юр'я тожэ булкі пяклі. Кароў выганялі на першую расу. Па расе хадзілі, каталіся. Чаму ж не?! Яйца цераз хлеў кідалі.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Шынгель Наталлі Віктараўны, 1930 г.н.*

Каровы адно выганяюць раніцаю, на расу. Бярэш вярбу і выганяеш вярбою карову на Юр'е. Выганялі кароў разоў тры палачкай.

*Запісана ў в. Альбянка*
*ад Татур Браніславы Францаўны, 1942 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Саска Ліпка Нясвіжскага р-на).*

Выганялі карову на юр'еву росу. Свянцонай вярбой перахрэшчвалі і выганялі на пашу карову. Быў закон на Юр'е: першы раз на пашу карову выганялі з вярбою.

*Запісана ў в. Альбянка*
*ад Санько Марыі Канстанцінаўны, 1926 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Карцэвічы Нясвіжскага р-на).*

На Юр'е выганялі каровы, першы дзень на раніцу. Выганялі яе хто вярбой, хто ліпаю. Ну, і каб ужэ карова ішла на пастбішчэ, каб малака многа давала. Яшчэ як карова была ў хляве, яе свянцонай вадой пырскалі.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Хоміч Ганны Сцяпанаўны, 1944 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Каменка Нясвіжскага р-на).*

На Юр'е некалі выганялі карову ў поле з хлява, бо гэта добры дзень. А так больш нічога не рабілі.

*Запісана ў в. Цякалаўшчына*
*ад Кавальчук Валянціны Вікенцьеўны, 1950 г.н.*

На Юр'е некалі ў нас танцы былі. Як Юр'е, дык ужо танцы. Мы таго музыканта частуем, трэба ж даць гарманісту і павячэраць. І самі ўжо, хто як хто можа.

*Запісана ў в. Слаўкава*
*ад Драздовіч Яніны Браніславаўны, 1947 г.н.*

Выганялі карову ў поле, білі свянцонай вярбой, каб была паслушна, многа малака давала, прыходзіла дадому, нікуды не бегала. Басяком па расе бегалі. Гэта было сімвалам здароўя.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Шынгель Ганны Іванаўны, 1934 г.н.*

Каровы выганялі на пашу. Качаліся па расе, ну, казалі, што гэта памагае ізбавіцца ад розных хвароб. Свята Юр'е так называецца таму, што быў святы чалавек Юрэй.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Гурко Марыі Адамаўны, 1945 г.н.*

Першы раз выганялі карову ў поле, пры гэтым білі яе свянцонай вярбой і прыгаворвалі, каб яна прыйшла да хаты.

*Запісана ў в. Нялепава*
*ад Буйко Таццяны Аляксандраўны, 1923 г.н.*

На Юр'е абходзілі поле. Свянцоных яек скарлупу хавалі да Юр'я. Абходзілі найбольш каля жыта. Закапвалі гэту скарлупу, гэта каб ужо быў добры ўраджай. Захоўвалі ў вуглу да заходу сонца. Бралі з сабой яечню, сала, каўбасу.

Мужчыны распальвалі касцёрчык. Рассцілалі абрусы, садзіліся каля поля.

*Запісана ў в. Грыцкавічы*
*ад Захарэц Сафіі Мікалаеўны, 1941 г.н.*

На Юр'е першы раз выганялі кароў у поле, абычна на 6 мая. На Юр'я кожная гаспадынька сваю кароўку з вярбой выганяла. Пас кароў пастух. Ён назначаўся па чарзе ўвосень, на кім закончвалася чарга, а ўвесну наступны чалавек пачынаў пасвіць. На Юр'е смажылі яічніцу на вуліцы на каменнях. Яшчэ раней некалькі хат наймалі пастуха. Яму з сабой давалі пачастункі, і ён пасвіў кождый дзень. Кожны дзень пастух не мяняўся. Калі находзілі пад хлявом яйкі, то гаварылі што хтосьці нешта прырабіў кепскае. Ад іспугу скаціну лячыла бабка. Брала воск і растаплівала ў місачку над вадой і гаварыла якусьці малітву. Потым вылівала той растоплены воск з маліткамі. Вадзічка была свянцовая. Яшчэ жывёлу загаварвалі, былі такія жанчынкі, якія займаліся гэтым.

*Запісана ў в. Слаўкава*
*ад Харытонавай Чаславы Баляславаўны., 1946 г.н.*

Бралі каня, украшалі яго. Засцілалі белай просцілкай. Садзілі Юр'я. Надзявалі ціпа маску. А Юр'я быў такі весь у доспехах. Юр'я заўсёды праводзілася, як выганялі кароў. Мы бралі свянцовую воду, замок, вярбу. Мы хадзілі вакол гэтага стада. Палівалі вадой, закопвалі замок, а замок закопвалі для таго, каб воўк не накінуўся на жывёлу. Лажылі яйка, каб карова пераступіла. І ім абкатвалі карову.

*Запісана ў в. Казлы*
*ад Яраш Галіны Палікарпаўны, 1950 г.н.*

На Юр'е выганялі раненька кароўку. Мужчыны і жанчыны пасвілі. Ім з сабой давалі крашаныя яечкі, бутылку і хлеб яны бяруць. Зямлю ключом адкрываюць. Казалі, калі галка схавалася ў жыце, значыцца, ураджай будзе харошы. А як будзе відна, то ўраджай будзе плахі.

*Запісана ў в. Смалічы*
*ад Мірончык Ірыны Пятроўны, 1936 г.н.*

## Мікола

22 мая Мікола ў нас. Усе ідуць на могілкі. Бацюшка прыязжае, могілкі свенціць.

*Запісана ў в. Карцэвічы*
*ад Усовіч Надзеі Максімаўны, 1947 г.н.*

## Тройца (Сёмуха)

На Тройцу ў нас бярозкі ставяць возле калiткi, а затым аер у хаце сыпалi – каб усё было харашо. У цэркаў iдуць, моляцца. Ну, i дадому iдзеш, святкуеш. Нiчога не дзелаеш.

*Запiсана ў г. Нясвiж*
*ад Высоцкай (Чараповiч) Валянцiны Аляксандраўны, 1935 г.н.*

На Тройцу дома ўсё ўбiралi, рвалi бярозу. Да сценкi прыбiвалi бярозу, клён – украшалi сцену.

*Запiсана ў в. Альхоўка*
*ад Кузьмiч (Мазан) Марыi Дзмiтрыеўны, 1932 г.н.*

Ну, як!? Тройцу святкавалi ў нас: убiралi, садзiлi ёлку, прымерна каля хаты, з вулiцы.

*Запiсана ў в. Альхоўка*
*ад Драчан (Грахоўскай) Людмiлы Антонаўны, 1923 г.н.*

На Тройцу ўсё на двары i ў хаце ўкрашалi клёнам, ламалi лiсце. Украшалi таксама бярозаю.

*Запiсана ў в. Жанкавiчы*
*ад Карачун Ганны Трафiмаўны, 1930 г.н.*
*(ранеj пражывала ў в. Каменка Нясвiжскага р-на Мiнскай вобл.).*

Бралi веткi, ставяць бярозкi, тады ўжо прыносiлi дамоў, у сарай ставiлi, каб усё добра было.

*Запiсана ў в. Лань*
*ад Шусты Марыi Антонаўны, 1940 г.н.*

Сёмуху адзначалi. У цэркаў iшлi. Маладзёж хадзiла на танцы. Каторыя маладыя ў лес хадзiлi, а старыя ж не пацягнуцца ў лес (смяецца).

*Запiсана ў в. Новы Сноў*
*ад Рацкевiч (Рак) Нiны Iванаўны,* 1941 г.н.

Цяпер у празнаваннi дзелаюць два этапа: первы – Сашэствiе Духа Святога. I другi дзень Святой Троiцы (Сёмухi). Два дня празнавалi: гэта васкрасенне i панядзельнiк. Украшалi бярозкамi, пад балкi ў хаце iх засоўвалi. Ставiлi на крыльцэ па обе стораны.

*Запiсана ў в. Слаўкава*
*ад Макавец Чаславы Вiтольдаўны, 1943 г.н.*

Святкавалi Троiцу (Сёмуху), ну, у цэркву ходзяць, каталiкi – у касцёл. Прыбiралi хату, мама i пiрагi пякла на Тройцу (Сёмуху). На сёмую нядзелю пасля Пасхi Тройца (Сёмуха). Убiралi двор, бярозкi ставiлi, каля варотаў паставяць, у дзвярах, вот як ужо iсцi ў хату, панастаўляем гэтыя самыя бярозкi. I ў царкву iдзем.

*Запiсана ў в. Слаўкава*
*ад Халоп Марыi Аляксандраўны, 1933 г.н.*

На Тройцу, або Сёмху, як i на Пасху, трэба, каб уся хата была зялёная. Ламалi веткi i запiхвалi пад бэлькi. Рэзалi веткi бярозы, клёну. Хадзiлi ў цэркву, вечарынку, бывае, зробяць. Даўней усё было проста, iначай.

*Запiсана ў в. Слаўкава*
*ад Шыкулы Яўгенii Iосiфаўны, 1914 г.н.*
*(ранеj пражывала ў в. Ракавiчы Нясвiжскага р-на).*

Перад Сёмухай лапкi з лiпы ўтыкалi для таго, каб бура хаты не тронула. Потым iх спальвалi ў печы.

*Запiсана ў в. Смалiчы*
*ад Гуцько Аляксандра Iванавiча, 1931 г.н.*

Тройцу (Сёмуху) святкавалi абыкнавенна. Перад Тройцаю (Сёмухай) вечарам хадзiлi i прыносiлi веткi клёна, веткi бярозы. Затыкалi пад балкi, красату наводзiлi. У хаце – такая зелень, такая красата. Усю хату зробiш зялёную, ветачкi бярозы ў дзвярах затыкаеш.

*Запiсана ў в. Смалiчы*
*ад Шчурскай Iрыны Мiкалаеўны, 1935 г.н.*

Некалi на Тройцу выносiлi з царквы харугвы i з iмi, i з iконаю iшлi па сяле. Бацюшка iшоў.

*Запiсана ў в. Сычэва*
*ад Бараноўскай Марыi Фёдараўны, 1926 г.н.*
*(ранеj пражывала ў в. Карцэвiчы Нясвiжскага р-на).*

Тройцу (Сёмуху) абыкнавенна гулялi, як свята, так i гулялi. Украшалi хату бярозавымi лапкамi, у паталок садзiлi кругом iконаў. Уся хата засажана была. Такi запах быў харошы.

*Запiсана ў в. Сычэва*
*ад Казей Валянцiны Паўлаўны, 1930 г.н.*

Дом на Тройцу ўкрашалi зелянню, бярозкаю. Хадзiлi ў цэркаў.

*Запiсана ў в. Сычэва*
*ад Юхноўскай Алены Антонаўны, 1935 г.н.*

Збiралi зялёныя веткi i ў хату насiлi, украшалi. Гэта зеленцо палезно, каб хазяйство сахраняць. Мо, хто i зжыгаў. Зараз такiя хаты, што нiма куды iх i паставiць. Можа, цяпер нiхто i не носiць зелень гэту. Явар на акно ставiлi.

*Запiсана ў в. Аношкi*
*ад Гадун Алены Вiкенцьеўны, 1924 г.н.*

Вешалi гэтыя ветачкi, хадзiлi ў лес, ламалi бярэзнiк цi лiпу, шо-нiбудзь такое, i ўтыкалi. Некалi ж былi хаты з бэлькамi i ўтыкалi веткi з аднаго боку i з другога. Дык хата такая зялёная ды пахне. Як была малая, дык падлогу саломай засцiлалi, а тады зграбалi тую салому на першы дзень.

*Запiсана ў в. Лявонавiчы*
*ад Лепяцiлы Нiны Уладзiмiраўны, 1930 г.н.*

Тройца – гэта як закон. Гэта цяпер у нас хаты падшытыя, а раньшэ былi пакрываныя. Наломiш ветак – у хаце ўжэ тады запах. Ламалi бярозу, найбольш лiпу, у цэркаў хадзiлi.

*Запiсана ў в. Аношкi*
*ад Сiнькевiч Вольгi Вiктараўны, 1927 г.н.*

Святкавалi Тройцу тры днi. Першы дзень рабiлi лёгкую работу, а ўжо на другi дзень забаранялася працаваць. Называлi гэты дзень Градавая серада. У гэты дзень лiчылася, што калi рабiць, то град усё паб'е. Хадзiлi збiраць розную зеляніну. Бярозкi ставiлi ў вароты, аер рвалi i ўсцiлалi падлогу. Ой, прыгожа так было! Тройца – тры духi: Ацец i Сын, i Святы Дух.

*Запiсана ў в. Вайнiлавiчы*
*ад Кароль Нiны Вячаславаўны, 1927 г.н.*

У цэркву на Тройцу ездзiлi. Бярозкi там былi. Некалi ў хатах падтыкалi iх пад столь. Кляны малыя, бярозкi, лiпы прыносiлi, у цэркву бралi i лажылi пад iкону. Калi высыхае, палiлi. А яшчэ ставiлi на варотах бярозкi.

*Запiсана ў в. Лявонавiчы*
*ад Матус Яўгенii Мiхайлаўны, 1930 г.н.*

Некалi ж як Сёмуха ўжэ, то трэба маю прынесцi ў хату. I ўжэ лётаем, бярэзнiк ломiм. Ускрозь трэба яго затыкаць, але ж i хораша было, пахне ў хацi. Эта ж трэба аер рваць. Цяпер iдзём у цэркаў, нясём аер, бярэзнiк.

*Запiсана ў в. Аношкi*
*ад Шарапы Анастасii Сцяпанаўны, 1933 г.н.*
*(ранеj пражывала ў в. Каменка Нясвiжскага р-на).*

Ад Вялiкдзеня да Тройцы гэта сем нядзель. Нiчога не робяць на Сёмуху. Перад Сёмухай убiралi ўсё, пазатыкаюць бярозы, зелле.

*Запiсана ў в. Аношкi*
*ад Антановiч Веры Валяр'янаўны, 1933 г.н.*
*(ранеj пражывала ў в. Альхоўка Нясвiжскага р-на).*

Сёмуха – гэта ж сем нядзель пасля Вялiкадня, тожа святкавалася, як i Вялiкдзень. Гэта было вялiкае свята. I сёмуха то ж чатыры днi, но цяпер чатыры днi не святкуюць. Нядзелю, панядзелак, аўторак, а ў сераду зямлю не чапалi. Упрыгожвалi дом галiнкамi, такiя хаты былi, што можна было галiнку патыркнуць у вугол якi-небудзь.

*Запiсана ў в. Аношкi*
*ад Акулiк Марыi Уладзiмiраўны, 1944 г.н.*

Тройца – гэта вялiкi празнiк. У царкве свенцяць зелле i забiраюць дадому, гэта ж добра. Гэтыя ветачкi лажылi за iкону: калi пасохнуць, трэба ўкiдаць у печ, каб не кiдаць на вулiцу.

*Запiсана ў в. Вайнiлавiчы*
*ад Камлач Янiны Валянцiнаўны, 1936 г.н.*

Вон баба на Тройцу прыходзя з цэрквы i свечкай рысуе крыжыкi над дзвярамi. Есць такiя людзi, ведзьмы нейкiя. Ад iх засцерагалiся.

*Запiсана ў в. Вайнiлавiчы*
*ад Запольскага Валянцiна Валянцiнавiча, 1957 г.н.*

Пяклi на Тройцу булкi, свянчалi. У цэрквi настанаўлiваюць зяленi, мы па ветачцы прыносiлi, срываем i кладом за iконку цi ў вазачку паставiм. Абычна бярозкi, iмi ўсё ўкрашаюць. А некалi абязацельна дом увесь украшалi зелянню, па ўсiх балках украшалi лiпай i клёнам. Потым гэта пасякуць i ўсё.

*Запiсана ў в. Вайнiлавiчы*
*ад Камлач Вольгi Iванаўны, 1934 г.н.*

Я сама хадзiла на Тройцу ў лес, наломiш лапак усякiх зялёных (бярозы, дуба). I ў хацi натыкалi iх у бэлькi, то яно ўжо пахне.

*Запiсана ў в. Лявонавiчы*
*ад Лях Марыi Сiльвестраўны, 1943 г.н.*

На Тройцу насiлi з леса зелень i ўкрашалi хату, а калi пасохне – палiлi.

*Запiсана ў в. Лявонавiчы*
*ад Аксак Ганны Мiкалаеўны, 1952 г.н.*

Тройцу святкавалі ад сямі нядзель пасля Пасхі. Пад вечар усе бягуць да кладбішча, і там клёны раслі, і от тыя клёны ламалі і валаклі дадому. А некалі ж бэлькі былі ў хаце і пад бэлькі клалі клён, і ва ўсёй хаце, і яшчэ аер у возеры рос пахучы. І вось усыпалі пол етым аерам. А ўсегда ў нас затырквалі клён, бярозу бралі мала калі. У цэркву хадзілі. Троіца называецца так, бо праслаўляецца Ацец, Сын і Святы Дух.

*Запісана ў в. Вайнілавічы*
*ад Волкавай Марыі Уладзіміраўны, 1931 г.н.*

Ну, на Тройцу, канешне, красіва. Красіва была, бо мы хадзілі ў цэркву. Правілася служба ў цэркве, хораша правілася. Хадзілі, мы насілі іконы вакол цэрквы. Усё было хораша. Як аддыхнеш усе роўна. Прыдзем дадому, паабедаем ўсе разам. На Тройцу хадзілі ў лес па бярозу, ламалі ветачкі. І ў хаце можна было ўтаркнуць. Патом рвалі траву і траўкай пасыпалі ў каго падлогу. І траўка чуць звяне, і так пахне.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Кавальчук Аляксандры Паўлаўны, 1931 г.н.*

Ну, на Сёмуху, так прыбрацца надо, каб чысто было. Едзем, бярэзніку нарэжым, каля хаты паставім. Усю хату ўбяром у бярэзнік. Усё зялёна было. Ходзім у касцёл. З касцёла прыйдзеш. То ж вялікі празнік. Там госці прыходзяць. Надо было, штоб было і закусіць, па сто грам выпіць.

*Запісана ў в. Альбянка*
*ад Гібчык Юзэфы Францаўны, 1931 г.н.*

Сёмуха – это сёмая нядзеля бывае после Пасхі. Атмячаюць. Это бальшы празнік. Украшаюць хаты, некалі прыносілі з лесу галінкі.

*Запісана ў в. Альбянка*
*ад Шумейка Ядвігі Міхайлаўны, 1929 г.н.*

Тройца празнуецца после Пасхі. На сёмую нядзельку была Тройца. Ну, тут ужэ на Тройцу прыносілі май, хадзілі і ламалі зялёненькія дзераўцы (бяроза, клён). Ужо прыносілі ў хату. Панатыкаеш, і ўжэ поўную столь засцеліш. Утрачкам праснешся, а гэта ўсё пахне, зялёненькае.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Маркевіч Аляксандры Уладзіміраўны, 1938 г.н.*

Перад Троіцай у хату прыносілі ветачкі бярозы, ліпы, клёну. У паталкі закладывалі веткі паміж доскамі. Гэта было звязана з Ісусам Хрыстом.

*Запісана ў в. Грыцкавічы*
*ад Заяц Станіславы Іванаўны, 1944 г.н.*

Абязацельна перад Сёмухай закопвалі перад дзвярыма чатыры бярозкі. Гэта абязацельна. А ў хату ламалі і пад бэлькі піхалі і клён, і ліпу, і бярэзнік. А палы пасыпалі аерам, каб запах быў.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Гадун Ядвігі Уладзіміраўны, 1929 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Лесуны Нясвіжскага р-на).*

Некалі, дык ужо як Сёмуха, ідуць у лес: або клёну наломяць, або бярозкі пад бэльку піхаюць. Можна ставіць бярозкі і ў цэрквы.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Жук Леаніды Іванаўны, 1938 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Вайнілавічы Нясвіжскага р-на).*

На Сёмуху ў царкву ідуць. У нас некалі (яшчэ як я дзеўкаю была) усе паталкі чыста ўпрыгожвалі веткамі. Пад бэлькі гэтыя маладыя бярозкі піхалі. Усю хату ў зелянь убярэш. Заўсёды ў хатах убіраліся.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Чычко Соф'і Рыгораўны, 1934 г.н.*

Троіца – эта сем нядзель после Пасхі, это ўжэ кагда Ісус Хрыстос вазнёсся. На Троіцу пасыпалі аір (расце на балоце), пасыпалі ім у хаце, а пад балкі бярозкі ўтыкалі. Ну, тожэ абязацельна пірагі пеклі.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Халецкай Яўгеніі Іванаўны, 1932 г.н.*

Два дні абычна Сёмуха. Заўсёды перад Сёмухай збіраліся з дзяўчаткамі і ішлі ламаць бярозу, клён. Усе зялёныя лапкі прыносілі і ўсю хату абтыкалі: і пад паталок, на сцены ўтыкалі зелень.

*Запісана ў в. Малева*
*ад Верэмеевіч Яніны Дзмітрыеўны, 1938 г.н.*

На Тройцу аеру, бэзу прыносім у хату, на пол кладом. Пад бэлькі зелень кладом. Тры дні святкуем. Ніхто нічога не робіць на Тройцу.

*Запісана ў в. Малева*
*ад Каладзінскай Валянціны Фёдараўны, 1931 г.н.*

На Троіцу хадзілі ў лес, убіралі ў хаце. А некалі вымецеш, не было ж палоў, вымецеш чысценько, пясочкам жоўценькім пасыпалі, пайшлі ў зялёны бярэзнічак, паўтыкалі веткі і ўкрашалі імі дамы.

*Запісана ў в. Малева*
*ад Ігнатчык Валянціны Усеваладаўны, 1941 г.н.*





Упрыгожвалі на Тройцу хату зелянінай, ламалі лапкі ліпы і ўтыквалі іх. Яны былі ў хатцы дней тры, а тады выносілі іх.

*Запісана ў в. Грыцкавічы*
*ад Кандрацюк Антаніны Сцяпанаўны, 1939 г.н.*

Бярозкі на Тройцу завівалі. Гэта трэба было. У дварэ бярозкі ставілі, помню, каля варот. У хаце потым упрыгожвалі, пад балкі іх піхалі. На вячоркі збіраліся, каля цэрквы збіраліся.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Церахавец Уладзіславы Францаўны, 1938 г.н.*

Свадзьбы на Сёмуху рабілі. Упрыгожвалі хату зелянінай: і клёнам, і бярозай. Зелянiна ляжала дзён тры.

*Запісана ў в. Грыцкавічы*
*ад Рудой Таццяны Антонаўны, 1932 г.н.*

Хатку абвешвалі бярозавымі кветкамі ці вяночкамі. Калі ішлі ў царкву, бралі кветкі бярозы. Калі прыходзілі з царквы, гэтыя кветкі высушвалі і лажылі за ікону. Бабка гаворыла, шо еслі я пахажу босая па зямлі, у мяне не будуць балець ногі. Бацька прыносіў бярозу і сажаў каля хлява, абвешваў яе лентамі.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Жукоўскай Зоі Аляксандраўны, 1933 г.н.*

Мы з бацькамі на Тройцу сустракалі лета і праваджалі вясну. Бярозавыя галінкі набухалі почкамі, гэта жывое расцвітае. Гэтыя бярозкі хранілі да Купалля, а потым брасалі ў купальскае вогнішча.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Тарасевіч Алены Мікалаеўны, 1969 г.н.*

Вечарам дзеўкі шлі ў рошчу, плялі бярозавыя вянкі. Яны рабілі колькасць вянкоў па колькасці сваіх блізкіх. Потым вадзілі карагод вакол дрэва. Потым плавалі ў рацэ, а праз тыдзень дзяўчынкі шлі глядзець на сваі вянкі: чый вянок яшчэ свежы, у той будзе доўгае і шчаслівае жыццё.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Скрыцкай Марыі Аляксандраўны, 1940 г.н.*

Моладзь шукала самую прыгожую дзяўчынку, упрыгожвала яе бярозавымі кветкамі, накідвала на яе вянкі і ўсе разам шлі спяваць. Іх частавалі ежай, давалі ім грошы. Потым шлі ў адну хату і там рабілі вечарыну.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Данкевіч Яўгеніі Лявонцьеўны , 1944 г.н.*

На Сёмуху, верылі, што прыходзілі русалкі. Яны былі голыя, длінныя чорныя валасы, чорныя вочы. Яны бегалі, качаліся на кветках у полі. Калі чалавек іх бачыў блізка, яго твар рабіўся чорным. Дзяўчынкі надзявалі вянкі і брасалі іх у жыта, потым беглі да хаты.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Базарнавай Марыі Ігнацьеўны, 1922 г.н.*

Збіраліся на Тройцу дзяўчаткі. Крэст у нас быў. Мы збіраліся ўсе і далжны былі зрабіць вянок. Вянкі бальшыя дзелалі. Дзелалі іх з бярозы, з клёна. І развешвалі яго на той крэст. Усе ўбіралі хаты. Некалі ж былі дзярэвянныя паталкі. У нас такія балкі былі. І дзірачкі паміж доскамі. У каждую дзірачку ўсаджвалі бярозку. У нас поўнасцю весь дом быў укутан у гэтых бярозках. А потым хадзілі ў лужок такі далёка, і ў тым лужку расла асака, пахучая-пахучая. Прыносілі дамой і рассцілалі на пол па ўсёй хаце. Долга прыгатаўліваліся к Святой Троіцы. Такія абычаі былі.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Дзянішчык Неанілы Ільінічны, 1937 г.н.*

На Троіцу, я знаю, што рвалі на рэчке аір, пасыпалі па палу этат аір, а пад бэлькі ў хаце затыкалі веткі бярозы, клёна, ну, у аснаўном была бярозка. Кругом всё в зелені была. Карагоды вадзілі. Троіца называлася "зельная", і паэтаму всё было зялёнае ў доме. Цветы ставілі, букеты ставілі всякіе. Аір пасыпалі на пол пачему, патаму што аір как бы не даёт росту блохам.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Падгайскай Вольгі Дзям'янаўны, 1930 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Лань Нясвіжскага р-на).*

Святкуем Тройцу, ужо тры дні нічога не робім. А тамака, як на Смалічы дарога была, там быў такі (грабніцай называўся) лясок. Там некалі пан жыў, і там былі ўсякія дзеревы. І ўжо ідзем туда і ломім там клён, бярэзнік, і ўжо ўсю хату ўтыкаем.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Лурко Марыі Уладзіміраўны, 1937 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Смалічы Нясвіжскага р-на).*

На Троіцу свянцілі хаты, прыбіралі ўсё, ксёнз прыходзіў і свянціў хаты. Хату ўпрыгожвалі ўсім на свеце.

*Запісана ў в. Альбянка*
*ад Валчок Сафіі Ігнацьеўны, 1935 г.н.*

Троіцу як празнік святкавалі, прыбіралі ўсё. Хату прыбіралі ў зелень. Вось інагда Троіца бывае заранее. Дык вось яшчэ мала што распусціцца, так ужо што зялёнае: чаромуха, там ліпа зялёненькая, а чаромуха бывае дык цвіце, так ужо цвяты гэтыя (вось раней быў паталок крыты) пад бэлькаю затыркаеш, пад кожную дырачку клалі лапку. Можа, гэта сімвалізавала, што не расцвяло яшчэ нічога.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Хоміч Ганны Сцяпанаўны, 1944 г.н.*

Да касцёлу на Тройцу пойдзем ды і ўсё. Маліліся, ну, як заўсёды імша да абедні, і пасля абеду, часа ў чатыры. Ну, прыбярэш усё гэта, бярозкі-ветачкі, што абазначалі зялёныя ксёнткі.

*Запісана ў в. Альбянка*
*ад Татур Браніславы Францаўны, 1942 г.н.*

На Тройцу затыкаюць май. Ходзяць цэлую ноч, спяваюць. Танцы былі і вадзілі карагод.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Драчан Ірыны Міхайлаўны, 1933 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Альхоўка Нясвіжскага р-на).*

На Троіцу абычно ў хаце была зелень – бярозавыя лапкі. А некалі старыя хаты былі, у якіх бэлькі былі, і пад гэтыя бэлькі закладалі бярозавыя лапкі.

*Запісана ў в. Альбянка*
*ад Санько Марыі Канстанцінаўны, 1926 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Карцэвічы Нясвіжскага р-на).*

Як Сёмуха ідзе, дык у варотах бярэзіну панастаўляем, мама-нябожчыца памые ўсё. Кажам: "Ой, свята ж у нас!"

*Запісана ў в. Слаўкава*
*ад Драздовіч Яніны Браніславаўны, 1947 г.н.*

Святкуем Тройцу ў гэтыя дні, нічога не робім, некалі, после вайны, як падросткамі яшчэ былі, дзе дарога стаіць, быў лясок, і там былі ўсякія дрэвы, і ўжэ мы ідом, рвом і клён, і бярэзнік і ўсю хату ўтыкаем. Так прынята было.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Гурко Марыі Адамаўны, 1945 г.н.*

Святкуем Тройцу. Хадзілі ў лес, а я каля дому нарвала і назатыкала галінак, мы заўсёды так робім, і каля хаты напхаем, бярозку ламаем, ліпу.

*Запісана ў в. Казлы*
*ад Карачун Марыі Сямёнаўны, 1936 г.н.*

Сёмуха была сем нядзель после Паскі. Бальшы празнік. Дом зеленню ўкрашаюць. З лесу галінкі прыносяць і пасыпаюць імі палы ў хаце.

*Запісана ў в. Альбянка*
*ад Шумейка Ядвігі Міхайлаўны, 1929 г.н.*

На Тройцу збіраліся каля ракі, гулялі, у забор утыкалі веткі. Хадзілі ў царкву на службу.

*Запісана ў в. Нялепава*
*ад Сафівулінай Еўфрасінні Васільеўны, 1941 г.н.*

На Тройцу всегда ўкрашалі дом. Хадзілі ў цэркаў.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Калошы Марыі Ігнацьеўны, 1924 г.н.*

На Тройцу ўкрашалі дом веткамі бярозак, за ікону абавязкова клалі ветачку, у доме прыбіраліся, запрашалі ў госці.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Лукаш Кацярыны Іосіфаўны, 1941 г.н.*

Святкавалася Тройца ў 7 нядзель, на сёмую нядзелю. Раней заўсёды на хутарах ламалі ветачкі бяроз. І ставіліся яны па кожнаму кутку. Гэта азначала, мабыць, тое, што ўсё зялёнае добра зацвіло. Упрыгожвалі хаты, крэшчыкі не рысавалі.

*Запісана ў в. Слаўкава*
*ад Харытонавай Чаславы Баляславаўны, 1946 г.н.*

На Сёмуху плялі вянкі дзяўчаты. І гадалі, хто першы замуж выдзе.

*Запісана ў в. Казлы*
*ад Яраш Галіны Палікарпаўны, 1950 г.н.*

### Ваджэнне куста

Выбіралі самую прыгожую дзяўчыну. Адзявалі яе ў куст. І вадзілі яе па кругу. І вот яна ідзе па кругу, закрыўшы вочы, і раз – узялася за нейкую дзяўчыну, і гэта значыць, што яна першая выйдзе земуж. Дзяўчаты лезлі скарэй у круг.

*Запісана ў в. Казлы*
*ад Яраш Галіны Палікарпаўны, 1950 г.н.*





## ЛЕТНІ ЦЫКЛ

### Купалле

На Купала заўсягда праз век цягалі ўсе калёса ці пад возера збіраліся ўсе і танцавалі, пелі. Хораша было.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Гадун Ядвігі Уладзіміраўны, 1929 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Лесуны Нясвіжскага р-на).*

Кастры палілі на Купала, спявалі, варажылі. Раней хадзілі пад сасну або ліпку, там кар'ер быў. Чабор там рвалі, ну, нейкія зёлкі трох сартоў.

*Запісана ў в. Малева*
*ад Верэмеевіч Яніны Дзмітрыеўны, 1938 г.н.*

Мы на Купалле хадзілі, гадалі, дзяўчаты нічым не займаліся такім, а хлопцы врэднічалі, павырываюць усё ў агародах – так празнавалі. На Купалле чакалі ўзыхода сонца.

*Запісана ў в. Малева*
*ад Ігнатчык Валянціны Усеваладаўны, 1941 г.н.*

Некалі на Купалле палілі агонь, наносяць рэзіны і паляць, гуляюць, спяваюць. Прыгалі праз касцёр хлопцы і дзяўчаты. Дзяўчаты плялі вянкі з канюшынкі, вянкі накладвалі на голаву, пускалі некаторыя іх на ваду. На Купалле лаўкі ламалі, устаноўлена гэтак было, дык і рабілі.

*Запісана ў в. Грыцкавічы*
*ад Кандрацюк Антаніны Сцяпанаўны, 1939 г.н.*

Палілі касцёр і прыгалі цераз яго. Гадалі. Гаварылі: "Сёння Купала, а заўтра Ян. Будзем кідаць дзяўчатак цераз паркан". Кідалі вяночкі ў ваду.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Церахавец Уладзіславы Францаўны, 1938 г.н.*

Хлопцы на Купалле звозілі ламачча, палілі, танцавалі, спявалі кругом агню. Маладзёж весялілася.

*Запісана ў в. Малева*
*ад Алісіевіч Ніны Міхайлаўны, 1928 г.н.*

Палілі на Купалле агонь у нас. Снапы вялікія вязалі, ужо кожная дзяўчына ідзе і хлопец, тады паляць. Прыгалі праз касцёр. Лаўкі выварачвалі, то возьмуць хату зашчэпяць, каб не вылез хазяін, то залезуць і комін накрыюць, каб дым на хату ішоў.

*Запісана ў в. Грыцкавічы*
*ад Рудой Тацціяны Антонаўны, 1932 г.н.*

Знаеце, я человек хрешчоный, так православные не празднуют Купалле, патаму што эта язычества.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Дзішук Галіны Марцінаўны, 1938 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Качановічы Нясвіжскага- на).*

У нас на Купалье прыгают через костер, обливались водой по обычаю (не знаю для чего). Гуляли до утра.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Праходы Святланы Міхайлаўны, 1950 г.н.*

Касцёр на Купалле палілі, танцавалі, плясалі, пелі. Вянкі плялі, на галаву адзявалі.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Раманоўскай (Богдан) Ніны Сцяпанаўны, 1946 г.н.*

Ну, вароты на Купалле снімаюць, потым сталы переварачваюць у горадзе.

*Запісана г. Нясвіж*
*ад Чумакова Генадзія Васільевіча, 1955 г.н.*

Гулялі на Купалле каля леса на палянцы. Касцёр рабілі велізарны, музыка была і танцы.

*Запісана ў в. Альхоўка*
*ад Драчан (Асіповіч) Надзеі Сцяпанаўны, 1932 г.н.*

Сабіралась на Купалле маладзёж, усе дзяўчаты, хлопцы, старыя і малыя – усе сабіралісь. Спявалі, танцавалі, праз вогнішча прыгалі маладыя.

*Запісана ў в Альхоўка*
*ад Кузьміч (Мазан) Марыі Дзмітрыеўны, 1932 г.н.*

Нядаўна ў нас было Купалле: прыйшлі хлопцы, укралі мае вароты.

*Запісана ў в. Грыцкавічы*
*ад Заяц (Пятроўскай) Марыі Антонаўны, 1937 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Мацылеўшчына Нясвіжскага р-на).*

Палілі на Купалле касцёр. Гадалі.

*Запісана ў в. Жанкавічы*
*ад Карачун Ганны Трафімаўны,1930 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Каменка Нясвіжскага р-на).*

Ну, чула такое свята Купалле – гэта летам, маладзёж ламала платы, ну, што-нібудзь урэднае рабілі. А маладзёж такая более взрослая

хадзіла на рэчку, там дзевушкі вянкі плялі і ў рэчку пускалі іх: куды паплыве, туды і замуж іх возьмуць. Яшчэ "бяседавалі", ну, варажылі, значыць.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Кузьмовай (Дашко) Тамары Герасімаўны, 1928 г.н.*

Ну, на Купала ў нас касцёр заўсёды быў, а ў лес то ніхто не хадзіў: баяліся ж, усе ж знаюць, што папарадь-кветка там. Мая свякроў кажа, што на следуюшчы дзень нада травы сабіраць, яны будуць памагаць. Рвуць чарніку, рвуць траву – эта тое, што будзе памагаць, будуць "памачныя". Гадалі на Купалле: выбягуць, абхвацяць забор – чотныя выйдзеш замуж, нячотныя – не. Хто на тарэлцы гадаў. Кідалі тапор: куды павернецца, туды і замуж возьмуць.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Угляніцы (Плаксы) Таццяны Аркадзьеўны, 1967 г.н.*

Ну, я на Купала на гэта не хаджу. Раней да, там песні спявалі. Няма ў нас нікакіх такіх зацей. Праз вогнішча скакалі. Заборы павынімаюць, павыцягваюць і скамейкі.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Шусты Марыі Антонаўны, 1940 г.н.*

Ну, абычна Купалле празнуецца. Паляць касцёр, спальваюць калёсы, карагоды водзяць, дзяўчаты ў вяночках ходзяць. Потым пускаюць вяночкі ў рэчку, папараць-кветку шукаюць.

*Запісана ў в. Лань ад Ярмаліцкай*
*(Страшко) Людмілы Казіміраўны, 1937 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Дубейкі Нясвіжскага р-на.).*

Ну, эта да, збіраюцца, паляць Купалле гэта. Песні пяюць, музыка йграе. На Купалле многа маладзёжы сабіраецца. Праз вогнішча скачуць. Вянкі кідаюць на ваду.

*Запісана в. Малева*
*ад Абрамовіч (Ярашэвіч) Станіславы Антонаўны, 1938 г.н.*

Празнавалась Купалле возле леса. Кастры ставілі, хвораста многа кідалі ў касцёр. Там у нас быў музыкант, з гармошкой, канечно. Танцавалі вакруг кастра, потом шлі на рэчку, плялі вяночкі. Потым на вяночкі ставілі свечкі і пускалі па вадзе, загадвалі жэланіе.

*Запісана в. Малева*
*ад Каліноўскай (Меляньково) Галіны Васільўны, 1943 г.н.*

Купала (Ян) некалі ў нас не святкавалі. На рэчку проста дзяўчынкі насілі вяночкі, гадалі: куды вяночак паплыве, туды і замуж пойдзе.

*Запісана ў в. Слаўкава*
*ад Халоп Марыі Аляксандраўны, 1933 г.н.*

Збіралася маладзёж, дзе-нібудзь які касцёр распалім. І песні спявалі, пускалі на воду вяночкі. Дзяўчаты спявалі, а хлопцы скакалі праз касцёр. Дзяўчаты не прыгалі, бо баяліся і было стыдна, гэта ж пазор быў. Вяночкі пускалі на ваду, пелі:

*Рана, рана на Купала*
*Сонейка гуляла.*

*Запісана ў в. Слаўкава*
*ад Шыкулы Яўгеніі Іосіфаўны, 1914 г.н.*

На Купалле (Ян) рабілі кастры, усе прыгалі: і вялікія, і малыя. Музыкант рабіў музыку, мы танцавалі, нават басяком.

*Запісана ў в. Смалічы*
*ад Шчурскай Ірыны Мікалаеўны, 1935 г.н.*

На Купалле (Ян) сабіраліся сем'ямі і на балоце былі. Вяночкаў не пускалі, праз касцёр не прыгалі.

*Запісана ў в. Сычэва*
*ад Казей Валянціны Паўлаўны, 1930 г.н.*

Калі Купалле (Ян) у нас было, то была маёўка ў нас, музыка грала. У нас не варажылі.

*Запісана ў в. Сычэва*
*ад Комар Марыі Вікенцьеўны, 1941 г.н.*

На Купалле (Ян) прыгалі цераз касцёр, вяночкі пускалі, папараць-кветку шукалі. Варажылі: за забор бралі – колькі шчыкетаў абхопяць. На кольцах гадалі.

*Запісана ў в. Сычэва*
*ад Юхноўскай Алены Антонаўны, 1935 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Малева Нясвіжскага р-на).*

Раней на Купалле пазбіраемся, касцёр распалім, пасядземо ды ўсё.

*Запісана ў в. Карцэвічы*
*ад Цвірко Алены Пятроўны, 1941 г.н.*

Папараць-кветку на Купалле шукаюць маладыя, спяваюць і шукаюць. Некалі палілі касцёр, папрыгаюць праз яго і пайшлі па дамам. Былі танцы, канцэрты ставіліся. Нада на Купалу цалебныя травы сабіраць.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Гадун Алены Вікенцьеўны, 1924 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Каменка Нясвіжскага р-на).*



Нясвіжскага краю напеў векавы

Празнік этат Іван Купала панімаць нада так: быў када-та Ісус Хрыстос, а пры ём быў Іоан Хрысціцель. У чэсць Іоана вот пайшоў празнік Яна.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Захарчука Уладзіміра Міхайлавіча, 1931 г.н.*

Святкавалі Купалле ў нас. Гулялі ў гульні. Гарбуз клалі ў руку ды гаварылі: "Кладу, бяру". Ну, і адгадвалі. Кастры палілі і цяпер паляць. Збіраецца многа людзей пад вечар. Ідуць і паляць. Ну, маладзёж гуляе, а старыя ідуць дамой. Маладзёж зносіла дрова. Вянкі плялі. На голову клалі. Проста пагулялі, патанцавалі, і высахнуць вянкі і ўсё. Перад Янам трэба ўсягда нарваць папаратніка і дарогі выслаць. А хлопцы ўжо вечарам лаўкі пачалі шукаць, падрываюць лаўкі, варота пазносяць альбо на дарозе якія дрова клалі, каб машына не ехала. Перад Янам вот часнок ходзяць завязваюць, галоўкі, каб завязваліся.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Матус Яўгеніі Міхайлаўны, 1930 г.н.*

На Купалле ж крапіву рвалі і затыкалі ўсюды: і ў дверах, каб не прыйшла ведзьма. На Купалле травы рвалі, папарадь шукалі.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Шарапы Анастасіі Сцяпанаўны, 1933 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Каменка Нясвіжскага р-на).*

Збіраемся на Купалле, нясом палачкі якія і ўжо палім касцёр, і ўжо бегаем, скачам чэраз тое купало (касцёр). Песні пелі, хлопцам песні пелі:

*Сёння Купало, заўтра Ян,*
*А вам, хлопцы, ліхо, ліхо вам,*
*А вам ліхо ліхое,*
*Пагналі сабакі ў поле.*
*На сук скарабенька,*
*Та хлопцам паненка,*
*А другая падласа,*
*Эта, хлопцы, вам на мяса.*

Гадалі, вянкі вілі, на калодзежы насілі. Это на калодзеж павесіш, эта ты замуж за яго пойдзеш. Я некалі павесіла вянок на той калодзеж, то замуж такі ж пашла за яго.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Сінькевіч Вольгі Віктараўны, 1927 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Каменка Нясвіжскага р-на).*

На Купала хадзілі, бегалі, скакалі чэраз агонь. Калёса палілі. Складвалі ў кучу іх, вот касцёр з дом, так і падпальвалі. Крапівою выкладвалі сцёжку до сарая, каб ведзьма карову не спорціла.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Акулік Марыі Уладзіміраўны, 1944 г.н.*

У нас у суботу будзе Ян. Маладыя хлопцы сабіраюць калёса і выбіраюць окала возера месца, і запальваюць касцёр, маладзёж танцуець цэлу ноч, калі ўжо расходзяцца, то нахальныя маладыя, пацаны, снімаюць вароты ў хазяіна, перагаражваюць дарогу, скамейкі павыносяць. А яшчэ песні паюць, гадаюць, караблікі бумажныя пускаюць па вадзе, вянкі в'юць. Цэлу ноч гуляе маладзёж. На Яна кастры палілі, збіралі лапкі паліць кастры. Усё харашо было. Спявалі, гулялі. А яшчэ плялі вянкі, а хлопцы на каміны закладалі, каб дым ішоў на хату. А дзяўчаты на Яна гадалі. А яшчэ маладзёж рабіла злачынства: знімалі дзверкі, каб бабы старыя шукалі.

*Запісана ў в. Вайнілавічы*
*ад Кіпець Уладзіміра Рыгоравіча, 1926 г.н.*

На Купала людзі гадаюць. Гадаюць на воске. Ходзяць на возера. На Купалле хуліганы паломяць усё на свеце, вароты перанясуць куды-небудзь. На касцёр хлопцы кралі дровы ў людзей. Каля кастра спявалі песні, вілі вянкі.

*Запісана ў в. Вайнілавічы*
*ад Камлач Яніны Валянцінаўны, 1936 г.н.*

Як былі маладыя, касцёр на Купалле палілі, гралі на гармошке, спявалі, праз касцёр прыгалі.

*Запісана ў в. Карцэвічы*
*ад Крыўко Наталлі Мікалаеўны, 1934 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Малева Нясвіжскага р-на).*

Прыгалі на Купалле праз кастры. У калясе цябе з горкі маглі скаціць. А самае галоўнае ў купальскую ноч хадзілі па людзям: то калітку якую, то забор паламаюць ці што-небудзь, ну, была такая пагаворка: "Купала, што было, то і прапала". Гэта празнік, гэта ўжо абычай. Шчас парань гуляе з дзевушкай, так гэта не стыдна, раньша так устрачаліся ўціхара, патом вечар. І мы вот крошкамі якімі-небудзь ад парня к дзеўкі высыпалі дарожку такую, каб была заметна, што яны ўлюбляюцца. Яны

гэта скрывалі, а мы ўжо ціха раскрывалі, дзе там сабіраліся дзеўкі і гадалі. Чэраз хату нейкае галішнікі кідалі: у які бок пакажа, з таго боку жаніх прыйдзе. Вот, харашо помню, як з каляскай гэтай ноччу на вуліцы сыпалі попел, доўгая такая палучалась дарожка.

*Запісана ў в. Вайнілавічы*
*ад Запольскага Валянціна Валянцінавіча, 1957 г.н.*

Палілі на Купалле кастры, спявалі, прыгалі.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Антановіч Веры Валяр'янаўны, 1933 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Альхоўка Нясвіжскага р-на).*

Свята гэта было летам, называлася Купала. Палілі кастры. Дровы прыносілі з хат, якія бліжэй да месца, дзе палілі. Кожны хлопец ідзець і бярэ з сабою некалькі палак. Як хто заніма́ўся, дык хадзілі і цалебныя травы сабіралі на Купалу. Мы та не хадзілі ў моладасці. Былі бабкі такія, што сабіралі травы. Грушы, яблакі сушылі ў печках. Папараць-кветку не хадзілі шукаць, гэта ж цёмна было. Як ты пойдзеш яе шукаць уначы, каля нас і лесу не было, дзе я расла. Хто яе знае, цвіце ці не цвіце. Якая яна зялёная такая, з шырокім лісцем.

*Запісана ў в. Вайнілавічы*
*ад Кіпець Тамары Рыгораўны, 1926 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Асмолава Нясвіжскага р-на).*

Вянкі на Купалле вілі, песні пелі, хадзілі па дзярэўні. Мальчыкі дзевачкам дарожкі цвятамі засцілалі, як хто за каго хадзіў. Кастры палілі. Елі каля кастроў.

*Запісана ў в. Вайнілавічы*
*ад Камлач Вольгі Іванаўны, 1934 г.н.*

Касцёр палілі, танцавалі, папараць-кветку шукалі. Танцы былі. На Купала платы пераносілі.

*Запісана ў в. Карцэвічы*
*ад Усовіч Надзеі Максімаўны, 1947 г.н.*

Сёмага іюля – гэта ў нас Ян называецца. То на Купала ўжэ вечарам сядалі возле клуба, касцёр палілі, спявалі, прыгалі чэраз касцёр. Патом назаўтра ўжэ Ян. Былі танцы. Это кажды год як закон.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Лях Марыі Сільвестраўны, 1943 г.н.*

На Яна ў нас быў фэст. Людзі ішлі ў цэркву. Маліліся там, а потым прыходзілі дамой і танцавалі. У кожнай хаце былі госці.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Верамейчык Ядвігі Мікалаеўны, 1958 г.н.*

*Ой, сягоння, хлопчыкі,*
*Ян, будзе ліха,*
*Вам будзе ліха,*
*Вам да будзе ліха ліхое,*
*Пагоніце сабаку ў поле,*
*Адна сучачка стане,*
*Падласа будзе вам на мяса,*
*Адна сучачка рабенька,*
*Будзе вам паненка, хлопчыкі.*

На Яна ўжо ўбіралі калодзежы. Рвалі гэты Ян. Гэта расценіе жоўтае і белае, і вілі вянкі і вешалі на калодзеж. Палілі кастры, скакалі цераз іх. Цераз кастры скакала заўсёды маладзёж. Плялі вянкі і спускалі на ваду, шукалі папараць-кветку. Раніцай збіралі розныя лекавыя травы. Этымі травамі абкурвалі жывёл ад markовая напасці. Вось у маёй жызні было. Ну, вось забалела ў мяне карова, пайшла яе даіць, а яна лезе на мяне, бегае па хляве. Бегае, бегае і падае. Я думаю, што эта яно такое. Скарэй убегла ў хату і крычу свайму мужыку: "Садзісь скарэй на матацыкл, едзь і вязі доктара. Нешта карове зрабілася". Прыехаў доктар і сказаў, што трэба абкурыць карову зеллем тым, што сабралі на Яна. Так і ёсць. Скора паправілася.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Кароль Ніны Вячаславаўны, 1937 г.н.*

### Купальскія песні

*Ой, сягодня Купало…*
*Ой, сягодня Купало,*
*Заўтра Яно,*
*Каб вас, хлопчыкі, усіх паламала.*
*Да сягодня Купала,*
*Да сялом, сялом,*
*Да, закрыўшы вочы,*
*Вочанькі да рукавом.*

### Ой, у полі вярба…

*Ой, у полі вярба расла,*
*Прастаяла дзеўка красна,*
*Ні то красна, як рабіна,*





*Яе доля нешчасліва.*
*Сыноў парадзіла,*
*Усіх у Дунаі патапіла.*
*Ой ты, дзеўка, не дурэй-ка,*
*Будзеш мець ты чалавека,*
*Будзеш мець ты, с кім гуляці,*
*Кажду ночку размаўляці.*
*Ой, ляцелі гусі з пруду,*
*Скалацілі ў рэчкі ваду.*
*Скалацілі як хацелі,*
*Знізу ў вырай паляцелі.*
*Я табе, мамка, прызнаюся,*
*Што з Раманам кахаюся.*
*Раман чорны, я бялява*
*Нам з Раманам родна пара.*
*Раман чорны, я бялява*
*Нам з Раманам родна пара.*

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Аксак Валянціны Міхайлаўны, 1925 г.н.*

Купалінкі зоры ў цішыні нябеснай
Разліліся морам у чаканні песен.
У дзяўчыны кветка летуценна, светла,
Просіцца ў маці пакупаваці.
Маці, мая маці, не трымай у хаце
Мяне, маладую, у ночаньку святую.
Пайду пашукаю папараць чароўну,
Мне яка заззяе ў дубраве цёмнай.
Пайду на ўсю ночку, песен паспяваю,
Навію вяночкаў, любага спаткаю.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Матус Яўгеніі Міхайлаўны, 1930 г.н.*

Хадзілі на Купалле ў лес, збіралі папаратнік. Гэты папаратнік мы слалі каля сарая, дарожкі высцілалі, каб будто бы ведзьма не хадзіла. У нас такі абычай быў. Назаўтра, вечарам трохі дзе варота вынясуць, адзін другому занясуць. Рабілі па стараму абычаю. Назаўтра на Яна ідом у цэркаў, пабудзем у цэркве, тады запрашаем гасцей. А ў нас былі на Яна ў кажным доме госці. Музыку наймаюць. Прыводзім дадому, пачастуем. Тады ідом на танцы, патанцуем. Тады музыка атдыхае, а мы становімся ў круг, паём песні. І ўсё так бывае ўжо аж да самога ўтра. І тады расходзяцца дадому. Спявалі:

*Скоро времечка праходзіць,*
*Скоро ўдарыць першы час,*
*Скоро мілы мой уедзе*
*Скоро скроіцца із глаз.*
*Таска на сэрцы налегла,*
*Мілы ўехаў, скучна стала,*
*Шуціць, смяяцца перастала,*
*І ночка плакаць пачала.*
*Не пішы мне, мілы, пісем,*
*Не пішы пячальных слоў,*
*У нас акончана любоў.*
*Любоў акончана между намі,*
*Судзьба падзвінута за табой:*
*Ты гуляеш із другой, а я задумана табой.*
*Ты гардзішся сваім багаццем,*
*А я гаржуся красатой,*
*Тваім багаццем і надолго*
*А я красотка навсегда.*

Палілі кастры на Купалле, дзяўчаты сабіраліся. Калёсы насілі, падпальвалі. Дзяўчаты гадалі: дровы схопяць, насілі, колькі хто возьме, тады глядзелі – у пары будзеш ці не. Свечкі палілі, загадвалі. Вечарам гармонік грае. Пелі, каля кастра.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Кавальчук Аляксандры Паўлаўны, 1931 г.н.*

Свята Купалле тожэ святкуюць. Запаляць, аж пыл ідзе. Вогнішча палілі, песні разныя спявалі. Збіралі кола рызінавая.

*Запісана ў в. Альбянка*
*ад Гібчык Юзэфы Францаўны, 1931 г.н.*

Палілі ўсё кастры. Палілі касцёр, хвораст які сабіралі. А цяпер гуму цягаюць, калёсы. Гуляюць. Танцы. Маладыя ідуць шукаць папараць-кветку. Вылажваюць папараць да хлева, ладзяць абярэгі, засцярог ад нехарошых людзей.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Маркевіч Аляксандры Уладзіміраўны, 1938 г.н.*

У то врэмя, раньшэ, тожэ праваздзілі Купалле. Мы кастры палілі, спявалі. Русалкі былі і чэрці былі. У чарцей і ў нячыстую сілу – ва ўсё гэта не верым.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Салавей Марыі Міхайлаўны, 1947 г.н.*

Шостого было Купала, а сёмого – Ян. Усе ішлі к лесу дзе бліжэ папараць-кветка цвіце ў гэту ноч. Обязацельно ў тую ноч з шостого на сёмого да двянаццаці часоў далжны ўбачыць. Хто ўбачыць, то вельмі шчаслівы будзе, повезёт яму ў жызні. Гатовілі загадзя кастры, кругом танцавала маладзёж, песні

пелі, абараняліся ад ведзьм. Закрывалі дзверы сараяў, лажылі крапіву жгучую, каб ведзьма не прыйшла. Як паложаць крапіву, яна ўжо не прыйдзе.

*Рана на Івана,*
*Свеціць зара рана.*
*Я выхожу на вуліцу,*
*Весела і дружна.*

*Запісана ў в. Лань*
*ад Салавей Ірыны Іосіфаўны, 1933 г.н.*

Палілі на Купалле кастры, сабіралі бальшыя калёса, чэраз кастры прыгалі. Застолля ў нас былі, песні пелі, танцавалі, гулялі – называлася Івана Купала.

Абычна на Купалле кастры палілі, калёса сабіралі, песні спявалі, вянкі плялі.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Васільевай Валянціны Уладзіміраўны, 1952 г.н.*

На Купала і па сёняшні час лажу крапіву, гэта для таго, што вродзе бы як ад ведзьмаў, калі яна будзе ісці ў хлеў, значыць, яна апячэцца. У ведзьм мы верылі. На Купала былі ў сяле дзве жанчыны, па пашы, там дзе ходзяць каровы, цягнулі палаценца па зямлі. А адзін чалавек бачыў, ён пасвіў коней ноччу, і ён цягнуў вуздэчку. Павесіў яе ў сенцах, і з яе пачало капаць малако.

Русалкі нікагда не сушчэствавалі, і ў гэтае павер'е нікагда не верце, іх ніколі не было.

*Запісана ў в. Грыцкавічы*
*ад Заяц Станіславы Іванаўны, 1944 г.н.*

Купалле святкавалі, палілі касцёр, скакалі. Усе скакалі: дзяўчаты, хлопцы былі. Усе прыгалі, кругом лялі.

*Запісана ў в. Малева*
*ад Цыулі Ганны Міхайлаўны, 1932 г.н.*

Купалле празнавалася ў ноч з 6 на 7. Днём дзяўчаты і хлапцы сабіралі на лугу кветачкі. Счыталі, што ў гэты час расценія надзелены валшэбнай сілай. З наступленнем вечара случаецца ўсё самае цікавае. Дзяўчыны плятуць вянкі, а хлапцы робяць вогнішчы.

Па дарозе да вогнішча ў главе калоны ідзе чалавек, які нясе кола, якое потым ставіцца ў вогнішча, пасля ўсей этай працэдуры запальваецца агонь. Дзяўчыны спяваюць песні, гадаюць на вадзе, пасля пары прыгаюць праз касцер. Ёсць такая думка, што калі пара прыгае праз касцёр і рукі адцапляюцца, то гэта пара распадзецца.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Жукоўскай Зоі Аляксандраўны, 1933 г.н.*

Некалі збіраліся ў хаце ўсе разам па чатыры чалавека, былі лясы такія харошыя, у нас быў. Так, не знаю, як ён называецца па-рускі, ядлавец у нас быў такі, ён іначый называецца па-рускі. Расце такі небальшы, такі калючы, на ім чорныя ягадкі такія, яго было ў лесе многа. Мы насякаем яго такую вялікую горку, у нас не далёка была рэчка такая. Цякла рэчка такая, цяпер зрабілі міліарацыю, што той рэчкі болей няма. Усё павысыхала. Я немножко далей, пятнаццаць кіламетраў адсюль, тая мясцовасць называлась Міцкавічы, а мы цяпер жывём у Лане. Мы пагарэлі ў 1989 годзе, пераехалі сюда. Начынаецца карагод, песні пелі, хлопчыкі і дзяўчаты вяночкі вілі, на рэчку кідалі. Загадвалі: чый вяночак утопіцца, той памрэ, а чый вяночак далёка паплыве, той далёка замуж пайдзе, а каторы да берага прыплыве, той замуж не пойдзе. Вось такое Купалле. Вяночкі рабілі на сябе, заўсёды кідалі на воду. Некалі, дзетачкі, былі ў нас такія сенакосы, цяперачы іх няма, міленькія, цяпер усе пазаворвалі. Яны называліся есцественныя сенакосы, яны ад роду былі такія сенакосы, на тым сенакосе былі ўсякія-ўсякія цвяточкі разныя. Якіх там толькі не было. І пойдзем на той сенакос, нарвом гэтых цвяточкаў і робім каля рэчкі вянкі з цвяточкаў. Крэст у нас быў такі бальшы, быў пастаўлены. На крэст вяночак рабілі. Ну, тады мы ўжо сідзім, гуляем, а тады ўжо цераз агонь пераскаквалі, хто як пераскочыць. І ўжо сідзелі да самага ўсхода сонца. Якое-та ачышчэнне было ад агню, хто пераскачыць. Усе гаварылі, што на Купалле ведзьма ходзіць. І некалі мы на Купалле, заўсёды ўсе хлявы, дзе быў хлеў, як закрывалі хлеў (такая была клямачка), так сюды ўсаджвалі. Крапіва была такая дробненькая, пякучая. Гэты была зашчыта ад ведзьмаў. Некалі так рабілі ўсе старыя людзі. Зробім вянок вялікі і паложым яго на калодзеж. Яшчэ і на ручку пазакручваем. А яшчэ былі каменчыкі каля калодзежа, так мы яшчэ і на каменчык вянок паложым. А хлопцы залезуць на гору і паложаць на комін сцякло. Пачнуць печ тапіць, і ўвесь дым ідзе ў хату. Вот так выраблялі некалі. Было весела. Было дружна і хараша, невядома як.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Дзянішчык Неанілы Ільінічны, 1937 г.н.*





У асноўным былі на Купалле танцулі, пускалі вяночкі па рацэ, караблікі, пелі песні. Папараць-кветку не шукалі, а хадзілі па грыбы і ягады ў лес, у адну ноч сабіраліся жанчыны і ткалі (гэта была такая традыцыя) рушнікі, шылі фартушкі і налажывалі для красы.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Чычко Антаніны Фамінічны, 1926 г.н.*

У нас на Купалле моладзь збіралася на рацэ, запальвалі кастры і прыгалі праз іх. Хлопчыкі з дзяўчатамі спявалі песні, вадзілі карагод каля вогнішча. У кастры спальвалі непрыгодную ўсячыну. Но на Купалле асобую ролю грае кветка-папараць. Дзеўкі брасаюць вянкі ў воду. Яшчэ дзеўкі брасалі вянкі цераз агонь хлопчыкам, каб яны іх рвалі. У рацэ купаліся толькі адважныя хлопцы. Ужын быў такі: усаджваліся каля кастра і рабілі з яек яешню, і запівалі яе гарэлкай.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Данкевіч Яўгеніі Лявонцьеўны, 1944 г.н.*

Гавораць, што кветка папаратніка на Купалле прыносіць шчасце, но як дае яго так і аднімае.

Шла сляпая бабка з лесу і да яе тросткі прычапілася кветка папаратніку. Калі яна прыйшла дамой, то стала зрачай. У яе паявіліся грошы, здароўе, шчасце. Но калі яна пацярала гэту кветку папаратніка, то з ёй і ўшло ўсё добрае. Яна зноў зрабілася сляпой. Я наглядаю кожны год, што моладзь таксама празнуе Купалле, як нашы дзяды і прадзяды. Яны плятуць вянкі, прыгаюць праз вогнішча.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Скрыцкай Марыі Аляксандраўны, 1940 г.н.*

Всегда ішлі на Купалле на рэчку ілі на возера. А сёння Купала, а заўтра Яна. На берагу возера ілі ракі ставілі бальшой касцёр. Збіралі калёса абычно якія старыя там, бралі доскі, дровы там, всё падгатовілі заранее. Запальвалі касцёр і вакруг гэтага кастра харавод вадзілі і пелі песні:

А сёння Купала, а заўтра Яна…

Прыгалі чэраз касцёр, калі ўжо абгарыць, тады і прыгалі. У лес хадзілі, папараць-кветку шукалі, рабілі пудзіла ведзьмы і спальвалі яго. Дзяўчаты вянкі вілі і свечку ў сярэдзіну запальвалі, пускалі вянкі на воду і пелі эту песню:

Купалінка, Купалінка…

В какую сторану паплывёт вянок, туда, значыць, пайдзёт замуж дзяўчына. І яшчэ казалі: "Мой суджаны, пакажы мне, з якога боку ты прыйдзеш ка мне".

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Падгайскай Вольгі Дзям'янаўны, 1930 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Лань Нясвіжскага р-на).*

На двары і на агародзе прывязвалі ўсё, замыкалі ўсё, бо пацягаюць вазы. На Купалле касцёр палілі і лазу прывязуць з лесу, гару яе накладуць. І ўжэ танцы. Хлопцы цераз агонь скачуць, і дзяўчаты цераз агонь скачуць. Былі ўсякія ведзьмы, хадзілі па межках. Некалі куклы вязалі, іх кідалі ў жыце. Спальвалі пуджала. Ідуць папараць-кветку шукаць. Кветкі рвуць, ставяць каля краваці, за ноч распусціцца, то замуж пойдзе, як не распусціцца, то не пойдзе ў гэтым гаду. Вадзілі карагоды, і музыка была, танцуюць і пяюць.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Драчан Ірыны Міхайлаўны, 1933 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Альхоўка Нясвіжскага р-на).*

Я помню, мы хадзілі ў лясок і рвалі гэтыя купалкі. Гадалі: кладзём па две веткі, па одной. А потом ужо святой Ян. Сёдня от Купала, людзі гаворац, што папараць-кветка ёсць. Значыць, нада лажыць усё па дарожках долу, штоб ведзьма не прышла. Палілі касцёр, прыгалі чэраз касцёр. Касцёр паляць там за клубам.

Вяночкі пускалі. Ну, гадалі над купалкамі вось гэтымі: "Любіш, не любіш, к сэрцу прыжмёш, к чорту пашлёш".

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Шынгель Наталлі Віктараўны, 1930 г.н.*

Ну, некалі ў нас на Купалле хлопцы тыя цягнуць калёса туды, іх і бярэзіну на кастры палілі. Помню, раз там у Ліпцы спраўлялі Купало. Дзеці малодшыя, хлопцы (тамака за ровам у нас есць месца) заўсёды туды нацягаюць усяго ды і гулялі. Палкі ставілі, калёсаў накладуць, абложаць яшчэ дзе якім сенам, каб ужэ агонь вялікі быў. Пускалі вянок на ваду і

прасілі: "Плыві туды, да якога берага я замуж пайду".

*Запісана ў в. Альбянка*
*ад Татур Браніславы Францаўны, 1942 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Саска Ліпка Нясвіжскага р-на).*

На Купалле палілі кастры і варажылі. На Купалле мы не хадзілі, таму што пасля ходзяць па дварах і выцягваюць усё на свеце. Завалакуць табе ўсё, што хочаш. Патом ходзіш тады, шукаеш тыя дверы. Гэта рабілі хлопцы малыя, падросткі, а цяпер ужо ціха, ніхто ўжо нічога не цягае.

*Запісана ў в. Альбянка*
*ад Валчок Сафіі Ігнацьеўны, 1935 г.н.*

У нас у каждай вёсцы свае свята. У нас у в. Лявонавічы самае галоўнае свята – гэта Купала. Раней жэ неяк было по-другому, а цяпер прыедзе канцэрт з Нясвіжа. Патом ужо дыскатэка будзе. Рыхтуюцца так: у кажды дом прыязджаюць госці, абавязкова рыхтуецца зараней святочны стол. У в. Смалічы галоўнае свята – Пятро. Чакалаўшчына – вёска, то там на Спас, 19 жніўня, госці пераклікаюцца. У нас на Купалле гатовяць сваю каўбасу, мяска адвараць, хто з маслам, хто са смятанай бліны робіць, мачанку сваю варылі: варыцца ў вадзе мяса, а патом пакалоцяць, муку размяшаюць у вадзічцы і ўсё гэта кіпіць, патом можна зажарыць шкварачкамі, лучком зажарыць.

Купалле спраўлялі каля рэчкі, вогнішча запальвалі, на ім спальвалі ўсё нячыстае. Прыбіралі ў дамах і той мусар спальвалі. Шукалі папараць-кветку, помню, дажэ вельмі не много, год назад, каля рэчкі шукалі, і маладая пара знайшла.

Варажылі. Я помню сваё дзяцінства, мы распальвалі вогнішча, прыгалі, і па аднаму прыгалі, і па дваіх, за рукі ўзяўшыся, малыя былі, нам было па 12, можа, 14 гадоў. І тожэ, хто каму сімпацізіраваў, то ўдваіх прыгалі, узяўшыся за рукі. Мэта была, каб любіў, гэта ж дзецтва было, это ж не 18 гадоў было, што, дзействіцельно, я выберу, можа, мне ён будзе суджаны, ражаны. Вадой таксама абліваліся.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Гурко Марыі Адамаўны, 1945 г.н.*

Некалі загадачкі (купалкі) рвалі, вяночкі плялі, загадачкі былі. Вот яна не распушчана. Распусціцца яна ці не? Пайду я замуж ці не? Сіненькія, на гарах раслі кветачкі, ужэ навыстаўляем і каждаму падпішам. Чыя ек распусцілася, то замуж выйдзе або ўсё добра будзе ў жыцці. Вяночкі плялі. Песні спявалі некалі, а зараз ужо не. Колаў панавозяць, паляць на кастры.

*Запісана ў в. Казлы*
*ад Карачун Марыі Сямёнаўны, 1936 г.н.*

Некалі спявалі: "Сёння Купала, заўтра Ян". Ідуць ужо збіраць у лес першыя ягады. Ну, кастры раньшэ палілі, цяпер ужэ ня паляць. Маладыя прыгалі. Ідуць варажыць дяўчата на скрыжаванне дарог. Просяць, каб Гаспод аб'явіў у ва сне, за каго яна намячаецца выйсці.

З 6-га на 7-га было Купалле. Раньшэ кастры палілі, прыгалі чэраз іх, ішлі варажыць, на крыжавых дарогах. Хто як умее, просіць каб Гасподзь аб'явіў ва сне: ці што, ці за каго яна намячаецца выйсці.

*Запісана ў в. Альбянка*
*ад Шумейка Ядвігі Міхайлаўны, 1929 г.н.*

Збіраліся на Купалле ўсе, вянкі вілі, спявалі, касцёр палілі і вянкі пускалі па вадзе, спявалі маладзёжныя песні.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Галабурды Яўгеніі Уласаўны, 1934 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Асмолава Нясвіжскага р-на).*

Плялі вянкі з усіх кветак, палілі агонь, бегалі каля яго з песнямі, прыгалі цераз яго, елі пірагі, пілі, гулялі да ўтра.

*Запісана ў в. Малева*
*ад Шах Зінаіды Антонаўны, 1928 г.н.*

Вырывалі на Купалу лаўкі, платы насілі, у нас сабіралі розныя палкі, каб запаліць вогнішча. Некалі вянкі вязалі, папаратнік не хадзілі шукаць.

*Запісана ў в. Нялепава*
*ад Буйко Таццяны Аляксандраўны, 1923 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Пагарэльцы Нясвіжскага р-на).*

Быў хрэст такой бальшой, пасярэдзіне дзерэвні стаяў. Снімалі на Купалле ўсе калiткі і складвалі возле гэтага хрэста. Утрам прыходзілі і ўсё забіралі, было як на базары.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Коканавай Алены Вікенцьеўны, 1940 г.н.*



Нясвіжскага краю напеў векавы

Шло шэствіе па сялу, усё ўпрыгожана. Няслі чучала, спявалі песню: "Ой рана на Івана". Складвалі касцёр з вялікіх палак, вадзілі карагоды, правадзілі гульні, прыгалі чэраз касцёр. Пасля спальвалі чучала.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Тачылы Віталія Міхайлавіча, 1962 г.н.*

На Купалле жглі кастры, танцавалі, гулялі, кідалі на ваду вяночкі, плялі іх з рамашак, васількоў. В которую сторону поплывёт вянок, туды і замуж пойдзеш.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Габрыновіч Людмілы Мікалаеўны, 1952 г.н.*

На Купалле палілі касцёр, песні пелі. Здымалі калiткі і складалі іх у адным месце, а ўжо утрам сабіралі іх.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Лукаш Кацярыны Іосіфаўны, 1941 г.н.*

На Купалле прыходзілі малойцы, яны хацелі зняць брамку. Яшчэ шукалі папараць-кветку з гармонікам, скакалі праз касцёр. Калі знаходзіш кветку, то было гэта добрай прыкметай.

*Запісана ў в. Альхоўка*
*ад Драчан Надзеі Міхайлаўны, 1932 г.н.*

Сабіраліся маладыя дзяўчаты і хлопцы за сялом (у полі). Вадзілі карагоды, прыгалі цераз касцёр. Папараць-кветку не шукалі, бо далёка знаходзіўся лес. А былі яшчэ такія людзі, якія хадзілі па сялу і рабілі ўрэд: то калiтку знімуць каму-небудзь і знясуць у другое месца, то забор паваляць – гэтак праводзілі Купалле ў сяле. Гулялі ўсю ноч. Пра папараць-кветку ведалі толькі тое, што яна зацвітае раз у жыцці. Папараць-кветка азначае для чалавека шчасце. Шукалі папараць-кветку маладыя.

*Запісана ў в. Слаўкава*
*ад Харытонавай Чаславы Баляслаўаўны, 1946 г.н.*

На Купала вілі вянкі, іх вешалі на калодзязі. Гэтыя вяночкі былі лячэбныя, іх засушвалі. У каго былі дзеці, то заварывалі іх вадой і купалі дзяцей, самі мыліся. Папараць-кветку не шукалі, таму што ў нас не было леса.

*Запісана ў в. Смалічы*
*ад Мірончык Ірыны Пятроўны, 1936 г.н.*

## Пятро

Дзяўчаткі на Пятро пелі песні:

*Пятрова ночка*
*За ўжэ ж табе, зязюлька,*
*Малайцу каваці*
*Ад Вялікадня і да Пятра.*
*А Пятрова ночка да й маленька,*
*Да й не выспалася да й паненка.*
*Як ягадкі брала, да й драмала,*
*Села перабіраці да й заснула.*
*Прыехалі сваточкі да й не чула.*
*Устань, устань, дзева,*
*Годзе ж табе й спаці,*
*Бо і сваточкі ў варот стаяць.*
*Няхай яны стаяць, гэта ж не мае,*
*Няхай яны едуць, гэта ж не ка мне,*
*Як будуць мае ехаць, будзе лес-дубрава,*
*Будзе лес-дубрава да й шумеці,*
*Залаты падкоўкі да й звінеці.*

*Запісана ў в. Смалічы*
*ад Мірончык Ірыны Пятроўны, 1936 г.н.*

Вось Пятро будзе 12 іюня. Святкавалі.

*Запісана ў в. Альхоўка*
*ад Драчан (Грахоўскай) Людмілы Антонаўны, 1923 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Карцэвічы Нясвіжскага р-на).*

На Пятра ўсяго напякла. Ужо ўсяго ёсць, ужо ўсе зроблена ў полі.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Гадун Алены Вікенцьеўны, 1924 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Каменка Нясвіжскага р-на).*

Праз тыдзень за Яна ідзе Пятро. Прыйшоў Пятрок – апаў лісток, Прыйшоў Ілля – апала два, прыйшла Прачыста – прапала ўсё чыста.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Лях Марыі Сільвестраўны, 1943 г.н.*

У цэркві ходзяць там, спяваюць, бацюшка моліцца.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Антановіч Веры Валяр'янаўны, 1933 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Альхоўка Нясвіжскага р-на).*

Вяночкі плялі. Бывало, шо жыта жалі, а кусочак яго астаўлялі, каб чысценько ўсё было, каб на другі гадок Бог даваў жыто. Паастаўляеш, жыто выпаліш, завяжаш яго, каб уражай быў на следушчы год харошы.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Сінькевіч Вольгі Віктараўны, 1927 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Каменка Нясвіжскага р-на).*

*Прыйшоў Пятрок – апаў лісток,*
*Прыйдзёт Ілля – ападзе два.*

Чэраз две нядзелі после Пятра будзе Ілля. Ну, перад Пятром таксама пост быў. Па времені завісіт ад Троіцы. І после Троіцы наступает ужэ вялікі пост, Пятроў пост называўся.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Падгайскай Вольгі Дзям'янаўны, 1930 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Лань Нясвіжскага р-на).*

Мы тожэ святкуем. На Пятро і Паўла я заўсёды еду да касцёлу. І ў касцёлі імша і ўсё, а так больш нічога. Гаворась: "Прышоў Пятрок – апаў лісток. Прышоў Ілья – апала два".

*Запісана ў в. Альбянка*
*ад Татур Браніславы Францаўны, 1942 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Саска Ліпка Нясвіжскага р-на).*

## Ілья

Гаварылі, што на Ілью поўну печ хлебаналью. Заканчвалась уборка і ўжо быў малады хлеб.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Гадун Алены Вікенцьеўны, 1924 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Каменка Нясвіжскага р-на).*

Старыя людзі гаварылі: "На Ілью поўну печ налью, і Ілья наробя гнілля". Поўну печ, гэта ўжо значыць пірагі пяклі.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Матус Яўгеніі Міхайлаўны, 1930 г.н.*

## Спас

Свянціць на Спас нада яблачкі.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Гадун Алены Вікенцьеўны, 1924 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Каменка Нясвіжскага р-на).*

Спас жа бывае мядовы і яблычны. У нас абычна на яблычны Спас святкавалі, і насілі яблыкі ў царкву. Яблакі складвалі ў карзінку, упрыгожвалі кветкамі і няслі свяціць. Гаварылі, што жанчыны не елі да Спаса яблык, нават мая свякруха не ела, у яе малое дзіця памерла.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Акулік Марыі Уладзіміраўны, 1944 г.н.*

Бацькі, у якіх памерла дзіця, не елі яблакі да Спаса, а калі ўжо пасвенцяць, тады ўжо ядуць.

*Запісана ў в. Вайнілавічы*
*ад Камлач Яніны Валянцінаўны, 1936 г.н.*

Свянцілі зелле на Спас яблачны. Зялёные ўсе яблакі, грушы асвянчалі. Хто быў царкоўны, счыталася, да Спаса есць грэх.

*Запісана ў в. Вайнілавічы*
*ад Запольскага Валянціна Валянцінавіча, 1957 г.н.*

Свенцяць яблыкі. Ну, да Спаса абычна не ядуць, асабліва бацькі, у каго дзеткі памерлі.

*Запісана ў в. Вайнілавічы*
*ад Камлач Вольгі Іванаўны, 1934 г.н.*

Хадзілі ў цэркву на Спас, свянцілі яблыкі, а потым цэлую ноч былі танцы.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Верамейчык Ядвігі Мікалаеўны, 1958 г.н.*

На Іспаса яблыкі, грушы свенцяць. Не можна есці, як хто памёр, да Іспаса яблыкі.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Матус Яўгеніі Міхайлаўны, 1930 г.н.*

Да Спаса не ядзяць яблыкі. Тады на Спаса бяруць усё і свенцяць, у цэркаў вязуць. Пасвенцяць, тады толькі яны пачынаюць есці яблакі.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Кавальчук Аляксандры Паўлаўны, 1931 г.н.*

Спас ёсць і ў нас, і ў вас. Свенцяць яблыкі, некаторыя старыя людзі да Спаса не ядуць яблык. Пасвенцяць яблыкі, тады ядуць. У каго дзеці памерлі, ня можна есці яблык.

*Запісана ў в. Альбянка*
*ад Гібчык Юзэфы Францаўны, 1931 г.н.*

Спас к лету, восені. Бальшы празнік. Абязацельна яблыкі свянцілі. Я дажэ не кушаю гэтых яблык, пака не пасвянчу. Як не вовремя яблыка ўпатрэбляеш, так тваім дзецям будзе што-та не так.

*Запісана ў в. Альбянка*
*ад Шумейка Ядвігі Міхайлаўны, 1929 г.н.*

Ну, тожэ пост быў. Нясом свянціць яблыкі, віноград. Ідзем, ужо бацюшко асвяшчае. Не разрашалася есці тым людзям, у каго памерла маленькае дзіця. Маме нельга было есці да Спаса яблыка.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Маркевіч Аляксандры Уладзіміраўны, 1938 г.н.*

## Мядовы Спас

Чатырнаццатага жніўня адзначаюць Мядовы Спас. У гэты дзень вернікі нясуць у царкву на асвяшчэнне першы мёд. Лічаць, што мёд, асвечаны ў гэты дзень, можа пазбавіць ад шматлікіх хвароб і ўмацаваць здароўе. Акрамя мёду ў царку яшчэ нясуць яблакі, грушы, слівы, вінаград. Хто што можа, той і нясе. Мядовы Спас – гэта пачатак Успенскага посту.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Дзянішчык Неанілы Ільінічны, 1937 г.н.*

Абрывалі яблыкі харошыя, насілі ў царкву на Спас свяціць. Калі хто памёр, то яблыкі есці нельга, толькі калі пасвянціць, толькі тады можна. На могілкі свечаныя яблыкі не насілі.

*Запісана ў в. Нялепава*
*ад Буйко Таццяны Аляксандраўны, 1923 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Пагарэльцы Нясвіжскага р-на).*

## Яблычны спас

Да Спаса, тая маці ў каторай памерла дзіцятка, яна не ела да Спаса яблачка, не можна было, бо дзіцяці Бог не дась пакаштаваць яблачка, як маці будзе яго есці, а так, яна не ела і ўсе стараліся не есць да Спаса яблачка. На Спаса ў цэркву людзі хадзілі, маліліся.

*Запісана ў в. Казлы*
*ад Рабко Фаіны Антонаўны, 1942 г.н.*

У цэркаў яблака насілі свяціць. Старыя людзі яблакаў да Спаса не елі, а грушу елі. Нельзя было есці яблака таму, у каго памерла дзіцё. Таму што Бог на Спаса дзеліць паміж усімі яблачкі, а калі ж мама есць яблака да Спаса, значыцца, таму дзіцяці яблыка не будзе. Пасля таго, як пасвенцяць яблакі, то нясуць на могілку.

*Запісана ў в. Смалічы*
*ад Міронччык Ірыны Пятроўны, 1936 г.н.*

## Зажынкі

Зажыналі жыта. Ну, малітву гаворась, калі зажынаюць тое жыта, а патом ужэ дажынкі. Тады пакідаюць на полі нескалька каласоў. Ложаць хлеб. Каласы гэтыя звязваюць красіва, а тады ложаць хлеб на зямлю, каб ураджай на следующчы год добры быў. На дажынках уносілі ў хату сноп, ставілі на покуце першы сноп, які зжыналі.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Шусты Марыі Антонаўны, 1940 г.н.*

На зажынкі жэншчыны адзяюцца ў прыгожае адзенне і ідуць на поле з песнямі. Трэба 3 раза зрэзаць жыта, і завязаць маленькі снапочак і паставіць на покуце. Гэты снапок першым ложаць у гумно, а потым усё сена.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Аксак Ганны Мікалаеўны, 1952 г.н.*

### Песня "Зажынкі"

*Ды прасіўся снапочак у дзявочак:*
*– Звіце з мяне вяночак,*
*Звіце з мяне, дзявочкі, вяночак,*
*Занясіце на станочак.*
*Звілі вянок не з ружы, не з мяты,*
*А з буйнога жыта злата.*

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Матус Яўгеніі Міхайлаўны, 1930 г.н.*

*Сёння ў нас зажыначкі.*
*А мы жыта зажынаем,*
*Спадара мы праслаўляем.*
*Жыві, жыві, спадар, доўга,*
*Бо ў нас жыта многа-многа.*
*А мы жыта ўжэ зажыналі,*
*І ў снапочкі павязалі.*
*Спадара мы праслаўлялі.*
*Жыві, жыві, спадар, доўга,*
*Бо ты робіш для ўсіх добра.*

*Сёння ў нас зажыначкі,*
*Дасць гаспадар нам гарэлачкі,*
*На закуску сыр беленькі,*
*Будзе ў яго сын маленькі.*
*А мы жыта зажынаем*
*Гаспадара мы праслаўляем.*
*Жыві, жыві, гаспадар доўга,*
*Бо ў нас жніва многа-многа.*
*А мы жыта ўжо зажалі,*
*І ў снапочкі павязалі,*
*Гаспадара мы праслаўлялі.*
*Жыві, жыві, гаспадар, доўга,*
*Бо ты робіш для ўсіх добра.*

*Запісана ў в. Малева*
*ад Гацілы Алены Веньямінаўны, 1933 г.н.*

*За лес сонца кацілася,*
*Мне дадому хацелася,*
*Ні пайду я дадомачку,*
*Буду ў полі начаваці.*

*Дзеля свёкра журлівага,*

*Дзеля мужа бітлівага.*
*Свёкар будзе журбаваці,*
*А мужык будзе лупцаваці.*

*Завёў мяне ў каморачку,*
*Пабіў маю галовачку.*

***

*Сёння ў нас дажыначкі,*
*Дасць панок нам гарэлачкі.*
*На закуску сыр беленькі,*
*Будзе ў пана сын маленькі.*

*А мы жыта зажынаем,*
*Перапёлку выганяем.*
*Вылець, вылець, перапёлка,*
*Бо ў нас жыта ўсяго столька.*

*А мы жыта ўсё пажалі,*
*І ў снапочкі навязалі,*
*А салавейка на каліне,*
*А мой мілы на чужбіне.*

*Запісана ў в. Малева*
*ад Шах Зінаіды Антонаўны, 1928 г.н.*

## Жніво

Зажнём ды й пляцём вянок у полі. Мяне ўсё врэмя вазілі, і я зажынала.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Шарапы Анастасіі Сцяпанаўны, 1933 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Каменка Нясвіжскага р-на).*

Зажыналі збожжа. Гулялі. Тады пучкі вязалі, а потым на празнік Коляды на покуць ставілі.

*Запісана ў в. Жанкавічы*
*ад Карачун Ганны Трафімаўны, 1930 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Каменка Нясвіжскага р-на).*

Мама солі насыпле на кусок хлеба, горстачку жыта зловіць, лентачкай ці трапачкай, красненькай ці розавенькай, перавяжа. Мама перакрысціць і пайшлі жаць. Гэты хлебушак застаецца на полі, і гэты вузялочак стаіць доўга-доўга. Першы снапочак ставяць у красны вугалок.

*Запісана ў в. Слаўкава*
*ад Халоп Марыі Аляксандраўны, 1933 г.н.*

Людзі сярпамі жалі, на дзялкі дзялілі. Жалі ў сярпы. Як кончаць жаць, на палетку звязвалі жыта ў куклачку, каб быў харошы ўражай на следушчы год. Вянкі плялі. Песні спявалі:

*А ў садочку цвіла лілея,*
*Зажала жыта старшая жнея.*
*Збор жыта, збор.*
*Па нашым полі беглі лябёдкі,*
*Зажалі жыта, красныя малодкі,*
*Збор жыта, збор.*
*Засцілай, маці, сталы і лавы,*
*Да нас прыходзіць госць небывалы,*
*Збор жыта, збор.*

Запісана ў в. Смалічы
ад Шчурскай Ірыны Мікалаеўны, 1935 г.н.

На зажынкі абычна каждая жанчына выжне снапок, паставіць яго на хаце на покуці.

*Запісана ў в. Сычэва*
*ад Бараноўскай Марыі Фёдараўны, 1926 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Карцэвічы Нясвіжскага р-на).*

Абходзілі палеткі кругом. На зажынкі бралі сноп, нажнуць яго і тады прэдседацелю калхоза ці брыгадзіру дарылі. Ставілі ў красны вугал. На дажынках гэтак сама. Празнавалі гулянням.

*Запісана ў в. Сычэва*
*ад Юхноўскай Алены Антонаўны, 1935 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Малева Нясвіжскага р-на.).*

Як калхоз ужо быў, абязацельна адзначалі зажынкі, дажынкі. Як пшаніца ці жыта стала каласіцца, не дапускалі, каб не асыпалася. Жалі раней. Зажыналі жанчыны, а мужчыны касілі і памагалі жаць. Каму было весела, пелі песні.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Пракарына Івана Уладзіміравіча, 1938 г.н.*

Мама заўсёды хадзіла, як зажынала жыта, то яна пакіне такую кучачку, звяжа так каласкамі яго і тамака ўжо гавора: “Сёння ў нас зажыначкі, дасць гаспадар наш гарэлачкі. На закуску сыр бяленькі, будзе ў яго сын бяленькі”. Клалі хлеба і соль, кідалі на верх. Гэта ў суботу зажыналася. Тады ўжо ў панядзелак будзе жаць жыта, тагда хлеб і сольку ўжо знімалі. Як дажыналі, спявалі песні, звязвалі ўсё ў снапы. Тады ўжо прасохне і звозілі яго ў гумно.

*Запісана ў в. Карцэвічы*
*ад Крыўко Наталлі Мікалаеўны, 1934 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Малева Нясвіжскага р-на).*

Такі зажыналі снапок і ставяць на покуці перад дажынкамі. Памоліцца, як можа, і ставіць яго. Пакуль не ўбяруць, ён стаіць на покуці. Я гэта не рабіла, як я была, дык калхозы ўжо арганізаваліся. У нас у калхозах і цяпер на зажынкі бацюшка прыязжае дажа з цэрквы, моляцца. Сноп гэты ўручаюць таржэственна, палучаецца. А потым ішлі ўсе жаць, хто мог. Бабы ў полі жалі сярпом. Клалі гэты ячмень, каб ён сох, пераварочвалі, потым вязалі яго ў мэдлі (так называлі). Дажынкі мы не святкавалі. Ужо радаваліся, што ўсё ўбралі.

*Запісана ў в. Вайнілавічы*
*ад Кіпець Тамары Рыгораўны, 1926 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Смолава Нясвіжскага р-на).*

Бабкі спявалі. Адзяваліся ў касцюмы харошыя. Сноп вязалі. Сноп той ужэ, як зажынкі былі, на машыне вязлі, хараша было.

*Запісана ў в. Карцэвічы*
*ад Усовіч Надзеі Максімаўны, 1947 г.н.*

Спяваюць, збіраюцца бабы на зажынкі. Мы ездзілі і спявалі. Бабы зажыналі, старыя бабы, а маладыя спявалі. Потым маленькія снапочкі неслі ў хату, на покуці ставілі. Стаялі там яны, а тады ўжо, калі возяць у гумно, ужо той снапок асвенчаны ў гумно ставілі і тады вазілі ўжо снапы.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Матус Яўгеніі Міхайлаўны, 1930 г.н.*

Самі зажыналі. Ідом зажынаць. Вязлі нас на поле, там мы зажыналі. Вязалі снапочкі, ставілі снапочкі потым на покуць. Калі ўсё гатова, трэба было збожжа вязці ў сарай.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Кавальчук Аляксандры Паўлаўны, 1931 г.н.*

Зажнуць. А патом вечарам збіраюцца, п’юць. Там падаркі каму дадуць. П’юць, гуляюць без канца.

Першы сноп прывозілі ў хлеў, і стаіць ён там, пакуль не смалоцяць усё.

*Запісана ў в. Альбянка*
*ад Гібчык Юзэфы Францаўны, 1931 г.н.*

Бралі першы сноп. Станавілі на покуць. І потым закладвалі яго ў стоўп, калі пачынаюць зерне вазіць. Ну, колькі стаяў? Пака не смалоцяць. Зажынаць хадзіла хазяйка.

*Запісана ў в. Альбянка*
*ад Шумейка Ядвігі Міхайлаўны,1929 г.н.*

У калхозі зажынаюць сноп і ставяць ужэ на покуці. І тады ўжо бабы паспяваюць трохі, той сноп забіраюць. І так жа на дажынках рабілі.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Жук Леаніды Іванаўны, 1938 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Вайнілавічы Нясвіжскага р-на).*

Зажынкі ў нас не спраўлялі. Некалі толькі бабушка ці маці брала снапок, паставіць на покуць, і стаіць ён пака ў гумно снапы не носяць.

А дажынкі жнуць, тады кучачку пакінуць на полі, хлеб, соль, памоляцца і ўсё.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Гадун Ядвігі Уладзіміраўны, 1929 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Лесуны Нясвіжскага р-на).*

Дзе-та ў канцы іюля, начала аўгуста зажыналі. Завязвалі бантамі ілі ніткамі, стужачку завязвалі і снопік выжыналі, і ставілі на покуць пад абразы. Этат снопік ужэ з зажынак і дажынак неслі ў гумно, як першыя снапы прывазілі, дак у гумно няслі сноп, каб мышы не тачылі, і святой вадой маглі асвяціць.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Халецкай Яўгеніі Іванаўны, 1932 г.н.*

Кожны год у нас зажыналі, з песнямі былі, адзяваліся ў такую нацыянальную даўнейшую адзежду, такія юбкі-саматканкі, фартухі, зажыналі з вянкамі на галаве. Астаўлялі апошнія снапкі каласкоў.

*Запісана ў в. Малева*
*ад Ігнатчык Валянціны Усеваладаўны, 1941 г.н.*

У нас была бабка гэтака старынька. Адзявала на сябе белы платок, белы фартушок – ідзе зажынае. Пяклі піражок, ці як звалі каравайчык. Першы зажаты снапок ставілі на покуць, а сена клалі пад абрус. Снапок ставілі, каб быў ураджай, а трава гэта трэба, каб скаціна вялася.

*Запісана ў в. Грыцкавічы*
*ад Кандрацюк Антаніны Сцяпанаўны, 1939 г.н.*

Я помню, як дажынкі, то снапкі вязалі, самы харошы пакідалі.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Церахавец Уладзіславы Францаўны, 1938 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Завітая Нясвіжскага р-на).*

Сабіраюцца бабы, фартухі белыя, хусткі белыя і ўжэ ідуць на поле спяваюць, зажынаюць.

*Запісана ў в. Грыцкавічы*
*ад Рудой Таццяны Антонаўны, 1932 г.н.*

Абычна ў паследні пост Пятра ўжо дажынкі дзелалі. Ва-первых, градавую сераду не трэба было працаваць у полі, з зямлёй, не трогаць землю. Патаму, што б не было граду. Первая градавая серада сразу после Паскі, і после Троіцы градавая серада была. Кагда ўжэ вот пападает градавая серада, то не трэба было ўжо рабіць, працаваць у полі. А так ужо калі наступае граза, то запальвалі свечку і маліліся.

Абычна першым у зямлю кідалі жыта. У нас тут жыта кідалі. Летам або вясной гаспадар хадзіў у жыта, славіў Бога, каб добра ўсё было.

На дажынкі ўжо нарадна адзяваліся, як і на касьбу, нарадна адзяваліся. Тагда выхадзіл каждый на свой сенакос і пелі песні беларускія. Абязацельна зажыналі снапок, і этат снапок связавалі тожэ саломай этай ілі жытам. І ставілі, прынасілі абычна ўжо ў дом хазяіну і на покуць ставілі, там дзе іконы. На покуці стаяла пакуль усё жніво не пройдзе, да малацьбы. І ўжо калі малаціць начынаюць, тады гэты першы снапок абмалоцяць, а потым малацілі ўсе жыта. Свяцілі каласы свянцонай вадой. Сам асвяшчаў хазяін, у него ж есць всегда свянцоная вада. Жнеі, якіх нанімаў хазяін, прыходзілі да казалі: “Дай, гаспадар, сала, а калі не дасі сала – каб твая паласа не ўстала”. Астаўлялі кусцік, звязвалі яго, некалькі сцебляў звязвалі, а ў сярэдзіну кусочак хлеба лажылі, пакідалі на зіму. А калі хто мог разбурыць гэты залом, то ўражаю не будзе.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Падгайскай Вольгі Дзям’янаўны, 1930 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Лань Нясвіжскага р-на).*

Дажнуць у пана, пакінеце трошку. Потым гэту бародку з каменчыкам паложаць і ўсё. А ў багатых людзей жанцы жнуць, тожэ дажнуць, вянок саўюць. Прынясуць пану, багатаму дзядзьку. Тады ідуць і спяваюць летам. Барoдку пакідалі. А снапок, што жалі, і вянок, што вілі, прыносілі хазяіну. Ён ужо нёс у гумно. І перакульваліся на полі.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Драчан Ірыны Міхайлаўны, 1933 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Альхоўка Нясвіжскага р-на).*

Жыта сеялі і кідалі першае зерне, гэта быў ячмень. Жалі жыта, сплятом вянок і павесім брыгадзіру на галаву, а ён прынясе віна, ці чаго. У шнуркі клалі, каб добра прасыхала сена, у мэблю клалі. Каласы свяцілі на Спас, калі празнік быў 19 аўгуста, тады ўжо зелле, зверабой, калоссе і шчэ якое лячэбнае зелле лажылі.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Хаванскай Ірыны Адамаўны, 1946 г.н.*

Штобы быў добры ўраджай, навоз вазілі, удабрэннем нада ўдабрыць поле. Былі каровы, былі авечкі, падсцілалі, ну, а потым гэтым навозам удабралі.

Жыта вырасце, зажынаюць. Бывае, снапок маленькі нажнуць, прынясуць у хату, у покут становяць той снапок, а патом ужо, як возяць ужо ў гумна (такія бальшыя былі гумна) нясуць той снапок малаціць, а патом ужо ўсе астальное возяць. Во як! Жалі рукамі, а потым у снапы сабіралі. Серп такі быў, жнеш.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Шынгель Наталлі Віктараўны, 1930 г.н.*

Каб быў добры ўражай, Бога прасілі. Жанчына, якая рабіла работу пазней, дражнілі “гультайка”, але дзе ж там, усе стараліся ўбраць. Дажэ я (яшчэ была малая) помню, восем год, нашы жнуць мама з папаю, а я вядома хачу легчы спаць, замаруся, а яны: “Ну, нажні ўжэ тады дзесяць снапкоў, тады пойдзеш спаць”. Мучаліся, ой. Снапы, якія пакідаліся ў полі, называліся “бабкі”.

*Запісана ў в. Альбянка*
*ад Валчок Сафіі Ігнацьеўны, 1935 г.н.*

Бярэш тамака снапок той, звяжаш, маленькі, невялічкі прыносілі, на покуць ставілі пад абразы ў хату.

Снапы, якія пакідаліся на полі, называліся “бабкі”. Як ставілі: дзевяць снапоў ставіш, а тады дзясяты раскладалі, разломвалі, накрывалі і называліся “бабкі”. Усё жыта ставілі ў “бабкі”, у гэтакія радочкі, а потым ужэ ж звозілі дадому, у гумно, малацілі цэпам.

Жняю, якая жала жыта горш за ўсіх, называлі гультайкай.

Каласы насілі ў хату на Зельну, да касцёла. Нясеш каласкі, свенціш, а тады гэтыя каласкі, яны вот цэлую зіму ў гэтым кутку з зельем пралежвалі, а тады іх патрэш вясной, і як сеяш, у гэто зярно ўсыпаеш, каб расло вялікае.

*Запісана ў в. Альбянка*
*ад Татур Браніславы Францаўны, 1942 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Саска Ліпка Нясвіжскага р-на).*

Каб жыта не пабіў град, ніколі не рабілі ў такія святы пасля Вялікадня: васкрысенне, панядзелак, аўторак. А ў сераду – гразавая серада называецца, і ў гэты дзень ніколі нічога ніхто не рабіў, зямлю не чапалі, каб град не пабіў.

Першае зерне пакідалі, гаспадар хадзіў, аглядаў сваё жыта, аглядаў, якія каласы, славіў Бога, каб быў добры ўражай, каб усё вырасла, каб град не пабіў, каб нічога не палягло.

На зажынках зажыналі сноп, няслі сноп гэты к прадсядацелю. Прадсядацель дасць грошы на гулянне. Рабілі вот гэтакі вялікі вянок з жыта і кветак кругом. А ўжэ прынясуць гэты вянок, так ужэ прадсядацель клаў грошэй.

Дажынкі ўжо тожа атмячалі. У полі пакідалі і заламвалі паследні каласок, можа, для таго, каб на наступны год усё парасло. Снапы, як ставілі іх, называлі “бабкі”, а ўжо як накрывалі зверху, так “мыдлі”.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Хоміч Ганны Сцяпанаўны, 1944 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Каменка Нясвіжскага р-на).*

Хадзілі летам ў жыта, васількі рвалі, гулялі, а патом жалі, бацькам сваім памагалі. Мы сколькі хадзілі, жалі самі і пальцы пазрэзвалі, было вельмі цікава, спявалі зажыначныя песні, а потым былі дажыначныя. Першы сноп уручалі старшыні калгаса, ці брыгадзіру, людзі жалі, а потым вечарам старшыня прыносіў замачыць, выпіць, як кажуць, і жанчыны пелі задушэўныя песні. Гулянне было адным словам. Ставілі ў копы жыта.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Шынгель Ганны Іванаўны, 1934 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Смалічы).*

На зажынках і дажынках сноп бралі з поля, клалі на покуць, і стаяў ён, пакуль не змалоцяць. Зажынаць хадзіла хазяйка.

*Запісана ў в. Альбянка*
*ад Шумейка Ядвігі Міхайлаўны, 1929 г.н.*

На жніво ўраджай палівайся свяшчэннай вадой ці соллю перад сяўбой.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Тачылы Віталія Міхайлавіча, 1962 г.н.*

Бралі немнога жыта, связвалі ў небальшой сноп і ставілі на покуць да следуюшчых дажынак.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Коканавай Алены Вікенцьеўны, 1940 г.н.*

На жніво, калі трэба быў дождж, украшалі ікону і з ёй абыходзілі вакол поля па кругу.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Лукаш Кацярыны Іосіфаўны, 1941 г.н.*

## ВОСЕНЬСКІ ЦЫКЛ

### Багач

Усё на Багач павінна быць у парадку, убрана. Гэта 21 аўгуста, у сенцябры ў нас быў фэст. Булкі пяклі на Багача. Патаму што ўсё сваё новае вырасла. На Багача мы ішлі на фэст. Там хлопцы былі, наладжвалі там танцы. Танцуем цэлую ноч. Там клуб быў харошы.

*Запісана ў в. Вайнілавічы*
*ад Кіпець Тамары Рыгораўны, 1926 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Асмолава Нясвіжскага р-на).*

Ды сеяць жыта после Багача толькі. Гаварылі: “Прыйшў Багач, даставай рагач, берысь за вейку ды сей па маленьку”.

*Запісана ў в. Вайнілавічы Нясвіжскага р-на*
*ад Запольскага Валянціна Валянцінавіча, 1957 г.н.*

### Пакроў

Да Пакроваў трэба ўбраць усё ў агародзе, ужо пасля Пакроваў пачынаюцца маразы.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Акулік Марыі Уладзіміраўны, 1944 г.н.*

Пакроў – заганяй кароў. Ужо Пакровы – гэта паследні празнік.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Матус Яўгеніі Міхайлаўны, 1930 г.н.*

На Пакровы заганяюць каровы. Трэба каб на полі ўсё собрана было, усё ўбрана, паўбірана, пакапана.

*Запісана ў в. Альбянка*
*ад Гібчык Юзэфы Францаўны, 1931 г.н.*

Пакровы саўсім перад маразамі. Гаварылі: “Прышлі Пакровы, заганяйце каровы!”. Усё трэба было прыбіраць.

*Запісана ў в. Альбянка*
*ад Шумейка Ядвігі Міхайлаўны, 1929 г.н.*

## Дзяды

На Дзяды ў цэркаў ходзім і памінаем, запіскі даём. Свечы ставілі на кладбішчы.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Качура Таццяны Паўлаўны, 1948 г.н.*

На стале адно не ўбіраюць на Дзяды. Трэба каб было на стале, бо верылі, што прыходзілі памерлыя і елі. Памінаюць у цэркві ўсіх родных.

*Запісана ў в. Слаўкава*
*ад Шыкулы Яўгеніі Іосіфаўны, 1914 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Ракавічы Нясвіжскага р-на Мінскай вобл.).*

Як у каго было за што, калі грошы былі, то святкавалі Дзяды. Стараліся некалі, каб усё было на Дзяды, каб стол быў накрыты.

*Запісана ў в. Сычэва*
*ад Комар Марыі Вікенцьеўны, 1941 г.н.*

А на Дзяды тожа стараліся гэтак во штонебудзь згатовіць, а тады на стале пакідалі дзядом тым.

*Запісана ў в. Сычэва*
*ад Юхноўскай Алены Антонаўны, 1935 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Малева Нясвіжскага р-на).*

На Дзяды памінаем памерлых. У цэркву напісваем запісачку. Там ужо чытаюць і памінаюць іх. А тады ўжо на кладбішча ідуць.

*Запісана ў в. Карцэвічы*
*ад Цвірко Алены Пятроўны, 1941 г.н.*

На Дзяды мама бліны пякла, і клалі іх на кожнае акенца. Кажуць, што трэба пакласці кожнаму памёрламу, ён прыйдзе і з’есць. А потым знімалі і курам давалі.

*Запісана ў в. Карцэвічы*
*ад Крыўко Наталлі Мікалаеўны, 1934 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Малева Нясвіжскага р-на).*

Толькі на Дзеды і пасля Дзедаў рабіліся ўсе работы на кладбішчы. Іменна осенню, ні вясной, ні летам, глубокай осенню. Вось хто нават што зробіць летам, могуць звярнуць, напрымер, памятнік на кладбішчы. Быў грэх рабіць да осені на кладбішчы. Толькі осенню ўсё рабілі. Памятнікі ставілі не летам, не вясной, а толькі осенню. Так прынята было, а цяпер хто калі хоча, то і ставіць.

*Запісана ў в. Вайнілавічы*
*ад Запольскага Валянціна Валянцінавіча, 1957 г.н.*

На Дзяды трэба дванаццаць патраў зрабіць: і грыбоў, і бурачкоў гэтых наробім, усяго.

*Запісана ў в. Карцэвічы*
*ад Драчан Соф’і Адамаўны, 1924 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Альхоўка Нясвіжскага р-на).*

На Дзяды на могілкі ідом і ўсё.

*Запісана ў в. Карцэвічы*
*ад Усовіч Надзеі Максімаўны, 1947 г.н.*

Гэта ідуць на Дзяды ў цэркаў. Дзяды мы не адзначалі ў хаце ніколі. Некаторыя ж отмячаюць гэты дзень.

*Запісана ў в. Вайнілавічы*
*ад Кіпець Тамары Рыгораўны, 1926 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Асмолава Нясвіжскага р-на).*

На Дзяды ідуць у цэркаў, тожа вячэраюць. На Дзяды трэба 12 страў зварыць (посных і няпосных). Павячэралі, усё на стале астаўляецца.

Калі запрашаюць дзядоў, то гавораць: “Дзяды, дзяды, прыходзьце вячэраць, мы вам усё аставілі”.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Драчан Ірыны Міхайлаўны, 1933 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Альхоўка Нясвіжскага р-на).*

Сёння молімся за дзядоў, назаўтра ходзім на кладбішча. Молімся, свечку ставім. Гэта было восенню.

*Запісана ў в. Альбянка*
*ад Гібчык Юзэфы Францаўны, 1931 г.н.*

Дзяды – гэта асенні празнік. Пад зіму бярэцца. Спраўляюцца ў нас Дзяды. Гатовяцца стравы якія, прыглашаем дзяцей.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Маркевіч Аляксандры Уладзіміраўны,1938 г.н.*

Ну, Дзяды гэта пасля Пакроваў, 8 лістапада. Тады мы памінаем бацькоў, памінаем іх шырока і хараша, бо ўся праца ўжо зроблена. Мы вымывалі чыста хату. Да ўжына мы частавалі канунам. Гэта булка, яе ламалі ў ваду з мёдам. Яшчэ мы елі яешню, мяса, кашу, суп. Калі нехта заходзіў да нас, мы абавязкова частавалі іх. Усё елі з блінцамі. Колькасць страў была нячотная, бо нячотнае – гэта колькасць жывых. Калі ў кагосьці дзень нараджэння, мы даравалі нячотную колькасць кветак, а калі шлі на пахаванне бралі чотную колькасць.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Скрыцкай Марыі Аляксандраўны, 1940 г.н.*

На Дзяды на стол мы ставілі гарэлку абавязкова, варылі галаву парася, хадзілі на кладбішчэ, маліліся і шлі дамоў. Гаспадар адчыньваў вокна і дзверы, глядзеў на могілкі і зваў сваіх продкаў частавацца.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Жукоўскай Зоі Аляксандраўны, 1933 г.н.*

Памінаюць продкаў у нас на Дзяды, ходзяць на могілкі. Калі ўсе снедаюць, бяруць міску і ложаць у яе па чуць-чуць кожнай ежы – гэта душам нябожчыкаў. Запальвалі вялікую свячу, трэба было паспрабаваць ўсю ежу, бо дзяды разгневаюцца на цябе. Трэба было ўставаць ўсім разам з-за стала, бо інакш памрэш. Ежу не ўбіралі, яна заставалася на ўсю ноч, бо прыходзілі пакойныя бацькі і дзяды.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Базарнавай Марыі Ігнацьеўны, 1922 г.н.*

Памінанне ўсопшых – Дзяды. Гэта ўспамін усіх сваіх памёршых дзядоў. Абавязкова трэба, каб было 9 страў: куцця, блінчыкі мядовыя, кампот з груш, халоднае.

*Запісана ў в. Казлы*
*ад Рабко Фаіны Антонаўны, 1942 г.н.*

У цэркаў шлі, памінаі памерлых, і свечку ставяць. А тады прыходзяць на могілкі, заходзяць, паляць свечку. А дома вараць 12 страў: квас, каша, сялёдка, канон, бліны, грыбы, квас з грыбамі і потым моляцца. Сям’я паліць свечкі ў доме. Чытаюць малітву “Отча наш”.

*Запісана ў в. Альхоўка*
*ад Свірыдовіч Ларысы Сцяпанаўны, 1938 г.н.,*
*Карачун Ніны Сцяпанаўны, 1929 г.н.*

## Андрэй

Хадзілі дзяўчата. Трэба было йці ў тры калодзесі і гаварыць: “Святы Андрэю, у каноплі сею, дай, Божа, знаць, дзе век каратаць”.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Шарапы Анастасіі Сцяпанаўны, 1933 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Каменка Нясвіжскага р-на).*

Некалі на святога Андрэя канапелькі сеялі, хлопцы лавілі ля калодзісяў дзяўчат. Трэба 5 ці 6 калодзісяў абысці – свянцаць.

*Святому Андрэю канапелькі сею,*
*Дай, Божа, узнаць з кім век векаваць?*

Гэта ўжо дзяўчаты хадзілі, варажылі на будучы лёс. Аднойчы дзяўчына прыйшла да калодзежа з Навасёлак, а хлопец схаваўся ў ім ды так яе напужаў, што тая захварэла ды памерла.

*Запісана ў в. Сейлавічы*
*ад Хвіцько Вольгі Паўлаўны, 1932 г.н.,*
*Таратуты Соф’і Мікалаеўны, 1934 г.н.*
*(Матэрыялы ўзяты з архіва Нясвіжскага раённага цэнтра народнай творчасці)*

## Зельна

На Зельну свянцілі каласкі. Гэты Зельна восенню. Гэтыя каласкі лажылі пад паталочак. Зелле свянцілі для таго, каб на наступны год быў добры ўраджай.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Чайкі Вольгі Міхайлаўны, 1922 г.н.*

На гэта свята, 28 аўгуста, свянцілі травы.

*Запісана ў в. Вайнілавічы*
*ад Кароль Ніны Вячаславаўны, 1927 г.н.*

## Барыс

На Барыса ня можна вазіць сена і ня можна вазіць збожжа, таму што можа стукнуць громам, як на Барыса завязеш у клуню. Стараліся людзі да гэтага ўсё зрабіць. Атмячаецца ўвосені.

*Запісана ў в. Казлы*
*ад Рабко Фаіны Антонаўны, 1942 г.н.*

## Уздвіжанне

На Уздвіжанне нельзя картофель сыпаць у пограб, а то там будзе ўсяго: і крысы, і ўсё.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Гадун Алены Вікенцьеўны, 1924 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Каменка Нясвіжскага р-на).*


Нясвіжскага краю напеў векавы

Ніколі, як капалі картофель, не сыпалі ў пограб на Уздвіжанне: будзе многа лягушак. Тады гэта ўсё жывое – і вужы, лягушкі – хаваюцца. У той дзень не адкрывалі паграба, каб не пазапаўзалі яны ў пограб.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Акулік Марыі Уладзіміраўны, 1944 г.н.*

Уздвіжанне тожэ ў нас празнік. На Уздвіжанне хаваюцца ўсе змеі ў норы. Так, не можна нічога з лесу несці ў дом, у падвал кідаць, кажуць, што будуць звіжэць і мышы, і пацукі, і краты, і жабы.

*Запісана ў в. Карцэвічы*
*ад Крыўко Наталлі Мікалаеўны, 1934 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Малева Нясвіжскага р-на).*

Не трэба на Здвіжанне ў пограб кідаць картоплі, барані Божа. Патаму што гэта ўсё двіжыцца звяр’ё, бо будзе повен пограб звяр’я.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Матус Яўгеніі Міхайлаўны, 1930 г.н.*

Не можна на Уздвіжанне з лесу цягнуць грыбоў якіх. Не можна ў склеп картофель сыпаць, а то там жыжэць будуць жабы.

*Запісана ў в. Карцэвічы*
*ад Усовіч Надзеі Максімаўны, 1947 г.н.*

На Уздзвіжанне нельга капаць картоплю, яе ў пограб ня можна ўсыпаць, бо будуць мышы.

*Запісана ў в. Альбянка*
*ад Гібчык Юзэфы Францаўны, 1931 г.н.*

Гэта Уздвіжанне ў нас 27 верасня. Гэто бальшы празнік. Гавараць, што калі прынясеш у пограб і кінеш першую картошку, то дрэнна будзе ляжаць, пагніе.

*Запісана ў в. Альбянка*
*ад Шумейкі Ядвігі Міхайлаўны, 1929 г.н.*



***Валянціна Новак***

# АДМЕТНАСЦІ СЯМЕЙНА-АБРАДАВАЙ ПАЭЗІІ НЯСВІЖЧЫНЫ

Паняццем “сямейна-абрадавая паэзія” аб’яднаны радзінна-хрэсьбінныя абрады і песні, вяселле і пахавальныя галашэнні. У структуры радзінна-хрэсьбіннага абрадавага комплексу Нясвіжчыны можна вылучыць прыкметы і павер’і, звязаныя з цяжарнасцю жанчыны, выбар бабкі-павітухі, кума і кумы, абрад падрыхтоўкі бабкай-павітухай кашы, абрад хрышчэння дзіцяці, адорванне падарункамі бабкі-павітухі і кумоў, абрад разбівання гаршка з кашай, звычай адвозіць бабку-павітуху і інш. Засяродзім увагу на асобных структурных кампанентах радзіннахрэсьбіннай абраднасці. Мясцовыя жыхары надавалі вялікае значэнне шматлікім народным правілам і прадпісанням, выкананне якіх, лічылася, будзе становача ўплываць на лёгкія роды жанчыны, а таксама засцерагаць нованароджанага ад звышнатуральнага ўздзеяння. Паводле народных вераванняў, цяжарнай жанчыне забаранялася пераступаць праз якія-небудзь прадметы, напрыклад, “через нацянутую проволоку переходзіць, бо ў дзіця пупавіна ля шыі будзе” (в. Слаўкава), “не можна цераз вяроўку хадзіць цяжарнай” (в. Карцэвічы). Як адзначылі жыхары в. Смалічы, каб пазбегнуць цяжкіх родаў, трэба было развязаць “фартушок, шнурочкі на бацінках…, каб у вузялкох не былі, бо пупавінка, кажуць, за шыю заматваецца” (в. Смалічы). Каб забяспечыць лёгкія роды, “расшпільвалі ўсё…, бабка раскрывае дзверы, каб лёгка было раджаць” (в. Вайнілавічы). Асцерагаліся жанчыныпарадзіхі глядзець на агонь, забаранялася, калі спалохаешся, дакранацца да твару: “Ну, цяжарнай жанчыне, дзе што гарыць, ёй нельзя туды глядзець, ці вот так бывае, што хто спалохаўся і хватае, нельзя, таму што будзе пятно” (в. Аношкі); “Цяжарнай забаранялася на пажар глядзець, бо можа быць на ліцэ краснае радзімае пятно” (в. Лявонавічы). Згодна з прынцыпамі народнай этнапедагогікі, цяжарная жанчына павінна была строга кантраляваць сваe паводзіны ў адносінах да іншых людзей, не рабіць ім шкоды, не падманваць, быць шчырай і сумленнай, справядлівай (в. Лявонавічы). Не дазвалялася ёй і здзіўляцца з тых людзей, якія мелі пэўныя фізічныя недахопы, “каб ужо малы не ўдаўся случайна на некрасівых такіх” (в. Цякалаўшчына). У народнай практыцы вяскоўцаў важнае значэнне мелі абрадавыя дзеянні, звязаныя з засцярогай дзіцяці ад сурокаў: “Імкнуліся абараніць парадзіху і нованароджанага ад сурокаў такім чынам: тры разы абнасілі і абсыпалі соллю. І гэтую соль кідалі ў печ, як топіцца. А з-пад нізу падолам обціралі ліцо. Гэта рабілі не толькі цяжарным жанчынам, а і дзецям ад сурокаў” (в. Лань). Паводле сведчанняў жыхароў з в. Альбянка, важным сродкам засцярогі ад сурокаў з’яўлялася шпілька, якую “зашпільваеш ды ходзіш з ёй”.

Калі гаварыць пра родавы цыкл і звязаныя з ім прыкметы і павер’і, то варта адзначыць, што, як правіла, роды звычайна прымала бабка-павітуха: “Усіх тых дзяцей, якіх яна дабыла на гэты свет, яна называла ўнучачкамі і частавала іх, часцей за ўсё, яйцом” (в. Смалічы). Жыхары вёсак Карцэвічы і Вайнілавічы пацвердзілі, што заўсёды запрашалі бабку-павітуху, калі ўжо надыходзіў час жанчыне нараджаць: “Бабушку прыводзілі, як ужо ражаць” (запісана ад Драчан Соф’і Адамаўны, 1924 г.н.). Каб аблегчыць пакуты жанчыны-парадзіхі падчас родаў мясцовыя жыхары чыталі малітву: “Трэба малітву “Отчэ наш” гаварыць, каб лягчэй радзіць” (в. Карцэвічы).

Калі ўжо жанчына паспяхова нарадзіла дзіцятка, то ў в. Вайнілавічы ўрачыста адзначалі гэту падзею, хадзілі па вёсцы, пераапраналіся (“мужыка ў бабу адзявалі, а бабу – у мужыка”), пелі песні, частаваліся.

Пасляродавы цыкл уключаў абрады і звычаі, якія сімвалізавалі далучэнне нованароджанага да сям’і. У мясцовай радзіннахрэсьбіннай традыцыі было прынята наведваць жанчыну-парадзіху праз некалькі дзён пасля родаў: “Чэрэз пару дзён прыходзілі ў адведкі. Баба прыходзіла з куццёю, з квасам грыбным” (в. Смалічы).

Устойлівымі на тэрыторыі Нясвіжчыны былі традыцыі хрысціць дзіця і святкаваць хрэсьбіны, на якіх бабку-павітуху, кума і куму адорвалі падарункамі. Як прыгадалі ў в. Смалічы, калі хрысцілі дзяўчынку, то “булку не рэзалі, а рвалі, каб хлопцы замуж скора бралі”. Паводле ўспамінаў жыхароў в. Лявонавічы, у іх мясцовасці было распаўсюджана павер’е, згодна з якім, калі паміралі ў сям’і дзеці, то ў якасці кумоў выбіралі нават незнаёмых людзей, якіх маглі выпадкова сустрэць на вуліцы: “Калі дзіцёнак паміраў, то бралі другіх кумоў. Устрэчных дажа. Спыніш бабу – бяры яе, спыніш мужчыну – яго” (запісана ад Матус Яўгеніі Міхайлаўны, 1930 г.н.). Кум, кума і бабка-павітуха з’яўляліся самымі ганаровымі гасцямі на хрэсьбінах.

Кульмінацыя радзінна-хрэсьбінных святкаванняў – абрад разбівання гаршка з кашай, права разбіваць які атрымліваў кум. У в. Альхоўка “гаршчок разбівалі нагой, а чарапкі выкідвалі” (запісана ад Драчан Ірыны Міхайлаўны, 1933 г.н.). Напрыканцы хрэсьбін адбываўся абрад “адвозіць бабку-павітуху”, які ўключаў тэатралізаваныя элементы і адрозніваўся гумарам: “После хрысцін вазілі бабу па сяле на калясцы з гарэлкаю, з закускаю” (в. Лявонавічы).

У структуры вясельнай абраднасці Нясвіжчыны можна вылучыць тры перыяды: давясельны, уласна вясельны і паслявясельны. Асноўныя абрадавыя моманты нясвіжскага вяселля – гэта сватанне, заручыны, зборная субота, каравай, вянчанне, пасад, ад’езд да маладога, вяселле ў маладога. Як засведчылі жыхары, вяселле звычайна спраўлялі на працягу трох дзён, пры гэтым два дні гулялі на вяселлі ў маладой, а адзін дзень – у маладога. Абрадавы момант давясельнага перыяду – сватанне – у вёсках Нясвіжскага раёна называлі “дагавор”, “на дагавор”, у якім удзельнічалі бацькі з боку маладой і маладога. Было прынята, напрыклад, у вясельнай мясцовай традыцыі в. Малева адорваць падарункамі бацькоў маладой, а таксама і свата. Сімвалам згоды маладой на шлюб у в. Альхоўка з’яўлялася перавязаная ёю чырвонай лентай бутэлька гарэлкі: “Бярэ малады свата, якога-небудзь старэйшага чалавека, і ўжэ тады бутылку бяруць і ідуць засватаць тую маладую. Тая маладая бутылку абвязвае лентаю чырвонаю ці платком харошым”. Калі не дасягалася згода на шлюб, то бацькі маладой вярталі назад прынесеную сватамі гарэлку: “Хадзілі ўдваіх са сватам. Няслі з сабой

Нясвіжскага краю напеў векавы

паўлітры, хлеба булачку маленьку. Еслі сагласен, то водку расходуем, если не даюць – водку аддаюць” (в. Малева). У в. Лань дзяўчына, якая не жадала выходзіць замуж, падмятала падлогу або проста адмаўлялася: “Ну, еслі нявеста не хацела ідці замуж, то гаварыла, што не хоча, ці мяла падлогу” (запісана ад Васільковай Валянціны Уладзіміраўны, 1952 г.н.).

Зборную суботу ў в. Вайнілавічы называлі “Вянок”. Асноўныя рытуалы гэтага абрадавага этапу былі звязаны з падрыхтоўкай кветак і віццём вянка: “Сабіраліся дзяўчата на вянок, а мы малыя яшчэ былі. Вяночак вілі з барвінка. Кальцо трэба каб было абручальнае” (в. Вайнілавічы).

Хоць пра пасад запісаны вельмі сціплыя звесткі, але амаль усе інфарманты пацвердзілі, што “некалі на дзяжу садзілі маладую” (в Вайнілавічы). Паводле ўспамінаў жыхароў, на пасад мела права сесці толькі тая дзяўчына, якая захавала сваю дзявоцкасць, цнатлівасць: “Маладую саджалі на дзяжу, толька чэсну дзеўку, а як не то, не саджалі” (в. Вайнілавічы). З пасадам былі звязаны абрадавыя дзеянні, якія сімвалізавалі пераход маладой у іншы стан – жаноцкі: “Садзілі дзеўчыну на пасад. Клалі паўшубак, кажух. А тады ўжо прывядуць маладую ды садзяць на тэй кажух. А сваха тады абводзіць свечкаю маладую тры разы. Падпаляць косы. Устанеш і тады спавіваешся” (в. Аношкі).

Важным момантам вясельнай абраднасці з’яўляецца каравай, які рыхтавалі старэйшыя ў вёсцы жанчыны (“прыглашалі каравайніцжанчын, у каторых дружная і крэпкая сям’я” – в. Лань), а выносілі яго дзеці: “Каравай дзеткі дзяржуць на кружку. Дзеці баруць кружок з караваем на галаву, уносяць той каравай, музыка грае” – в. Альбянка). Рытуал абсыпання зернем маладых, які звязаны з пажаданнем багацця, надзвычай важны ва ўсіх лакальных вясельных традыцыях Нясвіжчыны: “Зерном абязацельна абсыпалі маладых, во як выпраўляюць на вянчанне” (в. Новы Споў). Адметным момантам нясвіжскага вяселля з’яўляецца звычай “катания молодых на стульях”, што сімвалізавала ў будучым іх шчаслівае сямейнае жыццё: “Их (молодых) вдвоём садили на скамейку, и самые сильные мужики поднимали их вверх и именно вместе. Это на удачу” (г. Нясвіж). Дзяльба каравая суправаджалася разнастайнымі пажаданнямі, якія з’яўляліся своеасаблівым маральна-этычным кодэксам для маладых у іх будучым сямейным жыцці: “Дару табе клубок нітак, каб не блытаўся да чужых лытак. Дару табе медзі, каб былі сыны, як мядзведзі” (в. Карцэвічы). Адметнай з’явай у вясельнай абраднасці жыхароў Нясвіжчыны было выкананне музыкантамі спецыяльных “маршаў”, адрасаваных гасцям. У сістэме вясельнай абраднасці значнае месца займаюць прыкметы і павер’і, якія адлюстравалі светапогляд мясцовых жыхароў, асаблівасці ўспрымання (як прымхлівага, так і рацыянальна-прагматычнага) навакольнага свету. Паслявясельная частка ў розных вёсках Нясвіжчыны мела адметныя назвы: “з пірагамі ездзіць”, “у бацьке” (в. Вялікая Ліпа), “пол мыць” (в. Карцэвічы), “ісці на пірог” (в. Лявонавічы), “дровы масціць” (в. Слаўкава) і інш.

У пахавальнай абраднасці і галашэннях знайшлі адлюстраванне архаічныя міфалагічныя ўяўленні мясцовых жыхароў, звязаныя з рознымі этапамі пахавання памерлага. У розных лакальных традыцыях Нясвіжчыны вялікае значэнне надавалася дзеянням членаў сям’і ў першыя хвіліны пасля смерці блізкага чалавека: спынялі гадзіннікі, завешвалі люстэркі: “Зеркала завешвалі, астанаўліваюць часы, каб не атражаўся пакойнік” (в. Аношкі); “Зеркала прасціной засцілаюць і часы астанаўліваюць. Кажуць, што ўжо астанавілась урэмя чалавека, трэба каб астанавіліс і часы” (в. Карцэвічы). Абмыванне нябожчыка – важны момант у пахавальнай абраднасці, таму і кіраваліся мясцовыя жыхары пэўнымі правіламі. У вёсках Жанкавічы, Слаўкава, Смалічы, Сычэва, Карцэвічы і іншых абмываць нябожчыка запрашалі чужых людзей сталага ўзросту. Паводле сведчанняў жыхароў в. Вайнілавічы, у іх мясцовасці “мыць нябожчыка маглі як родныя, так і спецыяльныя людзі”. У некаторых вёсках выразна прасочваецца ў працэсе абмывання нябожчыка фактар полу: “Калі памерла жанчына, то мылі жанчыны, а калі мужчына – мужчыны” (в. Лявонавічы). Звычайна, як пацвердзілі жыхары в. Лань, запрашалі абмываць нябожчыка старых жанчын: “Пакойніка абычна моюць спецыяльныя бабкі”. Пасля таго, як абмылі цела памерлага, імкнуліся выліць ваду ў тое месца, дзе ніколі не хадзілі людзі. Апраналі нябожчыка ў новае адзенне, але пры гэтым “катэгарычна забаранялася, каб у адзежы памерлага хоць бы прысутнічаў чырвоны колер, гэта магло пацягнуць за сабой яшчэ адну смерць кроўнага сваяка” (г. Нясвіж). Было прынята, каб адну ноч “пераначаваў пакойнік у хаце” (в. Сычэва).

Варта адзначыць, што адметны звычай у пахавальнай абраднасці Нясвіжчыны – прывозіць ёлку з лесу адразу, як памірае чалавек: “Як памрэ, прывязуць ёлку, пасадзяць” (в. Альбянка). “Ёлка ў балтаславянскай традыцыі лічыцца за дрэва, звязанае са светам памерлых. Яе галінкі і сёння выкарыстоўваюцца ў пахавальных абрадах – з іх робяць вянкі, іх кідаюць на дарогу да могілак і г.д. Гэта звязваецца ў першую чаргу з вечнай зелянінай ёлкі, што не магло не асацыявацца з вечнасцю жыцця, з магчымасцю працягу існавання ў іншых вымярэннях” [1, с. 159 ]. Паводле сведчанняў мясцовых жыхароў, “ёлачкі рубяць, пасыпаюць па дарожцы” (в. Карцэвічы); “ Па мертвяцу ставяць ёлачкі ў варотах. Як мертвяца ўжо хаваць будуць, ёлачкамі кідаюць і каля кладбішча две ёлачкі ставяць” (в. Лявонавічы). У структуры мясцовай пахавальнай абраднасці належнае месца адводзіцца пахавальным галашэнням: “Галасілі, прычытвалі па пакойніку, можа што ні так яму здзелалі, так каб прасціў” (в. Лявонавічы).

Такім чынам, сямейная абраднасць, у якой знайшлі адлюстраванне маральна-этычныя каштоўнасці і філасофскія погляды нашых продкаў, суправаджала чалавека на працягу ўсяго яго жыцця: ад нараджэння да пахавання. Рытуальна-абрадавыя комплексы, звязаныя з нараджэннем і хрышчэннем дзіцяці, заключэннем шлюбу і пахаваннем, захоўваюць агульнаэтнічную скіраванасць і вызначаюцца ў розных вёсках Нясвіжскага раёна спецыфічнымі рысамі, адметнымі дэталямі.

### Спіс літаратуры

1. Беларуская міфалогія: Энцыклапед. слоўн. /С. Санько [і інш. ]; склад. І. Клімковіч. – 2-ое выд., дап. -- Мн.: Беларусь, 2006. – 599 с.





## СЯМЕЙНА-АБРАДАВАЯ ПАЭЗІЯ

### Радзінна-хрэсьбінная абраднасць

Хрэсьбіны тры дні святкавалі. Кум і кума былі чужыя людзі. Першае дзіця купала свая бабушка.

*Запісана ў в. Жанкавічы*
*ад Карачун Ганны Трафімаўны, 1930 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Каменка Нясвіжскага р-на).*

Калі ражалі, выклікалі доктара, а раней пажылыя жэншчыны памагалі. Потым хадзілі ў цэркаў, бацюшка красціў.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Кузьмовай (Дашко) Тамары Герасімаўны, 1928 г.н.*

Раньша ж кашу варылі. Ужэ бабка-павітуха была, варыла кашу, патом ужэ ту кашу ў гаршку прыносяць. Патом той гаршчок разбіваюць. Як тая каша не разваліваецца, значыць, тая ўжэ бабка добрую зварыла кашу. Адорвае гэтай кашай. Грошы збіралі на кашу. Як тую кашу з’елі, ну, дык тады ўжэ грошы ложаць. Каша была пшонная з мёдам. Калі дзіця спалохаецца, насілі яго да бабкі-павітухі. Некаторыя бабкі на ваду нагаворвалі. Некаторыя бабкі шэпчуць проста так, некаторыя на свечку. Садзяць гэта дзіцё і гавораць малітву на тую свечку. І там ужо яно відно было (на свечку і на ваду), спалохана дзіця ці не. Яна ўжо гаворыць, колькі разоў хрысціць, каб нідзе не зглазіць, і калі ўжэ ўсё гладзенька-гладзенька будзе, то ўжэ тады дзіцё успакоіваецца. А некаторыя на яйцо шэпчуць. Яйцо разбіваюць, і над галоўкаю ставяць у стакане вадзічку, і ідуць тады стрэлкі, як спалоханы. А як не спалоханы, то стрэлак няма.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Шусты Марыі Антонаўны, 1940 г.н.*

Абязацельно звалі радню і святкавалі. Сабіралі грошы на кашу навараждзённаму, вазілі дзеньгі, падаркі, яшчэ што-небудзь. Сабіралі на мыла, ігралі песні, кладуць кажды грошы малому.

Бабка-павітуха была, яе, калі ё на чым, то адвязуць, а калі няма, то й сама пойдзе (смяецца).

*Запісана ў в Новы Споў*
*ад Рацкевіч (Рак) Ніны Іванаўны, 1941 г.н.*

Ражалі дома. Цяжарнай нельзя через нацянутую проволоку пераходзіць, бо ў дзіця пупавіна ля шыі будзе. Роды прымала бабка-павітуха. В общэм, в роддом не ездзілі, но жэншчына старэнькая прынімала роды. Ёй давалі падарачэк, у каго што ёсць. Первае купанне жэншчынка праводзіць, у якой ужо быў клімакс.

*Запісана ў в. Слаўкава*
*ад Макавец Чаславы Вітольдаўны,1943 г.н.*

Роды прымала бабка-павітуха. Усіх тых дзяцей, якіх яна дабыла на гэты свет, яна называла ўнучачкамі і частавала іх, часцей за ўсё яйцом. Як доўга жанчынка тупае, то развязвала фартушок хазяйка: як дочка, напрымер, ражае ці нявестка. Шнурочкі на бацінках паразвязвае, каб у вузялкох не былі, бо пупавінка, кажуць, за шыю заматваецца.

Хто дома ражаў, а хто ўжо і ў роддоме ражаў. Чэрэз пару дзён прыходзілі ў адведкі. Бабка прыходзіла з куццёю, з квасам грыбным.

Купала першы раз маленькага тая бабка. А патом ужо, як хрэсбіны былі, гасцей многа было. Тую бабу саджалі, як вясною, то ў каляску і вазілі па сяле, а як зімою – на санках вазілі. Бабка сядзела з мятлой уверсе і чырвонаю хусткаю. Каго не ўстрачалі – усіх угашчалі.

*Запісана ў в. Смалічы*
*ад Шчурскай Ірыны Мікалаеўны, 1935 г.н.*

Цяжарная ражала дома. Роды прымалі бабкі старыя. Калі дзіцяці спаўняўся адзін год – няслі той бабцы падарачак, адрэзвалі кусок палатна, бралі закусіць. Яна дзіця благаслаўляла.

*Запісана ў в. Слаўкава*
*ад Шыкулы Яўгеніі Іосіфаўны, 1914 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Ракавічы Нясвіжскага р-на).*

З бальніцы прывозілі і сразу дзіця купалі. Дзіця купалі старыя абычна. Еслі дочка ці нявестка, то купала іх маці.

*Запісана ў в. Сычэва*
*ад Бараноўскай Марыі Фёдараўны, 1926 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Карцэвічы Нясвіжскага р-на).*

На хрэсьбіны прыходзілі кум і кума. Родным нельга быць хроснымі. Бабка купала дзіця.

*Запісана ў в. Сычэва*
*ад Сандрос Вольгі Марцінаўны, 1929 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Андрушы Нясвіжскага р-на).*

Радзіны прынімала бабка-павітуха, ёй патом давалі падарак. Людзі кажуць, што яе вазілі на санках. Былі песні. Дзіця першы раз купала бабка-павітуха. Яна кашу, мусіць, пярловую варыла.

*Запісана ў в. Сычэва*
*ад Юхноўскай Алены Антонаўны, 1935 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Малева Нясвіжскага р-на.).*

Як нараджалі, то звалі бабку-павітуху. Я-то ўжэ ражала ў Каменцы, то звалі бабку. Як хрэсьбіны, то бабку возьмуць, возьмуць каляску якую, да пасадзяць, да вязуць тую бабку, каб гарэлкі сарваць. У кумаўя бралі хто падругаў, хто каго хоча. Кажуць вельмі добра, як брат і сястра.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Шарапы Анастасіі Сцяпанаўны, 1933 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Каменка Нясвіжскага р-на).*

Ня можна цераз вяроўку хадзіць цяжарнай. У празнікі не можна рабіць нічога. Трэба малітву “Отчэ наш” гаварыць, каб лягчэй радзіць.

*Запісана ў в. Карцэвічы*
*ад Цвірко Алены Пятроўны, 1941 г.н.*

Каб пахрысціць, на дом бацюшку прывадзілі. За кумоў бралі сваіх, знаёмых.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Майсені Тацццяны Антонаўны, 1936 г.н.*
*(раней пражывала ў г. Нясвіж).*

Некалі ж квасу навараць гаршок да трапкачэ такія былі вузенькія. У той трапкач ужэ ўсадзяць той квас і ідуць ужэ адведаць, як народзіцца. Некалі ж не ў бальніцах, а дома ражалі. У нас была ў сяле баба некалі, і яе вызывалі да родаў.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Лепяцілы Ніны Уладзіміраўны, 1930 г.н.*

Як вот хто радзіцца, па дзярэўні хадзілі. Мужыка ў бабу адзявалі, а бабу ў мужыка. Кумы перадзяваліся, і ўся дзелегацыя хадзіла па сяле. Пелі там усе, угашчалі, налівалі там.

*Запісана ў в. Вайнілавічы*
*ад Запольскага Валянціна Валянцінавіча, 1957 г.н.*

Цяжарнай жанчыне нельзя адліваць у калодзеж, працаваць у празнікі. Бабы ж некалі дома раджалі, клікалі бабку.

*Запісана ў в. Вайнілавічы*
*ад Кароль Ніны Вячаславаўны, 1927 г.н.*





Некалі ж бальніцаў не было, ражалі дома. Хрысцяць дзіця. Спяваюць даўнейшыя етыя песні. Засцярога была для бярэменных, каб лейцаў, не дай Божа, праз бярэменнаю жанчыну не перакінулі. Ідзе калі запах нехарошы, то жанчына можа плюнуць і наўрадзіць дзіцю.

Бабкі старыя былі, дапамагалі ражаць. У адведкі хадзілі родственнікі, суседзі. Наварадь суп які, кашу. Прыходзілі і жэншчыны, і мужчыны, ну, праз якіх дзён 10 ці нядзелю.У кумаўя бралі хто каго хацеў. Едуць у цэркву перакрысцяць там дзіця. Купалі гэта ж дідятка. Мальчыкаў цераз царскія вароты праносяць. Прыязжаюць дамой, па чарцы вып’юць і ўсё. Варыла маці кашу. Песні пелі старынныя, каб дзіця расло, каб здаровае было. Дзецям жадалі здароўя, шчасця. Ня можна каб мужык і жонка аднаго крысцілі дзіцёнка. Калі дзіцёнак паміраў, то бралі другіх кумоў. Устрэчных дажа. Спыніш бабу – бяры яе, спынеш мужчыну – яго.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Матус Яўгеніі Міхайлаўны, 1930 г.н.*

Я раджала дома дзіця і другога радзіла дома. Цэлы дзень картошку муж пераворваў, а я збірала, дык сярэдзіна забалела, ды і радзіла. Бабка на гледзіны хадзіла. Несла квасок, бліны. У кума бралі якога пляменніка. Можна было родных браць. Бабу-павітуху потым каталі па сялу. Як хрэсьбіны, то кажуць, шо баба збірае дзіцяці на мыла. Потым ёй ужо падарка ўручваюць.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Сінькевіч Вольгі Віктараўны, 1927 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Каменка Нясвіжскага р-на).*

Раней хадзілі ў атведкі. Сабіраліся жанчыны і пайшлі. Гаварылі, калі збіраліся прыйсці, то бралі падаркі нейкія, жанчына прыбіралася, стол накрывала. За кумоў бралі хто родных, хто каго. Калі крысцілі, накрывалі стол.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Акулік Марыі Уладзіміраўны, 1944 г.н.*

Бабушку прыводзілі, як ужо ражаць. На хрысціны бабку завуць і падарак ей даюць. Кашу варыла яна.

*Запісана ў в. Карцэвічы*
*ад Драчан Соф’і Адамаўны, 1924 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Альхоўка Нясвіжскага р-на).*

Ёсць спецыяльныя бабкі, каторых нанімаюць, калі яны памагалі. Былі такія бабакі-павітухі. Адна ці дзве ў сяле ўсягда былі.

*Запісана ў в. Вайнілавічы*
*ад Кіпець Тамары Рыгораўны, 1926 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Асмолава Нясвіжскага р-на Мінскай вобл.).*

Расшпільвалі ўсё, каб легчы было раджаць. Дажа як павядуць у бальніцу, бабка і раскрывае дзверы, каб лёгка было раджаць.

*Запісана ў в. Вайнілавічы*
*ад Камлач Вольгі Іванаўны, 1934 г.н.*

Цяжарнай забаранялася рабіць многа, паднімаць цяжкае, на пажар глядзець не трэба, бо можа быць на ліцэ краснае радзімае пятно, і ўсё, яго не вывядзеш. Як ражала дзяўчына, то некалі звалі бабу-павітуху. Як мае маці расказвала, кажны мужчына пачці мо чераз аднаго (2 разы жанаты, 3 разы жанаты) і ўсі ўміраюць: і мужыкі, і жонкі. Родзіць дзіцятка і ўжэ нікому не патрэбнэ, а прывядзе другую жонку, то тое дзіцятка не глядзяць, да і помрэ. Як я сваіх вазіла хрэсціць на кані, то як хрэсцілі, то бацькоў не пускалі. После хрысцін вазілі бабу па сяле на калясцы з гарэлкаю, з закускаю. Некалі як родзіцца дзіця, то ужэ ў атведкі ідуць. Патом ужэ, як кажуць, і радзіны гуляюць ужэ, клічуць радню, гуляюць вечэр, яшчэ і назаўтра.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Лях Марыі Сільвестраўны, 1943 г.н.*

Гаварылі, што бярэміннай нельга было ісці, калі хто памрэ.Трэба было, каб яна была справядлівай, каб ніколі нікому плахога не рабіла, каб не абманвала. Нельзя было ісці на пажар. Раней бабкі свае прымалі роды. Косы не заплетуюць. За кума бралі родствінікаў. Мужа і жонку нельга было браць. Варылі кашу. Шлі в атведкі. Ідзе ўжэ бабка, якая варыла кашу, і з гэтаю кашаю ідзе. Калі гэтую кашу прададуць, бабе ўжэ падарак дадуць. Баба купала дзіця.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Кавальчук Аляксандры Паўлаўны, 1931 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Садовая Клецкага р-на).*

Ну, цяжарнай жанчыне, дзе што гарыць, ёй нельзя туды глядзець. Ці вот так бывае: што хто спалохаўся і хватае, нельзя, таму што будзе пятно. Надо было больш засцярагацца.

Раней жа ў бальніцы не ражалі. Звалі бабку. Гэта бабка называецца павітуха. Тая бабка роды прынімае. Яна прыходзіла памагала купаць дзіцятка.

Ну, як сабіруцца, могуць цераз нядзелю прыходзіць у адведкі, каб трохі дзіцятка было пахожа на дзіцятка. Жанчыны сабіраюцца, нясуць з сабой. Пякуць так называемую яешню, там яшчэ што-нібудзь: булкі, каўбасу. Прыходзілі толькі жанчыны.

Хрысціць як хто хоча. Ну, хрысціць стараліся да года. Бралі хросную, хроснага. Хто каго выбірае. Мужа і жонку нельзя была браць. Вазілі ў цэркаў. І мама ездзіць, і ўжо пахрысцяць.

Ну, варылі, канешне, варылі "бабіну кашу", пярлоўку, можа, яшчэ з чаго варылі.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Маркевіч Аляксандры Уладзіміраўны, 1938 г.н.*

Бабка прыходзіла купаць 3 разы, 3 дні. Бабцы-павітусе пры першым купанні дзіцяці клалі грошы на краёчак ночваў (называлі ў народзе пелюсці): колькі ў каго было – і рубель, і два. А назаўтра бабка варыла квас, пякла блінчыкі і прыходзіла зноў купаць дзіця, то тады ўжо давалі які-небудзь мацерыял (падарунак). Квас – гэта мяса з грыбамі, а блінчыкі з маслам ці смятанай (што ў каго было).

Ваду для купання бралі з калодзежу, у ваду нічога не сыпалі. Адно як пакупалі, нялслі выліваць ваду пад жаночае дрэва. Калі дзяўчынка нараджалася, пад вішню ці яблыню, а калі хлопчык – пад ясень ці граб (мужское дрэва). Песень асаблівых не спявалі.

На трэці дзень падарункаў бабцы не давалі, а як хрэсьбіны былі, то тады бабцы давалі падарунак. Малому за сталом сабіралі грошы "на мыла" – бабка брала талерку, накрывала платочкам і казала: "Каб нашае малое чысценька было, да здаровенька было – трэба яму сабраць грошай мыла купіць".

Злажылі грошы, тады бабу адзяюць, бяруць дзяркач, садзяць у каляску альбо на санкі і вязуць па сяле ці пад магазін. Бяруць гарэлку з сабою, булку, мяса, і каго ні сустрэнуць на дарозе, налівае бабка ўсім. Калі хрэсцілі дзяўчынку – булку не рэзалі, а рвалі (каб хлопцы замуж скора бралі). Бабка магла грошы аддаць маці нованароджанай, а магла і прыкарманіць іх сабе (тыя, што сабралі за радзінным сталом, бабка магла і не аддаць). Імя дзіцяці давалі бацькі ці блізкія і родныя.

Калі ішлі праведваць парадзіху ("адведкі"), нялслі з сабой хто што мог, а тады збіраліся бацькі і назначалі дзень радзін (цяпер не робіці ніхто). Прыязджалі кума з кумам, вязлі дзіця ў царкву, а як з цэрквы прыязджалі, то павінна была кума "пакрыць" малога (пакласць падарак). Што за сталом давалі падаркі, то гэта само сабой, а як з цэрквы з хрэсту прыязджалі само сабой.

Кумаўство ўспрымалася як сваяцтва, нават калі бралі і чужых у кумаў'я, нежанатых можна было браць у кумы, а сямейных – не бралі. Не бралі ў кумы і бяздзетных.

*Запісана ў в. Сейлавічы*
*ад Хвіцько Вольгі Паулаўны, 1932 г.н.,*
*Таратуты Соф'і Мікалаеўны, 1934 г.н.*
*Матэрыялы ўзяты з архіва Нясвіжскага раённага цэнтра народнай творчасці*

Вазілі па дзярэўні бабку, каторая моет рэбёнка в первый раз. На хрэсьбінах, еслі зіма, то садзілі на санкі і ўжэ па дзярэўні вазілі яе. Падвазілі к дамам, угашчала яна. Угашчэнія яна з сабой вазіла. Дзяцей усіх хрысцілі, у нас у дзярэўні цэркаў была. К хрэсьбінам у нас гатовіліся як на свадзьбу. Очэнь хлебасольныя людзі. Закускі былі розныя. Кашы абычна не было.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Шуковіч Галіны Міхайлаўны, 1946 г.н.*

Прыглашалі свяшчэнніка, ён браў ванначку, лажыў хлопчыка і маліўся. Кум запрашаўся па жаланію.

*Запісана ў в. Грыцкавічы*
*ад Заяц Станіславы Іванаўны, 1944 г.н.*

Была бабіна каша. Уночы яшчэ бабу па сялу каталі. Яна далжна была памыць дзіця.

*Запісана ў в.Малева*
*ад Васільевай Зінаіды Віктараўны, 1950 г.н.*

Бабушкі прымалі роды, дома раджалі. Свае бабушкі прымалі роды, калі не было – другую звалі. Ну, пакупае бабушка. Бабушкі заўсягда шлі на адведзіны. Праз тыдзень, пару дзён прыходзяць бабушкі з гаршчкамі. Варылі кашу. Патом прыходзілі к маладзіцы з кашай. А потым ужэ хрэсьбіны – дзіця вязуць у цэркаў, куму бяруць, кума і едуць. Адзначалі банкетам. Дома падаркамі адорвалі кума і куму. І бабе дарылі.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Гадун Ядвігі Уладзіміраўны, 1929 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Лесуны Нясвіжскага р-на).*

У нас было многа дзяцей. Спачатку бабка прыхадзіла, а паследняга ўжо ў раддом маці паехала раджаць. А так бабка прыходзіла, дапамагала, дзіця запелянае. А ўжэ тая бабка прыходзіла на трэці дзень дзіця мыць. Напячэ яечань, бліноў і наварыць яблак у чыгунку. Хадзіла кожны дзень.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Жук Леаніды Іванаўны, 1938 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Вайнілавічы Нясвіжскага р-на).*

Была некалі ў нас бабка. Ужо і купала, і з раддома як забіралі, то бабка была. Яна прыходзіла, напячэ яечань, хусткай абвяжа і прыходзіць адведаць. Як яна ка мне прыйшла, мне ўжо трэба ёй які падарак рыхтаваць. Ну, і як хрэсьбіны рабілі, то тожа тая бабка была. Кум, кума і бабка – гэта былі асноўныя госці. Тады тую бабку ў каляску садзяць ды вязуць, і кожнаму сустрэчнаму даюць чарку. І варыла бабка кашу, як ужэ на хрэсьбіны. Баба прыходзіла з кашай у гаршчку, тады ўжо, як канчаюцца хрэсьбіны, усім даюць кашу.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Чычко Соф'і Рыгораўны, 1934 г.н.*

Калі жанчына ражала, дык к ёй прыходзіла бабка-павітуха. Калі схваткі былі, то бабку прыводзілі, чысты ручнік бралі.

Абязацельна хто-та з кумавей далжны быць ілі жэнатым, ілі замужняй. Ну, і едут хто куда: хто ў цэркаў, хто ў касцёл. І бацюшка крэсціць, а кума дзержыць.

Ну, і кашу ж варылі. Абязацельна кума далжна была кашу прынесці пшонную, із бярозкі лес пасадзяць, і ізюм паложыць. Абязацельна, кагда крысцілі, то пелёнка далжна быць беленькая.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Халецкай Яўгеніі Іванаўны, 1932 г.н.*

Калі жанчына нараджала, то ёй мама, баба памагала. Як няма сваёй мамы, то клікалі бабку. Яна ужэ першы дзень пакупае.

На хрэсьбіны бабке давалі ўсе грошы. А кума і кум прыносілі падарак дзіцяці. А мы ўжэ неслі бабке.

*Запісана ў в. Малева*
*ад Верэмеевіч Яніны Дзмітрыеўны, 1938 г.н.*

Крэсціны праводзілі самі. На крэсціны бралі з сабой водку, закуску. У маёй мамы бабкі прынімалі роды. На хрэсьбіны кашу прыносілі.

*Запісана ў в. Малева*
*ад Ігнатчык Валянціны Усеваладаўны, 1941 г.н.*

Кумаўямі бралі як хто каго. Кажуць, як памрэ дзіця, то ўжэ трэба браць другую хросную. На Хрэсьбінах варaць кашу, квас, кісель.

*Запісана ў в. Вайнілавічы*
*ад Кароль Ніны Вячаславаўны, 1927 г.н.*

Роды прынімала бабка-павітуха. У кумаў абычна выбіралі сваіх, то знакомых добра, то асоба родных ужо тое, нeяк не бралі, вот больш далейшых бралі за кумоў, бо, гаворaць, кум должэн быць чужэйшы трохі чалавек.

*Запісана ў в. Нялепава*
*ад Болтуць Станіславы Адамаўны, 1947 г.н.*

Калі цяжка хадзіла цяжарная, прыгаворвалі малітвы, у цэркаў хадзілі тожа, бацюшка прыгаварваў малітвы. Першая купала дзіця бабка, каторая доўгі час жыве. У воду далівалі свенцоную. Калі былі цяжкія роды, таксама звалі бабку. Еслі дзіця корміш, ты можаш не забярэменець, гадоў тры корміш тое дзіця.

Бралі куму і кума ды вязлі ў цэркаў. Няможна было браць, прымерна, у каго ў раду ці памірае, ці што, дак тому няможна, тых яны людзей не бралі.

*Запісана ў в. Грыцкавічы*
*ад Кандрацюк Антаніны Сцяпанаўны, 1939 г.н.*

Калі раджала, звалі бабку. Бабака прыйдзе, падніме тое дзіця да пупавіну завяжа. Як свайго старэйшага хрысцілі, зарэзалі барана і сала купілі. У кумоў разведзеных браць няможна. Бабка, як ідзе ў адведкі, так і нясе сваё. Купала дзіця першы раз баба. Пераадзявала бабка дзіця і возіла ў калясцы па сяле.

*Запісана ў в. Грыцкавічы*
*ад Рудой Тацццяны Антонаўны, 1932 г.н.*

Імкнуліся абараніць прарадзіху і нованароджанага ад сурокаў такім чынам: тры разы абнасілі, абсыпалі соллю і гэтую соль кідалі ў печ як топіцца. А з-пад нізу падолам обціралі

ліцо. Гэта рабілі не толькі цяжарным жанчынам, а і дзецям ад сурокаў. Бабкі прымалі роды, бабка-павітуха называлася. Бабку адорвалі тым, у каго што было. У каго грошы былі, то давалі грошы, у каго хлеб, то давалі хлеб. Кума і куму выбіралі хто як хацеў, ілі выбіралі своіх друзей, ілі каго-то із друзей. Хрэсьбіны заканчваліся тым, што пілі гарэлку.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Падгайскай Вольгі Дзям'янаўны, 1930 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Лань Нясвіжскага р-на).*

Пакупаюць маленькага і паложаць спаць. Бабку пачастуюць, пасядзяць. Бабка пойдзе дадому. Назаўтра бабка наварыць кашы ў гаршчочку. Палаценцам абвязвалі той гаршчочак. Тады цераз дзён колькі (цераз нядзельку) вязуць хрысціць дзіцятка. Бабка прыходзіць купае. Укруцяць у падушку, кума дзяцятка вязе, а кум конем кіруе. Перахрысцяць. Кум, кума, роственікі спраўляюць хрэсьбіны. Да гэтай бабкі – хто які падарачак (хто з мацерыялу, палаценца, хто што). Ну, і гуляюць. Тады бабку на саначкі пасадзяць, дадуць самагонку. Возяць па дярэўні, тая бабка ўсім гарэлкі дзеліць, назад ужо грошай назбіраюць, едуць у магазін і зноў п'юць. Бабіну кашу гатавал.

Роды прымала бабка-павітуха. Ну, хочаш – заві каго-небудзь на хрэсьбіны, хочаш – не заві. Приходзіць бабка тая, якая роды прынімала, і зварыць гаршчок кашы якой, квасу з грыбамі, і там ужо ўгашчаюцца. Вот як. А цяпер нічога, у бальніцу завязуць і ўсе.

Хто рабіў хрэсьбіны, хто не рабіў. Яечню пяклі.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Шынгель Наталлі Віктараўны, 1930 г.н.*

Бабка-павітуха была, як я была ўжэ, то не было бабкі-павітухі, а як брат мой радзіўся, то была бабка-павітуха. Яна ўжэ наварыла гаршчок кашы і прыходзіла ў адведкі. Куму – як хто ўжэ выбярэ. Вось, як мая дачка радзілася, узялі мацер хрышчоную, мяне прывязлі з роддома. Мацер хрышчоная ўжэ прышла на першы дзень, пакупала дзіця, я падаркі дала ёй. На каляску садзяць і вязуць бабку-павітуху, і яна ўжо купляе канфеты.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Хаванскай Ірыны Адамаўны, 1946 г.н.*

Цяжарнай жанчыне забаранялася пераступаць цераз вяроўку, патаму шта можа дзіця задавіцца і можа яно цяжка радзіцца, ці што. А на хрэсьбіны, ну хрысцілі дзеці. Збіраліся, ну, прыбіралі сталы, клікалі людзей, вазілі да касцёла ці ў цэркву – там хрысцілі. Дапамагала цяжарнай жанчыне ражаць бальніца. Была і бабка-павітуха. Была тут у меня Кадзейчыха, муж быў на рабоце, а я была бярэменна, і трэба было радзіць. Ну, дак ён быў да дзевяці часоў вечара на рабоце, потым ён ўжо прыходзіць, а мяне ўжэ схваткі бяруць. Дак ён запрог каня везці, так што я даехала да Галі да і радзіла ў Галі. А потым мы ўжэ пазванілі ў бальніцу, а бальніца сказала, што каб я ляжала там, дзе радзіла, а яны прыедуць і забяруць мяне. Дак яны прыехалі і забралі мяне на скорай помашчы, сабралі мяне.

Мы сабе на кума звалі яго брата. Згадзіўся ён, а кума ў мяне была адна, старэйша хрысціла ў мяне дзяўчатка, а ўжо малодшая хрысціла, ну, хлопчыка. Гэта, ну, ужэ каб і замуж выйсці, каб знайсці хлопца. Калі хлопец радзіўся, тут у мяне была другая сястра. Нельга было ўзяць кумоў: мужа з жонкай. Кума ў яе з сям'і адной, а мужа – з другой. Кум і кума павінны былі быць хрышчоныя, а як жа.

На хрышчэнне варылі ячменную кашу,ігралі з ёй. Як у мяне радзіўся хлопец, так Кадзейчыха была, у мяне як родная яна. Мы жылі па-суседску, хораша і ўсе, яна як родна была, я яе не называла баба, а казала цёця, бо яна ж была яшчэ не такая старая, а я была саўсім маладая. Я ў дзевятнаццаць год вышла замуж. А ў дваццаць Ядзю радзіла. А тады цераз пяць год хлопца радзіла, а потым яшчэ чэраз тры (мы думалі: хай двое будзе дзяцей, больш не трэба).

*Запісана ў в. Альбянка*
*ад Валчок Сафіі Ігнацьеўны, 1935 г.н.*

Цяжарнай жанчыне забаранялася пляваць на што-небудзь гадкае, таму што можа потым у малого з рота ваняць; глядзець на абы-што, на калеку на якога, трохі трэба было асцярагацца. Каб засцерагчы прарадзіху ад сурокаў, шпільку зашпільваеш ды ходзіш з ёй. Жанчыне, якая ражала, дапамагала бабка-павітуха.

На хрэсьбіны бяруцца кумы і ў касцёл дух хрысціць. У кума і куму бралі таго, хто панравіцца, могуць суседа папрасіць і суседку, с кім там бывае больш дружыш, можно сваіх каго ўзяць, як хто каго хацеў. Можно было родных запрашаць у кумы.

Бабку-павітуху, мусіць, адразу адорвалі на радзінах. Перш заўсёды былі адведкі, а тады ўжо хрысцілі. Прыходзяць на адведкі, там прыносяць што-небудзь, булачку хлеба, хоць што-небудзь дзіцяці, бо з голымі рукамі ісці да рожаніцы адразу пасля родаў ні паложано, трэба каб з чым-небудзь прышоў, ні з голымі рукамі. А ўжо тады ідуць на радзіны, хто быў на адведках, ужо можна нічога не несці. А ўжэ хто ідзе першы раз на радзіны, а на адведках ні быў, тыя ўжо нясуць і малому падарак адразу. На адведкі можна прыходзіць адразу посля родаў. Былі песні, якія былі прысвечаны бабцы-павітухе. Радзіны закончваліся так: пап'юць, пасняваюць, пойдуць, могут і пабіцца яшчэ ў дадатак, як добра нап'юцца ды ўсё.

*Запісана ў в. Альбянка*
*ад Татур Браніславы Францаўны, 1942 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Саска Ліпка Нясвіжскага р-на).*

Забаранялася цяжарным, вот калі людзі якія нехарошыя, так на іх глядзець, каб ужо малы не ўдаўся случайна на некрасівых такіх. Забаранялася цераз вяроўку пераступаць, каб пупавіна не была закручана ўжо за шыйку ў дзіцяці, бо як пры родах яно можа задушыцца.

*Запісана ў в. Цякалаўшчына*
*ад Кавальчук Валянціны Вікенцьеўны, 1950 г.н.*

Як цяжарная хадзіла, то цераз дрот і пад дрот не лазь, бо, кажуць, не дай Божа, пупавіна на шыйцы ў дзіцяці будзе закручана. Ну, там на сабаку не плёвай, бо будзе дзіця, як сабака, брахаць.

Як спіць дзіця малое і нясуць мерцвяка, трэба нож пад ніз падлажыць, бо, кажуць, спуджана после тады будзе дзіця.

*Запісана ў в. Слаўкава*
*ад Драздовіч Яніны Браніславаўны, 1947 г.н.*

Цяжарнай ня можна было кур ганяць, нагой нічога кідаць нельга. Чэраз вяроўку ніякую не пералазіць. Штоб у час пажара не ўхапілася ні за што. Як бачыць пажар або гарыць што-та, еслі цяжарная ўхопіцца рукою, там будзе краснае радзімае пятно.

Калі былі хрэсьбіны, то сабіраліся. У адведкі з гаршкамі ішлі, квас варылі, верашчаку варылі з грыбамі, пірагі пяклі, аладкі, яечню. Хто зваў друзей у кума, то лічыў, што друзья, сябры лепшыя за сваякоў. Бабіна каша была таксама. Варылі з ячменных круп (пярлоўка зараз). Бабу-павітуху на радзінах садзілі ў каляску і вазілі па сяле. Хто сустракаў на дварэ, баба ўгашчала, песні пелі.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Шынгель Ганны Іванаўны, 1934 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Смалічы).*

Цяжарнай нельга было пераступаць цераз куры, гусі, бо як родзяцца дзеці, то крылішча будзе. Свярліць іх будуць, то вы вазьміце і пакупайце, і мукі па плечкам раскачайце, і пабачыце, на плечах будуць курыныя валасочкі. Вазьміце пакачайце. Калі пакачаеце, і ўсе яны выкачаюцца, то тады дзіця паспакайнее.

Бабка-павітуха прыходзіла ў адведкі. У адведкі хадзілі толькі жанчыны, бо мужчыны не мелі права на гэта. Хрэсьбіны гулялі. Прыбіраюцца і ўжо тры дні гуляюць. За кумоў бяруць найбольш сваіх падруг, друзей, разных бралі, каму як удобна было.

*Запісана ў в. Альбянка*
*ад Гібчык Юзэфы Францаўны, 1931 г.н.*

Калі дзіця нараджалася, бабка-павітуха прыходзіла раней. Яна ў жанчыны прымала роды. Мая баба некалі хадзіла прымаць дзетак. Прыме, а тады наварыць абаранначкаў, а яны – ёй падарак, аддзячаць яе падаркам, вот і яна ўжо чэраз дзён два і пойдзе наведае яе, што-небудзь зноў ёй занясе.

Калі хрэсьбіны, то вязуць да бацюшкі пахрэсціць дзіця, кругом стала абыдуць ужэ і багаславіць якая старэйшая, да прывязуць і ўсё, перахрысцілі.

Вазілі бабку-павітуху па сяле, вазілі чэрэз сяло. Хорошэ ўбіраюць каляску і бабку-павітуху таксама і ўжо вязуць па сяле.

*Запісана ў в. Казлы*
*ад Ляпешка Антаніны Аляксандраўны, 1957 г.н.*

Раней было, што роды прымалі дома. Была бабка старэнькая, звалі яе калі былі сільныя болі ў жанчыны, бабка гэтая пупы завязвала, брала, калі давалі, грошы, матэрыял. На хрэсьбіны бралі як замужніх, так і не замужніх людзей. Хросная маці дарыла і пялёнку, і адзёжку. Бабка першы раз абмы-

вала дзіцця і прыгаворвала нешта, каб ён быў здаровенькі.

*Запісана ў в. Малева*
*ад Шах Зінаіды Антонаўны, 1928 г.н.*

Садзілі ў каляску родных і каталі па вуліцы, білі венікам. Хросная дарыла распашонкі, пялёнкі. Першы раз купала дзіцця бабка, яна ў ваду дабаўляла настояную рамашку.

*Запісана ў в. Малева*
*ад Акулік Галіны Уладзіміраўны, 1947 г.н.*

Раджалі ў бальніцы, прывозілі малога дахаты, прыходзіла маці хросная ў адведкі, прыносіла адзенне для малога. Потым садзіліся за стол снедаць, варылі кашу.

*Запісана ў в. Нялепава*
*ад Захарэц Ірыны Васільеўны, 1932 г.н.*

Цяжарная жанчына не хавалася ні ад каго, хадзіла на работу. Казалі, што ня можна пераступаць цераз штосьці вострае. Як ў маёй маці, то была бабка, якая прымала роды. Тата пайшоў па бабку, мама пачала ражаць.

У Асмолаве называлі бабка-павітуха. Усе яе клікалі. Калі пакупала тое дзіцятка бабка, падняслі пацалаваць, бабке дарылі кусок матэрыі, гэта заўсюды. Муж на родах павінен быў заставацца з жонкай, астатнія далжны быць ў саседняй комнаце. Калі нарадзілась дзіцця, то заходзілі глядзець.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Галабурды Яўгеніі Уласаўны, 1934 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Асмолава Нясвіжскага р-на).*

Была некалі баба старая, якая роды прымала. У яе было дванаццаць дзяцей. Яе клікалі, калі раджалі, яе Лукашыха звалі. Цяпер ужо ў бальніцы раджаюць, потым прыязжаюць дадому, завуць бабку. Яна прыходзіла, купала дзіцятка, давалі ёй потым падарунак. Ваду выносілі на двор, потым паклікалі кума з кумой і павязлі хрысціць.

*Запісана ў в. Кіркаўшчына*
*ад Роўбы Тамары Емяльянаўны, 1938 г.н.*

Крэсцяць дзіцяці ў касцёле, ксёнз асвечвае яго вадой. Кросныя павінны абавязкова падарункі прынесці. А астатнія госці могуць не дарыць нічога. Прыходзілі звычайна з бутылкай і калбасой, хто што вобшчам прынясе.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Коканавай Алены Вікенцьеўны, 1940 г.н.*

Калі жанчына радзіла, у хату запрашаць гасцей нельга, бо людзі могуць зглазіць, у кожнага свае глаза.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Лукаш Кацярыны Іосіфаўны, 1941 г.н.*

Калі жанчына нараджала, нельга было, каб ў хаце быў хто-та, акрамя радзіліцы і бабкі, якая прымае роды.

*Запісана ў в. Альхоўка*
*ад Вальчык Анастасіі Іванаўны, 1927 г.н.*

Спачатку прымала немаўлятка бабка-павітуха, на пасцельцы раджалі ці пад капою сена. Бабка была ў гонары, у пачоці. На сяле яна была адна, у ўсіх прымала роды. Калі прынялі роды, патом, чэраз нескалька нядзелькаў, дзіцятка хрысцяць. Вязуць да бацюшкі. Бяруць кума, куму, садзіліся на коні, убіралі іх і ехалі ў цэркаўку. Там ужэ бацюшка даваў ім імя. Выбіралі імя па кніжцы царкоўнай. От з надыходам Юр'я – будзе Юрай, Мікола свята – Мікола. Бацюшка так і даваў імяна. Пасля таго, як прывезлі з цэрквы, быў прыбраны стол з яешнямі. Яешні рабіліся па-асобаму: бярэцца яйцо, мука, малако, сода, усё гэта мяшаецца, усё гэта на скавародку – і ў печ, і яна падходзіць. Потым надламліваюць кускамі і кожнаму давалі. Пілі з кілішка за здароў'е немаўляткі. Тады гэту бабулю, як зіма, у санкі саджалі і вязлі там, дзе зборышча людзей. Абавязкова з сабою брала яна буталь самагонкі і яешню, і ўжэ мужчыны запрагаюць аглоблі і ўжэ вязлі яе, і кожнаму сустрэчнаму бабуля налівала. Потым дабра жадалі маленькаму, бабку хвалілі. Абвязлі кругом сяла і зноў бабульку прывозяць за стол. Яе саджалі на самым віднам месцы, на покуці. Маленькаму дарылі пялёнку з палатна.

*Запісана ў в. Казлы*
*ад Рабко Фаіны Антонаўны, 1942 г.н.*

На даму прымалі роды. У нас была адна жанчына, яе яшчэ называлі бабка-павітуха, якую заўсёды клікалі к родам. Гэта жанчына была старэйшая ўжэ, каторая з год вышла і ўжэ, прымерна, як яна ў цябе і ў мяне, пятага дзесятага яна была пры родах, так яе ўжэ ўсе сазывалі. Вот былі каторыя, што іспуг там, прымерна, выгаварывалі ці вылівалі воскам. Ну, вот гэтыя жанчыны, каторыя больш малітваў ведалі. Калі ж ўсё было ў парадку,





то яе частавалі. Назаўтра яна пякла блінчыкі, пякла яна ў сваёй хаце і потым прыносіла. Яна пякла маленькія блінчыкі, мачала ў смятану, у масла, у жыр, у мак. Варыла квас: бралася вада падкіслёная, туды дабаўлялі немножка картошкі, мяса, грыбоў асобенна. І яна яго чуць-чуць мукой падкалочвала. Гэты гаршочак брала ў адну руку, а місачку з блінчыкамі ў другую. І яна ішла даведвацца. Яна гэта скоранька прыносіла і развязвала, каб скоранька дзіцця гаварыла. Тады вада гатовая, яна пакупала дзіцятка, а рожаніца кладзе на начовачкі падарак: грошы, палаценца і г.д. На трэці дзень яна абратна прыходзіла і ўжэ пакупая дзіцця. Тры дні дзіцця не клалі ў калыску. Яго клалі на ложак каля маці або на начовачкі дзеравянныя. Як быў хлопчык, то бралі дзевачку годзікаў 6-8 і пакупалі, і спавіла яна яго, і тады яна гэта дзіцця ложа ў калыску. Як дзевачка, то хлопчык клаў. На трэці дзень клалі ў калыску малое. Як хрэсьбіны былі, калі ўсе паядуць і пап'юць, бабка бярэ тарэлку, яна яе засціла платочкам, ну, і кажа, што трэба дзіцяці злажыць грошы на мыла. Вось ідзе ж яна з гэтай тарэлкай па ўсім сталам, хто колькі паложа гэтых грошаў. Ну, а тады ўжо, як трохі выпілі і паелі, бралі каляску, а як зімой – санкі. Многія перадзяваліся: хто кажух вывярне на левую старану, хто накрасіцца і г.д. Пасля застолля бяруць тарэлку, туды налажываюць булку, пірог печаны, водку, калбасу і г.д. Едуць па ўліцэ, каго сустракаюць на уліцэ – усіх частуюць. Булку, як дзяўчына, не давалі рэзаць рукамі, а ламалі кускамі, каб хлопцы любілі. А хлопца – наадварот. А баба, як вып'е ўсю тую гарэлку, то заязжалі яшчэ і ў магазін, куплялі канфет полкілаграма, пячэння кілаграм ці болей. Прыязжалі і па сталу раскладвалі гэты пачастунак. Песні спявалі:

*Із-за гор, гары едуць мазуры,*
*Едуць, едуць мазурачкі,*
*Вязуць, вязуць два вяночкі,*
*Едуць, едуць мазурачкі,*
*Вязуць, вязуць два вяночкі.*
*Мазурцы на двор,*
*Мазурцы на двор.*
*Прыехаў мазур к нам на двор.*
*Стук, брась на ганачка:*
*– Выйдзі, Маша, на крылечка,*
*Стук, брась, у другое.*
*Выйдзі, сэрца залатое,*
*Дай каню вады.*
*– Я не магу стаць, каню вады даць.*
*Мне мама прыказала,*
*Каб я з панам не стаяла.*
*Мне мамаша прыказала,*
*Каб я з панам не стаяла.*
*Мамашы баюсь,*
*Мамашы баюсь.*
*– Мамашы не бойся,*
*Садзіся на мой воз.*
*А мы паедзім у чыста поле,*
*Дзе шырокае раздолле.*
*А мы паедзім у чыста поле,*
*Дзе шырокае раздолле.*
*Там мы зажывём,*
*Там мы зажывём.*
*Сялом ехалі, людзі глядзелі,*
*Што ж там за дзяўчына,*
*Хараша і чарнабрыва,*
*Што ж там за дзяўчына,*
*Хараша і чарнабрыва,*
*З панам ехала, з панам ехала.*

Бабы-павітухі пачастунак называлі бабіна каша. Яна варылася з пярлоўкі, трошкі падсалоджвалася. І гэты гаршок прыносілі да сталоў, раскладвалі па кожнай тарэлцы. Каша варылася ў печы. Спявалі песні, гэта ўжо бацьку спявалі. Бацька прасіў бабульку:

*А бабулька мая, парадулька мая,*
*Дам табе гаршчок маку.*
*Ды зрабі ж, бабулька,*
*Каб не было знаку.*

*Запісана ў в. Смалічы*
*ад Міронччык Ірыны Пятроўны, 1936 г.н.*

З Хросных выбіралі хто з каго хацеў: хто саседзей, хто знаёмых браў. Не бралі жонку і мужыка, не далжно гэтага быць, не рабілі гэтага. Бралі кумоў з адной сям'і і з другой.

*Запісана ў в. Вайнілавічы*
*ад Кіпець Тамары Рыгораўны, 1926 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Асмолава).*

Была бабка-павітуха. І да яе хадзілі во тады, да бабкі, насілі ёй падаркі. А яна ўжо гэтую кашу гатовіла, грыбы, абаранкі. Некалі ў нас, як яшчэ я малая была, вады насалодзяць, накідаюць абаранкаў ды ўжо нясуць. Варылі квас з грыбоў сушаных. Туда кідалі крупу. І што-небудзь сваё пяклі, пончыкі якія. Тая ж

бабка далжна была і купаць, каторая бабіла, каторая разбіраецца троха. Давалі ёй падарак, частавалі абязацельна, чым маглі. У той дзень іменна як народзіцца дзіця, не купалі, прыглашалі патом.

*Запісана ў в. Цякалаўшчына*
*ад Кавальчук Валянціны Вікенцьеўны, 1950 г.н.*

Як дзіця купалі, пакуль не перахрэсціш дзіцяці ў касцёле, то казалі, што етых пялёнак нельзя выносіць на двор і нельзя было выліваць вады, у якой купалі, пакуль дзіця не перахрышчана. Неяк праз акно ўсе пялёнкі выкідвалі. Праз акно, да ўсходу сонейка пакуль, каб дзіцяці не вырадзіла малое дзіця, трэба толькі аглядацца.

Вось пакупаў і не вылівай той вады, хай вада стаіць. Не вылівай ужо, патаму што бывае і што месяц захваціць гэту воду як ты выліваеш, ужо тады дзіця будзе неспакойным. Як месяц захваціць ваду, значыцца, дзіця не захоча спаць. Яно неяк перайначваецца: днём спіць, а ноччу гуляй з ім.

*Запісана ў в. Слаўкава*
*ад Драздовіч Яніны Браніславаўны, 1947 г.н.*

## Вяселле

Вечарам бабкі пяклі каравай, а назаўтра ўжэ была свадзьба. Свадзьба ў мяне праходзіла абыкнавенна. Распісаваліся, патом вянчаліся. А да гэтага нада выкупіць маладую: прыязжаў жаніх з сватамі. Раньша гулялі мы свадзьбу ў васкрасення і ў панядзельнік.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Высоцкай (Чараповіч) Валянціны Аляксандраўны, 1935 г.н.*

Вяселле раньшэ гулялі два-тры дня. У сваты прыходзіў сват. Каравай абізацельно пяклі. Цвяточкі рабілі і самі сладасці пяклі, хворост. Дзяліў каравай сват са свахаю. Зразу бацькам, патом хросным бацькам, а патом братам сёстрам.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Качуры Тацццяны Паўлаўны, 1948 г.н.*

Хадзілі ў сваты. Прыходзілі з хлебам, соллю, сядзелі, дагавараваліся, как будзе праходзіць свадзьба, кагда роспісь, заявленія насілі. Каравай свой пяклі, замешвалі яго ў бальшой місцы. Бабушкі пяклі каравай, пры гэтым спявалі каравайныя песні. Калі ад'язджалі на рэгістрацыю, бралі палаценца з сабою, угашчэнне. Палаценца слалі пад ногі, бацькі благаслаўлялі, абыходзілі машыну вакруг з хлебам, з соллю, з водкаю і іконаю. Прыязжалі з роспісі, встречалі радзіцелі, водку давалі, мёд давалі маладым, рюмкі білі, каб шчаслівыя былі. Зернем абсыпалі, кагда встречалі і як адпраўлялі, каб багатыя былі маладыя. Спачатку каравай давалі радзіцелям, патом сёстрам, брацццям, а патом цёцям, бабушкам, прабабушкам, родным. Як свадзьбу адгулялі, патрэбна ехаць начаваць да жаніха. Гулялі два дня свадзьбу: у суботу і васкрэсенне.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Раманоўскай (Богдан) Ніны Сцяпанаўны, 1946 г.н.*

Спачатку ў сваты хадзілі, дагаварваюцца калі свадзьба. Вяселле святкавалася ў пятніцу, суботу, васкрасенне. Каравай пяклі. Мы на Сёмуху пазнаёміліся, а на Пятра свадзьбу гулялі

У сваты прыходзілі, так: бярэ малады свата, якога-небудзь старэйшага чалавека, і ўжэ тады бутылку бяруць і ідуць засватаць тую маладую. Тая маладая бутылку абвязвае лентаю чырвонаю ці платком харошым. Вот гэта былі заручыны, а патом ужо дагавор быў, калі свадзьбу рабіць. Каравай пеклі бабкі, якія ўмелі. Спякуць, украшаюць цукеркамі. Свадзьбу гулялі два дні.

*Запісана ў в. Альхоўка*
*ад Драчан (Грахоўскай) Людмілы Антонаўны, 1923 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Карцэвічы Нясвіжскага р-на).*

У сваты хадзілі. Ішлі бацькі на дагавор. Каравай пяклі, самі пяклі. Некалі прыбіралі печ, і шышкі там ужо рабілі для каравая, і ўкрашэнні розныя. Патом уносілі яго на стол. Святкавалі ў царкве, бацюшка вянчаў. Вечарам шылі тую фату, як мае быць, абыкнавенна. Абвязвала маці падаркамі, а як адпраўлялі да вянца, абсыпалі зернем. Іконай абходзіла маладых матка. Святкавалі заўсёды пад выхадныя: у суботу, у нядзелю. Два дні гулялі, скакалі. Песні на свадзьбе паюць.

*Запісана ў в. Грыцкавічы*
*ад Заяц (Пятроўскай) Марыі Антонаўны, 1937 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Мацылеўшчына Нясвіжскага р-на).*

Гулялі на вяселле харашо. Тры дні гулялі. Першы дзень – у маладое, а на трэці – адпраўлялі да маладога. Вяночкі плялі. Каравай заказвалі, самі не пяклі.

*Запісана ў в. Жанкавічы*
*ад Карачун Ганны Трафімаўны, 1930 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Каменка Нясвіжскага р-на).*

Вяселле заўсёды гулялі, каб не быў пост. На конях ехалі, ручнік ткалі. Дзяўчаты дзелаюць вячоркі. Мая сястра выходзіла замуж і ў знак таго, што яна чэсная дзевушка, як кажуць, не папробаваная нікем, курыцу зарэзаную, абсмаленую (калі ідуць ад нявесты – да жаніха) нясуць наперадзе.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Атрошчанка Анастасіі Аляксееўны, 1929 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Карма Гомельская вобл.).*

Сваха далжна быць замужам, штобы эта не была ўдава ілі разведзеная.

Едзем у дагаворы. Сразу мы паехалі к сватам у дагаворы, патом на другую суботу, пасля свадзьбы, прыйшлі ка мне, на пірагі. На пасадзе жаніх сядзеў па леву сторану. Каравай быў на другі дзень. Калі яго пеклі, пелі песні народныя. Каравай мне мама пекла, бальшы такі пірог, яго ўкрашалі. Калі ад'язджалі, кідалі зярно, абыходзілі, каб харашо жылі.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Булыгі (Есіс) Ніны Міхайлаўны, 1958 г.н.*

Ну, сваталіся спачатку. Прыязджаў ў сваты муж са сватам, сасваталіся, пасядзелі. Бацькі, сам жаніх і сват прыязджалі. Ну, і патом свадзьба была, як кажуць. Сначала заручыны, патом ўжэ свадзьба. Шчас жа ўжэ распісваюцца і свадзьба, раньшэ так не было. Раней было так: заручыны, ну, гэта вось ужэ, што сваталіся, дарылі падаркі. Раньшэ дык ручнікі дарылі. Нявеста адарвае гэтых, хто ўжэ да іх прыязджае, ну, павязвае ручнікамі каждага, жаніха – не, толькі бацькоў і ўжэ свата, хто ўжэ будзе: сват, сваха – іх абвязвае. І тут чэраз нядзелю была свадзьба.

Я помню, на падушкі садзілі, як адзявалі, маладую. Як плацце шлюбнае адзявалі, садзілася на стул з падушкамі, а ўжэ дзяўчаты памагалі ёй адзявацца, гэта каб харошае жыццё было.

Перад вянцом "падстрыгалі": садзілі на дзяжу і "падстрыгалі", ну, як сказаць, расчоскаю расчэсвалі так во валосікі, а патом свечкаю падпальвалі тры разы так, у трох месцах, ікону абносілі кругом, і спявалі ўжэ песні. Раньшэ на дзяжу садзілі, як пачынаецца свадзьба, як пад вянец. Там, мусіць, і падушка дажэ была. Дзяжа, патом падушка і кажух. Хлопца не садзілі.

Вянчаліся ў цэркве. Як вянчаюцца, хто першы, кажуць, стане на ручнік, той будзе хазяін у доме.

Каравай быў. Свадзьба ж раньшэ ў нявесты была, і свадзьба ў жаніха. Ну, дык, і там, і там каравай. Сначала ў нявесты каравай, а патом ўжэ падзеляць каравай у нявесты, едуць да жаніха, у гэты ж самы дзень у жаніха свадзьбу гуляюць. А назаўтра ўжэ дзеляць каравай у жаніха, і ўсё заканчваецца свадзьба. Пажаданні ўсякія на каравай: каб добра жылі, каб шчасліва ўсё, і клалі грошы, ну, хто чым адарваў.

Каравай заказвалі, штоб спецыцяльныя людзі пяклі (каравайніцы). Гэта жанчыны, каторыя ўжэ занімаюцца гэтым і ўмеюць. Уносяць каравай пад музыку, музыка іграе. Раньшэ дзеткі ўносілі каравай, круціліся. Патом ужэ на стол ставяць, і тады ўжэ сват па куску рэжа і ўжэ выклікае: вот першы там – маладой бацькі ці маладога бацькі ідуць ужэ. Жаніх і нявеста аддзяляюць караваем ужэ і так па парадку ўсіх там: ці брат, ці сястра там, патом ўжэ родственікі. Бралі кавалак на хустачку, з'ядалі: хто сразу, а хто дадому нясе. Лепшым сватам быў у нас Віталь Барадзін, які ў вершаванай форме клікаў да каравая: "Сватава воля, каб да каравая іншоў дзядзька Коля". На кожнае імя ў яго была свая рыфма.

Вяселле было тры дні. Первы дзень паехалі к вянцу, гулялі, дзень, вечар. Патом на следуюшчый дзень – к жаніху (назаўтра яшчэ ў жаніха – пака каравай падзеляць). І на трэці дзень ужэ ў жаніха (там ужэ пахмяляцца ідуць).

На другі дзень (як ішлі ўжэ госці на другі дзень) музыканты садзіліся каля калiткі, на гасцінцы, як дзе ў каго палучалася, лажылі футляр адкрыты, ад скрыпачкі ці ад баяна, і ўжэ ўбачылі здалёк, хто ідзе: "О, там ідзе той-та, той-та госць", марша як дадуць яму – "Славяначку". Госці ідуць, стануць, паслухаюць. Гонару больш, хто грошай больш паложыць музыкантам у футляр. Яны добра набіралі грошай тады. Мужчыны лажылі больш, а жанчыны напалову менш, і дзеці па-якому рублю. Усе ж знаді, з раніцы па карманах раскладалі

грошы: тут каравайныя, а тут "на барабан", казалі "на барабан" у нас.

У в. Міцькавічы ёсць бабуля, якая пякла караваі. Да яе звярталіся, у ёй заказвалі. Караваі пякла ў печы. Былі такія ў яе тазы спецыяльныя, і былі формы і быў у яе алюміневы кубачак. Калі гэтае цеста ў тазу ўжэ гатовае было, каб ставіць яго ў печ, яна пад цеста ставіла гэты алюміневы кубачак. Ён ад печы награваўся сам і даваў духу, каб каравай прапёкся. Каравай складала ў тры этажа, палівала там рознымі палівачкамі сваімі і рабіла фігуркі (птушачкі, жаніха, мядзведзіка, нявесту, музыкантаў) расфарбоўвала іх. Дабаўляла ветачкі шпарахуса.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Жук Алены Мікалаеўны, 1969 г.н.,*
*Шусты Марыі Антонаўны, 1940 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Касмовічы Нясвіжскага р-на).*

На маё вяселле памерла свякруха, а людзі гаварылі, што брак будзя някрэпкі. Дак я і пражыла з мужам толькі тры гады.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Плотнікавай (Максімовіч) Таісіі Пятроўны, 1940 г.н.*

Маладых сустракалі песнямі. Рабілі каравай: прыглашалі каравайніц-жанчын, у каторых дружная, крэпкая сям'я, давяралі толькі ім рабіць каравай. Вось яны замешвалі цеста, і пака гэта ўсё падыходзіла, спявалі песні. Калі добра падышоў каравай, добрая будзя доля. Каравай украшалі кветкамі.

*Запісана ў в Лань*
*ад Угляніцы (Плаксы) Таццяны Аркадзьеўны, 1967 г.н.*

Гулялі і летам, і зімой, у нас у пост свадзьбу не гулялі. Пяклі каравай, дзялілі яго. Пяклі жэншчыны, сабіраюцца чалавек па чатырох і пякуць каравай. Дзялілі на свадзьбе каравай на втарой дзень. Сразу не сажаюць маладога і маладую разам, а па аддзельнасці. Як малады маладую прывозіць, патом сажаюць маладога з маладою. Як ужэ распішуцца, павянчаюцца, тады сажаюць ужэ ўсіх вмесце. Пасля таржэственнай часці ўжэ за стол садзяцца.

*Запісана ў в. Новы Сноў*
*ад Абрамовіч (Ярашэвіч) Станіславы Антонаўны, 1938 г.н.*

Мужчына і жэншчына ў сваты шлі, ад маладога заўсёды быў сват. После роспісі сразу ехалі к маладой, а назаўтра ўжэ – к маладому. Зерном абязацельна абсыпалі маладых, во як выпраўляюць на вянчанне. Раньшэ ж на конях, на вазах ездзілі, абсыпалі жытам, каб было добрае жыццё. Сваха брала ікону, палаценцэ, а патом як ужэ прыязджаюць, сразу румкі б'юць, а патом па канфеце ядзяць, каб сладкая жызнь была.

*Запісана ў в. Новы Сноў*
*ад Рацкевіч (Рак) Ніны Іванаўны, 1941 г.н.*

Спачатку рабілі огавар. Пазнакоміліся. Рашылі пажаніцца. К нявесце прыезжают родственнікі жаніха. Стол накрывают, гасцінцы дзелают. Дагаварываются, на кагда свадзьба. Гулялі тры дня. У невесты дзень і назаўтра да абеда, а патом к жаніху едут. Самі пеклі каравай, кілаграм пяці, у завісімасці ад калічаства гасцей.

*Запісана ў в. Слаўкава*
*ад Макавец Чаславы Вітольдаўны, 1943 г.н.*

Сваталі нявесту. Як была багатая, то сваталі за багатага, а калі бедная, то за беднага. Ідуць у цэркву на запаведзь на аглашэнне да бацюшкі. Бацюшка аглашаў, калі і ў які дзень будзе вяселле. У агледзены прыязжаў маладой са сваёю дружынаю: бацька, мамка, кросныя бацькі. Увечары збіралася моладзь і пяклі каравай, шылі фату для нявесты. Плацце даўжно быць белым абязацельно. Куплялі беленькіе туфелькі, а як у каго няма грошай, так, якія ёсць, адзене. Но маладзёж уся ішла у белым, а як няма свайго, то – ідзі аддалжы. Садзіліся на воз, ездзілі і спявалі песні. Гулялі тры дні. Першы дзень у маладой і другі да абеда. Гулялі на вуліцы, у сенях. Трэці – у маладога. Як адгуляюць, так астаюцца "дровы масціць", маладзёж гуляе ў маладой, а старыя – у маладога. Маладую вязуць да маладога, і свякроў адзяе кажух наізнанку, бярэ ікону і сустракае ўжо маладых. Кажух наізнанку, каб багата была нявестка.

*Запісана ў в. Слаўкава*
*ад Халоп Марыі Аляксандраўны, 1933 г.н.*

Прыходзяць у сваты дагаварвацца з бацькамі, назначаюць, на які дзень свадзьбу рабіць. Прыходзіў жаніх і сват. Праз тыдзень пасля свадзьбы прыязжалі бацькі, каб пазнакоміцца. Булку здобную пяклі. Пякла сваха або той, хто ўмеў. Потым дзеляць той каравай, а праз тыдзень бацькі нявесты едуць да





жаніха. Дзве нядзелі дзлілася свадзьба. Ездзілі вянчацца ў цэркві.

*Запісана ў в. Слаўкава*
*ад Шыкулы Яўгеніі Іосіфаўны, 1914 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Ракавічы Нясвіжскага р-на).*

Вяселле праходзіла слаўна. Хадзілі ў сваты з булкаю і з бутылкаю. У сваты ішоў сват і жанішок. Бралі булку пад паху і ехалі на кані. Дагаварваліся нашчот свадзьбы.

Потым ехалі к вянцу, хлопцы адбіралі перапой. Два дня дзлілася вяселле: у васкрасенне пачыналася, а ў панядзелак заканчвалася.

У свята вяселле не рабілася. А калі нявеста не хацела ісці, то яе кідалі і шукалі другую.

*Запісана ў в. Смалічы*
*ад Гуцько Аляксандра Іванавіча, 1931 г.н.*

Вяселле празнавалася весела. Перад вяселлем збіраліся дзяўчаты, плялі вянок, рабілі фату (раней называлі "вэлен"), бо там былі такія цвяточкі, якія ў кальцо ўплялі. А хлопцы рабілі тожа вечар, але не прыходзілі к дзяўчатам. А дзяўчаты спявалі ўсякія песні. Абычна весела было. Малады едзе к маладой. У яе адбываюць каравай і едуць к яму. У сваты хадзіў сват і малады. Спецыяльных людзей, якія пяклі каравай, не было. Каравай пякла сваха. Пяклі булку, на якой зверху выкладвалі з цеста касу. Чужых на вяселлі не было. Калі гулялі вяселле ў маладой і маладога, то было два караваі, а калі обшчае, то адзін. Каравай дзялілі на другі дзень вяселя. Пелі песні:

*Прыстройся, дзяўчына-нябога,*
*Сягодня дзянёчак святы.*
*Сашый, ты галоўку прыгожа,*
*Бо заўтра прыедуць сваты.*
*Сашый ты галоўку прыгожа,*
*Бо заўтра прыедуць сваты.*

Абсыпалі зернем маладых. З іконай ішоў бацька, сват, маць.

*Запісана ў в. Смалічы*
*ад Шчурскай Ірыны Мікалаеўны, 1935 г.н.*

Абычна прыходзілі бацькі, дагаварваліся і ўсё. Спачатку малады ехаў да маладой. Патом у цэркву ехалі, пасля гэтага абратна да маладой. А назаўтра ўжо дзеляць каравай. Дзеліць сват, а патом – да жаніха. Абычна маладую падстрыгалі. Сваха абводзіла свечачкаю маладую з аднаго боку і з другога. Вяселле святкавалі два дні. У нявесты першы дзень гулялі, а другі – у жаніха. Каравай замужнія, канешна, пяклі.

*Запісана ў в. Сычэва*
*ад Казей Валянціны Паўлаўны, 1930 г.н.*

Раней вяселле гулялі тры дні. У сваты прыходзіў кум. Каравай заказала дзеўчына – і пяклі ёй каравай.

*Запісана ў в. Сычэва*
*ад Комар Марыі Вікенцьеўны, 1941 г.н.*

Прыязжалі ўдваіх, сват і малады, дагаварыліся – і ўсё. Сваха была пекла каравай. Ездзілі вянчацца.

*Запісана ў в. Сычэва*
*ад Сандрос Вольгі Марцінаўны, 1929 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Андрушы Нясвіжскага р-на).*

У сваты хадзіў то лі малады з бацькам, то лі з сватам. Гулялі тры дня, на трэці ехалі к маладому. Каравай абізацельна пяклі свахі. На дзяжу садзілі нявесту. Маладых абсыпалі зернем, як ад'язжалі да маладога. Сват дзяліў каравай. Маладую да стала вёў бацька.

*Запісана ў в. Сычэва*
*ад Юхноўскай Алены Антонаўны, 1935 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Малева Нясвіжскага р-на).*

Раней ездзілі ў сваты. Маладога бяруць і паедуць ужо якая радня і сватаюцца. Ужо як панравіцца, так сыходзяцца, а як не – расходзяцца. Каравай пяклі. У мамы была там нейкая вялікая пасудзіна і пяклі каравай. Некаторыя ведаюць, а некаторыя не, што сваты прыедуць.

*Запісана ў в. Карцэвічы*
*ад Цвірко Алены Пятроўны, 1941 г.н.*

Вяселле гулялі два дні. Першы дзень – у маладой, а другі – у маладога. Пяклі два караваі. У яго свой, а ў яе свой. Маладым аддавалі лебядзей з каравая, а гасцям дзялілі па парадку.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Майсені Таццяны Антонаўны, 1936 г.н.*
*(раней пражывала ў г. Нясвіж.).*

Жаніх ішоў у сваты з дзядзькам альбо і з шваграм. У сваты бралі якога сам хочаш, якога падабаеш. Я была от на свадзьбі, то мне панравілось: "Госці далёкія-блізкія, высокія-нізкія, прашу за стол". А от я жаніла дачку, дак сват абы-які, не ўмеў нічога. Дык я паздраўляла: "Просім Бога найвышэга,

Ойца маткі разданэго, суседзі прыляцелі ў самае кола, што сядзіць вакруг стола. Просім паблагаславіць маладога, свадзьбу начаць, а потым прадліць, а потым ужэ і закончыць". І пад каравай ужэ як завуць, то родных – бацька з мацер'ю. Просіць малады з маладою: каравай каб не забывалі, караваем надзялялі.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Лепяцілы Ніны Уладзіміраўны, 1930 г.н.*

Каравай, хочаш, з молатай, хочаш, з трошку лепшай мукі пяклі. Грошы ў людзей пачці што не было. Хто ў сяле, дык хто палатна, хто кашулю дасць. Каравай дзялілі сват і сваха, назаўтра дзялілі. Ну, і тады ўжо сват благаславіць, сваха ўжо рэжа, хто што падае. Хрышчана сядзіць за сталом, кладзе етыя падаркі ўсе ў клунак. Возьме клунак сваха і скача, а музыканты – гармоніка. На вяселле спявалі песні. Як падпілі, так спявалі. Плялі вянок із руты. Тут ужо вэлен прыбіралі. Адзін вэлен быў на ўсё сяло, і ў аднае жанчыны пазычалі той вэлен, і ўсе вянчаліся ў ім, можа, усё сяло. На вянку спявалі дзяўчаты. Маладая не спявала на вяселлі, трэба, каб маўчала, а не то плача, бо будзе жыць кепска. Госці спявалі. Бралі за свата скрамнейшага, бо мог напіцца.

*Ой, ты ж мая зеляная, не сажаная*
*Маладая дзяўчыночка заручаная,*
*Маладая дзяўчыночка заручаная,*
*Прыбралася, на рынак пайшла,*
*Палюбілі дзяўчыночку ўсе тры малайца,*
*Палюбілі дзяўчыночку ўсе тры малайца.*
*Адзін дзяржыць за ручэньку,*
*другі за рукаў,*
*Трэці стаіць, сэрца баліць,*
*Любіць ды не ўзяў,*
*Любіць ды не ўзяў.*
*Майго бацька двор шырокі,*
*новы частакол,*
*А з-пад тога частакола вылецеў сакол,*
*А з-пад тога частакола вылецеў сакол.*
*Я і думала, я і гадала, што сакол-сакол*
*Азірнуўся, аглянуўся ажно сівы кол,*
*Азірнуўся, аглянуўся ажно сівы кол.*
*Мае хаты пална чужаземцаў,*
*полан бацькаў двор,*
*Мае хаты пална чужаземцаў,*
*полан бацькаў двор.*
*Пілі гарэліцу, давайце віна,*
*Ужо ж цяпер, мая мамка, да я не твая,*
*Ужо ж цяпер, мая мамка, да я не твая.*

### Вясельная песня

*Ой, зелена, зелена ў лузе трава,*
*Зачэм яна зелена, што пад ёй вада.*
*Ой, хароша-хароша ў мужа жана,*
*Зачэм яна хароша, што долі дабра.*
*Спіць жа яна, малада, да белага дня.*
*Не будзі, свякровушка, не сваё дзіця,*
*А свякроўка-бацюшка па сенях ходзіць,*
*Да й сваю нявехнучку ціхонька будзіць:*
*– Уставай, нявехначка, годзе табе спаць,*
*Валы да каровушкі ў хляве стаяць,*
*Куры канапелюшкі павыгрэбалі,*
*Жыта да пшанічанька не жата стаіць,*
*А твой кужаль беляанькі не прадзен*
*ляжыць.*
*– Ой, бацюшко-бацюшко, бацюшко*
*радной,*
*Не май жа ты волюшкі над маей жаной.*
*Куры з канапелюшак я й сам паганю,*
*На жыто пшанічаньку жнеяк я найду.*
*На кужаль беленькі праллю пасажу.*
*Ой, запрагу-запрагу тройку лашадзей,*
*Сяду пакатаюся з мілаю жаной,*
*З мілаю жаной пракатаюся*
*Да й з сваімі жнеямі расчытаюся.*

*Запісана ў в. Карцэвічы*
*ад Грабоўскай Веры Іосіфаўны, 1925 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Вялікая Ліпа Нясвіжскага р-на).*

Прыязджалі сваты. На вяселлі было два каравaі. Адзін каравай быў са стараны маладой, другі – маладога.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Чайкі Вольгі Міхайлаўны, 1922 г.н.*

Каравай пяклі спецыяльныя жэншчыны. Каравай дзяліла сваха. Маці знімала хфату, і ўжо свякруха дарыць хустачку. Некалі на дзяжу садзілі маладу.

*Запісана ў в. Вайнілавічы*
*ад Кароль Ніны Вячаславаўны, 1927 г.н.*

Ну, як жаніцца ідуць, то бяруць булку хлеба, ідуць у сваты. Ну, гэта гарэлка малая. Маленькія чарачкі там выпілі. Абрад ужо зрабілі. А другі раз як ужо ідуць, так ужо бальшая гарэлка. Ну, тады вяселле робяць. Едуць у цэркаў вянчацца. Прыязжаюць з цэрквы.



Нясвіжскага краю напеў векавы

Страчаюць бацькі з мёдам, з усім і заходзяць у хату. Ужо гуляюць у хаце, спяваюць, маладую паздраўляюць, падаркі даюць. А патом каравай на другі дзень дзеляць. Ужэ сазываюцца бацькі крышчоныя, родныя, патом свахі, маладзёж. Сваха пякла каравай. Кожнаму па кусочку давалася. Першы дзень гуляюць у маладой, а на другі дзень пераязжаюць да жаніха. Ужо ў маладога каравай, а то ў маладой быў каравай. Мама жаніха знімае ў маладой вэлюм і завязвае ёй хустачку, бо яна прыехала ў дом жаніха. У платочак ужо прыбірае які харошанькі. Як хто ўмее паздраўлялі. Хто етак, хто так. Песні спявалі даўнейшыя ўжо: як маладая замуж ішла, як маці яе ўжо ўстрачала. Яна гаварыла, каб нявестачка добра была, каб рабіла, памагала мне. У першую ноч прыходзяць потым, паднімаюць адзеяла.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Матус Яўгеніі Міхайлаўны, 1930 г.н.*

Малады разам з сабою каго хоча бярэ, ды і ідуць у сваты. Бацькі то не шлі. Малады і сват ужэ ідуць. Як звалі да каравая, то казалі: "Бацька родны, у Бога родны, просім на каравай, на Божы". Ходзяць вакруг стала, і ўжэ сват тожа гавора. Дзеўку садзілі на пасад. Пасадзяць і састрыгаюць свечкаю. Свечку запаляць, возьме трохі валасоў на клок і падсмаліць. Некалі ж гулялі ў маладой, назаўтра яшчэ ў маладой да абеду, па абедзі прыедуць к маладому. Ну, а патом ужэ каравай у маладога дзеляць. Каравай быў у маладой свой, у маладога свой. Гулялі тры дні. Ужэ і маладая ідзе, і малады ідзе ў чацвер, а бацькі тады к маладой ужэ – у нядзелю.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Шарапы Анастасіі Сцяпанаўны, 1933 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Каменка Нясвіжскага р-на).*

Сват хадзіў з маладым, бацькоў не бралі. У нас папала ў яго і ў мяне адна хросная. Маці абыходзіла вазы тры разы, цяпер ужэ абыходзяць тры разы стала. Ну, і ўсё. Паедзеш у цэркву, звянчаешся. Ну, прыедзеш – і свадзьба ўжэ. Садзілі дзеўчыну на пасад. Клалі паўшубак, кажух. А тады ўжо прывядуць маладую ды садзяць на тэй кажух. А сваха тады абводзіць свечкаю маладую тры разы. Падпаляць косы. Устанеш і тады спяваешся. Малады садзіцца з тое стараны, а ты ўжо з гэтае і спяваешся ўжо з маладым і яго шаферамі. Перад свадзьбаю, у суботу, маладая збірае сваіх дзяўчат, плятуць вяночак. Іх частуеш, яны песні паюць, а як прыбіраешся ўжэ да вянца, вяночак тэй ў галаву прыкалывалі. Свадзьбу гулялі ў суботу, нядзелю, панядзелак. Каравай падзеляць у маладога і ў маладой. Было два караваі. Каравай пяклі жанкі.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Сінькевіч Вольгі Віктараўны, 1927 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Каменка Нясвіжскага р-на).*

Прыязжалі сваты: сват, сваха, дружка, першы брат. На канях жа было вяселле. Заручаліся ж некалі, вот за стол як ужо пасядуць, ды ўжо нявеста платочкі дарыла. На дзяжу садзілі, падстрыгалі свечкаю: ставілі дзяжу, лажылі кажух, а потым падстрыгалі свечкаю тры разы. Песні спявалі. Каторая была нячэсная, не можна было садзіць на дзяжу. Платочкі зложвалі на чатыры часці, водкі нальеш і на тарэлачку ставіш і платочак радам ложыш кожнаму, а яны ўжо тагды грошы ложаць, хто што. Пасля пасаду садзіліся за стол альбо ехалі ў царкву вянчацца. За нядзелю бацькі маладой прыязжалі да бацькоў маладога, гэта называецца "з пірагамі ездзіць" да жаніха. Маладому, яго дружыне прышпільвалі кветачкі і маладой прышпільвалі. Два дні гулялі вяселле, а на трэці дзень прыходзілі пол мыць. Гэта значыць, прыходзілі, вадою палы змочвалі, а потым п'юць, гуляюць. Потым ехалі да жаніха. Сустракалі бацькі, на тарэлачцы быў платочак і дзве румкі з гарэлкай. Спявалісь песні, марш грае, калі ад'язжаюць, танцуюць. Самы галоўны на вяселлі быў сват, сваха каравай дзяліла. А сват запрашаў. Маладым дарылі падаркі і гаварылі: "Дару табе клубок нітак, каб не блытаўся да чужых лытак. Дару табе палена, каб пацалаваў маладую ў калена. Дару табе медзі, каб былі сыны, як мядзведзі". Калі едуць да маладога, маладая дзяржыць клубок нітак, каб дзеўкі замуж шлі.

*Запісана ў в. Карцэвічы*
*ад Крыўко Наталлі Мікалаеўны, 1934 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Малева Нясвіжскага р-на).*

Вяселле беднае тада было. Як на тры ста-

лы робяць – так гэта ўжо добрае было. У сваты ездзілі. Малады хлопец прыходзіць і свата бярэ. Два дні было вяселле. Каравай бабы такія пяклі.

*Запісана ў в. Карцэвічы*
*ад Драчан Соф'і Адамаўны, 1924 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Альхоўка Нясвіжскага р-на).*

Замуж ішлі тожа. Сабіраліся дзяўчата на вянок, а мы малыя яшчэ былі. Суседка ў нас там ішла ды і паклікала нас. Ох, мы ж і радыя былі. Вяночак вілі з барвінка. Кальцо трэба каб было абручальнае. Плацце ж у нявесты. У сваты прыходзіў жаніх з мужчынамі дагаварвацца, калі свадзьба, калі што, калі ўжо дагаварылісь. Мая свадзьба была перад Пятром. Пятро – гэта ўжо пост. Мой дзядзька хадзіў у цэркву ды і кажа на нас: “Што ж вы цянеце, рабіце свадзьбу, усё ж скора Пятро – будзе пост. Мы вянчаліся. Не было такіх машын легкавых. Як я ішла замуж, дык мы на гэтай, на грузавой ехалі. Я ў кабіне, малады наверсе.

*Запісана ў в. Вайнілавічы*
*ад Кароль Ніны Вячаславаўны, 1937 г.н.*

Вяселле гулялі хораша. У сваты хадзілі днём сват і сваха. Свадзьбу гулялі два дні ў нявесты, а потым – у жаніха. На вяселле пяклі каравай бацькі. Развядзёным ня можна пячы каравай і ў сваты нельга было іці. На дагаворах дагаворваліся, як будуць свадзьбу рабіць.

*Запісана ў в. Вайнілавічы*
*ад Камлач Яніны Валянцінаўны, 1936 г.н.*

Жаніх, як ішоў у сваты, то браў с сабой свата. Ён павінен быць гаварлівы. Як ехаць у ЗАГС, то маці хадзіла і абсыпала ваза, так і шчас машыны абсыпаюць. Гулялі тры дні ў маладой, патом ішлі к маладому. Вянчаліся на другі дзень. А пад вечар ужо маладая ўсіх сваіх вызывала на каравай. Патом сабіраліся і ехалі к маладому. Ужэ начыналася ў маладога свадзьба. Назаўтра зноў у маладога дзень гуляюць, і ўжэ пад каравай заве малады сваю радню. Абычна вяселле рабілі ў суботу, васкрасенне, бывала, у пятніцу начыналі. Перад свадьбай вечарам збіраліся дзяўчаты плясці вянок. Як начыналась свадзьба, то ў нас усе мужчыны “ідуць на пірог”, бабы співаюць ужэ песні, тады ужэ выносяць і сумку (водку, закуску), і ужэ бабы ідуць, гуляюць, мужчынам асобенна даюць. Як з ЗАГСа ехалі, то ставілі перапоі. У мястах могуць раза тры, пака да сельсавету даедуць. Вынясуць стол, на стале патрэбна каб абязацельна стаяла гарэлка. Становяць сярод сяла, а яны едуць і становяцца.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Лях Марыі Сільвестраўны, 1943 г.н.*

Пасля сватання я сабірала перад свадзьбай за нядзелю дзевачак-падружак, чалавек васямнаццаць-дваццаць. Рабілі мне вяночак дзяўчаткі. Я іх угашчала. Надзелі мне ўжо тэй вяночак. Паспявалі. Песні харошыя спявалі пра вяночак, пра маладую. Дзявішнік называлі. Жаніліся толькі не ў посты. У Піліпавы пост не жаніліся. На Тры каралі ўжо вянчаліся. Едуць у сваты малады і сват. Пасаг трэба, каб давалі прыданае маладой: хто гектар зямлі, хто хату якую, што ў каго было.

Каравай пяклі. Мясілі цеста як у каго палучалася: хто найшоў каго, хто сам пёк, а хто людзей прасіў, а цяпер за грошы ўжо. У печы пяклі каравай. Ну, есць спецыялісты такія, больш развітыя дзяўчынкі, якія больш панімалі ў кулінарыі. Тады тэй каравай убіралі хораша і ўжо ва врэмя свадзьбы малыя дзеткі няслі, уносілі каравай чатыры або пяць дзевачак, і нясуць на выцянутых руках, і круцяцца. На таком веке з дзяжы насілі і выносілі каравай з хаты. Дзетак тых апяць звалі выносіць. Давалі ім булкі за гэта. Уносілі, усе крычалі: “Каравай! Каравай!”. Палучалі ж булкі там кусок і дзеці, і старых угашчалі тожа. Свадзьба была.

*Запісана ў в. Вайнілавічы*
*ад Кіпець Тамары Рыгораўны, 1926 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Асмолава Нясвіжскага р-на).*

Гулялі вяселле праз сем нядзель после Пасхі. От тады самэ вяселлі былі. У пост рабіць вяселле быў грэх. Некалі ў нас Юрка Галякоў узяў Котаву сястру. То ўсе дзівіліся, бо вялікі грэх быў. Ніхто, ніхто не жаніўся ў пост. У сваты ехаў сват, маці, бацька і малады. Свата выбіраюць гаварліваго, шустраго. А калі той, шо абы-які, то і вяселле – не вяселле. Ехалі ў сваты пад вечар абычна.

*Ой, хажу я, хажу па вішнёваму саду,*
*Отдала мене мама ў чужую сям'ю.*
*А веліка сям'я ўся вячэраць села,*
*А мене, маладу, выпраўляюць па воду.*





*Ой, іду ж я іду ў крыніцу па воду,*
*І з дромнымі глазкамі я крыніцы не найду.*
*А крыніцу нашла і вады я набрала,*
*Поўнага вядра не брала, слёзкамі даліла.*
*А веліка сям'я навучае мужыка:*
*– Чаму жонкі не б'еш, чаму жонкі не б'еш?*
*– За што жонку буду біць,*
*яна умее ўсё рабіць:*
*І парыць, і варыць, і са мною гаварыць,*
*І ўпрысядкі гуляць, і са мною пагуляць.*

Як дзеўка сагласна, то распівалі водку, а як не сагласна маладая, забіралі эту водку і ўязджалі. Абычно ўжэ зналі, што ідуць ў сваты і яна пойдзе за яго.

Вянкі плялі перад самой свадзьбай дзеўкі. Маладой плятуць вянок. Абычно ў суботу не рабілі свадзьбу, потому што быў кароткі дзень. Свадзьба была ў васкрэсенне, панядзелак і аўторак. Гулялі першы дзень у маладой. Другі трохі тожэ, пад вечар ішлі да маладого і на трэці дзень там тожэ гулялі.

Вянок з барвінка вілі маладой і прычаплялі да галавы пад фатою.

*Зборная субота на стале,*
*Зялёная рута на стале,*
*Дзеўка ў дружыну збірае,*
*Дзеўка ў дружыну саджае.*
*Яна, маладзенькая, павазоў між іх*
*Скланіла галованьку ніжэй усіх.*

Маладу саджалі на дзяжу, тольку чэсну дзеўку, а як не то, не саджалі. Калі ехалі ўжо з ЗАГСа, то на ганак засцілалі кажух, каб былі багатыя. Жэншчыны пяклі каравай (хто ўмеў пячы добрэ булкі), на вазу ўсе ездзілі, то з іконаю маці родная абходзіла кругом ваза, у фату зярнят, жыта абычна сыпалі. Бывае, у каго дванаццаць вазоў, то абыйдзе ўсе і абсыпае тры разы. Абычно абсыпала родна маці ці хрышчона. Это, мусіць, каб былі багатыя, каб шчаслівыя. Каравай дзяліў сват. Абычно два каравая: у маладой і маладого.

Як з ЗАГСа ехалі, то людзі ставілі перапой. Бывало, столькі много. Колькі паставяць гарэлкі, столькі трэба, шоб малады пакрыў. Бывае, шо і вады могуць наліць. Гарэлку пакрывалі гарэлкаю, хто больш. Трэба было і грошы класці.

*Запісана ў в. Вайнілавічы*
*ад Волкавай Марыі Уладзіміраўны, 1931 г.н.*

Было два караваі. У маладога адзін, а ў маладой іншы. Буслікі былі на караваі, хто як мог украшаў. Шышачку (вярхушачку) выразалі маладым.

*Запісана ў в. Вайнілавічы*
*ад Запольскага Валянціна Валянцінавіча, 1957 г.н.*

## Песні

*Сядзела Ленка за сталом,*
*Раняла слёзкі ручаём.*
*На яе мамачка паглядала,*
*Як боб, слёзкі раняла.*
*– На каго ты, дзіцятка, жаль маеш?*
*– Жаль, мая мамачка, жаль на цябе,*
*Не так на цябе, як на род,*
*Што не далі пагуляці яшчэ год.*
*Як у лузе камена з кветкамі,*
*Не далі папагуляць з дзеўкамі,*
*Як у лузе камена з расою,*
*Не далі папагуляць з касою.*

***

*Рута мая да зяленая,*
*Тры радочкі саджана.*
*Я садзіла ды палівала,*
*Не разочку не сарвала.*
*Разок сашчыпнула,*
*Вянок завінула.*
*Успрыскначак палажыла*
*Ой, ляжы, ляжы, венчык, ажыдай*
*Меньшай сястры.*

***

*Прыйшоў на вяселле наш сваток,*
*Павязаўшы крыжам ручнічок,*
*Ды казалі, сват наш вельможны,*
*А ў свата доўгі буслаў нос,*
*А ў свата лыса галава*
*Ды казліна рыжа барада.*
*Скача сват у вяселлі, як белка,*
*Хоча маладзіцца, як дзеўка.*
*Плавае па хаце, як таран,*
*Лыпае вачыма, як баран.*
*Мы пасыплем сватку канапель,*
*Клюй, наш сватку, ты, як верабей.*
*Барадою, сватка, патрасі,*
*Маладзіца, чарку паднясі*
*Калі сват гарэлкі не дасі.*
*Караваю трасцу ты з'ясі.*

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Аксак Ганны Мікалаеўны, 1952 г.н.*

Ідуць к дзяўчыне сватацца. Сват ідзе з булкаю хлеба. Прыходзяць к ім. Бацька маладых пачынае гаварыць. Ну, а тады, калі пасватаюцца, частуюць іх. Намячаюць, калі свадзьбу рабіць будуць. Свадзьбу рабілі дома. І музыка была, танцавалі. Каравай пяклі, самі пяклі. Пякла сваха. Вызывалі самі гасцей, паміж імі і дзяліла каравай. Давалі каравай на салфетачку. Адзначалі вяселле два дні. Каравай заносілі дзеці. Музыка грае, а дзеці круціліся. Неслі каравай на кругу. Каравай украшалі ўсім. Два дні гулялі ў невесты. На другі дзень к вечару ехалі к маладому. А назаўтра быў яшчэ адзін каравай. Нельга жаніцца ў вялікі пост. Жадалі, каб хораша жылі, каб друг другу прашчалі, каб бацькоў не забывалі.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Кавальчук Аляксандры Паўлаўны, 1931 г.н.*

Маладыя прыбіраліся. Бацькі дзяржалі абраз перад імі, свечкі дзяржаць. Сустракаюць, каб бацькі былі ў пары. Бяз пары няможна сустракаць. Заходзяць у хату, і маладых абсыпалі канфетамі.

Прыязжалі, дагаварваліся. Мой сын, твая дачка. Ці сагласна, ці што. Што вы даеце сыну?

Ну, заручыны, запоіны, дзе былі, дзе не. Вып'юць. Ці сагласныя бацькі, дзеці.

Каравай деткі дзяржуць на кружку. Дзеці бяруць кружок з караваем на галаву, уносяць той каравай, музыка грае. Тады каравай падзеляць.

Першы дзень свадзьбы гуляецца ў маладой. Назаўтра едуць да маладога. У яго свой каравай.

Калі мадыя павянчаюцца, прыедуць сюды, матка яго знімае з галавы маладой вянок і адзявае платок.

*Запісана ў в. Альбянка*
*ад Гібчык Юзэфы Францаўны, 1931 г.н.*

Рабілі ўсе свадзьбы дома. Ішлі да маладой на вянок. Прыбіралі ёй вянок. Рабілі самі вяночак, з цвяточкаў. Шаферу рабілі. Там пасядзім вечар, песні вясельныя паспяваем. Тады нас угосцяць, пачастуюць. І назаўтра свадзьба.

Перад гэтым сваты. Ідуць да маладой, хто хоча. Ідзе хросны, хросная, мама сястры якая, цётка маладой, сватам, у асноўным каб былі ў гадах людзі, бралі жанатага чалавека. Дагаварваліся, калі тую свадзьбу рабіць. Гаварылі: "Паехалі на дагаворы".

Вялікая гарэлка – гэта значыць, сагласна, а еслі што-нібудзь не дагаварыліся, не сашліся ў чом там, то гэта называлі малая гарэлка.

Ну, да едзе маладзёж, малады бярэ сваю дружыну і едзе да маладой. Там ужэ выкупаюць маладую, трэбуюць ад свата і ад маладога падаркаў. Прывозілі канфеты, шампанскае, ну, і водку. А яны таргуюцца, каб давалі пабольш, пабольш: "Наша нявеста стоіць дарожэ". Забіраюць маладую, ну, і едуць на роспіс, ілі вянчацца.

Раней зразу гулялі ў маладой, і назаўтра яшчэ да абеда, а на вечар усе едуць к маладому збіраецца. Уся дружына маладой і госці. Сваха едзе, хросныя бацькі. І тады едуць да маладога, то і гуляюць той вечар. Жэнчына назаўтра дзяліла каравай. Было два караваі. У маладой свой, а ў маладога свой.

Вяночак знімала маці маладога і павязвала платочак. Значыць, яна ўжэ становіцца не дзяўчынай, а жанчынай. А жанчына далжна ў платочку хадзіць.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Маркевіч Аляксандры Уладзіміраўны, 1938 г.н.*

Дагаворы былі, прыязджаў там жаніх, дагаварваліся. А патом свадзьба, да вянчаліся ў цэркві. Сразу ж былі дагаворы заручаны рабілі.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Салавей Марыі Міхайлаўны, 1947 г.н.,*
*Чыжык Соф'і Міхайлаўны, 1939 г.н.*

На свадзьбе, калі кіне той букет каму-небудзь нявеста, хто словіць першы, таму і павезёт, та быстрэй замуж выйдзе.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Санько Раісы Іванаўны, 1936 г.н.*
*(раней пражывала ў г. Навагрудак).*

Сначала едуць да нявесты на дагаворы з ёй. Дагаворацца, калі ўжо свадзьба. Патом гатовяцца к свадзьбе. І ўжэ нявеста прыглашае сваіх дзяўчат.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Салавей Ірыны Іосіфаўны, 1933 г.н.*

Хадзілі ў сваты, трэбавалі прыданное ці дзенькі ці яшчэ што-небудзь. Хадзілі ўдваіх са сватам. Няслі з сабой паўлітры, хлеба булачку маленьку. Еслі сагласен, то водку расходуем, еслі не даюць – водку аддаюць. Яны не зналі, можа, што я прыду. Сустракалі вечарам, прыходзілі і аб'яўлялі, што прышлі дочку сватаць, ну, і выстаўлялі паўлітры на стол і хлеб.

Каравай быў круглы. Пяклі старшыя жэншчыны.

Нявесце вэлен адзявалі, плацце дліннае. Калі былі багатыя, то гулялі дзень у бацькоў у маладой, а на другі дзень яшчэ пераходзяць к маладому.

Да свадзьбы збіраліся дзеўкі аддзельна і хлопцы. Хлопцы на гармошке гралі, на скрыпцы, танцавалі розныя танцы: хто польку, хто што.

Кавалкі каравая чалавек нёс дадому, сам з'ядаў, дзецям аддаваў яшчэ.

*Запісана ў в. Малева*
*Гацілы Міхаіла Дзмітрыевіча, 1920 г.н.*

Вначале, когда дзевушка выхадзіла замуж, сабіралісь перад свадзьбай на так называемы вянок. Плялі мы ей вянок, ну, а назаўтра ўжо ў неё свадзьба. Этат вянок нявесце сабіралі на галаве. Была длінная такая фата. Этат вянок падшывалі к вэлену. Сватаўство как вездзе абычна. Вначале свадзьба ў нявесты, патом у жаніха. Два дня гулялі.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Шуковіч Галіны Міхайлаўны, 1946 г.н.*

Вяночак такой быў, маленькая фата была. Нядзелю гулялі. Раньшэ ж не распісываліся, а хадзілі ўжо ў цэркаўку, вянчаліся, а патом у сельсавеці распісваліся. Нявесту падгатаўлівалі 2 дня, яна ўжо феранкі вешала на вокны, свякруха застаўляла яе, каб краваці засцілала, сціраць. Правярала яе. Сваты прыязджалі, дзелалі заручаны, назначалі дзень свадзьбы. Ну, еслі нявеста не хацела ісці замуж, то гаварыла, што не хоча ці мяла пол.

Свадьба сразу была ў маладой, а ўжо патом у маладога.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Васільевай Валянціны Уладзіміраўны, 1952 г.н.*
*(раней пражывала ў г. Мінск).*

Спачатку маладыя ідуць у цэркаву. Малады са сваёй мамай, раднёй ідуць да маладой – гэта догавары. Маладая іх абвязвала. Маму – шолкам, другіх – сітцам. Маладую нараджалі ў саседзей, не ў сваёй хаце. Патом малады яе выкупляе. Малады выкуплівае, дзяўчаты ўжо не аддаюць. Малады выкуплівае, дае канфеты, шакаладкі, деньгі, што-небудзь.

У маладой быў вянок, называлася ісці на "вянкі". Перад вяселлем сабіраліся дзяўчаты, маладая прыглашала ўжо іх на "вянкі". Дзяўчына далжна была насыпаць у бутылку жыта і абвязаць лентачкай – гэта значыць, што яна сагласна. Адпраўлялі маладую і, калі былі пахараны, трэба было каб яны назад гэтай дарогай не варочаліся.

Каравай гатовіла маладая. Каравай круглы. Дзяльба каравая адбывалася на другі дзень.

Першы дзень гулялі ў маладой, а назаўтра дзеляць каравай. Падзялілі каравай, і едуць к маладому. Другі вечар гуляюць у маладога. Тры дні гулялі. На трэці дзень сабіраліся госці к маладому. Маладым выразалася сярэдзіна каравая. На вянчанні нада каб денюжка была. Абсыпалі зернем маладых.

*Запісана ў в. Грыцкавічы*
*ад Заяц Станіславы Іванаўны, 1944 г.н.*

Раньше это всё было более ярко, более торжественно. Ехали сваты, имелось в виду родители, вместе с женихом к невесте. Ехали с подарками (подарки чисто символические), ехали к хозяевам дома. Там готовилось пиршество, приглашались крёстные. Это был очень важный момент. Есть очень хороший момент, когда отправляли жениха. Мальчишники и девичники они были и раньше. Но, как правило, чаще всего девчата шли украшать помещение. Чаще всего это было в доме, в палатках. Строили какие-либо сооружения, покрывали тканью. В деревнях пиршество проходило на улице, сбивались столы.

Жениха отправляли. Напутствие обязательно должен был сказать старейший. Не то, чтобы старенький дядюшка, а самый мудрый, самый умный. Он отправлял жениха с каким-то напутствием. Потом бабушка какая-либо зачитывала молитву и родители крестили иконами картеж (лошадей, карета и т.д.).

А уже когда молодые приезжали к невесте, там уже свои нюансы. Девушки по максимуму начинали просить людей, которые пришли (выкуп).

Когда уже прошли через преграду жених со своей командой, они уже идут к невесте.

Невесту либо ставили на стул, либо так, чтобы она на возвышении была. Жених должен был её снять. И ещё должен был поцеловать её. Только так, чтобы она не наклонялась.

Все гости собирались уже в этой комнате, в которой стоял стол, и надо было обойти их три раза по часовой стрелке. Это якобы свидетельствовало о том, что дорога к ЗАГСу и по жизни была очень ровной, без ухабов и всяких препятствий.

Потом распределяются по машинам: в первой едет жених, во второй – невеста. Это так всегда было по Несвижу, потому что жених везёт невесту. Вообще, судя по этим традициям, женщина вообще не оказывает влияние ни на что: сначала родители ей всё указывают, потом жених. Невеста обязательно должна была жить в доме жениха. Обносили машины зерном, рожью. Иногда льют водку. Иногда поливают полностью все машины рюмочкой либо просто колёса. Обходят родители либо крёстные с иконой.

Провожают невесту с иконой женской, а жениха с иконой мужской.

Когда молодожёны приезжают в зал, встречают их родители жениха. Если же родители не были счастливы в браке, либо разведены – они встречать не имеют права. В таком случае встречают крёстные. В крайнем случае, встречают родители невесты.

Хлеб должен быть максимально прост и наличие соли не в дополнительной солонке, а должна быть прямо в хлебе.

Родители встречают с хлебом-солью, пожеланиями, посыпают пшеницей и зерном. Стоят вчетвером. Мама жениха держит хлеб-соль, папа жениха держит водку, иногда рядом с хлебом-солью стоит мёд. Хлеб – символ богатства, урожайности, плодородия. Соль – пуд соли съели, когда посолили, горечи попробовали, а мёдом подсластить.

Свекровь ложечкой даёт мёд и дразнится немножко, то есть она сразу пытается дать своему сыну, подносит ко рту, он только рот открывает, и она сразу убирает. Это говорит: "Я готова тебя принимать, ты становишься такой же, как мой сын, даже ближе" (потому что теперь ты за моим сыном ухаживаешь).

Водку пить нельзя, водку выливают, потому что первая брачная ночь она очень значимая: она продолжение рода, чтобы никаких проблем не было.

Они пригубили рюмки, вылили через плечо и желательно, чтобы попали на гостей. На кого попали, тот и счастливым будет, либо быстрей женится, либо будет прибыль. Люди старались подбежать под эти капельки. И разбивали бокалы. Если бокал не разобьётся, то значит разведутся.

Если встречается пара (пересекается, то есть одна выходит, а вторая заходит), то нужно разорвать носовой платок.

Если на пути встречались похороны – это вообще считалось к счастью. А вообще нужно возвращаться сложным путём, как можно виляя. Если вы ехали в ЗАГС самой быстрой дорогой, то обратно надо как можно больше поворотов, объезжаний. Считалось, что это запутает злую силу, чтобы она не догнала.

Мамы должны быть сугубо в платьях. Ни в коем случае никаких костюмов или брюк. Каравай либо кусали, либо ломали. Как любят друг друга, так и солят, а потом кормят друг друга. Это значит, пуд соли вместе съели. Любое перекрещивание (рук и т.д.) значило связь с Христом. Поднимался рушник вместе с караваем, и молодые, и гости проходили под рушником. Свекровь держала на одной руке хлеб-соль, поднимала вверх, раздвигала одной рукой рушник, а второй раздвигал отец жениха. Пройдя за стол, начиналось празднование. Женщина (либо мужчина), которые входили в церковь, читают молитву, богославляют. И тут начинается празднование, поздравление. Сват говорит тост. Сват отвечал за то, чтобы у всех было налито (сват и сваха). Второй тост был родительский.

Всегда раньше жили молодые у родителей жениха. Они наставляли невесту, поскольку мама может где-то пожалеть и приласкать дочку, за неё что-то сделать, а здесь – нет. Она должна была становиться хозяйкой полноценной и свекровь её поучала, пока мужчины работали на полях.

Снятие фаты. Очень правильно, если невеста будет плакать до свадьбы и во время свадьбы. Если невеста плачет, значит, она в жизни будет счастлива. Если невеста плачет в начале свадьбы, значит, жизнь будет начинаться довольно сложно, а потом она будет счастлива.





Невесту садили в кругу на стул, к этому кругу подходила свекровь, снимала фату и повязывала платок в силу того, что она уже не невеста, а она уже жена. Это посвящение невесты в жёны. Иногда свекровь вешала фартук на невесту. Иногда это было 7 фартуков.

Передача семейного очага. Мама зажигала и передавала свечу. Это ещё делали до праздника. Приходят молодожёны и зажигают свечу, чтобы она горела в течение вечера. И от этой свечи мама зажигает свечки, которыми передают семейный очаг.

Каравай должен был делиться на следующий день. Либо это двух дневная свадьба, если один день гуляют, то в 12.00 должны были выносить каравай.

Караваю особый почёт. Каравай должны печь у невесты дома, сама невеста должна печь. Каравай выносили незамужние и неженатые. Впереди танцевали дети. Либо выносят только сваты (так было в 10 км от Несвижа).

Поднимать каравай нужно максимально высоко, чтобы все видели, какой он красивый. Каравай выносили с фигурками. Фигурки делались из муки, воды и соли, а украшались ветками пихты. Фигурки: медведи, курочки, цыплята. Этим пытались передать богатство.

Верхушка давалась молодожёнам, следующий этап – каравай делился между родителями. Значимость каравая – это как благодарность, что гости пришли, подарили подарки. Раньше просо несли, продукты (вместо подарков). В Копыле каравай квадратный и молодожёнам срезаются уголочки, а не верхушка.

Нельзя чтобы столы и стулья были разные на свадьбе. Столы должны были быть общие на всю свадьбу. Если стулья, то их связывают лентами. Один стол должен быть у молодожёнов (отдельный), ни в коем случае не стык столов. Платье не должно быть раздельным.

Букет не передавался, бросать нужно дубликат букета. Букет нельзя давать в руки. Жених несёт невесте букет, и только он должен его держать. И, отдавая невесте, невеста ни в коем случае не должна его передавать.

То же самое происходило с фатой. Невеста раньше давала фату подруге, которая ещё не замужем, и они танцевали под музыку. Свекровь снимала фату и ложила невесте на колени, и потом её забирала только мама невесты, либо свекровь держала её в руках и вешала в красный угол под иконой.

Раньше были трёхдневные свадьбы. Сначала свадьба у невесты, потом у жениха. На свадьбе у невесты ехали только друзья жениха. Только друзья, ни мамы, ни папы.

У жениха на тот момент были свадьбы в палатках. Украшали коврами, ветками берёзы, рисовали плакаты. Всё готовили дома.

Музыканты были главные люди на свадьбе. Их в первую очередь за стол садили, им самое вкусное подавали. Встречали и провожали молодожёнов обязательно с баяном.

Родители встречают дома жениха и едут домой к невесте. Это объясняется тем, что родителям всегда рады.

Если родители умерли до свадьбы, то молодожёны обязательно едут на кладбище. Там нужно постоять некоторое время и иногда даже выпить.

На мостах обязательно переносили невесту на руках. Стараются найти семь мостов, если не находят, то семь раз через один мост переносят.

Кольца не должны не иметь никакой гравировки, так как это некая преграда в жизни.

Никогда не должна невеста выходить замуж в босоножках, только в туфлях.

Ели у жениха нет близких родственников (отца и матери), всю процедуру снятия фаты проводит либо старшая сестра или крёстная, но мама невесты ни в коем случае не должна, это делать.

Праздновали свадьбу осенью (сентябрь-октябрь), так как огороды, питание, было чем кормить. Летом, как правило, зарождались отношения.

На свадьбе если ты сохранил шишку (со свадьбы), и принёс на золотую свадьбу, то молодожёны должны отплатить деньгами.

Жениху нужно ублажить тёщу деньгами, обложить ей башмаки деньгами, либо помыть тёще ноги в тазике.

Катание молодых на стульях. Их вдвоём садили на скамейку, и самые сильные мужики поднимали их вверх и именно вместе. Это на удачу. Лентами обвязывали бокалы. Когда выходят из кареты, под ноги стелят кожух перевёрнутый и потом под ноги стелется этот кожух, что за столом, либо они на нём сидят.

Свекровь обязательно должна подарить золотой подарок в конце праздника, когда снимают фату.

Невеста всем должна подарить подарки, всей семье жениха: тётям, дядям родным, крёстным и т.д. Смысл этого: невеста должна задобрить семью жениха, чтобы её приняли.

Дом строили, когда уже видели, что невеста полноценная хозяйка. Дом строили недалеко от родителей.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Купцовай Наталлі Віктараўны, 1978 г.н.*

Прыходзіў жаніх з сватам. Прыносілі хлеба булачку і паўлітра. Калі была сагласна нявеста, то гаварыла: "Да". Я любіцца не хацела доўга. Жаніліся ў феўрале. Былі вянкі. Прыходзілі дзяўчаты, плялі вянкі, адзявалі. Усякія куплялі кветкі, беленькія былі. Самі некаторыя хадзілі рвалі, тожа рабілі. Хлопцы прыходзяць. На вяселле дзядзька кажух аддаваў. Яшчэ вянчацца ездзілі, свадзьба без вянчання не бывала. Саседзі перапынялі, неслі стол на двор каля хаты.

*Запісана ў в .Малева*
*ад Цыулі Ганны Міхайлаўны, 1932 г.н.*

Сваты, па-мойму, некалі хадзілі ў суботу, у пятніцу. Свадзьбы рабіліся ў нядзелю, толькі ў нядзелю начыналіся свадзьбы. У нядзелю начыналіся і ў панядзелак заканчваліся.

Сваты ж прыходзілі раней. Шоў малады. Калі дзеўка богатая, харошая, рабочая, вот такую дзеўку сваталі. У сваты ішоў бацька хрэсны, можа, і брат, і кум ілі дзядзька родны, ці сусед, можа, харошы. Бралі з сабой бутылку, хлеб з сольлю. І тады ставілі тую бутылку на той стол і хлеб з сольлю. Калі прыходзілі і гаварылі:

– Я сват, ад Бога прысланы, каб быў стол засланы.

І ўжо садзяцца за стол і вып'юць. Не пілі раней з гэтых бакалаў, а сто грамаў пілі. Калі маладая сагласна, то абвязвалі бутылку. А еслі не сагласна, то не абвязвалі бутылкі.

Каравай быў з боку нявесты, і з боку жаніха. Напярэдадні гэтага пяклі каравай. Замешвалі цесто, туды ўсе прыправы, усе ваніліны, каб быў харошы каравай. І гэты каравай убіралі хораша: канфеткамі, шпаракусам. Шпаракус – гэта вазон такі. І потым каравай неслі на свадзьбу, а дзеткі малыя яго потым уносілі. Каравай спачатку дзялілі ў нявесты, а потым ехалі да маладога і ў яго дзялілі. Два караваі было. Пелі, калі каравай уносілі:

*Віўся, віўся каравай*
*Пад зялёнам дубам…*

Калі каравай дзялілі, так маці на свадзьбе глядзела, каб хто што не палажыў на каравай, каб ніхто нічога не падклаў. Марш гралі. Марш "Туш" называўся.

Потым сабіралі нявесту да маладога адпраўляць. Сабіралі пасцель, прыданае складвалі. Дружка і шафер неслі гэту пасцель, на коней клалі, дзе нявеста будзе ехаць. Дружына ехала за маладой. Ехалі на конях з шамкамі. З шамкамі, каб чулі, што свадзьба едзе. У пары коні запражаны былі. Каня аднаго не было, гэта каб маладыя ў пары жылі.

На дзяжу маладую садзілі. Пакуль яна на дзяжэ сяздела, яе застрыгалі, малітвы над ёй розныя гаварылі. Як бярэменная, так не можна было, а як так, то садзілі.

Сустракалі маладую з жытам і з хлебам з соллю. Вянчаліся у царкве. Трэба, каб маладым ніхто дарогу з боку на бок не пераходзіў, пакуль яны не прыйдуць да царквы і да вянца.

Як свадзьба канчаецца, так пераапраналіся госці. Хто мядзведзь, хто певень, хто як.

У нявесты быў вяночак на галаве. Шпаракусам яго ўбіралі. Фата была ў нявесты кароценькай.Туфлі трэба закрытыя, каб шчасце іхняе не ўходзіла.

*Запісана ў в. Малева*
*ад Петраш Марыі Іосіфаўны, 1948 г.н.*

## Вясельныя тосты

Жадаю, каб у вас было столькі сыноў, колькі куткоў,
І столькі дачушак, колькі падушак.

***

*Жадаю столькі сынкоў,*
*Колькі ў лесе пянькоў.*

***

*Жадаю пары маладой*
*Дажыць да свадзьбы залатой,*
*Жыць і хораша дружыць,*
*Па другіх не хадзіць.*

***

*Каб ваш ложак рыпаў-рыпаў,*
*І да году сынок выпаў.*





***

*З вяселейкам вас паздраўляю,*
*Шчаслівай жызні вам жадаю,*
*Каб адзін аднаго шанавалі*
*І бацькоў старых не забывалі.*

***

Дару вам кашалёк з грашыма, каб ён заўсёды быў запоўнены імі, а таксама вось гэтыя кветачкі, каб у вас было столькі здаровых, разумных, паслухмяных дзетачак, усяго немагчыма пералічыць таго, што жадаю я для вас: усіх зямных даброт і бож'ега вам благаславенья.

*Запісана ў в. Малева*
*ад Гацілы Алены Веньямінаўны, 1935 г.н.*

### Адзенне

Убранне маладая купляла сама ці бацькі. Убіраюць маладую шаферкі, самая старшая. Прыбіралі нявесту ў чужой хаце і каб праз дарогу была родная хата. З чужой хаты вядуць у сваю. Маладая на чарку гарэлкі кладзе платочак, а малады на гэты платок павінен палажыць адрэз тканіны, астальныя госці на свае насоўкі лажылі грошы (насоўкі ўсе былі розныя, закупліваліся загадзя). Малады быў апрануты ў асноўным у белую рубашку і касцюм (чорны ці карычневы). Сваццяя была ў спадніцы з кафтанам. Букецікі купляла сама маладая. Самая старшая шаферка прышпільвала ўсім: і дружыне маладога, і маладой. Свату і маладому букецік прышпільвалі з правага боку. Дзяўчатам букецікі не прышпільваліся. У вывернуты кажух была апранута маці маладога, калі сустракала нявесту ў сваім доме пасля вяселля. Сустракалі з двумя чаркамі і сахарам на талерцы. Маці запрашала выпіць і сахар з'есці, каб жыццё было салодкім, як пераступалі парог, жаніх цалуецца з бацькам, потым нявестка.

### Вяселле

На танцах знаёміліся, якія ладзіліся на святы. Жаніліся большую часць па выбару бацькоў. Выгадным жаніхом і нявестай лічылася багатая нявеста і багаты жаніх. Пасаг давалі толькі дзяўчыне (гектар поля, на свадзьбу грошай – сто злотых). У прымы хлопец ішоў у тым выпадку, калі ён быў з вялікай сям'і. Тады яму давалі адзін гектар зямлі, злотыя і адпраўлялі к нявесце. Больш ладзілі вяселле пад Сёмуху, таму што было цёпла, а зімой холадна і хаты былі без кухань. Часцей за ўсё ўжывалі назву "вяселле". Маладую называлі "нявеста" або "маладая", а жаніха – "малады" або "жаніх". З боку маладой былі шаферкі, а з боку маладога – падсвацянкі (малады ў падсвацянкі браў два шаферы і дзяўчат). У маладой – тры шаферкі і тры шаферы. Бабы стаялі ў парозе і спявалі песні. Малады прыязджаў з музыкай (гармонік ці скрыпка).

### Сватанне

У сваты ішоў адзін сват і мамалады. Свата бралі з родных. Сват вёў перагаворы. Хадзілі ў сваты ў чацвер і ў суботу. Ішлі звечара. Бралі з сабою паўлітра і кусок хлеба. Сват гаварыў, што прыйшлі забраць вашу цялушку, садзіліся за стол, дагаворваліся пра пасаг, і толькі тады падыходзіла нявеста (калі не згаворацца на пасадзе, то расходзяцца, калі дагаворацца, – жаніх бярэ нявесту к сталу, садзяцца жаніх і нявеста тады вакол бацькі). Калі багатая нявеста, то могуць сваты і тры разы прыехаць, але розныя. Бацька пытаецца ў нявесты, ці згодна яна ісці за гэтага хлопца. Як падабаецца хлопец, засмяецца і кажа, што згодна. Дзяўчына абвязвала свата ручніком. З боку дзяўчыны сватанне не бывае. Можа быць у адзін дзень і трое сватоў. У час сватання не спявалі, толькі на вяселлі спявалі.

### Заручыны

Заручыны і запоіны – адно і тое ж. Адбываліся больш перад вяселлем. Дзяўчына давала свякрові адрэз на кофту, свёкру – рубашку. Музыканта не было. Ехалі на заручыны хрышчоныя, заўсёды ён і яна. Пякуць булкі. Чатыры-пяць чалавек ад жаніха і родныя нявесты. Маладыя павінны былі спавядацца. У споведзь едуць разам. Перш яна прычышчаецца, а потым жаніх.

У канцы вяселля ставілі вараную капусту і кашу, на якую малады кладзе грошы, і кожны гэту кашу павінен узяць тры разы. Гаварылі: "Вот ставім кашу, канец нашай свадзьбе".

**Зборная субота**

Са старшай шаферкай маладая запрашала дзяўчат на "вянок". Бабы пачыналі спяваць вясельныя песні: "Зборная субота настае, зялёная рутанька на стале". Дзяўчаты садзіліся за стол і абмотвалі невялічкае кальцо рутай (трава такая). Гэтае абмотанае кальцо ўстаўлялася ў вален ззадзі, а потым пасля вянчання гэта кальцо маладая зашывала ў падушку.

**Каравай**

Каравай пяклі ў хаце маладой. Свацця мясіла, старшая шаферка ёй дапамагала. Каравай пеклі круглы. Пяклі не адзін каравай, а два-тры, але ўжо меньшага памеру. У час вяселля каравай знаходзіўся ў каморцы на спецыяльным кружочку, засланым абрусам. Каравай дзяліў сват.

**Выпраўленне маладога па маладую**

Шаферы вядуць маладую на пасад. Маці і бацька з іконай. Як маладыя станавіліся на калені "застрыгалі свечкі" і благаслаўлялі. У трох месцах спальвалі крыху валасоў у маладой і маладога. Тройчы абыходзілі вакол стала і ехалі да вянца.

**Паездка ў царкву**

Малады едзе першы з шаферамі, потым маладая. Сват бярэ ў дарогу паўлітра, булку. Маладая, калі выязджала са сваіх варотаў, павінна была прыўстаць. У царкве маладая станавілася ў парозе. Бацюшка моліцца, пасля фартухом накрывае рукі маладым і вядзе ставіць на кавёр. Сваццi ідуць з іконамі. Пасля вянца маладыя едуць разам. Маладая садзіцца к маладому на калені. Па дарозе ў царкву нічога не спявалі. Госці, якія засталіся ў хаце, п'юць, гуляюць. З царквы маладыя едуць к маладой.

**Сустрэча пасля вянка**

Не сустракалі ніяк. Як трэба было ад'язджаць, хавалі нявесту. Маладому трэба было выкупіць яе. Маці маладога садзілася на падушкі, а маладыя са сватам выкуплівалі, давалі грошы. Малады дзякуе мацеры, цалуе руку. Маці жадае дабра маладому.

**Развітанне**

Да маладога едуць маладыя, хрышчоная радня:

*Едзьце прыданкі,*
*Едзьце дадому,*
*Бо паелі коні нашу салому.*

**У маладога**

Як прыязджае маладая да маладога, у варотах сыпле канфеты (усё ліхое скідае, ідзе у чужую хату). Калі маладая ўваходзіць у хату, то кланяецца і кідае жыта на сталы. Сват садзіцца, маладая і дружына. Старыя бабы сядзелі на печы спявалі песні, адна была з прасніцай і прала.

*Лелю, лелю*
*Прадзе кот кудзелю,*
*Саўе ды*
*Вытча Лена (маладая),*
*Ваню (малады) на кашулі.*

Маладая павінна вылезці з-за стала і падарыць бабцы на прасніцы адрэз тканіны альбо платок.

**Як дараць каравай у маладога**

Свякроў бярэ каравай са словамі: "Ты замена мая. На табе ключы ад кладавой, адамкні кладоўку". Маладая ідзе і адмыкае кладоўку. Гэта азначае, што яна будзе гаспадыняй у новай сям'і. Пасля каравая свякроў несла хустку і гаварыла, што я табе аддаю сваё і цябе ў замену бяру. Цалаваліся. Вален у маладой знімала старшая і кідала ў парог, дзе стаялі дзяўчаты.

*Запісана ў в. Краснагорка*
*ад Макаўчык Феафаніі Васільеўны, 1921 г.н.*
*Матэрыялы ўзяты з архіва Нясвіжскага раённага цэнтра народнай творчасці.*



Нясвіжскага краю напеў векавы

**Каравай**

Ну, каравай пяклі. У маладой пяклі. Тады маладым сярэдзінку каравая выразалі, а той астатні каравай хавалі. А нашто яго хавалі, хто яго ведае.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Чычко Соф'і Рыгораўны, 1934 г.н.*

Малады сабе свадзьбу робіць дома, маладая – сабе. Малады прыязджае к маладой абычна пад вечар. Тады сядуць, вып'юць, а тады едуць у царкву вянчацца. Ну, тады прыязджаюць, гуляюць вяселле. Назаўтра к вечару едуць к маладому. Прымаюць бацькі маладога з хлебам, соллю.

**Сватанне**

У сваты браў дзядзьку з хлопцам. Бралі з сабою хлеб і бутылку. Прыйшлі і гавораць: "Мы ў вас прыастановімся нямнога, пераначуем". Тады сват задае вапрос маладой: "Ці сагласна ты пайсці за маладога ці не?" А бывае, што і малады адкажэцца.

**Вянок**

Вось як, напрыклад, мая свадзьба заўтра, то сёння вечарам сабіраліся ўсе дзеўкі і плятуць вянок.

**Каравай**

Каравай пяклі свае жанчыны. Магла саседка пякці. Цвяточкі давалі маладым. А патом усім раздзяляюць каравай.

**Пасад**

Маладую садзілі на дзяжу, калі яна была варта. Пераначуюць, прыходзяць і правяраюць: калі была гожая – садзілі. Дзяжу пакрывлі кажухом.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Гадун Ядвігі Уладзіміраўны, 1929 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Лесуны Нясвіжскага р-на).*

**Сватанне – запоіны**

Якія сваты былі? Запоіны, як мы кажам. Прыходзіць маці яго, друг першы і брат, і ўсё. І ўжо дагаварыліся, калі вяселле. Вянчацца яшчэ можна было. А калі дзяўчына адмаўлялася, то сват забіраў свой хлеб і заварочваўся назад.

**Каравай**

А як жа ж, пяклі на вяселлі каравай абязацельна. Харошы каравай. Ну, і кожнага вызываюць ужо і гаварыць: "Абсылаю караваем, Божым дарам, божаю расою, сваёй красою". І кожны прыходзіць, каравай забірае, грошы кладзе і ўходзіць. А маладым адразу давалі каравай, самую яго сярэдзіну.

**Сватанне**

Да мяне сваты прыходзілі. Сват прыходзіў і малады, маці яго. Сватам быў друг мужыка. Прывозілі булку хлеба. Калі не панравіўся жаніх, адносілі булку, а калі панравіўся – забіралі.

**Зборная субота**

Як вянок кладуць (заўтра свадзьба), сабіраюцца маладыя дзевачкі і паюць.

**Каравай**

Некалі ў печы пеклі каравай. Маладым сярэдзіну выразалі. Упрыгожвалі яго цвяточкамі, ветачкамі. У мяне каравай пекла мая сястра харошая.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Жук Зінаіды Канстанцінаўны, 1932 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Лесуны Нясвіжскага р-на).*

**Сватанне**

Бралі жаніха, радзіцелей, потом свата бралі і ўжэ ехалі. Нявеста не выхадзіла. Дагаварваліся, сколька пасаг будзет. Сватам должэн быць чалавек пачотный. Вазкі, калі ехалі, засцілалі красівым даматканым. Абязацельна на лошадзі калакольчыкі вешалі. Так жэ і на свадзьбе калакольчыкі вешалі. Ніхто не пытаўся, згодна нявеста ці не. Мая сусед-

ка дык прыбегла і просіць: “Татачка, забяры мяне”. А ён ёй говорыць: “Прывыкнеш, я ж за цябе выкуп аддаў”.

**Пасад**

На свадзьбе такой абычай был: дзежкі былі, а ў дзежках хлеб пяклі, вынімалі гэту дзежку, і дзевушка, чэсная, не ізменяла, то ана далжна была перад цем, як ехаць пад вянец, сесці на дзежку. Не дай Бог, нечыстая была, патом што-нібудзь случалась у сям’е – всё будзет на неё.

**Каравай**

Каравай абязацельна пяклі. Прыглашалі жанчын, і муку тры разы сеялі, цвяты выдзелвалі. Дзеці неслі каравай. І песні спецыяльна спявалі пад каравай. Патом сват дзяліў каравай.

**Паслявясельны перыяд**

Бралі прыданае і глядзелі, скалька падушак, і яшчэ паглядзяць якія, сколька ручнікоў дадуць, сколька плацьеў.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Халецкай Яўгеніі Іванаўны, 1932 г.н.*

У сваты прыходзілі, як гавораць “на дагавор”. Прыязджалі бацькі. Яны нам дарылі падаркі, а мы – ім. Калі ехалі, бралі бутылку, булку хлеба. Калі да маладой прыязджалі, трэба было бацькам яе падаркі даць. За свата мог быць друг маладога, брат дваюрадны.

*Запісана ў в. Малева*
*ад Верэмеевіч Яніны Дзмітрыеўны, 1938 г.н.*

Пасля вяселля маладой забаранялі ў бацькоўскую хату ісці, трэба было праз нядзелю. Бацькі ўжэ прыедуць з бацькоўскім хлебам да маладога.

Калі знімаюць вянок, то свякруха павязвае платочак.

*Запісана ў в. Малева*
*ад Каладзінскай Валянціны Фёдараўны, 1931 г.н.*

**Сватанне**

Прыходзяць у сваты. Сватам бяруць суседа ці другога мужчыну і бяруць бутылку. І жаніх ідзе. Прыняць далжны заўсёды гасцей. А патом можна толька адказваць, но бутылку всегда далжна нявеста даць. Свату падаркі давалі.

**Вянок**

Дзяўчаты збіраліся, вяночкі плялі.

**Каравай**

Пяклі каравай пажылыя людзі, яны ўжэ зналі, як пякці. І на свадзьбу іх прыглашалі.

Чэраз недзелю, як нявеста выйдзе замуж, то бацькі едуць у адведкі, як яна там жыве.

*Запісана ў в. Малева*
*ад Алісіевіч Ніны Міхайлаўны, 1928 г.н.*

**Сватанне**

Перад вяселлем прыходзілі сваты. Малады ўжо браў свата якога. Сватам мог быць і дзяцька, і пастароннія былі. Раней вяселле ў дамах рабілі.

**Зборная субота**

Былі таксама “дзявочнікі” перад вяселлем. Сёння свадзьба, а на следуюшчы дзень перад свадзьбаю хадзілі на “вянок”. Рабілі маладой вянок.

**Каравай**

Пеклі каравай. Пеклі яго самі. Каравай дзялілі паміж усімі. Сярэдзіна – для маладых, а астальное дзялілі. Выпякаліся красівыя караваі.

*Запісана ў в. Малева*
*ад Ігнатчык Валянціны Усеваладаўны, 1941 г.н.*

**Вяселле па-смаліцкі**

Маладой з барвінка звівалі калечка, маладой распускалі косу і ўпляталі яго ў валасы, спявалі песню: “Прыстройся, дзяўчына прыгожа”, а здымалі перад шлюбнай ноччу і клалі на падушку, на якой маладыя будуць спаць (каб шчасце і доля была добрая).



Нясвіжскага краю напеў векавы

**Выкуп**

Маладыя сядаў за стол, а маладая была ў каморцы. Сват ішоў выкупліваць маладую тры разы. Сват падыходзіў да каморкі і клаў на талерачку грошы. А талерачка накрыта платочкам, там не відаць, колькі ляжыць грошай, гэтыя грошы аддаюць дружкам. На трэцці раз малады мог і забраць талерачку. А тады бярэ маладога брат, а маладую дружка і вядуць, садзяць перад сталом. Тры разы абыходзяць стол, а тады вылазяць маладыя. Бацькі сядаюць на лаўку з іконай, маладым засцілаюць рушнік, і яны становяцца на калені. Сваха бярэ свечку і падстрыгае маладых.

*Просім Бога найвысшага,*
*Маткі роднай просім паблагаславіць*
*Маладых падстрыгчы.*

Падстрыглі, тады адпраўляюць маладых к машынам: маладога – старшы брат, маладую першая дружка. Маладая першая заходзіць у царву, тады малады. Дома сустракалі і благаслаўлялі бацькі: гарэлкай ці наліўкай, віном, хлебам-соллю. Чарак тады не білі.

**Каравай**

Спецыяльных людзей, якія выпякалі каравай, не было. Пяклі булку, выкладалі зверху з цеста касу. Людзей на вяселлі было ў залежнасці ад роду, чужых не звалі. Фату бралі з суседняга сяла. Вэлян шылі доўгі, зверху рабілі фальбону, якую дзялілі на пяць часцей, каб стаяла як карона. Кветкі рабілі з мірту ці сітцу, чаплялі іх на правую старану. Калі гулялі ў маладой і маладога, было два караваі, калі агульнае вяселле – адзін. Да караваю давалі сыр. Дзялілі каравай на другі дзень вяселля за другім заходам.

Музыка на вяселлі - скрыпка, дудка, гармонік, рэдка духавы аркестр. Расчытваліся грашыма. Дзялілі каравай, гралі марш. А цяпер я раскажу, з чаго наша маладая выпякала каравай:

*З сямі палёў пшанічка,*
*З сямі крыніц вадзічка,*
*Ад сямі кароў масла*
*Ды яец паўтараста.*
*Сама сеяла, сама выпякала,*
*Сама гасцей склікала каравай*
*паспытаць,*
*Шчасця-долі пагадаць.*
*Просім Бога найвысшага,*
*Бацькі, маці раднай,*
*Просім усіх благаславіць*
*Каравай падзяліць.*

Бацька і маці маладой дарылі пяць рублёў і капеек, цялушку і карову, палотна, рушнікі, настольнікі.

**Вяселле ў хаце маладога**

Як маладыя прыводзіў маладую дадому, спявалі песню:

*Выйдзі, выйдзі маці,*
*Gаглядзі свайго дзіцяці,*
*Што прывёў сын баярачку*
*Ды паставіў на ганачку,*
*Высокую ды й румяную,*
*Ды й хораша прыбраную.*
*Дай, Божа, маладым добрую долю.*

Маладая сама за сталом не спявала. Калі маладая заходзіла ў хату да жаніха, яна сыпала зернем і засцілала ўсе сталы настольнікамі, а іконы рушнікамі абвешвала. Госці стаялі, глядзелі, як маладая адкрывала куфар. Куфар прывозілі браты і бралі з маладога выкуп. Тады пачыналася вяселле.

Маладыя сядзяць на покуці. Як маладая сядзіць за сталом, пра яе склалі песню:

*Сядзіць наша й Ганька за сталом,*
*Цякуць у яе й слёзанькі ручайком.*
*На яе й мамка паглядае,*
*Як яна й слёзанькі раняе.*
*На каго ж табе, дачушачка, мая, жаль?*
*Жаль, мая й мамачка, жалі на цябе,*
*Што не дала пагуляці ў сябе.*
*Ні так на цябе, як на ўвесь род,*
*Што не далі пагуляці да й з касой.*
*У агародзе каліна да й з кветкамі,*
*Што не далі пагуляці з дзеўкамі.*

Затым бацькі вязлі з сабою каробку, накрытую настольнікам, якую ставілі на покуці.

У ёй былі стравы: кансервы, водка, сыр, каўбаса, булкі. Спачатку дзеляць каравай, тады бацькоўскі хлеб. Рэжуць усе прысмакі, што прывезлі бацькі, а сваха разносіць іх па сталах. У хаце маладой бацькоўскі хлеб маладога маладая абвязвала сваім ручніком.

А моладзь жартавала і магла падкласці ў бацькоўскую каробку якую-небудзь ляльку, а тады смяюцца ды выкупляюць тое, што было ў каробцы.

Як ехалі да вянца, дык маладыя нічога не елі. А за сталом выкрадалі нявесту, выкрадалі туфлю. Прасілі ў свахі пірага (дарэчы былі сват і сваха ад маладога і сваха ад маладой):

*Дай, сваха, пірага-пірага,*
*Возьмем мы яго да рата,*
*А сіву кабылу за грыву, за грыву.*
*Паставім як на рынку,*
*Паставім яе мы на рынку,*
*Прап'ем мы яе за гарэлку,*
*Паставім яе мы на лёдзе,*
*Прап'ем мы яе як на мёдзе.*
*Дай, Божа, маладым добрую долю,*
*Дай, сваха, пірага.*

А як дась сваха пірага, вылазілі з-за стала і дзякавалі ёй:

*Дзякую, сваха, за пірог, за пірог,*
*Што яго добра гатавала,*
*Што ў яго солі шкадавала,*
*На далоні мясіла, мясіла,*
*Пад цыцкаю сушыла.*
*Ён харошы і беленькі,*
*Толькі ганеба, што маленькі.*
*Дзякую, сваха, за пірог, за пірог,*
*Што ты яго добра гатавала,*
*Дай, сваха, пірага*
*Дай, Божа, маладым добрую долю.*

Сваты пелі песню свасе, а ніколі не спявалі свату.

*Прыйшоў на вяселле наш сваток,*
*Павязаўшы дротам ручнічок.*
*Ды казалі сват наш вельмі харош,*
*А ў свата доўгі буслаў нос,*
*Лыса галава*
*Ды казліна барада.*
*Скоча сват на вяселлі, як белка.*
*Ходзіць малады – то, як дзеўка.*
*Мы пасыплем свату канапель,*
*Клюй наш, сватка, як верабей.*

Дружкі ў маладога называліся падсвашкі, казачкі, у маладой – дружкі. Шлюбную пасцель не аглядалі. Як дарылі, маладая адорвала радню маладога.

Маці маладога знімала фату, каравай прыносілі дзеці (4 дзяцей), а як выносілі, стараліся ўкрасці кусочак пірага.

Гульні на вяселлі – выпрабаванні для маладой на другі дзень: маладая выцягвала з калодзежа ваду, давалі маладой паламаны венік, каб яна падмятала.

Матэрыялы ўзяты з архіва Нясвіжскага раённага цэнтра народнай творчасці.

Сваты ка мне не прыходзілі. За сваты абычна там, дзе да каго прыходзілі, былі бацька, маці, сват. Сватам быў такі мужчына, каб усё знаў, умеў вясці сватаўство, умеў гаварыць добра, такіх і бралі. Сваты бралі з сабой бутылку. Ну, і мы ўгашчэнне ставілі. Пасля вяселля маладая абычна па закону далжна быць у хаце маладога. Яна далжна быць нядзелю, а то і дзве ў хаце маладога.

*Запісана ў в. Нялепава*
*ад Болтуць Станіславы Адамаўны, 1947 г.н.*

## Сватанне

Прыходзілі сваты, гэта быў сват і жаніх, бывала, бацькі прыязджалі. Сваты абычна прыходзілі ў суботу неяк, прыносілі з сабой бутылку.

## Каравай

На вяселле пеклі каравай маладым. Калі каравай выносілі, дык закідвалі яго на стрэху, а потым дзяліў каравай звычайна сват, першым дзялілі каравай маладым.

Булачкі кралі, украдуць, дык шукаюць тую булачку, або маладую схаваюць, то маладую пака найдуць, булачкі кралі, каб шчаслівей быў чалавек. Звычайна вяселле было два дні. У першы дзень было вянчанне. Нявесту садзілі на дзяжу.

Калі маладыя ехалі вянчацца, то іх перапынялі на шляху. Каб не сурочылі шлях маладым, ячменем абносілі. Маладыя павінны ў царкву ехаць не разам, а тады, як павянчаюцца, садзяцца радам.

Калі нявеста ад'язджала да жаніха, свякруха выходзіла і адчыняла дзверы, трымала два стаканы на талерачке, улівала туда шампанскага і давала выпіць. Пасуду ў нас не білі, бо кажуць, што шчасце сваё паб'еш. У хату ішлі маладыя разам. Пасцель сцяліла маці нявесты сама. Правяралі на наступны дзень дзявоцтва маладой.

*Запісана ў в. Грыцкавічы*
*ад Кандрацюк Антаніны Сцяпанаўны, 1939 г.н.*

## Сватанне

У сваты абязацельна хадзілі. Хто на машыне, а хто і пяшком прыходзіў. Звычайна бацькі выбіралі нявест, жаніхоў. Багатых выбіралі. Калі жаніх бедны, дык багатую шукалі, а як нявеста бедная, дык багатага жаніха. У сваты сват прыходзіў і радзіцелі, жаніх не прыходзіў. Радзіцелі спачатку дагаворваліся. У апошні вечар перад свадзьбай збіраліся падружкі нявесты, дапамагалі ёй. У маладой самая лепшая сяброўка ці радня называлася шаферкай, і ў маладога гэтаксама: ці старэйшы дваюрадны брат, ці яшчэ хто.

## Каравай

Каравай пеклі. Канешне ж, у яе свой, у яго свой каравай. Сразу ў маладой дзялілі, а патом да жаніха ехалі. Былі такія жэншчынкі, што спецыяльна пеклі гэтыя караваі, дык у іх заказвалі. Раней на другі дзень толькі каравай дзялілі. Сват дзяліў.

Маладую спецыяльна хавалі. А малады тады ўжо выкуп за яе даваў. Як ўязджаюць на свадзьбу, маладых зернем абсыпаюць. Гэта каб багатыя былі.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Церахавец Уладзіславы Францаўны, 1938 г.н.*

## Сватанне

Прыходзілі сваты. Сватам можа быць друг, сваяк, а тады ўжо бацькоў клічуць.

## Вянок

Маладой перад вяселлем плялі вянок. Збірае маладая дзяўчат, і дзяўчата ідуць і плятуць вянкі. Вянок зробяць, кветачак напіхаюць. Як кончыцца вяселле, маладая знімала вянок, ды як вянчаюцца ўжэ з тым вянком, дык патом вянок клалі ў ікону, пад сцякло.

## Каравай

Пеклі каравай. Было два караваі, пяклі іх у розныя дні. Трэба каб маладая ехала ў хату маладога і ў хаце кругом сталы выстаўляюць і кожны стол маладая скацерцю засцілала. Вяселле праходзіла тры дні.

*Запісана ў в. Грыцкавічы*
*ад Рудой Таццяны Антонаўны, 1932 г.н.*

## Вяселле

Як мы былі, ужо ў нашым пакаленні, толькі к адной у сваты прыходзілі. Калі шлі ў сваты, бралі бутылку. Прыходзіў малады і дагаварваўся, сагласна лі нявеста ці не сагласна. У маёй бабушкі быў хлопчык, яна вельмі моцна яго любіла. Бабушка сама з купечэскай зямлі, а дзедушка быў багаты. У яго папы было аж тры маёнткі. І ён прыйшоў да маёй бабушкі пасватацца, а дзедушка, бабушкін папа, сказаў : "Марылька, пойдзеш за Петрыка замуж?" А яна вельмі моцна плакала, бо яна любіла Антона. Папа завёў яе ў камору, закруціў на руку валасы і гэтак біў, да тых пор пакуль яна не сагласілася выйсці за Петрыка. Вот так раней некалі аддавалі замуж. Не адну маю бабушку, а саседку нашу так замуж тожэ аддалі. Яна любіла аднаго, а яе аддалі за другога. У яго была там дзеўка, ён з ей пачці не жыў. Яна прыйшла папрасілася дадому, бацькі яе не пусцілі. Так яна за полгода так высыхла, што прыйшла дадому. Пражыла дзевяць месяцаў і памерла. Аддалі замуж яе насільна. Некалі так і аддавалі. Гэта цяпер, хачу і усё, а некалі зямля была, не дасць бацька зямлі, як жа ты будзеш жыць. Вот так аддавалі замуж.

Ужо после прыходзілі ў сваты і бутылку прыносілі. Я сагласна –бутылка выпіваецца, а еслі не сагласна, тады яе яшчэ ўгаварваюць. Назначаюць свадзьбу на які дзень. Дзявічнік рабілі. Некалі не было фаты, як цяпер. У нас быў такі матэрыял, як фата. І мы сабіраліся з дзяўчаткамі і шылі. Збіралася нас многа, ча-

лавек пад сорак. Дзяўчата збіраюцца паюць, і шыем мы "войлен" па-польскі, бярэм бусінкі, шпарагус і робім з яго розачкі красівыя. Дзяўчаткі пелі, хлопцаў не было, іх не пускалі ў хату. Не можна было, каб хлопцы былі ў хаце. После застолле было, угашчалі нас. І назаўтра ўжо дагаварваліся, хлопцы перапой сабіралі. Выносілі стол такі бальшы, на яго ставілі 5 бутылак самагонкі і клалі грошы. І трэба было каб малады ўсё пакрыў. Паставілі пяць бутылак, малады должэн пакрыць гэта ўсё. І колькі грошэй паложыш, должэн пакрыць ўсё. Так сустракалі яго. Я, калі маладога не сустрэлі , то гэта быў вялікі пазор, што яго ніхто не сустрэў. Ніхто не даў яму почасці. Ну, і калі сабралі перапой, маладога ўжо пускалі. Ён прыходзіць, маладую хаваюць. І стаялі дзяўчата, ждалі выкуп, трэба каб малады даў выкуп за нявесту. Што яму скажуць, то ён і павінен даць. Выкупілі маладую, малады сядзіць за сталом. Прыходзіць маладая і садзіцца напроціў, але яна вачэй не падымае, каб не ўгледзець маладога да тых пор, пакуль яны не абвянчаюцца. І начыналася співанне. Маладой даюць тарэлачку, а яна на гэту тарэлачку ложыць платочак. А малады кладзе туды ці кальцо, ці сярожкі, ці цэпачку. Калі паспіваліся, тады сват благасловіць. Потым едуць у цэркву вянчацца, маладая і малады едуць аддзельна. Калі ужо абвянчаліся, то едуць назад разам. Пачынаецца свадзьба, пір. Пасля першай ночы, калі ўжо маладыя паспалі, маці маладога і маці маладой прыносяць простыню і паказваюць людзям, што гаварыць аб чыстаце і чэснасці дзяўчыны. І вот адна дзяўчына была не чэсная, і на мацеру адзелі хамут, як на коней адзяваюць. Пяклі такую яечню і ў ёй выразалі гэтакую дзірку. І ўсю свадзьбу маці з хамутом ходзіць. Вось некалі паэтаму не было такога безабразія.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Дзяnішчык Неанілы Ільінічны, 1937 г.н.*

З чаго рабілі вэлюм? Ну, гэта з таго, што на могілках нашых расце – барвінак. Бралі пярсцёнак і на барвінак кругом шылі. Маладой распускалі косу і ўшывалі яго ў валасы. У нас тады ўсякія песні пелі. Еслі дзяўчына прыгожая, то спяваліся песні, калі вянок сабіралі. Ну, ужэ сабралі гэта ўсё, пашылі, на талерачку палажылі, маладой памералі, мацеры аддалі. На талерачку вянок, каб было чысценька, маладая была чыстаю, і ўсё было чыстае. А тады маці прыносіла, частавала, а тады ўжэ песні пелі. А тады, калі прыехалі з-пад вянца, сядзіць маладая да вечара, а як класціся спаць, значыцца, вымала калечка сама ці малады памагаў, ці, можа, была дружка там каля яе, і клалі ў тую падушку, дзе спалі маладыя.

Ну, гэта свянцонае ўсё было, значыць, каб на шчасце, каб доля была. Калі едзеш вянчацца, калечка было ўплецена ў валасы, а як ужэ малады прыедзе, некалі, садзіцца за стол, а маладая была ў каморцы. Сват ішоў выкупаць маладую.

Сват варочаецца раз. Пасля сват ідзе і гаворыць словы, на што быў здатны, той так і гаворыць. Так робіць другі раз. Трэцім разам або малады дабавіць, або забярэ ўсе грошы. Талерачка накрытая платочкам, там не відаць колькі грошай. Ну, як дабавіць, то дружам будзе што, а калі забярэ, то няма нічога.

Маладым засцілаюць абрус, маладыя становяцца на каленкі, сваха бярэ свечку і пастрыгае маладых. Еслі маладога не пастрыгаюць, то не, а еслі да, то пастрыгаюць абоіх. Гэта значыла благаславенне маладых, адпраўлялі іх. Адна палова шла ў сваю машыну , другая – у сваю.

У цэркаў маладыя ў нас не шлі разам, яго вялі яго родзічы, а яе першы брат. Першай уваходзіла маладая, а за ёю – малады.

Ну, каравай дзялілі, тортаў жа ніхто не рабіў. На вяселлі гулялі 60, мо 70 людзей. Фату перадавалі некалі ці бралі з другога сяла. А сукенку магла яшчэ маладая браць ад маці. На вяселлі іграла скрыпка, дудка, гармошка, ці баян, ці барабан. Выпякалі каравай:

*З сямі палёў пшаніцы,*
*З сямі вадзіц крыніцы,*
*Ад сямі кароў масла,*
*Ды яец паўтараста.*
*Сама сеяла, сама выпякала,*
*Сама гасцей склікала,*
*Сама гасцей склікала,*

Каравая паспытаць, шчасця і долі пажадаць.

Дарылі ў асноўным цялушку, грошы. Як малады прыводзіць маладую, пяюць:





*Выйдзі, выйдзі, маці,*
*Паглядзі свайго й дзіцяці,*
*Што прывёз сын баярачку*
*Ды паставіў на ганачку,*
*Высокую да румяну,*
*Да й хороша прыбраную,*
*Дай, Божа, маладым добрую долю.*

*Матэрыялы ўзяты з архіва Нясвіжскага раённага цэнтра народнай творчасці.*

Галоўнае, каб вяселле не пападала на пост. Между Раждзеством і Вялікім пастом, между Калядкамі і Вялікім пастом вяселле рабілі. На Масленіцу вяселле рабілі, на масленічнай нядзеле. На Троіцу самыя свадзьбы былі. После Паскі, значыт, пашці да Пятровскага паста, а патом на Пятра тожэ пост канчаўся, і тожэ былі вяселля ад Пятроўкі да Успення Прысвятой Багародзіцы, да Успенскага паста. Это ў сенцябрэ. Жаніх засылаў сватоў. Якога пастаршэ мужчыну браў ці дзядзьку свайго, ці друга якога, абязацельна, штоб пастаршэ быў. Сват должэн был быць жанатым ужо. Сваты прыхадзілі ілі прыязджалі. А невесту в эта время пряталі. Жаніх прасіў рукі нявесты, дагаварваліся ўжо аб пасаге, які пасаг должэн был быць. І тады ўжо паказвалі нявесту.

На заручынах ужо аб'яўлялі іх жаніхом і нявестай. Вілі вянкі. Плілі вянкі гэтай нявесцы, на галаву прібіралі, пелі песні. Красівыя, канешна, вянкі дзелаліся. Каравай пяклі, заказвалі каравай. В аснавном каравай пеклі тыя людзі, якія добра ўмелі печ. Каравай былі бальшыя, звычайна разукрашаныя цестам такім, усякімі завітушкамі. Всякія кветачкі там на ём. І насілі той каравай абычна ўжо к канцу першага дня ілі на втарой дзень. Два дня свадзьбу гулялі. І на втарой дзень насілі этат каравай, абычна падбіралі такіх невялікіх хлопчыкаў, які неслі на руках і галаве, і пелі песні. В эта время свадзебные песні пелі. І ў караваі свечкі запаленыя былі.

Садзілі нявесту на дзяжу, ёй тады ўжо знімалі фату, павязвалі касынку. А нявеста далжна была ўжо адорваць падаркамі радзіцелей, родственікаў там яшчэ якіх, дзядзькаў. Абкідвалі зернем, абычна на конях усё гэта было, пакрываліся красівыя просцілкі. Гэта адбывалася каля дома маладой. Ва-первых, трэба было ж выкупіць нявесту, дзяўчаты прыгаворкі, песні дажэ напевалі: "Што за гэта даш? Ці водкі, ці віна". Грошы должэн даваць жаніх. І тады ўжо выводзілі нявесту, а спачатку, калі жаніх яшчэ са свайго дому выходзіў, таксама трэба было абыйсці вакол стала. Стол быў накрыт, і вакол стала абвадзілі бацька з маткай з іконай Ісуса Хрыста. Першы раз ішлі і пакланіліся. Жаніх должэн быў пацалаваць гэтую ікону за каждым разам, а затым ужо ехалі к нявесце. А ў нявесты, ужо пасля тога як ён выкупіў яе, таксама абводзілі і кланяліся, але ікона было ўжо Божай Мацеры і ікона Ісуса Хрыста вмесце. Спачатку яны ехалі ў ЗАГС, а потым вянчацца. Абсыпалі зярном вакруг тако картэджа, а тады ў аснаўном на конях ездзілі. Гэта трэба было для таго, каб шчаслівая жызнь была. А вянчаліся маладыя з той мэтай, каб нікілі не развянчацца. Бацюшка і кароны там эці надзяваў, над німі дзержат, палаценца падсцілают, вышатае беларускае палаценца. І тада кагда на палаценцэ ўжо стаят, бацюшка іх вянчает. А патом водзіт іх вакол прастола.

Потым дзялілі каравай. Яго абычна дзяліў сват. І маладыя ўжо ўгашчалі караваем цётку, яшчэ каго, сястру ілі брата, падругу ілі каго.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Падгайскай Вольгі Дзям'янаўны, 1930 г.н.*
*(раней пражывала ў в.Лань,Нясвіжскага р-на).*

У які час гулялі вяселле? На Сёмуху (Тройцу), у аўгусці, у сенцябрэ, таму што да аўгуста ідуць вельмі вялікія пасты. Хлеба возьмуць, свата возьмуць, мужчыну, і ён гаворыць. Каторыя ж згаджаліся, а каторыя не згаджаліся. Вянок рабілі маладой. Збіраліся ўсе ў хату дзяўчата і барвінец такі ў лесе ё, доўгі ён, і з гэтага барвінцу плялі вяночак маладой. Песні спявалі дзяўчаты. Вясельны каравай самі пяклі. Выязджаюць да вянца і абсыпаюць зернем маладых, і цяпер зярнятамі абсыпаюць. Каравай дзеліць сваха, ужэ дзеці малыя, каторыя на свадзьбе, нясуць каравай, засцелюць абрусам, прынясуць ужо і дзяляць каравай, і выклікаюць па парадку родных бацькоў, баба, дзед, тады хрышчоных бацькоў, а тады ўжо і дружку, і па парадку выклікалі, а ты кладзеш грошы, ці падаркі, і па кусочку ждалі каравай. Дзеці прыносяць каравай і дзеляць ужо.

*Запісана ў.в. Лявонавічы*
*ад Хаванскай Ірыны Адамаўны, 1946 г.н.*

Вяселле гулялі на Сёмуху, на Яна ўжо

гулялі, на Багача гулялі свадзьбы, калі каму прыспічыць, на Новы год гулялі. А ў пост ніхто нікагда не гуляў.

Сватанне было. Сват быў, сваха была, маладая сваху брала, а малады – свата. А патом пад каравай сваты вызываюць свадзебных людзей. Кладуць падаркі, хто можа, маладой.

Дзявочнік быў, заплялі вянок, песні пелі. Некалі маладая, як замуж ідзе, склікала дзяўчат, з імі гуляе. Патом бяруць, ідуць ужо ў хату к ёй, плятуць вянок. Рамашкі ўпляталі, васількі, шылі цвяточкі ў вянок, і яна ўжо там шыла. Патом песні спявалі маладой:

*Дай, Божа, маладой*
*У добы час…*

Ну, сплятуць вянок ужо з этых кветак, а патом ужэ частуюць дзяўчат гэтых, каторыя плялі вянок. Хто хоча, той і пёк каравай.

Едзе маладая пад вянец. Некалі раней садзілі маладую на дзяжу, а цяпер не. Вот адпраўляюць маладую распісвацца з хлопцам і бяруць зярняткі, жыта, ужо тры разы абходзіць трэба машыны, каторыя паставілі. Кругом машыны ходзіць ужэ маці там, тудасюда, дзе свае, па тры разы, а патом ужэ гэтыя зярняткі, каторыя засталіся ў платочку, сыпяць.

А музыка як зайграе ўжэ, як ужэ ісці пад вянец к бацюшку. Бацюшка ж вянчаў некалі, дак ужо адпраўляюць маладую з маладым.

Каравай раздзелвала сваха. Хто дае падаркі, таму і каравай давалі. Рэжуць ужэ кусочак каравая, сыра. Сначала сваіх вызываюць.

*Малады з маладою вызывае:*
*Караваем абсылаем,*
*Прасім прыняць,*
*Паблагаслаўлаць.*

Нясуць ужо падаркі, а ім кладуць каравай, кусочак сыра.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Шынгель Наталлі Віктараўны, 1930 г.н.*

Прыходзім на дагаворы. Дагаварыліся яго бацькі і яе бацькі, калі шлюб браць. Пілі вялікую гарэлку, потым малую гарэлку, а тады запівалі маладых. Да шлюбу гатовілісь. Дзяўчаты прыходзілі, шылі ёй фату. Шылі цвяточкі. А фату накрухмалілі і сшывалі. Фату памылі. І малады прынясе гарэлку. І назаўтра ўжэ ўбіраем яе, да шлюбу адпраўляем. Некалі дзяўчына ў адну касу валасы не заплятала, пака замуж не йдзе. Ужо мы ёй касу заплятаем, вяночак заплятом ў касу. Ужэ яка не дзевочка, а жэншчына. І да шлюбу адпраўляем. Едзем у цэркаў вянчаюцца.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Драчан Ірыны Міхайлаўны, 1933 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Альхоўка Нясвіжскага р-на).*

Ну, некалі ж гулялі ўсё ў дамах. Былі сваты, я помню, што эта во хадзіў да мяне адзін хлопец, ну, я яго так не вельмі любіла за адно дзела, а да мяне прыйшоў адзін чалавек і кажа: “Я прыду з хлопцам з Саска Ліпкі”. Ну, прыйшоў да нас, і ён панравіўся мне: высокі такі, кучаравы, муж быў красівым, высокім, кучаравым, ну, мы пажаніліся, і ўсё. Дак яны дагаворваліся з гэтым, з сватам, ну, каб ужэ пазнакоміцца спярва. Ну, пазнакоміліся мы, адзін аднаму панравіліся, ну, давай жаніцца.

На сватанне ён прыходзіў з бутылкай. Заручаны – гэта ўжэ ў касцёлі. Ксёндз ужэ вянчаў. Кольца куплялі, ксёндз шлюб даваў, і зручалі.

На пасад садзілі, дзярушку падсцілалі дома, ну, і мы ўкленчвалі. А нас ужэ благаславілі, такая жэншчына, якая ўмее благаслаўляць, помню, як ана благаславіла:

*Просім Бога найвышэго,*
*Ой, цэ матко радзонэго,*
*Суседзі пшывяцелі*
*Тэго кола…*

Неяк ужэ так благаславілі. Як Пан благаславіць, трэба нешчо сказаць, тры раз нешчо гавораць. Тожэ это самае як Пан благаславіць. А тады ўжо паднімаешся з пасаду, і начынаецца свадзьба. Патом, калі канчаецца свадзьба, падходзіць сваха, хвату знімае, завязвае хустку – значыць, будзеш ўжэ жанчынай. Калі дзяўчыне павязвалі хустачку, ёй можна было, не забаранялася выплакаць усе свае дзівацкія слёзы. Бацькі давалі дазволу на шлюб, але каб да шлюбу не жылі, патаму шта наша мама і тато былі веруюшчые, і я была ў дзевятнаццаць год у касцеле, хадзіла да касцёла, да працэсіі. А да працэсіі хадзілі чэснымі





ўсе дзевачкі, ня чэсных не бралі. Ну, і эта во да дзевятнаццаці год я хадзіла да працэсіі. Мяне ксёнз знаў, і ўсе на свеце. Мяне харашэ благаславіў.

Бацькі маглі адмовіць сватам. Ну, як не панаравіцца, то бацькі адмаўляюць, але хто іх там слухаў. Раз мне панаравілась, то што мне бацькі, яны саглашаліся. На вяселлі спявалі спецыяльныя песні.

Каравай пякуць ад маладога, а ў маладой свой каравай. Ну, пякуць каравай, тожэ спяваюць, кружацца, дзеці ўсё нясуць, маленькія, ну, такія вот – падростачкі. Нясуць кружацца, ну, і спяваюць. Каравай, хто хацеў, тыя і пяклі.

Калі маладыя ад’яджалі ў ЗАГС іх пасыпалі зернем. Некалі не было ж машын, былі коні запрэжаныя. А мы ў санях былі, бо зіма была. Мы жаніліся перад Калядамі. Так, ужэ бацькі, свае бацькі абходзяць усё кругом, а тады тры раз ходзяць, абсыпаюць зярном, і благаслаўляць тады і ўсё, каб усё добра было. У пост нельга было жаніцца – это после поста была свадзьба.

Падчас застолля спявалі ўсякія песні. Тады ўсё ў сваёй хаце рабілі, а калі ў сaседа, дзе музыка грала, станцавалі ды ўсё. Ад сурокаў прышпільвалі маладым шпілячку туды ў сярэдзіне.

Каравай дзяліў сват. Каравай пякуць такі бальшы, там шмат шышак, усяго, і ён ужо, сват, рэжа, і раздае ўсім гасцям па кусочку. А раней дарылі капы, падаркі, што-небудзь этакае.

*Запісана ў в. Альбянка*
*ад Валчок Сафіі Ігнацьеўны, 1935 г.н.*

У посці нельзя вяселле гуляць: і вот перад Калядамі, і перад Вялікаднем. А вот цяпер Пятроў пост, тожэ не вельмо ні з рускаго, ні з польскаго Пятра. А ў посці ксёнз дажэ і не будзе вянчаць і дзіця хрысціць, ну, дзіця то перахрышчвае, таму, што дзіцятко як маленько можна, што хоча можа быць, ксёнз хрысціт, а венчаць – нікагда, у посці не паложано ні перад Вялікаднем, ні перад калядамі.

*На сватанне прыязджалі там бацькі.*
*Раней садзілі на дзяжу.*

*Запісана ў в. Альбянка*
*ад Татур Браніславы Францаўны, 1942 г.н.*
*(раней пражывала ў в.Саска Ліпка Нясвіжскага р-на).*

На вяселле едуць і з абразом. Гэта вязуць ўжо маладую туды, к маладому. Гэта па-даўнейшаму так. Тры дні гулялі. Абычно у пятніцу, суботу, у нядзелю канчалі. У маі стараліся не рабіць, бо маладыя будуць маяцца. У іюні, там, іюлі рабілі.

*Запісана ў в. Цякалаўшчына*
*ад Кавальчук Валянціны Вікенцьеўны, 1950 г.н.*

### Вясельная песня

*Маруся, Маруся,*
*Кепско жыць з табою,*
*Не одзін я вечар прасядзеў з табою,*
*Не одзін я вечар, не адну нядзелю.*

*На табе, Маруся, думаю надзею,*
*Усю маю надзею.*
*І думаю іграці,*
*Только ці пазволяць*
*Сёстры, родна маці.*

*Мамку перапрашу,*
*Сёстраў перамалю,*
*Прывязу Марусю,*
*Як чырвону ружу.*

*Прывязу Марусю,*
*Пасажу ў куточку*
*Глядзі, мая мамка,*
*За радную дочку.*

*А што ж цяпер стала,*
*За які прычыны*
*Чужая дзяўчына*
*За радную стала.*

*На табе, Маруся,*
*Каня варанога,*
*Адайдзі ад мяне*
*І ад сына майго.*

*А я каня прадам*
*І вазьму я грошы.*
*Люблю твайго сына,*
*Бо твой сын харошы.*

*Люблю твайго сына*
*І буду жыці.*
*А ты наша мамка,*
*Мусіш нас любіці.*

*Запісана ў в. Альбянка*
*ад Шумейка Таццяны Антонаўны, 1931 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Малева Нясвіжскага р-на).*

Ішлі сваталіся, тады раней дзве нядзелі ды распісваліся, а тады ўжо свадзьба. Прыедзе малады, кругом стала абходзяць, да ўжэ то платочкі, то што маладая яго дружыні дарыць. Ехалі ў цэркаў вянчацца, распішуцца. Тут сядзяць, а тады і едуць ужо да маладой. І гэтак вяселле праходзіла 2 дні. От у суботу, заўсёды, едзе малады да маладой. Там збіраліся пад вечар. Малады бярэ маладую і едзе да свайго дому, і тады гуляюць. Сватацца прыходзілі. Раней нявесту выбіралі багатую, штоб з роду добрага, каб негуляшчая. Глядзелі, якая матка, ці хазяйка добрая, ці ўсё ў парадку, ці з бацькам добра жыве. Гэтак во выбіралі. Бывае, і многа помешаюць, ходзяць, ходзяць, ано і ваб'юцца бацькі яго або яе бацькі і разлучаць. А некатарыя то не слухалі. Ек ходзяць, то і вяселле было. А бывае, бацькі ек ваб'юцца, то і не жаніліся, а былі і случаі, што і разводы ў жыцці былі.

Усяк было. Ек любіць, то бярэ. А яшчэ ек калхозы былі, выбіралі маладую, каб зямлі многа было, каб у куфры многа палацён было, каб усё было. Вось адна ішла замуж і куфар быў пусты, яна не наткала рушнікоў і матка не наткала, да наклалі под іспод кірпічоў, а наверх рушнікоў, да ўжо няслі браты яго гэты куфар. Да кажуць, ну, што тут, а потым адчынілі, дак там кірпічы.

Зборная субота была. Збіраліся, клікала маладая дзяўчат сваіх, падружак, вяночак плятуць і кветачкі рабілі, лентачкі пакупляюць, цвяток прышывалі к сукенцы. Маладая паставіць дзяўчатам бутылку і дзяўчата вып'юць, благасловяць, каб ужэ добра было ўсё. А прыедзе некалі малады, да выкуплівалі. Дзяўчаты ўжо таргуюцца, не аддаюць маладую: хто грошай, а хто і гарэлкі пакладзе, шампанскага паставіць, вот гэтак было.

*Запісана ў в. Казлы*
*ад Карачун Марыі Сямёнаўны, 1936 г.н.*

Раней вяселле праходзіла так: малады і маладая прыбіраліся. Едуць у царкву ці касцёл, ды вянчаюцца. Бацькі моляцца, абразы ў царкве дзяржалі перад імі, свечкі гараць. Бацька і маці сустракаюць маладых або дзядзька з цёткай. Тады ўжо уходзяць у хату і маладая абсыпае канфетамі. Сустракалі заўсёды тыя людзі, хто быў у пары: дзядзька з цёткай.

Сватанне было, бо і без сватання вяселля не можа быць. Прыязжалі, дагаварваліся: "Ваш сын, мая дачка, ці сагласны вы? Што вы даеце сыну?"

І каравай абезацельно быў. Дзеўкі каравай на дзяжу кладуць, потым на галаве дзеці носяць. Абезацельно лажылі маладым хто грошы, хто мацерыял.

Свадзьба была ў каго два дня, у каго адзін, а ў каго і тры. Першы дзень усегда гуляецца ў маладой, а на другі дзень ужо едуць да маладога.

Дзяўчаты вянок знімалі маладой і адзявалі платок тады, калі павянчаюцца. Як прыедуць з царквы, то ўжэ яна жэншчына, а не дзевушка.

*Запісана ў в.Альбянка*
*ад Гібчык Юзэфы Францаўны, 1931 г.н.*

У пасты вяселле нельга было гуляць, і перад Калядамі ня можна было гуляць, толькі гулялі ўжо пасля Крашчэння, якое 19 студзеня канчалася, і пасля 20 чысел можна было гуляць. Асобенно ў кастрычніку, лістападзе гулялі вяселле. Сначала сватанне была, заручыны. Сабраліся, вянок вілі з барвінца, барвінец – гэта такая трава. Сватанне праходзіла ў кожнага па-рознаму, як хто дагаворыцца. Заручыны – прыязжалі бацькі маладога ды і дагаварваліся. На дзявочніку сплялі вянок са шпарагуса, дзяўчата сабраліся, парагаталі, павячэралі – ды вот такі і дзявічнік.

Каравай пяклі. Ехалі, паўтара дня гулялі ў маладой, паўтара ў маладога. Потым падзялілі каравай у маладой, сабраліся і пераязжаюць к маладому, прыязжаюць бацькі хрышчоныя маладое. Абавязкова раней каля маладога сядзелі бацька і маці хрышчоныя, і каля маладой таксама сядзелі маці і бацька хрышчоныя. Цяпер дружкі сядзяць, а раней абавязкова былі бацька і маці хрышчоныя. Падзялілі каравай маладой, паехалі к маладому. А на ноч пакідалі плецеными каробкі, і ў гэту каробку падкладвалі куклу, назаўтра, калі падзялілі каравай маладога, варушаць хлеб бацькоў хрышчоных і адкрывалі каробку, і падымалі на смех маці з бацькам хрышчоным: за ноч зрабілі дзіця. Потым дзялілі бацькоўскі хлеб, каўбасу, гарэлка тожэ была. Каравай рэзалі-рэзалі і дзялілі ўсім. Каравай пяклі не самі, прасілі, каб пяклі, хто ўмеў. Абсыпалі зернем маладых, калі аб'язжаюць, ек ужо пастроеныя машыны, раней вазы пастаўлены ўсе ў рад. На першым возе едзе маладая ці малады, бацька маладога, і маці тады ўжо з іконаю ішлі, ішоў сват і сваха, і маці, адпраўляючы, тры разы абходзіць строй машын і абсыпае зернем. Калі трогаецца машына, то ўзадзі пхаюць машыны. Прыметы былі такія: каб дарогу не пераходзілі, ек едзе вяселле, што счыталася, што гэта ек іменна едзе малады да маладое, то будзе няшчасце. Выкуп быў, усяго было, як жаніх выкупае, прыязжае, закрываюць ужо аддзельна, і тут ужо гавораць: "Мы не аддамо табе, должэн заплаціць". Ён ужо таргуецца, колькі сват са сватам з першым шаферам дадуць выкуп ужэ. Еслі падружка вельмі настырная дзяўчына, то яна добра выцыганіць і возьме, здзярэ добра грошай і дажэ гарэлкі, цукеркі. Каб засцерагчы ад урокаў маладога з маладой, шпількі прышчэпвалі. Вяселле заканчвалася такім чынам: падзялілі каравай, хлеб, выпілі, і ўсё, на гэтым канчаецца вяселле.

*Запісана ў . в. Лявонавічы*
*ад Шынгель Ганны Іванаўны, 1934 г.н*
*(раней пражывала ў в. Смалічы Нясвіжскага р-на).*

Сваталіся, прывялі хлопца і пыталі ў дзяўчыны падходзіць ён ці не. Адзін не падыйшоў, прывялі другога – панравіўся. Гулялі свадзьбу, трэбавалі пасаду. Сабіралі ўсю радню, чакалі маладога з братамі, з шаферам, перавязвалі вуліцу, бралі грошы, бутылку. Калі пажаніліся, маці маладога знімала фату, завязвала платок. Свадзьбу гулялі тры дні, пяклі два каравая – адзін для маладой, другі для маладога. Маладыя на шчасце разбівалі чаркі, потым маладая рассыпала канфеты. Заносілі каравай маладога і выразалі сярэдзіну, яе аддавалі маладым, потым частавалі бацькоў.

*Запісана ў в. Малева*
*ад Шах Зінаіды Антонаўны, 1928 г.н.*

Прыехаў малады з брыгадаю, выкупаў без грошаў, без падарка. Гулялі тры дні. Першы дзень гулялі ў маладой, на другі дзень ехалі да маладога есці каравай, трэці дзень гулялі, пілі, елі. Калі дзялілі каравай, сярэдзіну выразалі і аддавалі маладым, пасыпалі зернем. Дарылі крапу, мацерыял, то настольнік. Нельга было дарыць нажы.

*Запісана ў в. Малева*
*ад Акулік Галіны Уладзіміраўны, 1947 г.н.*

Прыхадзілі, сваталіся. У дзень свадзьбы прыязджаў малады і выкупаў маладую. Свадзьбу гулялі два дні, пяклі караваі, не вянчаліся. На свадзьбу дарылі, хто грошы, хто капу.

*Запісана ў в. Нялепава*
*ад Захарэц Ірыны Васільеўны, 1932 г.н.*

Прыхадзілі сваты, гаварылі: "У нас жаніх, у вас нявеста". Садзіліся за стол, пілі, елі, гулялі. У мяне гулялі адзін вечар. Прыйшлі, пасядзелі, да і ўсё, падарылі зеркала і палаценца.

*Запісана ў в. Нялепава*
*ад Сафівулінай Еўфрасінні Васільеўны, 1941 г.н.*

Прыехаў вось гэты чалавек да мяне. Распісаліся, а свадзьбу мы не рабілі, бо пост быў, тады ж трымаліся гэтага. Мяне не выкупалі, помню, як дачку аддавала. Вось прыехалі яны на машынах, адзявалі яе мы і прыбіралі ў хаце па суседству, бо ў сваёй выкупоўвалі, давалі грошы, шампанскае, канфеты. Потым паехалі ў Нясвіж распісвацца. Ну, а потым прыехалі, селі за стол ды і гулялі.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Галабурды Яўгеніі Уласаўны, 1934 г н.*

У сваты хадзў жаніх і сват. У першы дзень вянчаліся, пасля было застолле. Дзялілі каравай сват і свацця. Першыя кускі даставаліся бацькам і хросным, патом усім астальным гасцям.

Нявеста адорвала родственікаў жэніха. На другі дзень тожа пяклі каравай. Яго выносілі, вярцелі, дзялілі между ўсімі гасцямі. Калі аставаліся, то яго вярцелі, а госці далжны былі дастаць астаўшыеся кускі.

На другі дзень снімалі фату і адзявалі платок. Гэта рабіла свякроў. Гэта азначае, што яна прымае нявестку ў сям'ю.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Коканавай Алены Вікенцьеўны, 1940 г.н.*

У сваты прыходзіў жаніх і яго радня, усе хто хацеў. На сватах нявесту садзілі на дзяжу, у якой пеклі хлеб.

На свадзьбе ёсць абрад знімання фаты. Выносілі каравай накрытым платком. Патом свякроў знімае фату і надзеёт этат платок нявесце на галаву.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Токар Таісы Пятроўны, 1942 г.н.*

Нельга каб нявеста да свадзьбы была ў

хаце жаніха. Нявеста ў сватах дарыла падаркі родственікам. Если нячэсная, на дзяжу не садзілі. Перад цем, як ехать ў ЗАГС, машыны маладых бацькі нявесты абсыпалі зернем. Гэта азначае пажаданне ім багатства і добрай дарогі. Каравай дзялілі ў канцы вяселля сват і свацця.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Лукаш Кацярыны Іосіфаўны, 1941 г.н.*

Хлопец хадзіў сватацца да дзяўчыны. Калі яны дагаварваліся, то потым ехалі ў царкву, і бацюшка іх вянчаў. Калі дзяўчына ці яе бацькі не маглі прыняць гэтага хлопца, то пілі ўсе разам гарэлку. Каравай дзялілі пасля таго, як павянчаюцца.

*Запісана ў в. Альхоўка*
*ад Вальчык Анастасіі Іванаўны, 1927 г.н.*

Вяселле не рабілі да Сёмухі, таксама не рабілі ў пост, нельга. Спявалі песні, выносілі каравай. Каравай дзялілі на другі дзень пасля вянчання. У час пасада маладая не пяе песні, яна заўсёды плача.

*Запісана ў в. Гусакі*
*ад Гесь Ніны Пятроўны, 1929 г.н.*

Калі жаніх прыязжае да маладой з бутылкай, то калі маладая сагласна, гэту бутылку распівалі. Калі не, то бутылку не адкрывалі. Але калі адкрылі, но маладая не сагласна, то бацька маладой павінен быў выплаціць грошы.

*Запісана ў в. Грыцкавічы*
*ад Захарэц Сафіі Мікалаеўны, 1941 г.н.*

Былі сваты. У сваты прыязжалі бацькі маладога, знаёміліся з сям’ёй маладой. Другі дзень называўся “Вялікая Гарэлка”. На першы дзень малады прыязжае да маладой, пасядзяць за сталом і едуць яны вянчацца. Маладая была адзетая ў белую сукенку, якую яна сама шыла. Яшчэ маладая надзявала вэлем.

Абрад вянчання праходзіў у цэркві, дзяржалі над галавой вянкі. Заходзілі і кленчылі перад алтаром. Павінны былі быць свідзецелі, і ксёнз маліўся, і потым прысягалі на вернасць, што ён не пакіне яе і яна яго не пакіне, пакуль смерць не раздзеліць іх, цалуюць крэст і абменьваліся кольцамі.

Па дарозе з царквы былі перапоіны: запыняюць машыну, ставяць стол перад ёю і на кожны вугал стала ставяць па бутылцы. І сват выходзя з машыны, звязаны рушніком, і патрэбна, каб ён абязацельна паставіў бутылку на кожны вугал.

Пасля вянчання прыязжалі да дому маладой і потым іх віншавалі саседзі, благаслаўлялі бацькі і гулялі. Пасля вяселля ў хаце маладой усе ехалі да маладога. У канцы вяселля дзялілі каравай, спецыяльна пяклі такі вялікі пірог. Яго пякла гаспадыня. Ён быў і ў маладога, і ў маладой.

А ўжо як канчалася вяселле, мама маладога знімала маладой вэлем і завязвала хустачку. Раней вэлем магла надзяваць толькі чэсная дзеўка.

*Запісана ў в. Слаўкава*
*ад Харытонавай Чаславы Барыславаўны, 1946 г.н.*

На вячоркі маладая запрашала дзевак, і яны плятуць вянок. У сваты ідзе сват і нясе бутылку і булку хлеба. Яны спытлівалі: ці будзем адкрываць бутылку і разразаць булку? Каравай пяклі на вяселлі.

*Запісана ў в. Смалічы*
*ад Хмарук Людмілы Антонаўны, 1930 г.н.*

*Сегодня дзень для ўсіх вясёлы,*
*Сегодня дзень для ўсіх вясёлы.*
*Музыка вёску весяліць,*
*А я кладуся, пасцялюся,*
*Сэрца ноя, грудзь баліць.*
*Пасцелі паслала, дзверы закрыла,*
*Толькі засталась агонь стушыць,*
*Як чую: шэлест раздаецца.*
*Хто там ідзе, дзвярмі стучыць?*
*З пасцелі ўстала, дзверы адкрыла,*
*Мілы за ручаньку бярэ:*
*– Чаго так рана спаць кладзешся?*
*Чаму на вуліцу ня йдзеш?*
*Я гаварыці з ім не стала,*
*Стала сур’ёзна атвячаць:*
*– Бо ты ўжэ жэнішся з другой,*
*Пара мяне ўжо забываць.*
*Хадзіў да мяне ты чатыры года,*
*Дарыў з сярэбраным кальцом,*
*Пускай Гасподзь цябе накажа,*
*Калі ты ж станеш пад вянцом.*

Заручаны – гэта, калі малады дагаворыцца на гэту свадзьбу. Пярэзвы – гэта бацькі маладога прыязджаюць да бацькоў маладых. Патом чэраз нядзелю маладая не шла дадому. Раз яна пашла туды к маладому, то яна цэлую нядзелю не шла дадому. Хай яна ў сваім сяле, але ж яна не шла дадому. А ўжо чэраз нядзелю маладая, малады і маладога бацька, маці, сястра і брат прыязжалі сюды к маладой, прывозілі яе дадому і ўжо частаваліся. У будні дзень вяселле не рабілі.

Спачатку малады хадзіў да маладой у сваты, садзіліся за стол. Еслі бутылку водкі ставілі на стол і маладая была сагласная, значыцца, сват будзе пытацца гэтак: “Ну, так як, будзем начынаць маладога водку піць ці не будзем?” Еслі маладая была сагласная, значыцца, водку маладога начыналі, а еслі маладая скажа, што не сагласная, то бутылкі, гэтай не адкрывалі. А еслі ўжо сагласная і адкрыюць гэтую бутылку, вып’юць, маладая абвязывала гэту бутылку краснай лентай. Што азначае, што яна чэсная. Потым маладая хадзіла па хатах, збірала маладых дзяўчат, якія плялі вянок. Адна садзілася, фату сабірала, другія брали што-небудзь зялёненькае, і ўшывалі. А гэты барвінак бралі, кальцо і ўшывалі вяночак з двух бакоў. І потым гэты вянок бралі як фату, косы распускалі і прымацоўвалі з песняй:

### Ня бойся, дзяўчына, Бога

*Прыстройся, дзяўчына, да Бога,*
*Сягодня дзянёчак святы.*
*Чашы ты галоўку прыгожа,*
*Бо сёння прыедуць сваты,*
*Бо заўтра прыедзе твой мілы,*
*Каторый вазлюбляный твой,*
*Падумай, куды цябе возьмуць*
*Ад роднае мамы тваёй.*
*Падумай, як цяжка прыдзецца*
*Ступіць да хаціны чужой,*
*Спазнацца з чужой старонкай,*
*Злюбіцца з чужою сям’ёй.*

Потым пасля таго, як прыязжалі да маладых, маладая знімала вянок і клала ў ту падушку, на якой спалі яны ўдвох. Клалі таму, што быў закон, што калі ты пад вянцом, то ляжыць усё разам. Назаўтра прыязжаў малады і садзіўся за стол (у цэнтр), а сват ішоў у каморку выкупліваць маладую, да трох раз хадзіў. Сват прыходзіў першы раз, калі дружкі не аддавалі за гэтую цэну, то ён прыходзіў у другі, а на трэцці раз хоць за капейкі, але аддавалі. Толькі хадзілі тры разы, пакуль маладую не прыводзілі. Яна садзілася перад сталом напроціў маладога. А потым выпівалі па тры чаркі, што, значыць, сват благаславіў. Еслі маладога сваха дома не падстрыгала, значыць, садзіліся маладой бацькі. Лажылі нейкі ручнік, яны садзілі туды свата маладога і маладой, палілі свечку, тры разы праводзілі вакол і чуць-чуць на расчошачку бралі валасы і падпальвалі іх. Гэта значыць, падстрыгалі маладых. Маладую паднімалі пад рукі браты, а маладога бралі дзяўчаты, і вялі на воз (машыну) і раздзялялі іх. Да царквы іх так жа вялі. Там іх ставілі на ручнік разам. Свахі станавіліся па бакам. Пасля прыязжалі дадому з-пад вянца. Пілі і гулялі.

Каравай пяклі ў нявесты. У час вяселля яго прыносілі з дзяжы, бралі века, засцілалі чым-небудзь беленькім. Бралі дзетак, іграла музыка “Марш”, а яны кружыліся для таго, каб усё вялося. Сват са свахай дзялілі каравай са словамі:

*Просім Бога найвысокага,*
*Просім раздзяліць*
*Маладой каравай.*

Сваха першая раздавала каравай. Сват благаславіць. Цяпер я вам раскажу, з чаго наша маладая пякла каравай:

*З сямі палёў пшанічка,*
*З сямі крыніц вадзічка,*
*Ад сямі кароў масла*
*Ды яец паўтараста.*
*Сама сеяла, сама веяла,*
*Сама выпякала,*
*Сама гасцей склікала*
*Караваю паспытаць,*
*Шчасця і долі пажадаць.*

Акрайчык каравая адразала сваха і давала маладым. А потым раздае па парадку: радным, блізкім, суседзям, а яны ім за гэта давалі падарункі са словамі:

*Пажадай маладым шчасця і долю абаім:*
*Дару вам пару галубей,*
*Штоб з вас была пара харошых людзей.*
*Дару вам пару гусей,*
*Каб всегда давалі адно аднаму бусі.*
*Дару вам многа медзі,*
*Каб дзеці былі ў вас, як мядведзі.*

*Дару вам арэх, каб нявеста*
*Не глядзела на чужы прарэх.*
*А маладому дару ніткі,*
*Каб не глядзеў на чужыя лыткі.*

Пасля таго, як раздзеляць каравай, дзеляць бацькоўскі хлеб. Калі малады едзе к маладой, то ён едзе з хроснымі бацькамі, вязуць карзіну ці каробку, а там ляжыць хлеб, каўбаса, пірог, мяса, водка і сыр. А калі прыязжаюць, то ставяць усё гэта ў куточак, для таго каб з’есць гэта ўсё пасля каравая. А таксама на свадзьбах былі фокуснікі: як-нібудзь стараліся, каб хросныя бацькі нічога не бачылі і ў каробку падлажывалі куклу. Куклу так рабілі: бралі якую-небудзь анучку, дзецкую шапачку і суконачку. Усё гэта скручвалі, рабілі дзіця і ў якую-небудзь трапку закручвалі, бралі лентачку якую з паяском, спавівалі яе і ў каробку туды бацькам піхалі. Гэта рабілі на смех. Слядзілі за хрышчонымі бацькамі, каб яны гэтай куклы не агледзелі, каб яны яе не дасталі. Ну, а бацькі раскрываюць гэты хлеб, бацькі раскрываюць – ды бывае за тую куклу і хоп пад стол: “Бацька, бацька, што ты хаваеш? Самае смачнае схаваў, давай сюды”. А калі ж дастануць гэту куклу, рагочуць, у ладкі плешчуць, што бацька хрышчоны з мацер’ю за ноч прыдбаў сабе.

Дарылі падушку, скацерку, ручнік на ікону, палатна кусок, тканую коўдру. Абычна жанчына клала падарак, а мужык грошы. На дзяжу садзілі ўсіх дзяўчат, бо раней яны ўсе былі чэсныя. Фату надзявалі ўсе, бо было так заведзяно. Пасля вяселля, калі маладыя паспяць, паказваюць прасціну. Еслі маладая была нячэсная, то на дзяжу не садзілі.

На другі дзень у маладога дома праходзілі гульні:

1) давалі маладой венік і казалі, ці ўмее наша маладая падмятаць. Маладая пачынала падмятаць, а астатнія стаялі і кідалі сарынкі, кажучы, што во маладая не чыста падмяла.

2) ці ўмее наша маладая воду чэрпаць, ці накруціць яна вядро? Калі яна воду накруціць і не ўспее ўзяць вядро, яго вылівалі і казалі, што во маладая дажы вады не начэрпала.

На вяселлі спявалі песні ў маладога і ў маладой пастароннія жанчыны, якія прыходзілі. І прасілі ў свахі пірага:

*Вазьмём вала за рага,*
*А сіву кабылу за грыву, за грыву,*
*Пасадзім яе мы на рынку,*
*Паставім мы яе на лёдзі, на лёдзі,*
*Прап’ём мы яе на мёдзе.*

Прыязжалі ж на конях. Ды як сваха не дасць пірага, дык, значыцца, мы кабылу тваю забяром і прап’ём яе і на мёдзе, і на гарэлцы, і на ўсём.

А пасля песен сваха нясла пірог гэтым жанчынам. Жанчыны дзякавалі яе песняй:

*Дзякуй табе, сваха, за пірог, за пірог,*
*Што ты яго мясіла,*
*Што ты яго мясіла, мясіла,*
*Пад цыцкаю сушыла.*
*Ён бяленькі, маленькі і мякенькі,*
*Толькі ганьба, што ён маленькі.*

А напаследак спявалі: “Дай, Божа, маладым добрую долю”.

Назаўтра ехалі да маладога. А бабы, якія сядзелі ў маладой, сустракалі маладых з мёдам і віном:

*Выйдзі, маладая маці,*
*Паглядзі свайго дзіцяці.*
*Што прывёз сын баярачку,*
*Да й паставіў на ганачку,*
*Высокую да й румяну,*
*Да й хораша прыбрану.*

А калі дзяўчыну аддавалі не па любві, то спявалі:

*Сядзіць наша Ганька за сталом,*
*Цякуць у яе слёзачкі ручайком.*
*На яе й мамка й паглядае,*
*Як у бок слёзачкі да й раняе.*
*На каго ж табе,*
*Маё ж дзіцятачка, й жаль,*
*Жаль, мая мамка, жаль на цябе,*
*Што не дала й пагуляці ў сябе,*
*Ні так на цябе, як на ўвесь род,*
*Што не далі пагуляці яшчэ й год.*
*У гародзі каліна да й з расою,*
*Што не далі пагуляці да й з касою.*
*У гародзі каліна да й з кветкамі,*
*Што не далі пагуляці да й з дзеўкамі.*

На вялікі пост свадзьбаў не рабілі, а таксама перад Калядамі і Піліпаўкай. І вот шчас у нас на пост ад Пятра да Спаса не рабілі





свадзьбаў. Вяселлі больш рабілі ўвосень і зімой.

На вячорках спявалі песні:

*Ой, хажу, я хажу па вішнёваму саду,*
*Аддала мама замуж у чужую старану.*

***

*Бяроза мая караністая,*
*Свякроўка мая наравістая.*

*Запісана ў в. Смалічы*
*ад Міронччык Ірыны Пятроўны, 1936 г.н.*

## Пахавальная абраднасць і галашэнні

Памёр чалавек, яго далжны былі памыць. Калі памёр мужчына, то яго мылі мужчыны, а калі жэншчына - то жэншчыны. Старога мыюць чалавека два, тры.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Высоцкай (Чараповіч) Валянціны Аляксандраўны, 1935 г.н.*

Абмывалі ў аснаўном старыя людзі. Зеркала закрывалі абізацельно, штоб атражэння не была. Адну ноч начаваў пакойнік. Памінали на дзевяць дней, сорак дней і гадаўшчыну. Незамужнюю ў белым плацці харанілі. Маладога тожэ ў касцюмі. Да полугода нікакіх вяшчэй ні трогалі. Бацюшка каля крэста каждага астанаўліваўся і маліўся.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Качура Таццяны Паўлаўны, 1948 г.н.*

У нас людзі галосяць, калі хаваюць памерлага. Усе ж галосяць, усе ж шкадуюць. Сусед мыў, брыў майго мужа (калі той памёр), касцюм чысты адзявалі. Ну, маленне было ў цэркві на дзявяты той дзень пасля пахавання, ну, і на шэсць нядзель было.

*Запісана ў в. Грыцкевічы*
*ад Заяц (Пятроўскай) Марыі Антонаўны, 1937 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Мацылеўшчына Нясвіжскага р-на).*

Абмывалі нябожчыка чужыя, старэйшыя людзі. Труну чужыя выносілі, іншы раз пляменнікі, але найбольш чужыя. Зеркала завешвалі, гадзіннікі астанаўлівалі ў гэтым доме. Пераначаваць дома доўжэн суткі. Памінали на дзевяць дзён, сорак дзён і год. У цэркаў хадзілі абязацельна.

*Запісана ў в. Жанкавічы*
*ад Карачун Ганны Трафімаўны, 1930 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Каменка Нясвіжскага р-на).*

Памірае чалавек, капаюць яму, тады робяць гроб і ў гроб кладуць, але трэба, каб ён пераначаваў ў хаце. Пераадзяваюць у новае адзенне і выносяць нагамі ўперад і пяюць пахаронныя песні. Пахаваюць, і ўсё.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Кузьмовай (Дашко) Тамары Герасімаўны, 1928 г.н.*

Ну, радня галосіць, спецыяльных людзей не было. Каб памыць, звалі, калі мужчына памірае, так мужчыну, а калі жэншчына, то жэншчыну звалі. Дзе крэст, там і астанаўліваліся, бо бацюшка моліцца. Калі напроціў хто едзе, транспарт тожэ астанаўліваецца, перад пакойнікам не едзе.

*Запісана ў в. Новы Сноў*
*ад Абрамовіч (Ярашэвіч) Станіславы Антонаўны, 1938 г.н.*

Пеўчых прывозяць, бацюшка памоліцца. Ёсць і людзі ў дзярэўні, каторыя спяваюць.

*Запісана ў в. Новы Сноў*
*ад Рацкевіч (Рак) Ніны Іванаўны, 1941 г.н.*

Мылі чужые людзі, родственнікам мыць нельзя, но як прыдзецца, то мыюць. Зеркала, сцёкла ў буфеце нада закрываць. У зеркале душа чалавека атражаецца. Астанаўліваліся каля крэста (ахоўнага на вуліцы ці каля вёскі), маліліс і ехалі дальшэ.

*Запісана ў в. Слаўкава*
*ад Макавец Чаславы Вітольдаўны, 1943 г.н.*

Абмывалі пакойніка. Даюць свечачку. Як мужчына памрэ, то мыюць мужчыны, ужо прамыюць, вытруць, адзяюць у чысценькае і ўжэ даюць мужчынам павячэраць. Старэйшыя звычайна мылі, маладыя не хадзілі. А як жанчына памрэ, так жанчынкі. У той самы дзень лажылі ў труну. Хавалі тады, як гаспадар з гаспадынькаю гатовы. Адну ноч абязацельна трэба, каб начаваў. А назаўтра ўжэ ж хавалі.

Памінаюць на сорак дзён. Дзевяці ў нас няма, цяпер ужэ ў каталікаў у трыццаць дзён. А як маладая дзяўчына памерла, што замужам

не была, то адзяюць у вянчальнае: фату адзяюць і белае плацецэ, і туфелькі. А як жаніх памрэ, то касцюмчык з кветачкаю.

Закрывалі зеркала, часы астанаўліваюць, радзіва выключаюць. Калі пакойнік ляжыць, то свет не выключаюць усю ноч. Пастароннія прыходзяць, малітвы гавораць, е спецыяльныя людзі, якія адпяваюць. Прывозяць з царквы то пеўчых, то бацюшку. У сорак дней адпраўляюць абязацельна, а ў католікаў можна не адпраўляць.

*Запісана ў в. Слаўкава*
*ад Халоп Марыі Аляксандраўны, 1933 г.н.*

Адно галасілі, як хавалі. Кажда галасіла, як хто ўмее. Галасілі, пра тое як жылі і як будуць жыць.

*Запісана ў в. Слаўкава*
*ад Шыкулы Яўгеніі Іосіфаўны, 1914 г.н.,*
*(раней пражывала ў в. Ракавічы Нясвіжскага р-на).*

Абмывалі пакойніка чужыя і старыя людзі. Зеркала закрываюць, часы астанаўліваюць. Незамужнюю, як памірала, адзявалі як хто мог. Кажды плакаў, як мог. З тых, хто галасіўзавываў, смяяліся. Суткі должан пакойнік пераначаваць. Дзевяць дней раней не атмячалі, сорак дзён атмячалі. У цэркву хадзілі і стол ставілі. І гадавіну ў нас атмячалі. Да трох дней, як памёр чалавек, нада ўсе яго вешчы памыць ці спаліць.

*Запісана ў в. Смалічы*
*ад Шчурскай Ірыны Мікалаеўны, 1935 г.н.*

Абычна пакойніка абмывалі старэйшыя. Каго папросяць, той і прыходзіць абмываць. Родныя труны не выносілі, абычна чужыя. На кладбішчы кажды плакаў, як мог. Закрывалі зеркала абычна простынькай ці палаценцам. Пераначаваць абычна адну ноч нада пакойніку. Незамужнюю адзявалі як маладую, а маладому кветачку прышпільвалі да касцюма. Дзяўчынцы вэлен клалі. На дзевяць дней у нас не паміналі, абычна шэсць нядзель шчыталі і на год паміналі.

*Запісана ў в. Сычэва*
*ад Бараноўскай Марыі Фёдараўны, 1926 г.н.,*
*(раней пражывала ў в. Карцэвічы Нясвіжскага р-на).*

Абмываюць пакойніка спецыяльныя бабкі, а як няма каму, то свая сям'я. Трэба, каб тры дні пакойнік дома быў. Труну выносілі спецыяльныя людзі, сынам можна было выносіць. Як незамужняя, то наражаюць у свадзебнае, фату адзяюць. Паміналі на сорак дней.

*Запісана ў в. Сычэва*
*ад Казей Валянціны Паўлаўны, 1930 г.н.,*
*(раней пражывала ў в. Засулле Стаўбцоўскага р-на).*

Бацюшку прывязуць. Пакойніка бабка мыла ці хто-нібудзь старэйшы. Незамужнюю адзявалі хто як мог. Пакойнік павінен начаваць у хаце два дня. Зеркала завешвалі, стаялі часы. Пакойніка ў нас у шэсць нядзель паміналі, а ў некатарых тры дні прайшло і паміналі. А ў нас, як шэсць нядзель прайшло, у цэркаў едуць.

*Запісана ў в. Сычэва*
*ад Комар Марыі Вікенцьеўны, 1941 г.н.*

Даўней пакойніка старыя абмывалі: калі сваякі, а калі і суседзі, як каго пазавеш, як хто каля каго жыве. Адну ноч пераначаваў пакойнік у хаце ды і ўсё. Паміналі на сорак дней і на гадавіну. Як маладога пакойніка, то з хаты выносяць друзья, родныя не выносяць. Як пакойнік у хаце – закрывалі зеркала і часы, каб не йшлі.

*Запісана ў в. Сычэва*
*ад Сандрос Вольгі Марцінаўны, 1929 г.н.,*
*(раней пражывала ў в. Андрушы Нясвіжскага р-на).*

Адну ноч абязацельна ў хаце нада пераначаваць. Мыюць чужыя бабкі. Мужчыны труну абычна выносяць, але не свае. Былі бабкі, якія галасілі. Успамінаюць пакойнікаў на сорак дзён, на дзевяць дзён многія не памінаюць. Абычна праваслаўныя празнуюць сорак дзён, а католікі – дзевяць.

*Запісана ў в. Сычэва*
*ад Юхноўскай Алены Антонаўны, 1935 г.н.,*
*(раней пражывала ў в. Малева Нясвіжскага р-на).*

Мыць пакойніка завуць каго-небудзь. Ваду трэба выліць, дзе не ходзіць ніхто. Зеркала прасціной засцілаюць і часы астанаўліваюць. Кажуць, што ўжо астанавілась урэмя чалавека, трэба каб астанавіліс і часы. А зеркала закрывалі, так траур у хаце, нашто каб яно свяцілася. Ветачкі кідаюць на дарогу. На вароты і на машыну елкі ставяць. Елкі таму што, кажуць, калючыя, як бяда ж. Да шасці нядзель яны стаяць.

*Запісана ў в. Карцэвічы*
*ад Цвірко Алены Пятроўны, 1941 г.н.*





Родныя ўсегда галосяць. Нябожчыка хавалі пасля абеда, у другой палавіне дня. Мыць нябожчыка некалі прыглашалі каго-небудзь, а цяпер не. В аснаўном мыюць свае. Памыюць трошку дэ й і ўсё. От мая падруга была памерла, то мы там з аднэю хадзілі, то мылі. Воду вылівалі дзе-небудзь не ў хадзячае места, дзе людзі не ходзяць.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Лепяцілы Ніны Уладзіміраўны, 1930 г.н.*

Зеркала завешвалі, астанаўліваюць часы, каб не атражаўся пакойнік. На сорак дзён і год варылі кашу, заказвалі панехіду, шлі ў цэркаў, ставілі свечы. Гавораць, што сорак дней душа жыве ў хаце. Галінкі па дарожке кідалі. Елкі ставілі на варотах. Пакойніку абычна ў рукі ложаць платок, а ў гэты платок у ўгалочку завязваюць манетку.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Акулік Марыі Уладзіміраўны, 1944 г.н.*

Калі чалавек паміраў, то завешвалі зеркала. Мыць нябожчыка маглі як родныя, так і спецыяльныя людзі. Тую ваду, што мылі нябожчыка, вылівалі пад плот або туды, дзе не хадзіў чалавек. Пасля таго як чалавек памрэ, яго душа яшчэ ходзіць па зямлі. Да мяне свякруха прыходзіла. Вось сплю я, а дзверы самі адкрылісь, чую ідзе і ветрам мяне пабудзіла. Я кажу: "Шо ты тут ходзіш? Не хадзі болей!" Тады мне саседка і кажа: "Вось устала я ўночы памачыцца, бачу, твая свякруха. Адкрыла дзверы і зайшла ў хату".

*Запісана ў в.Вайнілавічы*
*ад Кароль Ніны Вячаславаўны, 1927 г.н.*

Паміраў калі хто, то свечку ставілі. Памылі, прыбралі людзі не свае, суседзі. А потым бацюшку прывязуць, у хаце бацюшка памоліцца. Зеркала закрывалі, каб цёмна было мертвяцу. Ставілі труну на парог, калі выносілі пакойніка, а потым выносяць і дарогу пасыпаюць. Тады пасцель скоранька убіраюць, памыюць усё. Рвалі ёлачкі, на дарогу кідалі, яны там і разамнуцца, а тыя, што ў хаце, палілі, куды ж іх дзяваць. Шэсць нядзель душа не ўлятала. А тады ўжо ў цэркву ідуць, моляцца. Некаторыя і ў дзевяць дзён моляцца. А тады вячэру ім робяць, чарачку наліваюць і стаіць гэта чарачка ўродзе як пакойніку. Галасілі, прычытвалі па пакойніку, можа што ні так яму здзелалі, так каб прасціў. Па мертвяцу ставяць ёлачкі ў варотах. Як мертвяца ўжо хаваць будуць, ёлачкамі кідаюць, і каля кладбішча две ёлачкі стаяць. І ў дамах на варотах, і на кладбішчы. Дзярэўечкі, маленькія ёлачкі сякуць. Стаяць яны да шэсці нядзель.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Матус Яўгеніі Міхайлаўны, 1930 г.н.*

Калі чалавек памёр, то закрывалі зеркала і астанаўлівалі часы. Хавалі пасля абеда. Дзіцё як спала, дык будзілі. Трэба паднімаць, трэба, каб пакойніка правесці. Раней толькі паміналі ў сорак дней.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Сінькевіч Вольгі Віктараўны, 1927 г.н.,*
*(раней пражывала ў в. Каменка Нясвіжскага р-на).*

Закрывалі зеркала, астанаўлівалі часы, бо ўсё ж астанаўліваецца. Раньшэ гаварылі, што патрэбна хараніць пасля дванаццаці. Як дзіця спала, то клалі нож пад падушку. Кажуць, некалі дзевяць дней не адзначалі, сорак дней было тады. Прыглашалі каго з людзей, каб галасілі.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Шарапы Анастасіі Сцяпанаўны, 1933 г.н.,*
*(раней пражывала ў в. Каменка Нясвіжскага р-на).*

Як чалавек памірае, свечку запальваюць. У руку дасі, падзержыць ён трохі і памірае. Клалі зеркала, каб праверыць, памёр ці не. Часы астанаўліваюць, бо час яго закончыўся. Зеркала засцілалі чорным мацер'ялам, каб ужэ не бачыў чалавек там сябе. Елачкі рубяць, пасыпаюць па дарожцы. Елачкі ставяць у вароты, яны стаяць там шэсць нядзель, потым іх паляць. Мыюць пакойніка пажылыя, завуць каго. Ваду ў вугол вылліваюць, дзе чалавек не ходзіць.

*Запісана ў в. Карцэвічы*
*ад Крыўко Наталлі Мікалаеўны, 1934 г.н.,*
*(раней пражывала ў в. Малева Нясвіжскага р-на).*

Пакойнік павінен абавязкова пераначаваць дома. Адзін вот цэлы вечар бацькі маліліся там, плакалі. Аддавалі мыць чужым людзям мёртвага. І магілу з родственнікаў ніхто ні капаў, ні выносіў.

Ну, выносілі, як гавораць, упярод нагамі. Атрыбут пахарон – абязацельна ёлачкі, украшалі ўсё. Абязацельна каля каліткі две

ёлачкі ставілі і чакалі, покуль гэтыя ёлкі не прастаяць 6 нядзель, 40 дзён.

Мёртваму адзявалі ўсё чыстае. Хто-куды ваду вылівае, хто пад дзерава, хто-куды, туды, куды людзі не ходзяць. Пасля пахарон быў абязацельна памінальны стол. Усе, хто ўчаствавалі, ішлі назад дамой. Приходзяць, за жалобны стол садзяцца, у каждага на блюдзечкі булка з мёдам расцёртая, пасвенчана і першым павінны з'есці гэты канун. Выпівалі 3 чаркі, паміналі.

Ва время пахарон часы астанаўлівалі, зеркала закрывалі.

*Запісана ў в. Вайнілавічы*
*ад Запольскага Валянціна Валянціфавіча, 1957 г.н.*

Ёсць такія, што любяць і паплакаць. Родственнікі пакойніка не мылі. Чужыя няслі, а цяпер і ўнукі нясуць. Выносілі яго ўпярод нагамі. І кажуць, што вынеслі ўперад нагамі паследні раз з хаты. Сыпалі ялачкі (ёлачкі), дарожку рабілі.

*Запісана ў в. Вайнілавічы*
*ад Кіпець Тамары Рыгораўны, 1926 г.н.,*
*(раней пражывала ў в. Асмолава Нясвіжскага р-на).*

Абычна пасля абеда хаваюць нябожчыка. Зранку ў нас ніколі не хаваюць. А дзецям гаворащь, што не можна спаць. Трэба падняць іх.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Лях Марыі Сільвестраўны, 1943 г.н.*

На пахаванне сначала водку на стол не ставяць. Трэба было памаліцца і з'есці канон, потым водку ставяць на стол. Галоўнай страў былі шчы. У самым канцы падавалі кашу. Гаворащь: "Пасля кашы нету пашы". Ніхто не садзіўся больш за стол.

Нябожчыка радным мыць нельга. Мылі яго саседзі. Калі памерла жанчына, то мылі жанчыны, а калі мужчына – мужчыны. Калі нябожчык у хаце – трэба закрыць усе зеркала і астанавіць часы.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Аксак Ганны Мікалаеўны, 1952 г.н.*

Калі памрэ чалавек, тады трэба завесіць зеркала. Бацюшку паклічам, родствінікаў. І хароняць. Ветачкі яловыя рвалі і высцілалі дарожку, як няслі. Паставяць ветачкі на вароты і на кладбішчы. Выносілі нагамі ўперад, апускалі тры разы на парозе. У магілу кідалі манеты, кідаюць зямлю тры разы. Бацюшка памоліцца, тады начынаюць засыпаць.

*Запісана ў в.Лявонавічы*
*ад Кавальчук Аляксандры Паўлаўны, 1931 г.н.*

**Пахавальныя песні**

*О, все братия, мои сестры,*
*Вы по духу все родня.*
*Вы придите, посмотрите,*
*Жизнь закончилась моя.*
*Вы придите, посмотрите,*
*Господь чудо сотворил.*
*Летел ангел с неба божий,*
*Душу с телом разлучил*
*И с молитвою святою*
*До могилы он донёс.*
*И с прощальными словами*
*В могилу опустил.*
*Где упадут ваши слёзы,*
*Там же вырастит трава.*
*Я там буду спочивати*
*До всемирного суда.*
*О, вы, братия мои, сестры,*
*Сжальтесь надо мною,*
*Просите Бога со слезами,*
*Со святыми упокой.*

***

*Мама – это имя мне мило,*
*Полно оно ласки, любви.*
*Мама на руках нас носила*
*И нас охраняла в любви.*
*Мама, сколько ты пережила,*
*Мама, сколько скорбей несла,*
*Нас ты берегла и хранила,*
*Мама дорогая моя.*

***

*Поминайте братья, сестры,*
*Поминайте всякий час.*
*Только Ваше поминание*
*Облегчает всех тут нас.*
*Поминате хлебом, солью*
*Вы с любовию меня*
*И простите, в чем виновен*
*Может быть пред вами я.*
*Прошу, чаще поминайте.*
*Меня, милая семья.*
*Я служил вам безотказно,*
*Не забудьте вы меня.*
*Приходите чаще в церковь,*
*Все души ждут вас там*
*И с отцом духовным вместе*





*Вымолите милость нам.*
*И не страшно, что от света,*
*Я навечно отошёл.*
*Только страшно, что с грехами*
*Я и к Господу пришёл.*
*А теперь, мои родные,*
*Предстою я перед ним,*
*Прошу у Господа прощения*
*Со святыми упокой.*
*Не скорбите, братья, сестры,*
*И не плачь, моя семья.*
*Всех я встречу вас, поверьте,*
*Все вы смертны, как и я.*
*Аминь.*

*Запісана ў в.Альбянка*
*ад Шумейка Таццяны Антонаўны, 1931 г.н,*
*(раней пражывала ў в. Малева Нясвіжскага р-на).*

Калі чалавек умер, нада завешываць зеркала, каб не відна была атражэння пакойнага. Каля вушэй нада ставіць уксусную цэльсію.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Шуковіч Галіны Міхайлаўны, 1946 г.н.*

Пают пеўчыя. Яны абычна пают у цэркві. У нас есць такія жэншчыны пеўчыя, іх прыглашают, кагда ўмірает чэлавек. Как умер, яны прыходзят к вечэру. Моют пакойніка прыглашонныя людзі. Еслі мужчына, то саседзеймужчын прыглашают, яны моют его і адзяваюць, в гроб ложат. Гроб выносят чужыя людзі, так паложэна.Усе сваі ідут за гробам. Пеўчыя пают, кагда нясут гроб. Нельзя ідці навстрэчу, усе астанаўліваюцца і ждут, пака не прайдуць з пакойным.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Шуковіч Галіны Міхайлаўны, 1946 г.н.*

Праходзіла пахаванне як абычна. Відзяць, еслі чалавек вот-вот должэн умерэць, то чыталі малітву. Еслі ён мучаўся, і свечку давалі ў руку. Вокны закрывалі, завешывалі зеркала белай тканінай, каб пакойнік не бачыў свайго атражэння. Песні пелі ўхадзяшчыя, загробныя.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Васільевай Валянціны Уладзіміраўны, 1952 г.н.*

Сядзець трэба з труной, каб не было скучна пакойніку аднаму. Цэлую ноч гарыць свет.

*Запісана ў в. Грыцкавічы*
*ад Заяц Станіславы Івананаўны, 1944 г.н.*

Когда умирал человек, ставили свечку, иконы, скрываются зеркала обязательно, абсолютно снимается и всё отражающее, потому что считается, что можешь увидеть там образ. Потом ни в коем случае нельзя оставлять гроб один, обязательно кто-то должен быть. За гробом идут естественно самые ближайшие родственники. Ёлки обязательно вешают, ставят на входе калитки, по бокам. Могли цветами посыпать дорогу, для того чтобы дорога была мягкой, как бы ступать, переходить человеку было лучше.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Купцовай Наталлі Віктараўны, 1978 г.н.*

Памрэ мужчына – мылі мужчыны. Зразу ў труну не клалі, клалі на тапчан. У труну клалі, калі выносілі. Маліліся і галасілі хто як. Калі праносяць праз парог, 3 разы апускаюць у хаце і калі на двор – то прашчающца з парогам. Хадзілі ў царкву на шэсць нядзель і год. Памінаці памёрлага на Радаўніцу, Дзяды.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Гадун Ядвігі Уладзіміраўны, 1929 г.н.,*
*(раней пражывала ў в. Лесуны Нясвіжскага р-на).*

Каб аблегчыць мукі паміраючага, усягда клікалі бацюшку. Бацюшка іспаведаваў, прычашчаў, ну, памоліцца і ў скорасці забірае Бог яго туды, на небяса. Як рана чалавек памёр, то ноч пераначуе і назаўтра яго хаваюць. Хто ўмее плакаць, той плакаў.

Пасля пахарон на трэці дзень прыходзяць у цэркву, на дзявяты і на саракавы. Ну, вот мне казалі, што гэта дваццаць другога марта ёсць сорак мучанікаў – такі прысвятак. І вот за гэтым і сорак дзён адзначаюць. Таму ж вось, як бачыш, і саракагоддзе дома не адзначаюць.

Мыў памерлага нехта чужы, сусед там ці суседка. Як мужчына памёр – мужчыну звалі, як жанчына – жанчын звалі. І свае памагалі.

Як апусцілі ў яму, як бацюшка памаліўся і тры разы накрэст кінуў пясок, і тады ўжэ ўсе кідаюць пясок тры разы. Радныя не кідаюць. Радныя некалі капейкі кідалі.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Чычко Соф'і Рыгораўны, 1934 г.н.*

Ну, як паміраў мужчына – мужчынаў прыглашалі памыць, а другі раз і бабаў прыглашалі. На табурэтку пакойніка садзілі, дзе на лаву лажылі, дзе на стол. Раней не

накрывалі кружэвамі. І бяруць і выносяць с хаты вон нагамі.

Ужэ як прыязджаюць з кладбішча на памінкі, то абязацельна скацерць наізнанку засцілалі – пячальна. Блюда, якія рабілісь, не ўкрашалісь. Калі канчаюць, выходзяць са стала, то дзякуй не гавараць.

Назаўтра радня ідзе на кладбішча, а патом ідуць снедаюць. І на дзевяты дзень пасля пахарон ідуць.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Халецкай Яўгеніі Іванаўны, 1932 г.н.*

Калі памрэ, то клічуць суседзяў, а некаторыя самі мыюць. На могілках свае землю сыплюць. Паміналі ў дзевяць дзён, у сорак дзён, у год.

*Запісана ў в. Малева*
*ад Верамеевіч Яніны Дзмітрыеўны, 1938 г.н.*

Як мужчына памірае, то заўсёды клічуць памыць мужчыну. Трэба, каб мёртвы паляжаў часоў два на том месцы, дзе ён скончаўся. Тады адзяюць і кладуць на лаву. Патом звалі жанчыну, якая ўмела гаварыць малітву, а тады сазываюць блізкіх. Трэба, каб пакойнік абязацельна пераначаваў у сваёй хаце. Пасядзяць каля пакойніка, а затым хаваюць. На парозе тры разы паднімуць труну, папрашчаюцца і нясуць далей. Апусціць бацюшка труну, лапаткаю кідае тры разы зямлю на гроб. І тагда хто радня, то капейкі кідалі некалі, а цяпер шчапотачку зямлі трэба кінуць.

*Запісана ў в. Малева*
*ад Каладзінскай Валянціны Фёдараўны, 1931 г.н.*

Мыць нябожчыка звалі пастаронніх, саседзей. Могілкі наведвалі абавязкова на Вялікдзень. У нас очань многа тады народу.

*Запісана ў в. Малева*
*ад Ігнатчык Валянціны Усеваладаўны, 1941 г.н.*

Мылі памерлага абычна самыя старэйшыя людзі. Як чалавек ішоў, так труну і выносілі – нагамі ўперад. Труну на парозе не спынялі.

*Запісана ў в. Нялепава*
*ад Болтуць Станіславы Адамаўны, 1947 г.н.*

Памерлага мылі і апраналі чужыя людзі, пасля ваду вылівалі на крыжавыя дарогі. Закрывалі зеркала і астанаўліваюць часы. Труну выносяць пастароннія людзі. Хавалі на трэці дзень. Душа на зямлі знаходзіцца сорак дней, гэта праўда.

*Запісана ў в. Грыцкавічы*
*ад Кандрацюк Антаніны Сцяпанаўны, 1939 г.н.*

Былі спецыяльныя жэншчыны, якія галасілі. Звалі саседзей, каб прыйшлі памыць. Мужчыну мужчына мыў, жанчыну – жанчына. Галоўнае, каб не родственнікі былі. Калі выносілі труну, на парозе спыняліся. Калі сустракаўся чалавек на дарозе да могілак – абавязкова спыняўся. Сорак дзён абавязкова адзначалі. Гэта ў цэркву ішлі, свечку ставілі. На Вялікдзень некалі на могілкі хадзілі, не было раней Радаваніцы. Гэта цяперака ўвялі.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Церахавец Уладзіславы Францаўны, 1938 г.н.*

Сначала памыюць пакойніка, адзенуць харашэнька. Некалі ж не клалі адразу ў гроб, а клалі на спецыяльную лаўку. Прыбіралі харашэнька гэтую лавачку. Ставілі гэтую лаўку галавой у Красны ўгал. У Красным углу стаіць лампадка і свечачкі. Запальваеш лампадачку і свечкі, і гараць яны цэлую ноч. Вечарам прыходзіць бацюшка, моліцца. Пасля бацюшкі пеўчыя прыходзяць. А назаўтра тожа пеўчыя прыходзяць, паюць. І ўжо направаслаўнаму хароняць на трэці дзень. Бацюшка прыходзіць, моліцца і асвяшчае гроб. Гроб свянцоны, кладзецца на зелье. У гроб ложаць расчоску і палаценца. Бацюшка памоліцца, папасвеціць гроб, і тады ўжо ложаць чалавека ў гроб. Із ежы некалі варылі капусту, боршч варылі, а цяперачы не робяць. Некалі не сядзелі доўга за сталом. Выпілі чарачку, памаліліся, другую чарачку выпілі, трэцюю выпілі, памаліліся, пакланіліся ды пашлі. Яшчэ канон рабілі. Калі чалавек уміраэ, на стол ставіцца булачка хлеба, солька і канон. І бацюшка, калі адпявае, асвечвае гэты канон. Ужэ як пахароняць, дастаюць канон. Водка не ставіцца на стол, пакуда не скушаюць канона. Канона давалі па тры разы.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Дзянішчык Неанілы Ільінічны, 1937 г.н.*

Нябожчыка апраналі ва ўсё новае. Катэгарычна забаранялася, каб у адзежы памерлага хоць бы прысутнічаў чырвоны колер, гэта магло "пацягнуць" за сабой яшчэ адну смерць кроўнага сваяка. Памерлую незамужнюю дзяўчыну апраналі ў шлюбны ўбор.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Скрыцкай Марыі Аляксандраўны, 1940 г.н.*

Галасілі мы заўсёды самі, нікога не звалі. Хто як умеў, так і галасіў. Мужчына мужчыну абычна мыў, пажылыя мужчыны мылі. Труна выносілася нагамі ўперад. Выносілі і на пароге труну тры раза на парог спускаюць. Абязацельна эта нада для предания к земле. Нябожчыка абычна харанілі на втарой дзень. В завісімаці ад пары года. Калі жарка, то дзе ж яго дзяржаць?! А зімой можна было тры дня падзяржаць.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Падгайскай Вольгі Дзям'янаўны, 1930 г.н,*
*(раней пражывала ў в.Лань Нясвіжскага р-на).*

Памрэ чалавек, памыюць. Тады паклічуць каго памыць: мужчына памрэ – мужчына мые, жэншчына памрэ – жэншчына мые. Паложаць, тады хазяін кліча. Колькі мужчын ідуць, робяць труну. Да трох часоў ночы дзелаюць, сені бальшыя, у сенях робяць. Запаляць святло. А назаўтра ідуць на кладбішча, вядзе гаспадар. Запросіць бацюшку. Загаворваць з бацюшкай, калі той можа прыехаць да хаты выправадзіць памерлага. Бацюшка прыходзіць у цэркаў. Адкрывае цэркаў. Тры разы зазвоняць у званы і тады ідуць капаюць магілу. І тады бацюшка на сваім кані едзе. Гэтага пакойніка вынясуць цераз сяло на плечах, а тады на воз ставяць і завязуць. У цэркаў занясуць, яшчэ там памоляцца. Вынясуць, закапаюць і прыедуць назад. На вячэру паставяць бутылачку водкі, тры разы паднімаюць чарку, па кусочку хлеба дадому занясуць. Галасілі дзеткі, жонка, родствінікі, а чужыя не галасілі. На саракавы дзень галасілі. На Дзяды ідуць у цэркаў, тожа вячэраюць. На Дзяды трэба 12 страў зварыць (посных і няпосных). Калі павячэралі, усё на стале астаўляецца.

Родныя свае ўстрайвалі галашэнні. Ужо і казалі, і клікалі, усяк было. Мыць нябожчыка звалі суседаў. Калі мужчына памрэ, то мужчыну звалі мыць, а калі жанчына, то звалі жанчыну. А як мой муж памёр, то сястра двайродняя прыйшла, яна і памыла, і адзела яго. Пад труну ставілі міску з вадой, каб вельмі не распухаў.

*Запісана ў.в. Лявонавічы*
*ад Хаванскай Ірыны Адамаўны, 1946 г.н.*

Нікога не звалі, каб галасілі, былі толькі самі, сваі радные. У нас не прычытаюць, проста галосяць, плачуць. Кажды, як хто казаў, сваё выражае. Бацюшка памоліцца над ім і ўсё. Ну, кажды, як хто казаў, плача: ты па сваём, я па сваём. Плача ды ўсё.

Сваі мылі і апраналі нябожчыка. От бацька наш памёр, мы самі яго мылі, браты там яго дваюрадныя.

Пад труну ставілі ваду, магніт, штоб адцягваць ад яго ўсё, каб не ваняў. Мы вот дажэ воду ставілі ў ванну, магніт лажылі. Кветкі само сабой. Проста ано адцягвае эту тухляціну ўсю.

У нас еслі выносяць, дапусцім, адзін хтота астаецца ў доме. Нада ўслед прамыць, значыць, усе палы, яны хоць і чыстые, но шмаргануць так вадой са швабры, трошка где-та, што-та. А еслі, гавораць, пакойніка нясуць, хочаш на лаву садзіся, каб рукі там не балелі ўжэ. З клабішча прыдзеш, рукі мый.

Люстэркі ў хаце закрывалі. Часы астанаўліваюць. Сабаку ў сарай закрываюць. Рукі мыюць усех. Лапкі вот этыя з ёлачкаў ставяць, штоб не вярнуўся, значыць, дух да хаты апяць.

Еслі, дапусцім вот, пакойніка вот мыеш і знаеш там дзе ўсё. Бачыш: еслі ў яго вот рукі слабенькія, дак гавораць, значыць, што хто-та апяць памрэ, можа свой, можа не свой, можа хто-та з сяла. А еслі яны ўжэ такія рукі як рукі, крэпкія ўжэ, так ужэ вродзебы ўсё добра будзе.

Быў адзін гаспадар, значыць, памёр бацька мой, дзед наш. І от он ёй сніўся кажды дзень. Ён гукаў яе ўсё врэмя. От дзе ён ляжаў быў, а яе комната была другая. А ён кліча: "Наташ!". А яна не агукваецца ўсё роўна. А я пыталася, а некаторыя кажуць: "Не агуквайся, нельзя агуквацца!" Я разоў два агуквалася, казала: "Оў!" Патом сказалі нельзя, еслі будзеш агуквацца, забярэ з сабой, хоча, каб скарэй забраць. Туда ўжо забраць хоча скарэй з сабой.

Калі сніцца нябожчык і нешта просіць, то нельзя нічога даваць яму ва сне. А калі ён табе што-та дае, то можна браць, то гэта гавораць, што добра. От еслі дапусцім кліча з сабою, ужэ ніколі не трэба ісці за ім. Ён заве цябе, нада абычна прамаўчаць, і ён скрыецца там.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Шынгель Наталлі Віктараўны, 1930 г.н.*

Вось, адныя, калі галасілі, казалі словамі:

як добра жылі, да тое-да тое, як хто ўмеў гаварыў, а я не маўчала і плакала.

Калі нябожчык быў у хаце, пад труну ставілі міску з вадой, магніцікам. Гэта рабілі для таго, каб ён не порціўся. Ну, каб не разложваўся. Дажэ магніт пад паху кладуць.

Некалі нябожчыка мылі самі. Можа, хто яку бабачку пазавёт. У нас была такая бабуля. Ваду гэтую дзявалі тамака, дзе ніхто не ходзіць. Цераз яе, гавораць, не можна хадзіць. От лілі ў то месца, каб ніхто не хадзіў. За сараем, ці дзе так, не вылівалі абы куды, калі памыюць нябожчыка.

Труну выносілі чужыя людзі. Па дарозе на могілкі ідзе ксёнз, спявае і людзі спяваюць. Як памрэ, пасадзяць, прывязуць ёлку. Ну, у дзверы ў вароты паставяць. А тады насякуць ёлкі, ідзе чалавек і сыпле. Самы першы пасыпае. У нас на могілках усякіх страў не было, усе дадому ехалі. Калі прыехалі да-дому, на стале ўсякая страва была: мяса, і тушана, і варана, усё на свеце, каб усё смашна было. Людзі ядуць і водку п’юць.

Там, дзе нябожчык сядзеў, пакідаюць чарку водкі, яна доўга стаяла. Калі памрэ, у хаце ўсе люстэркі закрывалі, не пасвяціўся ён у люстэрку.

Пахавальныя галашэнні ад памінальных не адрозніваліся, бо як харошы чалавек, яго ўсегда шкода.

На Радуніцу прыбіраюць магілкі.

*Запісана ў в. Альбянка*
*ад Валчок Сафіі Ігнацьеўны, 1935 г.н.*

Радаўніца – то ў рускіх, мы-то польскія, мы не ходзім. Ёсць Дзяды… во ідом на могілкі, то ў рускіх, а ў нас ужо, мы кажам, “усе святыя”. Гэта ў нас 2-га наябра, а 3-га мы ідом на могілкі, кажды ідзе на сваю магілу: братоў, сёстраў сваіх, хто ў каго пахаваны. Прыбіраем, но не ў той дзень, мы раней, мо, за тыдзень. Ідом, прыбяром, і каждаму мы ўжо становім свечку, а ўжо перад Вялікаднем усягда купляем букецікі і ідзем на могілкі. Раней на хутары ў нас хадзілі на могілкі і спявалі песні касцёльныя, а цяпер не, бо памерлі тыя, хто спяваў.

*Запісана ў в. Слаўкава*
*ад Драздовіч Яніны Браніславаўны, 1947 г.н.*

Галасілі на пахаванні. Памрэ, і зразу крычаць, галосяць, звярталіся такімі словамі: “Міленькі, родненькі мой, сонейка маё, каб ты ўстаў, адкрый вочкі, што ты закрыў, дзеткі ж кругом цябе, а ты ляжыш, паглядзі, сколькі родных каля цябе, госці прыехалі, а ты не сустракаеш. Ты ж быў гасцепрыімны, а сёння ты не сустракаеш іх, чаго ты зазлаваўся? Прасці нас”. Выносілі труну з хаты. Як выносяць чэраз парог, тры раза труну нагінаюць і стукаюць тры разы, т.е. чалавек развітваецца з тым месцам, дзе ён жыў, дзе ён быў. За ім выносілі ўжо пасцель, дзе і на чым ляжаў. Выносяць родныя і блізкія, крычаць і галосяць. Ставілі міску з вадой пад труну, штоб чалавека не раздувала, штоб не сінеў, ставяць воду, каб яна адцягвала кроў, капейкамі прыкрывалі вочы, каб яны не адкрываліся, і магніт падкладваюць у труну або пад труну. Каб рот не адкрываўся, падвязвалі хусткай, рукі і ногі звязваюць, каб не разышліся. Калі гадавіна была, ідуць у царкву, а потым на могілкі, і галасілі. Апраналі так: калі мужчына памрэ, то бралі мужчыну, а калі жанчына, то жанчыну, старых людзей бралі, маладых жа не бралі. Памылі, перадзелі. Раней чалавек ляжаў спачатку на лаве, і раней хавалі на трэці дзень, не так як зараз, сёння памрэ, а заўтра хаваюць.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Гурко Марыі Адамаўны, 1945 г.н.*

***

*О, Божа мой, Божа мой мілы,*
*Як хочацца жыці мне,*
*Но смерць забірая, всё трэба кідаці*
*І быці сырой мне земле.*
*Ой, Божа, мой Божа, з высокага неба*
*Пачуй ты малітву маю,*
*Вазьмі маю душу да сябе на неба,*
*А цела ў сырую зямлю.*
*Насыпце на мяне высоку магілу,*
*Яна вся травой зарасце,*
*Садзіце на яе чырвону каліну,*
*Ана па вясне зацвіце.*
*Там будуць да мяне пціцы прылетаці*
*І будуць мне песні спеваць.*
*А я не пачую, бо буду лежаць*
*У глыбокай магіле сырой.*
*Магіла глыбока і хата малая,*
*І выхада з яе няма.*
*А я, сіраціна, як в полі быліна,*
*І там буду лежаць я адна.*
*Калісь мае ногі па свету хадзілі,*
*Тамлення не зналі ані.*
*Калісь мае рукі так цяжка рабілі,*
*А ныне на грудзі ляглі.*
*Прашчайце мне, дзеці, і браце, і сёстры,*
*Бо я атхажу ўжэ ат вас.*
*Дарога шырока, магіла глыбока,*
*І я не вярнуся да вас.*
*Прашчайце, радныя і родная хата,*
*Все блізкія саседзі мае,*
*Вы будзеце жыці на беламу свету,*
*Я буду ў сырой зямле.*

*Запісана ў в. Альбянка*
*ад Шумейкі Таццяны Антонаўны, 1931 г.н.,*
*(раней пражывала ў в. Малева Нясвіжскага р-на)*

Калі паміраў у хаце чалавек, то завешвалі зеркала просцінай, каб ліцо не адбівалася ў зеркале.

Мая свекроў была памерла, а я стаю. Наліваю ў талерку супу. А мама майго мужа нежывая. Паклікала я сваю маму, а яна кажа: “Прынясі падсвечнік, што мне падруга прынясла!” А я гавару: “Добра, мама”.

Мама падыходзіць да свякрухі і нясе падсвечнік на стол. Запаліла свечку, далей былі пастаянна смерці. Спачатку мама памерла, а цераз год сястра, бацька, муж, сын. Душа ешчэ на зямле 40 дзён.

Дзе ляжаў нябожчык, на стале, то трэба было булачку хлеба палажыць, а патом её скаціні аддавалі. Ставілі пабакам ёлачкі.

*Запісана ў в. Альбянка*
*ад Гібчык Юзэфы Францаўны, 1931 г.н.*

Былі такія, што павесяцца. Бацюшка такіх не хароніць. Бабы, што спяваюць, дык праспяваюць. Плакальшчыкаў у нас не было, не нанімалі. У нас няма гэтакіх. Пахаранілі вісельніка не на кладбішчы, за кладбішчам, там быў у нас як роў выкапаны.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Галабурды Яўгеніі Уласаўны, 1934 г.н.,*
*(раней жыла ў в. Асмолава Нясвіжскага р-на).*

Калі паміраў чалавек, у хаце занавешвалі ўсе люстэркі, столік стаіць са свечкай ды і ўсё. Нельга плакаць у труну, бо пакойнік у вадзе будзе ляжаць.

*Запісана ў в. Кіркаўшчына*
*ад Роўбы Тамары Емяльянаўны, 1938 г.н.*

Калі чалавек сябе ўбіў, яго хароняць не на кладбішчы, а за ім, там, на рву, бацюшка такіх не адпяваў. Калі паміраў чалавек, яму ў рукі ставілі свечку, звалі бабак, яны абмывалі яго. Нельга было плакаць у труну, бо сніцца будзе. У труну клалі памёршаму капейку на дарогу. На трэцці дзень на магілку ідуць. Снедаюць, бяруць чарачку, снеданне бяруць. У хаце на стол ставяць свечачку, ды трэба, каб сорак дзён яна стаяла. Калі выносяць труну, у паследнія дзверы прыпыняюцца і тры разы стукаюць аб парог.

*Запісана ў в. Малева*
*ад Шах Зінаіды Антонаўны, 1928 г.н.*

Даюць свечку пакутніку ў рукі. Можна было сваім абмываць. Потым адзенуць, палажаць. У гроб адзенне памершага паложаць. Тры разы аб парог білі, калі выносілі. Калі памерлага вязуць, а ў хаце спіць малое дзіця, то малому каля галавы ложаць грабенчык або рашчосачку. Ваду, калі памылі, з памерлага выліваюць на двор, дзе не ходзяць людзі. Занавешвалі люстэркі на два дні. Нельга плакаць па пакойніку, бо будзе ён у вадзе, плоха яму будзе. Калі памёр чалавек, ня можна чокацца. Каля іконы ставяць ежу, чарачку, запальваюць да дзевяці дзён свечачку.

*Запісана ў в. Малева*
*ад Акулік Галіны Уладзіміраўны, 1947 г.н.*

Калі паміраў у хаце чалавек, варылі куццю з зерня з мёдам. Яна была посна. Калі памрэ чалавек, то сваі яго абмывалі, адзенне выкідвалі. Абмывалі свянцонай вадой. У труну жанчыне клалі – грэбень, мужчыне – трубку. Пахавальны крыж бралі ў цэркві. Нельга пераходзіць дарогу, калі вязуць нябожчыка. На другі дзень прыходзілі на кладбішча, рассцілалі скацерць на магіле. Трэба было тры разы кінуць у магілу зямлі, каб не сніўся пакойнік.

*Запісана ў в. Нялепава*
*ад Сафівулінай Еўфрасінні Васільеўны, 1941 г.н.,*
*(раней пражывала ў в. Вароніна Сібірскай вобл).*

З кладбішча, калі пахавалі нябожчыка, прыносілі елачкі і ставілі каля парога.

*Запісана ў в. Нялепава*
*ад Буйко Таццяны Аляксандраўны, 1923 г.н.,*
*(раней пражывала ў в. Пагарэльцы Нясвіжскага р-на).*

Гроб няслі мужчыны, блізкія шлі за гробам, знакомыя спераду няслі вянкі і хрэст. Заўсёды звалі свяшчэнніка, той прыходзіў, каб яго адпець.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Калошы Марыі Ігнацьеўны, 1924 г.н.*

Калі хтосьці памірае, мерцвяка нельга пакідаць адным, з ім павінен хто-та быць заўсёды. Памерлага моюць родзічы. На трыццаты дзень пасля пахавання молюцца. Ставілі свечку ў банке з крупою.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Коканавай Алены Вікенцьеўны, 1940 г.н.*

Калі ноччу памірае чалавек, дарослага трэба разбудзіць, а малому ў калыску падкласці нож. Пакойніка абычна моюць спецыяльныя бабкі. Калі бачаць, што чалавек памірае, запальваюць грамнічную свечку. На пахаранах павінны яму капаць знаёмыя людзі. У магілкі кідаюць манеты для продкаў. На дзявяты дзень, дзясяты, саракавы і на гадаўшчыну пасля пахарон маліліся ў царкве.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Клышка Наталлі Яўгенаўны, 1973 г.н.*

Кагда вынеслі гроб, нужно перевернуць табуреткі ножкамі ўверх. Нужно пастучаць аб парог, кагда выносят пакойніка, чтобы прінял тот мір. Нужно бросіць манеты в магілу, счітаецца, што кідаеш блізкім родственнікам.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Габрыновіч Людмілы Мікалаеўны, 1952 г.н.*

Мыць нябожчыка маглі або бабы чужыя, або мужыкі. Неслі на могілкі труну моцныя мужыкі. Калі ўсе шлі па трасе, нельга было абганяць народ з нябожчыкам.

*Запісана ў в. Альхоўка*
*ад Вальчык Анастасіі Іванаўны, 1927 г.н.*

Адзявалі нябожчыка ў чысценькае абязацельна, аббівалі трунку любым мацер'ялам, хто чорным, хто бардовым, аббівалі ўнутры. А як труну апускалі ў магілку, родныя накрывалі яе адзеялам. Такі быў абычай.

Раней наймалі галашэльнікаў у дом, каб яны галасілі. Потым закапалі і прыехалі дадому на памінальны стол. Потым спачатку чыталі малітву "Отчэ наш…", а потым "Цару небеснай, уцешыцель дух ісціный. Вездзе находяшчыйся і всё наполняюшчый. Істочнік всякого блага. Прыйдзі і ўсяліся ў нас і ачысці нас ад усякіх грэхоў. І спасі благія душы нашы. Госпадзі Ісусе Хрысце. І сыне божем. Малітвы радзі, Прачыстае маці тваёй і усіх святых, памілуй нас. Амінь".

Былі розныя стравы: мяса, бульбу тушаць, а апошняе ўжо даюць капусту. Тады вячэра закончана. На 9 дней збіраліся таму, што яшчэ дух абітае ў хаце, а патом 40 дней – саракавіны.

*Запісана ў в. Казлы*
*ад Рабко Фаіны Антонаўны, 1942 г.н.*

Галасілі блізкія людзі. Завешвалі зеркала ўсе, штоб не асталася атражэнне мярцвіца. Калі мужчына памёр – звалі мужыкоў такога ўзросту, як і ён. Яны яго мылі і адзявалі. А калі жанчына, то гэта рабілі ўсё жанчыны. Прачытаюць малітву і свечку запаляць. Ставяць бутылку і частуюць. Секлі абязацельна ці авечку чорную ілі куру чорную або пеўня, для таго, каб па хазяйству было ўсё нармальна. Калі мярцвіца выносілі з хаты, то адкрывалі хлявы, штоб на месці ўсё засталося. Гаварылі: "Ты ўходзіш дык забірай сваё ўсё, а маё не трогай, маё будзе маім".

Адзенне выбіралі для памерлага цёмнае. Жанчыны жанчынам клалі тое, што клалі ў цэркаў. Некалі, як хадзілі ў цэркаў, у маёй мамы быў фартушок пашыты, юбка і кофтачка. Яна гэты нарад нікуды болей не адзявала, і яе ж пахаранілі ў гэтым.

А для мужчын была рубашка чыстая і брукі. А ногі анучачкамі белымі абкручвалі, штоб не голая нага была. Тапкі не адзявалі. Адразу труну аббівалі палатном у сярэдзіне, бо зверху нельзя было. А потым абоямі аббівалі, бумага шалясціць, калі пакойнік будзе варочацца. У сярэдзіне аббівалі белым сітцам, а снаружы – чорным сітцам. Родныя ніколі зямлі не кідаюць, бо яму там цяжка ляжаць будзе. Лучшы грошы кідаць, т.е на дарогу. На 40 дзён хадзілі ў цэркаў і адпявалі. У 9 дзён усё рабілі дома, у цэркаў не хадзілі. 9 дней азначала тое, што душа яшчэ да 40 тут. Адна жанчына расказвала, што да 6 нядзель прылятала пташачка і стукала ў акно. Самагубцаў не хавалі на могілках, а з краю. Бацюшка іх не асвяшчаў. Дажы малітваў не гаварылі. Еслі ты будзеш малітву гаварыць, то ты ўсё бярэш на сябе. Для таго, каб выйсці з такога састаянія, патрэбна кожную нядзелю хадзіць ў цэркаў і маліцца Богу, даваць за ўпакой, а то яно можа перайсці з пакалення ў пакаленне.

*Запісана ў в. Смалічы*
*ад Міронча Ірыны Пятроўны, 1936 г.н.*





***Вольга Ізотава***

## СІМВОЛІКА ТРАДЫЦЫЙНАГА ВЯСЕЛЬНАГА АБРАДАВА-ПАЭТЫЧНАГА КОМПЛЕКСУ НЯСВІЖСКАГА РАЁНА

Беларускае вяселле, ці то вясельная абрадавая дзея, песня, прыказка, загадка, было раней напоўнена глыбокімі знакавымі сэнсамі, зразумелымі для кожнага. І гэтае культурнае поле з яго складанымі сімвалічнымі сувязямі вызначала паводзіны жаніха і нявесты, іх бацькоў, дружыны, сваякоў, вясельных гасцей і аб'ядноўвала іх у адзіны соцыум і шырэй – адзіную этнічную супольнасць – народ.

### Сімволіка абраду пасада

Старэйшыя носьбіты фальклорнай традыцыі яшчэ памятаюць аб вялікім значэнні, якое надавалася на вяселлі пасаду, бо паўсюдна лічылася, што цнатлівыя маладыя прыносяць у сваю сям'ю шчасце, і наадварот, страта цнатлівасці да шлюбу магла стаць прычынай няшчасцяў і іх саміх, і блізкіх ім людзей.

Пасад вельмі выразна раскрывае выключны статус маладой, бо садзіцца на дзяжу любому чалавеку – такое для вяскоўца было справай недапушчальнай: "Хто ж это сядзе на дзяжу, дзе хлеб?! Вавек жызьні ніхто нідзе! А гэта ж нявесту, што яна чэсная, чыстая" (Еўдакія Хвошч, 1925 г.н., в. Вялікая Ліпа, запіс зроблены Тамарай Варфаламеевай) [3, с. 469].

Акрамя сімволікі інфармавання аб цнатлівасці і прадуцыравання шчасця, плоднасці і багацця (сядзенне на хлебнай дзяжы на вывернутым поўсцю ўверх кажусе), абрад пасада выяўляе выразныя лімінальныя матывы, г. зн. матывы пераходу ў іншую сацыяльную групу, змены сацыяльнага становішча маладых (звычай падпальваць валасы маладой). Цікава, што абрад падпальвання валасоў называлі "падстрыжэнне", што, безумоўна, паказвае як на яго старажытныя карані, так і на тое, што раней валасы на самой справе падстрыгалі. Так, па ўспамінах інфарматара Марыі Шусты, 1940 г.н., ураджэнкі в. Касмовічы, маладую перад вянцом садзілі на дзяжу і "падстрыгалі": "расчоскаю" расчэсвалі так во валосікі, а патом свечкаю падпальвалі тры разы так, у трох месцах, ікону абносілі кругом, і спявалі ўжэ песні. Раньшэ на дзяжу садзілі, як пачынаецца свадзьба, як пад вянец. Там, мусіць, і падушка дажэ была: дзяжа, патом падушка і кажух".

У в. Малева "ставілі дзяжу, лажылі кажух і тады садзілі маладую на пасад, а тады "падстрыгалі": кругом свечкаю абводзілі тры разы, зразу на лобіку валасы падпальвалі (свечкаю падсмальвалі), а тады тут каля вушэй ужэ. Пасля пасада ўжэ і вяселле начыналася" (Наталля Крыўко, 1934 г. н., ураджэнка в. Малева, запіс зроблены Вольгай Ізотавай).

### Сімволіка пасагу

Сярод сімвалаў вясельнай абраднасці адно з важных месцаў належыць пасагу. Інстытут пасагу існаваў з самых старажытных часоў, насіў назву "вено" ці "кграда". Звычайна гэта быў пасаг нявесты, якім яна магла распараджацца на працягу свайго жыцця. Але і за жаніхом бацькі давалі пэўныя матэрыяльныя каштоўнасці. У сямейнай абраднасці пасаг сімвалізаваў яднанне эканамічнага жыцця, маёмасці двух родаў, якую набылі бацькі маладых у няспынных турботах і працы.

Выгаднай нявестай лічылася дзяўчына, якая мела багаты пасаг: вялікі надзел зямлі, карову, хату, грошы. За дзяўчынай давалі таксама авечак, парасят, хатніх птушак. За хлопцам давалі каня, надзел зямлі, часам хату, але за дзеўкай звычайна давалі больш. У в. Вялікая Ліпа, паводле сведчанняў інфарматара, бывалі выпадкі, калі родныя хлопца былі не задаволены памерам пасагу ад маладой: "За каго я хацела, мне нельга было, бо трэба было, каб бацька хату паставіў. Была ж такая, як той кажа, "мода": "Мой сын возьме тваю дачку, але ты пастаў хату". А за што ж мой бацька паставіць? Мае бацькі жылі беднавата, як я замуж ішла, то яшчэ была наша хата без падлогі".

### Убранне маладой

Вясельнае адзенне, асабліва

нявесты, з даўніх часоў адрознівалася маляўнічасцю і вытанчанасцю. Да пачатку XX ст. маладая апраналася ў лепшыя ўборы: вышытую белую кашулю, узоры якой былі інтэнсіўна напоўнены чырвоным колерам, спадніцу (андарак), на ногі – чаравікі ці лапці, на галаву – вянок. У традыцыйных уяўленнях беларусаў чырвоны колер суадносіўся як з семантыкай дзявоцкасці, так і фертыльнага ўзросту, лічыўся надзейным сродкам ад "нячысцікаў". Наогул, чырвоны колер шырока выкарыстоўваўся ў вясельным адзенні як маладой, так і маладога ў якасці апатрапейных і прадуцыравальных стымулаў. Так, каб засцерагчыся ад нячыстай сілы, дэманічных істот, якія, згодна з народным павер'ем, асабліва актывізуюцца на шляху да царквы, апраналі адзенне, якое мела вышытыя чырвоныя крыжы.

У сярэдзіне XX ст. вясельная сукенка маладой была звычайна белага колеру: "із штапелю шылі сукенкі белыя" (Зінаіда Шах, 1928 г.н., в. Малева Нясвіжскага раёна). Вэлюм часам выяўляў сацыяльна-маёмаснае становішча нявесты: "Як багацейшыя, то харошы вэлюм куплялі, а бяднейшыя рабілі з марлі" [3, с. 449]. Часам вэлюм пазычалі адзін у аднаго. Так, па ўспамінах Веры Грабоўскай, 1925 г.н., ураджэнкі в. Вялікая Ліпа (выходзіла замуж у 1946 г.), "адзін вэлен быў на ўсё сяло, і ў аднае жанчыны пазычалі той вэлен, і ўсе вянчаліся ў ім, можа, ўсё сяло" (запіс зроблены Вольгай Ізотавай).

Паказальным быў рытуал апранання нявесты. Так, у в. Лань, па ўспамінах інфарматараў, лічылі, што сяброўкі прыбіраюць маладую да шлюбу на шчаслівае жыццё: "Я помню, на падушкі садзілі, як адзявалі, маладую. Як плацце шлюбнае адзявалі, садзілася на стул з падушкамі, а ўжэ дзяўчаты памагалі ёй адзявацца, гэта каб харошае жыццё было" (Марыя Шуста, 1940 г.н., Алена Жук, 1969 г.н., в. Лань, запіс зроблены Валянцінай Новак, Святланай Вяргеенка і Вольгай Ізотавай).

## Вянок

Важнае абрадавае значэнне меў вясельны вянок, які са старажытных часоў сімвалізаваў цнатлівасць і замужжа. У Нясвіжскім раёне вечарына ў дзяўчыны напярэдадні вяселля мела пэўную назву – "вянок". У в. Вялікая Ліпа ў адзін вечар вілі вянок і рашчынялі каравай: "У сыботу падружкі ідуць шыць валян (в'алян) – яна должна быць длінна, аж па зямлі. А кума ці дваюрадная якая сястра – яна ўжо кліча суседак і яны рашчыняюць каравай. А дзяўчаты цэлы вечар кветкі шыюць і валян. Тады прымяраюць, каб скарэй замуж пайсьці" (звычай выяўляе шлюбную семантыку вянка). Гатовы "валян" вешалі на ікону, там ён чакаў дня вяселля. На гэтай жа вечарыне рабілі і яшчэ адзін маленькі вяночак з руты, які ў час пасаду прышпільвалі маладой на патыліцу пад вэлюм (Еўдакія Хвошч, 1925 г.н.) [3, с. 422].

У в. Сейлавічы дзяўчаты, як прыходзілі шыць вянок і вэлюм, спявалі (запіс зроблены Тамарай Варфаламеевай):

*Ой, прыйшлі дзевкі, прыйшлі*
*Да ці ня руту й шчыпаці.*
*Да ці ня руту й шчыпаці,*
*У Марынкі праўды пытаці:*
*-Малада й Марыначка,*
*Мы в цябе да папытаемся,*
*Мы в цябе да папытаемся,*
*Што цябе да ў вянок віці?*
*-Ой, дзевачкі, мае сястрыцы,*
*Ці ж вы самі ні знаяця,*
*Ці ж вы самі ні знаяця,*
*Што ў мяне да пытаяця?*
*Усялякія краскі зьбірайця,*
*Мне ў вяночак ўвівайця [3, с. 432].*

## Змена галаўнага ўбору

Падчас вяселля змяняліся адзенне, галаўныя ўборы, пляценне валасоў. Развітанне з касой як сімвалам дзявоцкасці, прыгажосці і вольнага жыцця ў бацькоў, змена галаўнога ўбору на жаночы выяўляла вельмі старажытную сімволіку – пераўтварэнне дзяўчыны ў замужнюю жанчыну, набыццё ёю новага статусу. Як вядома, пасля вяселля маладыя жанчыны насілі жаночы галаўны ўбор, што і знайшло адлюстраванне ў вясельнай сімволіцы. Так, па звычаях в. Вялікая Ліпа свякроў, як каравай у маладога падзеляць, здымала з маладой фату і павязвала хустку са словамі: "Была ты дзявіцаю, цяпер будзеш маладзіцаю" [3, с. 540], што сімвалічна пазначала пераход маладой да жаноцкасці.





## Сімволіка вясельнага застолля

Паўсюдна ў Нясвіжскім раёне лічылі, што вясельны стол – сімвал дабрабыту будучай сям'і. Так, да прыкладу, у вялікай пашане было сала, якое лічылася абавязковым вясельным прадуктам. Разам з тым многія інфарматары адзначаюць, што такога пышнага вясельнага стала як сёння не рабілі, "усё было з сваёй гаспадаркі". Інфарматар Вера Грабоўская, 1925 г.н., в. Карцэвічы (ураджэнка в. Вялікая Ліпа), адзначае: "Некалі, як ёсць якая скварка, гуркі да капуста – вот табе і закуска. Некалі сала парэжаш і будзеш есці, а цяпер так на вяселлі тога сала ніхто ніколі і не рэжа, і не паказвае. Але ж так і ва ўсіх гэдак было. Як ёсць, як той кажа, чарка і скварка – вот табе і вяселле" (запіс зроблены Вольгай Ізотавай).

## Сімволіка жыта

Звычайным кампанентам вясельных абрадаў розных народаў свету з'яўляецца жыта (таксама іншае зерне), якое мае ўстойлівую семантыку "ўрадлівасці", "багацця", "шчасця", "плоднасці", "жыцця", "дабрабыту". Шляхам кантактнай магіі жыта забяспечвала дабрабыт, урадлівасць, багацце, здароўе ўдзельнікам абраду і, апрача таго, ахоўвала ад магчымага негатыўнага знешняга ўплыву (чаравання). Семантыка жыта рэалізоўвалася ў абрадах абсыпання, а таксама насыпаннем зерня ў прадметы посуду, кішэні адзення, у абутак і інш. Так, у в. Вялікая Ліпа, калі дзяўчына давала згоду выходзіць замуж за хлопца, яна "ў пустую бутылку, каторую яны (сваты) прынясьлі, насыпала жыта поўна і завязвала красную ленту. Ужэ яны знаюць, што ўсё дагаворана" [3, с. 409].

## Каравай

Адным з найбольш сакралізаваных прадуктаў харчавання з'яўляецца каравай, які, таксама як і жыта, атаясамліваецца з маладымі, іх сумесным лёсам і шчасцем. Сам працэс прыгатавання вясельнага хлеба (пераўтварэнне сырога цеста ў спечаны каравай) звязваўся з пераходам маладых у іншую сацыяльную групу [2, с. 44] ("З добрага цеста – добра паляніца, а з добрае дзеўкі – добра маладзіца"), стварэннем новай сям'і.

Калі каравай удаваўся, лічылі – гэта на шчасце. Па ўспамінах Еўдакіі Хвошч, 1925 г.н., в. Вялікая Ліпа, "як удаўся, дык радуюцца – добрая жызьня маладым будзе" [3, с. 438].

Караваяў на вяселлі было два – жаніхоў і нявесцін: "Сначала ў нявесты каравай, а патом ўжэ падзеляць каравай ў нявесты, едуць да жаніха, у гэты ж самы дзень у жаніха свадзьбу гуляюць. А назаўтра ўжэ дзеляць каравай у жаніха, і ўсё – заканчваецца свадзьба." (Марыя Шуста, 1940 г.н., Алена Жук, 1969 г.н., в. Лань, запіс зроблены Валянцінай Новак, Святланай Вяргеенка і Вольгай Ізотавай).

Падзел каравая суправаджаўся мноствам абрадавых дзеянняў. Да прыкладу, у в. Вялікая Ліпа перад тым, як пачаць выклікаць гасцей для адорвання і атрымання кавалка каравая, "сват выразая з каравая шышку (у дадзеным выпадку гэта вярхушка каравая з запечанай на ёй кветкай з цеста), кладзе на чысценькую тарэлку і ставіць пад маладых". Потым пачынае выклікаць усіх па парадку "па радні блізкай: "Дзе ест родны бацько? Просім на каравай, на Божы дар! Ні я прашу, а малады з маладой!" Ну, бацько падходзіць, дара" (Еўдакія Хвошч, 1925 г.н., запіс зроблены Тамарай Варфаламеевай) [3, с. 500-501].

У в. Лань (таксама ў в. Вялікая Ліпа, в. Малева і інш.) каравай уносілі пад музыку дзеці, якія павінны былі кружыцца, што, верагодна, з'яўлялася пажаданнем фертыльнасці і дабрабыту (каб у маладой сям'і было многа дзяцей-памочнікаў): "Раньшэ дзеткі ўносілі каравай, круціліся. Патом ужэ на стол ставяць, і тады ўжэ сват па куску рэжа і ўжэ выклікае: вот першы там: маладой бацькі ці маладога бацькі ідуць ужэ. Жаніх і нявеста адзяляюць караваем ужэ і так па парадку ўсіх там: ці брат, ці сястра там, патом ўжэ родственікі. Пажаданні ўсякія на каравай: каб добра жылі, каб шчаслівa ўсё, і клалі грошы, ну, хто чым адарваў. Бралі кавалак на хустачку, з'ядалі: хто сразу, а хто дадому нясе" (Марыя Шуста, 1940 г.н., Алена Жук, 1969 г.н., в. Лань).

У в. Малева на каравай выказвалі самыя розныя пажаданні, у тым ліку жартоўныя, каб у маладых было вясёлае і шчаслівае жыццё. Так, інфарматар Наталля Крыўко, 1934 г.н., ураджэнка в. Малева, успамінае: "На каравай

благаславілі ўсяк, мая мама дык благаславіла: яна ўжэ возьме, прыбярэ клубочак нітак, тады вот і кажа: “Дару табе клубок нітак, каб не блытаўся каля чужых лытак. Дару табе палена, каб пацалаваў маладую ў калена. Дару табе медзі, каб былі сыны, як мядзведзі”. Малады паднімае плацце і цалуе ў калена, ну і сьмяюцца ўсе. Наша мама любіла так во пашуціць” (запіс зроблены Вольгай Ізотавай).

## Сімволіка гарэлкі

Выразны сімвалічны статус на традыцыйным вяселлі мела гарэлка [1, с. 117], якая ў народным уяўленні неад’емным элементам сватання. Так, у в. Вялікая Ліпа ў сваты абавязкова неслі бутэльку гарэлкі, якую выпівалі. У в. Малева, калі ў аглядах гаспадарка хлопца не спадабалася, вярталі назад бутэльку гарэлкі, што выпілі на сватанні: “аддаюць тую бутылку, што выпілі, вяселле раскідаецца, нічога ні будзе. Ці яна там яго палюбіла, ці ні палюбіла – хаяйства ні падходзіць” [3, с. 417].

Цікава адзначыць, што на вясельным застоллі маладыя альбо толькі прыгублялі паднесеныя ім чаркі гарэлкі, альбо зусім не краналіся іх, што, згодна з распаўсюджаным павер’ем, павінна было забяспечыць ім заможнае і шчаслівае жыццё. Характэрна, што інфарматары сталага веку адзначаюць, што даўней на вяселлі наогул пілі мала (вясельныя госці): “Ну, там жа ж пілі – такія во румачкі (маленькія), гэта ж ні ціпер, што стаканы даюць. Тагды і ціпер – гэто саўсім другое дзело” (Еўдакія Хвошч, 1925 г.н., запіс зроблены Тамарай Варфаламеевай) [3, с. 495].

## Сімволіка прадуцыравання новых шлюбаў

Вялікая колькасць абрадавых дзей на традыцыйным вяселлі была накіравана на прадуцыраванне новых шлюбаў. Так, у в. Вялікая Ліпа існаваў наступны звычай (здзяйсняўся пасля пасаду маладой): “Дзяўчата хочуць схапіць той настольнік, на чом кленчыўшы была маладая, на чом на пасад садзілі. Схапілі тую скацерку, кінулі далей у парог, цераз людзей, а там яшчэ маладзёж стаіць, тыя на стрэху стараюцца закінуць. Такі абычай быў. Это штоб ніхто нідзе ні заседжваўсё: і дзеўкі ляцелі замуж, і хлопцы жаніліся” (Еўдакія Хвошч, 1925 г.н., запіс зроблены Тамарай Варфаламеевай) [3, с. 480].

У в. Карцэвічы лічылі, што каб сяброўкі маладой хутка выходзілі замуж, трэба развязаць сватам ручнікі пасля падзелу каравая: “Я помню, як я замуж ішла, то мая бабуля бегала, каб хаця ж сватам паразвязвалі ручнікі пасля, як каравай падзялілі. Каб астальныя ўсе дзеўкі пашлі замуж. І ўжо бегалі, развязвалі тыя ручнікі” (Марыя Шумейка, 1977 г.н., в. Карцэвічы, запіс зроблены Тамарай Варфаламеевай) [3, с. 509].

У в. Малева, як выязджалі да маладога, маладая дзяржала клубок нітак, каб дзеўкі замуж ішлі: “Як ад’язджаюць, да маладога ўжэ едуць, дак альбо клубочак нітак альбо шпульку маладая дзяржыць за канец ніткі, каб ужэ каціласся шпулечка ці клубочак, дзе атарвецца, то атарвецца. Гэта ўжэ, каб дзеўкі замуж ішлі – падружкі” (Наталля Крыўко, 1934 г.н., в. Карцэвічы, родам з в. Малева, запіс зроблены Вольгай Ізотавай).

Такім чынам, традыцыйны вясельны абрад Нясвіжскага раёна аб’ядноўвае значную колькасць гетэрагенных матываў і функцый: лімінальная функцыя (змены сацыяльнай ролі маладых), анталагічная (перадачы жыццёвых установак), аксіялагічная (перадачы духоўных каштоўнасцей, каштоўнасных пазіцый і маральна-этычных імператываў), функцыя інфармавання аб цнатлівасці маладых, прадуцыравальная (забеспячэнне дабрабыту, плоднасці, шчасця маладой сям’і, прадуцыраванне новых шлюбаў), забаўляльная, эстэтычная і інш.

### Спіс літаратуры

1. Беларуская міфалогія: Энцыкл. слоўн. / С. Санько, Т. Валодзіна, У. Васілевіч і інш. – Мінск: Беларусь, 2004. – 592 с.

2. Лаврентьева, Л.С. Символические функции еды в обрядах / Л.С. Лаврентьева // Фольклор и этнография. Проблемы реконструкции фактов традиционной культуры: Сб. науч. трудов. – Л.: Наука, 1990. – С. 37–47.

3. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: У 6 т. / В.І.Басько [і інш. ]; ідэя і агульнае рэдагаванне Т.Б. Варфаламеевай. – Мінск: Выш. шк., 2010. – Т. 5: Цэнтральная Беларусь. У 2 кн. Кн. 1. – 847 с.





*Святлана Вяргеенка*

# “АД ГОСПАДА БОГА ШЧАСЛІВА ДАРОГА…”

## (замовы Нясвіжскага краю)

Сістэматычнае вывучэнне беларускіх замоў (аднаго з найбольш архаічных жанраў вуснай народнай творчасці) пачынаецца з канца XIX стагоддзя. Асноўнымі напрамкамі вывучэння замоўных твораў з 1890 года і амаль да Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі (1916 г.) з’яўляліся збор фактычнага матэрыялу, спробы растлумачыць важнасць выкарыстання замоў у розных жыццёвых сітуацыях, а таксама вырашэнне пытанняў, звязаных з класіфікацыяй і тэарэтычным асэнсаваннем твораў замоўнага жанру. У гэтай сувязі, каштоўнасць уяўляюць працы Е. Раманава [1], П. Шэйна [2], М. Доўнар-Запольскага [3], А. Багдановіча [4], Я. Карскага [5]. Аднак варта адзначыць, што ў працах названых і іншых айчынных фалькларыстаў, якія працавалі ў азначаны і наступныя перыяды, не сустракаюцца замоўныя тэксты раёна, якія нас цікавяць. Напэўна, гэтаму ёсць гістарычнае тлумачэнне, бо, як вядома, Нясвіж з 1793 г. увадзіў у склад Расійскай імперыі, з 1921 па 1939 год – у склад Польшчы. Не паглыбляючыся ў гісторыю, нагадаем, што як адміністрацыйная адзінка на паўднёвым захадзе Мінскай вобласці Нясвіжскі раён быў утвораны 15 студзеня 1940 года. Магчыма таму, у беларускай фалькларыстыцы вывучэнню замоў Нясвіжчыны ўдзялялася недастатковая ўвага. Апошняя комплексная фальклорна-этнаграфічная экспедыцыя ў гэты рэгіён была здзейснена ў 1976 годзе. У самым грунтоўным на сённяшні дзень выданні тэкстаў замоў – акадэмічным томе БНТ “Замовы” [6] – творы замоўнага жанра Нясвіжчыны не прадстаўлены. На пачатку XXI стагоддзя былі зроблены некаторыя запісы замоўных тэкстаў, што знайшлі адлюстраванне ў выданні “Замовы” [7]. Вынікам экспедыцыі 2012 года, праведзенай студэнтамі і выкладчыкамі ўстановы адукацыі “Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны” пры падтрымцы Нясвіжскага райвыканкама, з’явіліся новыя фактычныя матэрыялы, якія дазволілі ўзбагаціць калекцыю замоў розных функцыянальна-тэматычных груп, большасць з якіх, як і ў іншых рэгіёнах Беларусі, – лекавыя.

Кожны раз, прыязджаючы на фальклорную практыку ў іншы рэгіён, мы ставім на мэце як мага больш поўна зафіксаваць фальклорныя творы. Скажу шчыра, замоўная традыцыя Міншчыны ў цэлым, і Нясвіжчыны ў прыватнасці, адрозніваецца не вельмі багатым замоўным скарбам, хаця ў вёсках і жывуць бабулі, якія карыстаюцца гэтымі магічнымі творамі амаль на прафесійным узроўні. З такой бабуляй пашчасціла сустрэцца ў в. Малева. Жыхары вёскі добра ведалі, што ёсць у іх бабуля, якая лечыць дзіцячыя хваробы, і мы са студэнтамі мэтаскіравана вырашылі яе знайсці. Мы звярнулі ўвагу, што ў Ніны Міхайлаўны зусім невялікая хатка знаходзілася ў глыбіні двара і была “схаваная” ад позіркаў людзей, якія праходзілі па вуліцы. На парозе нас сустрэла жанчына не вельмі сталага ўзросту, прыемная, ветлівая. Пачалі мы распытваць у яе пра святы і абрады, але на ўсе нашы пытанні бабуля адказвала адмоўна: “Нічога я, дзеткі, не ведаю”. А калі мы сказалі, што скіравалі нас да яе жыхары вёскі, яна тут жа адказала, што займаецца лекаваннем. Ніна Міхайлаўна распавядала нам аб тым, як набыла магічныя веды і як гэтымі ведамі па сённяшні дзень карыстаецца. На нашу просьбу расказаць нам хоць адну замову, бабуля, як сапраўдная знахарка, адмовілася. Спаслалася на тое, што мы не будзем пераймаць яе веды, а проста так яна не скажа. За ўвесь час гутаркі з ёю адчуваўся яе вельмі чэпкі позірк, нібы прасвечвала яна нас да “мозгу касці”. Заўважу, дарэчы, што і далей парога сваёй хаты яна нас не пусціла, хоць мы і пакутавалі ад невыноснай спякоты. Тым не менш уражанні ад сустрэчы з Нінай Міхайлаўнай засталіся вельмі прыемныя, і са спакойнай душой мы рушылі далей у пошуках фальклорных скарбаў.

У рэшце рэшт вынікам нашай фальклорнай вандроўкі па вёсках Нясвіжчыны стала калекцыя замоў, прадстаўленая ў прапанаваным выданні.

Звернемся да найбольш цікавых, на наш погляд, тэкстаў і прасочым, як адлюстраваўся ў іх менталітэт і светапогляд нашых продка

Даволі шырока ў замовах прадстаўлены разнастайныя персанажы. Яны надзеле-

ны пэўнымі ўласцівасцямі і згодна з імі ўзаемадзейнічаюць з чалавекам, бо ён надзяляў іх усімі тымі якасцямі, якімі валодаў сам: жыццёвай энергіяй, розумам, здольнасцю ўступаць у кантакт з іншымі і г.д. Як тлумачыў такую з’яву А.С. Аксамітаў, “персаніфікацыя прыроды і прыродных сіл – вынік псіхалагічнай адаптацыі старажытнага чалавека да навакольнага свету, маральна-псіхалагічнага і духоўнага прыстасавання свету да сябе. Асацыятыўнае збліжэнне знешняга свету са сваім унутраным спрыялі фарміраванню спецыфічнага мастацкага прыёму – тлумачэння бытавой сферы чалавека праз тлумачэнне прыроды і космасу” [8, с. 154]. Гэты спецыфічны погляд на прыроду і космас, якія рэгулююць адносіны ў сістэме “свет-чалавек”, знайшоў своеасаблівы адбітак у замоўным жанры. Так, ва ўяўленнях нашых продкаў-язычнікаў Сусвет мае цэнтр, межы, адпаведныя часткі, якія звязаны з зямлёй і небам. Найбольш важныя падзеі адбываюцца на міфалагічным сакральным месцы (міфалагічны цэнтр – МЦ): “на сінім моры стаіць дуб…”, “на сінім моры ляжыць камень…”, “у сінім моры камень ляжыць, на тым камені дзве панны сядзяць, у Алы пужанні і ўляканні вызываюць к сабе на пагулянне…”. Але ёсць і прастора, непрыдатная для жыцця людзей, гэта мёртвая зямля, “дзе сонца не свеціць, дзе вецер не вее, дзе птушкі не шчабечуць”, або “я яго (іспуг – С.В.) выгаворваю і вымаўляю ў чыстае поле, у сіняе мора”. Гэтыя прыклады з’яўляюцца паказчыкам таго, што ў замовах зафіксаваліся і захаваліся адзнакі народнага менталітэту, у якім суіснуюць уяўленні аб рэальнай прасторы (свой дом), хаця і тут у разуменні “свайго дома” з’яўляюцца рысы, якія яго міфалагізуюць: “сакральныя” часткі дома – парог, печ і г.д.) і ўласна міфалагічнай, якой у рэальнасці не існуе. Не існуюць і духі, якія насяляюць і абжытую (сваю, культурную прастору), і неасвоеную (чужую, а таму варожую). І тут прыярытэтную ролю ў міфалагізацыі свету адыгрываюць уяўленні, звязаныя са шматлікімі дэманалагічнымі вобразамі. Такімі істотамі з’яўляюцца дамавік, які жыве і ўладарыць у доме, дваравы, што сочыць за парадкам на двары, хлеўнік, які ахоўвае і даглядае свойскую жывёлу, і г.д. Аднак, з цягам часу ў міфалагічнай свядомасці народа функцыі гэтых істот нібы ўзаемапераносяцца, і тады замаўляльнік просіць дамавіка: “Ахрані, дамавік, маіх цыплят” (запісана ад Гацілы А.В., 1935 г.н., в. Малева). Хаця тут ёсць і апраўданне выкарыстання такога звароту. Справа ў тым, што да цяперашняга часу ў некаторых сем’ях, а раней – паўсюдна, куранят трымалі ў хаце да таго часу, пакуль яны не падрастуць. Тады ўжо былі іншыя ворагі: каршуны, вароны і іншыя абаронцы, што знайшло адлюстраванне ў тэксце замовы, запісаным ад таго ж інфарматара.

Папулярным у замовах з’яўляецца і зварот да боскіх і касмічных сіл. Гэта не нейкая ўмоўнасць, этыкетная ці цырыманіяльная формула. Людзі глыбока верылі ў магчымасць рэальнай дапамогі з боку зор-зарніц, Бога (“памажы, Божа, табе страляць, а мне ўдар вымаўляць”); “Благаславі, Госпадзі, нас (імя мужа і жаны”). Увогуле стандартная формула ўступу замовы “Госпаду Богу памалюся…” – малітоўны зварот да сакральнага памочніка і заступніка ў нашай калекцыі сустракаецца даволі рэдка, як і формула закрэпкі (“Ва імя Атца і Сына і Святога Духа”) і зааміньвання. Гэтая адметнасць функцыянавання замоўнага жанру на Нясвіжчыне сведчыць аб некаторым паслабленні традыцыі.

У замовах таксама міфалагізаваліся пэўныя адрэзкі часу, што было звязана з уяўленнямі пра “дрэнныя” і “лепшыя” часы. Трывалай была вера людзей у магічную сілу вымаўленага слова і ў рэальную магчымасць яго матэрыялізацыі. Калі гэтыя словы прамаўляліся ў сакральны час (“на Крещенской неделе следовало прочитать”, “увидев на небе молодой месяц”, “если у ребенка косоглазие, следовало смотреть на луну и говорить”, “читать слова-обереги на убывающий месяц и обязательно в четверг” і г.д.), яны набывалі яшчэ большую сілу магічнага ўздзеяння. Як бачым, для таго, каб пажаданне, выказанае ў замове, рэалізоўвалася, неабходна было прытрымлівацца пэўных правілаў-рэкамендацый. Нашы продкі меркавалі, што пры парушэнні гэтых правілаў можа ўзнікнуць нават адваротны вынік – гэта будзе рэакцыя на несвоечасовае прамаўленне тэксту, бо слова, як і дзеянне, якое адбываецца не ў вызначаны час, уносіць дысбаланс, дысгармонію





ў касмічны парадак, які ўсталяваўся на працягу стагоддзяў. Устойлівым з’яўляецца меркаванне пра дрэнны і добры час, пра цяжкія і добрыя (лёгкія) дні (да гэтага часу панядзелак, напрыклад, лічыцца цяжкім днём, дрэнным часам для пачатку працы). Таму пачынаць важныя справы, а лячэнне (шырэй – пазбаўленне ад ліха, бяды, хваробы, злых сіл), неабходна было пачынаць у лепшы час, што зафіксавана і ва ўступнай формуле (формуле зачыну) у адной з замоў нашай калекцыі: “Першым разам, лепшым часам Госпаду Богу памолімся, Прачыстай Мацеры наклонімся. Зоры-зарніцы, божыя памочніцы, прыступіце, удар загаварыць дапамажыце” (запісана ад Лепяцілы Н.У., 1930 г.н., в. Лявонавічы).

Аналіз тэмпаральнага кода ў тэкстах замоў дае магчымасць наблізіцца да разумення нашымі старажытнымі продкамі спецыфічных асаблівасцей бачання свету. У замоўным комплексе выяўляюцца элементы дахрысціянскага міфалагічнага светапогляду, глыбінная сутнасць якога надзвычай устойлівая. Рудыменты міфалагічнага мыслення захаваліся нават да сённяшняга часу.

Такое ж магічнае значэнне надавалася жыхарамі Нясвіжчыны і лічбам. Невыпадкова даволі часта інфарматары папярэджвалі, што замову трэба “дзевяць раз гаварыць і хрысціцца”, “трэба ўсыпаць у дзевяць калодзежаў маку”, “сеялі мак у калодца, у тры калодца, а то і ў сем калодцаў… хоць тры раза хадзі”, “качаеш тры катушачкі”, “чытаць па тры раза”, “чытаць дзевяць раз”, “брали нож и трижды проводили им”. Сустракаюцца магічныя лічбы і непасрэдна ў тэкстах замоў. Так, напрыклад, чытаем: “Ёсць на свеце тры браты”, “ішоў Ісус з нябёс, нёс тры ружы”, “дванаццаць брацьеў мост будавалі”, “было у царя Поганина двенадцать жен”, “не гори раз, не гори два, не гори три”. Гэта прыклады адкрытай формы ўжывання магічных лічбаў. Больш складаная форма – скрытая, калі ў тэксце тройчы паўтараецца той ці іншы вобраз, тое ці іншае дзеянне і г.д. (“ни сегодня, ни завтра, никогда не гори”, “пусть он спит, отсыпается, по ночам не просыпается”, “Батюшка млад месяц, дорогой дружочек, золотой рожочек”, “ключ, замок, язык”, “ідзі (ружа – С.В.) дзе сонца не свеціць, дзе вецер не вее, дзе птушкі не шчабечуць”, “Господь небо благословляет, раба (имя) засыпает. Господь землю благословляет, раба (имя) засыпает. Господь небо, землю благословляет, раба (имя) крепко спит. Аминь. Аминь. Аминь.”).

Замовы выконваюць канкрэтную прагматычную задачу: яны скіраваны на выгнанне сіл, якія шкодзяць чалавеку. Тэкст замовы будуецца так, што перад замаўляльнікам нібы паўстаюць усе тыя магчымыя часткі цела чалавека, дзе магла лакалізавацца хвароба (“… із рук, із ног, із белага цела, із русага воласу”), адкуль яна магла з’явіцца (“… ці з валу, ці з павалу, ці з вады, ці з яды, ці з зямлі, ці з якой стараны”) і куды яе трэба саслаць. Гэтае месца – сакральны белы камень у сінім моры – так званы міфалагічны цэнтр, у якім знаходзяцца “дзве панны” (“… у сінім моры белы камень ляжыць, на тым камне дзве панны сядзяць, у Алы пужанні і ўляканні вызываюць к сабе на пагулянкі…” – “Іспуг”, запісана ад Лях М.С., 1943 г.н., в. Лявонавічы).

У традыцыйным укладзе сялянскай сям’і адным з асноўных клопатаў быў клопат пра свойскую жывёлу, перш за ўсё пра карову, якая ў значнай ступені забяспечвала дабрабыт сям’і. Разам з тым у нашай калекцыі ёсць шэраг замоў, запісаных ад А.В. Гацілы, скіраваных на забеспячэнне сям’і такім прадуктам штодзённага ўжывання, як яйкі. Дзеля гэтага замаўляльнік звяртаецца і да дамавіка (адзіны выпадак у нашай калекцыі), і да святога Фамы, і непасрэдна да курэй, “чтобы куры хорошо неслись и по чужим дворам не бегали”, трэба было здзейсніць сапраўдны рытуал: “… налить им воды, в которой хозяйка вымыла руки и ноги, туда же насыпать пшено и проговорить” адпаведную замову (запісана ад Гацілы А.В., 1935 г.н., в. Малева).

Замовы – гэта не толькі творы ўтылітарнага прызначэння, гэта ў першую чаргу вербальныя тэксты, складзеныя па пэўных правілах з улікам разнастайных сродкаў мастацкай выразнасці. Характэрнай асаблівасцю мовы замоў, як і фальклору ўвогуле, з’яўляецца наяўнасць формул, якія служаць сродкам перадачы інфармацыі і змяшчаюць у сабе адпаведныя скрытыя сакральныя ўяўленні: “На сінім моры стаіць дуб, на дубе сядзіць чорны грак, не есць травы, не п’е вады”, або “на сінім моры ляжыць камень, на том камне сядзяць тры дзявіцы” (запісана ад Булыгі Н.М.,

1958 г.н., в. Лань). Прыведзеныя формулы апісваюць месца дзеяння – гэта павярхоўны, прафанны ўзровень. Разам з тым яны з'яўляюцца і кодам – гэта глабальны, сакральны ўзровень, калі пэўныя прадметы і вобразы набываюць сакральнае значэнне і становяцца архетыпамі. Яны адпавядаюць тым ідэям першабытнай культуры, якую можа стварыць чалавек толькі з міфалагічным мысленнем. Каб зразумець глыбінную сутнасць твора, неабходна расшыфраваць кодавыя значэнні кожнага з вобразаў-архетыпаў і прадметаў-артэфактаў, якія маюць толькі ім уласцівыя якасці. Адным з такіх кодаў з'яўляецца і акцыянальна-рэальны код – найважнейшы кампанент вывучэння замоў. Без яго асэнсавання немагчыма зразумець глыбіню зместу замоўнага тэксту. Невыпадкова, замаўляльнік, калі прамаўляе тэкст, выконвае дзеянні з вярбою, вадой, розгай з веніка, якой водзіць па парозе. Тэкст замовы сведчыць аб тым, што паміж словам і абрадавым дзеяннем існуюць самыя розныя формы адносін, розныя формы сувязі. Самы просты і найбольш частотны варыянт, які прысутнічае і ў замове "Ад ангіны", запісанай ад Санько Р.І., 1936 г.н., г. Нясвіж, – гэта арганічная повязь вербальнага і акцыянальнага кампанентаў: у тэксце замовы гучыць пагроза: "… а если ты её не возьмёшь, мы её заглотим с корнями", і ў акцыянальнай частцы "больной должен сглотнуть слюну, а если лечат ребенка, то надо за него сглотнуть".

Мы засяродзілі ўвагу толькі на асобных аспектах аналізу аднаго з самых цікавых і таямнічых жанраў вуснай народнай творчасці. Замовы Нясвіжчыны – гэта цудоўны мастацкі скарб, які яшчэ чакае, на нашу думку, свайго ўдумлівага даследчыка.

### Спіс літаратуры


1. Романов, Е.Р. Белорусский сборник. Вып. 5. Заговоры, апокрифы и духовные сти¬хи. – Витебск, 1891.

2. Шейн, П.В. Материалы для изучения быта и языка русского населения северо- западного края: в 3-х т. / П.В. Шейн. – Санкт-Петербург : Типография императорской академии наук, 1887. – Т. 1. – 585 с.; 1893. – Т. 2. – 715 с.

3. Довнар-Запольский, М. Чародейство в Северо-Западном крае в XVII-XVIII вв.: Историко-этнографический этюд / М. Довнар-Запольский // Этнографическое обозрение. – 1890. – № 2. – С. 49-72.

4. Богданович, А.Е. Пережитки древнего миросозерцания у белоруссовъ: этнографиче¬ский очерк / А.Е. Богданович. – Гродна : Гу-бернская Типография, 1895. – 186 с.

5. Карскі, Я. Беларусы / Я. Карскі // уклад. і камент. С. Гараніна і Л. Ляўшун; навук. рэд. А. Мальдзіс; прадм. Я. Янушкевіча і К. Цвіркі. – Мн. : "Беларускі кнігазбор", 2001. – 640 с. [8] с.: іл.

6. Замовы / уклад., сістэм. тэкстаў, уступ. арт. і камент. Г.А. Барташэвіч; рэдкал.: А.С. Фядосік (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1992. – 597 с.

7. Замовы / уклад.: У.А. Васілевіч, Л.М. Салавей; уступ. арт. : Л.М. Салавей. – Мінск : Беларусь, 2009. – 519 с.

8. Аксамітаў, А.К. Беларуская фразеалогія ў граматычным, семантычным і функцыя¬нальным аспекце // слова Беларус. З гісторыі лексікаграфіі. – Мінск, 1994.






## ЗАМОВЫ

### Ад удару

Хадзілі косці па цэламу свеце, па буйным жыце, па ясным сонцы. Быць косці, быць у чалосці.

Гэта трэба сказаць дзевяць разоў.

*Запісана ў в. Альхоўка*
*ад Драчан (Грахоўскай) Людмілы Антонаўны, 1923 г.н.,*
*(раней пражывала ў в. Карцэвічы).*

### Ад удару

Ой, знаю, меня бацька навучыў:

– Свенча матка па касцёле ходзіць, свайго сына за руку водзіць, мой сын у бой, забяры боль.

Гаворыцца 9 раз, трэба хрэсціцца.

### Ад вачэй

На сінім моры стаіць дуб, на дубе сядзіць чорны грак, не есць травы, не п'е вады, мужчынам пад шапку, жанчынам пад хустку. Чорная, сабачая, кацячая, нечага хадзіць ад чалавека к чалавеку.

9 раз гаворыцца, і трэба хрэсціцца.

### Ад вывіху

На сінім моры ляжыць камень, на том камне сядзяць тры дзявіцы адной матушкі. Волас, волас, голас, голас, крык, крык, слух, слух. Ні як рабе божай Ніне работаць, як вывіх (удар) выгаворваць.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Булыгі (Есіс) Ніны Міхайлаўны, 1958 г.н.*

### Удар

Узвіху, узвіху, каб у Алы не было ліха. З высокага неба, з зялёнага гаю, з сырое зямлі. Мінайся, узвіх, ушыб і ўдар, з Алінае касці. Бог з помаччу. Амінь.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Лях Марыі Сільвестраўны, 1943 г.н.*

***

Удар, удар, выхадзі, ліхва, дзе сонца не ўсходзіць, дзе месяц усходзіць, дзе птушкі лятаюць, дзе мурашкі ўпаўзаюць (9 разоў).

Ішоў стралец чэрэз поле:

– Куды ідзеш, стралец?

– Страляць.

– А я, стралец, іду ўдар вымаўляць.

Памажы, Божа, табе страляць, а мне ўдар вымаўляць (9 разоў).

***

Первым разам, лепшым часам Госпаду Богу памолімся, Прачыстай Мацеры паклонімся. Зоры-зарніцы, божыя памошніцы, прыступіце, удар загаварыць дапамажыце. Удар, удар, ідзі із касці, бальшой і малой, ад суставу, ад ліца. Тут удару не бываць, белай косці не ламаць, краснай крові не сушыць, ад балезні адступіць, здароўем рабу Божую (імя) надарыць.

### Ад ведзьмы

Выганяю я кароўку на божу расу, на залатую красу. У Госпада Бога прашу, каб не дапусціў Бог мае кароўкі да ведзьмы з ведзьмаром, каб не забрала ад мае кароўкі белага малака і жоўтага масла. Будзе ехаць Святы Георгій на белым кані, ён праб'е вострым шылам ведзьму і ведзьмара.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Лепяцілы Ніны Уладзіміраўны, 1930 г.н.*

### Іспуг

Памалюся Госпаду Богу, каб Бог памог. Вымаўляю і выгавараваю пужанні і ўляканні із рук, із ног, із белага цела, із русага воласу. З чаго ж яно стала: ці з валу, ці з павалу, ці з вады, ці з яды, ці з зямлі, ці з якой стараны. Я ж яго выгавараваю і вымаўляю ў чыстае поле, у сіняе мора. У сінім моры белы камень ляжыць, на тым камені дзве панны сядзяць. У Алы пужанні і ўляканні вызываюць к сабе на пагулянкі. Ім там піць і гуляць, а ў Алы пужання і ўлякання не бываць. Бог з помаччу, Госпадзі Божа. Амінь.

## Ураз

Ішлі святы Пятра і Паўла, сустрэліся з Госпадам Богам, насустрач ім святы Уразе. Ёсць на свеце чатыры браты. Першы брат – ясны месяц у небе, другі брат – сіні камень у моры, трэці брат – у лесе клён. Як сыдуцца ўсе чатыры разам – будуць вялікі банкет мець, каб перастаў у Алы жывот балець, каб не балела, каб не гарэла, каб на сваё местачка ўсё стала, на своем местачку, на залатом крэселку. Бог з помаччу.

## Ружа

Ішоў Ісус з нябёс, нёс тры ружы. Адна – паліла, другая – смаліла, трэццяя – усё ліха патушыла. Панка-ружа, панка-ружа, ідзі, ружа, з хаты дымам, з двара -- ветрам, дзе сонца не свеціць, дзе вецер не вее, дзе птушкі не шчабечуць. Бог з помаччу. Госпадзі Божа, дапамажы. Амінь.

## Ад крывацёку

Ішлі тры кошкі, сустрэліся з Госпадам Богам:

- Вы куды ідзяце і што робіце?

- Мы нікуды не ідзём і нічога не робім. Мы п'ём і гуляем, кроў забаўляем. Стань, кроў, у ране, як ціха ў Іардане (3 разы). Бог з помаччу. Амінь.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Лях Марыі Сільвестраўны, 1943 г.н.*

## Ад пярэпалаху

Я пярэпалах яйцом выкатваю. Трэба зразу "Отчэ наш" чытаць, качаю ад людзей яйцо, качаю, качаю, а потым кругом галавы на адну руку, а патом -- у другі бок галавы на другую руку, а патом -- пад грудзьмі качаю і гавару:

- Выкачвайся, пярэпалах, усякі-ўсялякі, які нейкі чалавечы, але і звярыны, гавару ўсякі, які е, памажы, Божа.

І трэба "Отчэ наш" гаварыць, калі дзеці малыя. Гэта ўсягда памагае, эта господня малітва.

*Запісана ў в. Вайнілавічы*
*ад Кароль Ніны Вячаславаўны, 1927 г.н.*

У рэчкі дзяўчыны рожу мылі (рожа ў людзей), камень мылі. Рожа вадзяная, рожа агнявая, рожа ветраная. Крыві не сушы, сэрца не тамі. Я – з духам, Бог – з помаччу. Перахрысціцца і сказаць: "Боская мамочка йшла і рожу ўнясла. Памажы, рожа.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Драчан Ірыны Міхайлаўны, 1933 г.н.,*
*(раней пражывала ў в. Альхоўка Нясвіжскага р-на).*

## Ад ангіны

Читать по 3 раза: утром, вечером и утром следующего дня. После каждого прочтения больной должен сглотнуть слюну, а если лечат ребёнка, то надо за него сглотнуть:

- Ветла, ветла, возьми свою глоть, а если ты её не возьмёшь, мы её заглотим с корнями.

Аминь, аминь, аминь.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Санько Раісы Іванаўны, 1936 г.н.*

## На добры ўраджай памідораў

Як няма ліку-пераліку мурашам у лесе, так няма ліку-пераліку маім памідорам.

## Ад іспугу

Калі ад іспуга, тады воск растаплівалі ў баначке, вадзілі над галавой, гаварылі малітву. Еслі я адалью гэты іспуг, то мне самой становіцца плоха.

*Запісана ў в. Грыцкавічы*
*ад Заяц Станіславы Ивананаўны, 1944 г.н.*

***

Мая маці малітву шаптала. Яйцо вылівала з адной чаркі ў другую і вот вылівала над галавой. Еслі дзіцё была пуганае, то былі такія нітачкі з пузырамі.

*Запісана ў в. Малева*
*ад Васільевай Зінаіды Віктараўны, 1950 г.н.*





## На захаванне сямейных адносін

Кто на Благовещение с утра до ночи назовёт мужа сорок раз "милый", весь год у мужа любимой будет. Такими действиями старались сохранить или исправить семейные взаимоотношения.

## Ад бяссонніцы

Если вы страдаете бессонницей, попробуйте сделать так: подойдите к окну, постучите по стеклу согнутыми пальцами и скажите:

– Господь небо благословляет, раба (имя) засыпает. Господь землю благословляет, раба (имя) засыпает. Господь небо, землю благословляет, раба (имя) крепко спит. Аминь. Аминь. Аминь.

## Каб муж з жонкай любілі адзін аднаго

Чтобы муж и жена больше дорожили друг другом, надо в ночь перед Рождеством зажечь две свечи белого воска, скрученные между собой, читать 12 раз и обязательно сжечь эти свечи до самого конца:

– Благослови, Господи, нас (имя мужа и жены), век по веку, отныне и до веку. Как эти свечи ярко горят, вместе с воском прольются, так и мы (имена) вместе чтоб прожили ярко, жарко друг друга любили. И пока люди Рождество не будут забывать, до тех пор нам друг друга не потерять. Во имя Отца и Сына и Святого Духа. Аминь.

## Ад хваробы вачэй

Чтобы не болели глаза, следовало, увидев молодой (растущий) месяц, быстро, вполголоса сказать:

– Маладзік малады, у цябе рог залаты, табе на станне, а мне на здароўе, табе цёмныя ночы, а мне светлыя вочы.

***

Если дёргается веко, следовало приложить пальцы к глазам и говорить:

– Тётушка-дергушка, не трепи, не дёргай, ни вниз, ни вверх. Аминь.

## Для добрага здароўя

Увидев на небе молодой месяц, следовало попросить у него для себя доброго здоровья, потому тихо говорили:

– Батюшка, млад месяц, дорогой дружочек, золотой рожочек. Дай тебе, Господь, золотые роги, мне доброго здоровья.

Или так:

– Іду я к мору з вялікага гора, а ты, рыбка, страпяніся, ад гора адбіся. За тваю дабрату хлеб-соль кладу. Хлеб-соль прынімайце і здароўем надзяляйце.

## У дарогу

Выходя из дома, надо обязательно позвать с собой ангела-хранителя:

- Ангел мой, пойдём со мной, ты впереди, а я за тобой.

## Каб валасы раслі

Чтобы волосы у девочек росли лучше, надо было в канун Рождества положить верёвку под подушку:

– Чтобы коса была длиннее, чем верёвка.

## Каб куры добра несліся

Чтобы куры хорошо неслись и по чужим дворам не бегали, надо налить им воды, в которой хозяйка вымыла руки и ноги, туда же насыпать пшена и проговорить:

– Как на Пасху весь мир много яиц в руках держит, так бы много яиц моему дому, моему подворью. Во имя Отца и Сына и Святого Духа. Аминь.

## Ад пажару

Чтобы предостеречь свой дом от пожара, один раз в год на Крещенской неделе следовало прочитать:

– Шли святые за мной, несли чашу с во-

дой. Если пожару быть, святые станут пожар тушить. Не гори раз, не гори два, не гори три. Ни сегодня, ни завтра, никогда не гори. Святые стоят, мой дом охраняют. Аминь.

## Каб дзеці не забывалі бацькоў

Если дети выросли, забыли родителей, которые нуждаются в помощи, можно исправить так: выдернуть из веника прут в форме рогатки, водить по порогу и читать 9 раз:

– Накладываю я, раба божия (имя), печать-печаль на ретивое сердце своего дитяти по мне, своей мати. Где бы ты ни бывал, с кем бы ты ни гулял, а всё бы обо мне памяти не терял. Во имя Отца и Сына и Святого Духа. Аминь..

## Каб дзеці добра вучыліся

Чтобы дети хорошо учились, следовало вечером, глядя на яркий огонь в печи, говорить так:

– Как ты, пламя, горишь да разгораешься, от моего дыха колыхаешься, так бы горел и ярел на учение раб (имя). Аминь.

## На добры ўраджай

Корнеплоды садить под повню. В таком случае овощи пойдут не в ботву, а в корень. Слова при посадке корнеплодов:

– Корень к корешку, а вершок к вершку. Пусть будет сей корень крепок. Аминь.

## Ад зглазу

Если кто-то пристально смотрел на вас или вашего ребенка, необходимо про себя сказать:

– Соль тебе в глаза.

Не раз, трижды.

## Ахоўная

Огради, Господи, силою честного и животворящего Твоего Креста, от Духа плохого, от человека лихого и от всякого зла. Аминь.

## Ад болю

Господу Богу помолюсь, Святой Пречистай помолюсь. Божая Мать, приступи, от боли заговорить помоги. Боль, боль, уйди из кости малой и большой, тут боли не бывать, красной крови не видать, белой жилы не парить и здоровьем рабу Божью Елену наградить. Аминь.

## От бессонницы

Господь Бог со мной, ангелы по бокам, Матка Божья спереди, все болезни позади. 3 раза повторить. Да будет воля твоя.

## От неприятностей

Если на Коляды первой войдет чужая женщина – так как с ней могли войти все неприятности, надо сказать:

– Родись, Христос, родись, здоровье.

## Ад болю

У Адама болит голова. Адам передает боль Еве, Ева – змее, змея – яблоку, яблоко – солнцу, солнце – морю, море – ветру, а ветер ту боль развеял.

## Ад пракляцця

Если в ваш адрес “несутся” проклятия вслух или мысленно, трижды скажите:

– Вокруг меня круг, чертил(а) его не я, а Богородица моя. Во имя Отца и Сына и Святого Духа. Аминь.

## На здароўе

Увидев на небе молодой месяц, следовало попросить у него для себя доброго здоровья, потому тихо говорили:

– Батюшка, млад месяц, дорогой дружочек, золотой рожочек. Дай тебе, Господь, золотые рога, мне доброго здоровья.

## Для добрых вачэй

Если у ребёнка косоглазие, следовало смотреть на луну и говорить:

– Народится месяц, раскруглится, исправится и поправится, так чтоб и глаза раба божьего (имя) смотрели бы правильно. Аминь.

## Каб куры не клявалі яйкі

Чтобы куры не клевали яйца, следовало наговорить на воду или зерно и дать курам.

– Куры белы, куры серы, куры черны, не клевать вам звёзд на небе, а яиц в гнёздах. Ключ, замок, язык. Аминь.

## Чтобы цыплята были целы

Чтобы цыплята были целы, их следовало заговаривать. Посыпая им корм, приговаривали:

– Охрани, домовик, моих цыплят. Крепко слово, добро дело. Аминь.

***

Чтобы ворон (коршун) цыплят не таскал, следовало зажечь свечу возле птичника со словами:

– Ворогу-вороне мимо лететь, святому Фоме цыплят охранять. Аминь.

## На сон

Спацькі лажуся, на Бога спадзяюся. Крыж пада мной, Бог нада мной. Анёлы мае, станьце пры мне – што вам, тое і мне. Ва імя Айца і Сына і Святога Духа. Амінь.

## Чтобы вернуть сон:

– Дремота, зевота, покой найди на раба божьего (имя). Пусть он спит, отсыпается, по ночам не просыпается. Часты звезды – ему сестры, ясный месяц – ему брат. Добрый сон – ему кум и сват. Аминь.

## Чтобы петух не бегал по чужим дворам

Чтобы петух не бегал по чужим дворам (а то прибьют и съедят), надо забить гвоздь в первую половицу от двери со словами:

– Как этот гвоздь станет держаться полу, так петух держался бы своего дому. Аминь.

## От мышей

Для избавления от мышей и крыс следовало читать слова-обереги на убывающий месяц и обязательно в четверг:

– Помолюсь Господу Богу и всем святым. Господи милосердный, помоги мне с сего дня и до святой субботы. Было у царя Поганина 12 жен, а с двенадцати – одиннадцать, а с одиннадцати – десять, а с десяти – девять, а с девяти – восемь, а с восьми – семь, а с семи – шесть, а с шести – пять, а с пяти – четыре, а с четырех – три, а с трех – два, а с двух – ни одной. Так бы дал Господь, чтобы крысы и мыши с моего хозяйства ушли, пропали.

## От начальника

Читать, когда идешь к начальнику, или там, где тебя могут ругать:

– Святые пороги, будьте на защиту, на подмогу рабе божьей (имя). А вы, стенки, стойте немые, а вы, начальники, будьте милостивы к рабе Божьей (имя). Аминь.

## От плохого сна

Если приснился плохой сон, то его надо обязательно рассказать, и тогда он не сбудется. А ещё советовали про себя проговорить:

– У кого-то сон сбывается, а меня это не касается, Господь Бог со мной, а плохой сон долой. Аминь.

## На добрый сон

Если сон сулил что-то хорошее, то рассказывать его нельзя, иначе он не сбудется. Кроме этого надо было обязательно перекреститься и сказать:

–То, что во сне увидела, то всё себе забрала.

## Защитная

Ангел мой, идем са мной, ты впереди, а я за тобой.

*Запісана ў в. Малева*
*ад Гацілы Алены Веньямінаўны, 1935 г.н.*

## Ад іспугу

Іжэ на ўсякае ўрэмя і на ўсякі час, на небясі і на зямлі пакланяем і славім Хрысце Божа, долго церпялівен, многа міласцівы, многа благоўчон. Іжэ праведныя любя і грэшныя мілуе, іжэ свята мы радзі спасенія абяшчанія будучых благ. Госпадзі, прымі наша ўчасціе і малітвы, ісправі жывот наш на запаведзь тваім, душы нашы асвяці, целеса ачысці, памышленія ісправі, мыслі ачысці, ізбаві нас ад усякае скорбі і балезні, аградзі нас святымі сваімі ангеламі.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Чычко Соф'і Рыгораўны, 1934 г.н.*

## Ад перапалоху

Я бяру яйцо, разбіваю жаўток аддзельна, а бялок аддзельна. Тады вады наліваю і "Отчэ наш" расказваю і малюся над галавою. І памагае.

*Запісана ў в. Чанавічы*
*ад Сарокі Аляксандры Пятроўны, 1934 г.н.*

## У дарогу

Мяне маці парадзіла, сонейкам абгарадзіла, месяцам падпаясала, у дарогу адпраўляла. Ранні бег – недабег, позні бег – недабег. А мне ад Госпада Бога шчасліва дарога.

*Матэрыялы ўзяты з архіва Нясвіжскага раённага цэнтра народнай творчасці.*

Калі дзіця не спіць па начах, тады ўжо бабку клічаць, каб яна перапуг які яму выкачвала. Вот мая мама, прымерна, брала хлеб. Гэты хлеб скручвала і тым хлебам пакачае па жывоціку, потым гэты хлеб выкідвалі сабаку, каб ён гэты перапуг з'еў.

Пярэпалах на воск вылівалі: устаўлялі ў стакан і воск падпальвалі. Воск гарэў і тады вылівалі воск у воду. У вадзе ўсё відно. Так трэба выліваць дней тры, і потым вада становіцца чыстай. Воск мама сажме, назад яго сціснe, ўсё, патрымкае і паложыць.

Мама брала ў каласке жыта і гэтымі каласкамі над балячкай трымае і капае-капае, і пры гэтым яна малітву гаварыла. І гэта рабілі разоў тры.

## Калі дзіця не спіць

Калі дзіця не спіць, ужэ тады рабілі чары нейкія. То як ноч крычыць, нешта адсеквалі і на парог клалі якое крыло.

Спалоханае дзіця хто яйцам качае, адгаварвае, а хто некалі волава тое топіць над галавою.

## Ахоўная

Я па-своему, па-святому знаю, як ідзеш ,то перажымаешся, і кажаш:

– Каб Бог храніў хату, усё на свеце.

*Запісана ў в. Альбянка*
*ад Валчок Сафіі Ігнацьеўны, 1935 г.н.*

## Ад сурокаў

Пырскалі вадой цераз рэшата і казалі:

– Ад каго пашкодзіла, штоб мне памагло.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Хоміч Ганны Сцяпанаўны, 1944 г.н.,*
*(раней пражывала ў в.Каменка Нясвіжскага р-на).*

Былі бабкі-шаптухі. То ўдар, то лішай выгаворвала. Пярэпалах вылівалі на свечку грамнічную ў царкве, свянцоную, на яйцо, потым выкідвалі. Малітву чыталі, ды глядзяць, што будзе, ёсць хвароба ці не.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Галабурды Яўгеніі Уласаўны, 1934г.н.,*
*(раней пражывала ў в. Асмолава Нясвіжскага р-на).*





Бабкі выгаворвалі пярэпалах, вылівалі свечку на ваду.

*Запісана ў в. Нялепава*
*ад Буйко Таццяны Аляксандраўны, 1923г.н.,*
*(раней пражывала ў в. Пагарэльцы Нясвіжскага р-на).*

## Ад пярэпалаху

Ад пярэпалаха лячылі малітвамі.

Шрамы і пакраснення лячылі выпальваннем ружы. Трэба, каб быў лён і палаценца льняное сваёй работы, і свечачку бралі. Накрывалі тое месца льняным палаценцам і распраўлялі над палаценцам лён, надпалівалі. І, падпаліўшыся, лён падаў на палаценца, і бабуля нешта шаптала, і потым усё праходзіла.

Калі баліць галава, прывязвалі капусны ліст, або картошачку разразалі на долькі і прывязвалі на галаву, і чыталі малітву, і гэта дапамагала.

Калі балеў зуб, прыкладвалі цёплае салёнае сала.

*Запісана ў в. Слаўкава*
*ад Харытонавай Чаславы Баляславаўны, 1946 г.н.*

## Ад укусу змяі

Па шырокай дарозі, па зялёнай дуброві гадюка паўзе, услед за нею Божжая Мать ідзе, слядочкі лісточкамі прыкрывая, (імя) гадюччая жала вынімае і рабе божжай (імя) помачы давая. Ні мой дух, а Гасподні. Амінь.

## Ад пужання

Выгаварываю пужанне, пярепалы з імя, урошныя, улёшныя, намовныя, прыгаворныя, авечыя, чалавечыя, гусячыя, сабачыя, кацячыя, жарабячыя. Тут жа табе ,пужанне, пярепалы, не быць, сердца не таміць, дыхання не займаць, яды не запрагаць, галаве і жывату вреду не даваць. Ні сваімі думамі, гасподнімі славамі. Амінь.

## Ад скулы

Скула-скуланіца, красная дзявіца, вас 12 скул, 12 прышчыкаў, 12 падпрышчыкаў. Гарлянка, шкарлацянка, нарыца, паязычніца і каўтуніца, угаварываю я вас і ўпрашываю: ідзіця ж вы на мох, на балота, на гнілую калоду. Там вам пасць, там вам прапасць, у рабы божыя (імя) не бываць. Амінь.

## Ад уроку

На море, на акіяне, на востраве стаяла сасна тонка, высака, кареньем глубока. Зімой не баіцца марозу, а летам жары. Штобы (імя) раба божая не баялася ўроку ні радаснага, ні намоўнага, ні прыгаворнага, ні пужанага, ні влеканага, ні дробнага даждзя. Выкаціся, урок, макавым зярном, мышыным пяром. Як мяне не знав, тогда бушевав, як став мяне знаць, перестань бушеваць. Ні да схода, ні да маладзіка не прыхадзі. Гасподні зух, прынімі мой дух. Амінь.

## Ад кавтуна

Кавтун-кавтунец, маладой удалец, кавтуніца, маладая маладзіца, што лапушня, то лапушны, што падтынны, то падтынны, што намовны, то прыгаворны, што пужаны, то пужаны, што влеканы, то влеканы, ухадзі от рабы божай (імя), ня мучай. А то будзя ехаць Ісус Хрістос на сваём белым кані, будзя табе высікаць, вырубаць і па чыстаму полю раскідаць, і рабе божай (імя) помачы даваць. Ні мой дух, а гасподній. Амінь.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Чарнюк Яўгеніі Паўлаўны, 1932 г.н.*

## Ад спалоху

Як спалохаецца, то нада прачытаць малітву. Узяць воск свечкі і казаць:

- Вылівайся, пярэпалаха ўсякі-ўсялякі, чалавечы, скацячы, авечы. Памаліцца і гаварыць:

- Госпадзі Божа, памажы.

3 разы над галоўкай ваду абнесці, і тэю вадзічкаю трэба ўмыцца, вада простая, а гэту воду выліць, дзе стыкаецца плот з плотам.

*Запісана ў в. Альхоўка*
*ад Свірыдовіч Ларысы Сцяпанаўны, 1938 г.н.,*
*Карачун Ніны Сцяпанаўны, 1929 г.н.*

### На сон

Госпаду Богу памалюся, Святой Прычысці пакланюся, Святому Ісусу Хрысту. Маці дзіця парадзіла, месяцам абгарадзіла, звёздамі абкідала. Каб было блізка рабое, каб спалося спакойна.

*Запісана ў в. Смалічы*
*ад Міранчык Ірыны Пятроўны, 1936 г.н.*

### Перад ядою

Утрам нада маліцца і нанач нада маліцца, перад ядою. Ну, вось перад ядою, ну, гэта ж не па-царкоўнаму, а як мы гаворым:

- Благаславі, Госпадзі, сіё яду і піццё малітвамі Прысвятой тваёй Багародзіцы. Благадару цебя, Госпадзі, за пішчу нябесную.

*Запісана ў в. Новы Сноў*
*ад Рацкевіч (Рак) Ніны Іванаўны, 1941 г.н.*



*Алена Кастрыца*

## СВЕТ ПРЫКМЕТ І ПАВЕР'ЯЎ НЯСВІЖСКАГА КРАЮ

Шляхамі, сцежачкамі, пуцявінамі Нясвіжскага краю давялося нам, студэнтам і выкладчыкам Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ф. Скарыны, падарожнічаць падчас летняй фальклорнай экспедыцыі 2012 года. Вельмі цікавай і надзвычай плённай аказалася наша вандроўка: непаўторныя ў сваёй прыгажосці мясціны, шчырыя і гасцінныя людзі, цікавыя фальклорна-этнаграфічныя запісы, якія далі нам падставы меркаваць аб захаванасці ў памяці людской традыцыйных духоўных ведаў, гэтых своеасаблівых зярнятак мудрасці народнай, што ашчадна зберагаюцца і перадаюцца з пакалення ў пакаленне.

Як забяспечыць дабрабыт у гаспадарцы і добры ўраджай? Як пазбавіцца ад шкоднікаў і спрагназаваць надвор'е? Як забяспечыць доўгае жыццё новай сям'і і шчаслівы лёс дзіцяці? Што абяцае будучае і як пазбавіцца ад непрыемных нечаканасцей? На гэтыя і многія іншыя пытанні нашы продкі знайшлі адказы, якія прапанавалі нашчадкам у выглядзе прыкмет і павер'яў, вербальна складзеных клішыраваных утварэнняў, якія пэўным чынам увасобілі ў сабе маральна-этычныя нормы і асаблівасці светапогляду беларусаў.

У межах прыкмет і павер'яў, зафіксаваных на тэрыторыі Нясвіжскага раёна, можна выдзеліць дзве групы – прымеркаваныя да абрадаў і пазаабрадавыя, сярод якіх таксама варта выдзеліць шэраг функцыянальна-тэматычных падгруп.

Каляндарныя прыкметы і павер'і Нясвіжчыны, як і агульнабеларускія, прадстаўлены наступнымі групамі:

піліпаўскімі ("У Піліпаўку ў нас ніхто не жэніцца. Усе ж законаў дзяржацца" (в. Вайнілавічы));

калядныімі ("Сварым куццю, паставім на покуць, засланую сенам і абрусам. Сена ложаць для таго, каб быў добры ўраджай" (в. Лань); "На Каляды была такая прымета: глядзелі, хто на першы дзень зайдзе ў хату. Калі жанчына зайдзе першая, то авечэчка акоціцца, а як мужык – будзе бугайчык" (в. Лявонавічы); "Ваду свянцілі. Пырскалі вадой хату, хлявы, штоб добра было, хто п'е, каб здароўе было" (в.Аношкі));

масленічнымі ("На Масленицу чем дальше проедешь, тем лучше будет лён" (г. Нясвіж));

грамнічнымі ("Ну, свечкі, гавораць, шо як на Грамніцы запаляць, ды як трашчаць свечкі, то граза будзе, а як гараць ціхонька, спакойно, то, кажуць, не будзе. А як граза была, то запальвалі. Ды і цяпер жа мы грамнічныя свечкі запальваем" (в. Аношкі));

дабравешчанскімі ("Не трэба было трогаць зямлю да 7 красавіка, капаць не трэба было ніколі" (в. Лявонавічы); "Старыя людзі казалі, што нават валасы расчэсваць не можна. На Благавешчанне нічога-нічога не можна рабіць. Да Благавешчання ніхто нічога на агародах не рабіў" (в. Аношкі));

юраўскімі ("Выганялі карову ў поле, білі свянцонай вярбой, каб была паслушна, многа малака давала, прыходзіла дадому, нікуды не бегала. Басяком па расе бегалі. Гэта было сімвалам здароўя", "Качаліся па расе, ну, казалі, што гэта памагае ізбавіцца ад розных хвароб" (в. Лявонавічы));

велікоднымі ("На Вербную вярбу насілі свяцілі, а патом ставілі яе за іконай. Цяпер у нас у вазе стаіць. Гаварылі, што гэтай вярбою, старой вярбою, яна ж астаецца кожны год, першы раз выганяць кароў, на поле як выганяеш. Бывае, што і білі ўсіх, гаварылі: "Не я б'ю, вярба б'е", "Свянцонае яйка разразаем на кусочкі і ўсе елі, а шкарлупкі курам адавалі, каб куркі няслісь лучш" (в. Аношкі), "Калі паміраў чалавек, яйкі красілі ў чорны колер, ці не красілі" (в. Лявонавічы));

сёмушнымі ("Перад Сёмухай лапкі з ліпы ўтыкалі для таво, каб бура хаты не тронула. Потым іх спальвалі ў печы" (в. Смалічы); "На Троіцу ў нас бярозкі ставяць возле каліткі, а затым аер у хаце сыпалі, каб усе было харашо" (г. Нясвіж));

купальскімі ("Закрывалі дзверы сараяў, лажылі крапіву жгучую, каб ведзьма не прыйшла. Як паложаць крапіву, яна ўжо не прыйдзе" (в. Лань); "На Купала і па сёняшні час лажу крапіву, гэта для таго, што вроде бы як ведзьма, еслі яна будзе ісці ў хлеў, значыць, яна апячэцца" (в. Грыцкавічы));

спасаўскімі ("Бацькі, у якіх памерла дзіця, не елі яблакі да Спаса" (в. Вайнілавічы)),

"здвіжанскімі" ("На Здвіжанне хаваюцца ўсе змеі ў норы. Так не можна нічога з лесу несці ў дом, у падвал кідаць. Кажуць, будуць звіжэць і мышы, і пацукі, і краты, і жабы" (в. Карцэвічы); "На Уздвіжанне нельзя картофель сыпаць у пограб, а то там будзе ўсяго: і крысы, і ўсё" (в. Аношкі)),

пакроўскімі ("На Пакровы заганяюць каровы. Трэба, каб на полі ўсё собрана было. Усё ўбрана, паўбірана, пакапана" (в. Альбянка)) і інш.

Трэба адзначыць, што на тэрыторыі Нясвіжчыны таксама зафіксаваны прыкметы і павер'і, прымеркаваныя да шануемага мясцовымі жыхарамі свята Зельна ("На Зельну свянцілі каласкі. Гэтыя каласкі лажылі пад паталочак. Зелле свянцілі для таго, каб на наступны год быў добры ўраджай" (в. Лявонавічы); "На гэта свята, 28 аўгуста, свянцілі травы" (в. Вайнілавічы)).

Частка каляндарных павер'яў і звязаных з імі магічных дзеянняў носіць яскрава выражаную прадуцыравальную скіраванасць: гаспадары імкнуліся зрабіць усё магчымае, каб надыходзячы год стаў для іх спрыяльным. Так, паводле народных вераванняў, на Каляды можна забяспечыць добры ўраджай ("У час Калядак абвязвалі кожную яблыню саломай (верацяном) і забор. Калі праходзілі Каляды, гэта ўсё знімалі і спальвалі, каб быў харошы ўраджай" (в. Лань)) і дабрабыт у гаспадарцы ("Курам трэба даць [куцці], каб добра нясліся"; "І жывотным давалі кашы, гэта ж усё асвенчанае. Свінні, куры лучшэ расці будуць"; "А на другую куццю варылі цэлую калбасу, каб авечкі акаціліся па многа ягнят" (в. Вайнілавічы)), на Масленіцу – доўгі лён ("Святкавалі Масленіцу. У калхозах ездзілі на доўгі лён на канях" (в. Аношкі); "Гэта ўжэ на Улассе запрагуць каня і ўжо едуць, насядуць, хто ў госці куды, а хто і так сядуць, каб лён вялікі рос" (в. Грыцкавічы)), на Еўдакію – добрую капусту ("Считалось, что капуста не будет бояться морозов и даст большой урожай, если семена на рассаду посеять в день святой Евдокии (14 марта), в пост, смешав семена капусты с землёй и посеяв их даже по снегу" (в. Малева)), на Юр'я і Міколу – вялікую колькасць гуркоў ("Гуркі сею на Юр'е і на Міколу, каб урадзілі" (в. Аношкі)), на Пахома – ураджай гарбузоў ("Гарбузы на Пахома і на Міколу



Нясвіжскага краю напеў векавы

садзілі, каб добрыя былі” (в. Лань)), на Яна – “тоўсты” часнок (“На Яна гэта ўсягда і цяпер, і тады часнык абграбалі, каб тоўсты рос “(в. Вайнілавічы)) і інш.

Некаторыя каляндарныя павер’і маюць характар прафілактычных і апатрапеічных: яны адлюстроўваюць веру жыхароў Нясвіжскага раёна ў магчымасць засцерагчыся пры выкананні пэўных дзеянняў, якія рэгламентаваны і выконваюцца ў дакладна акрэслены час, ад шкоднага ўздзеяння благіх людзей (“На Купалле ж крапіву рвалі і затыкалі ўсюды: і ў дверах, і ўсюды, каб не прыйшла ведзьма”; “На Купала... крапівою выкладвалі сцёжку до сарая, каб ведзьма карову не спорціла” (в. Аношкі); “Адзін раз перад Калядамі куцця, другая – перад Новым годам і Шчадрацом, а трэцяя – перад Трыма каралямі. Падлажвалі сена, у каго карова была, каб ела, каб урокаў не баялася” (в. Сычэва)) і драпежных жывёл (“Юр’я заўсёды праводзілася, як выганялі кароў. Мы бралі свянцовую воду, замок, вярбу. Мы хадзілі вакол гэтага стада. Палівалі вадой, закопвалі замок, а замок закопвалі для таго, каб воўк не накінуўся на жывёлу” (в. Казлы); “Ну, вось, лажылі абрус на стол [на Юр’я], запальвалі свячу і пасыпалі хлеб соллю. Маліліся. Скаціну мылі вадою. Бацька кланіўся пяцьдзясят разоў і гаварыў: “Бяры хлеб з солю, глядзі скаціну, каб ня здарылася дрэннага” (г. Нясвіж)), ад неспрыяльных з’яў навакольнага асяроддзя (“На Грамніцы свяцілі свечкі ў цэркве, а потым дома рысавалі хрэсцікі на ўхадных дзвярах. Свечкі, як грыміць, палілі. Спасаюць, кажуць, ад грому” (в. Вайнілавічы)) ці заняпаду ў гаспадарцы (“До Благовещения или Радуницы нельзя трогать землю – будет неурожай”; “У той дзень тыдня, як была галодная куцця ці панядзелак, ці аўторак, не сажаюць, не сеюць, бо будзе благі ўраджай” (в. Малева); “Благавешчанне – гэта вялікі празнік. Нельзя расчэсвацца дзяўчыне. Я ўжо старалася не расчэсвацца, бо калі будзеш расчэсвацца, то куры выграбуць што-небудзь на агародзе” (в. Вайнілавічы)).

Падчас палявой экспедыцыі па Нясвіжскім раёне намі запісана шмат тэкстаў прыкмет, якія па сваёй функцыянальнай скіраванасці з’яўляюцца прадказальнымі. Да прыкмет звярталіся, каб меркаваць аб асабістым лёсе (“Рождённые 1 марта, на Благовещение, на Яблочный спас будут несчастливыми”; “Кто увидит ласточку на Благовещение, тот весь год удачливым будет” (в. Малева) і будучым (“Примечали, кто первым придёт в дом в Новом году. Считалось, если мужчина – год будет успешным, прибыльным, везучим, если женщина – во всём семью будет ожидать невезенье” (в. Малева), гаспадарчых справах (“Як прыйдзе мужчына на Каляды, то аходзіцца авечка, будзе баранчык, а жанчына, то дзевачка, цялушачка, авечачка” (в. Малева)), ураджаі (“Некалі на Куццю ўжэ глядзяць: як зоркаў на небе многа, то ўжо будзе першы ўражай вельмі ўражайны, як няма ўжо зорак, то не будзе” (в. Аношкі); “На Купалу раса – будуць агуркі” (в. Малева)) і надвор’і (“На Пакровы зарыкаюць у хлеве каровы – будзе холад. Як на Пакрову цёпла, то да Новага года будзе цёпла” (в. Альхоўка); “Калі на Юр’е пойдзе дождж, то на ўсе празднікі будзе дождж”(в. Смалічы)).

Варта адзначыць, што ў межах прадказальнай групы ёсць тэксты прыкмет, не звязаныя з календаром, прычым іх вельмі шмат, ды і функцыянальна-семантычны дыяпазон гэтых прыкмет больш разнастайны: яны прагназуюць удачу (шчасце) (“Кажуць, калі дачка падобна на бацьку – шчаслівай будзе” (в. Нялепава)) або няўдачу (няшчасце) (“Калі птушка ў акно стукае, то гэта кепска, к бядзе” (в. Карцэвічы)), радасць (“Хто ў сне плача, то наяве будзе смяяцца” (в. Лань)) або сварку (“Соль вот рассыплецца – к соре” (г. Нясвіж)), прыбытак (“Калі на смецце нападзеш, кажуць, што багатым будзеш. Ну, во калі зайшоў у хату, а там смецце, будзеш багаты” (в. Новы Сноў)) або страту (“Калі нож на сталe аставіш – бедна жыць будзеш” (в. Кіркаўшчына)), сваю дарогу або прыход гасцей (“Ложка ўпала – госць прыдзя. Як нож упадзе – ён прыдзе. Як ложка ўпадзе, то яна прыдзе” (в. Альхоўка)), хваробу або смерць (“Сабака вые ўніз – хтосьці памрэ. Калі пераносье чэшацца, то хтосьці памрэ” (в. Малева)) і інш.

Неабходна звярнуць увагу таксама і на распаўсюджанасць на тэрыторыі Нясвіжчыны павер’яў-правіл і павер’яў-забарон для розных жыццёвых сітуацый: захавання прыгажосці (“Нельга ў люстэрка глядзецца ўдваіх – красату аддаш” (в. Нялепава)), здароўя (“Нельга долу кідаць валасы – галава балець будзе” (в.





Малева)) і дабрабыту (“Стары венік з старой хаты не выкідваюць – грошай не будзе” (в. Кіркаўшчына), забеспячэння ўдачы (“Калі выходзіш з хаты, трэба яе перакрасціць. Калі гэтага не зробіш і вярнешся, то нічога не палучыца” (в. Грыцкавічы) і спрыяння з боку вышэйшых сіл (“Нельга хлеб выкідаць – Бог крыўдзіцца” (в. Нялепава)) і да т.п.

Прыкметы і павер’і сямейнай абраднасці вельмі папулярныя сярод жыхароў Нясвіжскага раёна. Тэксты вясельных павер’яў адстроўваюць веру людзей у магчымасць паўплываць на лёс новай сям’і (“Калі ад’язджалі, кідалі зярно, абыходзілі, каб харашо жылі” (в. Лань); “Сваха брала ікону, палаценцэ, а патом як ужэ прыязджаюць, сразу румкі б’юць, а патом па канфеце ядзяць, каб сладкая жызнь была ” (в. Новы Сноў)) і ўзаемаадносіны маладых (“Маладая не спявала на вяселлі, трэба, каб маўчала, а не то плача, бо будзе жыць кепска” (в. Карцэвічы), на дабрабыт у новай гаспадарцы (“...з іконаю маці родная абходзіла кругом ваза, у фату зярнят, жыта абычна сыпалі. Бывае, у каго дванаццаць вазоў, то абыйдзе ўсе і абсыпае тры разы. Это, мусіць, каб былі багатыя, каб шчаслівыя” (в. Вайнілавічы)).

Прыкметы і павер’і, тэматычна звязаныя са смерцю чалавека і працэсам яго пахавання, прадстаўлены наступнымі функцыянальна-семантычнымі групамі:

- прыкметы-прадказанні смерці (“Як б’ецца ў акенца любая пташка, то памрэ хто-небудзь. Калі сабака лае, то памрэ хто” (в. Карцэвічы));
- павер’і-рэкамедацыі да паводзін людзей падчас падрыхтоўкі нябожчыка да пахавання: занавешваць люстэркі і прыпыняць гадзіннікі (“Зеркала завешвалі, гадзіннікі астанаўлівалі ў гэтым доме” (в. Жанкавічы)), мыюць чужым або старым (“Мыяць пакойніка пажылыя, завуць каго. Ваду ў вугол выліваюць, дзе чалавек не ходзіць” (в. Карцэвічы)), не спаць (“Цэлую ноч гарыць свет. Сядзець трэба з труной, каб не было скучна пакойніку аднаму” (в. Грыцкавічы)), класці ў труну або магілу пэўныя прадметы (“Грэбень трэба ў гроб палажыць, ён спатрэбіцца”. Калі чалавек памёр – трэба ногці пакласці ў труну” (в. Нялепава); “У могілкі кідаюць манеты для продкаў” (в. Лань)), не плакаць (“Нельга было плакаць у труну, бо сніцца будзе”, “Нельга плакаць па пакойніку, бо будзе ў вадзе, плоха яму будзе” (в. Малева));
- павер’і-рэгламентацыі паводзін людзей падчас праходжання пахавальнай працэсіі і пасля яе: выносіць нябожчыка нагамі ўперад і апускаць тройчы труну на парог (“Труна выносілася нагамі ўперад. Выносілі і на пароге труну тры раза на парог спускаюць”, “Нужно пастучаць аб парог, кагда выносят пакойніка, чтобы прінял тот мір” (г. Нясвіж)); не ісці насустрач пахавальнай працэсіі (“Нельзя ідці навстрэчу, усе астанаўліваюцца і ждут, пака не пройдуць з пакойным” (в. Лань)) і не пераходзіць дарогу (“Нельга пераходзіць дарогу, калі вязуць нябожчыка” (в. Нялепава)), ставіць елачкі (“Па мертвяцу ставяць елачкі ў варотах, як мертвеца ўжо хаваць будуць, елачкамі кідаюць, і каля кладбішча дзве елачкі стаяць. І ў дамах на варотах і на кладбішчы”; “Лапкі вот этыя з ёлачкаў ставяць, штоб не вярнуўся, значыць, дух дахаты апяць” (в. Лявонавічы)), засцерагаць дзяцей (“Калі памерлага вязуць, а ў хаце спіць малое дзіця, то малому каля галавы ложаць грабёнчык або рашчосачку” (в. Малева); “Як спіць дзіця малое і нясуць мерцвяка, трэба нож пад ніз падлажыць, бо, кажуць, спуджана после тады будзе дзіця” (в. Слаўкава)).

Вялікай разнастайнасцю адрозніваюцца радзінна-хрэсьбінныя прыкметы і павер’і. Гэта і забароны для цяжарных (“Нельга цяжарнай пераступаць праз вяроўку – у дзіцяці будзе кішка за горла. Нельга цяжарнай абіжаць жывотных, будзе сівое дзіця” (в. Вайнілавічы); “Цяжарнай нельга было біць сабак і катоў – будзе шэрсць у дзіцяці. Нельга праходзіць праз столб – будзе дзіця абкручаны пупавінай” (в. Лявонавічы)), і правілы для лёгкіх родаў (“Расшпільвалі ўсё, каб легчы было раджаць. Дажа як павядуць у бальніцу, бабка раскрывае дзверы, каб лёгка было раджаць” (в. Вайнілавічы); “Цяжарнай жанчыне нельга пераступаць цераз нож, штосьці вострае – будзе цяжка раджаць” (в. Нялепава”), і прыкметы-прадказанні і павер’і аб здароўі, жыцці і лёсе дзіцяці (“Дети, рождённые в первой половине дня, будут более здоровыми и проживут больший век, чем дети, рождённые во второй половине дня и особенно поздно вечером”, “Ребёнка не стригли до

года, чтобы не “укоротить” ум” (в. Малева), “Як дзіця не ходзіць, дак трэба цераз парог тры раза перасадзіць” (в. Грыцкавічы), і павер’і-рэкамендацыі супраць сурокаў (“Каб засцерагчы прарадзіху ад сурокаў, шпільку зашпільваеш ды ходзіш з ёй” (в. Альбянка); “Фартук абязательно доўжын быць, штоб малое не баялася зглаз” (в. Смалічы)).

Трэба адзначыць, што прыкметы і павер’і – гэта своеасаблівы звод народна-практычных ведаў і жыццёвая мудрасць, паэтычнае ўспрыманне наваколля і невычэрпная фантазія, гэта дзівосная карціна свету, створаная нашымі продкамі.



## ПРЫКМЕТЫ І ПАВЕР’І

Вера – эта і есць вера в себе. Если ты шчыра верующчый чалавек і верыш вельмі, то яно абязацельно сбудзецца.

Усе знаюць, што смецце нельзя выносіць вечарам, бо нешта здарыцца.

Калі кот перабег дарогу, значыць, плоха. Я не веру в эта.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Высоцкай (Чараповіч) Валянціны Аляксандраўны, 1935 г н.*

Выйшаў на вуліцу, і кто-то табе перашоў с пустым ведром дарогу, то абязацельно будзе неўдача.

Калі што-та забыў, выйшаў з дому, то лучше не вяртацца, лучше не іці, всё раўно не павезёт.

Если хлеб упаў, то кто-та вернецца галодны.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Дзішук ГаліныМарцінаўны, 1938 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Качановічы Нясвіжскага р- на).*

Соль вот рассыплецца – к ссоре.

Нож, гаварат, нада пратаць на ноч – ад дамавога, патаму што парэжацца, абідзецца.

Даваць чэраз парог нельзя, патаму што вясціся не будзе.

Дзеньгі ў свята ілі ў васкрэсенне аддалжаць нельзя. І доўг забіраць нельзя.

На радзіны нада адкрываць вокна і дверы, штоб лягчэй радзілася, дажэ ў шкафах дзверы адкрывалі.

Цяжарнай нельзя нагінацца, цяжку работу рабіць, нельзя пераскакваць цераз забор, нельзя пляваць на што-та, смяяцца ні с каго нельзя.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Качура Таццяны Паўлаўны, 1948 г.н.*

На столе нельзя нож оставлять – к ссоре.

Если соль рассыпешь – тоже к ссоре, говорят. Если хлеб со стола упал, значит, мужчина к вам придет, а если вилка или ложка – женщина.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Праходы Святланы Міхайлаўны, 1950 г.н.*
*(раней пражывала ў г. Ветка Гомельскай вобл.).*

Калі дождж раней звалі – мак у калодзеж кідалі.

*Запісана ў в. Альхоўка*
*ад Вальчык Анастасіі Іванаўны, 1927 г.н.*





Як спяшыць хто, дык ложка ўпадзе. Ну, сёння ў мяне падала, а я ж не знала, што ў мяне здалёку госці будуць.

*Запісана ў в. Альхоўка*
*ад Драчан (Грахоўскай) Людмілы Антонаўны, 1923 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Карцэвічы Мінскай вобл.).*

Ложка ўпала – госць прыдзе. Як нож упадзе – ён прыдзе. Як ложка ўпадзе, то яна прыдзе.

Ластачкі нізка над зямлёй летаюць – дождж будзе.

Быў некалі Спас і свяцілі яблакі, мак і, як доўга няма дажджу, ужо сеялі ў тры калодзежы мак, сыпалі панямножку і прасілі ў Бога, каб дождж пайшоў.

*Запісана ў в. Альхоўка*
*ад Кузьміч (Мазан) Марыі Дзмітрыеўны, 1932 г.н.*

Калі матка была ўдавой, то нельга было на свадзьбе абыходзіць маладых з іконай.

Калі ластаўкі нізка над зямлёй лятаюць, то кажуць на дождж.

*Запісана ў в. Грыцкавічы*
*ад Заяц (Пятроўскай) Марыі Антонаўны, 1937 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Мацылеўшчына Нясвіжскага р-на).*

Чорны кот дарогу перабяжыць – гэта, кажуць, не павязёт, але гаворáць гэта яму, кату, не павязёт.

Бывае, заяц как перейдёт дарогу – нікагда не ідзі, варочайся назад.

*Запісана ў в. Грыцкавічы*
*ад Капусты Яўгеніі Барысаўны, 1939 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Шавялі Ляхаўскага р- на).*

Канечна, веру ў прыкметы. Вось іду ў магазін, ідзе баба насустрэчу, значыць, не павязе. Вот абязацельна. Вот паследні раз хадзіла ў апцеку, дайшла да срадзіны дарогі, забыла грошы. Я ж не знала, што забыла, но я встрэціла жэншчыну. А еслі мужчыну встрэціш, то ўсё харашо будзет.

Нельзя пасля заходу сонца ваду, якой мыешся, выносіць з хаты, бо не павязе.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Атрошчанка Анастасіі Аляксееўны, 1929 г.н.*
*(раней пражывала ў г.п. Карма Гомельскай вобл.).*

Каб не зглазілі, трэба насіць тры шпілечкі ўніз галоўкамі, штоб яны былі ў каждага чалавека.

Еслі бярэменая, нада штоб краснае насіла ад зглаза.

У мяне ад маланкі всегда на акне стаіць вада свянцоная і свечка грамнічная. Іконку купіла “Купіна”, яе павесіла ад пажару.

Нельзя даваць вечарам нічога – хлеб, соль, іголкі. Знаю, усе на гэта робіцца.

Калі мода пашла па бабкам пасылаць, дык я ездзіла. Калі плахі чалавек зайшоў, гэта з гадамі чувствуеш. Трэба тры раза вады, тры раза пяска, во, як выйшаў, услед трэба яму.

У брата дарога была, а па целявізару сказалі, што нельзя ехаць. І пцічка в акно стукнула, тожа плахая прымета. Усё – ключы, мабільнік – забыў, вярнуўся. У эта врэмя нельзя была нікуда ехаць, ен знаў і ўсе роўна паехаў. І папаў у аварыю.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Булыгі (Есіс) Ніны Міхайлаўны, 1958 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Панач Мінскай вобл.).*

Цяжарным трэба засцерагацца пажара. Ну, глядзець можна, толькі рукой трогаць нельзя не ліцо, не рукі.

Я чула, што цяжарнай, калі ражала, лажылі нож пад ложак на хлопчыка, гэта, мусіць, не на хлопчыка, а лічылі, што злую сілу адганяюць.

Цяжарным валасы нельга стрыгчы.

З калодца ваду як бярэш, то кажуць, як поўнае вядро, адліваць у калодзеж не можна, бо будзе рэбёначак бальны. Во як ўзяў вядро, так яго і нясі.

Нельга, як якія простані сціраеш ці пададзеяльнікі, закручваць і сжымаць, бо, кажуць, дзіця будзе абвіта пупавінаю.

Валасы не стрыгчы, бо дзіця будзе неразумнае.

Каб лягчэй радзіла, я адно чула, што замок пад ложак лажылі.

Бяроза – гэта харошае дзерава.

Ёлку нельзя садзіць ля забора, бо к смерці прыводзіць, а на аколіцы можна садзіць.

Плакучую іву нельзя садзіць. Во сядзела ў нас плакучая іва, і адна жанчынка ідзе і гаворыць:“Удаліце вы плакучую іву”. Я кажу: “Чаму?” “Таму што яна, гаворáць, гэта плоха”. І праўда, знаеце што, я з бальніцы не вылазіла без канца. Як удалілі мы яе – і ўсё. Яна на агародзе сядзела.

Харошая птушачка ў акно стукаецца, значыцца, на харошае. Асобенна як варона пастукаецца, то плоха.

Прымерна, як жанчына бярэменная, і як

што сячэш, то не можна: будзе дзіця інвалід.

Выклікалі дождж: сеялі ў калодзеж мак цераз чулок і там ўжэ гаварылі.

Гарбузы на Пахома і на Міколу садзілі, каб добрыя былі.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Жук Алены Мікалаеўны, 1969 г.н.*

На маё вяселле памерла свякруха, а людзі гаварылі, што брак будзя някрэпкі. Дак я і пражыла з мужам толькі тры гады.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Плотнікавай (Максімовіч) Таісіі Пятроўны, 1940 г.н.*

Калі першы гром, то па зямлі катаюцца, каб спіны не балелі. І зараз так робяць.

Першы раз, калі зязюлю пачулі, трэба каб грошы былі ў кармане, значыць, пры грашах будзеш.

Праз парог нічога даваць не можна, гавораць, што сварка палучыцца.

Калі нябожчыка выносілі, труну аб парог стукалі, калі праз дзверы неможна, то праз акно выносілі.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Шусты Марыі Антонаўны, 1940 г.н.*

Ластачка нізка лятае – дождж будзе.

*Запісана ў в. Лань ад Ярмаліцкай*
*(Страшко) Людмілы Казіміраўны, 1937 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Дубейкі Нясвіжскага р-на ).*

На акно ікону ставілі ад маланкі, грамнічныя свечкі палілі.

Нельга выносіць мусар пасля захода сонца.

Калі на смецце пападзеш, кажуць, што багатым будзеш. Ну, во калі зайшоў у хату, а там смецце, будзеш багаты.

*Запісана ў в. Новы Сноў ад Абрамовіч (Ярашэвіч)*
*Станіславы Антонаўны, 1938 г.н.*

Бяруць вілкі, якімі чыгуны цягаюць, і выкідаюць на перакростак, калі навальніца. Цяпер жа гэтага не робяць.

Ад пажара моляцца іконе нерукатворнай, грамнічную свечку запальваюць, моляцца Богу.

*Запісана ў в. Новы Сноў*
*ад Рацкевіч (Рак) Ніны Іванаўны, 1941 г.н.*

Былі такія забароны для цяжарнай. Была прымета, каб цяжарная не пералівала вады, бо будзе дзіцятка пасля яды адліваць. Булавачку не насілі на грудзях, бо будзе на пераноссі сінячок.

Рассыпаная соль – к ссоре.

Нож нельзя аставляць на стале – денег в доме не будет.

Через парог нельзя здароваца і перадаваць што-небудзь.

*Запісана ў в. Слаўкава*
*ад Макавец Чаславы Вітольдаўны, 1943 г.н.*

Цяжарнай не можна глядзець цераз шчэль, бо радзіцца касы рабёначэк. Не можна пляваць у калодзец і есці каля калодца, таму што будзе дзіця не то жаднае, не то слюнявае.

Не можна чэраз крыла пціц пераступаць, таму што дзіцятка будзе круціцца і будзе ўсё крахтаць і крахтаць. Еслі дзіця так крахтала, то яго бралі і насілі ў бярлогу, дзе ляжала свіння, у хлеў. Пасля гэтага переставала дзіця крахтаць.

*Запісана ў в. Слаўкава*
*ад Халоп Марыі Аляксандраўны, 1933 г.н.*

Клалі грошы пад вугал, каб грошы вяліся або хлеб.

Нельзя глядзецца ў разбітае зеркала, бо няшчасце будзе

*Запісана ў в. Слаўкава*
*ад Шыкулы Яўгеніі Іосіфаўны, 1914 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Ракавічы Нясвіжскага р-на*
*Мінскай вобл.).*

Іспугі воскам вылівалі.

Нельга храніць фатаграфіі памерлых з фатаграфіямі жывых, бо будуць балець часта.

*Запісана ў в. Слаўкава*
*ад Халоп Марыі Аляксандраўны, 1933 г.н.*

На ноч не нада астаўляць нож на стале, абязацельна нада, штоб нож быў на сваім месцы.

Еслі свіння апарасілася, то нельзя нічога з хаты тры дня даваць.

Нельзя часы дарыць, бо часыestануць і чалавек памрэ.

*Запісана ў в. Смалічы*
*ад Шчурскай Ірыны Мікалаеўны, 1935 г.н.*

Цяжарнай забаронена чэраз вяроўку пераступаць, патаму што гаварат, што пупавіна закруціцца.

*Запісана ў в. Сычэва*
*ад Казей Валянціны Паўлаўны, 1930 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Засулле Стаўбцоўскага р-на).*





Калі ластаўкі нізка лятаюць – гэта, кажуць, на дождж.

Калі птушка ў акно стукае, то гэта кепска, к бядзе.

*Запісана ў в. Карцэвічы*
*ад Цвірко Алены Пятроўны, 1941 г.н.*

У нас памятнікі ставяць і аграды толькі восенню ілі раней вясной. Як ужо начынаюцца палявыя работы, тады ўжо не ставяць, не можна. Так раманціраваць ідуць, а на новых магілах не ставяць. Счыталі, што гэта ўжо дажджа не будзе.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Акулік Марыі Уладзіміраўны, 1944 г.н.*

Гуркі сею на Юр'е і на Міколу, каб урадзілі.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Майсеня Таццяны Антонаўны, 1936 г.н.*
*(раней пражывала ў г. Нясвіж Мінскай вобл.).*

Як б'ецца ў акенца любая пташка, то памрэ хто-небудзь.

Калі сабака лае, то памрэ хто.

*Запісана ў в. Карцэвічы*
*ад Крыўко Наталлі Мікалаеўны, 1934 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Малева Нясвіжскага р-на).*

На Яна гэта ўсягда, і цяпер і тады, часнок абграбалі, каб тоўсты рос.

*Запісана ў в. Вайнілавічы*
*ад Кароль Ніны Вячаславаўны, 1927 г.н.*

Некалі на Куццю ўжэ глядзяць: як зоркаў на небе многа, то ўжо будзе першы ўраждай вельмі ўражайны, як няма ўжо зорак, то не будзе.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Шарапа Анастасіі Сцяпанаўны, 1933 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Каменка Нясвіжскага р-на).*

Цяжарнай жанчыне нельга было пазычаць.

Калі цяжарная жанчына прыдзя пазычаць, дык як хлебам хто кіне, то дзіця будзе есці хлеб, а калі глінай, то будзе галодны.

Нельга цяжарай пераступаць праз вяроўку – у дзіцяці будзе кішка за горла.

Нельга цяжарнай абіжаць жывотных – будзе сівое дзіця.

*Запісана ў в. Вайнілавічы*
*ад Камлач Яніны Валянцінаўны, 1936 г.н.*

Нізка лятаюць ластачкі – гэта к даждю.

Калі сабакі выюць, то к пакойніку.

*Запісана ў в. Вайнілавічы*
*ад Запольскага Валянціна Валянцінавіча, 1957 г.н.*

Як пажар, ды спалохаешся і от возьмешся – там будуць чорныя пятны ў дзіця. Я тожа была дочкаю першай цяжарная – і граза гэтакая ў ночы. Як схапілася, дык, помню, раз – і ў яе палец астаўся. А ў нас адна тожа тако во за твар схапілася.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Сінькевіч Вольгі Віктараўны, 1927 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Каменка Нясвіжскага р-на).*

Агарод трэба садзіць, калі новая луна (маладзік).

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Аксак Ганны Мікалаеўны, 1952 г.н.*

Гуркі і памідоры пад поўню трэба садзіць. Пад поўню садзяць цыбулю, каб хрумянька была. Прыбывае поўня, і агарод прыбывае.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Матус Яўгеніі Міхайлаўны, 1930 г.н.*

Калодец капаць не ў любым месцы масцер будзе. Ён ложыць яйцо пад шапку. Шапку падніме, як мокрае будзе яйцо, то там вада. Палачку мог паставіць, як яна гнецца, скажа, ці есць тут вада.

*Запісана ў в. Вайнілавічы*
*ад Запольскага Валянціна Валянцінавіча, 1957 г.н.*

Як у абедзе стануць петухі спяваць – дождж заўтра будзе.

*Запісана ў в. Вайнілавічы*
*ад Кіпець Тамары Рыгораўны, 1926 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Асмолава Нясвіжскага р-на*
*Мінскай вобл.).*

Ластачкі на правады налятуць, то будзе дождж.

Буслы прылятаюць перад Благавешчаннем, а ўлятаюць перад Зельнай.

*Запісана ў в. Вайнілавічы*
*ад Камлач Вольгі Іванаўны, 1934 г.н.*

Як доўгі дождж будзе, то куры не будуць хавацца, а як кароткаўрэменны, то ўсе забягуць у сарай.

*Запісана ў в. Вайнілавічы*
*ад Волкавай Марыі Уладзіміраўны, 1931 г.н.*

Цяжарнай нельга было біць сабак і катоў – будзе шэрсць у дзіцяці.

Нельга праходзіць праз столб – будзе дзіця абкручана пупавінай.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Аксак Ганны Мікалаеўны, 1952 г.н.*

Як з ранку на Пакрову холадна, то будзе ранняя вясна і халодная, а як ўжо пад канец – ужэ тады пад канец будзе.

Як пworld прыляціць птушка ў акно, то эта птушка дае знак. Дваццаць год таму назад прыляцела і пастукала ў акно, і мая цётка памерла. І калі замуж ішла, дык я ўжо не ведала, нашто яна стукае: ці яна на вяселле, ці яна на гэтае. Тое бывала, і тое было.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Лепяцілы Ніны Уладзіміраўны, 1930 г.н.*

Цапля ляціць на поўдзень – это на дождж, а еслі ляціць на поўнач – это на пагоду.

Калі хлопца якога забіралі ў войска, шапку ў хату варочалі, рубашку яго насілі і штаны. І прасілі Бога, каб назад вярнуўся.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Драчан Ірыны Міхайлаўны, 1933 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Альхоўка Нясвіжскага р-на).*

Ластачка лятае нізка – к дажджу.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Шуковіч Галіны Міхайлаўны, 1946 г.н.*

Калі брэша сабака, то гэта смерць.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Салавей Ірыны Іосіфаўны, 1933 г.н.*

.

Агурцы садзілі дваццаць втарога мая.

На пароге нельзя сядзець дзяўчатам маладым, бо замуж не выйдуць.

*Запісана ў в. Малева*
*ад Васільевай Зінаіды Віктараўны, 1950 г.н.,*
*(раней пражывала ў в. Кукавічы Капыльскага р-на).*

Если найденную на дороге подкову кинуть через левое плечо и загадать желание, оно обязательно сбудется.

Знали, что высаживать рассаду должна только женщина. Если к рассаде прикоснется мужчина, то проку не будет: растение пойдёт в ствол и зацветёт.

На Юрьев день рано утром надо было обязательно поваляться по траве, потому что “Юрьева роса от сглаза, от семи недугов”. Такие действия предрекали здоровье на целый год: “Быть здоровыми, как Юрьева роса”.

Когда солнышко закатилось, новой коврига не начинай – нищета одолеет.

Чтобы быть счастливым и удачливым, в начале и в конце обеда съешь немного хлеба с солью.

Если, заслышав кукушку справа, загадать самое сокровенное желание, оно обязательно сбудется в этом же году.

В тот день, на который выпадает Благовещение, осенью необходимо засыпать картофель в погреб (гнить не будет).

Не садите квактуху в среду, а то выйдут одни петухи.

В понедельник или пятницу выезжать или начинать работу не стоит, потому что это плохие дни.

Избегайте одалживать деньги в понедельник – всю жизнь будете в долгах.

Не выносите мусор из дома после заката солнца и в воскресенье.

До Благовещения или Радуницы нельзя трогать землю – будет неурожай.

Засевать хлеб во вторник или субботу – получите хороший урожай.

В день Крещения не выносите воду из дома.

На Купалу роса – будут огурцы.

Если кукушка кукует, когда лес еще не оделся, будет голодный год.

Кто увидит ласточку на Благовещение, тот весь год удачливым будет.

Если 1 апреля обмануть 12 человек, то весть год вам будет везти.

7 апреля следует окуривать лук, тогда он не пойдет в стрелы и не будет гнить.

Запаситесь в Чистый четверг солью. Если носить несколько крупинок соли в течение года на груди, она будет охранять вас и ваш дом от многих несчастий.

Если ребенка зачать в ночь с понедельника на вторник – будет мальчик, если в ночь с пятницы на субботу – девочка.

Тот, кто оставляет на столе недоеденный хлеб, тот теряет свое здоровье.

12 июня запрещалось ходить в лес. Считали, кого укусит в этот день змея, тот не выживет.

Если на Пасху к вам придёт чужой человек и сядет за ваш праздничный стол, то вам будет везти в делах весь год.

В Святое воскресенье и всю Пасхальную неделю брать и давать в долг строго воспрещается.

Не убивайте животных, не режьте скот, не рвите цветов и не ломайте веток в день своего рождения и в день именин. Ваш век будет длиннее милостью Божьей и благодарной природой.

Чтобы волосы быстро отрастали, опытные люди советовали стричь волосы на растущей луне: луна растет, прибывает, так и волосы будут расти – прибывать.

Ровно в год надо подстригать ребенка.

На протяжении первого года жизни ребёнку запрещалось стричь ногти: мать должна была их откусывать: считалось, что отрежешь его судьбу.

На протяжении всей жизни запрещалось стричь ногти во вторник и четверг, иначе на пальцах будут заусеницы. Нельзя стричь и в праздничные дни.

Не садитесь обедать за стол, не застланный скатертью, в доме исчезнет достаток.

Беременной женщине нельзя стричь косы, чтобы не останавливать внутриутробное развитие ребёнка.

Беременной женщине нельзя садиться на камень: чтобы дитя не скаменело.

В тот день недели, когда была голодная кутья, или понедельник, или вторник, не садят, не сеют, потому что будет плохой урожай.

Беременной нельзя лазить через окно – ребёнок родится неживым.

Беременная женщина не имеет права целовать покойника, быть на похоронах, сидеть за поминальным столом, посещать кладбище в поминальные дни.

В течение 40 дней после родов женщина не имеет права ходить в храм.

Беременная женщина и женщина, родившаяся ребёнка, на протяжении 40 дней не имеет права быть крестной матерью.

Если ребёнок родился обвитый пуповиной – будет несчастливым, если с длинными волосами или в “сорочке”, удачливым и счастливым.

Рождённые 1 марта, на Благовещение, на яблочный Спас будут несчастливыми.

Дети, рождённые в первой половине дня, будут более здоровыми и проживут больший век, чем дети, рождённые во второй половине дня и особенно поздно вечером.

Не играют свадьбы в мае и в високосный год.

Если упала домашняя икона – в семье скоро будет покойник.

Кто умирает в большой праздник, того Бог сразу в рай забирает.

На то место, где стоял гроб с телом умершего, желательно положить топор, чтобы пересечь дорогу смерти.

После выноса покойника из дома, необходимо бросить на пол горсть зерна, чтобы жизнь в этом доме продолжалась.

Примечали, кто первым придёт в дом в Новом году. Считалось, если мужчина год будет успешным, прибыльным, везучим, если женщина – во всём семью будет ожидать невезенье.

*Запісана ў в. Малева*
*ад Гацілы Алены Веньямінаўны, 1933 г.н.*

Вот бывае пажар, можа цопнуть сябе за ліцо цяжарная, і будзе пятно цёмнае ў дзіця.

Пляваць не нужна, бо будзе ў рабёнка з роту ваніць.

Шыць на сабе нельга было і рэзаць.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Салавей Ірыны Іосіфаўны, 1933 г.н.*

Бярэменная не далжна пераходзіць чэраз вяроўку, каб не было каля шыйкі малога перавязана пупавіна.

Кагда пажар, не трэба было штоб да цела датрагівалася, тады будзе ў малога пятно там жа.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Шуковіч Галіны Міхайлаўны, 1946 г.н.*

Новогоднюю ёлку следует ставить в доме вечером 24 декабря (в эту ночь в природе происходит поворот солнца на новый жизненный круг), а вынести её из дому следует 13 января до заката солнца, чтобы всю ту отрицательную энергию, которую она «впивала» в себя за это переходное время, не «перенести» в новый год.

Ребенку надо объяснить: нельзя есть, когда читаешь, чтобы “не заесть” свой ум; нельзя переворачивать на ночь книгу – знания “не задержатся” в голове, ее следует положить на ночь открытой страницами вверх.

В народе знали, чтобы день прошел удачно, сначала надевали правый лапоть, а потом

левый.

Считалось, если вокруг огорода на несколько колов надеть старые лапти, то черви капусту не поедят, мошка не будет вредить, “завяжутся большие качаны”.

Нельзя класть ложку “дном к верху” (так кладут ложку только за поминальным столом).

Чтобы лицо было румяным, а тело белым и здоровым, необходимо было умыться водой, вытопленной из снега в день Сорока мучеников.

Считалось, что капуста не будет бояться морозов и даст большой урожай, если семена на рассаду посеять в день святой Евдокии (14 марта), в пост, смешав семена капусты с землёй и посеяв их даже по снегу.

Чтобы не передать “удачу” с огорода соседке, прежде чем отдать рассаду или семена, помойте руки и также помойте, когда рассаду отдадите.

В ночь со среды на четверг на открытой местности – под звезды – ставили соль. Назавтра утром ее забирали в дом. Четверговая соль как целебное средство для лечения людей и скота, на протяжении всего года.

Чем меньше вы будете показывать ребенка до года посторонним людям, тем спокойнее он будет.

Если во время венчания упадёт обручальное кольцо – семья не будет долговечной.

Чтобы куры не пропадали, на Благовещение на забор вешали корзину или решето. А потом с этого решета кормили кур.

Если в день Благовещения между заутренней и обедней (примерно в 12 часов дня) согнать веником кур с шеста, то яиц в доме всегда будет много.

Капустные грядки укрывать ветками берёзы, не будет гусениц.

Посади молодую берёзку по случаю рождения твоего ребенка – его минуют беды, а твой дом беда обойдет стороной.

Как Благовещение проведешь, так и жить будешь целый год. Если в этот день будешь здоров, сыт, одет и с деньгами, то все это не предвидится в течение года.

Хорошо и спокойно будет в том доме, в котором освещенная соль будет стоять открытой на столе или в другом месте.

В день Собора архангела Гавриила старайтесь не заниматься никакой работой.

Дети до 18 лет за поминальный стол не садятся.

Окрестите ребенка в день Крещения (19 января) – счастливым будет.

Если зайцы подходят к жилищу человека – быть сильным морозам.

В чистый четверг следовало рано утром пересчитать все деньги, какие имеются в доме, чтобы они не переводились весь год.

В ночь на 21 сентября, тем, кто желал, чтобы капуста стала твёрдой, белой, долго хранилась и не гнила, надо было ещё до восхода солнца встать, взять кочергу, побежать с нею в огород и там ударить ею каждый кочан.

Огурцы надо высевать рано утром, пока коровы лежат в сарае. Считалось, что тогда на грядках огурцы будут лежать «гурбами».

Загаданное желание обязательно сбудется, если в новогоднюю ночь как только часы пробьют первый удар 12-го часа, на листке бумаги быстро записать самое сокровенное желание и успеть сжечь листок с последним 12-ым ударом.

В день Крещения нельзя выносить воду из дома ни под каким предлогом. А если вдруг к вам кто-то придёт попросить воды, вспомните этот наказ.

В новогоднюю Коляду хозяйка кормила кур кутьей на разостланной скатерти – чтобы неслись в своем доме.

Чтобы коровы удачно телились и давали много молока, хозяйки жгли в этот день старые мётлы и веники.

Тот, кто первым посмотрит на лес в рождественское утро – летом будет удачливее других при сборе грибов.

1 марта день считается неблагоприятным, потому что Иуда, предавший Христа, покончил с собой.

Когда на небе погасла звезда, то ангел за душой усопшего полетел. Если в этот момент загадать своё самое сокровенное желание, оно обязательно сбудется, потому что считали, что в эту минуту ангелы не могут ни в чём отказать.

В Рождественскую ночь в период с двух часов ночи и до пяти утра “открываются небеса” и человек может обратиться к Богу с просьбой о помиловании, об искуплении грехов, об исцелении болезней, о ниспослании успехов в любой сфере человеческой деятельности.

На Ивана Головосека считалось, что ягоды калины, собраные в этот день, обладают особой целебной силой, и кто поест этих “прысмакаў”, у того целый год голова болеть не будет.

Если в ночь на 19 января молиться небу, то сбудется любая просьба, желание.

*Запісана ў в. Малева*
*ад Гацілы Алены Веньямінаўны, 1935 г.н.*

Гаварылі, калі пажар, калі баба бярэмянная, не трэба брацца рукою ні за ліцо, ні за руку, ні за што, бо пятно будзе.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Гадун Ядвігі Уладзіміраўны, 1929 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Лесуны Нясвіжскага р-на).*

Як прыйдзе мужчына на Каляды, то аходзіцца авечка, будзе баранчык, а жанчына – то дзевачка, цялушачка, авечачка.

Красці бярэмянная не далжна, а то дзіця злодзеем будзе.

Трэба завярнуць ў што-небудзь мужчынскае, каб за дзяўчынкай хлопцы хадзілі чарадой.

Маладой не даўжон бачыць нявесту ў плацці да свадзьбы.

*Запісана ў в. Малева*
*ад Каладзінскай Валянціны Фёдараўны, 1931 г.н.*

Як свадзьба, то нявеста снімае вянок, то далжна падружка памераць –замуж скора выйдзе.

*Запісана ў в. Малева*
*ад Алісіевіч Ніны Міхайлаўны, 1928 г.н.*

Цяжарнай нельга было глядзець на пажар, патаму што можа быць у дзіцяці краснае пятно. Гэта было да чатырох месяцаў, после чатырох ужэ нічога, да палавіны.

Венік я стаўлю мяцёлкай уверх. Ну, гэта, гаворaць, так нада.

Соль не далжна быць на стале нікагда на ноч. Гэта к няшчасцю.

Нож са стала трэба на ноч убіраць.

Бітай пасудай нельзя пользавацца – к няшчасцію. Еслі ў хаце ёсць – нада яе ўбіраць.

Кот з дому ўходзіць на плахое што-та.

Сабакі ж выюць на пажар ці на смерць. Еслі на зямлю вые – на смерць, к пакойніку, а еслі вые і ўверх глядзіць – на пажар.

Жаба крумкае на смерць.

*Запісана ў в. Нялепава*
*ад Болтуць Станіславы Адамаўны, 1947 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Гайнін Ляхавіцкага р-на).*

Калі ўвечары чуваць звонкае рэха – будзе пагода.

На дождж – сабака есць траву, кот качаецца, пахнуць моцна кветкі, дым сцелецца па зямлі.

Калі ліст увосень кладзецца на зямлі бокам уверх – будзе зіма цяжкая.

Гусі ляцяць у вырай нізка – ранняя зіма, высока – позняя.

Калі сонца заходзіць за хмару і не выглядае перад заходам – будзе пагода, а азірнецца – заўтра будзе дождж.

Калі на Куццю пойдзе снег або іней на дрэвах – будзе пад восень ураджай на грыбы.

Якая пагода на Пакровы, такая будзе зіма.

*Запісана ў в. Малева*
*ад Гацілы Алены Веньямінаўны, 1933 г.н.*

Цяжарнай жанчыне ня можна хадзіць пад вяроўкамі, тады прычына можа зрабіцца. Пры пажары нельга хапацца, бо бяды наробіш.

Ня можна жанчыне шыць, патаму шта, гаворaць, што ўрэднае дзіцяці будзе.

Вязаць цяжарнай нельга, каб на вочкі дзіця не хварэла.

Валасы ня можна стрыгчы – дзіцяці ўрэднае таксама будзе.

Каб быць галоўнай у сям`і, трэба ў цэркві, калі вянчаешся, наступіць на ногу яму.

Як дзіця не ходзіць, дак трэба цераз парог тры раза перасадзіць.

Нельга нічога перадаваць цераз парог.

Нельга было на стол шапку класці.

Нельга было ножа пакідаць на стале.

Нельга голай рукой змятаць крошкі са стала.

Венік звычайна ставяць уніз галавой: мяцёлкай уніз, ручкай уверх.

Гаворaць, што ня можна каб было два венікі ў хаце. Гаворaць, што як ажэняцца, тады трэба каб быў адзін венік, таму што гэта ўліяе на маладую. Гэта значыцца, два венікі – можа быць другі жаніх.

Калі ў акно стукаецца птушка, значыць, новасць прыносіць, еслі ка мне прыляціць птушка з жоўтым, значыць, мне прынесла дрэнную новасць, а еслі з светленькім – яна з харошым.

Калі дзіця зрабіла першы крок, путу нажом пераразалі.

Гуркі лепш садзіць на Мікольнага бацьку (дзесятага мая).

Калі чуеш першы гром – трэба катацца па траве.

Да Спаса ў каго хто памрэ – ня можна есць яблыка.

Еслі хто з хаты выйдзе, то ня можна прыбіраць, пака ён не прыйдзе.

*Запісана ў в. Грыцкавічы*
*ад Кандрацюк Антаніны Сцяпанаўны, 1939 г.н.*

Все лучшие черты передавались из поколения в поколение, от деда к внуку, минуя сына. И поэтому если, например, сложилась удачно жизнь у деда, деда звали Иван, его именем называют внука – Иван.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Жук Алены Мікалаеўны, 1969 г.н.*

Калі красна раніца – пагода будзе.

Калі строілі дом, абавязкова на вугал капейку клалі. Іменна апрадзялённы вугал быў, не абы-які. Ведама, каб грошы вяліся, каб хата багатая была.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Церахавец Уладзіславы Францаўны, 1938 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Завітая Нясвіжскага р-на).*

Цяжарнай на пажар ня можна глядзець. Дык як возьмецца, дык пятно будзе чырвонае.

*Запісана ў в. Грыцкавічы*
*ад Рудой Таццяны Антонаўны, 1932 г.н.*

Калі правае вуха гарыць, пра таго кажуць праўду, левае – хлусня.

Нельга не даядаць ці не дапіваць – зло пакідаеш.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Базарнавай Марыі Ігнацьеўны, 1922 г.н.*

Левае вока чухаецца – да слязам, правае – на мілага глядзець.

Хто ў сне плача, той наяве будзе смяяцца.

Жабы па беразе скачуць – да дажджу.

У правым вуху звініць – да добрых звест-как, у левым – да худым.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Чычко Антаніны Фамінічны, 1926 г. н.*

Моцна блішчаць зімою зоркі – да марозу.

Лёд пачарнеў, лес шуміць – чакай адлігу.

Зіма снежная –лета дажджлівае.

Кот на печы – да сцюжы, кот на падлозе – да цяпла.

Калі ўзімку суха і холадна, летам – суха і горача.

Снежны буран днём прадвяшчае мароз ноччу.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Жукоўскай Зоі Аляксандраўны, 1933 г. н.*

Зіма снежная – лета дажджлівае.

Доўгія ледзяшы – да доўгай вясны.

Узімку іней – улетку раса.

Вераб'і сядзяць надзьмуўшыся – да дажджу.

Позні лістапад – да суровай і працяглай зімы.

Стрыжы лётаюць нізка і з крыкам – да дажджу.

Цяжарнай нельга дакранацца да твару, інакш у дзіцяці будуць радзімыя знакі.

Самому сабе стрыгчы валасы – жыццё караціць.

Круціць валасы пальцам – да галаўнога болю.

Пяройдзе дарогу мужчына – добра, жанчына – да няўдачы.

Калі ластаўка нізка лётае – будзе дождж.

Калі цяжарная жанчына пераступае праз падлогу – то дзіця памрэ, бо пупавіна яго задушыць.

Калі садзяць капусту – трэба брацца за галаву.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Дзянішчык Неанілы Ільінічны, 1937 г. н.*

Еслі чорная кошка дарогу перойдзе, значыць, не павязе. Нада пальчыкі скрэсціць, ілі за пугавіцу ўзяцца, ілі, пака не перойдзе кошка дарогу, чуць-чуць пастаяць.

Калі пакойніка нясуць на могілкі, а я наўстрэчу іду – астанавісь, не ідзі, варочайся назад.

Еслі птушачка б'ецца ў акно, яна ўсегда навасці прыносіць. Як памёр у Маскве цёткі мае мужык, от ластачка пабілася ў акно на ноч,





вечарам. Всё, нам ужо звонюць – умер значыць. А еслі прыбіваюцца пташачкі, галубкі тожа да хаты, да дому, і ластаўкі в'юць гнёзды ў нас, ніколі іх ганяць не нада – эта добра, эта харашо.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Скаварады Вольгі Дзмітрыеўны, 1958 г.н.*

Калі ложка ўпадзе, значыць, хто-та спяшаецца.

Калі соль рассыплецца, гэта да слёз.

Тарэлка разаб'ецца – к шчасцю.

Калі пойдзеш з хаты, нешта забудзеш і вяртаешся, то не павязе, варочацца не можна было. Трэба было ў зеркала паглядзецца.

Цяжарныя цераз вяроўку не пераступалі, бо пупавіна ў дзіцяці абкруціцца вакруг шыі.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Хоміч Ганны Сцяпанаўны, 1944 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Каменка Нясвіжскага р-на).*

Нельга плакаць у труну, бо пакойнік у вадзе будзе ляжаць.

Кажуць, калі зязюля кукукае, трэба спытаць, колькі табе жыць. Колькі пракукукае – столькі і жыць.

Калі кот на парозе мыецца – чакай гасцей.

Калі кот на печ забраўся, кажуць, марозы будуць.

Кажуць, калі выносяць памерлага і кот перабяжыць дарогу перад, дык хтосьці яшчэ памрэ.

Кажуць, з чорнымі катамі нячыстая сіла.

Цераз парог нічога не перадаюць, не вітаюцца.

Нельга глядзець у калодзеж – замуж не пойдзеш.

Нельга са стала соль убіраць – грошай не будзе.

Шапку на стол нельга класці.

Нельга на стале сядзець – цяжка ражаць будзе.

На вугал стала нельга незамужнім садзіцца, бо замуж не пойдуць.

Праз венік пераступаць нельга.

Венік трэба ставіць мяцёлкай уверх.

Калі венік упаў, перахрысціцца трэба.

Стары венік з старой хаты не выкідваюць – грошай не будзе.

Нельга абметаць незамужнюю дзеўку, каб замуж не выйшла за шапілявага.

*Запісана ў в. Кіркаўшчына*
*ад Роўба Тамары Емяльянаўны, 1938 г.н.*

Калі хтосьці памёр, трэба было тры разы кінуць у магілу зямлі, .

Калі мышы водзяцца ў хаце, дык гэта значыць без парадку ўсё.

Нельга каля дома бярозу саджаць – да хваробы.

Нельга хлеб выкідаць – Бог крыўдзіцца.

Нельга кідацца хлебам – будзе голад у сям'і.

Нельга нікому крэсцік свой дарыць і паказваць – зглазяць.

Нельга крэсцік здымаць – захварэеш.

Калі нож на стале аставіш – бедна жыць будзеш.

Калі нож упадзе – мужчына прыдзе.

Цяжарнай жанчыне нельга пераступаць цераз нож, штосьці вострае –будзе цяжка раджаць.

Калі зуб выпаў, трэба кінуць яго цераз плячо за печ.

Калі б'ецца посуд – шчасце будзе.

Хлеб нельга класці скарынкаю ўніз.

Грэбень трэба ў гроб палажыць, ён спатрэбіцца.

Калі чалавек памёр – трэба ногці пакласці ў труну.

*Запісана ў в. Нялепава*
*ад Сафіулінай Еўфрасінні Васільеўны, 1941 г.н.*
*(перасяленка з в. Вароніна Сібірскай вобл.).*

Нельга ставіць хату там, дзе згарэла хата, бо таксама згарыць.

Калі пярсцёнак ўпадзе на свадзьбе, дык умесце не будуць.

Каб дзіцятка малое не сглазілі, пад шапачку булавачку прысцёгвалі.

Нельга абутак расбрасваць, калі хочаш быць у пары.

Нельга долу кідаць валасы – галава балець будзе. Трэба ў печ.

Калі соль рассыпеш – сварка будзе.

Калі ў хату залятаюць птушкі – хвароба будзе, а можа і смерць.

*Запісана ў в. Малева*
*ад Шах Зінаіды Антонаўны, 1928 г.н.*

Нельга праз парог перадаваць грошы, бо сварыцца будуць.

Калі памерлага вязуць, а ў хаце спіць малое дзіця, то малому каля галавы ложаць грабенчык або рашчосачку.

Калі нясуць труну з нябожчыкам і насу-

страч хтосьці ідзе, дык, гаворань, смерць у тую хату вернецца.

Крумкач крумкае – хтосьці памрэ.

Сабака вые ўгору, дык пажар будзе.

Сабака вые ўніз – хтосьці памрэ.

Калі пераносье чэшацца, то хтосьці памрэ.

Калі бусел над дахам лётае, дык, кажуць, дзеткі народзяцца.

*Запісана ў в. Малева*
*ад Акулік Галіны Уладзіміраўны, 1947 г.н.*

Калі садзілі капусту – трэба за галаву брацца, каб удалася.

Кажуць, у люстэрка часта нельга глядзець, там нячыстая сіла.

Нельга ў люстэрка глядзецца ўдваіх – красату аддаш.

Нельга нікому даваць сваё люстэрка.

Калі чалавек памёр – люстэркі ўсе занавешваюць, каб не ўцянуў да сябе.

Калі разаб’ецца люстэрка – чакай няшчасця.

Нельга ў разбітае люстэрка глядзець.

Калі штосьці дома забыў ды вяртаешся – паглядзі ў люстэрка.

Без пояса нельга было хадзіць. Калі з табой пояс – з табой Бог.

Кажуць, калі дачка падобна на бацьку – шчаслівай будзе.

*Запісана ў в. Нялепава*
*ад Буйко Таццяны Аляксандраўны, 1923 г.н.*
*(перасяленка з в. Пагарэльцы Нясвіжскага р-на).*

Бярэменным нельга рукі ўгору падымаць, таму што дзіцяці драчлівае будзе.

Нельга ў пароге сядзець, бо дзіцяці рана з хаты ўцячэ.

Нельга бярэменным на агонь глядзець, бо малы з плямамі радзімымі народзіцца.

Пры іспугу нельга за пуза хапацца, таксама плямы ў дзіцяці застацца могуць.

Нельга людзям з нажа есць, бо злым будзіш.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Калошы Марыі Ігнацьеўны, 1924 г.н.*

Беременным нельзя крычаць, будзе ребёнок нервным.

Калі правая рука чэшыцца – гэта к грошам, калі левая – не к дабру.

Калі разбіць зеркала – гэта на шчасце.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Коканавай Алены Вікенцьеўны, 1940 г.н.*

Калі рассыпаецца соль – жді біду.

Праз акно нельзя выкідваць мусар, бо выкідваеш усё добрае.

Хлеб нельга класці чарнушкай уніз ці класці на бок, бо так смерць можна наклікаць.

Нельга класці нож лезвіем уверх, бо гэта к смерці.

Калі выходзіць з хаты плахі чалавек, трэба брызгнуць свянцонай вадой крэстом альбо солю.

Бярэменным нельзя вязаць, каб не абвіўся рабёнак пупавінай.

Нельга бярэменным рубіць сякерай.

Нельга глядзець на інвалідаў – рабёнак будзе бальны.

Бярэменным нельга лускаць семкі – рабёнак будзе плявацца.

Супраць пахарон ехаць нельга.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Клышко Наталлі Яўгеньеўны, 1973 г.н.*

Калі чалавек памірае і доўга мучаецца, трэба разбіраць паталок, каб дух лягчэй выйшаў.

Зімой, калі дым ідзе роўна з трубы, к марозу, еслі сцеліца, то к цяплу.

Трашчыць сарока – к холаду.

Нельга качаць нагой, лічыцца, што качаеш чарцей.

В дом первым запускаецца кот, петух, заяц, каб вяліся. Дзеткі іх заносяць на руках, пасля заходзяць гаспадар з гаспадыняй.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Тачылы Віталія Міхайлавіча, 1962 г.н.*

Нельзя паказываць ребёнка, чтобы не сглазіць.

Нельзя нікаму гаварыць, што ідзеш ражаць, каб роды былі лёгкія.

Калі падае прадмет жаночага роду, прыйдзе жанчына, калі мужчынскага, то мужчына.

Калі пціца стучыт в акно, к новасці, когда залятае в акно – к смерці.

У якую сторану вые сабака, там будзе памерлы.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Габрыновіч Людмілы Мікалаеўны, 1952 г.н.*

Нельзя чтоб кот между ног пробегал.

Нельзя переступать через веник и топор – к тяжелым родам.

Стричь волосы перед родами – отнимать





силу у ребёнка.

Всё, что делаешь во время беременности, то и ребёнок будет делать.

Чтоб пошёл дождь, насыпали мак в колодеж.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Лукаш Кацярыны Іосіфаўны, 1941 г.н.*

Калі муравейнік бугром, то будзе ранняя і мёрзлая зіма.

Калі чайкі крычаць, то гэта к пахаладанню.

Калі ідзеш первы раз у хату, трэба несці хлеб, соль, ікону, каб было ў гэтай хаце ўсё добра.

Калі пятух распяецца раней чым трэба, то відзя злога духа альбо гоня яго, ці будзе памерлы ў гэтай хаце.

*Запісана ў в. Грыцкавічы*
*ад Захарэц Софьі Мікалаеўны, 1941 г.н.*

Калі выходзіш з хаты, трэба яе перакрасціць. Калі гэтага не зробіш і вярнешся, то нічога не палучыцца.

Пагода будзе жаркай і сонечнай, калі на захадзе сонца блакітнае, залатое. Перад усходам сонейка выпадае раса.

Калі звон калакалоў раздаецца звонка – будзе ясна, а калі глуха – будзе дождж.

Калі вясёлка бачна к вечару, то будзе добрае надвор’е, а калі па ўтру –будзе дождж.

*Запісана ў в. Грыцкавічы*
*ад Камко Марыі Іосіфаўны, 1942 г.н.*

Цяжарнай жанчыне забаранялася пад шнурамі хадзіць, бо пупавінка закруціцца.

Трэба было насіць фартушок, бо калі спужаесся, каб у дзіцяткі плямы не было нідзе, дакуда дакранецца жанчына.

Як хадзілі па ваду, круціць вядро, абавязкова, каб вада не пралілася назад у калодзесь, таму што дзіцятка як будзе сасаць грудзь, будзе абліваць.

*Запісана ў в. Смалічы*
*ад Хмарук Людмілы Антонаўны, 1930 г.н.*

Куры цярэбяцца – будзе дождж.

Ластаўкі плаваюць – будзе дождж.

Вецер будзе заўтра, бо сонца стаўбом.

Кот мыецца – госці.

Як нож упаў – мужчына прыйдзе, як вілка – жанчына.

Кусочак хлеба ўпадзе – упадзе што з рук.

Нож каб дагары не стаяў – гэта нядобрая прыкмета.

З пустым вядром пяройдзе дарогу – к нядобраму.

На Пакровы зарыкаюць у хлеў каровы – будзе холад.

Як на Пакрову цёпла, то да Новага года будзе цёпла.

*Запісана ў в. Альхоўка*
*ад Свірыдовіч Ларысы Сцяпанаўны, 1938 г.н.,*
*Карачун Ніны Сцяпанаўны, 1929 г.н.*

Фартук абязательно доўжын быць, штоб малое не баялася зглаз.

Еслі конь быў запрэжаны, штоб пад лейцы ні ў коем случаі не хадзіла, таму што будзе пупавінка кругом горла абкручаная.

Калі ты набярэш вады з калодзежа і будзеш несці ўжо гэту ваду дахаты, а табе хтосьці перайшоў дарогу, то вярніся абратна і набяры новай. А як яшчэ перойдзя дарогу мужчына, дык нічога страшнага, а калі жанчына – ды не дай Бог. А калі ў яе ёсць на бяллі, то, кажучы па простаму, дзіця будзе плакаць перад заходам сонца без перапынку.

*Запісана ў в. Смалічы*
*ад Міропчык Ірыны Пятроўны, 1936 г.н.*



*Алена Алфёрава*

# СПРАДВЕЧНАЯ НАРОДНАЯ МУДРАСЦЬ (МАЛЫЯ ФАЛЬКЛОРНЫЯ ЖАНРЫ НЯСВІЖЧЫНЫ)

У малых фальклорных жанрах (загадках, прымаўках, прыказках) сканцэнтраваліся ўважлівыя назіранні беларускага наро¬да над прыродай, навакольным светам, узаемаадносінамі паміж людзьмі. Магчыма, іх сцісласць і, адначасова, змястоўнасць, рыфмаваная будова і лёгкасць у запамінанні, а таксама актуальнасць нават у сучасных умовах садзейнічалі жыццяздольнасці пералічаных жанраў. Сведчаннем таму з'яўляюцца запісы, зробленыя ў Нясвіжскім раёне.

У нашы дні загадкі сталі пераважна дзіцячым жанрам. І гэта нядзіўна. Таямнічасць і прывабнасць загадкі для маленькіх слухачоў заключаюцца ў тым, што спачатку перад іх вачыма паўстае незвычайны, фантастычны свет з чароўнымі насельнікамі, нерэальнымі апісаннямі, якія пасля ўвасабляюцца ў звычайным аб'екце (прыроднай з'яве, расліне, жывёле, частцы цела чалавека або прадмеце побыту). Ранняе знаёмства з гэтым жанрам садзейнічала абуджэнню ў дзіцяці фантазіі, здольнасці бачыць незвычайнае і чароўнае ў звычайных паўсядзённых рэчах. Так, у адной з загадак, запісаных на тэрыторыі Нясвіжскага раёна, з'яўляецца вось такая дзіўная істота: "Кацілася кадушачка: ні звер, ні птушачка, і ні агонь, і ні вада, не адгадаеш нікагда. Гром" [1, № 168].

Па-ранейшаму папулярнымі застаюцца загадкі пра тыя аб'екты навакольнага свету, якія сустракаюцца нам кожны дзень, і прыгажосці, і ўнікальнасці якіх нельга не здзіўляцца. І заўсёды ў загадках да іх падбіраюцца трапныя маляўнічыя параўнанні, што дапамагаюць данесці да нас традыцыйнае суладдзе чалавека і навакольнага свету, гармонію ўзаемаадносін, захапленне ад невычарпальных таямніц прыроды: "Ходзіць па саломе, а не шастае. Сонца" [1, № 31]; "Поўна дзежачка круп, а наверсе струп. Мак" [1, № 761]; "Семсот свішчуць, а чатыры ішчуць, два нюхаюць, два слухаюць і два глядзяць. Конь" [1, № 1039]; "Ножанкі ў руках, шарсцінка ў зубах. Рак" [1, № 1403].

Любімымі для беларускіх загадак застаюцца і казачныя вобразы. Напрыклад, для такога этнаграфічнага прадмета, як саха, якая ўвесь час знаходзіцца пад зямлёй, вельмі трапным з'яўляецца вобраз змрочнай Бабы Ягі, што таксама жыве ў іншасвеце, у цёмным лесе, да таго ж мае адну нагу: "Баба Яга, віламі нага, увесь свет корміць, а сама галодная. Саха" [1, № 1574]. Цікава, што пры просьбе ўспомніць загадку сучасныя дарослыя інфарматары амаль адразу ўзгадваюць варыянт пра цыбулю ў вобразе злой барыні або старой: "Сядзіць барыня. Хто яе раздзявае, той слёзы пралівае. Цыбуля" (Зап. Н. Шэдавай, В. Кужэльнай у в. Аношкі ад Ганны Сцяпанаўны Хоміч, 1944 г.н.). Незвычайная, прыцягальная і вобразамі, і мовай, і гумарам адна з загадак, запісаных таксама на Нясвіжчыне. Абедзве часткі тэксту раўназначныя (што нетыпова для жанру) і паралельна разгортваюцца ў цэлую гісторыю са сваёй завязкай, кульмінацыяй і развязкай. А паэтычныя прыёмы, выкарыстаныя ў метафарычнай частцы, выклікаюць асацыяцыі са старажытнай мовай паляўнічых або рамеснікаў, выразы якіх былі зразумелымі толькі членам адной абшчыны: "Ішоў шалду-балду, узяў стрыкі-брыкі, як зачулі ляпётнікі, сталі будзіць гарэтнікі: "Уставайце, гарэтнікі, даганяйце шалду-балду, адбірайце стрыкі-брыкі". Пастух пасвіў авечку, воўк яе ўкраў, пастух будзіў сабак" [1, № 1557].

Асобную групу складаюць загадкі, якія ніколі не пераходзілі ў групу дзіцячых. Гэтыя тэксты маюць яшчэ назву "псеўдаэратычныя загадкі". І першапачатковае іх прызначэнне – праверка маладога на вяселлі, сцвярджэнне яго дарослаці і самастойнасці. Асаблівасцю такіх загадак з'яўляецца тое, што за, здавалася б, непрыстойным кантэкстам, хаваецца цалкам цнатлівая і нейтральная адгадка. Такая неадпаведнасць выклікае нават і ў наш час цікавасць, а пасля разгадвання – смех. Не дзіва, што і зараз гэтыя загадкі можна сустрэць у жывым бытаванні, у тым ліку і ў Нясвіжскім раёне: "Ніжэ пупа, / Вышэ калена / Як тое месца завецца, / Жывое цела кладзецца. Рука ў кармане" (Зап. В.С. Новак, К. Барысенка, С. Грыцковай, І. Пакаташкінай, В. Мацынкевіч, Л. Халязнікавай у в. Лань ад Галіны Міхайлаўны Шуковіч, 1946 г.н.); "Кругла, калмата і кругом гарбата, як прыпрэцца бяда, пальецца вада. Вочы" [1, № 964].

Тым не менш, у асяродку дарослых людзей загадкі не настолькі папулярныя. Тут можна запісаць даволі вялікую колькасць прыказак і прымавак, а таксама выслоўяў, звязаных з народнымі святамі. Пры гэтым застаецца толькі здзіўляцца з назіральнасці людзей і захапляцца іх здольнасцю ўвасобіць звычайныя з'явы навакольнага свету, прычынна-выніковыя сувязі паміж імі ў паэтычнай, часам прыгожай іншасказальнай форме: "Пятрова ночка невялічка – не выспалася дзевачка" (Зап. В.С. Новак, К. Аляшкевіч, К. Аршанінавай, Ю. Блізнец, А. Дулуб, В. Назаранка ў в. Лань ад Леаніды Іванаўны Жук, 1938 г.н.); "Пакровы – заганяй у хлеў каровы" (Зап. В.С. Новак, С.А. Вяргеенка, К. Аляшкевіч, К. Аршанінавай, Ю. Блізнец, А. Дулуб, В. Назаранка ў в. Чанавічы ад Аляксандры Пятроўны Сарокі, 1934 г.н.); "Прыйшоў Пятрок – апаў лісток, прыйшоў Ілля – апала два, а восень кажа: тут і я" (Зап. С.А. Вяргеенка, К. Аляшкевіч, К. Аршанінавай, Ю. Блізнец, А. Дулуб, В. Назаранка ў в. Грыцкевічы ад Антаніны Сцяпанаўны Кандрацюк, 1939 г.н.).

Частым спадарожнікам беларускіх прыказак і прымавак, у тым ліку запісаных і на тэрыторыі Нясвіжскага раёна, становіцца гумар. Так, адзін з варыянтаў утрымлівае ў сабе супрацьпастаўленне знакамітай прыкмеце: "І кот не мыўся – і госць з'явіўся" (Зап. С.А. Вяргеенка, К. Аляшкевіч, К. Аршанінавай, Ю. Блізнец, А. Дулуб, В. Назаранка ў в. Малева ад Алены Веньямінаўны Гацілы, 1933 г.н.). Яшчэ адна з прыказак адлюстроўвае стаўленне да жанчыны ў традыцыйным грамадстве, але таксама ўспрымаецца з гумарам: "Баба з возу – кабыльцы лягчэй" (Зап. В.С. Новак, Я. Зайцавай, К. Боевай, В. Лагун, А. Казека, Д. Цімонінай у в. Лань ад Неанілы Ільінічны Дзянішчык, 1937 г.н.). У той жа час патрыярхальная народная мудрасць сведчыць,аб тым што істотная роля ў гаспадарцы, жыцці, у тым ліку лёсе і статусе жанчыны належыць гаспадару, сапраўднаму мужчыне: "У плахога мужа княгіня загіне, а ў харошага мужа варона стане барона" (Зап. С.А. Вяргеенка, К. Аляшкевіч, К. Аршанінавай, Ю. Блізнец, А. Дулуб, В. Назаранка ў в. Малева ад Алены Веньямінаўны Гацілы, 1933 г.н.).

Найбольш папулярнай тэмай сучасных прыказак застаецца праца, руплівасць гаспадара і поспех, які абавязкова прыйдзе да працаздольнага чалавека. Гэтая рыса дакладна характарызуе беларускі народ як народ-працаўнік, таму, верагодна, і прыказкам гэтай тэматыкі ўласціва найбольшая жыццяздольнасць: "На свеце як бывае? Хто працуе, той і мае"; "Паміраць збіраешся, а жыта сей"; "Трэба нахіліцца, каб з ручайкі напіцца" (Зап. С.А. Вяргеенка, К. Аляшкевіч, К. Аршанінавай, Ю. Блізнец, А. Дулуб, В. Назаранка ў в. Малева ад Алены Веньямінаўны Гацілы, 1933 г.н.); "Без працы не з'ясі акуляцы (вячэры)" [2, с. 166, № 1497 г].

Вельмі чулыя, трапяткія адносіны беларусаў да роднай зямлі, асабліва да таго куточка, дзе нарадзіўся чалавек, яго лакальных звычаяў. Гэта бачна ў нашым фальклоры: песнях, казках, загадках і, зразумела, прыказках: "Родная зямелька як зморанаму пасцелька" (Зап. С.А. Вяргеенка, К. Аляшкевіч, К. Аршанінавай, Ю. Блізнец, А. Дулуб, В. Назаранка ў в. Малева ад Алены Веньямінаўны Гацілы, 1933 г.н.); "Дзе край, так і абычай" [2, с. 293, № 85 б].

А яшчэ беларускі народ мудры, і на кожны выпадак, нават самы цяжкі ў жыцці, ён заўсёды знойдзе сваю прымаўку: у нязначнай колькасці слоў адразу адчуецца і суцяшэнне, і парада, і ацэнка ўчынку. Такія прыказкі даволі распаўсюджаны ў наш час на тэрыторыі Нясвіжскага раёна: "Бяда ж усяму навучыць"; "Адзін раз збрэшыш, у другі не павераць"; "Лёгка пасварыцца, цяжэй памірыцца"; "Усё свой час мае"; "Рана загоіцца, а злое слова ніколі" (Зап. В.С. Новак, Я. Зайцавай, К. Боевай, В. Лагун, А. Казека, Д. Цімонінай у в. Лань ад Неанілы Ільінічны Дзянішчык, 1937 г.н.); "Якая заслуга – такая і пашана" [3, с. 525, № 418].

Такім чынам, у загадках, прыказках і прымаўках Нясвіжчыны прысутнічаюць агульнабеларускія і некаторыя агульнаславянскія вобразы, сюжэты, паэтычныя сродкі, якія сведчаць пра тое, што дадзены край у выніку ў тым ліку і гістарычных прычын (як адзін з цэнтраў інтэнсіўнага культурнага абмену) уваходзіць у агульны арэал генезісу і эвалюцыі малых фальклорных жанраў Усходняй Еўропы.

Малыя фальклорныя жанры, запісаныя на тэрыторыі Нясвіжскага раёна, сведчаць пра іх добрую захаванасць і выкарыстанне ў наш час, што абумоўлена іх выхаваўчымі, эстэтычнымі і прагматычнымі функцыямі. Так, загадкі бытуюць пераважна ў дзіцячым асяродку, выхоўваючы ў маладога пакалення фантазію, кемлівасць, а магчыма, і дапамагаючы ў будучым стаць паэтам ці мастаком, бо вучаць бачыць незвычайнае ў звычайным. Прыказкі ж здольныя сцісла і дакладна ахарактарызаваць сітуацыю і, у некаторых выпадках, паказаць выйсце з яе. Таму нават і сёння ў найбольш безнадзейных сітуацыях людзі звяртаюцца па параду да старэйшага мудрага пакалення, каб у некалькіх словах пачуць тое, што не могуць параіць нават самыя знакамітыя і аўтарытэтныя філосафы.

### Спіс літаратуры


1. Загадкі / склад. М.Я. Грынблат, А.І. Гурскі. – 2-е выд., выпр. і дапрац. – Мінск: Беларуская навука, 2004. – 363 с.
2. Прыказкі і прымаўкі: У 2 кн. / склад. М.Я. Грынблат. – Кн. 1. – Мінск: Навука і тэхніка, 1976. – 560 с.
3. Прыказкі і прымаўкі: у 2 кн. / склад. М.Я. Грынблат – Мінск: Навука і тэхніка, 1976. – Кн. 2. – 616 с.




## ПАЗААБРАДАВАЯ ТВОРЧАСЦЬ МАЛЫЯ ФАЛЬКЛОРНЫЯ ЖАНРЫ

### Загадкі

Ніжэ пупа, вышэ калена,
Як тое месца завецца,
Жывое цела кладзецца. *(Рука ў кармане)*

*Запісана ў в. Лань*
*ад Шуковіч Галіны Міхайлаўны, 1946 г.н.*

Сядзіць барыня. Хто яе раздзявае, той слёзы пралівае *(Цыбуля).*

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Хоміч Ганны Сцяпанаўны, 1944 г.н.,*
*(раней пражывала ў в. Каменка Нясвіжскага р-на).*

Паміж хаты жыд лупаты.
*(Лампачка).*

*Запісана ў в. Казлы*
*ад Рабко Фаіны Антонаўны, 1942 г.н.*

### Прыказкі і прымаўкі

Пятрова ночка невялічка – не выспалася дзевачка.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Жук Леаніды Іванаўны, 1938 г.н.*
*(раней пражывала ў в. Вайнілавічы Нясвіжскага р-на).*

У Піліпаўку воўк нема вые.
Два Юр'і і абодва дурні. Адзін галодны, а другі халодны.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Чычко Софы Рыгораўны, 1934 г.н.*

Пакровы – заганяй у хлеў каровы.

*Запісана ў в. Чанавічы*
*ад Сарока Аляксандры Пятроўны, 1934 г.н.,*
*(раней пражывала ў в. Палаўковічы Клецкага р-на).*

Што зробіш на Купалу, то прапала.
Пятрок – апаў лісток, Ілля – нарабіў гнілля.

*Запісана ў в. Малева*
*ад Каладзінскай Валянціны Фёдараўны, 1931 г.н.*

У плахога мужа княгіня загіне, а ў харошага мужа варона стане барона.
І кот не мыўся – і госць з'явіўся.
Смачны баршчок, ды малы гаршчок.
Пайшоў бы тапіцца, ды вада халодная.





Няма лепшае рэчы за свіныя плечы.
На свеце як бывае? Хто працуе, той і мае.
Родная зямелька, як зморанаму пасцелька.
Так у госці звалі, што аж рукавы адарвалі.
Ад паклону галава не баліць нікагда.
Паміраць збіраешся, а жыта сей.
Трэба нахіліцца, каб з руЧайкі напіцца.

*Запісана ў в. Малева*
*ад Гацілы Алены Веньямінаўны, 1933 г.н.*

Прыйшоў Пятро – апаў лісток, прыйшоў Ілля – апалі два, а восень кажа – тут і я.

*Запісана ў в. Грыцкавічы*
*ад Кандрацюк Антаніны Сцяпанаўны, 1939 г.н.*

Сёння – Купала, а заўтра – Ян. Будзем кідаць дзяўчатак цераз паркан.
На Юр'я трэба, каб было ў каждага дурня.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Церахавец Уладзіславы Французаўны, 1938 г.н.,*
*(раней пражывала ў в. Завітая Нясвіжскага р-на).*

Баба з возу – кабыльце лягчэй.
Бяда ж усяму навучыць.
Багаты не ведае, чым бедны абедае.
У крыніцу не носяць вадзіцу.
Няма байкі без праўды.
Кожны пастушок сваёй пугай хваліцца.
Розум на розум не выпадае.
Вышэй за свае пяты не падскочыш.
Галодны ўсё смакуе.
На свята думай пра будзень, а ўлетку пра зіму.
Свіння каню не таварыш.
Што хутка робіцца, то сляпое родзіцца.
Маўчы ды патаквай.
Дурны сабака і на гаспадара брэша.
Паслаў дурнога, пашлі і другога.
Воўк сыты – козачкі цэлыя.
Дзякуй не з'ясі.
Адзін раз збрэшыш, у другі не павераць.
Малады розум – гэта палявы вецер.
Не ўсё мёд, шо салодкім кажацца.
Птушцы – воля, чалавеку – мір.
Лёгка пасварыцца, цяжэй памірыцца.
Лета збірае, а зіма праядае.
Хто працуе, той і мае.
Усе свой час мае.
Страх мае вочы вялікія.
Праўда вочы коле.
Век пражыў, а розуму не нажыў.
Рана загоіцца, а злое слова ніколі.

Па адзенні сустракаюць, а па розуму праважаюць.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Дзянішчык Неанілы Ільінічны, 1937 г.н.*

Чуе звон, ды не ведае дзе ён.
Смерць ў зубы не заглядвае.
Дзяцел хваліцца, шо дзюбка доўгая.
Калі хлеб будзе, дак ўсё будзе.
Бяда бяду і гоніць.
Як хачу, так і вярчу.
Калі пытаешся, дак дапытаешся.
Хто б мяне павучаў, а ты б маўчаў.
Я яму гэтае, а ён мяне тое.
Што напісалі пяром, то і сякера не адрубіць.
Чым у лес далей, тым і гусцей.
Што галоўка, то розум.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Скрыцкай Марыі Аляксандраўны, 1940 г.н.*

Прыйшоў Пятрок – апаў лісток, прыйшоў Ілья – апала два, прыйшла Прачыста – стала на полі чыста.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Лепяцілы Ніны Уладзіміраўны, 1930 г.н.*

Хто раней устае – той грыбоў набярэ, а санлівы да лянівы пасля за крапівой пайдзе.

*Запісана ў в. Грыцкавічы*
*ад Захарэц Софы Мікалаеўны, 1941 г.н.*

## НЯКАЗКАВАЯ ПРОЗА

### Легенды

Быў у сяле Лявон да любіў дзеўку. Бацькі ім не дазвалялі жаніцца. Да тут была рэчка. Даказалі, што яны ўтапіліся ў рэчцы, ад гэтага тут сяло так і завеца. Патом тэ балото асушылі.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Лях Марыі Сільвестраўны, 1943 г.н.*

У дзярэўні Наруцавічы, там быў парк. У Несвіжы тожа ёсць парк. У Наруцавічах такая ж планіроўка, толькі ён у дзясяткі разоў меншы. Пан, калі заказваў парк, сказаў: "Зрабі мне маленькі парк. Такі, каб памесціўся на руцэ". Ну, вот і Наруцэвічы так з'явіліся.

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Акулік Марыі Уладзіміраўны, 1944 г.н.*

Быў дзед такі, Лявон называўся. З бабаю жылі. Бяздзетныя такія. Мо, такі, шо троху разбіраўся. І вот з тагу Лявона і пайшло "Лявонавічы".

*Запісана ў в. Лявонавічы ад Лепяцілы Ніны Уладзіміраўны, 1930 г.н.*

Альхоўка называецца таму, што гаворацЬ, што алешын многа, дык Альхоўка.

*Запісана ў в. Альхоўка ад Вальчык (Санько) Яніны Аляксандраўны, 1934 г.н.*

## Адкуль пайшла назва вёскі "Лань"

Шла Матерь Божья и заблудилась в этих лесах не проходимых. И так она уже устала, так она уже совсем измучалась, что уже не было сил идти. И услышала, что кто-то играет на дудочке. И просто на звук вышла. И возле крынички, которая била из-под земли, сидел мальчик-пастушок, играл на дудочке, бегали вокруг козочки-ланьки, возле него такие, живенькие, резвенькие такие, просто игривые. И рядышком текла крыничка. И вот Матерь Божья в этой крыничке сполоснула там лицо, ручки, воды напилась, и как бы ожила, стало ей легче. И вот мальчик вывел ее из этого леса, и вот место, где они встретились, отсюда бьет крыничка, место было встречею с ланьями, и место назвали – Ланью. И речка у нас отсюда идет Лань, впадает в Ушу. И уже вокруг этого места пошло поселище.

*Запісана ў в. Лань ад Тарасевіч Алены Мікалаеўны, 1969 г.н.*

У нас легенда есть о том, что давно-давно здесь были непроходимые места, леса. Шла Матерь Божья и заблудилась в лесах этих непроходимых. И уже она устала, совсем измучилась, что не было сил идти. И услышала, что кто-то играет на дудочке, и просто на звук вышла. И возле крынички (била из земли крыничка) сидел мальчик-пастушок и играл на дудочке. Бегали вокруг него козочки-ланьки такие, живенькие, игривые. И вот Матерь Божья сполоснула там лицо, ручки, воды напилась и как бы ожила, стало ей легче. Мальчик вывел её из этого непроходимого леса. И вот место, где они встретились, где бьёт криничка, назвали Ланью. И речка у нас Лань, впадает в Ушу.

*Запісана ў в. Лань ад Жук Алены Мікалаеўны, 1969 г.н.*

У нас ёсць рака, па ёй растуць дзярэўя, і лясы былі вялікія там. У іх, ведаю, лані бегалі. Гэта жывёла такая. А потым ляса вырубілі.

*Запісана ў в. Лань ад Салавей Марыі Міхайлаўны, 1947 г.н.*

Назва вёскі ад ракі "Лань". Яна берёт начала каля кладбішча. Там камень стаіт, адкуда яна выцекает і ўпадает яна ў Прыпяць.

*Запісана ў в. Лань ад Шуковіч Галіны Міхайлаўны, 1946 г.н.*

Дзярэўню назвалі так, таму што рэчка так называецца. Гэта рэчка каля кладбішча, там ёсць камень, каля яго бальшы прыток, вот ад этага прытока і пайшла назва вёскі – Лань.

*Запісана ў в. Лань ад Васільевай Валянціны Уладзіміраўны, 1952 г.н., (раней пражывала ў г. Мінск).*

Рака наша, яна бярэ пачатак у Лані і завецца Ланская, і цячэ туды, ну вось і вёска такая Лань.

*Запісана ў.в. Лявонавічы ад Хаванскай Ірыны Адамаўны, 1946 г.н.*

Точных звестак пра ўзнікненне вёскі няма, але кажуць, што тут варылі смалу. Ад гэтага і пайшла назва вёскі Смалічы.

*Запісана ў в. Смалічы ад Шчурскай Ірыны Мікалаеўны, 1935 г.н.*

Калісьці ў старыну за нашым сялом варылі смалу. У дзярэўні жылі людзі, якія варылі гэтую смалу. Іх раней называлі "смалякамі", і, мабуць, адгэтуль пайшла назва вёскі Смалічы.

*Запісана ў в. Смалічы ад Хмарук Людмілы Антонаўны, 1930 г.н.*

Раньшэ вёска наша называлася Пахабаўшчына. А цяпер Альбянка, а чаму Альбянка, раньшэ быў завод Альба. Спірт некалі гналі.

*Запісана ў.в. Альбянка ад Гібчык Юзэфы Францаўны, 1931 г.н.*

Раней вёска Альбянка называлася Пахабаўшчына. Як мне здаецца, мне раней гаварылі, што пахабны быў чалавек, ці што. Яна начай называлася. Ну, і Пахабаўшчынай назвалі дзярэўню нашу, а потым пераміналі ў Альбянку.

*Запісана ў в. Альбянка ад Валчок Сафіі Ігнацьеўны, 1935 г.н.*





Мужык убіў звера. Нёс і гаварыў: "Нясвеж, нясвеж". Так і назвалі Нясвіж.

*Запісана ў г. Нясвіж ад Падгайскай Вольгі Дзям'янаўны, 1930 г.н, (раней пражывала ў в. Лань Нясвіжскага р-на).*

Альхоўка – гавораць, што тут альхі многа расло. Сёння рэчка Дунаечка наша працякае, там многа альхі.

*Запісана ў в. Альхоўка ад Свірыдовіч Ларысы Сцяпанаўны, 1938 г.н.*

Паявіліся на гэтай мясцовасці людзі валасатыя, барадатыя і захацелі тут жыць, таму што тут была харошая зямля. Спачатку паявіліся мужык і жонка. З'явіліся ў іх дзеці. І так паяўляліся хата за хатай. Аднекуль яшчэ прыехалі людзі за дравамі і ўбачылі гэтых людзей. І сказалі: "Божа, што тут за казлы жывуць?" Таму што яны былі барадатыя, валасатыя. І гэтае слова "Казлы" так і засталося.

*Запісана ў в. Казлы ад Яраш Галіны Палікарпаўны, 1950 г.н.*

# ДЗІЦЯЧЫ ФАЛЬКЛОР

## Калыханкі

Ага-ага, люлі, люлі.
Будзе маці калыхаць.

*Запісана ў г. Нясвіж ад Драчан Ірыны Міхайлаўны, 1933 г.н., (раней пражывала ў в. Альхоўка Нясвіжскага р-на).*

***

*Люлі-люлі-люлі,*
*Пашоў кот па дулі.*
*Замарозіў лапкі,*
*Залез на палаткі.*
*Сталі лапкі грэцца,*
*Няма дзе катку дзецца.*

*Запісана ў г. Нясвіж ад Санько Раісы Іванаўны, 1936 г.н., (раней пражывала ў г. Навагрудак).*

***

*Люлі-люлі-люляю*
*Наб'ю катка лапаю.*
*Пайшоў коцік у лясок,*
*Найшоў коцік паясок.*

*Запісана ў в. Лань ад Малахавай Ірыны Уладзіміраўны, 1957 г.н.*

*Баю-баюшкі-баю,*
*Не лажыся на краю:*
*Прыйдзе шэранькі ваўчок*
*І ўкусе за бачок.*

*Запісана ў в. Грыцкевічы ад Заяц Станіславы Іванаўны, 1944 г.н.*

*Люлі, люлі, каціна,*
*"Куда едзеш?" - "Па сена".*
*Вазьмі мяне з сабою,*
*Буду табе слугою,*
*Я й коніка папасу*
*І вадзічкі прынясу.*

*Запісана ў в. Лань ад Чычко Соф'і Рыгораўны, 1934 г.н.*

*Люлі-люлі-люлі,*
*Прыляцелі гулі,*
*Селі на вароцях*
*У чырвоных боцях.*
*Сталі яны шчабятаць,*
*Што дзіцятку трэба даць,*
*Сталі яны гаварыць,*
*Што дзіцятку падарыць.*

*Запісана ў г. Нясвіж ад Халецкай Яўгеніі Іванаўны, 1932 г.н.*

*Люлі-люлі, усе дзеткі паснулі,*
*А ты не спіш, не гуляеш,*
*З катамі басенькі баеш.*

***

*На мякенькай падушаццы,*
*На шоўкавай дзяружаццы,*
*Пасні, мой сынок,*
*На мякенькай падушаццы,*
*На шоўкавай дзяружаццы.*

***

*Спі, дзіця маё раднoе,*
*Бог твой сон храніт,*
*Твая маці шпікулянтка,*
*Па начам не спіт.*

*Запісана ў в. Лявонавічы ад Матус Яўгеніі Міхайлаўны, 1930 г.н.*

## Забаўлянкі

*Ладкі-ладушкі,*
*Прыляцелі птушкі,*
*Селі на варотах*

*У чырвоных ботах.*
*Сталі шчабятаці –*
*Нема чаго даці.*
*Пасыпалі грэчкі –*
*Знялі тры яечкі.*
*Шух-шух, паляцелі.*

***
*Сарока-варона*
*Дзеткам кашку варыла.*
*Гэтаму дала,*
*Гэтаму дала.*
*Ты мал круп не драў,*
*Вады не насіў*
*І кашкі не прасіў.*

***
*Кую-кую ножку,*
*Паеду ў дарожку,*
*Куплю чаравічкі*
*Саўсім невялічкі.*
*На малую ножку*
*Малому Цімошку.*
*Абувала бабуля – не абула,*
*Абувала матуля – не абула.*
*Прыляцелі птушкі-гулі –*
*Ураз хлопчыка абулі.*

*Запісана ў в. Карцэвічы*
*ад Цвірко Алены Пятроўны, 1941 г.н.*

*Кую-кую ножку,*
*Паеду у дарожку,*
*Дарожка крывенька,*
*Кабылка сівенька.*
*Уцякай-уцякай, хлопча,*
*Конь цяпе затопча.*

***
*Гусі-гусі, га-га-га,*
*Есці хаціце? – Да-да-да,*
*Ну, ляціце, як хаціце,*
*Там халодная вада.*

***
*Ладушкі-ладушкі ,*
*- Дзе былі?*
*- У бабушкі.*
*- Што елі?*
*- Кашку.*
*- Што пілі?*
*- Бражку.*
*- Што нам, бабка дала?*
*- Кусочак піражка.*

***
*Дождзік-дождзік, секані,*
*Я паеду на кані, -*
*Дарожка крывенька,*
*Кабылка сівенька.*

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Кавальчук Аляксандры Паўлаўны, 1931 г.н,*
*(раней пражывала ў в. Садовая Клецкага раёна).*

*Ладкі-ладушкі, прыляцелі птушкі,*
*Селі на вароты ў чырвоных ботах,*
*Сталі шчабятаці – няма чаго даці,*
*Насыпалі грэчкі, каб неслі яечкі.*
*Шух-шух-шух, паляцелі.*

***
*Сарока-варона дзеткам кашу варыла,*
*На прыпечку студзіла,*
*На ложачцы дзяліла:*
*- Гэтаму дала, гэтаму дала.*
*- Гэтаму дала , гэтаму дала.*
*А на гэтага кажа:*
*- Ты, мал, круп не драл,*
*Вады не насіл,*
*Дзеткам кашкі не варыл,*
*Твая кашка ў каманіцы,*
*А ложачка на паліцы.*

***
*Кую-кую ножку, паеду ў дарожку,*
*Дарожка крывая, кабылка сляпая,*
*Сцеражыся хлопча, бо конік затопча,*
*А я коніка не баюся,*
*качаргою адбаранюся.*

***
*Чубору-чубору (за галаву),*
*Паехаў пан на высокую гору,*
*З гары скаціўся і нечага забыўся.*
*І пытаюць: “Жук ці качан?”*
*Як скажа: “Жук” – пайшоў з маіх рук,*
*Скажа “качан” – я ізноў пачаў.*

*Запісана ў в. Альхоўка*
*ад Свірыдовіч Ларысы Сцяпанаўны, 1938 г.н.,*
*Карачун Ніны Сцяпанаўны, 1929 г.н.*

## Гульні

У квадрацікі: ну, рысуецца, пішаца: адзін, два, тры, чатыры, пяць, шэць, сем, восем, дзевяць, дзесяць і прыгаеш вакол.





А яшчэ ў скакалкі прыгалі, у валейбол гулялі.

*Запісана ў в. Лань*
*ад Булыгі (Есіс) Ніны Міхайлаўны, 1958 г.н.,*
*(раней пражывала ў в. Панач Мінскай вобл.).*

Ну, гулялі ў гэтакі вот мячыкі. Мячыкаў некалі ж не было. Вечна ўжо як выганюць карову, так гэта шэрсць, што пазлазіць, шарыкі скручвалі і заганялі. Вон там лінія, і заганялі гэтыя мячыкі, адбіваліся.

***

Ілі вот калі назбіраем камешкаў пяць штук, падкідаем іх, а другія ловяць.

***

У хованкі гулялі. Калі той, хто шукаў, лічыў: “Адзін, два, тры, чатыры, пяць, вышаў зайчык пагуляць”. Альбо: “Аты-баты, шлі салдаты, аты-баты…”. Цяпер, на ком кончыцца, той ідзе лічыць. А патом ужо каго найдуць, так крычыць: “О, я нашоў!”, там ужо такі возглас, смех.

***

Гульні ў куба. Мы гулялі, дзяўчаты.

Вот ставіцца такая паліняка, штоб стаяла. Дапусцім, вот даўжыня гэта там. На дароге там ілі дзе, там ставіцца. Вот дапусцім, там на той старане пяць чалавек, там палосачка, зона іх, значыць. Патом там пяць чалавек. От мы стаім усе з кіямі, і, значыць, папускаем, ну, б’еш куб. Вось еслі я папала ў куб, значыць, я астаюсь, не выходжу із ігры. Ён тожа там са сваей стараны б’е. Еслі хто не пападае, вон із ігры.

***

Значыць ігра ў мяч, не футбольны або футбольны, такі вот абыкнавенны, магазінны.

Вось нас пяць дзяўчатак тамака, мы ж жылі вуліцамі, значыць, гулялі помню. Вось бярош гэты мячык і кажыш: “Я знаю пяць імён дзевачак: Валя, Таня, Маня.” – І тада штоб без запінкі ўсё да канца: “Я знаю тры імёны рэк, я знаю тры названні, імёны там таво, таво”. Еслі ты там што-та неправільна сказала, всё, выхадзі. Патом другая ўжо начынае.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Скаварады Вольгі Дзмітрыеўны, 1958 г.н.*

## ПРЫПЕЎКІ

*Не глядзіце на мяне,*
*Што крывыя ножкі,*
*У магазіне я купіла*
*Такі басаножкі.*

***
*Нашы бабы хочуць грошай,*
*Мужыкі - гарэлкі,*
*А мне б толькі быць здаровай,*
*І спяваць прыпеўкі.*

***
*Ой, прыпеўка, ты прыпеўка,*
*Надта ж шанавалася.*
*Як гармонік заіграў -*
*Вёска ўся сабралася.*

***
*Я паю, усё паю,*
*А сплясаць баюся,*
*Падумаю, пастаю*
*Можа й, разайдуся.*

***
*Мы, дзяўчата баявыя,*
*На машыне ехалі.*
*Беражыце сваіх хлопцаў,*
*Адбіваць прыехалі.*

***
*Сядзіць баба, хоча есці,*
*Ды не знае, што рабіць.*
*Можа, здаць у арэнду дзеда*
*Ды батон сабе купіць?*

***
*Тарелачка залачоная*
*На століку вярцелася.*
*Прыдумайце, вучоныя,*
*Каб есці не хацелася.*

***
*Стаіць белая бяроза,*
*Стаіць баба каля воза,*
*Дзед з хлява цяля выводзіць,*
*Будзе акцыі заводзіць.*

***
У настаўніка Пятрова
Трэці год няма абновы.
Яго двоечнік-балбес
Мае трэці "Мерседэс".

***
І чаму ж мне, маладому,
Не спяваць прыпеўкі?!
У каморы сала ёсць,
А ў клубе дзеўкі.

***
Усё жыццё пяю прыпеўкі,
Усё збіраю ў кучку.
Вот і вывела на сцэну
Я сваю ўнучку.

***
Пець учусь я ў народа,
Там вытокі тонкі,
Патаму я і паю
Так легко і звонко.

***
Едзе баба на мапедзе
І ўразаецца ў забор,
А каму якое дзела,
Што ў нас баба - каскадзёр.

***
На стале стаіць букет,
Кветачкі схіліліся.
А мне 60 год,
Но ў мяне ўлюбіліся.

***
Ой, дудачка, далі Бог,
Не жалей жа маіх ног.
Мае ножкі не баляць,
Яны хочуць танцаваць.

***
Пастарайцеся, дзяўчаты,
Усе канавы засыпаць,
Бо такія хлопцы ходзяць,
Што з канавы не відаць.

***
Мой мілёначак харош,
Хоць за пазуху палож.
Палажыла б за душу,
Дык баюся задушу.

***
Дзяўчынка мая люба,
Мядовая твая губа.
Адзін раз як пацалую,
Тры дні ў роце мядок чую.

***
Мне не трэба пуд гароху,
Толькі тры гарошыны.
Мне не трэба многа хлопцаў –
Мне адзін харошанькі.

***
Мне не трэба пуд мукі,
Мне не трэба сіта.
Мяне мілы пацалуе,
Цэлы тыдзень сыта.

***
Не тужы, мая мілая,
За мной будзеш панаваць.
Я наймуся свінні пасвіць,
А ты будзеш падганяць.

***
Сюды-туды вокам кіну –
Няма таго, за кім гіну,
А пры боку сядзіць згрэбла,
Што нікому не патрэбна.

***
Я з-пад лесу, я з-пад гаю
Свайго мілага пазнаю:
Ногі доўгія, крывыя,
Парткі срэбныя, рабыя.

***
Каб ты міленькі ссінеў,
Як асіна сіняя,
Я іду, а ты гаворыш,
Што я некрасівая.

***
Не дай, Божа, з такім лёсам
Любіць хлопца з доўгім носам,
Каб яго пацалаваць,
Трэба нос адпілаваць.

***
Заіграй, гармонік, звонка,
А я буду падпяваць.





Буду родную старонку
Я прыпеўкай праслаўляць.

***
Наша маладасць прайшла,
Старасць набліжаецца.
Но любоў мая радная
Наўсягда астанецца.

***
Не ідзе жыццё ўгору:
Стаў я рэдка есці,
Як ад голаду памру,
Будзе лёгка несці.

***
Каларадскія жукі
Ядуць бульбу год які,
А цяпер жа чуткі йдуць:
І вучоных паядуць.

***
На дубу сідзіт варона,
Ветачкі качаюцца.
Палюбіце вы мяне –
Маладасць канчаецца.

***
Я фігурай хараша,
І спяваць стараюся.
Мо, якому тут дзядулю
Я і спадабаюся.

***
Землякі вы, землякі,
Вы нас не асудзіце.
Будзем пець мы да сіх пор,
Пака вы слушаць будзеце.

***
Я лавіла петуха,
А спаймала курыцу.
Палажыла дзеда спать,
А сама на уліцу.

***
За сталом сабраліс госці,
Весяляцца і шумяць,
А хазяева трасуцца:
Неужэлі ўсё з'ядзяць?

***
Я, падружкі, умываюсь
Радніковаю вадой.
Не хачу я быць старухай,
А хачу быць маладой.

***
Какой парэнь, статный, бравый,
Как і палагаецца,
А ўспомне он пра цёшчу –
Ногі падгібаюцца.

***
Я прыпеўкі праспявала,
Трошкі засталося.
Кабы нашаму народу
Весела жылося.

***
Мы прыпеўкі вам прапелі,
Да ўсталі, хочем сесць.
Прыезжайце к нам в деревню –
Мы для вас там будзем пець.

Запісана ў в. Смалічы
ад Шчурскай Ірыны Мікалаеўны, 1935 г.н.

***
Ах, саперніца мая,
Жаба ты балотная,
Я любіла, ты адбіла,
Падавісь, галодная.

Запісана ў в. Лань
ад Булыгі (Есіс) Ніны Міхайлаўны, 1958 г.н.,
(раней пражывала ў в. Панач Клецкага р- на).

Ты іграй весялей,
Балалайка, тры струны,
Падпявайце, хто ўмее,
Не саромеясь, пляшы.

***
Ходзіць Люся, як кашчэй,
Ні супоў ні есць, ні шчэй,
Валіцца ад слабасці,
А любіць толькі сладасці.

Запісана ў в. Лявонавічы
ад Матус Яўгеніі Міхайлаўны, 1930 г.н.

***
У майго мілёначка
Акуратненькі насок.

*Восем курачак садзіцца,*
*А дзевяты петушок.*

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Сінькевіч Вольгі Віктараўны, 1927 г.н.,*
*(раней пражывала ў в. Каменка Нясвіжскага р-на).*

*Гарманіст, гарманіст,*
*Рубашка сацінава,*
*Цераз цябе, гарманіст,*
*Мамачку пакінула.*

***

*Мяне мілы праважаў*
*Ад каліткі да варот.*
*Я думала – пацалуе,*
*Ён стаіць, разінуў рот.*

***

*Ой, любоў, мая любоў,*
*Дзе жэ любоў дзелася.*
*Мусіць, ты, мая любоў,*
*У паветры разляцелася.*

***

*Цераз рэчку быструю*
*Галошы перакінула.*
*Любіце мілага майго,*
*Бо я яго пакінула.*

*Запісана ў в. Малева*
*ад Гацілы Алены Веньямінаўны, 1933 г.н.*

*Мой мілёначак харош,*
*Хоць за пазуху палож,*
*Палажыла бы ў душу,*
*Дык баюся задушу.*

***

*Гаварацьь, я баявая,*
*Баявая я і есць,*
*Цяпер ціхія ня ў модзе,*
*Баявым бальшая чэсць.*

*Запісана ў в. Казлы*
*ад Рабко Фаіны Антонаўны, 1942 г.н.*

*На стале стаіць стакан,*
*А ў стакане малако.*
*Прашчай, тата, прашчай мама,*
*Я ўяжжаю далеко.*

*Запісана ў в. Гусакі*
*ад Усовіч Антаніны Уладзіміраўны, 1935 г.н.*

*Гдзе маі 17 лет,*
*Гдзе мая тужурачка,*
*Гдзе маі тры ўхажора:*
*Міша, Ваня, Юрачка.*

***

*Я любіла гарманіста,*
*Ні папала за яго,*
*Бо ні стала капітала*
*У папашы маяго.*

***

*Гарманіст, гарманіст,*
*Рубашка сацінава,*
*Цераз цябе, гарманіста,*
*Мілога пакінула.*

***

*Гарманіст, гарманіст,*
*Карэнькія очкі,*
*Цераз цябе, гарманіста,*
*Не даспала ночкі.*

***

*Коля мой, Коля мой,*
*Коля ненаглядны,*
*А ў Колі на грудзі –*
*Цвяток вінаградны.*

*Запісана ў в. Альхоўка*
*ад Свірыдовіч Ларысы Сцяпанаўны, 1938 г.н.,*
*Карачун Ніны Сцяпанаўны, 1929 г.н.*

*Коля, Коля, пайдзі ў поле,*
*Пасматры, какая рож.*
*Еслі нізенька-высока,*
*То ў салдаты не пайдзёш.*

*Запісана ў в. Аношкі*
*ад Шарапа Анастасіі Сцяпанаўны, 1933 г.н.,*
*(раней пражывала ў в. Каменка Нясвіжскага р-на).*

***

*Вокам кіну, вокам кіну,*
*Няма тога, за кім гіну.*
*А сядзіць то грэбла,*
*Што нікому не патрэбна.*

*Запісана ў в. Грыцкавічы*
*ад Цыўлі Ганны Міхайлаўны, 1932 г.н.*

## Гульні

**Розга.** Сабіраліся хлопцы і дзяўчаткі на вячоркі, выбіралі вядучага і счыталі, каму выпадае першы дубчык. Ставяць табурэтку пасярэдзіне. І калі выпала хлопцу, то ён ідзе і б'е па калене дзяўчыну, і яна скарэй бяжыць. Хто першы на стул сядзе,значыць, дубчык перадаецца.

**Фанты.** Гулялі маладыя на вячорках так: кажды аддае які-небудзь свой прадмет, складвалі ў адну каробачку усё і потым выцягвалі, чый фант. Кожны пазнаваў свой прадмет. І тады гаварылі: каму патанцаваць, каму паспяваць, каму вішанькаю быць.

**Быць вішанькай.** Дзяўчына становіцца на табурэтку, а 2 хлопцы становяцца па баку. А трэцці падбягае, падпрыгвае і дастае, каб пацалаваць дзяўчыну, абапіраецца на двох гэтых.

*Запісана ў в. Слаўкава*
*ад Макавец Чаславы Вітольдаўны, 1943 г.н.*







***Аляксей Ненадавец***

# СПАДЧЫНА НЯСВІЖСКАГА КРАЮ

Упершыню мне давялося трапіць у гэты славуты край у далёкім 1983 годзе. Вёска, дзе я спыніўся, мела дзіўную назву – Саска Ліпка. Нідзе раней не сустракаў такой. Калі пачаў распытваць, то аказалася, што паселішча мае сваю цікавую гісторыю і назву трэба тлумачыць як Царская Ліпка. А мне спачатку падалося, што Саска паходзіць ад слова "сасы" – шведы. Жанчына, у якой я распытваў, цвёрда стаяла на сваім варыянце. Разгаварыліся, і мне падалося цікавым, як вяскоўка трымалася: не ганарліва, але горда, нязмушана, стрымана. Яна не гаварыла без перапынку, а адказвала ясна, дакладна. На Нясвіжчыне існавала славутае раздзяленне на мужыкоў і шляхту. Яно было проста ўмоўнае, міфічнае, але існавала. Пераканаўся я ў гэтым тады, калі запытаў пра захаванне старажытных слаеў фальклору: прымхаў, забабонаў, замоў, варожбаў, павер'яў. Вось што паведаміла мне В.Л. Мацкевіч, 1919 года нараджэння: "Перш чым пачынаеш ткаць ці ўстанаўліваць ткацкага станка, то трэба абавязкова ведаць, які ідзе тыдзень – добры ці неспрыяльны. Як па календары атрымліваецца, што навалунне, то нельга ні ў якім разе пачынаць ткаць ручнікі, ці ўвогуле ткаць палатно. Бо, гаварылі, як пачнеш у навалунне, то ў рабоце не будзе аніякага спору: ніткі стануць блытацца і рвацца без дай прычыны, а само палатно стане атрымлівацца няроўным і каляным, надта зрэбным і нетаварным"; "Вось як ацеліцца карова, то ў гэты самы ж дзень нікому нічога нельга будзе даваць, нават калі вельмі будуць прасіць-упрошваць, гаварыць, што ад гэтага надзвычай многае залежыць. Няма розніцы, дробная гэта будзе пазыка, ці буйная. Але ўсё роўна забарона на яе абавязковая. Калі ж не ўтрымаешся ці забудзешся і аддасі, то карова ў такім разе можа зусім страціць малако ці будзе даваць яго намнога меней".

Некаторыя з нагаданых ёю прыкладаў выклікалі ўсмешку перад іх "шляхетнасцю", калі я міжволі ўзгадваў пра яе. Людзі былі бяссільнымі перад адвечнымі законамі

жыцця, хіба што з розніцай на ранейшую сацыяльную няроўнасць. А так… Хоць бы і хацелі супрацьпаставіцца, то нічога не атрымлівалася, бо законы жыцця патрабавалі свайго. Надыходзіў адпаведны момант, час, калі ўсё здаралася так, "як і трэба". Верылі продкі, працягвалі верыць і нашчадкі: "У ноч на Івана Купальнага на дзвярах адрыны (хлява), дзе стаіць (стаяць) карова (каровы), навешваюць сярпы, пілы, страсныя свечкі і крыжы. Гэта рабілася для таго, штоб у гэтую ноч русалкі не змаглі зайсці ці пранікнуць у адрыну. Таму што гора будзе гаспадыні, калі яна так не аберажэцца і яны туды зойдуць. Не дачакаецца малака ад сваёй каровы (кароў). Вельмі моцны знахар здолее выратаваць ад такой бяды"; "Сабраныя на Яна галінкі купалкі з нераспушчанымі кветкамі прыносілі ў хату, уторквалі за абразы, у шчыліны між бярвеннямі ці падвешвалі за бэлькі. Калі потым кветкі распускаліся, то гэта азначала, што дзяўчына, якая жыла ў гэтай хаціне, у гэтым годзе выйдзе замуж ці ўвогуле задуманае ёю абавязкова збудзецца".

## Каляндарна-абрадавыя павер'і

У народных павер'ях фіксавалася ўсё, што адбывалася навокал. Здаецца, што сядзеў нейкі летапісец і ўсё запісваў, каб потым перадаць нашчадкам, але ўжо ў вуснай форме.

"Вясна лічыцца з Грамніц, бо ж кажуць, што на Грамніцы да полудню зіма, а пасля полудня вясна. Яшчэ кажуць, што на Грамніцы курыца з лужы нап'ецца, бо ўжо павінна вада капаць са стрэх. Нездарма ж на Грамніцы свенцяць свечкі, якія і называюцца грамнічнымі, бо яны вельмі добра дапамагаюць ад грому. А ведама, што гром бывае толькі ўлетку ды яшчэ, зрэдку, вясной. Нашы старыя гаварацЬ, што яны памятаюць такі год, што на Грамніцы былі рэдкія грымоты, што так смаліў Пярун, што рэдка калі бывае й па лету. Магчыма, таму і гэтае свята называецца Грамніцамі, што з яго пачынаюцца грымоты і яно імі заўжды камандуе".

Былі ў сувязі з гэтым і асаблівыя павер'і, якія звязвалі з прадказаннем будучых грымот ці навальніц на ўвесь летні перыяд.

"Калі грамнічныя свечкі, як і касцёльныя, трашчалі ў час свайго гарэння, то гэта азначала не што іншае, як улетку трэба чакаць грымот. І чым мацнейшы і часцейшы быў трэск, тым часцейшымі і страшнейшымі будуць летнія навальніцы (Мацкевіч В.Л., 1919 г.н.).

Знайшоў я тады і іншыя сведчанні таго, што на нясвіжскай зямлі захавалася даволі многа звестак са старажытных поглядаў на прыроду, якія былі перададзены праз апісанні народных і рэлігійных святаў: "Ад Вербніцы і ажно да Вялікадня нельга ні ў якім разе піць ваду, зачэрпнутую пад вярбою ці блізка ля яе, бо ў вадзе той ёсць шмат чарцей, якія непрыкметна зайшоўшы ў чалавека, пачнуць усяляк шкодзіць яму. Агульнавядома, што як толькі кранецца са свайго месца веснавая вада, перапалоханыя чэрці павыскокваюць са сваіх зімовых сховішчаў і палезуць на вербы адагравацца ад сцюж і маразоў. Калі ж засвенцяць вярбу, то ўдвая больш раззлаваныя нячысцікі падаюць у ваду. Чэрці аддаюць перавагу вярбе перад іншымі дрэвамі таму, што яна раней распускаецца, а, значыцца, ім можна болей нашкодзіць людзям. Але ж і людзі ламаюць галінкі гэтага дрэва раней, каб іх асвяціць у касцёле. Таму і людзі болей шкоды паспеюць нанесці нячысцікам".

Жыхары лічылі таксама, што вярба дапамагае ад зубнога болю і ліхаманкі: "У Вербную нядзелю, калі выйдуць з касцёла, то кожны стараецца з'есці па дзевяць пупурышак з галінкі свянцонай вярбы, якія здавён называюцца "свечкамі". Робіцца гэта для таго, каб на працягу ўсяго года не балелі зубы і чалавек не хварэў на ліхаманку".

## Сямейна-бытавыя павер'і

Законы жыцця нельга было перамяніць ні багатаму, ні беднаму. Як ні старайся, а час абавязкова бярэ сваё.

"Жаніха і нявесту, як збіраліся да касцёлу вянчацца, трэба абвесці вакол сямейнага стала тры разы; а як выйдуць ужо з хаты, то неабходна абсыпаць зернем жыта або хмелем. Жыта азначала заможнасць, багацце. А хмель – цягу да жыцця, жыццядайную сілу, тое, што мог прарастаць і выжываць у надзвычай складаных умовах. Не зробіш так, то ад маладой сям'і не будуць адчапляцца беды і няшчасці".

Існавала таксама ўсемагутная сіла, якая проста распраўлялася з любым з зямных жыхароў, не ведала стомы нідзе і ніколі, працавала пастаянна, не спыняючыся ні на хвіліну. Людзі ведалі пра яе, ведалі пра страшэнныя здольнасці сілы і стараліся ад яе абараніцца. Калі не ад самой яе, то ад тых уздзеянняў, якія маглі шкодзіць чалавеку на працягу значнага часу. "Як выносяць з хаты пакойніка, то абсыпаюць яго зернем жыта. Гэта, кажуць, для таго, каб пакойнік потым не пасылаў з таго свету ўсялякіх непрыемнасцей, каб не працягваў "жыць" у хаце, каб не з'яўляўся начамі, не палохаў хатніх і даў ім адпачынак".

Але мяне тады цягнула, як мне самому здавалася, да больш "значных" жанраў вуснапаэтычнай творчасці, а найперш, да легенд. Гэта ўжо пазней я не стаў іх падзяляць, бо ведаў, што няма "першасных" і "другасных", а ёсць духоўная спадчына беларускага народа. Тым не менш запісаў многа адзінак і не ўсе, як сёння бачна, агульнавядомыя.

## Пра паходжанне бярозы і асіны

Самі бяроза і асіна – гэта няверная жонка і яе палюбоўнік. Вядома, што жонка пры дапамозе палюбоўніка забіла свайго мужа. Але гэта пазней стала вядома. І Бог, які хадзіў па свеце жабраком-дзядулькам, прачуўшы пра гэта ад людзей, пераўтварыў няверную жанчыну ў бярозу, якая штовесну плача над тым злачынствам рачною асакою: шуміць, перашэптваецца, прыніжаецца. Палюбоўніка ж зрабіў Бог асінаю, якая ад таго самага здарэння ўвесь час трасецца ад страху сваім лісцем, нават у надзвычай ціхае надвор'е. Трасецца, бо чакае ў любую хвіліну смяротнага пакарання. Так вось пайшлі на свет бяроза і асіна.

*Карпук В.Я., 1916 г.н., в. Альбянка*

Многае захавалася ў памяці ад тэкстаў, якія знайшлі сваё месца ў кнізе "Легенды і паданні" (Мінск, 1973). Я здзіўляўся: не паспеў выйсці акадэмічны том, а легенды з яго ўжо вядомы мясцовым жыхарам. Але потым успомніў святое правіла для фальклору – варыятыўнасць. І не выключана нават тое, што я запісваў матэрыялы тых жа інфарматараў, што і складальнікі кнігі.

## Краснае возера і княжацкі палац

Калісьці старыя людзі прамаўлялі пры мне, зусім малым хлапчуком, а я быў заўсёды цікаўны ды дапытлівы, таму і запомніў. Ніколі не прапускаў іхніх гамонак ды сустрэч, бо дзед мяне не пакідаў і браў з сабою. Таму старыя і распавядалі, што тут недзе было вялікае і прыгожае возера. Знаходзілася яно пасярод лесу. Сам той лес быў густы і непралазны. Ды яшчэ на возеры знаходзіўся востраў, а на ім стаяў велічны княжацкі палац. Узвялі яго за вялікія грошы, многа людзей пры будаўніцтве загінула. Калі пабудавалі палац, то ягоны гаспадар пачаў з усімі сваімі знаёмымі ды суседзямі закладвацца, што ніякая бура не разбурыць ягоны гмах, не пашкодзіць яго. Неяк так заклаўся, а не ведаў, што насупраць яго выступіць моцны знахар-чараўнік. Дачакаліся ночы. І тут такая навальніца ўсхадзілася, такія хвалі ды вецер панёсся, што і перадаць немагчыма! Нібы якое шкарлупінне знеслі са свайго шляху хвалі агромністай вышыні ўсе чыста пабудовы, ніякага следу пасля сябе не пакінулі. І князя таго не стала той страшнай ноччу. Ніхто не ведае, куды ён дзеўся. Сышла вада незаўважна. І што самае галоўнае – на тым месцы не стала болей возера, адно што вынішчаны лес доўга адыходзіў пасля такой навальніцы. Бываюць зрэдку такія стыхіі, што і пераказаць пра іх нам зараз цяжка, бо не на нашым вяку здарылася ўсё гэта.

*Шыманскі В.С., 1912 г.н., в. Рассветная*

## Дзявічая гара

Гэта паданне не прывязана да нейкай канкрэтнай мясцовасці, але трывала мацуецца за назвай "Дзявічая гара".

"Даўным-даўно, нават пры памяці прапрадзедаў нашых дзядоў жыў адзін вельмі багаты пан. Бязлітасны быў, злосны, нікога не шкадаваў, нікога не лашчыў. Распавядалі, што ў яго быццам бы працавалі на ўсіх работах толькі адны дзяўчаты. Амаль не ведалі яны адпачынку. Сонца ўзыходзіла – яны ўжо працавалі, заходзіла – яны яшчэ працавалі. Толькі пану і гэтага было мала: загадаў ён, каб дзяўчаты нацягалі пяску і з яго насыпалі вялікую і высокую гару. Нібыта выканалі і

гэтае патрабаванне сквапнага пана дзяўчаты. Выканалі, але пры гэтым усе да адной памерлі. Гаварылі, што многа гадоў запар трава на самой гары была мокрая. І ноччу, і днём. Казалі людзі, што гэта сачыліся дзявочыя слёзы, якія яны пралілі падчас свайго нечалавечага жыцця. Вось адкуль такая гара ўзялася".

*Мацкевіч Ю.С., 1895 г.н., в. Квачы*

## Пра птушак і звяроў

Часам паходжанне птушак спрабавалі звязваць з пэўнымі гістарычнымі падзеямі. Напрыклад, з руска-шведскай вайной, ад якой надзвычай пацярпелі нясвіжскія землі: "Адкуль узяліся ў нас кнігаўкі? Раней, калі ішла вайна са шведамі, то тыя везлі з сабою шмат кнігавак. Справа ў тым, што заўважыўшы чалавека, гэтыя птушкі заўсёды пачыналі надта крычаць і тым самым выдавалі ягонае месцазнаходжанне. Ворагі беглі на гэтыя крыкі і знаходзілі местачкоўцаў. Пры гэтым іх паланілі ці забівалі. Вось таму і цяпер, калі кнігаўкі бачаць каго з людзей, то адразу ж падымаюць моцны вэрхал".

У некаторых выпадках легенды і паданні нагадвалі сабою анекдатычныя выпадкі, якія здараліся ў жыцці людзей, але былі перанесены на жывёльны свет: "Чаму кот мыецца". "Ухапіў кот вераб'я, але ўперад стаў мыцца. Пакуль мыўся, дык верабей уцёк. Тады ўжо як другі раз злавіў, то прамовіў: "Не, я спачатку цябе з'ем, а потым ужо памыюся". Так і засталося назаўсёды: кот паесць, аблізнецца, а потым ужо пачынае мыцца".

## ЗАМОВЫ

Тады мною было запісана некалькі дзесяткаў замоў на ўсе выпадкі жыцця. Я не вылучаў спецыяльна нейкіх зададзеных накірункаў, а фіксаваў усё, што траплялася, бо адчуваў каштоўнасць гэтага бясцэннага (сёння ўжо) матэрыялу. Здавалася б, простыя тэксты, але ўсё роўна ў іх адчувалася нейкая духоўная глыбіннасць, нейкі своеасаблівы падтэкст.

### Ад ікаўкі

Ехала ікота каля балота на сівой кабыле. Кабыла ўпала, ікота прапала.

Ікалка, ікалка, з другім пайграй, а мне спакой дай!

Ёкалка, ёкалка, выйдзі за плот. Каго сустрэнеш – таму ў рот.

Ікалка-пыкалка, стань ля варот. Хто прыйдзе – таму ў рот.

Якаўка-ікаўка, выйдзі з-за маіх варот. Хто пачаў ікаўку, ускоч яму ў рот.

*Карпук І.С., 1897 г.н., в. Слаўкава*

### Любоўныя

Канешне, людзі заўсёды былі аптымістамі, таму думалі найперш пра каханне. Кожная дзяўчына старалася прылучыць да сябе назаўсёды свайго каханага, мілага, любага, нават тады, калі ён кахаў іншую.

Для такой справы існавала шмат замоўных тэкстаў і розных магічна-варажбітных спосабаў уздзеяння: "Пайду я ў чыстае поле, памалюся Богу, уграм і буграм, і вятрам. Вы, вятры-вецярочкі, дуйце яму па ўсім свету. Найдзіце раба Божага (імя), дуйце яму ў сэрца, дуйце яму ў кроў, каб яго сэрца балела, кроў кіпела па рабе Божай (імя). Амінь. Пускаецца па ветру"; "Лягу я, раба Божая, памалюся. Устану, благаслаўлюся. Памыюся расой, вытруся пеляной. Выйду я ў чыстае поле, у шырокае раздолле. Як красна сонейка ззяе-прыпякае, так і ты, раб Божы (імя), ка мне прыбягай, ка мне прысыхай. Спаць бы ты не спаў, гуляць бы не гуляў, а ўсё да мяне прысыхаў. Амінь". Паўтарыць замову тры разы.

*Коршук Ю.С., 1889 г.н., в. Салтанаўшчына*

Выпадкова мне сустрэўся нават тэкст, дзе ўзгадваліся дэманалагічныя персанажы. Іх таксама заклікалі на дапамогу ў такой жыццёва важнай справе: "Эй, вы, чэрці, гуляйце. Майго (імя) мне аддайце. Каб ён з каўрыгі хлеба не еў, а думаў пра мяне і прыйшоў да мяне" (Вішнеўская В.Л., 1897 г.н., в. Асмолава).

Знайшлася адна замова, у якой прысушыць да сябе дзяўчыну спрабаваў хлопец: "Лягу я, раб Божы (імя), памалюся. Устану я, благаслаўлюся. Памыюся я расою, вытруся прастольнаю пеляною. Пайду я з дзвярэй у дзверы, з варот у вароты. Выйду я ў чыстае поле, у зялёнае намор'е. Стану я на сырую зямлю, пагляджу я на ўсходнюю старану. Як краснае сонейка ззяе, прыпякае мхі і балоты, чорныя гразі, так і ты прыбягай, ка мне прысыхай, раба Божая (імя), ка мне, рабу Божаму (імя). Вочы ў вочы, сэрца ў сэрца, мыслі ў мыслі. Спаць бы яна спала – не засынала, гуляць бы яна сама не гуляла, а ўсё ка мне прыбягала. Амінь, слава табе" (Хоміч Л.І., 1994 г.н., в. Альбянка).

Значная колькасць замоў-прысушак закранала тэму вяртання мужоў у сем'і, іх "адмаўлення" ад заляцання да чужых жонак: "Як людзі соль любяць і без яе не могуць, так жа каб і мой муж мяне любіў і без мяне жыць не мог: ні дзень дняваць, ні ноч начаваць. Каб усё за мной хадзіў і на мяне любаваўся"; "Вячэрняя зара, Марыя, прыгані мне (імя) з любоўю і жаласцю. Утранняя зара, Марыя, прыгані мне (імя) з любоўю і жаласцю. Чытаць тры разы запар раніцай і вечарам" (Вішнеўская Я.Ц., 1892 г.н., в. Іскры).

Інфарматары гаварылі і пра тое, што заўсёды трэба баяцца "чорных" вачэй, якія ўсюды цікуюць за маладымі, здаровымі і шчаслівымі. Таму і навучалі, напрыклад, нявесту перад вяселлем: "Пры ўваходзе пасля вянчання ў касцёле ў дом мужа маладая, для таго, каб панаваць над іншымі жанчынамі ў хаце, павінна была прамовіць: "Першая, другая, я іду трэцяя! Усе пайшлі вон, а мне адной будзе дом!"

Узаемаадносіны з "чорнымі", "ліхімі", "чартоўскімі" людзьмі не пускалі на самацёк. Усяму злому і бязлітаснаму стараліся супрацівіцца, каб засцерагчы сябе і сваю сем'ю ад уздзеяння "нядобрай", "нячыстай", "чартоўскай" сілы і яе носьбітаў. Мне сустракаліся даволі розныя замоўныя тэксты. Але іх усё роўна можна падзяліць на некалькі груп: "Замовы ад злога духа", "Ад ліхога чалавека", "Ад злога чалавека", "Ад злых людзей", "Малітва ад усіх зол".

### Малітва ад усіх зол

Ангел Божы, святы мой храніцель! Дадзены ты мне ад Бога з неба ў ахоўванне. Прашу цябе, ты сягоння мяне перасцеражы і захавай ад усялякага зла, навучы мяне добрай справе і накіруй на шлях выратавання!" Паўтарыць тройчы.

### Ад нядобрых вачэй

Перад шаптаннем хворага трэба перахрысціць. Хрысцяць звычайна не рукой, а жалезам (нажом, лыжкай). Замаўляюць на вадзе, якую потым п'юць або якою ўмываюцца. "Госпаду Богу памалюся, Мацеры Прачыстай Гасподняй пакланюся. Першым разам, гасподнім часам. Ішло тры хмаркі. Адна – дажджавая, другая – грамавая, а трэцяя – ветраная. Дажджавую дождж размывае, грамавую гром разбівае, а ветраную вецер раздувае. Хто на рабу Божую (імя) злобу мае, хай таму на лоб вочы павыпірае. Я з духам, словам, а Гасподзь мне на помач".

*Мясніковіч М.І., 1899 г.н., в. Загорная*

### Ад болі ў суставах

Святы Георгій ехаў на белым кані па залатым пяску. Конь спатыкнуўся, а сустаў на сустаў наткнуўся, жыла на жылу наткнулася, кроў на кроў налілася. Святая спасіцельная малітва раба Божага (імя) народжанага, прашчонага, малітвеннага, прычашчонага.

### Ад ламаты касцей

Дзерава дзеравіцца. Гэтаму дрэву ў лесе не бываць, на пні не стаяць, вятрам не гудзець, лісту не шумець. Я – шэры воўк, я цябе з'ем!

*Грыміцкая С.Я., 1909 г.н., в. Садовая*

Здаралася, што тыя, хто прамаўляў замовы, не ўяўлялі, ад чаго яны дапамагаюць, бо хвароба была нейкая "прымхліва-міфічная". Тым не менш такія вуснапаэтычныя творы знаходзіліся ў "запасе" вясковых знахараў Нясвіжчыны.

### Ад чэмеру

На сінім моры, на лукамор'і стаіць дуб. Пад тым дубам стаіць капліца. У той капліцы красная дзявіца платкі мыла, чорным шоўкам вышывала. У яе шоўку не стала. Каб у раба Божага (імя) чамярыцы-патніцы не стала. Каб

цела не сушыла, сэрца не знабіла і ўсё на месца станавіла. Замова замаўляецца ў тры разы.

На моры, на лукамор'і, ляжыць камень. На тым камені сядзіць дзявіца. Яна шые чорным шоўкам, вышывае. У тае дзявіцы чорнага шоўку не стала. Так у гэтага чалавека чэмеру не стала. Амінь.

*Хомічава Н.П., 1911 г.н, в. Петухоўшчына*

У кожнай сям'і раслі дзеці. З-за пастаяннай занятасці некалі было сядзець з малымі. Як казалі ў вёсках: "дзеці гадавалі самі сябе" або старэйшыя сачылі і адказвалі за сваіх малодшых братоў і сясцёр. Бацькі больш сталага ўзросту, якія ўжо не хадзілі на працу і знаходзіліся дома, таксама дапамагалі. Гаспадыня адказвала за ўсё, таму і прасіла яна ў замовах аб абароне сваіх дзяцей на розных "этапах" іх гадавання.

## На захаванне плода

Ішла святая Прачыстая з усімі святымі апосталамі. Нясла залатыя замкі, сярэбраныя ключы. Замыкала рабы Божыя (імя) жывот да пары. Амінь.

## Каб аберагчы ўнукаў

Трэба пасадзіць дзіця на стул, даць у ручкі абраз і стаць за яго спіною. Прыкусіць тры разы валасінку на яго галаве і гаварыць: "Ліха-бяда! Рукі чужыя, ворагі людскія, языкі злыя! Ад раба нараджонага, пахрышчонага (імя), рукам нямець, ворагам камянець, злым языкам аднімацца, з ліхай бядой не знацца. Амінь".

## На дачку

Чытаць у дзень нараджэння, пры гэтым трымаць валасы дзяўчынкі ў руках: "Ліха бяда! Рукі чужыя, ворагі людскія, языкі злыя, ад рабы народжанай, перахрышчанай (імя) адыйдзіце! Рукам – нямець, ворагам – камянець, языкам – аднімацца, з ліхой бядой – не знацца. Амінь".

## На сына

Чытаць замову толькі на хрышчаных і ў дзень іхняга нараджэння: "Ангелы з раждзенія – на яго сахраненія! Крыламі адмахніце ворагаў, убійцаў. Мячом-агнём пагубіце, маё дзіця сахраніце. Амінь".

*Мішыкевіч Я.Н., 1907 г.н., в. Іванава*

## На моцны абпал

Абпал, не балі, наперад не хадзі. У рабы Божай (імя), каб косці не нылі, паясы не балелі, ні на ранішняй зары, ні на вячэрняй зары, ні днём пры сонейку, ні ноччу пры месяцы. Ні на ветаху месяца, ні на сярэдзіне месяца, ні ў канцы месяца. Якую прамову не дамовіла, то яе няхай мая думка замовіць, а яна моцная і крэпкая. Адныне і давеку. Ключ і камень. Амінь!

Паліваюць абпал, па сонейку павадзіць безымянным пальцам вакол абпалу і паўтарыць усё тры разы.

*Шыбіцкая В.І., 1907 г.н., в. Астроўкі*

Браліся народныя медыкі ці знахары дапамагаць і тады, калі людзі ламалі ногі. Часта гэта здаралася, бо хадзіць сялянам даводзілася многа. Паслуг прафесіянальнай медыцыны спачатку ўвогуле нельга было дачакацца (яна проста адсутнічала). Быў і яшчэ адзін аспект – фельчар ці доктар вельмі дорага ацэньвалі свае паслугі. Мясцовыя знахары – іншая справа: "Ішоў Бог дарогай, а злая сіла – аблогай. Бог нясе рукавіцы, а чэрці – паганіцы. А я – бох ад пералому чорту ў ногі. Я цябе прашу, вымаўляю, а заадно і вылечваю прыстрэчную, пераломную, прыдуманую, прыгаданую хваробу-боль. Амінь"; "Ішоў Гасподзь па камяну масту. Ішоў і плакаў. Пытаецца Божа Маці: "Чаго, сынку, плачаш?" – "Дзіцятка ўпала, ножку зламала". – "Пастой, сынок, не плач, будзем ратаваць. Будзем ножку пацаляці: костачку на костачку, сустаў на сустаў, да і на места пастаў. А кроў разальецца і ўсё мінецца. Амінь".

*Хомічава І.В., 1910 г.н., в. Рассветная*



Нясвіжскага краю напеў векавы

# НАРОДНЫЯ СВЯТА

Часам розныя звычаі і парадкі, заведзеныя ў пэўным населеным пункце, былі падобныя да хуліганства. Усякае здаралася: раскідвалі гаспадарчыя прылады, ламалі платы, вырывалі лаўкі і весніцы.

## Новы год

Пад Новы год абычай такі ў нас ёсць. Ідзем увечары па вуліцы вёскі, убачым, у каго дровы ляжаць у двары складзеныя, то ўварвемся туды ды параскідаем. Вісяць, вымярзаюць ходнікі, то мы іх запрэм ажно двароў праз дзесяць ды там пакідаем, а весніцы з пяцель пазрываем ды пад дзверы гаспадару падапрэм, каб з хаты падумаў, як яму раніцай выбрацца.

Пад Новы год апраналі дзеўкі і хлопцы на сябе навыварат вывернутыя кажухі і паўкажушкі і хадзілі пад вокнамі хатаў. Пачыналі там, пасля поўначы, дурэць і спяваць. На розныя галасы, прыкідваючыся ды прыдурваючыся, выкідваючы ўсемагчымыя штучкі. Яны спявалі, крычалі. Жадалі дабра на ўвесь год, а ім гаспадары за гэта плацілі, выносілі розныя падарункі-паднашэнні.

*Крывіцкая С.П., 1900 г.н., в. Квачы*

## Масленіца

Па-свойму пераказвалі народныя святы, тое, як яны сустракаліся і праводзіліся ў народзе. "Масляніца прыходзіць не ў адзін дзень. Яна прыходзіць у першых днях сакавіка. Масляніца працягваецца сем дзён. Гэта вельмі вясёлае свята, таму зарання ўсе да яго па-свойму рыхтуюцца. Найлепшыя запасы ежы зберагаюць менавіта на гэты час. У першы дзень, які называецца разговіны, апранаецца ўся вёска ў самае лепшае, што ў кожнага ёсць. Са старых ануч робяць чучала (бабу) і нясуць яе з песнямі ды крыкамі на самае высокае месца, каб усе маглі бачыць. Там гэтае чучала становяць. Ля яго наладжваюцца ўсемагчымыя гульні, ездзяць на санках, водзяць карагоды, мужчыны ды хлопцы мераюцца сілай, барукаюцца. Дзяўчаты водзяць карагоды і спяваюць песні. Напрыклад:

*На вуліцы хмель павіваецца,*
*Маладая прыгажуня замуж сабіраецца!*
*Масленка шчаслівенная,*
*Працягніся надоўга!*

І так гуляюць-святкуюць цэлы тыдзень. На апошні дзень, у нядзелю, яго ў народзе называюць заговіны, зноў ідуць на гулянне да чучала. Потым яго ўрачыста спальваюць. Чым даўжэй чучала, тым, лічаць, шчаслівейшым будзе год. Попел і рэшткі чучала старанна закопваюць. Пасля гэтага нядзельнага дня наступае пост. У час паста не збіраюцца вечарынкі, не спяваюць дзяўчаты звонкіх песень. Бабы тым часам прадуць, шыюць. Адным словам, усе займаюцца звычайнай працай.

*Недаборская Ф.М., 1900 г.н., в. Альбянка*

## Вялікдзень

Вечарам пад вокнамі кожнай хаты хадзілі валачобнікі і сваімі песнямі віталі і ўзвялічвалі гаспадароў і іхніх дзяцей. За гэта тыя, у сваю чаргу, кідалі ім грошы. На сабраныя грошы і прадукты валачобнікі ладзілі вечарынку, куды запрашалі дзяўчат. Там спявалі і весяліліся да рання. Велікодныя песні былі самыя розныя:

*Мая мамачка,*
*ты на што мяне замуж аддала?*
*У чужое сяло, у далёкае.*
*Не прыду к мамцы ні разу ў госці,*
*А прыду к мамцы толькі разок,*
*У гадок на Вялікдзень.*

* * *

*На Вялікдзень ды прынясу*
*мамцы ды тры радасці:*
*Першая радасць – мой муж п'яніца,*
*А другая радасць – дзіця малое,*
*А трэцяя радасць – сама молада.*

## Русалін тыдзень

Святкуецца ў пачатку лета. За мэту мае прыручэнне русалкі, каб яна потым дапамагала, а не шкодзіла людзям. Існуе старадаўняе павер'е: калі ад русалкі будзеш уцякаць уздоўж баразны, то яна цябе абавязкова дагоніць і заказыча. Калі ж здагадаешся і

пабяжыш упапярок, то яна ніякай шкоды табе не прычыніць.

Святкаванне пачынаецца пад вечар. Дзяўчаты паміж сабою выбіраюць русалак. Першай русалкай выбіраецца самая прыгожая дзяўчына з самымі доўгімі валасамі. Вакол яе пачынаюць вадзіць карагоды. Падчас іх ваджэння тая прыгажуня спявае:

*Паслала мяне мачаха ў поле*
*жыта жаці (2 разы).*
*Казала мне мачаха,*
*калі жыта я жаці стану*
*І ўсё не сажну – русалкаю стану.*
*А я жыта не дажала ды русалкаю*
*ў полі стала!*

Пасля карагода русалку штурхаюць у бок лесу і спяваюць:

*Павяду русалку да броду,*
*Сама пайду па ваду.*
*Завяду русалку ў цёмны лес,*
*Няхай русалку воўк з'есць!*

У жыце хаваюцца хлопцы. Яны чапляюцца да русалкі, і яна пачынае ганяцца за імі, выбіраючы сабе жаніха. Калі ёй гэта не ўдаецца, то выбіраюць другую, пакуль не будзе злоўлены хлопец-русальнік. Пасля гэтага русалка і русальнік ідуць назад. Іх сустракаюць ля вёскі з музыкай і песнямі. Потым водзяць карагоды і зноў спяваюць песні:

*На гранай нядзелі*
*Русалкі сядзелі (рана-рана).*
*Павяду русалак*
*З бору да бору (рана-рана),*
*З бору да бору*
*Ў зялёну дуброву (рана-рана),*
*У зялёну дуброву,*
*Каб не ласкаталі (рана-рана),*
*Каб не ласкаталі,*
*Улетку не пужалі (рана-рана),*
*Улетку не пужалі,*
*Узімку не лякалі (рана-рана).*

*Кармук С.Л., 1900 г.н, в. Садовая*

### Масленічны тыдзень

У гэты перыяд елі толькі вырабы з малака: масла, смятану, тварог. А таксама і само малако.

### Вялікдзень

Кажуць, што стараверы на Вялікдзень не неслі свяціць ежу ў касцёл або царкву, а ставілі ўсё на спецыяльнае прыстасаванне, якое знаходзілася на страсе хацін. Гаварылі, што рабілі гэта для таго, каб ежа была бліжэй да Бога.

На Вялікдзень яйцы фарбавалі ў ружовы колер, але калі ў сям'і нядаўна памёр хтонебудзь, то фарбавалі іх у сіні колер.

### Тройца

Перад гэтым днём секлі бярозкі, ставілі іх вакол хаты, а пасля свята бярозкі палілі. Была нават такая прыкмета, што калі бярозкі добра вянуць, то будзе і добра сохнуць сена. Калі ж не вялі дрэўцы актыўна, то неабходна чакаць дрэннага надвор'я.

### Юр'еў дзень

Святкаваўся шостага мая. Увечары ішлі на жытнёвае поле з ядой і гарэлкай. На полі рассцілалі абрус і на ім вячэралі. Падчас гэтага спяваліся велікодныя песні. Ідучы на поле, усім гаварылі, што ідуць збіваць расу.

## ПРЫКМЕТЫ

Хлебаробы ніколі не забываліся, калі трэба было сеяць, калі жаць і звозіць ураджай з палёў.

Як за тыдзень да Благавешчання прыляціць бусел, то ў свірне на засек трэба дошку прыкладваць – поўна пашні будзе, добры ўраджай. А як пасля Благавешчання, то трэба знімаць дошкі, бо ніколі не засыплеш поўных засекаў.

Дабравешчанне без ластавак – халодная вясна.

Калі перад Дабравешчаннем выляціць пчала – будзе мокрая вясна.

Калі пчала не вылятае з вулля на Дабравешчанне, то будзе цёплае ўраджайнае лета, а калі пакажацца раней – то благое, беднае.

Калі на Вадохрышча мароз і сонца, то чакай засушлівага лета.

*Яўфіміч К.І., 1911 г.н., в. Слаўкава*





І як толькі ўсе гэтыя дробязі паспяваў заўважаць чалавек працы? Яму ж не было калі галаву ўзняць лішні раз. Але так толькі здавалася.

Божая кароўка. Пень ці калода, ці будзе заўтра пагода? Калі паляціць – будзе надвор'е, сядзе – не будзе.

Бусел кружыцца – чакай надвор'я.

Рэха па лесе ідзе – на надвор'е.

Калі гусі і куры хаваюць галовы ў пер'е і стаяць на адной назе, то будзе холадна.

Калі карова ідзе з пашы і нясе ў роце траву, то будзе дождж.

Калі мята цвіце позна – будзе шмат мёду.

Калі ноччу быў іней, то днём снег не выпадзе. Калі месяц зімою рожкі падняў угору, то будзе марозна і суха; калі ўніз, то снег ці дождж.

За колькі пчала да Благавешчання вылеціць, то столькі яшчэ пасядзіць пасля Благавешчання (будзе холадна).

Да Юр'я не сей грэчкі і не стрыжы авечкі.

Да Юр'я каб сена было і ў дурня, а на Міколу падавай і вілы пахавай.

Калі на Пакровы вецер дзьме з поўначы, то зіма будзе халодная, а калі з поўдня, то цёплая.

Калі на куццю на небе высыпаны частыя зоркі, то ўвесь год павінен быць з грыбамі.

Калі на Пятровіцу (12 ліпеня) пойдзе дождж, то дажджлівае надвор'е будзе стаяць да Іллі (2 жніўня).

*Манскевіч Ю.Ф., 1902 г.н., в. Асмолава*

Мне даволі часта даводзілася бываць на нясвіжскай землі і пазней, але тыя ранейшыя сустрэчы са спагадлівымі і шчырымі людзьмі назаўсёды засталіся ў маёй памяці і сэрцы.



*АЛЕНА БОГАНЕВА*

## *НАРОДНАЯ ПРОЗА НЯСВІЖСКАГА РАЁНА*

Матэрыялы па народнай прозе Нясвіжскага раёна былі сабраны на працягу некалькіх дзён фальклорна-этнаграфічнай экспедыцыі ў 2006 годзе ў вёсках Вайнілавічы, Малева, Малеўшчына, Андрушы, Сейлавічы, Смалічы, Вялікая Ліпа. Усе гэтыя населеныя пункты геаграфічна знаходзяцца ў розных частках раёна (паўднёва-заходні, заходні, паўночна-ўсходні, паўднёвы кірункі), таму сабраны матэрыял дастаткова прэзентабельна выяўляе асноўныя напрамкі бытавання народнай празаічнай традыцыі ў Нясвіжскім раёне. Разам з тым, улічваючы кароткі тэрмін экспедыцыі, аднакратнасць запісаў, выпадковую і абмежаваную выбарку вёсак у раёне, усе вывады будуць насіць "неканчатковы", адкрыты характар.

Народная проза ў Нясвіжскім раёне прадстаўлена асноўнымі жанрамі і жанравымі разнавіднасцямі: казкамі, легендамі, наратывамі "народнай Біблії", былічкамі, вуснымі бытавымі расказамі (ніжэй спынімся на кожнай з пазначаных разнавіднасцей больш падрабязна). У падборку народнай прозы мы традыцыйна ўключаем таксама падраздзел "вусны народны дыскурс: выказванні светапогляду" – так званыя "экстражанры", паводле ўдалага вызначэння Р.М. Кавалёвай [1].

Запісы народнай прозы ў Нясвіжскім раёне, як і ў іншых рэгіёнах Беларусі, зроблены пераважна ад вясковых мясцовых жанчын сталага ўзросту (ад 1918 г.н. да 1952 г.н.), традыцыйных канфесій (праваслаўных або каталічак), якія маюць пачатковую або сярэднюю адукацыю (некаторыя не маюць яе зусім). Але нельга не адзначыць тут сумную тэндэнцыю пераважання носьбітаў традыцыі народнай прозы сярод прадстаўнікоў самага старэйшага пакалення, 1920 – 1935 гг. нараджэння.

[1] Кавалева Р. М. Экстражанравыя з'явы ў традыцыйным фальклоры // Вулей і пчолы. Вектары сучаснай фалькларыстычнай школы БДУ. /Зб. навуковых артыкулаў. Пад навуковай рэдакцыяй Р. М. Кавалёвай. — Мн. "Права і эканоміка", 2011. — С. 91 – 97.

Разам з тым, бываюць і адметныя выключэнні з правілаў, напрыклад, у Нясвіжскім раёне зроблены запіс абсалютна традыцыйнага сюжэта этыялагічнай легенды “чаму дзіця да году не ходзіць” ад самага юнага “носьбіта” – Валеры Чадовіча, 1999 года нараджэння (на момант запісу яму было 6 гадоў). Валера гасціў у прабабулі Марыі Сцяпанаўны Шуст 1928 г.н. – выдатнай расказчыцы і казачніцы – у вёсцы Вайнілавічы, але прабабка гэту легенду ўжо не помніла.

Сярод казак, запісаных у раёне, ёсць казкі пра жывёл, чарадзейныя, навелістычныя і дакучныя. Вусная казкавая традыцыя ў Нясвіжскім раёне паступова выходзіць з вясковага ўжытку. Казкі расказваюць ужо не столькі бабулі ўнукам (бабулі ўзросту 45 – 60 гадоў казкі ўнукам звычайна чытаюць), колькі бабулі праўнукам, што відавочна па казках, запісаных у раёне. Шырокае кола вясковых інфармантаў казак ужо, як правіла, не помняць або не ведаюць, але на момант запісу на Нясвіжчыне яшчэ былі сапраўдныя карыфеі-казачніцы – Марыя Сцяпанаўна Шуст, 1928 г.н., з в. Вайнілавічы, Еўдакія Вікенцьеўна Хвошч, 1925 г.н., з в. Вялікая Ліпа. Марыя Сцяпанаўна Шуст не толькі выдатна расказвала казкі – з выкарыстаннем усіх прыёмаў казкавай паэтыкі, але ў яе рэпертуары былі таксама былічкі, этыялагічныя легенды, у тым ліку з рэдкімі этыялагічнымі матывамі, як, напрыклад, сюжэт “чаму бусел жаб збірае, у каго які хвост, чаму ў рака вочы ззаду”, або складанымі эпічнымі кантамінацыямі – “пра Юрая, дзеўку і цмока (чаго асіна трасецца, бяроза – добрае дрэва, а ёлка вечназялёная)”.

Запісы “народнай Бібліі” – вусных расказаў па тэмах Святога Пісання і Святога Падання – прадстаўлены этыялагічнымі легендамі Старога Запавета (Адам і Ева, Каін і Авель, Вялікі патоп, Ной і яго сыны, Ілля-прарок), Новага Запавета (уцёкі Святога сямейства ў Егіпет, Распяцце, самагубства Іуды), пераказамі з этыялагічным вывадам (чаго яўрэі свініну не ядуць), эсхаталагічнымі наратывамі – прадказаннямі пра бягучы час як апошні перад канцом свету.

Дастаткова шырока распаўсюджаны на тэрыторыі раёна этыялагічныхя сюжэты легенд – антрапаганічных, астрагенічных, заагенічных, гербагенічных, сацыягенічных. Гэта такія вядомыя на Беларусі сюжэты, як “чаму дзіця да году не ходзіць” (запісаны 2 разнавіднасці з аднолькавым этыялагічным вывадам), “адкуль бусел”, “адкуль зязюля”, “што крычыць зязюл”, “чаму колас ад зямлі не расце” (таксама некалькі разнавіднасцей сюжэта з аднолькавай этыялогіяй), “чаму жанчына занятая”, “як Бог пары робіць”, “чаму чалавек не ведае часу сваёй смерці”. Рэдкія і арыгінальныя сюжэты, расказаныя М.С. Шуст з в. Вайнілавічы, пазначаны вышэй. Запісана таксама духоўна-этычная легенда пра двух ведзьмакоў.

Былічкі ў Нясвіжскім раёне з’яўляюцца актыўным і запатрабаваным жанрам сярод інфармантаў розных пакаленняў і сацыяльных статусаў. Сярод былічак не толькі класічныя, традыцыйныя сюжэты на тэму пакарання за работу ў святы, “баранчыка на дарозе”, здані і прывіды каля могілак, але і сучасныя мадыфікацыі, як, напрыклад, былічка “Пра чорную руку і вогненны шар”.

Вусныя бытавыя апавяданні, запісаныя на тэрыторыі Нясвіжчыны, вызначаюцца тэматычнай разнастайнасцю: народныя з’явы, звязаныя з Бібліяй, міжканфесійнымі ўзаемаадносінамі (каталікі, бапцісты, яўрэі), народнымі вераваннямі і звычаямі, закранаюцца асобныя падзеі з жыцця жыхароў вёскі (“Пажары”), сустракаюцца і апавяданні-фабулаты (“Пра курыцу і гаспадара”). Адзначым, што тэмы, сюжэты і вобразы вусных бытавых апавяданняў не з’яўляюцца традыцыйнымі, яны ў значнай ступені абумоўлены – ідэалагічна і структурна – спецыфікай фальклорнага мыслення, выдатна адлюстроўваюць традыцыйную свядомасць, светапогляд, мараль, этыку.

Нясвіжскі раён поліканфесійны, але асноўныя канфесіі сярод вясковых жыхароў – праваслаўная і каталіцкая. Ступень рэлігійнасці насельніцтва тут, як і ва ўсёй Заходняй Беларусі, дастаткова высокая і свядомая, але што тычыцца ўзаемапрадстаўленняў і ацэнак праваслаўных і каталікоў, узаемных этнаканфесійных стэрэатыпаў, то маюцца некаторыя нюансы ў параўнанні з тэрыторыяй Гродзеншчыны. Калі на Гродзеншчыне праваслаўныя і каталікі ставяцца адзін да аднаго выключна талерантна, падкрэсліваючы, што ў іх “адна вера” і “адзін Бог”, то па меры





аддалення ад дзяржаўных межаў, у глыбіні беларускай тэрыторыі, як у Нясвіжскім раёне, праяўляюцца падкрэсліванні не агульнасці, а разыходжанняў, калі фарміруецца ацэначны вобраз “чужога”, які ў некаторых момантах даходзіць да адкрытых кур’ёзаў: “Вы знаеце, я сама, сама служыла ў пана. Так як польска Радзяство раней, так яно цёплае. А наша ўжо, беларускае, пазней, так яно маразы, больш халодно. Так сам пан казаў: “О, відзіш, як нашэ Божа Народзэння – як цёпло. А як на тых хамов, так завшэ мруз” [2].

У адносінах да яўрэяў у праваслаўных і каталікоў маецца звычайны стэрэатып “крывавага навету” – аб выкарыстанні хрысціянскай крыві пры выпяканні мацы. Але тут ён значна больш мяккі ў параўнанні з міфатворчасцю на гэту тэму на гродзенскай тэрыторыі (там, па расказах вясковых інфармантаў, кроў для мацы атрымлівалася ў выніку жорсткага забойства). “А, панімаеце, ну даўней… Як Вам сказаць… Ну, вот як урачы бяруць – шпрыцом. Ну, і яны. Хто сагласіцца – каплю крыві бралі. От у дзіцяці могуць угаварыць, даць канхветаў і ўзяць кроў дзіцяці. Але яны не ўбівалі людзей? Не, не. Што не – то не. Ну, а крыві-то ім абізацельно. Ім трэба разгавецца людскою кроўю” [3].

Што тычыцца вераванняў пра русалак, то ў Нясвіжскім раёне праяўляецца “пераходнасць” паўднёва-заходняй тэрыторыі Цэнтральнай Беларусі, калі маладыя і прыгожыя “лясныя” і “вадзяныя” русалкі паўночнай зоны Беларусі паступова ператвараюцца тут у страшную істоту, падобную палескай русалцы.

У павер’ях пра ласіцу вобраз гэтай “хлеўнай” жывёлы мае выразныя міфалагічныя рысы, уласцівыя дадзенаму вобразу на Гродзеншчыне: ласіцу нельга забіваць, яна выконвае ролю своеасаблівага “хлеўніка”, ласіца любіць жывёлу, якая супадае з ёй па масці.

---

[2] Зап. у 2006 г. ад Ганны Паўлаўны Рублеўскай, 1918 г. н., 1 кл., мясц., прав., в. Малеўшчына, Нясвіжскі р-н

[3] Зап. у 2006 г. ад Ганны Паўлаўны Рублеўскай, 1918 г. н., 1 кл., мясц., прав., в. Малеўшчына, Нясвіжскі р-н

# НАРОДНАЯ БІБЛІЯ

## СТАРЫ ЗАПАВЕТ

### Адам і Ева

У нас так і гаварылі, што гэта першабытныя людзі – Адам і Ева. Дзе яны там жылі? Што-та было такое, у відзе зямлянак, ці як яно называлася… А як называлася, дык я ўжо і забылася. Яны саграшылі перад Богам, што-та з’елі: ці яблыка, ці што там… Уродзе яблыка з’елі.

*Запісана ў в. Андрушы*
*ад Навоша Зінаіды Мікалаеўны, 1935 г.н.,*
*праваслаўнай, 7 кл. адукацыі (2006 г.)*

Перша, мусіць, яблык Ева сарвала, патом Адаму дала... Неяк нешта саграшылі. Адам укусіў ды ўдавіўся і зараз ў мужчын тырчыць “костачка” ў горле. А Ева праглынула.

*Запісана ў в. Вайнілавічы*
*ад Шуст Марыі Сцяпанаўны, 1928 г.н.,*
*праваслаўнай, 2 кл. адукацыі (2006 г.)*

Ну, і зьмяя яе абманула. А яна ўжо Адаму сказала, што гэдак і гэдак – так казалі. Вот яны за гэтым саграшылі, і вот цяперіча за гэтым і мы грэшныя. А мы ж ад Адама і Евы пашлі. Вот увесь народ стаў за гэтым грэшны… Цяпер няма на сьвеце, на гэтай зямлі няма сьвятых – усе грэшнікі, хто на зямлі ходзіць. То і свяшчэннік гаворыць. Як мы ні спавядаемся, ўсё раўно мы грахі бяром на сябе. Вот сёння – славамі, а ўсё раўно ж мы грэшым.

*Запісана ў в. Сейлавічы*
*ад Хвіцько Вольгі Паўлаўны, 1932 г.н.,*
*праваслаўнай, 4 кл. адукацыі,*
*Таратуты Сафіі Мікалаеўны, 1934 г.н.,*
*\праваслаўнай, 4 кл. адукацыі,*
*Кісун Алены Міронаўны, 1931 г.н,*
*2 кл. адукацыі (2006 г.)*

### Вялікі патоп

Бацька расказваў і чытаў, як свет сатвырыўся, і ўсё пра Адама і Еву… Як патоп быў усяобшчы, і як Гасподзь Бог прадсказаў здзелаць каўчэг. І там астаўся, пачакай, Ной, і вот як ён астаўся… І як гэта сатварыўся свет,

пасля патопу. Усё затапілі. Бог расчараваўся на людзей. Гэто да. Яны очэнь былі плахія.

*Запісана ў в. Вялікая Ліпа*
*ад Верамейчык Соф'і Нікадзімаўны, 1925 г.н.,*
*праваслаўнай, 7 кл. адукацыі (2006 г.)*

У нас расказвалі пра Ноеў патоп… Як ён карабель той рабіў, як пагіблі, а потым усё патапілася, а ён адзін застаўся і сем патомств засталося… Казалі, што ён кожнай твары па пары браў. Ну, гэтак жа ж і было, а каго ён семярых браў? Вот гэта я вам і не скажу, як там напісана…

*Запісана ў в. Сейлавічы*
*ад Хвіцько Вольгі Паўлаўны, 1932 г.н.,*
*праваслаўнай, 4 кл. адукацыі,*
*Тараты Сафіі Мікалаеўны, 1934 г.н.,*
*праваслаўнай, 4 кл. адукацыі,*
*Кісун Алены Міронаўны, 1931 г.н.,*
*2 кл. адукацыі (2006 г.)*

### Ілля-прарок

Гаварылі даўней, што калі гром грыміць, то гэта Ілля, вялікі прарок, на калясьніцы ездзіць.

*Запісана ў в. Сейлавічы*
*ад Хвіцько Вольгі Паўлаўны, 1932 г.н.,*
*праваслаўнай, 4 кл. адукацыі,*
*Тараты Сафіі Мікалаеўны, 1934 г.н.,*
*праваслаўнай, 4 кл. адукацыі,*
*Кісун Алены Міронаўны, 1931 г.н,. 2 кл. адукацыі*
*(2006 г.)*

***

А ў нас маланку пяруном называлі. Казалі, што не маланкаю забіла, а перуном. Ці громам у нас абычна гаворацы. Гром гэта, што блішча. А чаму вот як маланка так паліць і адразу ж б'е? Ці гэта яно па звуку?

Гэта гаварылі, што на калясніцы ездзіць, па-моему, Ілля.

*Запісана ў в. Андрушы*
*ад Навоша Зінаіды Мікалаеўны, 1935 г. н.,*
*праваслаўнай, 7 кл. адукацыі (2006 г.)*

## НОВЫ ЗАПАВЕТ

### Уцёкі ў Егіпет

– Раскажыце, чаму нельга павука забіваць?

Ну, як было… Мацер Божая ўцякала з ім, з Ісусам Хрыстом, бо за імі гналіся і там не было дзе схавацца, а была нейкая яма… І знаеце, што? Павук ўзяў заплёў павуціннем. Яны, як прыйшлі, паглядзелі і сказалі, што тут не можа быць іх, бо заплецена павуціннe. Яно пляцецца там, дзе доўгае врэмя ніхто не ходзіць, не трогае. Тут не можа быць, бо павуціннe будзе парванае.

*Запісана ў в. Вялікая Ліпа*
*ад Верамейчык Сафіі Нікадзімаўны, 1925 г.н.,*
*праваслаўнай, 7 кл. адукацыі (2006 г.)*

### Евангельская прытча

Жылі два браты, адзін Лазар, другі багаты. Ну ды ўжо ж прасіў хлеба бедны ў багатаго. Дык прыйшоў ды просіць хлеба. А той кажа:

– Не дам табе хлеба, бо ты не есьць мой брат, а ты псоў – гэта сабачы, ты псоў.

Ну, ён ужэ засмуціўся і прыйшоў дадому і кажа: "Ну, што ж, не дае мне ўжо таго, што я хачу". Ну, жылі-жылі – паўміралі. Багаты памёр і бедны памёр. Багатаго прышлі ўзялі чэрці. Нясьлі вісока, паднялі вісока, і кінулі ў пекла глыбока-глыбока. А беднаго ўжо ўзялі анёлкі. Гэтаго чэрці ўзялі, а гэтаго анёлкі. Нясьлі яго душачку нізенька, палажылі ў рай блізенька. А гэтаго нясьлі вісока і кінулі ў пекла глыбока.

*Запісана ў в. Вайнілавічы*
*ад Шуст Марыі Сцяпанаўны, 1928 г.н.,*
*праваслаўнай, 2 кл. адукацыі (2006 г.)*

### Чаму яўрэі свініну не ядуць

Чаму не ядуць яўрэі свініну… Таму што Ісус Хрыстос, як свінні былі збунтаваліся, вобшчэм, быў такі чалавек бальны, а ён пасціў свінней, і Ісус выгнаў з яго праказу. І гэта праказа пайшла ўся на свінней. І вот свінні ляцелі, яны прыйшлі к берагу, і з берага яны ўсе ў мора ўтапіліся. І во затым можа не ядуць гэтых свінней яўрэі, таму што яны ўсе заражаны праказай.

*Запісана ў в. Смалічы*
*ад Міронычык Ірыны Пятроўны, 1936 г.н.,*
*праваслаўнай, 7 кл. адукацыі,*
*Шчурскай Ірыны Мікалаеўны, 1935 г.н.,*
*праваслаўнай, 10 кл. адукацыі (2006 г.)*

### Распяцце

А цыган – можна красьці яму. Як Ісуса Хрыста расьпіналі, то прынясьлі чатыры цьвякі. Рукі прыбівалі і ногі. А цыган падкраўся і ўкраў адзін цьвік. І тады яны рашылі… Што ж рабіць? Тры анно цьвякі… І вот так во ногі яму залажылі Ісусу Хрысту і адным цьвяком прыбілі. Тады яму Бог даў па сьвеце хадзіць, нічога не рабіць, а красьці і з гэтага жыць. Што ён трохі ашукаў ужо тых людзей, што Ісуса Хрыста расьпіналі.

*Запісана ў в. Вайнілавічы*
*ад Шуст Марыі Сцяпанаўны, 1928 г.н.,*
*праваслаўнай, 2 кл. адукацыі (2006 г.)*

### Эсхаталагічныя прадказанні

Тато чытаў па Бібліі, што прыйдзе такое врэмя, што ўся страна будзе пераплецена аднымі павуцінамі жалезнымі. Вот это ўжэ збываецца, это ўжэ было збылось, ага. Будуць у небе лятаць жалезныя пціцы – это так пісалось.

Там много чаго гаворыць пра святыні, пра то, пра то, а гэтакія глаўныя вузлы. Ага, і тагды яшчэ пісалось, пачакайце, яшчэ ж нешто, што будуць гаварыць людзі. Вот як па тэлевізары і перш радзіва. Ну, а гэта ж усё пасля вайны пайшло, ну, там так прадсказвало, што як будзеш глядзець на сцену – будуць хадзіць гаварашчыя людзі.

– Ну, як жа ж тыя гаварашчыя, тато, людзі будуць хадзіць і гаварыць?

– Ну, кіно прывязуць, нацянуць первонально, і гэто ўсё было. І было яшчэ самое глаўное, што тут сбываецца. І прыйдзе такое врэмя, што настане так, што чалавек будзе ісьці, угледзіць чалавечы след і яму будзе рай.

– А ён пра гэта ўсё чытаў па той Бібліі, якая і зараз ёсць?

– Нет, эта там Стары быў Завет. Гэта ўсё былі пракорі старыя, много ён чаго чытаў сабе, много верыў, то гэто быў Стары Завет, Біблія Старого Завета. А яны веравалі, што кіно – гэта ж чэрці скачуць, ані же там, старыя, прeдпалагалі, што так. А гэта Новы Завет у нас.

*Запісана ў в. Вялікая Ліпа*
*ад Хвошч Еўдакіі Вікенцьеўны, 1925 г.н.,*
*праваслаўнай, 7 кл. адукацыі (2006 г.)*

Ну, патоп быў, яшчэ ж і засуха, ці што. Яшчэ не адно патоп быў некалі. Ну, і са ўрэменем яшчэ будзе ўсякая страшная такая… Ну, гаварыў бацька, што будзем гарэць і што будуць лятаць птушкі. У Евангеллі чыталі, што птушкі будуць лятаць і кляваць. Некалі ж самалётаў гэтых жа не было. Дык гэта ж дзіўна было. Расказваюць, што будуць птушкі лятаць і людзей кляваць, што яны не могуць адагнацца. Шчэ будзе страдаць народ. Шчэ не пакаецца. Шчэ будзе моцна страдаць. Што гэта яшчэ страшна будзе. Шчэ як пакаюцца людзі, то шчэ Бог адложыць срок. А еслі не пакаюцца, то накажа полным наказаннем, каяцца трэба, што саграшылі і Бога не прызнаюць, і забіваюць, і абкрадаюць, і лгуць. Усё некалі нас вучылі, нельзя гэтага рабіць, усё грэх. Людзі адступіліся і цяпер яны не каюцца. Яны не прызнаюць Бога.

Цяпер ніхто нічога не прызнае. А от некалі, калісьць, ой, скольк гадоў, шчэ я была малая, казалі, што пойдзе сын на бацьку, бацька на сына. Усё гэта точна цяпер робіцца. Усё, усё! Што будуць забіваць. І шчэ мы дажывёмся, мо мы не дажывёмся, канешна, можа нашыя дзеці, можа ўнукі, што будзе завідаваць жывы мёртваму. Што той, хто памёр, будзе шчаслівейшы, чым той, хто застанецца на гэтай зямлі. Гэта я добра ведаю, шчэ мой тата расказваў.

Канешна, даўней больш верылі! Некалі ў нас у цэркві людзей больш было! На ўсяночну пойдзем, так у цэркаў не ўбіцца. А цяпер? Цяпер і маладыя, і старыя могуць не іці ніяк. Яны шчытаюць ненужным ужо ў цэркаў іці. Канешна, адступіліся ад Бога. Некалі ж хацелі ў цэркаў іці, а нас не пускалі, забаранялі, у школах гаварылі, што нельзя…

*Запісана ў в. Андрушы*
*ад Навоша Зінаіды Мікалаеўны, 1935 г. н.,*
*праваслаўнай, 7 кл. адукацыі (2006 г.)*

## ЛЕГЕНДЫ

### Як Бог па зямлі хадзіў

Гаварылі, што некалі Бог па зямлі хадзіў. О, гэта ж многа ўжо прайшло! Як начынаўся век…Ну, гэта праўда, не казкі. Ну, як жа, Бог хадзіў, з Адамам і з Еваю гаварыў… Бог хадзіў, а баба думала, што жабрак і не падарыла, і вады не дала, дзіцятко зайшло і дзядок зайшоў… Прыбірала, і ў хаце ў яе быў парадак, а патом якраз прыбрала, села, дык ва

сне ўгледзіла, што гэта ж Бог у яе быў, тады ўжо давай прашчэнне прасіць. "Прашчу!", – сказаў Бог.

Я вот чула, што прыйдзе Бог у багату хату як жабрачок. Дык яму дажа вот сесці не прэдложуць. А прыйдзе к беднячку, дык ён дасць сваю рубашку, дый яго (Бога) перадзене, што ў яго (Бога) такая падзёртая адзёжа. І пакорміць, кажа: "Чым багаты, тым і рад". То былі такія размовы.

*Запісана ў в. Сейлавічы*
*ад Хвіцько Вольгі Паўлаўны, 1932 г.н., праваслаўнай, 4 кл. адукацыі,*
*Тараты Сафіі Мікалаеўны, 1934 г.н., праваслаўнай, 4 кл. адукацыі,*
*Кісун Алены Міронаўны, 1931 г.н,. 2 кл. адукацыі (2006 г.)*

Як Бог ішоў, то прасіў жэншчыну:

– Давай, я табе сьвінню перакіну чэраз рэчку, каб яна пашла сразу!

Яна дала, ён перакінуў, і яна сразу пашла. Тады карову перакінуў – яна сразу пашла. А тады дзіця папрасіў. А яна не дала. І яно тады не сразу ходзіць.

*Запісана ў в. Вайнілавічы*
*ад Чадовіча Валерыя, 1999 г.н. (2006 г.)*

## Пра плямы на месяцы

Ага, ага, плямы на месяцы, мне мама гэдак гаварыла. Жыў брат і з братам. І нешта ў іх там не палучалася, Бог іх ведае. І вот са злосьці брат брата скалоў, вілкамі. Скалоў і падняў так от. І от на месяц узнясло іх. І прыглядзьцеся, калі поўны месяц, відно, што брат брата дзяржыць на вілках, і ў яго так і ногі растапыраны, каб усе людзі бачылі гэдакую бяду.

*Запісана ў в. Вайнілавічы*
*ад Шуст Марыі Сцяпанаўны, 1928 г.н., праваслаўнай, 2 кл. адукацыі (2006 г.)*

## Адкуль бусел

Даўней чалавек нёс цэлы мяшок жабаў, даў другому падзіржаць. Ну, казалі, чалавек чалавеку, можа ён быў Бог, але ж мы не ўгледзім.

– Падзяржы, пака я не з'яўлюся, не глядзі што тут!

Дзе ж там! Не выдзержаў чалавек, захацеў развязаць мяшок. Развязаў – жабы паўцякалі. Вот і яўляецца гэты чалавек, каторы даваў гэты мех, і кажа:

– А ну, дзе ты дзеў, што было ў мяху? Я табе казаў не глядзець!

А ён кажа:

– А мне захацелася паглядзець. Тут былі жабы, ды паўцякалі…

– Вот цяпер ты пераўтварайся ў бусла і лаві тых жаб.

Вот гэты чалавек мусіў пераўтварыцца ў бусла і цяпер па сённяшні дзень буслом і ловіць жаб.

*Запісана ў в. Сейлавічы*
*ад Кісун Алены Міронаўны, 1931 г.н, 2 кл. адукацыі (2006 г.)*

## Адкуль зязюля

Зязюля вот як. Маліліся ў цэркві. І дзеўка вельмі любіла хлопца. Гэта мне мама гэдак расказывала. Дзеўка любіла вельмі хлопца. І ён зваўся Якуб, той хлопец. А яна прыйшла ў цэркву і стаіць, і ўсё аглядаецца і туда, і сюда, каб угледзець кавалера таго. Ніяк не ўбачыць. Аглядалася, аглядалася, а потым аглянулася да ўгледзела.

– Якуб! – яна гэдак сказала.

І вот ёй Бог даў выляцець птушкаю і век шукаць таго свайго... А ёй жа пары нямашака, зязюлі. Зязюлі пары нямашака. І яна па сьвеце лятае і ўсё кліча:

– Якуб, Якуб, – кліча ўсё.

От гэто мне мама расказывала.

– Так а за што яе Бог так пакараў?

Пакараў, што яна ў цэркві не стаяла як трэба, а ўсё аглядалася, аглядалася і ўжо ўгледзела свайго кавалера Якуба. А гэтак жа ж няможна! Вот яе Бог і пакараў гэдак за гэта. І вылецела яна птушкаю, і без пары жыве. І лятае ўсё і "ку-ку". А мы: "То яна кліча: Якуб, Якуб".

*Запісана ў в. Вайнілавічы*
*ад Шуст Марыі Сцяпанаўны, 1928 г.н., праваслаўнай, 2 кл. адукацыі (2006 г.)*

## Што крычыць зязюля

Зязюля… Усё казалі, што яна згубіла Якуба, як яна яго пацярала. Вродзе бы вот яны пажаніліся, такія яны былі набожныя. Гэта я чула ад старых дзядоў байку. І вот той Якуб памёр, і яна ўсё врэмя нікуда ні з кім не хадзіла, усё клікала яго. Хадзіла і клікала. І вот дажа голуб дзікі падключыўся, памагае ёй, ён часта спявае, дык ужо кажуць: "Якуб-Якуб". А зязюлька ўсё вот кукуе: "Якуб, Якуб!" Як па-навучнаму – так ужо "ку-ку". Тая зязюля кліча Якуба.

*Запісана ў в. Сейлавічы*
*ад Кісун Алены Міронаўны, 1931 г.н, 2 кл. адукацыі (2006 г.)*

## Чаму колас ад зямлі не расце

Мы жывём на катовым і на сабачым хлебе. Быў колас, як вяліко жыто вот так, і вот Бог разгневаўся і сказаў: "Еслі вы такія, то і я вас не памілую!" І як узяўся сьцягаць каласок той, і вот застаецца як цяпер каласок, і тут жа і каты, і сабакі кінуліся, сталі прасіці і цяўкаць, і лашчыцца. І вот гэты каласок нам застаўся.

*Запісана ў в. Вялікая Ліпа*
*ад Верамейчык Соф'і Нікадзімаўны, 1925 г.н., праваслаўнай, 7 кл. адукацыі (2006 г.)*

Ды некалі як расло зярно, ну, дык ужо ж Бог загневаваўся нешта на людзей. І вот быў колас да самай зямлі, гэтакі быў каласок, а цяпер ён у самым версе. Ды Бог як зняў той калаласок ды ўжо сшоргаў аж да нізу.

*Запісана ў в. Сейлавічы*
*ад Хвіцько Вольгі Паўлаўны, 1932 г.н., праваслаўнай, 4 кл. адукацыі,*
*Тараты Сафіі Мікалаеўны, 1934 г.н., праваслаўнай, 4 кл. адукацыі,*
*Кісун Алены Міронаўны, 1931 г.н,. 2 кл. адукацыі (2006 г.)*

От Бог хадзіў па зямлі. От, можа ж і грашно гаварыць, можа і брыдка троху, але я гэдак чула. Мне мама расказувала. Хадзіў Бог па сяле, зрабіўся ўжо жабраком. Зайшоў у адну хату – дараць яго людзі. Падарылі, хто што меў. Зайшоў у другую хату – зноў падарылі. Хадзіў, хадзіў, гэдак ужо колькі хат прайшоў. Заходзіць яшчэ ў адну хату. Заходзіць, а там дзяцей чарада. Просіць:

– Падары.

А тая дае блін. Падцерла дзіцяці попу тым блінам і яго падарыла. Ён выйшаў і падумаў: што ж рабіць? Гэдак ужо здзек зрабілі! Гэта ж не дай Божа! Падцерла дзіцяці попу і дала яму той блін. А ён і ўзяў.

Ішоў ён, ішоў і падумаў: пайду ў поле і людзей вазьму трохі голадам, настрашу. Зраблю голад людзям. Выйшаў у поле – збожжа расьце. Жыта ўсё гэта расьце хораша. Выйшаў, стаў ён у поле і думае: страблю колас, сашмаргну. І ўзяў так от ад зямлі і шмаргануў. Астанавіўся, слухае: ці будзе дзе хто гаварыць. Ніхто нічога не гаворыць. Далей шмаргануў. Стаў і зноў слухае: ці будзе хто гаварыць. Ніхто нічога не гаворыць. Ён трэці раз як шмаргануў – замяўкалі каты і забрахалі сабакі. Астаўся от такі каласок, а дзе каленца – ета ён прыстаўляў.

Вазьмеце от жыта, вазьмеце што любое, от каленца: тут астанавіўся, тут астанавіўся, тут астанавіўся. І ніхто не атзываўся. От, кажа, вазьму і сашмаргну… І замяўкалі каты, і забрахалі сабакі. От мы на кашачай і сабачай долі жывём! Гэто мне мама неколі расказувала, от я помню.

## Пра Юрая, дзеўку і цмока

*(чаго асіна трасецца, бяроза добрая дрэва, а ёлка вечназялёная)*

Шчэ мама расказывала, як ехаў Юрай на кані. Ён жа ж о з пікаю з такою. А дзеўчынка… Хацеў яе зьесьці цмок. Вуж гэтакі. Ішла дзеўчына па дарозе, а ляжаў Цмок той. Яна найшла на яго, і ён яе хацеў зьесьці. А тут наехаў Юрай. Як наехаў Юрай, так і стаў яе бараніць. Яна стаіць тая дзеўчынка ўжо і плачэць. А Юрай вужа гэтага пікаю з каня забіў, а тая дзеўчынка ўжэ ўцякала. Уцякала і прыбегла пад асіну і просіць:

– Схавай мяне!

А асіна сказала:

– Не магу я цябе схаваць, мае лісты рэдкія.

Дак яна пабегла пад бярозу. А на асіну сказала:

– Каб ты траслася, сколькі ты стаяць будзеш!

Яна прыбегла пад бярозу, а бяроза сказала:

– Я цябе не схаваю. – Але падсаветавала: "Бяжы пад ёлку!"

Яна схавалася пад ёлку, а ёлка апусьцілася, і ўжо ўцалелa яна.

– Каб ты была зялёная і зялёная зімой і летам!

І ёлка стала зялёная і зялёная заўсюды. А асіна, каб траслася, сколькі жыла. І от лісьця

ў асіны і трасуцца, казалі гэтак. А на бярозу сказала:

– Каб ты красавалася і была заўсёды харошая.

*Запісана ў в. Вайнілавічы*
*ад Шуст Марыі Сцяпанаўны, 1928 г.н.,*
*праваслаўнай, 2 кл. адукацыі (2006 г.)*

### Чаму жанчына занятая

Ну, во ішоў старычок і сказаў жэншчыне:

– Памагай Бог!

А яна дажа і не аглянулася, як жала дык і жала, ну адказала, ды і жне. А сказаў мужчыну, той адказаў яму, сеў, пасядзеў, пакурыў з ім там ці што, прыгласіў сесці. А жэншчына і жнёт і ўсё, вот за гэта. За гэта і работай, раз ты ня ўспела аглянуцца, глянуць.

*Запісана ў в. Сейлавічы*
*ад Хвіцько Вольгі Паўлаўны, 1932 г.н.,*
*праваслаўнай, 4 кл. адукацыі (2006 г.)*

Ішоў Бог, а бабы робяць. Нешта ж палолі ці што рабілі. Бог пытаецца ў іх, куда дарога там прайсьці. А адна:

– Тудэю, он тудэю, он тудэю, – паказала нагой і не разагнулася.

Ну што, і пайшоў. Ідзе – мужчыны там рабілі. Што яны рабілі? Хто іх ведаець, ці яны касілі, ці што рабілі. Ён у мужчын дарогі пытаецца. Мужчыны сталі ці селі і яго прыглашаюць:

– Сядзь, пасядзі з намі! От тудэю, от тудэю… – паказалі яму.

І вот мужчына мае час, і сядзя, пасядзіць, а баба нешта ўсё робіць-робіць-робіць.

*Запісана ў в. Вайнілавічы*
*ад Шуст Марыі Сцяпанаўны, 1928 г.н.,*
*праваслаўнай, 2 кл. адукацыі (2006 г.)*

### Чаму чалавек не ведае часу сваёй смерці

Вот некалі казалі, што Бог па зямлі ходзіць. Ідзець дзядок, а там другі мужчына, ён тожа дзядок, гародзіць плот саломаю. Ён кажа:

– Чаму ж ты саломкаю плот гародзіш?

Дык ён кажа:

– Я ўсё роўна заўтра памру, а бабцы хваціць, каб курка градкі ні паграбла.

Вот цяпер зрабілася гэдак, што ніхто не знае, калі памрэ. А некалі знаслі людзі, калі памруць, гарадзіў ужо плот, бо я заўтра памру. Ну дык і было гэдак.

– Маей мамы тата жыў 101 год. Ды й і казаў, што… "Я, – кажа, – дзеткі, сёння памру. Налійце мне вады памыцца". І ноччу ён памёр.

*Запісана ў в. Сейлавічы*
*ад Хвіцько Вольгі Паўлаўны, 1932 г.н.,*
*праваслаўнай, 4 кл. адукацыі,*
*Таратуты Сафіі Мікалаеўны, 1934 г.н.,*
*праваслаўнай, 4 кл. адукацыі,*
*Кісун Алены Міронаўны, 1931 г.н., 2 кл. адукацыі (2006 г.)*

### Як Бог пары робіць

Вот як некалі хадзіў Бог па свеце, казалі. Вот ідзе Бог. Жне такая рухавая-рухавая маладзічка, і ён папытаўся… Не, не, сперва ідзе, аж ляжыць чалавек. Ён кажа:

– Пакажыце, куды дарога туды і туды?

А ён падняў ногу і паказаў яму, і не ўстаў дажа з места. Бог ідзе далей. А тая жанчынка жне і ўвіхаецца тое збожжа ўжо. А ён пытаецца, а тая выскачыла і паказала яму, куды ісці. А ён кажа:

– Вот гэто будзе пара, бо адно рухаво… Дак як будуць абодва рухавыя, дык будуць вельмі багатыя.

– Нет, не плохо, калі багатыя, але ж ён гэтак рабіў, каб было роўна, каб былі багаты і небагаты. Каб былі ўдваіх багаты, дык будуць вельмі ўжо багато жыць. А так будзе і доброго, і кепскага. Ну, я гэток чула такую прыбаутку. Правільно, Бог жа гэток зрабіў, каб было адно рухаво, другое нерухаво.

*Запісана ў в. Вайнілавічы*
*ад Шуст Марыі Сцяпанаўны, 1928 г.н.,*
*праваслаўнай, 2 кл. адукацыі (2006 г.)*

## ПРЫМХЛІЦЫ (БЫЛІЧКІ)

### Пакаранне за работу ў свята

Пашла ў поле жэншчына жаць. Ды сьвятам. Празьнік быў, но не знаю точно, які празьнік. Жне яна, ідзе Бог ды кажа:

– Што ж ты прышла жаць гэтакім празьнікам!

– Бо часу не мела. Часу ў будзённы дзень не мела.





І жне, жне, жне. Ён:

– Стой жа ж, раскажы! І я табе дам задачу, ці ты яе выпалніш?

Вярнулася, стала глядзець на яго. Ён кажа:

– Я цябе за гэта накажу, што ты жнеш у празьнік.

А яна кажа:

– Чым накажаш?

– Выбірай: ці сем гадоў пахварэць, ці год двое дзяцей пакарміць?

Яна стала і думае.

– Двое дзяцей пакарміць. Год пакармлю двое дзяцей.

Аж хоп – два вужы за шыю яе заматаліся і за цыцкі. От год дзеці будзеш карміць. Гэта я чула. Гэта нас мама страшыла.

*Запісана ў в. Вайнілавічы*
*ад Шуст Марыі Сцяпанаўны, 1928 г.н.,*
*праваслаўнай, 2 кл. адукацыі (2006 г.)*

### Пра страх

Ну, мама расказвала наша і дзядушка яшчэ расказваў. Нейкі ў нас быў тут бровар. Водку гналі ў нас тут і вазілі прадаваць тую водку. І вот ён едзе, бочкі вязе. І вот яны астанавіліся на дарозе аддыхаць, а залазілі пад такую снасць, там было накрыж. І вот падыходзіць чалавек і крычыць на яго:

– Вылазь! Вылазь! А то выпушчу водку!

Ён кажа:

– Выпускай!

А як дванаццаць часоў – усё прапала. Выходжу – і водка цэла. Ну, нейкія страхі былі.

### Страхі, здані

Гэта тато мне расказваў, што мама хворая была, і ён часта ездзіў канём за дванаццаць кілометраў у бальніцу. Паедзе пад вечар, як тут управіцца з работай, і едзе і ўжо позна. Там пабыў, узяў нейкіх лякарстваў і едзе дадому. І выходзіць пад шляпаю чалавек: ідзе, ідзе… А я кажу:

– А што вы там ідзяце? Сядзьце, пад'едзьце на воз, калі хочаце.

Маўчыць, маўчыць… А гэта было перад дванаццаццю скоро. Еду, еду далей, вёў, вёў – ха-ха! І прапаў на вачах.

І многа такіх, у балота можа завесці чалавека, гэта тожа я чула. Будзе знакомы голас гукаць: "Аюй, аёй, пагібаю, прападаю!" І як ён будзе ісці суха, як вот ідзём, а ён крычыць – і што раз далей і далей. Як пойдзе туды, то гэтак абыдзе ўсе, нідзе не ўваліцца ні ў адну канаўку. А як зойдзе і "ха-ха" – і не ведае, куда і выйсці дадому. Казалі, што водзіць нячысты дух. Гэта людзям здавалася, і былі кагда-то прывядзенія, было-было…

*Запісана ў в. Вялікая Ліпа*
*ад Верамейчык Соф'і Нікадзімаўны, 1925 г.н.,*
*праваслаўнай, 7 кл. адукацыі (2006 г.)*

### Пра заклятыя скарбы

Ну, кажуць, стаяў дом. І выйшлі з яго жыцелі. Как только пад дванаццаць: "Рыну, рыну", – голасам людскім. Ну, і ўсе са страху паўцякалі.

Ідзе салдат, дваццаць пяць служылі, боты за плячыма, ідзе, ідзе. Просіцца пераначаваць. Дык яму кажуць:

– Тут-то ёсць дом – і харошы, і дагляды, вы б там пераначавалі. Але Вы там не пераначуеце.

– Як не пераначую?!

– Паглядзіце, што вы не пераначуеце, уцячэця адтуль.

Прыйшоў салдат, там стаіць краваць, бо людзі кінулі ўсё і ўйшлі. І ён лёг і заснуў. Ну вот пад дванаццаць часоў і крычыць: "Рыну, рыну!". А ён ужо прачнуўся, сеў і слухае. І ён ужо па матушчы: "Да рынь, такую тваю маць!" – і, кажа, як рынуліся грошы!

*Запісана ў в. Вялікая Ліпа*
*ад Верамейчык Соф'і Нікадзімаўны, 1925 г.н.,*
*праваслаўнай, 7 кл. адукацыі (2006 г.)*

### Як чараўнікі паміраюць

Вот, гэта да. Вот у нас некалі чараўнік не дасць рады памерці. Дык выразалі столь. Інача ён не паміраў. Рабілі дырку. Ён ніяк не мог памерці.

Ніхто гэтага не дакажа, на што гэта рабілі. У нас гэта было. Гэта Валі Маляўкавай баба памірала, а яны жылі недалёка ад нас, ад маіх бацькоў. І казалі, што яна была вядзьмаркай. Ну што ж там – не знаем, але гаварылі так у народзе. І прыйшлося, яна мо тры дні памірала. І не памерла. Дык казалі, што зрывалі столь, сталяніцы зрывалі.

*Запісана ў в. Андрушы*
*ад Цар Надзеі Сяргееўны, 1952 г.н., праваслаўнай,*
*Боганевай А.М., Варфаламеевай Т.Б. (2006 г.)*

## ВУСНЫЯ НАРОДНЫЯ АПАВЯДАННІ

### Пра веру, царкву

Еслі ты мне не вывучыш і гэтую, і гэтую "Отчэ наш", дзесяць запаведзь, то кажа: "То нікуда ты не пойдзеш!". А закон быў напісан па-рускі… Бацюшка прыходзіў у школу. Як закон. На тыдзень два разы прыходзіў. І ў цэркаў хадзілі. І нават у нас цэркаўка тут была не такая бальшая. Да гэтого бальшая была. І нават мой тата старастаю быў тады. Яшчэ ў той цэркві. Но потым палучыласё такое, што на Вялікдзень свечку не патушылі, ці што, і тая цэркаў згарэла. А патом паставілі другую. "Да часу, – гаварылі, – пака, а потым паставім лепшую". Ну, і яна стаяла ў нас, пака к нам Саветы не прыйшлі. А патом рашылі іх ліквідзіраваць. Ну, прыйшлі к нам Саветы, і патом стала тутака і вайна, і калхоз, і ўсё. І быў наш прыдсядацель Цюрын. І ён узяў нешта там рабочых, а яны не ішлі, тыя рабочыя. Так ён падумаў, як раскідае цэркаў – будзе больша сіла калхоз на ногі вастанавіць. Дык от. Яе і раскідалі. Свае…Начальству можа было і лепш, калі царквы не стала, а нам-то ўжо пахужэ. Так прыходзіцца па сёняшні дзень у цэркаў у Нясвіж хадзіць. Хадзілі ўвесь час у царкву, спявалі і да сённяшняга дня. Цяпер ужо і бацюшкаў больш. Ужо разрашылі і маліцца. А то мы былі за бацюшку, і за дзяка, і за ўсіх. Бо людзі старэнькія ўсё раўно хацелі, каб іх хавалі і з почасцямі даўнейшымі. Як гэта было некалі ішчо.

Я раней вянчалася. І сястра мая вянчалася. Сястра ішла замуж, то мне было дванаццаць год. Яшчэ я ў польскім барэце была. Там у меня фотакартачка ёсць. А ўжо потым тутака нет. От цяпер носяць барэты. Мы называем, як гэты быў саламяны капялюш, мы казалі, прамо барэт як шэрсцяненькі гэдыкі. Былі і белыя, і сінія. І арол польскі тут. Гэта ў школу хадзілі. Вянчацца мы вянчаліся. Яшчэ цэркаў у нас стаяла, і яшчэ быў бацюшка ў нас. Гэта бацюшка яшчэ і за Польшчу быў. Смоліч фамілія яго была. І я вянчалася.

Паміж сабою гаварылі, хто на святое руку падняў, таму добра жыць не будзе. Я скажу адкрыто. А хто тады будзе нешто недзе гаварыць?! Самі сабой. Можа, хто і гаварыў што. Ну, самі сабе казалі, што Бог накажа. Ну, нешта ж там будзе ў канцы канцоў. Не жарты, разрушыць цэркаў! Ну, грэх! Думалі, што грэх жа! Здаецца, як гэта, разрушыць цэркаў?! Ну, а рабілася. Бацюшке не можна была хаваць ездзіць. Пеўчых паклічуць. І хочуць, каб па старыках, і бацьке ўміраюць, просяць: "Радзі Бога, хай хоць малітву якую па мне там згаварыць!"

Хацелі людзі перад смерцю прычасціцца, хацелася старым.

*Запісана ў в. Малева ад Вінніцкай Наталлі Пятроўны, 1921 г.н., праваслаўнай, 6 кл. адукацыі, Шах Зінаіды Антонаўны, 1928 г.н., праваслаўнай, 5 кл. адукацыі (2006 г.)*

### Пра крыжы і ахвяры

Я яшчэ была малаватая, а нашы мамы, бабы, канешне, сабіраліся, пралі, сукалі, снавалі, ткалі і рабілі палатно. І тады выбелівалі, і штоб гэта на крыж яго павесіць у цэркві. У царкву насілі гэта палатно, у цэркву вешалі, тут, дзе была Божая Маці і царскія дзверы, і Ісус Хрыстос. Вот над царскімі дзвярыма, вот так, дзе етыя іконы вешалі, вот што стаялі ў нас у цэркві. Там было многа, многа. Тады прама за адну ноч з каждого сяла. А красты ў нас ставілі, як была вайна, тады плакалі жанчыны і ўсе, і ўсё. І рабілі тожа гэтыя крэсты і ставілі на перакростку, на перакростку гэтыя крэсты.

Знаеця што, а патом жа іх і зразалі, была другая ўласць. А вот ужо цяпер сталі абратна ставіць. Вот у нас тут паставілі крэст і ў Цякалаўшчыне, у вёсцы радам, у нас у Смалічах тры крэсты. Там на перакростку, тут і ў сяле. Ну, гэта ўкрашаем іх, к Пасхе. Вяночкі робім. Вот некаторыя ж фартушкі вешаюць, самі шыем. Знаеце, вот даже і на магілачках на крэсціке фартушкі вешаем. Ну, канечне, хочыцца, каб харошы быў наш крэсцік, вешаем і іконкі, ручнікі. Мы вешалі іх некалі як ахвяру. Вот мы тут усе збіраемся, саседзі, складаемся, купляем вяночкі і кветачкі.

### Пра разбурэнне храмаў і пакаранне

Калі была ўласць, камуністы, каму не нравілася, вот яны ламалі крыжы. Той і ўнічтожыў сябе, хто так рабіў. Я знаю, адзін мужык ламаў красты, ён узяў і ўтапіўся ў калодзежы. Вот зайшло яму што-та такое – піў, піў. Канечне, гаварылі, што яго Бог пакараў, да і цяпер гавораць. Разве вот не карае Гасподзь іх, што ідуць п'яныя па дарозе, валяюццца, сядзяць. Мы Адаму і Еву знаем і законы чытаем...

*Запісана ў в. Смалічы ад Міроначк Ірыны Пятроўны, 1936 г.н., праваслаўнай, 7 кл. адукацыі, Шчурскай Ірыны Мікалаеўны, 1935 г.н., праваслаўнай, 10 кл. адукацыі (2006 г.)*

## ВЕРАВАННІ, ЗВЫЧАІ

### Сямейнае жыццё

### Дзіця ў сарочцы (чапцы)

Гэта Бог надзяе на яго сарочку. І тут, у Андрушах, у нас у Анагель Марыі Уладзіміраўны двое дзяцей нарадзіліся. Якраз сын Уладзімір і дачка Іна. І вот, як паглядзець па жыццю, дык дзяйствіцельна яны шчаслівыя ў чапцы. Вот у такой шапачцы, як родзіцца дзіцятка, вот гэта і называлася "чапец" – плёначка такая. Яно не на галоўцы – на ўсё дзіця. Іменна кагда выходзіць. Во, яны ў роддоме так і гавораць: "Во, радзілася шчаслівым дзяўча". Так і называюць у роддоме цяперака: "Радзілася дзіцятка шчаслівае – у чапцы".

### Пра лёс і час, калі добра паміраць

У нас гаварылі, што кажнаму судзьба пры ражджэніі даецца. У кажнага чалавека ёсць свой лёс, кажнаму ўсё назначана з роду…Калі чалавек родзіцца, у які дзень шчаслівы, і калі паміраe… У нас вельмі хацелі памерці да Ушэсця. Бо после Ушэсця, такі празнік у нас гадавы, закрываюцца царскія дзверы. І после Ушэсця ўжо не хочуць. Вот у нас у цэркві маладзы памёр, то вельмі хацеў на Вялікдзень памерці, а ён як раз па Вялікадню памёр. Хацелі памёрці ад Пасхі да Ушэсця. Да Ушэсця аткрытыя царскія дзверы. А после Ушэсця ўжо закрываюць царскія дзверы. Так от стараюцца. Да гэта не так як хочаш, гэта як прыдзецца. Але так гаварылі. От, некалі мой папа памёр як раз на Ушэсце. Дык казалі, што ён шчаслівы – на такія празнікі памёр! На Ушэсце яго харанілі.

*Запісана ў в. Андрушы ад Навоша Зінаіды Мікалаеўны, 1935 г. н., праваслаўнай, 7 кл. адукацыі (2006 г.)*

### Час, калі добра паміраць

Гавораць такое, што ад Пасхі да Ушэсця – гэта добрая смерць. Нехта кажа, што шчаслівы чалавек, а другія кажуць, што не, эта даже не ад Пасхі. Вот і кленчыць, ужо не кленчым ад Пасхі да Ушэсця. Перад Вялікаднем усе гэтыя цяжкія дні, і хто памрэ перад Вялікаднем…

Ну, дык гэта ж жалобныя дні, пасля Пасхі да Ушэсця, гэта ж вясёлыя дні, хто памрэ, гэта ўжо васкрэсне ён.

*Запісана ў в. Сейлавічы ад Хвіцько Вольгі Паўлаўны, 1932 г.н., праваслаўнай, 4 кл. адукацыі, Таратуты Сафіі Мікалаеўны, 1934 г.н., праваслаўнай, 4 кл. адукацыі, Кісун Алены Міронаўны, 1931 г.н., 2 кл. адукацыі (2006 г.)*

### Прыкметы і прадчуванне смерці

Знаю, што есць душа, што цела адмірае, а душа ідзе. І ідзе Суд Божы. Гэта ўсе людзі знаюць і ў нас у дзярэўні гавораць. У цячэніі 40 дзён душа летае ў гэтай хаце. Таму многія родственнікі, калі ўміраюць у іх родныя, яны расказваюць ці чуюць, што вот прыходзіць у хату, ходзіць па хаце ў цячэніі 40 дзён.

– Ці хранілі адзенне, у якім вянчаліся, замуж выходзілі на смерць сабе?

– У нас тут вянчаюцца ў адном, а хароняцца савяршэнна ў другом. Вянчаюцца ў белом, а хароняцца ў цёмным. Есць прыкметы смерці. Гэта мо і праўда. У нас гэтак суседні сабака выў паследнія дні – мужык памёр мой. Гракі лятаюць над домам тым. І яшчэ птушкі б'юцца ў вакно. Гэта як уніз сабака вые – на пакойніка, а як угору – на пажар.

Як адчуваюць, што хутка памруць, то развітваюцца з гаспадаркаю. Ходзяць. Вот маі наблюдзенія: кажды прэдчуствуе смерць. То лі сон прысніць, то лі што. Кажды чалавек. Гэта каторы раптоўна, а так кожны чалавек. І перад смерцю сняцца ўсё нябожчыкі. І кажды

дзень сняцца нябожчыкі. І вот як мой свёкар размаўляў з нябожчыкамі, чы так і понялі, што яны прыходзяць, праважаюць. А вот узгляд яшчэ, як людзі паміраюць, то ў іх ліцо дзелаецца прасветлённае. А вот глаза, стаіш, смотрыш на яго, ён вродзе глядзіць на цябе. Но ўзгляд яго… Яны што-та відзяць перад смерцю. Гэта точна. Патаму што ўзгляд цераз цябе праходзіць. І смотрат далеко-далеко, куда-та ўдаль… Так усе па-разнаму.

*Запісана ў в. Андрушы ад Цар Надзеі Сяргееўны, 1952 г.н., праваслаўнай, Боганевай А.М., Варфаламеевай Т.Б. (2006 г.)*

## Народная метэаралогія і астраномія

### Бура і віхор

І вот як бура вялікая: "Уцякайце! Бо можа скваэніць, спаралікаваць!"

Гаварылі, што гэта вяселле нячыстых! Гаварылі: "Уцякайце, бо чэрці гуляюць!" І еслі круціць гэты віхор, трэба перахрысціцца. І ён пойдзе ў другую сторану.

Гэто точно, што падымаецца віхор ці бура, калі памірае чараўнік ці самагубца. У нас гэдыка жанчына была. На яе ўсё казалі: "Вядзьмарка". І вот, калі яна памерла і ўносілі ў цэркаў, і гэдака бура як схвацілася! А потым унясслі – і ўсё.

*Запісана ў в. Малева ад Гацілы Алены Веньямінаўны, 1933 г. н., праваслаўнай, 7 кл. адукацыі (2006 г.)*

### Выкліканне дажджу і помнікі на могілках

Даўней голыя хадзілі, во як маці радзіла, во яна і я. Бабушка брала гэты плужок, што акучаваць картофель, нясла, там быў нейкі радок, гэтак вада і жоўты пясок.

Гэтакі радок, што каменьчыкі ўсе відны па дне, вады колькі там хоць і там не вельмі многа было, але гэдак чысценечка, і мы ўжо цянем удзвёх, а баба за гэтыя ручкі дзяржыць, а потым і аром, каб дождж пайшоў. А некаторыя сыпалі мак у калодзеж.

Вот некалі дажджу як у нас не было, казалі, што гэта ўжо нехта памятнік паставіць не ў гэта врэмя. Нельга памятнікі ставіць пасрадзіне вясны. Трэба заранне або ўвосень.

Можа быць засуха, калі памятнік не ў час паставіш. Дажа там палажылі, так хадзілі з бабамі спіхаць. Якраз ідзём дадому – і дождж пайшоў.

Да, зварушылі камень з магілы, падлілі вады, ня быў жа стаячок, і палажылі яго, а яны не зналі, хто палажыў, ну, мы пайшлі, падсыпалі туды маку, ці вады туды падлілі свянцонай, ну, нам падсказалі гэдак, і пайшлі мы.

Даўней жа памятнікаў не ставілі, клалі камні. Ляжачкі такія.

Гэта правільна ці гэта грэх на засуху араць. Нас старая бабка вяла. Гэта правільна, гэта не грэх. Мы ідзём так раздзяёмся, як маці радзіла, голенькія. Гэта не грэх, пасля таго, як мы аралі, быў дождж, дык гэта ж не грэх. Бог дае.

*Запісана ў в. Сейлавічы ад Хвіцько Вольгі Паўлаўны, 1932 г.н., праваслаўнай, 4 кл. адукацыі, Таратуты Сафіі Мікалаеўны, 1934 г.н., праваслаўнай, 4 кл. адукацыі, Кісун Алены Міронаўны, 1931 г.н., 2 кл. адукацыі (2006 г.)*

### Пра зоркі

Паказвалі некалі на неба, вот цяпер гавораць: "Малая мядзведзіца", "Вялікая мядзведзіца", а некалі мне мама казала: "Гэта вот сітка на небе". Гэта зорачкі на небе. А коўш ці касцы, вот як Вялікая і Малая мядзведзіца. Гэта, казала мама, касцы. Вот яны некалі, як на вячоркі хадзілі – на іх глядзелі, па іх часы апрадзялялі. Вот сядзяць, выйдуць, глядзяць – ага, значыць, тут гэта ўжо (прымерна дванаццаць ілі час ужо), пара ісці дадому. Я не ўмею, па іх часы апрадзялялі, я зоркамі люблю дзівіцца. Я іх, як выйду на двор, я іх усе-усе кругом перагледжу. Казалі ўсе, што шлях уздоўж неба – Млечны шлях. Мама некалі казала, што Млечны шлях – гэта па ім ляцяць птушкі, у вырай ляцяць птушкі. Адно яшчэ казалі, што як зорачка пакоціцца на ніз, я чула, мама казала, ужэ адна душа паменшала, памёрла, як зорачка апусцілася на ніз.

*Запісана ў в. Смалічы ад Міронлык Ірыны Пятроўны, 1936 г.н., праваслаўнай, 7 кл. адукацыі, Шчурскай Ірыны Мікалаеўны, 1935 г.н., праваслаўнай, 10 кл. адукацыі (2006 г.)*





### Пра папараць (абярэг ад чаравання)

Дык раз у год цвіце папараць-кветка. Ездзіла я з нявесткаю на сахарны завод у Гарадзею, карову хацелі купіць, глядзелі. Карова прыгожая, з вялікім вымем. Людзі казалі: "О, з якім вымем карову купілі!" А мама кажа: "А во, бачыш, перад парогам у мяне папараць сядзіць, пасадзі ля парога папараць". Гэдак яна знае. Нешта ёсць, яна сама, можа, нячыстая. Яе карове не пашкодзіць, бо ў яе папараць сядзіць.

*Запісана ў в. Сейлавічы ад Хвіцько Вольгі Паўлаўны, 1932 г.н., праваслаўнай, 4 кл. адукацыі, Таратуты Сафіі Мікалаеўны, 1934 г.н., праваслаўнай, 4 кл. адукацыі, Кісун Алены Міронаўны, 1931 г.н., 2 кл. адукацыі (2006 г.)*

## ЖЫВЁЛЫ

### Пра змеяў

Змяя не дай Бог! Адно асцерагаліся. Ва мху яны абычно сядзяць. Гаварылі, што на Уздзвіжанне яны само кішаць, гэтыя гадзюкі. І на картоплі, ждзі, накажа. На Уздзвіжанне не можна картоплі капаць, бо ўсякія там напаўзуць. Як напаўзуць – уджаляць! Змочаць, згрызуць і там ужо згадзяць. Што прыдзецца на прадвесне, во выкідаеш, з гразею. Гэта ў мяне быў гэдакі случай. Адзін дурань чалавек, яго ўжо і німа, ды мне сказаў, што камень трэба ўкінуць на Уздзвіжанне. Тады не будзе мышэй, нічого ў паграбе. Я, як той дурань, і ўкінула ж. То вы знаеце што, шамацела тамака: і мышы, і пацукі, і ўсё!

Як што плахое, трэба заўсюды казаць: "Не вам кажучы!" Некалі з намі падружка вучылася шыць і прыйшла ды расказвае, як у іх на печы сыры сушаць. Гэдак многа сыраў! Божа! Божа! У нас на печы, цётушка, не вам кажучы, сыры сушаць. А яна кажа: "Гэта не гавары: не вам кажучы! Гэта як што плахое, як хочаш расказваць, скажы: не вам кажучы!"

### Пра ласіцу

Я сама бачыла на сваёй карове ласіцу. Пашла даіць карову утрам. І от карова мая была чорна. А пад жыватом, гэтак вот з-пад грудзі, вымя было белае. А я адно падмыла яе. Яшчэ не даіла. Падмыла, выціраю. А во! Ззаду на калені, пад тым, што я сяджу, пад яе. Сядзіць. Я зірк. Што ж гэта?! Бачу ж, што ж ласіца! Я пака зашавялілася хвартух зняць. А яна скок з таго калена каровінага і пад стрэху, у дзірачку. То я сама бачыла. Кажуць, што карова чорная, вот гэта тая ласіца вядзецца. Калі пярэста карова, то будзе пярэстая. Як чорная – чорная. Калі не ўзлюбіць, мокрыя ці карова, ці конь. Прабывала мая часта, пака я не ўгледзела. Я не ведала што. Но после того я ўжэ не замячала ні ласіцы, ні того поту на карове.

А я вам скажу. У нас некалі, яшчэ бацьке жылі, і была кабыла. І тожэ ласіца была. І касу спляце такую, як чалавек рукамі, грыву спляце. Ну, любіла, мусіць, каня. Яна любіць коньскі пот, кажуць. Але тады кабыла мокрая, ужо яна яе ізмучыць, усё лазячы там яна, пака сспляце гэтую грыву. Гэта не паложана. Гэта не здорава. Ласіца і сама прапала. І болей і не бачыла. Але, кажуць, што добра, як ласіца вядзецца. Ды яшчэ гэдыкай самай масці.

*Запісана ў в. Малева ад Вінніцкай Наталлі Пятроўны, 1921 г.н., праваслаўнай, 6 кл. адукацыі, Шах Зінаіды Антонаўны, 1928 г.н., праваслаўнай, 5 кл. адукацыі, Гацілы Алены Веньямінаўны, 1933 г. н., праваслаўнай, 7 кл. адукацыі (2006 г.)*

У мяне ёсць на двары, але мала яе я бачыла, як яна выглядае. У нас у хляве я куранятак кармлю, а яна вылазіць, гэтакая нейкая доўгенькая… А я думаю, што за яна, вот такая рабенькая, нейкая рыжэнькая? Я думала, мо якая яшчарка лезе. Яна то вылезе, то задам назад. Ну, што яна робіць? Як не ўзлюбіць, дык кароваў яна мучаіць. Казалі некалі, зеркала прыбівалі ў хляве, каб яна, як у зеркала гляне, уцякла. Ну, як той масці пападзе ласіца, як карова, дык не будзе ўрадзіць. У мяне цяперака мо шэсьць куранят ласавіца забрала.

*Запісана ў в. Сейлавічы ад Хвіцько Вольгі Паўлаўны, 1932 г.н., праваслаўнай, 4 кл. адукацыі, Таратуты Сафіі Мікалаеўны 1934 г.н., праваслаўнай, 4 кл. адукацыі, Кісун Алены Міронаўны, 1931 г.н., 2 кл. адукацыі (2006 г.)*

# ДУХІ ПРЫРОДЫ І ГАСПАДАРКІ

## Пра русалак

Русалкамі нас страшылі. Во каля Вініцкіх, дзе Фаня жывуць, там гэдыко балото, і там прамо аер гэдыкі. І казалі, што русалкі там вядуцца. Так мы баяліся туды ісьці вельмі. Так мы страшылі адзін аднаго. “Не ідзі туды, бо там русалкі!” Можа, і вадзіліся русалкі, але мы іх не бачылі, але гаварыць гаварылі. Русалкі з пранікам. Кажуць: “Русалка бяжыць з пранікам!” Гаварылі, што русалка злая. А яшчэ нас як назбіраецца… То там Алёша, ці Генадзь, ці Алена: “Уцякаймо, бо там ужо варушыцца русалка!” І беглі невядома як. Адно пятамі давалі. Валасэ ў яе вялікія, кажуць, “ходзіць як русалка ўсё раўно” – не очэнь гэдыка яна прыгожая. Ну, русалка, мусіць, маладая. А можа, і старая ёсць. Калі маладая, калі ў старую пераходзіць.

– У нас штo-та было, бачылі русалку, бо Александросу замазалі ўсе вокна. То гэта ж на Купало хадзілі! Мы замазвалі! Хто русалкі? Ну, вот! Бачыце?! Тыя, што рабілі, дзе каму шкоду. Ну, я не ведаю, ці казалі, што русалкі – нячыста сіла ці не. Але яна цягне ўсё ў той вугал, дзе казалі, што русалкі. Нячыстая сіла – гэта чорт. А русалкі, Бог яе знае. Можа, яна і добрая, якая тая русалка.

*Запісана ў в. Малева*
*ад Вінніцкай Наталлі Пятроўны, 1921 г.н., праваслаўнай, 6 кл. адукацыі,*
*Шах Зінаіды Антонаўны, 1928 г.н., праваслаўнай, 5 кл. адукацыі,*
*Гаціла Алены Веньямінаўны, 1933 г. н., праваслаўнай, 7 кл. адукацыі (2006 г.)*

Пужалі русалкай, і не раз. Вон, дзе жыта вялікае расцець, і што вылезе русалка. Я сама малая была, а мне казалі: “Бяжы, бяжы! Там русалка з пранікам”. А, Бог яе ведаець, русалка, страшная. Хто яе ведае, старая ці маладая. Але, казалі, што страшная. Ну, русалка, нешта ж нядобрае, калі страшылі: “Бяжы, бяжы, хай русалка цябе зловіць!”

*Запісана ў в. Сейлавічы ад Хвіцько Вольгі Паўлаўны, 1932 г.н., праваслаўнай, 4 кл. адукацыі, Таратуты Сафіі Мікалаеўны, 1934 г.н., праваслаўнай, 4 кл. адукацыі, Кісун Алены Міронаўны, 1931 г.н., 2 кл. адукацыі (2006 г.)*

Пужала мама русалкай. Каб у жыто не йшлі, каб не йшлі купацца. “Ня йдзеце, бо ў вадзе жывуць русалкі”. Так мы ўсё казалі: “Мамачка, ну, раскажэце, якія ж тыя русалкі?” Так будзе мама гаварыць: “У іх воласы длінныя, о, кучаравыя. І вот яны хватаюць гэтыя дзеткі і ў рэчку цягнуць”. Пугалі, пугалі дзяцей гэтым. Была, па-відзімаму, страшнай русалка.

*Запісана ў в. Маляўшчына*
*ад Рублеўскай Ганны Паўлаўны, 1918 г.н., праваслаўнай, 1 кл. адукацыі (2006 г.)*

## Пра дамавікоў

Гэта-то я чула, што ў доме жыве дамавік. Страшылі. Вот, напрымер, наш сусед, бацькоў німа, то яны страшылі: “Не хадзіце ў хату, бо там пад печчу чорт сядзіць!” Я не чула, што дамавы далжон у кожнай хаце быць, але разоў усё нескалько ў тое акно – ці я прысню, ці я прыдумаю – але нехта: стук, стук, стук у вакно. А што, ды і думаю: “Мусіць, хтота будзе ісці ка мне”. А знаеце, адной яшчэ жывучы… Цішына. Ну, і ціхо. Больш німа. Ну, думаю, гэта мне нешто прычудзілася. Яно ж аказваецца, можа прайшло там сколько часу, месяц ці сколько. Мне вот кажацца ізноў. Нешта стук, стук у гэта акно. Спалохаюся. А што і як гэто?

У хату ідзеш, а з боку хлопцы ці саседскія дзеці: “Не ідзі, не ідзі ў хату, бо там чорт пад печчу сядзіць!” Альбо што-небудзь зробіш кепскаго, кажа: “Вот зараз пад печ запхну, і будзеш сядзець там з чортам!”

А яшчэ вот после смерці. Памёр мой тата. І мы яго пахавалі. Цераз дзён тры кліча мяне: “Зіна, Зіна!” А то, кажуць, не можно аказвацца, но я аказалася. А нехта мне кажа: “Не аказвайся! Бо гэто ж не твой тато. Гэта ж мамін брат (хрэсны мой папа)”. А я кажу: “Усё раўно тато. Хоць хрэсны”. Я прахвацілася, пабегла ў тое акно, дзе стукаўся і клікаў, – і німа нічога.

*Запісана ў в. Малева*
*ад Вінніцкай Наталлі Пятроўны, 1921 г.н., праваслаўнай, 6 кл. адукацыі,*
*Шах Зінаіды Антонаўны, 1928 г.н., праваслаўнай, 5 кл. адукацыі,*
*Гаціла Алены Веньямінаўны, 1933 г. н., праваслаўнай, 7 кл. адукацыі (2006 г.)*

## Пра русалак і дамавікоў

Русалку, то русалку бывало, што чуеш: ні глядзі ў калодзеж, бо там сядзіць русалка. Ну, у калодзежы, гэто вот маткі страшаць, дзеці лезуць пад калодзеж, а знаеце, гэта ж дзіцё, дык баіцца ж там, не можна глядзець, бы там русалка цябе схопіць. У нас толькі дзяцей страшылі. А дамавік? А Божа, хто яго бачыў? Дамавік і дамавік. Да вот некаторыя дамавікі з добрымі пажэланіямі – вот дамавік, ручка зашастала, нешта як шагамі – гэта дамавік, ну, у каждым доме ён ёсць. Дамавіка, кажуць, баяцца не нада, но ён павінен быць у каждым доме. Не, вродзе, ён не нячыстая сіла, так кажуць.

*Запісана ў в. Вялікая Ліпа*
*ад Верамейчык Сафіі Нікадзімаўны, 1925 г.н., праваслаўнай, 7 кл. адукацыі (2006 г.)*







*Таццяна Валодзіна,*
*Таццяна Цяпкова*

# З АРХІЎНЫХ ПАЛІЦ

***(Фальклорная калекцыя ДНУ “Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі”)***

У фальклорным архіве аддзела фалькларыстыкі і культуры славянскіх народаў ДНУ “Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі” Нясвіжскі край прадстаўлены немалым блокам матэрыялаў. Сярод іх – запісы як вядомых беларускіх фалькларыстаў Галіны Аляксандраўны Барташэвіч, Антона Іванавіча Гурскага, так і запісы студэнтаў Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка, якія пад кіраўніцтвам Уладзіміра Аляксандравіча Васілевіча праходзілі фальклорную практыку ў родных мясцінах. Прадстаўлена большасць класічных жанраў традыцыйнага беларускага фальклору – каляндарна-абрадавая паэзія, песні і звычаі сямейнага цыкла, пазаабрадавая песеннасць ва ўсім сваім багацці, ад балад і сацыяльна-бытавых твораў да прыпевак. Звяртае на сябе ўвагу значная колькасць казак, частка з якіх ужо была апублікавана ў тамах з серыі “Беларуская народная творчасць”, а частка чакала свайго часу на архіўных паліцах. Варта прыгадаць казачніц і спявачак Ярош Ганну Іванаўну і Гукале Фаіну Паўлаўну, талент якіх выклікае самую глыбокую павагу.

Матэрыялы паказваюць і адметнае спалучэнне даследчых і збіральніцкіх інтарэсаў, бо яшчэ ў 60-70-я гады актыўна збіраліся класічныя жанры. У апошняе дзесяцігоддзе ўзрасла цікавасць да светапогляднага кантэксту, у сувязі з чым павялічылася вага павер’яў і прыкмет. Менавіта ў апошнія гады запісана значная частка абрадавых песень рэлігійнага зместу (песні на Ражство, Вялікдзень). Паранейшаму жывыя і любімыя вясельныя і пазаабрадавыя песні.

Асобным блокам прадстаўлены аматарскія запісы студэнткі УА “Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў” Вольгі Кананец, якая робіць у фалькларыстыцы толькі першыя крокі, але ўжо ўмее пачуць і заўважыць

цікавыя і адметныя рысачкі з традыцыйнай духоўнай культуры роднага краю.

## КАЛЯНДАРНА-АБРАДАВЫ ФАЛЬКЛОР

### КАЛЯДЫ

*У нядзелю рана карагод вадзіла,*
*А Божая Маці сына парадзіла.*
*Каляда, каляда,*
*Сына парадзіла.*
*Каляда, каляда,*
*Сына парадзіла.*
*У пялёнкі павіла, палажыла спаці.*
*І сказала Маці сына калыхаці.*
*Каляда, Каляда,*
*Сына калыхаці.*
*Каляда, Каляда,*
*Сына калыхаці.*
*Калыхайце сына,*
*Песенкі спявайце,*
*Песенкі спявайце,*
*Сына праслаўляйце.*
*Каляда, Каляда,*
*Сына праслаўляйце.*
*Каляда, Каляда,*
*Сына праслаўляйце.*
*У нядзельку рана карагод вадзіла,*
*А Божая Маці сына парадзіла.*
*Каляда, Каляда,*
*Сына парадзіла.*
*Каляда, Каляда,*
*Сына парадзіла.*

*Запісана ў в. Казлы*
*ад Берташ Аляксандры Іванаўны, 1930 г.н.,*
*Акулік Марыі Аляксандраўны, 1930 г.н.,*
*Антановіч Леаніды Сцяпанаўны,*
*студэнтамі Гарбачовай А.А., Радаман А.В. (2004 г.)*

*Новы год, новы*
*Нам зара свяціла,*
*А Божая маці*
*Па саду хадзіла,*
*Сына нарадзіла,*
*У пялёнкі спавіла,*
*У яслі палажыла,*
*Ангелаў прасіла:*
*– Калышыце сына,*
*Спявайце пясэнкі,*
*Іграйце, музычэнкі.*

*Запісана ў в. Пагарэльцы*
*ад Бядонік Вольгі Сцяпанаўны, 1910 г.н., праваслаўнай,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Купіцай Н.М.*

*Неба і зямля*
*Ныне таржэствуют,*
*Ангелы людзям, ангелы людзям*
*Весела святкуют.*

*Хрыстос нарадзіўся,*
*Бог ваплаціўся,*
*Ангелы спявают,*
*Царя вітают,*
*Паклоны аддают,*
*Пастыры іграют,*
*Чуду, чуда вазвешчают.*

*Ва Віфліеме, ва Віфліеме*
*Вясёла навіна.*
*Чыстая Дзева, чыстая Дзева*
*Нарадзіла сына.*

*Слава ойтчэ, слава ойтчэ,*
*Взяла наша цела.*
*У цемнасцях азімніх,*
*У цемнасцях азімніх*
*Сонца засвяціла.*

*Ангелы служат,*
*Ангелы служат*
*Раждзённаму цару,*
*І ва верцепе, і ва верцепе*
*Тварат яго волю.*

*Трыя царыя, трыя царыя*
*Ад вастока прыходзят.*
*Смірну і ліван, смірну і ліван,*
*І злата прыносят.*

*Цару і Богу, цару і Богу*
*Трое ві даруют,*
*Пастыры людзям, пастыры людзям*
*Дзіўну весць вказуют.*

*І мы раждзоннаму*
*Богу паклон даймо,*
*Слава ўсявышніх.*

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Булат Алены Іванаўны, 1927 г.н., праваслаўнай,*
*Капытка Т.У. (1993 г.)*





*Прыехала Каляда к Янку на двор,*
*Каляда, Каляда, Калядзіца мая.*
*Ой, ты, Янка, нам скажы, чым даруеш?*
*Каляда, Каляда, Калядзіца мая.*
*Калі, Янка, не дасі бочку пшаніцы,*
*Каляда, Каляда, Калядзіца мая.*
*Дык ты, Янка, аддасі маладу дзяўчыну,*
*Каляда, Каляда, Калядзіца мая.*

*Запісана ў в. Сейлавічы*
*ад Секушэнка Анастасіі Паўлаўны, 1939 г.н.,*
*Астрэйка І.*

### ВАРОЖБЫ

На зімовы празнік Андрэй дзяўчаты варожаць: сеюць каноплі каля калодца. Гавораць: "Святы Андрэй, канапельку сею. Дай, Божа, знаць, з кім буду век каратаць". І дзяўчына далжна ноччу сасніць свайго сужанага.

У адзін дом субіраліся дзяўчаты з трынаццатого на чатырнаццатого вечарам. І сталі яны варажыць. Насыпалі кучку зярна, свае кучкі замецілі, чыя дзе кучка ляжыць. Патом прынасілі курыцу з сарая. Тую курыцу пускалі, і яна падходзіла пад гэту крупу і пачынала есці зярно, дзяўбці. І вот чыю кучку пачне дзяўбці, тая дзеўка первая выйдзе замуж.

На Шчадрэц дзяўчаты перакідалі галошу цераз крышу дома. У якую старану носам пападзе, у тую старану дзеўка замуж пойдзе.

*Запісана ў г. п. Гарадзея*
*ад Канюшок Марыі Канстанцінаўны*
*Касцюкевіч Я.Ю. (2002 г.)*

На Каляды гадалі так: дзяўчаты варылі куццю, потым набіралі поўны рот гэтай кашы і хуценька беглі на вуліцу. Запынялі першага сустрэчнага чалавека і пыталі імя. Такім і павінна быць імя будучага мужа.

Дзяўчаты бралі свечку, ламалі на маленькія кусочкі, а потым ужо складвалі іх у лыжку і над агнём тапілі воск. Калі ён поўнасцю раставаў, то ўлівалі яго ў халодную ваду. А там ужо даставалі і глядзелі, якія фігуркі атрымоўваліся.

Дзяўчаты выходзілі на двор, падыходзілі да забору і рукамі хапалі калкі, колькі зможаш. Потым лічылі: калі ўсе калкі па парах, то і дзяўчына гэты год знойдзе сабе пару, а калі калок заставаўся, то і прыйдзецца адной застацца.

Зараня трэба было ўсім дзяўчатам напекчы аладак. Потым мы збіраліся ў адной хаце, клалі свае аладкі па кругу і запускалі сабаку. І чыю аладку сабака з'есць першую, тая дзяўчына і пойдзе замуж першая.

На Каляды трэба выйсці на двор і падкінуць уверх нагой адзін бот, а потым паглядзець, у якую старану ён паказвае носам – туды і замуж пойдзеш.

Ноччу, у дванаццаць часоў, дзяўчаты хадзілі да закрытай цэркві і прыслухоўваліся. Хто чуў вянчальнае пеніе, тая ў гэтым годзе павінна была выйсці замуж.

Перад сном трэба было наліць у міску вады і паклацсі зверху саломінку, каб атрымаўся мосцік, і сказаць: "Суджаны мой, ражаны, перавядзі мяне праз масток". Пасля легчы спаць. Ноччу павінен прысніцца будучы муж.

*Запісана ў в. Прасці*
*ад Хваль Зінаіды Міхайлаўны, 1931г.н.,*
*Лабаза Ю.Ф.*

### ВЕСНАВЫЯ ПЕСНІ

*А ў лесе ды на верасе,*
*Вясна-красна на ўвесь свет.*
*Малады там хлопец ды валы пасе,*
*Вясна-красна на ўвесь свет.*
*А яму дзяўчына ды абед нясе,*
*Вясна-красна на ўвесь свет.*
*Сядзьма разам з намі, паабедайма,*
*Вясна-красна на ўвесь свет.*
*А я па абедзе скажу табе дзіва,*
*Вясна-красна на ўвесь свет.*

*Запісана ў в. Быхаўшчына*
*ад Літвін Ганны Ігнацьеўны, 1922 г.н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Шапель Л.*

*Ой, вясна то вясна,*
*Ды што яна нам прынясла.*
*Старым бабам па кіёчку,*
*Маладачкам па чаўночку,*
*А дзявочкам па вяночку,*
*Малым дзеткам па яечку,*
*А мужчынам па плужочку.*
*Ой, вясна то вясна,*
*Ды што яна нам прынясла.*

*Запісана ў в. Завушша*
*ад Чурыла Таццяны Канстанцінаўны, 1930 г.н.,*
*праваслаўнай,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Паплаўскай А.*

## ВЯЛІКДЗЕНЬ

На Вялікдзень у в. Краснагоркі збіралася група людзей: маладыя і людзі ва ўзросце. Яны называліся кукольшчыкамі. Яны хадзілі па хатах, спявалі песні. Песні былі прысвечаны гаспадару дома, жадалі яму шчасця, здароўя, таксама яго сям'і, жадалі добрага ўраджаю. Кукольшчыкам давалі ў асноўным сырыя яйкі, а некаторыя людзі давалі грошы. Пасля гэтыя яйкі дзялілі між сабою і жарылі.

*Запісана ў в. Краснагоркі*
*ад Кулеш Надзеі, праваслаўнай,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Гецман Н. (2006 г.)*

Вялікдзень (Пасха) – самае галоўнае хрысціянскае свята ўваскрасення распятага Ісуса Хрыста. З Краснай суботы на нядзелю ішлі ўсе ў цэркаў на ўсеначную. У царкве свяцілі пафарбаваныя яйкі, булкі, соль, мяса і інш. А ўжо калі прыдуць з царквы, то разгаўляюцца свянцоным, у першую чаргу яйцом. Тады ідуць на могілкі і памінаюць родных нябожчыкаў. Кладуць ім на магілкі свянцонае яечка, мяска, булачкі кусочак. У гэты дзень адныя людзі казалі:

– Хрыстос уваскрэс!
Другія адказвалі:
– Ваісціну ўваскрэс!

Звычайна ў гэты дзень на вуліцы збіраецца моладзь і б'юцца ў яйкі. Чыё яйцо разбілася, той праіграў і павінен аддаць яго таму, хто пабіў. Ішлі ў хлеў і віншавалі жывёл, частавалі іх свянцонаю булкай, каб былі здаровыя і дужыя.

*Запісана ў в. Грускова*
*ад Грабёнкі Валянціны Міхайлаўны, праваслаўнай,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка*
*Грабёнкай А.М. (1995 г.)*

### Велікодная

Спявалася дзецьмі, якія на Вялікдзень хадзілі па вёсцы "за яйкамі", як бы абвяшчалі "Хрыстос уваскрос":

Вялік святы нам дзень настаў
Со славай з гроба восеяў.
Хрыстос Гасподзь наш вечны свет.
Хрыстос васкрэс, Хрыстос васкрэс.

Суботня полнач ліш прашла,
Зара в нядзелю чуць взашла,
Как ангел дзвер во гроб отверс.
Хрыстос васкрэс, Хрыстос васкрэс.

*Ту ноч ко гробу жоны йшлі*
*І мірра цэнное неслі.*
*Но там ужэ был гроб отверст.*
*Хрыстос васкрэс, Хрыстос васкрэс.*

*Це жоны плакаць ліш пошлі,*
*Што в гробе цела не нашлі.*
*Но смотраць – в гробе нехта есць.*
*Хрыстос васкрэс, Хрыстос васкрэс.*

*Там был в блесцяшчых рызах лік,*
*Пасланец божы там для ніх.*
*То светлы ангел был с небес.*
*Хрыстос васкрэс, Хрыстос васкрэс.*

*Как сам пред смерцю он сказал,*
*На трэці дзень із смертных встал.*
*От радосці не надо слёз.*
*Хрыстос васкрэс, Хрыстос васкрэс.*

*Ідзіце, дайце знаць аб том*
*Усім яго ученікам.*
*Прадоўжыў ангел тую весць.*
*Хрыстос васкрэс, Хрыстос васкрэс.*

*І ангел жонам тот сказал:*
*Хрыстос – Гасподзь із мёртвых встаў.*
*Что ішчэце? Его здесь нет.*
*Хрыстос васкрэс, Хрыстос васкрэс.*

*В цэрквах лікуйце і ў дамах,*
*Нам жызнь аткрылась в небесах.*
*Все веселіцесь, людзі, днесь.*
*Хрыстос васкрэс, Хрыстос васкрэс.*

*Как ангелы на небесах все,*
*Радуйцеся на землі все,*
*Весяліцесь, людзі, днесь.*
*Хрыстос васкрэс, Хрыстос васкрэс.*

*Запісана ў в. Еськавічы*
*ад Сайкевіч Валянціны Сцяпанаўны, 1930 г.н.,*
*Гайдук Н. (2003 г.)*

### Юраўская

*Юр'я, Юр'я па полі ходзіць,*
*Юр'я, Юр'я да й Бога просіць:*
*– Урадзі, урадзі, жыта, пшаніца.*
*Пабі, пабі куколь, мятліцу.*
*Падай, падай ключы і замкі*
*Адамкнуць неба і зямлю,*
*Выпусціць цёплую расу*
*І на жыта, і на пшаніцу.*
*Будзе ў корані караністая,*
*У сярэдзіне ды сцяблістая,*
*А на полі выжаністая,*
*А і з поля вывазістая,*
*А ў гумне выкладзеная,*
*А ў млыне вымеленая,*
*А ў дзяжы падыходная,*
*А ў печы выпячоная,*
*А на стале сытна-спорнаю*
*Нашым людзям на здароўечка.*

*Запісана ў в. Быхаўшчына*
*ад Літвін Ганны Ігнацьеўны, 1922 г.н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Еўтух С.П.*

## КУПАЛЬСКІЯ ПЕСНІ

*Ой, у борку, у борку, у борку*
*Да рубіў малойчык каморку.*
*Да яго да дзеванька прыбягала,*
*Да яго, маладзенькага, навучала:*
*– Да рубі, малойчык, з акенцам.*
*Каб к нам салавейко прылятаў,*
*Да нас, маладзенькіх, навучаў.*
*Бо чужая матка ні пабудзіць.*
*Пойдзе і к суседу, абсудзіць.*

***

*Сягоння Купало, заўтра Ян,*
*Да будзя вам, хлопцы, ліха вам.*
*Да якое ж ліха ліхоя,*
*Да пагоніца сабакі ў поля.*
*Якія сабакі ліхія,*
*Што нашыя хлопцы дурныя.*
*Што яны самі нічога ні маюць,*
*А ў дзяўчат пасагаў пытаюць.*

*Запісана ў в. Казлы*
*ад Турко Антаніны Адамаўны, 1910 г.н.*
*(нарадзілася ў в. Каменка),*
*Лесінай Л.М. (1976 г.)*

*А купальна ночка маленька,*
*Да не выспалася паненка,*
*Ягадкі збірала, драмала,*
*Як села перабіраці, да й заснула.*
*А як прыехаў дзяцінко, не пачула.*
*Уставай, дзяўчына, годзе табе спаць,*
*Да й пара, дзяўчына, і столы накрываць.*

*Запісана ў в. Казлы*
*ад Гукалы Фаіны Паўлаўны, 1914 г.н.,*
*Барташэвіч Г.І. (1976 г.)*

*Сёння Купала, а заўтра Ян,*
*Да будзе, хлопчыкі, ліха вам.*
*Да якое ліха ліхое.*
*Пагоніце сабакі ў поле.*
*Колькі тых сабак? Трыццаць шэсць,*
*Усе тыя сабакі ў адну шэрсць.*
*Адна сучачка рабенька,*
*Гэта вам, хлопчыкі, паненка.*
*Другая сучачка падласа,*
*Гэта вам, хлопчыкі, на мяса.*
*А трэцяя сучачка пярэста,*
*Гэта вам, хлопчыкі, нявеста.*

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Шынгель Надзеі Віктараўны, 1910 г.н.,*
*Шынгель І.А. (1976 г.)*

*Ой, рана-рана на Яна,*
*Зямля з Купала стагнала,*
*Зямля з Купала стагнала,*
*А лясы звінелі із песень,*
*А лясы звінелі із песень,*
*Сяло разлягалася з музыкі.*
*Прасілася нявеста ў свякраткі:*
*– Пусці мяне на вулку пагуляці,*
*Пусці мяне на вулку пагуляці,*
*Ад маленькага дзіцяці.*
*"Ідзі, ідзі, нявеста, не баўся,*
*Да белага свету не шляйся".*
*Як пайшла нявеста гуляці,*
*І белага свету дачакаці.*
*От узяў свякратка востры меч:*
*– Зніму табе, нявеста, галоўку з плеч.*
*– Свякратка, мой ты татачка,*
*Шаўкова твая бародачка,*
*Шаўкова твая бародачка,*
*І панская твая паходачка,*
*Парловыя[4] ў цябе зубачкі,*
*Рабочыя твае ручачкі.*
*Ой, гуляла нявеста да свету,*
*Ідзі гуляй, маладзенька, да абеду.*
*Да пару коней запрагу,*
*І цябе, маладзенькую, да прывязу.*

[4] Белыя (заўвага выканаўцы).

## Звычай на Купалу

Кветкі Купалы рвалі толькі жоўтага цвету, а белага – не (не ведаю чаму). За дзень перад Купалам, вечарам, дзеці па 7– 8 гадоў рвалі кветкі купалы і крапіву, клалі на шулы ў варотах ва двор. Пучок купалы і пучок жычковай крапівы лажылі спачатку на адно шула і прыкладвалі бальшым камнем, пасля – таксама на другое шула. Усё гэта рабілася для таго, каб ведзьмы малако ад кароў не адбіралі.

*Запісана ў в. Юшавічы*
*ад Петручэня Марыі Іосіфаўны, 1913 г.н.,*
*Гурскім А.І.*

## ЖНІЎНЫЯ ПЕСНІ

*Каб я гэту бяду знала,*
*Каб я гэту бяду знала,*
*А не йшла б замуж маладая.*

*Цяпер трэба тоя знаці,*
*Цяпер трэба тоя знаці,*
*Позна легчы, рана ўстаць.*

*Дзяжу хлеба замясіці,*
*Дзяжу хлеба замясіці,*
*Дзевярочка накарміць.*

*Запісана ў в. Казлы*
*ад Турко Антаніны Адамаўны, 1910 г.н.*
*(нарадзілася ў в. Каменка),*
*Лесінай Л.М. (1976 г.)*

*Жана мужа шанавала,*
*Жана мужа шанавала,*
*На папары навязала.*

*Еш, муж, траву папарную,*
*Еш, муж, траву папарную,*
*Пі, муж, ваду лугавую.*

*Папарная трава сытна,*
*Папарная трава сытна,*
*Лугавая й вада пітна.*

*Запісана ў в. Казлы*
*ад Марулевіч Аляксандры Сцяпанаўны, 1900 г.н.,*
*Ярош Ганны Іванаўны, 1900 г.н.,*
*Карловіч Вольгі Данілаўны,1900 г.н.,*
*Лесінай Л.М. (1976 г.)*

*Сёння ў нас дажыначкі,*
*Прынясе пан гарэлачкі,*
*А пані закусачкі.*
*Ой, баран наш пан, баран,*
*А пані авечая*
*Трымае жанцоў да вечара.*
*– Жнеце, жнейкі маладыя,*
*Вашы сярпы залатыя.*
*А мы жыта дажалі*
*І ў снапочкі павязалі.*

*Запісана ў в. Сейлавічы*
*ад Таратута Сафіі Міхайлаўны, 1934 г.н.,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Навоша В.*

*Жнеце, жанцы маладыя,*
*Вашы сярпы залатыя.*
*Жнеце, жнеце, да пажнеце,*
*Самі сябе не пазнаеце.*
*Не дагнаўшы, не пойдзеце,*
*Без вячэры не ляжаце.*
*Наша пані маладзенька,*
*Да зладзіла салавейка,*
*На патэльні гатавала,*
*Свае жанцы частавала.*
*Пара, пара нам дадому,*
*Пала раса нам дадолу,*
*І буйная халодная,*
*Лугавая і мядовая.*
*Мядовае – напіціся,*
*Лугавою памыціся.*

***

*Як я пайду дарогаю,*
*Пушчу голас дуброваю.*
*Няхай голас галасуе,*
*Няхай мая маці дома чуе (2 р.),*
*Мне вячэрушку гатуе.*
*Наварыла бацвіннейка,*
*Насадзіла Марціннейка.*
*Мне бацвіння не хочацца,*
*А з Марцінам рагочацца.*

***

*Да ты, баравая зязюлька,*
*Ня многа табе кукаваці,*
*Ня многа табе кукаваці,*
*Адно ад Юр'я да да Пятра,*
*Адно ад Юр'я да да Пятра,*
*Чым твая, дзевачка,*
*Галоўка да клапатна.*
*Ой, клапатна галоўка, клапатна,*
*Што няма на падаркі да палатна.*





***

*Ой, борам-борам, тым барком,*
*Дзе ехала салдатаў сем палкоў.*
*Вязлі газэту сінюю,*
*Што забяруць дзевачку сілаю.*
*Да не так сілаю, за грошы,*
*Бо яе дзяцінка да харошы.*

*Запісана ў в. Юшавічы*
*ад Петручэня Марыі Іосіфаўны, 1913 г.н.,*
*Гурскім А.І.*

## Андрэй

13 снежня – Андрэй. Варожаць. Намочаныя лучынкі кладуць пад падушку і сніцца тое, што будзе. Адно запіраешся, ставяць зеркало і глядзяць у яго. Яшчэ кажуць: на Андрэй не дурэй.

*Запісана ў в. Макашы*
*ад Мяцеліцы Івана Іванавіча, 1920 г.н.,*
*студэнтамі БДПУ імя М. Танка Філіпчук В.,*
*Арлоўскай В.*

## Як праводзілі Дзяды

На Дзяды варылі 12 патраў (страў): бліны, квас, кашу, мяса і іншае. Накрывалі стол, елі і пілі. Што не даядалі, астаўлялі на стале дзядам. Назаўтра прымалі ўсё са стала і казалі дзецям, што ўсё з'елі дзяды.

*Запісана ў в. Сноў*
*ад Яраш Яніны Міхайлаўны*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Сідаровіч Н. М.*
*(2004 г.)*

## ВЯСЕЛЛЕ

Прыязджаюць сватэ, прывозяць гарэлку, хлеб. У хату ўдваіх ідуць: малады і сват. Ну, садзяцца ўжэ, гавораць. Кажуць, як пасаг добры, тады возьмем. Ну, дзеўку пытаюцца, ці пойдзе. Дык як каторыя любяцца, то яна ж сагласна, а як адкуль здалёк прыязджаюць, дык яны ж і не ведаюць адно аднаго. Як сагласны, сядаюць, частуюцца. Сватэ ўжэ пакідаюць хлеб, бутэльку гарэлкі. Патом ужэ дагаворваюцца, некалі казалі – спеўніны, гэта цяпер – дагаворы. Клічуць хрышчоных бацькоў, і яго бацькі прыходзяць. Ну, пачастуюцца ды дагаворваюцца, калі вяселле будзе. У сыботу заўсёды сваталіся і спеўніны рабілі ў сыботу, а вяселле пачыналі ў нядзелю.

То перад вяселлем маладую, як не гуляла, на дзяжу садзяць. Выварочваюць кажух, сцелюць і садзяць. Бацьке ўжэ бяруць ікону дзержаць, а свацця свечкай валасы маладой трохі падсмальвае.

А як заўтра вяселле, дык сёння вянок плятуць. Вялікі вянок. Каравай пякуць. Прыгожа яго ўсякімі кветачкамі, касічкамі павыкладваюць, як шышычкамі, ружачкамі. Пену рабілі ды павыводзяць усякіх бубачкаў, яшчэ і напішуць: "Жалаем маладым многая лета!" А вянок дзеўкі як саўюць, дык потым іх частуюць. Тады як з'ядуць усё, настольнік той хапаюць, скручваюць і кідаюць у парог, каб хутчэй ужэ ўсе дзеўкі замуж ішлі за гэтаю.

Тады заўтра едуць вянчацца, маладая на адным возе, малады на другом. Як прыедуць з-пад вянца, малады ўжэ здымае маладую з воза, але не нясе, цяпер дык нясуць, а то не нясе, сама ішла. А маці ўжэ з чаркамі іх прынімае. Маладыя садзіцца за стол, маладая перад сталом. І ўжэ перапіваліся. Малады кладзе падарак на чарку, а маладая выпівае. Ну, а сват кажа ўжэ, што "прашу пачаць вяселле". Ды гуляць.

На другі дзень ужэ каравай дзеляць, прыносяць. Мамы прыносяць. Тады сват кажа тры разы: "Божа, благаславі!" І як рэжа, дык кажа гэтак. Ды потым раздае па парадку. Першым бацькам маладой, а як у маладога – ды яго бацькам. Раней яшчэ і сыра да каравая рэзалі.

Тады ўжэ едуць да маладога. Куфар нясуць поўны. Але не аддаюць. Тады малады частуе, выносіць гарэлку. Маці маладога сцеле пасцель, малады ўжо дае сваю падушку, коўдру.

Як маладая ехала, дык падаркі давалі, ці як каравай дзеляць, ужэ падушкі кладуць.

Маладых жа ў гумно вялі спаць, на кулі, куль распасцiралі. Тады музыка грала. А раніцай маці маладой ужэ закруціць тую сарочку сабе на галаву і танцуе ад радасці, што дачка мая чэсная. Але так жа мала рабілі.

А як у другое сяло ішла дзеўка, дык бацька едзе паглядзець ужо гаспадарку хлопца, ці ёсцека ў яго што.

*Запісана ў в. Асмолава*
*ад Лютко Ганны Піліпаўны, 1922 г.н.,*
*праваслаўнай, Лютко А.У.*

*Не садзіся, сваха, блізка сцяны,*
*Бо нашы хлопцы – круцялі,*

Круцяць дзіркі праз сценкі,
Дастаюць пірог з кішэнькі.
Наша сваха – чапяла,
Нам піражок пачала,
Да ў кішэніку палажыла
Свайму дзіцяці маломү.
Не так дзіцяці маломү,
Як свайму дзеду старому.

***
Дай нам, сватка, караваю,
Мы ж табе дзеўку нараім,
Да нараім, нараім
Першую дружку старую,
Да й на вока сляпую.

***
Свахначка, да галубачка,
Мы ж цябе доўга ждалі (2 р.),
Жалезныя масты клалі,
Каб свахначка не ўтапілася
Да піражка не забылася.
Сястрыцы, забылася піражка ўзяці,
Палажыла ў сенях да на краваці,
Пабяжыце да маім слядком,
Да вазьміце піражок з мядком.

***
Да, казалі, сватка вельмі харош,
А ў яго доўгі буслаў нос,
Да казіна рыжа барада,
Да тоўстая лыса галава.
Плавае па хаце, як таран,
Лупае вачыма, як баран.
Калі, сват, гарэлкі не дасі,
Караваю трасцу пад'ясі.
Жаніх ты мой – багаты,
Адно толькі – што староваты.

Спяваюць назаўтра ў маладой:

– Валеччына мамачка,
Валеччына мамачка
Вакруг стала да пахаджае,
На дзевачкі да паглядае.
А Божа ж мой, да мілюсенькі,
Усе дзевачкі харашусенькі,
Адно да маё дзіця бледна,
Ці на яго імгла пала,
Ці на яго імгла пала
Із саду з вішнёвага,
Із саду з вішнёвага,
Із цвету да маковага.
Жаль табе, мая мамачка,
Было мяне не аддаці,
Было мяне не аддаці,
Яшчэ з гадок пагадаваці.

Спяваюць, як прывозіць малады маладую да сябе:

– Прывёз, мама, да баярачку,
Паставіў да на ганачку.
Прымі, мама, да баярачку,
Што паставіў да на ганачку.
– Рада бы я да прыняці,
Да не ведаю як яе назваці.
– Заві яе да княгінькаю,
Будзе ў доме да гаспадынькаю.
Заві яе да баяркаю,
Будзе вадзіць гаспадаркаю.

***
Свахначка, да галубачка,
Да ці добрая зямліца,
Да ці добрая зямліца,
Да ці зарадзіла пшаніца.
У нас зямля – крамяніца,
У нас не зарадзіла пшаніца,
У нас не зарадзіла пшаніца,
Адно куколь да мятліца.

*Запісана ў в. Юшавічы*
*ад Петручэня Марыі Іосіфаўны, 1913 г.н.,*
*Гурскім А.І.*

Да хадзіла дзевачка да каля яра,
Да сеяла з прыполу да вінагра...
Да прасіла ў бацюшко шчыранько,
Зачыняй варота шчыльненько,
Бо наедзе дзяцінка с сватамі,
Да патопча вінаград ботамі.

***
Як едзе маладая да маладога:
– І вышла маці за варота,
Слядкі знаць.
І куда маё дзіцятко
Павёз зяць.
Анно чуцён галасочак,
Знаці, што яе.
Плача маё дзіцятко
У чужо(га) бацькі на двары,
Нізкія паклоны кланяя,
Дробныя слёзкі раняя.



Нясвіжскага краю напеў векавы

***
Як на пасад вядуць:
– І да брат сястру
Да на пасад вядзе,
Да гібкую кладку кладзе.
Да, кладачка, да ня ўгібніся.
Сястрыца, да ня ўлякнісь.
Да кладачка ўгібнулася,
А сястрыца да ўлякнулась.

*Запісана ў в. Казлы*
*ад Ярош Ганны Іванаўны, 1900 г.н.,*
*Барташэвіч Г.І. (1976 г.)*

– Мая мамка, мая родная,
Тут і горы высокія,
Тут і калодзежы далёкія,
Тут і зямля камяністая,
І сям'я наравістая.
– Маё дзіця, маё роднае,
Паначуй ты хаця тут ночаньку,
Пажыві ты хаця тыднічак!
Тут і горы паніжаюць,
І калодзежы пабліжаюць,
Тут і зямля параўнее,
І сям'я паласкавее.

***
Захацела маці пераведаці дзіцяці,
Ды паслала голку ды маточак шоўку.
– Вышывай, маё дзіцятка,
Як у мяне ты вышывала.
– Ой, маці, маці, не магу вышываці:
Трэба рана ўстаці,
І кароўку падаіці,
І свякроўцы ўнаравіці.

***
Ой, я ў горы не радзілася,
Ой, я ў горы не радзілася,
Ка мне гора прыкацілася
Чэраз сені, чэраз хатушку
У маю краватушку.
А ў маёй кравaткі ляжыць,
А мне, маладой, разуваці вяліць.
А мне, маладой, усё не хочацца,
Каля п'яніцы варочацца.
Не хочацца белы ручкі мараць,
Не хочацца тонкі пальчыкі згінаць.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Плаксы Аляксандры Іванаўны*
*Зяньковіч Я.І. (1967 г.)*

## Вясельная сіроцкая

Дарогаю да й шырокаю
Там ішла сіротанька.
Ішла яна, гукаючы,
Сваёй мамкі магілку шукаючы.
Зялёны дзярнок – раздзярніся,
Жоўты пясок – разсыпніся,
Мая мамка мілая,
Скарэй акажыся.
– Адчапіся ж ты, маё дзіцятачка,
У цябе дома ёсць свая мамачка.
– Ой, ты, мамачка мая мілая,
У мяне дома толькі мачыха,
А яна мяне ўсё праклінае,
Шчасця, долі не жадае.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Мялешка Фаіны Пятроўны*
*Зяньковіч Я.І. (1967 г.)*

Калі маладая прыязджае ў хату да бацькоў маладога, яны страчаюць дзяцей хлебам-соллю. Пераступаюць парог. Яна прыветствуе радзіцелей, яе тожа. Маладая бярэ са свайго дому ў платочак жыта. І калі пераступае парог, бярэ жыта і абсыпае ўсе куткі. Сразу на покуць, па баках. Толькі тады садзіцца за стол.

Сядзелі радзіцелі з іконай. Маладая падыходзіла і кленчыла перад імі на абрус. Бацькі давалі благаславенства і абводзілі тры разы яе свечкай. Затым прышчыквалі чуць валос. Сваха ўшпільвала вяночак маладой пад вален. Пасля вянчання, калі маладая ўсё здымала, вяночак маладая ўкладала ў падушку, на якой яны будуць спаць.

Кагда ўжэ дагаварыліся радзіцелі, у які дзень свадзьба, то дагаворанаю нядзеляй маладая збірае падарунак. Прыходзяць асобенно дзевачкі. Яны шылі ёй фату, пелі песні прашчальныя з маладосцю. Адна жанчына, каторая ўмела шыць, адна шыла вянок. Калі ўжэ пашылі вянок і вален, падыходзіла матка і благадарыла за гэто. Калі ўводзяць маладую, сваха ўколвае гэты вяночак ззаду ў валасы.

Матка маладога страчае маладых. Сталы прыбраныя. Матка бярэ ў руку насавы платочак. Маладая бярэцца за платочак, малады за маладою. Матка першая вяла іх за свадзебныя сталы.

У дванаццаць, ужэ пасля каравая, матка знімае маладое вален і вешае на абраз, з якім

яна прыехала. А ёй завязвае платочак. Гэта значыць, што яна ўжэ як жэншчына.

*Запісана ў г.п. Гарадзея*
*ад Дашкевіч Ганны Канстанцінаўны*
*Касцюкевіч Я.Ю. (2002 г.)*

Калі маладыя сядалі на вазы, ад'язджаючы да маладога, спявалі сіраце:

*– Паедзеш, Волечка,*
*У чужую староначку,*
*Будзе падпаветка – хатачка,*
*А суседка – матачка.*

*Першы замочак – зялёны дзярночак,*
*Другі замочак – жоўты пясочак,*
*Трэці замочак – саснова дошчачка.*
*Зялёны дзярночак, аддзярніся,*
*Жоўты пясочак, адсыпіся,*
*Саснова дошчачка, адчыніся,*
*А родна мамачка, адгукніся.*

*Пытаецца сын у маці, каторую браці,*
*Багатая дзяўчыначка – очэнь ана пышна,*
*А бедная сіраціначка, як у садзе вішня.*
*У багатай дзяўчыначкі – волікі, кароўкі,*
*А ў беднай сіраціначкі – чорныя броўкі.*
*У багатай дзяўчыначкі волікі здыхаюць,*
*А ў беднай сіраціначкі броўкі не ліняюць.*

*Запісана ў в. Салтанаўшчына*
*ад Кірлюк Вольгі Сямёнаўны, 1922 г.н. (2005 г.)*

*Спявалі ў маладога:*
*– Не радзілася, не была,*
*Куды мамачка аддала.*
*Аддала замуж да ракі,*
*Дзе ўсе мужыкі дуракі.*
*Да п'юць гарэлку без меры,*
*Да б'юць жоначак без віны.*
*– А ты, дзевачка, розум май,*
*Як будзе біць – уцякай*
*Да праз кутнее аконца,*
*Не кажы яму ні слоўца.*

*Запісана ў в. Новыя Навасёлкі*
*ад Нагорнай Анастасіі Вікенцьеўны*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Скрыннік А.А.*
*(1992 г.)*

## РАДЗІННА-ХРЭСЬБІННАЯ АБРАДНАСЦЬ І ПАЭЗІЯ

Як прыдзе час ужо нараджаць, дык бягуць ужэ тады па бабу, клічуць. Ну, тая баба ідзе. А то ж яшчэ кажуць, як жанчына нараджае, дык Багародзіца доўга вельмі абуваецца, а потым ужо ідзе. А як дзеўка, дык хуценька, у адным сандалю бяжыць. Гэта ўжэ, каб дзеўка нікуды не дзела, каб радзіла, ды добра б усё было дзіцю тому.

От баба прыйдзе, пупок абрэжа, пакупае дзіця. Потым яго ўжо закруцяць у чыстае, паяском тканым абвяжуць, каб шчаслівa было. Пачастуюць бабу, і пашла баба дадому.

Назаўтра ўжо баба пячэ ці ў гаршчок… насалодзіць вады добра, абаранкаў тых накрышыць, у ручнік закруціць і пайшла тое дзіця даведвацца. Так можа з тыдзень ходзіць.

А той пупок жа не выкідаюць, а хаваюць дзе ў хаце. Як дзяўчынка, дык недзе пад прыпекам, каб добрая ўжо гаспадыня была. Як хлопец, дык таксама недзе ў хаце. Гэта каб хату памятаў. І места тое, дзе дзіцятка было, не выкідала маці.

Ну, а патом, праз тыдзень ці два, як народзіцца, ужэ хрысціць. Склікаюць усіх на радзіны, кумоў клічуць, бабу. Тады ўжэ бярэ баба тая дзіцятка на рукі, як выбіраюцца хрысціць, і адсоўвае стол і за сталом ужэ ходзіць, носіць тое дзіцятка на руках і кажа, як абыдзе раз стол кругом і кажа:

– Бацьке раджоныя і хрышчоныя, дзядэ і бабы, выпраўляем к Хрысту, каб прыждаць выпраўляці к вянцу.

І так тры разы абыходзіць і гаворыць. Тады ўжо вязуць тое дзіця да цэркві хрысціць. Кума трымае, а кум ужо павінен казаць «Верую». А як не ўмеў, дык бацюшка злаваўся вельма. Імя ж бацюшка сам дае. От нельга толькі, як які няўдалы ёсць у сяле, дык нельга такое імя даваць.

А як дзеці ў сям'і паміраюць, дык маці тады год дзіцю не шые і не купляе. Усё хрышчоныя прыносяць: і пялёнкі, і сарочкі – усё.

Ну, пахрысцяць, а тады ўжо едуць дахаты ды гуляюць. Тады на трэці дзень, узаўтра та ня йдзе, на трэці дзень зноў баба ідзе, нясе ўжэ пачастункі. Бабі падарак дадуць. Ставяць ужо на стол тарэлку і кідаюць грошы, хто сколька можа. Баба ўжэ бярэ тую тарэлку з грашыма, ставіць на голаву і танцуе, круціцца па хаці, ужэ рада. А тады, катора баба бедна, дык забярэ тыя грошы, а катора і не брала, возьме які рубель, тады астатняе маці дзіцятка аддасць.

Потым садзяць бабу на санкі ды зробяць гэтую, бабу абкруцяць абы-як, бяруць мяцёлку гэткую во, венік, насадзяць на дубчыну і на воз пасадуць, і ўжо па сяле з песнямі едуць, пяюць. А ў сушні бабы лён цэрлі. Заехалі ў сушню, навезлі гарэлкі, закускі, частавалі тых бабаў, тыя бабы ўжо танцавалі. Потым зноў на вазэ паселі і паехалі па дзярэўні. Дзе людзі стаяць, там патанцуюць.

*Запісана ў в. Асмолава*
*ад Лютко Ганны Піліпаўны, 1922 г.н.,*
*праваслаўнай,*
*студэнткай БДПУ імя М. Танка Лютко А.У.*

*– Ой, ці чула мая мамка,*
*Як я ў цябе была.*
*Пад тваім жа акошачкам,*
*Як галубка выла.*

*– Каб я чула, дзіця маё,*
*То я б адчыніла.*
*Дала б табе піці, есці,*
*Чаго б ты хацела.*

*Дала б табе піці, есці,*
*Чаго б ты хацела.*
*Сама б села ў канцы стала*
*Да й пагаварыла:*

*– Ой, чаго ты, дзіця маё,*
*Тако старо стало.*
*Ці ты сынэ пажаніла.*
*Дочкі паддавала.*

*– Ой, я сыноў ні жаніла.*
*Дачок ні аддавала.*
*Ой, за ліхім, мамка, мужам*
*Така стара стала.*

*Ой, завяжы, мая мамка,*
*Чорны плат па вочы.*
*Вязі мяне, утапі мяне*
*Проці цёмнай ночы.*

*Ні давай жа, мая мамка,*
*Моцненько й гукаці,*
*Як учуюць суседачкі,*
*Прыйдуць ратаваці.*

*Запісана ў в. Казлы*
*ад Пакіда Сцепаніды Фамінічны*
*Лесінай Л.М. (1976 г.)*

*Кум куму любіў,*
*Па саду вадзіў.*
*Чаму ж мне куму*
*Ды не любіці,*
*Чаму ж па саду*
*Ды не вадзіці.*

*А ў кумы каралі,*
*Сто рублёў аддалі.*
*Чаму ж мне куму*
*Ды не любіці,*
*Чаму ж па саду*
*Ды й не вадзіці.*

*А ў кума боты*
*Добрае работы.*
*Чаму ж мне кумочка*
*Ды й не любіці,*
*Чаму ж па саду*
*З ім не гуляці.*

*А ў кумы шнуроўка,*
*Аддадзена кароўка.*
*Чаму ж мне куму*
*Ды не любіці,*
*Чаму ж па саду*
*Ды й не вадзіці.*

*А ў кума кафтан*
*Вельмі добра ткан.*
*Чаму ж мне кумочка*
*Ды й не любіці,*
*Чаму ж па саду*
*З ім не гуляці.*

*А ў кумы хвартух,*
*Аддадзены пятух.*
*Чаму ж мне куму*
*Ды не любіці,*
*Чаму ж па саду*
*Ды й не вадзіці.*

*А ў кума штаны*
*Не маюць штаны.*
*Чаму ж мне кумочка*
*Ды й не любіці,*
*Чаму ж па саду*
*З ім не гуляці.*

*А ў кумы сцягно*
*Сто паноў лягло.*
*Чаму ж мне куму*
*Ды не любіці,*

*Чаму ж па саду*
*Ды й не вадзіці.*

*Запісана ў в. Грускова*
*ад Радаман Людмілы Мікалаеўны, 1935 г.н.,*
*Грабёнка А.М. (1995 г.)*

*На стале каша стаяла.*
*Залатога кума ждала.*
*Ой, куманёк, куды ж ты пайшоў,*
*Чаму ж ты да нас не зайшоў?*

*Ой, ты, кумачка-пане,*
*У цябе ў роце кол скора стане.*
*Ўсадзі руку ў кішэню,*
*Вымі грошыкаў жменю.*

***
*Пасаджу я хвасоліну*
*І пайду дадому,*
*А мой мілы мужынёк*
*П'е ў карчме з кумою.*

*– Ой, нядобра вельмі робіш,*
*Мой міленькі, любы,*
*Як дзень так і ноч*
*З кумою п'янюсенькі ходзіш.*

*– Мой ты мілы, чарнабрывы,*
*Годзе сёння піці.*
*Ой, хадзема ж дадоманьку*
*Вячэрку варыці.*

*– Мая мілая жоначка.*
*Яшчэ вазьму кварту.*
*Кума ж мая прыгожая*
*Яшчэ болей варта.*

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Мялешка Фаіны Пятроўны*
*Зяньковіч Я.І. (1967 г.)*



## ПАХАВАЛЬНАЯ АБРАДНАСЦЬ

Калі памірае чалавек, яму даюць грамнічную свечку, каб памёр з Богам. Падвязваюць бараду. Перад смерцю прашчаецца з блізкімі, прычашчае свяшчэннік. Пакойніка мыюць мужчыны. Апраналі ва ўсё новае. На смерць у труну кладуць шапку.

Калі чалавек паміраў, то яго абмывалі. Майго мужа абмываць прыходзілі стрыечныя браты. Калі ўжо абмыюць, апранаюць ва ўсё чорнае. Падушку ў труну напіхалі сенам, пер'ем нельга было напіхваць. У праваслаўных пакрывала ў труну было зроблена з тулю, і ім можна было накрываць нябожчыка. У нас жа, у каталікаў, пакрывалам нельга было накрываць. Падушку для нябожчыка шылі з паркалю. Хавалі нябожчыка праз тры дні. Яму для нябожчыка нельга было выкопваць раней, а толькі ў той дзень, калі яго хавалі. Калі незнарок яму выкопвалі раней, то ў яе трэба было наліць вады, каб яна не была пустой. Бо гэта лічылася дрэннай прыкметай.

Калі выносілі нябожчыка з хаты, то дарогу пасыпалі зялёнымі елкамі. Лічылася, што калі зрабіць гэта, то нябожчыку будзе дарога на тым свеце. Была яшчэ прыкмета: калі каля хаты стаяла прыгожая бяроза, а потым ссохла, то ў гэтай хаце таксама нехта ссохне, значыць, памрэ. Расказваюць, што калі на хаванне вялікая завея, то над ямаю нябожчыка нельга маліцца. Трэба занесці труну ў капліцу і там маліцца. Яму выкопвалі мужчыны. Труну ў яму апускалі на палатне. Калі труну ўжо апусцілі, то да ямы падыходзіць бацюшка і лапатаю тры разы зямлі кіне на труну, а потым свянцонай вадой пасвянцае. Пасля гэтага па горстцы зямлі кідалі на труну спачатку тыя, хто яе апускаў, а потым ужо родныя.

Папярэдне, яшчэ ў хаце, труну ставілі на пакрывала, якое бралася загадзя ў царкве.

*Запісана ў в. Макашы*
*ад Буко Алены Міхайлаўны, 1927 г.н.,*
*студэнтамі БДПУ імя М. Танка Філіпчук В.,*
*Арлоўскай В.*







## КАЗКІ, ЛЕГЕНДЫ І ПАДАННІ

***з фондаў Фальклорнай калекцыі аддзела фалькларыстыкі і культуры славянскіх народаў Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы НАН Беларусі***

### Пра Івана-царэвіча і дванаццацігаловага змея

Жыў-быў цар з царыцаю. Жылі яны ў згодзе і багацці. І вот на свеце стала суш. Цар сабраўся і паехаў шукаць вады. Выехаў цар на лепшых сваіх конях, многа праехаў цар, стаміліся і коні, а вады нідзе не відно. Пад'язджае цар да пушчы і бачыць – стаіць калодзеж. Абрадаваўся цар калодзежу і нагінаецца напіцца вады. Вада стаіць у самым версе калодзежа, але калі цар нагнецца – вада апускаецца да сярэдзіны. Так паўтаралася некалькі разоў. Зусім аслабеў цар без вады і гаворыць:

– Што за чорт сядзіць у калодзежы? Як толькі нагнуся напіцца – вада адступае да сярэдзіны.

У гэты час раздаецца голас з калодзежа:

– Цар Іван, я вам дам ваду, але распішыцеся сваёю собственнаю кроўю за тое, што ў вас німа дома.

Думаў, думаў цар і адказвае:

– Усё ў мяне ёсць: землі, людзі, багацце.

Разрэзаў цар палец і распісаўся сваёю кроўю, затым напіўся сам і напаіў сваіх коней. Завярнуўся цар і паехаў дамоў, прывёз вады, а ў цара нарадзіўся сын. Ахнуў цар:

– Вось на каго я распісаўся сваёю крывёю, на свайго роднага сына.

Пагараваў цар і скора забыўся аб гэтым. Ездзіць цар на ахоту, а сын расце не па часах, а па мінутах.

Паехаў аднойчы цар на ахоту ў лес, і тут раздаўся голас:

– Цар-царэвіч, калі вы прывязеце доўг?

Цар падумаў, што яму пачудзілася, ён жа забыўся, што распісаўся сваёй крывёю. Другі раз цар ізноў падумаў, што пачудзілася, аднак на трэці раз голас сказаў:

– Іван-царэвіч, калі свайго доўга не аддадзіце, наш меч – ваша галава з плеч.

Цар пытае, які за ім доўг, а голас адказвае:

– Помніце, у пушчы ля калодзежа вы распісаліся сваёю собственнай крывёю за тое, чаго ў вас не было?

Вярнуўся цар засмучаны, абняў сына і стаў плакаць:

– Дарагі мой сын. Калі была суш, я шукаў ваду і падпісаўся сваёю крывёю на цябе, а цябе не было на свеце. Ты павінен з'явіцца к калодзежу ў пушчы.

Доўга плакалі цар і царыца. Сабралі сыну адзежу, харчы ў дарогу, і пайшоў царэвіч з царом у лес. Папрашчаўся царэвіч з царом, цар вярнуўся, а царэвіч рушыў далей у пушчу. Падходзіць царэвіч к невялікаму возеру ў пушчы, у гэты час прылятаюць к возеру дванаццаць качак, ударыліся аб зямлю і сталі прыгажунямі-дзяўчатамі. Раздзеліся яны і пачалі купацца ў возеры, а царэвіч прыхітрыўся і ўкраў у адной дзяўчыны ўсю адзёжу. Пакупаліся дзяўчаты, выйшлі з возера, ператварыліся ў качак і паляцелі, адна стаіць без адзёжы і просіць царэвіча:

– Аддай, царэвіч, маю адзёжу.

– Не, не аддам, – адказвае царэвіч.

– Аддай, я знаю, куды ты ідзеш, ты ідзеш к майму бацьку, дванаццацігаловаму змею. Аддай, я навучу, як падыйсці да бацькі. Як будзеш ісці, трэба ісці на каленях, ён будзе крычаць: «Уставай, мой меч – твая галава з плеч». Но ты не падымайся, і так ты застанешся жывым.

Пад'язджае царэвіч к палацу дванаццацігаловага змея і ўпаў на калені. А змей крычыць:

– Уставай, брадзяга! Уставай, сукін сын!

Але царэвіч не падняўся і так дайшоў да змея.

– Маладзец, – пахваліў царэвіча змей, і адразу аддае загад замкнуць царэвіча за жалезныя рашоткі.

Сумны сядзіць царэвіч, успамінае бацьку, маці, а тут у дванаццаць гадзін прыносіць слуга задачу, якую загадаў змей (зрабіць царэвічу за ноч). Задача была такая, каб за ноч пабудаваў хрустальны мост, і калі змей будзе ісці па хрустальнаму масту, каб абапал цвілі сады, а калі будзе варочацца назад, каб мог яблыкі сарваць. Сядзіць царэвіч сумны, а ў гэты час у адкрытае акно ўлятае качка і ператвараецца ў прыгажуню.

– Чаго плачаш, сумуеш, царэвіч? – пытае прыгажуня.

– А як жа не гараваць, загадаў бацька збудаваць хрустальны мост, і калі будзе ісці, каб абапал цвілі сады, а калі будзе варочацца, каб мог нарваць яблык.

Прачнуўся змей і бачыць – стаіць хрустальны мост, а абапал яго цвітуць сады. Пахваліў змей царэвіча, загадаў напаіць, накарміць і зноў пасадзіць за рашотку.

У дванаццаць гадзін з'яўляецца слуга і перадае загад змея:

– Заўтра будуць выстраены ўсе дванаццаць змеевых дачок, і царэвіч павінен адгадаць, дзе самая малодшая дачка змея.

Перадаў загад слуга і пайшоў, а ў гэты час у адкрытае акно ўлятае качка і ператвараецца ў прыгажуню:

– Чаго сумуеш, Іван-царэвіч?

– А як мне не сумаваць, загадаў бацька заўтра адгадаць, хто із вас дванаццаці самая малодшая.

– Я самая малодшая, і дам табе знак на ліцэ. Пройдзеш адзін раз, другі, а на трэці я пушчу чырвонае пятно на шчацэ. Вот так ты мяне пазнаеш, – адказала прыгажуня.

Назаўтра выводзяць царэвіча, а перад ім стаяць дванаццаць прыгажунь, усе адзінакавага роста, твар у твар, волас у волас. Паглядзеў царэвіч і думае: «Каторая ж із іх малодшая?» Прайшоў ён раз перад імі, прайшоў другі, а на трэці раз убачыў на твары ў адной чырвонае пятно. Узяў ён яе за руку і падвёў к змею і гаворыць:

– Вось твая малодшая дачка.

Пахваліў змей царэвіча, а сам думае, як гэта царэвіч так добра выконвае ўсе загады. І прыдумаў трэцюю задачу, каб зрабіў царэвіч яму боты з пяску. Яшчэ горш засумаваў царэвіч, як гэта зрабіць боты з пяску. Прылятае качка, ператвараецца ў дзяўчыну і пытае, якую загадаў бацька задачу.

– Загадаў бацька зрабіць яму боты з пяску.

Думала, думала дзяўчына і адказвае:

– Не, Іван-царэвіч, гэтага я не магу зрабіць. Трэба нам уцякаць. Пойдзем у хлеў, возьмем лепшага каня і будзем уцякаць.

Насыпалі яны пяску ў хатцы царэвіча, і плюнула тры разы дзяўчына на пясок, а самі сабраліся і адправіліся ўцякаць.

Рана ўтрам прыходзіць слуга клікаць царэвіча, ато ён не выходзіць выконваць загад змея, чаго не было раней. Паклікаў слуга, а слюна адказвае: «Падымаюся!» Пачакаў слуга і кліча другі раз, а слюна адказвае: «Адзяваюся». Чакаў, чакаў слуга, а царэвіч не выходзіць. Паклікаў ён трэці раз, а слюна пачала высыхаць і ціха шэпча: «Умываюся». Пайшоў слуга да змея і гаворыць:

– Не выходзіць царэвіч і адказвае ледзь чутна.

Загадвае змей зламаць дзверы ў хаціну царэвіча, а яго там няма. Ідзе змей к дочкам, а там няма малодшае. Здагадаўся змей і кажа:

– Вот хто выконваў усе мае загады. І загадаў слугам даганяць уцекачоў.

Уцякае Іван-царэвіч з дачкою змея, і дачка прыклала вуха да зямлі і гаворыць:

– Нас даганяюць. Я стану лесам, а ты будзеш лесніком.

У гэты час пад'язджаюць слугі змея і пытаюць:

– Не праязджалі тут двое, дзяўчына з хлопцам?

– Не, не праязджалі, – адказвае ляснік.

Завярнуліся слугі, прыязджаюць к змею і гавораць, што толькі на іх шляху быў лес і там быў ляснік.

– Ах, вы нягоднікі, трэба было браць лесніка – лес ішоў бы за вамі. Даганяйце і бярыце іх, – загадвае змей.

І зноў слугі змея даганяюць царэвіча з дачкою змея. Едуць, едуць царэвіч з дачкою, а яна і гаворыць:

– Паслухаю я, ці гоняцца за намі.

Прылажыла яна вуха да зямлі і чуе тупат коней. Дзяўчына гаворыць:

– Я стану калодзежам, а ты будзеш паіць кароў.

Толькі ўспела яна стаць калодзежам, а царэвіч вадапоем, пад'язджаюць слугі змея і пытаюць, ці не праязджалі двое – дзяўчына і хлопец.

– Не, не праязджалі, я тут стаю цэлы дзень, але ніхто не праходзіў і не праязджаў, – адказаў царэвіч. Ні з чым вярнуліся і на гэты раз слугі змея і гавораць, што пыталі ў вадапоя, а ён за цэлы дзень не бачыў ні праезджых, ні пешаходаў.

– Ах, вы, аслы, трэба было браць вадапоя, а калодзеж і каровы ішлі б за ім. Добра, я сам паеду даганяць.

Уцякаюць царэвіч з дзяўчынай, а іх даганяе бацька-змей.





– Паслухаю я, ці не гоняцца за намі, – гаворыць дзяўчына. Прылажыла вуха да зямлі і закрычала:

– Нас даганяе сам бацька. Я стану цэркаўю, а ты будзеш паліць свечкі.

Толькі яны ўспелі ператварыцца: яна ў цэркаў, ён – старастай, пад'язджае змей да цэрквы, а ўзяць не можа.

– Дагадалася, што зрабіць. Знаеш, што я не магу ўзяць цэркаў, што я нячысты дух. Будзь ты праклята, – сказаў змей, завярнуўся і паехаў назад, а цэркаў яшчэ стаяла цэлыя суткі, баяліся, каб не даганялі іх больш. Цераз суткі ператварыліся яны ў людзей і паехалі далей.

Пад'язджаюць к невялікаму царству і царэвіч гаворыць, што недалёка і іх царства. Царэвіч гаворыць, што ёсць у гэтым царстве яго знаёмая царэўна, з якой ён дружыў да таго, як паехаў к змею. Засумавала дзяўчына і гаворыць:

– Я табе жыццё выратавала, адраклася ад бацькі, а ты прыехаў у сваё царства і пакідаеш мяне. Ты забудзеш мяне.

– Не, не забуду, – адказаў царэвіч.

– Добра, як будзеш цалавацца ў доме, не цалуй малое дзіця, інакш ты забудзеш мяне, – гаворыць дзяўчына.

Пайшоў царэвіч, а дзяўчыну пакінуў адну. Зайшоў у дом, пачаў вітацца і пацалаваў малое дзіця, і ў той жа час забыўся аб дачцэ змея.

– Ах, якая я няшчасная, адна ў чужой старане, – і ў той жа час ператварылася ў белую розу і села пры дарозе, па якой хадзіў дзядок у царства бацькі Івана-царэвіча на работу.

А царэвіч вярнуўся ў сваё царства цэлы, жывы, усе былі рады і пачалі рыхтавацца да вяселля царэвіча. Аднойчы дзядок варочаўся з работы і ўбачыў белую розу. Хацеў яе зламаць, але не змог, тады вырваў з коранем і пасадзіў яе дома. Як стала расці кветка ў хаце, устане дзядок, а рана ўсё ў яго ёсць у хаце – і есці, і піць. Здзівіўся дзед і расказаў на рабоце аб чароўнай кветцы. І вось навучылі дзеда прасачыць, хто ж прыносіць яму есці і піць. Паставіў ён свечкі і накрыў макатром, а ў поўнач, калі ўбачыў, што да стала рухаецца талерка, хуценька адкрыў і здзівіўся – перад ім стаяла прыгажуня-дзяўчына.

– Эх, дзед, што ты нарабіў. Я б даглядзела цябе да смерці, а цяпер не знаю, што мне рабіць.

Пагаравала дзяўчына, а затым пытае, што чутно ў царстве. Дзядок адказаў, што ўсе рыхтуюцца да вяселля царэвіча, і цар загадаў спячы ўсім караваі, але дзе я бядняк спяку каравай.

– Не гаруй, дзядок. Я спяку каравай, а ты аднясеш на вяселле.

– Добра, калі прымуць, – адказаў дзед.

– Прымуць, я спяку харошы каравай.

Спякла дзяўчына каравай, а сама ператварылася ў галубку і села ў сярэдзіну каравая. Назаўтра рана ўзяў дзед каравай і панёс на вяселле. Усе ўдзівіліся, што бядняк прынёс такі каравай, а цар прыняў яго першым і пачаў рэзаць. Калі цар разрэзаў напалавіну, адтуль вылецела галубка, стукнулася аб зямлю і стала прыгажуняю. Усе былі здзіўлены яе красатою. Стала прыгажуня перад царэвічам і кажа:

– Эх, Іван-царэвіч, я табе жыццё выратавала, а ты пакінуў мяне адну ў чыстым полі.

Не даў болей гаварыць царэвіч прыгажуні, выскачыў із-за стала, абняў яе і расказаў бацькам і гасцям, што прыйшлося яму пераажыць і што прыгажуня яму дапамагала і выратавала жыццё. Нявесту царэвіча адправілі, а Іван-царэвіч стаў жыць з дачкою змея.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Кендрык Паўліны Іванаўны, 1887 г.н.,*
*Шынгель І.А. (1967 г.)*

## І так дрэнна, і гэтак дрэнна

Была ў батрака Івана прыгожая і добрая жонка Алёна. Яны кахалі адзін аднаго, але тут гэтая Алёна спадабалася пану. Ён яе сілай прымусіў жыць з ім. Іван даведаўся аб гэтым, але што можа асіліць бедны батрак супраць магутнага багатага пана, куды пойдзе скардзіцца?

Пан загадаў Івану месці дарогу перад яго ганкам. Мяце Іван і прыгаварвае:

– І так дрэнна, і гэтак дрэнна.

Пачула гэта пані, пытае, чаму гэта яму і так дрэнна, і гэтак дрэнна. Адказвае Іван:

– Паненачка, пан ходзіць да мае жонкі – дрэнна; выгнаць пана – ён са свету зжыве – таксама дрэнна.

Як пачула гэта пані, як угневалася і кажа Івану:

– Пан ходзіць да твае жонкі, а ты хадзі да мяне.

Так яна вырашыла адпомсціць нягодніку-мужу.

Пачаў Іван хадзіць да пані. Аднойчы мяце ён пад ганкам і прыгаварвае:

– І так добра, і гэтак добра.

Пачуў пан і пытае, чаму гэта яго беднаму батраку можа стацца добра. Іван адказвае:

– Паночку, пан ходзіць да мае жонкі, а я да панавай.

Як пачуў гэта пан, як угневаўся і загадаў:

– Даць хлопцу сто бізуноў, яму і яго жонцы.

Вось і выходзіць урэшце, што бедняку і так дрэнна, і гэтак дрэнна.

*Запісана ў в. Лявонавічы*
*ад Вараненкі М.В., 1900 г.н.*
*Лушчыцкай І.І. (1960 г.)*

## Як мужык жонку вылечыў

Ажаніўся хлопец. Узяў ён сабе дзеўку, за якою ён даўно ўхажываў. Калі яна стала бабаю, то стала вялікім пестуном. А пасля гэта яна прытваралася, што вельмі хвора. Ён печ паліў і есці варыў, а яна ўсё ляжыць хвора, усё ойкае і ойкае. Калі ён дзе выйдзе, ці выедзе, яна злезе з пасцелі, наварыць сабе есці і на печ залезе. А суседзі прыпільнавалі і яму сказалі, што яна так робіць… Ён на другі дзень ёй і кажа:

– Бабо, паедзем да дохтара.

Яна кажа:

– Чаго ж я паеду?

– Но то ты хвора, паедзеш лячыцца.

Яна супраціўлялася, але пасля селі і паехалі. Заехалі да дохтара, а яна стогне, што не можа ўстаць нават з воза: ой-ой! Ён пайшоў да дохтара і сказаў, што ў яго надта баба слабая. То доктар кажа:

– Вядзі скарэй сюды.

Яшчэ й дзверы адчыніў. І паслухаў яе, адправіў бабу, а мужыку сказаў так:

– Я табе прыпішу пілюляў.

– А якіх?

– Плюнь у руку, каб добрэ кулак зажаўся, і ёй тры разы ў шыю дай.

Мужык не сказаў аб гэтым жонцы. Прыехалі дадому, пераначавалі. Устаў мужык рана, наварыў снедаць і кажа:

– Уставай, жонка, ідзі да стала есці.

А яна й кажа:

– То дай жа мне пілюляў.

Ён кажа:

– Хадзі, дам.

Плюнуў у кулак і два разы стукнуў з усёй сілы ў плечы. Яна завойкала, застагнала. Ён хацеў яшчэ раз стукнуць, але яна закрычала:

– Ой, ой, я ўжо вылечылася і ад двох, трэцяй мне не трэба.

І пайшла ўпраўляцца. З гэтых пор яны сталі жыць у згодзе, бо жонка больш ужо не хварэла.

*Запісана ў в. Гусакі*
*ад Галяка Мікалая Макаравіча*
*(раней пражываў у в. Крывец Беластоцкага ваяводства), Чыгрын І.П. (1960 г.)*

## Прыгоды купцовай дачкі

Жыў купец, і была ў яго дачка. Яна была красівая. І вот, з купцом дружыў поп. І ўсё ўрэмя ўсё хадзіў да іх. Адзін раз прышоў, нікога не было дома. Адна была дачка. Поп захацеў з гэтай дачкой купцовай палюбіцца. Дачка была з гэтым не сагласна. Гаворыць на папа:

– Бацюшка, усё-такі нам стыдна. Вы мой ацец. Ну, раз гэтака дзела, хадзем у баню. Хадзем мы яшчэ памыемся.

Ну, поп гэта сагласіўся. Пашлі яны ў баню. Яна ўзяла, хацела яму голаў памыць, да кіпятком на голаў – і ашпарыла. Ну, ён нарабіў крыку і ўцёк. Вот яна ўжо жыве, поп к ім не йдзе, поп у бальніцы, усе валасы на ім аблезлі. Пачуў гэта купец. Што-та бацюшка к нам не пашоў. Потым гаворыць: «Ён у бальніцы». Пашоў купец яго навясціць, гаворыць:

– Ты ўжо даўно ў нас не быў. Я ўжо думаю, што гэта такое, ці забалеў.

А яму ж было стыдна сказаць. Так гаворыць:

– Я к вам ужо больш не пайду, бо твая дачка родная, а мая яна хрэсная. І вот яна займаецца з радавымі салдатамі. І мне стыдна хадзіць проста да вас.

Купцу гэта было нехараша слухаць. Прышоў дадому, а ў іх быў сын. Купец гаворыць на свайго сына:

– Завязі ты маю дачку, а сваю сястру, завязі ў лес і застрэль. І здымі плацце з яе і каб я бачыў, што яно прастрэлена і ў крыві.

Сын той павёў сястру сваю. Ён яе жалеў.





Зайшлі ў горад, купіў ёй плацця другоя. І гаворыць:

– Ты, сястра, надзень гэта плацце і ідзі дзе ў свет.

А ён застрэліў голуба дзікага і прастрэліў плацця і кроўю папырскаў. Занёс, атцу паказаў. «Ну, усё, – ацец думае, – яе няма ўжо на свеце».

Яна хадзіла доўгае ўрэмя па лесе. Хадзіў там адзін ахотнік, тожа купцоў сын, але ж далёка жыве ад іх. Ну, устрэўся з ёй і ў яе ўлюбіўся. І забраў яе дадому. Прышоў дадому, сваім бацьком прэдлажыў, што гэта будзе мая жана. Ну, яны разрашылі. Яны ўжо жывуць. Таго ўжэ яе мужа матка была такая красівая, што кажды год ездзілі на прасмотры, хто харошчы. І яна палучала прэміі. Паехала і нявестка разам з ёй. Так ужэ нявестка палучыла прэмію, што яна красівейша. Эта матцы не панравілась. Яна ўжо будта бы захварэла. І гаворыць свайму мужу:

– Я не ад чога не буду. Ніякія лякарствы мне не памогуць. Толькі зарэзаць нявестку і напіцца крыві, яе сэрца з'есці.

Бацька сказаў сыну. Сын ні мог бацьку папроціць, кажа:

– Я сыйду з дому. Рабіця, што хочаце.

Яны гэто сказалі слугам. Стары бацька купец ад'язджае з дому, слугам прыказаў, каб зарэзалі і далі старой пані лячыцца крыві, і каб зварылі сэрца. Слугі яе шкадавалі, сказалі:

– Ты йдзі дзе ў свет, каб цябе ніхто не бачыў і дзе-нібудзь жыві. А зробім, паддзелаем.

Яны ўзялі зарэзалі сабаку, далі ёй напіцца крыві і зварылі сэрца ёй. А тое ўсё пахаранілі. Прыехаў купец, яны паказалі тое месца, дзе пахаронена. Ну, тая адышла ўжо матка, жывуць яны. А тая ўжэ дзеўчына, німа ж ўжо ёй дзе дзецца, яна пайшла ў горад, зайшла ў парыхмасцерскую. Пастрыглася пад мальчыка, купіла сабе мужчынскі касцюм. Адзелася і ходзіць па горадзе. Прачытала там у адном месце, што трэбуецца, хто харошы повар. Адзін купец трэбуе сабе. Яна пайшла да таго купца, гаворыць:

– Вам трэба харошага повара?

– Трэба.

– Ну, вот я магу быць.

– Ну, аставайся.

Жыве там як бы хлопцам. Ну, яна ўмела харашо ўсё варыць. Ужэ купцу гэта вельмі панаравілася. Ён гаворыць адзін раз:

– Прыбяры ўсё, каб быў харошы стол. Я сазаву гасцей, пахвалюся сваім усім гасцям, што ў мяне ёсць харошы повар.

Вось тая ўжо прыбрала ўсё хораша, накрыла стол. Сазваў ён усіх у госці. Госці папрыязджалі, прыехаў яе родны бацька з маткай, прыехала свякроў з бацькам, яе муж і той поп. Яна ўсіх іх пазнала, а яны яе не пазналі. Праўда, ім усім панаравілася, што яна хораша прыбрала. Хваляць ужо:

– Які ў цябе ўжо повар, то ўжо лепшага не трэба.

Той гаворыць з імі… Яна гаворыць:

– Я ўсім вам магу расказаць харошую казку. Гэта была тоная праўда.

Ну, усе ўжо на яе:

– Ну, раскажы.

– Раскажу, але з гэтакім дагаворам: хто мне будзе мяшаць, той прама галоў з плеч.

Ну, усе паабяшчалі:

– Усе будзем маўчаць, раскажы казку.

Яна давай ім пра ўсё гэта гаварыць. Кажа:

– Была ў аднаго купца дачка. Вот да іх хадзіў поп, дружыў з купцом. Адзін раз прыйшоў, была адна дачка дома. Ён хацеў яе знасілаваць. Дачка яго нејак ад гэтага адгаварыла: «Давай перад гэтым у бані пабудзем». І яна ашпарыла яго голаў.

А папу гэта не панравілася. Бачаць, што ён жа без валасоў. Дак ён кажа:

– Перастань гэту казку.

Ага, ён загаварыў, трэба голаў здымаць. Яна сама, сваёй рукой зняла яму голаў з шапкай. Ну, пытаецца:

– Прадаўжаць далей казку? А яшчэ хто будзе мне пярэчыць, то кажа .. яшчэ думаю прывязаць да кабылінага хваста, хто мне пярэчыць.

Ну, усе гавораць:

– Ніхто табе пярэчыць не будзе.

Вот яна гаворыць:

– Пайшла тая… Той брат завёў сваю дачку ў лес, за гэта хацеў застрэліць. Але не застрэліў, пусціў яе жывую. Адзін купцоў сын хадзіў па лесе па ахоце і з ёю сустрэўся. Узяў яе сабе ў жонкі. Вот там была яе ўжо свякроў, была красівая. Ездзілі яны на прасмотры, і яна палучала прэміі. Паехалі ўжо яны ўдзвёх, тая нявестка палучыла. Так тая тады будта бы

стала хворая і загадала свайму муж зарэзаць нявестку, напіцца крыві і з'есці сэрца. Ну, ён разрашыў, сказаў ужо слугам, каб гэтак і зрабілі. Слугі яе шкадавалі, выпусцілі яе, а зарэзалі сабаку і далі ёй крыві напіцца.

А тая матка падумала, што яна гэтак піла. Гаворыць:

– Перастань гэту казку!

Ага, яна памяняла – усё. Прывязалі яе да кабылінага хваста і пусцілі кабылу, яна яе забіла. А яна тады гаворыць:

– Цяпер буду канчаць казку. Вось той дзеўчыне не было ўжо дзе дзецца. Ад дзвёх смерцяў уцякла. Яна пайшла ў горад, купіла сабе мужчынскі касцюм і ўстроілася за повара. І тады зняла шапку і раздзелася і кажа:

– Вот гэта яна і ёсць.

А тады яе родны бацька абняў і пацалаваў. І муж там быў, і астаўся з ёй жыць. І жывуць у сям'і.

*Запісана ў в. Казлы*
*ад Гукалы Фаіны Паўлаўны, 1914 г.н.,*
*Барташэвіч Г.А. (1976 г.)*

### Разумны мужык

Жылі-былі сабе ў адной вёсцы два мужыкі. Дык вось адзін быў ужо ж вельмі багаты, а другі зусім бедны, адно было дзяцей багата прыбагата, ды адзін гусь. Ну й, дажыўся гэты мужык, што ня стала чым дзяцей нават карміць. Ну, і давай ён думаць аб том, чым сваю дзетвару накарміць. Ды і закамандаваў ён сваёй хазяйцы гуся апошняга зажарыць. Вот гусь ужо быў гатовы, і яго паставілі на стол, але хлеба ў яго ні было ні крошкі. Дык тады мужык кажа сваёй жонцы:

– Занясу гэтага я гуся пану, можа хлеба хоць чуць выручу.

Вось прыйшоў мужык к багатаму ды й кажа:

– Прынёс я табе, пане, гуся, але ты мне дай за гэта хоць паўмяшка мукі, бо няма чым дзетвару карміць.

А ў таго барына было 6 чалавек сям'і. Дык ён і кажа мужыку:

– Калі ты сумееш раздзяліць паміж маёй сям'ёй без абіды, тады цябе награжу, а не – тады галаву зрублю.

Ну, прыносяць таго гуся мужыку і пачаў ён дзяліць паміж панскай сям'ёй. Ну, мужык адрэзаў зразу галаву і падае пану:

– Гэта табе, пане, бо ты дома галава.

Пані ён адрэзаў гузку, каб яна дома сядзела і за панам глядзела; панічам мужык даў лапы ад гуся, каб яны тапталі бацькавы дарожкі; ну, а паненачкам даў па крыльцу, каб яны ляцелі ў свет і не мяшалі сваім бацькам ды братам. А ўсё астальное ўсё забраў сабе, бо яму ж трэба дзяцей сваіх карміць. Пан абрадаваўся, што мужык хоць адзін папаўся разумны, наліў яму чарку гарэлкі і вялеў даць яму два мяшкі мукі. Палучыў мужык муку, зарадаваўся ды і паехаў дадому карміць сваё сямейства. І з той пары яны сталі жыць-пажываць дый дабра нажываць.

### Хітры мужык

Жыў-быў на свеці мужык. А была ў гэтага ж мужыка вельмі дурная баба. Вось аднаго разу закалолі яны на пудоў 15 свінню, налажылі 4 кублы сала дый сталі вясну-красну ждаці. Але аднаго разу мужыку трэба было ехаць за дровамі ў лес, дык ён і гаворыць сваёй бабе:

– Ты ж глядзі, баба, сала нікому ні давай, бо прыдзе вясна-красна і ўсё забярэ.

– Добра, дзедка, не аддам, буду вясну-красну чакаць.

Вось паехаў дзед у лес, а баба чакае яго дзень, чакае другі, а на трэці прыходзіць да бабы салдат дый кажа:

– Я чуў, бабка, што вясну-красну чакаеш, што ў цябе сала вельмі многа.

Дык баба і адказвае:

– Так, служывенькі, я чакаю вясну-красну, у мяне многа сала, але ж і праўду казаў мой дзед, што прыдзе вясна-красна і забярэ сала, мяса і калбасу.

Узваліла яна салдату ўсё на плечы, ну, той і пайшоў. Вось прыязжае дзед із лесу, а баба і кажа:

– Ну, й праўду ты ж казаў, дзядок, што прыйдзе вясна-красна і сала, мяса, калбасу зябрэ. Ды іна ж ужой была і ўсё ж забрала.

Пачухаў дзед патыліцу дый кажа:

– Ну, й дурная ж ты, баба. Гэта ж быў салдат, і ён цябе абмануў. Вясна-красна будзе тады, як будзем рабіці ўсё, як будем касіць, жаць, малаціць. А ты, дура, салдату паверыла. Ну, як найду гэткую дурную як ты, то прыйду да цябе жыць, а як не – то жыві сабе адна.

І пайшоў дзед у свет шукаць дурной, як яго была баба. Вось ідзе ён, ідзе, і прыйшоў ён у якісьці панскі двор. А ў тым двары хадзіла вельмі харошая свіння з парасятамі. Дык той дзед сняў шапку ды давай кланяцца перад той свіннёй. А тым часам ўбачыла гэта пані, ды пытаецца ў сваёй слугі:

– І чаго гэты чалавек хоча ад маёй свінкі?

Пайшоў слуга ўзнаваць у таго мужыка, што ён хоча ад панскай свінні, а той і кажа:

– Гэта ж мая свіння прыглашала панскую ў госці.

Ды зноў пакланіўся панскай свінне. Перадаў слуга пані ў чом дзела, тая абрадавалася ды прыказала свінню ў госці. Звалілі панскія слугі мужыку на воз свінню з парасятамі, ды той мужык і паехаў. Але неўзабаве вярнуўся пан з ахоты, а пані яму пахвалілася, што мужык іх свінню ў госці забраў. Раззлаваўся пан, пачаў моцна крычаць, ды кулакамі стукаць:

– Які ж гэта дурань свінню ў госці запрашае. Гэта ж, – кажа, – абманулі цябе.

Паехаў пан даганяць таго мужыка, а той як пачуў, што пан мчыцца, дак узяў схаваў воз з свіннёю, а сам сеў на дарозе і нібы птушку шапкаю дзяржыць. Пад'язжая пан да мужыка і пытае ў яго, ці ён доўга сядзіць. Той адказвае, што вельмі доўга, о ён дзяржыць заморскага салаўя і ніяк злавіць ня можа, а той салавей рублёў 300 стоіць, а мо і болей. Тады пан у яго пытае, ці не бачыў ён мужыка, які павёў свінню з парасятамі. Мужык адказаў, што бачыў і згадзіўся памагчы пану дагнаць, але ён не можа аставіць салаўя заморскага. Тады пан дастаў з кашалька 300 рублёў і даў мужыку. А мужык прыказаў пану дзяржаць салаўя, каб не ўцёк. Дзяржаў, дзяржаў пан салаўя, ды ўжо і вечар настаў. Паглядзеў ён пад шапку, а там няма нічога. Дагадаўся тады пан, што гэта быў той самы мужык, які перахітрыў паню, дый пайшоў пан дадому. А мужык жыве сабе са сваёй бабай і горушка не зная.

*Запісана ў в. Сычэва*
*ад Какошка Таццяны Сямёнаўны*
*Зянькові ч Я.І. (1967 г.)*

## ЛЕГЕНДЫ І ПАДАННІ

### Адкуль Нясвіж

Нясвіж стаіць ужо больш за сем з паловай вякоў. Заснаваў яго князь з роду Рурыкавічаў. А адкуль пайшла назва горада, людзі расказваюць так: як вядома, любімымі занятками князёў у вольны час былі паляванне і розныя там забавы. Навокал княжага замку некалі далёка прасціраліся дрымучыя лясы ды непраходныя балоты. Аднойчы князь разам са сваёй чэляддзю паляваў на мядзведзяў. Адзін звер быў паранены, але ўцёк у гушчар лесу. Праз некалькі дзён князь зноў быў на паляванні ў тым баку. Адзін з яго памочнікаў знайшоў ужо мёртвага мядзведзя. Князь пад'ехаў да яго, агледзеў ды і кажа: «Ня свеж». Вось і пачалі тое месца называць «Нясвіж».

### Пра Нясвіж

На тым самым месцы, дзе цяпер стаіць Нясвіж, было некалі паселішча старажытнага славянскага племені дрыгавічоў ці крывічоў. Яны жылі ў даліне ракі Ушы, лавілі рыбу і палявалі на розных звяроў у навакольных дрымучых лясах. Але аднойчы тут здарылася няшчасце: паселішча правалілася пад зямлю. На яго месцы засталіся толькі ўзгоркі ды руіны. Невядома, колькі часу прайшло пасля таго, калі сюды зноў прыйшлі людзі. Яны пасяліліся і знайшлі тут рэшткі былых развалін. Паколькі месца гэтае было не свежае (так як некалі тут жылі людзі), то яго і назвалі «Нясвіж».

### Пра вёску Сейлавічы

Сейлавічы – вялікае сяло за Нясвіжам. Стаіць яно каля ракі Тур'і, што ўпадае ў Нёман. Даліна Тур'і – раздольная, зялёная. За ёю – густы лес. Але зямля навокал неўрадлівая, і жыхарам вёскі было цяжка працаваць на ёй. Людзі ведалі, што, калі хочаш пракарміцца – сей і лаві рыбу, ракаў. Адсюль і назва вёска – Сейлавічы.

## Перунова гара (Замчышча)

Ёсць за Нясвіжам, калі ісці на захад ад горада, старое замчышча. Гэта вялікае ўзвышша, якое ўздымаецца над шырокім долам. Узвышша людзі завуць Перуноваю гарою. Навокал гэтай гары стаяць вёскі Аношкі, Жанковічы, Долкінды. Расказваюць, што некалі на месцы Перуновай гары стаяў вялікі княжаскі замак, а там, дзе дол, было прыгожае возера. Возера, як люстэрка, заўсёды адбівала колер неба. Улетку, у ноч на Івана Купалу, з возера выходзілі русалкі і вадзілі свае чараўнічыя карагоды. Кажуць, у розную пару ў возеры гэтым загубілі сябе сялянскія прыгажуні-дзяўчаты, падманутыя іх каханымі – маладымі княжычамі. І столькі разгульныя князі загубілі душ, што аднойчы ў купальскую ноч на возеры паднялася такая бура, што вада выйшла з берагоў і затапіла ўсё кругом. У той час у замак стрэліў пярун і разбіў яго ўшчэнт. Вёскі ж навокал былога замку носяць жаночыя імёны.

## Папова горка

На ўскраіне Нясвіжа, за возерам, стаіць узвышша, якое і цяпер у народзе называюць Папова горка. Было гэта вельмі даўно. Некалі на гэтай горцы стаяла цэркаўка. Далёка навокал прасціраліся ўладанні князёў Радзівілаў. Аднаго з уладарных князёў Радзівілаў празвалі Сіроткай. Так назваў яго польскі кароль, які гасціў у Нясвіжскім замку, калі ўгледзеў малое дзіця, якое ляжала адно ў пакоі, бо бацькі яго ў гэты час балявалі ў палацы. Сіротка жаніўся на каталічцы, быў удзельнікам апошняга крыжовага паходу ў Палясціну і жорстка насаджаў каталіцтва ў сваіх уладаннях. Сам Папа Рымскі зрабіў яму раскошны падарунак – срэбны сталовы прыбор (сервіз) на дзвесце чалавек. Прыбор быў вельмі тонкай работы і адлюстроўваў чатыры пары года: вясну, лета, восень і зіму.

Неўзабаве пасля таго, як Сіротка вярнуўся з крыжовага паходу, ён сазваў да сябе сорак папоў – служак праваслаўнай царквы і прапанаваў ім перайсці ў каталіцкую веру і служыць ёй. Вядома, папы адмовіліся прыняць каталіцтва. Тады князь загадаў адвесці іх у цэркаўку, што стаяла на гары за возерам, і заперці іх там без вады і яды, пакуль яны не прымуць яго прапанову. Сам жа князь баляваў у сваім замку тры дні. Няшчасныя папы, не жадаючы быць «вераадступнікамі», адпеўшы псалмы, вымушаны былі самі налажыць на сябе рукі, але не сатварыць «святатацтва». Праз тры дні, калі царкву адчынілі, жывымі засталося ўсяго некалькі чалавек. Папоў там жа на горцы і пахавалі. Цэркаўка з цягам часу развалілася. А горка і цяпер завецца Паповаю.

## Марысін парк

Навокал Нясвіжскага замку, які некалі належаў князям Радзівілам, раскінуўся на берагах возера стары дзіўна прыгожы парк. Тая яго частка, што стаіць на левым беразе возера, завецца «Марысіным паркам». Вось што пра гэта расказваюць людзі. Некалі ў князя Зыгманда Радзівілы была дачка Марыся, прыгожая і вясёлая. Тады ёй было шаснаццаць гадоў. Выхоўвалася яна так як патрабавалася князёўне. Верхавой яздзе яе вучыў прыгожы, смелы і спрытны хлопец з князевай прыслугі. Здарылася так, што маладыя людзі моцна пакахалі адзін аднаго. Колькі працягнулася шчасце закаханых – невядома, толькі вось Марысю ўсваталі за аўстрыйскага прынца. Прынц гэты, вельмі знатны і багаты, быў стары і пляшывы. Марыся моцна гаравала і плакала. Князь даведаўся аб усім і адразу загадаў убраць хлапца, што адважыўся кахаць князёву дачку. Хлопец прапаў. Кажуць, што яго казнілі.

Пасля Каляд павінна было адбыцца вяселле з прынцам. Бедная Марыся не захацела жыць без каханага. Вось і пайшла яна за возера ў парк пад Каляды, засталася там на доўгую калядную ноч. Пахавалі яе ў парку на тым самым месцы, дзе яна і памёрла.

Другія кажуць, што не замёрзла Марыся, а кінулася ўніз з высокай вежы Нясвіжскага замку.

У парку, на левым беразе Нясвіжскага возера, на паляне, якая звалася некалі Крыжовай, стаіць высокі каменны слуп на каменнай пліце. На ім адно слова «Марысін». Быў там некалі і фантан, з якога падалі тонкія струменчыкі чыстай празрыстай крынічнай вады. Фантан гэты людзі называлі «Марысіны слёзы».





## Пра Чорную Даму

Князі Радзівілы, што валодалі Нясвіжскім замкам, належалі да вельмі старажытнага і знатнага роду. Многа пакаленняў гэтага роду каля пяцісот гадоў былі ўладарамі шматлікіх маёнткаў на Беларусі. Тое, што расказваюць, адбылося каля 50-х гадоў XVI ст.

Князёўна Барбара Радзівіла – сястра грознага князя Мікалая Чорнага – рана пайшла замуж, але ўжо ў 22 гады аўдавела. Муж яе – князь – быў забіты на вайне. Маладая ўдава-княгіня жыла ў Вільна ў доме нябожчыка мужа. Барбара была вельмі прыгожай, разумнай і адукаванай жанчынай. У той самы час у Вільні жыў княжыч, пляменнік Вялікага князя літоўскага – Сігізмунд. Аднойчы юнак убачыў Барбару і закахаўся ў яе. Яны пачалі патаемна сустракацца. Малады княжыч быў наследнікам Вялікага князя. Барбара была старэйшая за юнака на тры-чатыры гады. Разумная і хітрая княгіня не супраць была зрабіцца жонкай будучага караля. І вось аднойчы, калі ў месячную салаўіную ноч закаханы пералез праз высокую каменную сцяну ў сад да сваёй мілай, па загаду ці то самой Барбары, ці то яе братоў, успалашылася ўся чэлядзь. Быў падняты такі шум, што Сігізмунд быў выкрыты. Яму прыйшлося жаніцца на княгіні, і іх тайна абвянчалі ў касцёле ў Вільні. Неўзабаве Сігізмунд стаў польскім каралём (Аўгустам Сігізмундам II). Але польскі сейм і духавенства не жадалі прызнаваць каралевай Барбару Радзівілу. Яны хацелі, каб польскай каралевай стала багатая прынцэса з якога-небудзь каралеўскага роду, папоўніла б каралеўскую казну. Але кароль Сігізмунд дабіўся, што яго жонка была прызнана каралевай. Барбара была бяздзетнай, і наследніка прастолу ў іх не было. А праз год пасля каранавання яна памёрла. Кажуць, што яе пад відам лекаў атруцілі. Пасля смерці Барбары кароль вельмі засумаваў і перастаў цікавіцца дзяржаўнымі справамі. Жаніцца ён больш не хацеў, бо моцна любіў Барбару. Прыдворныя і духавенства выклікалі з Англіі чорнакніжніка, каб той выклікаў дух Барбары, які павінны быў загадаць каралю жаніцца. І вось аднойчы ў цёмную залу, дзе сядзелі кароль і яго світа, увайшла дама, апранутая ва ўсё чорнае. Кароль кінуўся да яе і са словамі «Басенька мая, Басенька» схапіў яе за рукі. Але адразу пачуўся выбух, і пакой запоўніўся трупным пахам. Гавораць, што дух Барбары ў вобразе Чорнай Дамы пасяліўся ў Нясвіжскім замку. Ходзіць сярод людзей і такое: апоўначы, месячнай ноччу ў замку з'яўляецца Чорная Дама. Яна спрые закаханым і заступаецца за бяздзетных жанчын. Таму, на каго накіроўвае яна позірк сваіх вачэй, выпадае шчасце.

## Пра пана Каханку

Адзін з самых уладарных і багатых князёў Радзівілаў быў князь Карл (Кароль) Міхайлавіч Радзівіл. Сярод польскіх паноў яго звалі «Круль Нясвіжа». А празвалі яго «пане Каханку», бо гэта быў любімы выраз князя. Нават да няшчаснага, асуджанага князем на пакаранне смерцю, князь усё роўна звяртаўся са словамі «пане Каханку».

Карл Радзівіл не меў адукацыі, вызначаўся разгульным жыццём, жорсткім, каварным і нястрымным характарам. Некаторыя знатныя сучаснікі сцвярджалі, што ў князя нораў дзікага кабана. Карл Радзівіл меў трох жонак, не прамінаў карыстацца правам «першай ночы» ў сваіх прыгонных, якіх у яго было вельмі шмат. Балі, якія ладзіў пане Каханку, былі сапраўды каралеўскімі па раскошы, а паляванні на звяроў здзіўлялі сваёй жорсткасцю. На паляванне князь разам са сваімі гасцямі і сваёй чэляддзю выязджаў за Нясвіж у свой Альбянскі парк з прылягаючым да яго лесам. Парк быў прарэзаны васьмю каналамі, якія зыходзіліся да акружанага вадою вострава. Паляўнічыя, размясціўшыся там (на востраве), маглі без усялякай перашкоды расстрэльваць затраўленых звяроў, якія кружылі ўздоўж вострава. Пане Каханку забіваў па 27 ласёў і дзікіх кабаноў за раз. У Альбянскі замак запрашаўся і польскі кароль Генрых Панятоўскі. У час адной з забаў пане Каханку, польскі кароль, убачыўшы, як мядзведзі рвуць на кускі ласіху, не вытрымаў жорсткага відовішча і стрэліў у мядзведзя. На гэта пане Каханку ўсміхнуўся і сказаў: «Баба ты, а не кароль!» Пужаючы народ, забаўляўся пане Каханку і яздою ў санках у мядзведжай упражцы шасцярыкам па летняй дарозе, усыпанай соллю. Соль у тую пару была дарагая. Два з паловай фунты каштавалі якраз столькі, колькі

каштавала на продаж дванаццацігадовая прыгонная дзяўчына.

Пане Каханку не раз удзельнічаў у ваенных паходах, абараняючы інтарэсы польскіх каралёў, але ніколі не цікавіўся лёсам беларускага народа, якога жорстка прыгнятаў.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Лістапада Георгія Ксенафонтавіча, 1922 г.н.,*
*Гурскім А.І.*

## Пра Чорную Даму

Вось кажуць пра гэтую Чорную Даму людзі страхі нейкія: нібыта здань яе з'яўляецца па начах у былым замку князя Радзівіла. А хто запозніцца часам, і ноччу ідзе каля замку ці ў яго двор, ці калі закалышацца галіна якая на дрэве ці куст, або нешта затрашчыць, ці які другі таямнічы гук пойдзе, кажуць, вось Чорная Дама ходзіць па замку. Але бачыць-то яе ніхто не бачыў. Гэтая Дама ніколі не хадзіла нават як жывая была, бо хварэла моцна і ад той хваробы не магла ні хадзіць, ні нават ляжаць. Казалі, што небарака і памёрла седзячы. І пахавалі яе так, нібыта і ў труне яна сядзіць. Недзе гадоў за трыццаць таму назад (добра не памятаю) прыязджалі да нас нейкія людзі, казалі, вучоныя. Аглядалі Радзівілаўскія паграбенні ў склепах Нясвіжскага касцёла. Адкрывалі некаторыя мрамарныя княжыя труны. Цікавіліся і паграбеннем Чорнай Дамы. Знайшлі яны ў склепе мрамарную труну з высокім, у выглядзе конуса, верхам. Калі ж ускрылі, то ўбачылі, што пад гэтым конусаабразным верхам – звычайная труна, а пасярод яе стаяла прыгожая пазалочаная ваза з вянком кветак – вельмі тонкай работы рэч. Адкрыўшы труну Чорнай Дамы, угледзелі бальзамiраваную жанчыну, адзетую ва ўсё чорнае. З таго часу ўжо болей не вераць слухам пра Чорную Даму. Не ходзіць яна па Радзівілаўскаму замку, а ляжыць сабе, як і ўсе нябожчыкі там, дзе яе некалі пахавалі. Праўда, калі людзі хочуць каго напалохаць ці выпрабаваць яго смеласць, то і цяпер кажуць, што Чорная Дама па начах Нясвіжскі замак наведвае.

*Запісана ў г. Нясвіж*
*ад Керкі Васіля Вікенцьевіча, 1905 г.н.,*
*Гурскім А.І.*

***Вольга Кананец***

# У вёсках майго дзяцінства

## Перасцярогі для цяжарнай

Маці некалі цяжарнай не можно, вот як пажар дзе-небудзь, ні за што не ўзяцца. Узяўся за што-небудзь ва врэмя пажару, глянула, будуць пятна на дзіцяці, будзе пятно.

Вот як гарыць што-небудзь, глянуў, вот бывае от так, схапіўся так ці о так схапіўся, значыць і ў дзіцяці будзе там жа ж і пятно, пятно гэдакое вот. Пятна рыжыя бываюць, такія пятна бальшыя вот, гэто ад пажару, гэто ў многіх такіх, вот глянеш некалі ў малых дзяцей так это на ліцы бывае і на руках, это ад пажару, маці схапілася ў тое врэмя, як пажар быў, от это нельзя. Не можно было пераступаць вяроўку. Падлазіць пад вяроўкі нікакія нельзя ці вот што-небудзь гэдакое вісіць, вот вяроўкі вісяць, каторыя этыя самыя бяльё вешаюць, пад яе ісці нельзя цяжарной. Это правільно было, пуповіна была абкручана, я ўсё лазіла, лазіла пад, врач і сказала, кажа, вы відно, я кажу да, то пуповіна абручана была кругом, кругом шыі. Нельзя і праз венік пераступаць, ну, не ожно, кажуць, венік пераступіў, это плохо, это плохо будзеш жыць з мужчынаю ўжо ні кантакту ніякага не будзе, это венік пераступіў. І цяпер жа ж, цяпер веніка ніхто не пераступае, нельзя венікаў, кажуць, не будзеш з мужчынаю добра жыць, будзе мужчына гэдакі ўжэ да цябе як, мужчыне падабацца не будзеш, не пераступай ніколі. Ну, вот некалі бабунька ў мяне была. А вот мужчынам можно пераступаць венік, нам не можно. Некалі ў мяне бабунька была, гэта мая, гэдак. Дык яна ўсё гэдако расказвала, а я была любапытная гэдака, дык яна будзе казаць, не дуры галавы, не дуры, ты мне ўсю голаву задурыла. Бабунька, кажу, чаму не можно тоё, а чаму не можно тоё. – Не дуры галавы. А бывае, пад настраеньё скажа што. У нас бабкі гэдакія, мая бабуня была, мы называлі бабуня некалі, баба ў нас не было, баба, баба-то грубо было. О не, маю бабуньку, каб хто, кажа, каб хто назваў мяне баба, я б, можа, кажа, з ім век не гаварыла, баба – это грубо. От і цяперачы баба, от дзе дажэ бабуля, баба, от і врачы абрашчаюцца, нет, нельзя. Бабушка, бабушка, бабуня, бабушка. Бабуня, дзядуня, бубуня і дзядуня. Не было такога, што баба, не, это было хамское шчыталасё. Некалі больш такія, некалі называлі гжэчныя былі людзі, гжэчныя, бабуня была ва-первых палячка, дык яна кажа: это ты, дзетачкі, яна мяне ўсё вучыла, я буду крычаць, не дуры галавы. Прыдзі, дзетачка, на музыку, не павесь, каб рукі гэдако во віселі, гэдак во ручкі трэба палажыць, бо трэба так, ножкі вузенько.

## Пра роды

Ну, каб роды былі лёгкія, Бог яго знае, што там рабілі гэдак ужэ шапталі ўсё, у нас усё некалі былі на шэптах, усё бабкаў гэтых клікалі, шапталі, абводзілі ўсё гэдак во, абносілі, абносілі гэтымі ўсякімі, замоліцца, памоліцца і абносіць усё бабка. Некалі ж родаў, некалі бальніцаў не зналі, это ж бабкі хадзілі, мая бабунька хадзіла, роды прымала, Марыля не хадзіла, не ўмела Марыля, а бабунька мая хадзіла, тут усе ў яе былі яе ўнукі, па ўсёк, тутака ўсё былі ўнукі, усіх прымала, і Манюсю, бабу Маню, прымала яна, усіх-усіх прымала яна. Да, это мая бабунька прымала роды ўсягда, і яна знала, яна пака роды там якія будуць, яна пашэпча нешто, пашэпча і, я ж была любапытная. Бабунька, а што ты гаворыш? – Адыдзіся! Пхае мяне. – А што ты, бабунька гаворыш, як родзіць? – От як некалі будзеш радзіць, тады табе раскажу. Як некалі, дзе ж яна, я ж радзіла, яе ўжо не было. Яна ўсё нешта пашэпча, пагаворыць, пахрысціцьпахрысціць, тады ўжо. Кажуць, і ў жанчын, і ў мужчын быў "ураз", цяжко падняў, цяжко зрабіў, кажуць, ураз, трэба выгаварыць. Выгаварваюць, прыкладалі там нечым, прыкладаюць халодным, чым хочаш прыкладалі. І ад ураза маглі дажа этыя грыжы палучацца, магло б усё развівацца, але выгаворамі этымі ўсё сходзіла.

*Запісана ў в. Вялікая Ліпа*
*ад Марчык Рэгіны Міхайлаўны, 1937 г.н.*

## Пра лекаванне дзетак

У мяне ў другой дзевачкі, у мяне двойня, і ў другой дзевачкі, як радзілася, на спіне было многа валасоў, яны такія былі некія дзікія, жорсткія былі. І яна кадзе не магла проста, не магла спаць, не магла спаць, мне што ў роддоме сказалі, што надо, штоб бабушкі выгаварылі. У каждай была свая малебен, каждая знала ўсё. І вот і мне сказала Верка ўзаць спячы ў бляшцы прасты, вада, мука і спячы такі эты во, такую ляпёшку, такую ляпёшку спячы. І от клалі мы, маці, чэраз парог клала, галава туды, а сама на жывот на парозі, і эты самы са скарынкі, з скарынкі выдзірала эты мякіш і па спіне, па спіне дзевачцы выкачвала, і выдзірала. Некалі ж не было чым стрыгчы ці брыць, і нельзя было. З гэтымі ляпёшкамі, з гэтым цестам, цестам тым выкачвала, от маці тут ужэ гаварыла «Отчэ наш», «Отчэ наш» малітву гаварыла, выкатвала.

*Запісана ў в. Вялікая Ліпа*
*ад Карпач Неанілы Вячаславаўна 1940 г.н.*

## Пра зайчыкаў хлеб

Зайчыкаў хлеб спецыяльно пяклі. Зайчыкаў спячэш. Я сама хадзіла каля, каля гэтаго самаго, бо вельмі сядзелі вялікія этыя клёны, мусіць з-за граніцы, такія лісця былі вялікія. Хадзіла, бо на чом было хлеб пячы, не было тых ні блях, нічого, збірала тыя лісця з клёну, на нітку навязвала, высушыныя, як толькі хлеб замяшаць, усягда пакідалі кусочак цеста, пакідалі жменьку. І вот, як на лапаце, як печ ужэ выгарыць і жар гэты з печы выграбуць сюды ўперад, уперад гэты жар, тады ўжо хлеб на лапаці на этых лісцях, ён гэдак залазіў хораша, спячэцца эты хлеб, і тады ўперадзі тут астаўлялі, дзе менш ужэ духу, жару гэтую. І хвосцік зробяць, жменька гэта, адлёпяць хвосцік, тутака галоўку зляпіць мая маці і жанчына, у каторай мы жылі, і дзюбку зробяць. І патом, як адкрыюць засланку, бачаць, што ён ужо рыжанькі, значыцца, гатовы, запёксё гэты. От мне даюць зайцаў хлеб, а я ўжэ…мне-то не паказваюць, я думаю, што праўда той заяц прынёс той хлеб. Гэдака рада, ды што зайчык хлеб гэты ўжэ, гэтка рада есці.

– Як казалі, калі давалі акрайчык хлеба?

– На табе акрайчык, каб быў сын Мікалайчык!

*Запісана ў в. Вялікая Ліпа*
*ад Карпач Неанілы Вячаславаўны, 1940 г.н.*

## Пра нябесныя з'явы

Ну, плямы там на месяцы, некалі ізабражэннё такое на месяцы бывае. Усяк казалі, это, Ісус Хрыстос.

На гром у нас гавораць пярун. Такого дрэ-

ва ў якое маланка патрапіць не бралі: ні на дрова, нічого, бо гэто нельзя, бо ад Бога ці ад чаго нельзя было, ужэ маланка асвяціла, яно асвяшчонное. Як на палях былі, калі пачуюць гром, дак качаліся па полі, каб спіна не балела. Ну, елі хлеб цвілы, надо есці цвілы хлеб, каб не баяцца грому. Калі пажар – вёдрамі, лапатамі тушылі. Абходзілі кругом хаты, іконаю абходзілі. Есць спецыальна ікона для пажара, это неабыкнавенная ікона. Радуга стаіць, казалі, набірае воду, это на небо набірае воду, п’е воду радуга. І тады дождж. Кажуць, радуга ўжэ над рэчкаю, значыць, пойдзе дождж, набірае воду. Гэто і есць гэдак. У нас казалі некалі, Іллюк на..аў у воду. Да, не ідзеце, купацца не ідзеце, бо Іллюк, так такі папросту крычаць жа ж бабы на сваіх дзяцей. Віхор у чалавека патрапіць – это плохо, можа чалавека паралізаваць, можа, якую хваробу нагнаць гэдакую. Віхар, на віхар пападецца – это страшна, як віхар вее і пападзесся – это страшно пападаць. Пасля заходу сонца: смеццё, воду выносіць нельга. Вот, памые, бывае, нельзя гэто выносіць.

Гародніну і дрэвы трэба, садзілі гэто ўжэ, як, кажуць, месячык, палавіну месячыка, можа, было садзіць ужэ, этыя дні называліся – “сходнія дні”.

## Пра першых людзей і плямы на месяцы

Першымі людзьмі былі Адам і Ева. Памоему, ён іх як бы, ўродзе, пажаніў, але ў сад упусціў іх. І былі, вот, кажуць, яблычка. І Бог прыказаў яму, Адаму, ні есці, а Ева скусіла яго. Гэто ж Ева Адама скусіла. У кнігі піша. Ага, гэтым яны правініліся, і Бог нарадзіў іх между сабою жыць.

Гэто некалі казалі на месяцы плямы, ужэ нашыя дзядэ-прадзеды, гэто будзе вайна, а таму што враге б’юцца, брат брата дзяржыць на вілках.

## Пра зоркі і месяц, гром і дождж

Гаварылі, это каждаму зорка есць на небі, кажды чалавек умірае, дык яно падае, часто ж падае бывае, коціцца па небі, коціцца па небі, гэто ўбачыш. Кажуць, гэто як ужо, як зорка пакацілася – нехто памёр.

Маладзік – это як толькі расці пачынае. Тады сходнія дні, тады поўня, круглы ўвесь – тады поўня, кажуць.

Месяц чырвоны – это, кажуць, на вецер, кажуць, месяц пачырванеў. Альбо вот сонцо заходзіць красно-красно там, зімою то кажуць на мароз, а як ужэ лето, тады кажуць на вецер, гэто сонцо красно. А луна зімой свеціць, гэдак ясно-ясно, дык это, кажуць, на мароз.

А як яшчэ, кажуць, першы раз, як грыміць гром, як гэты во, у каго баліць спіна, дак трэба эты во, трэба качацца па зямлі, качацца, каб прайшла спіна, як першы раз пачуеш гром вясною. Часам, знаеце, казалі, о, ужэ грыміць, калясніца загрукала, па воду паехалі, зараз, зараз дождж будзе…Гасподзь паехаў па воду.

У нас казалі гром. Пярун, пярун б’е… Будзе клясці, каб цябе пярун заб’е. У засуху хадзілі з крэсным ходам па сяле. Мак адно ў нас, знаеце, еслі доўга дажджу німа, то сеюць мак, у дзевяць калодзесяў трэба пасеяць мак, тады, кажуць, дождж пойдзе. Дак вот бабкі старэнькія сеялі, пад адзін калодзезь, не ў дзевяць, у тры калодзесі, пад другі, пад трэці пасея, бывае і пойдзе.

Разарваць трэба жабу – дождж пойдзе…А тут жа была рэчка…Дык адно тыя лягушкі: «Кум-ква-кум-ква!»

## Пра травы і дрэвы

Асіна – яна і есць асіна, яна трасушча гэдака. Вот як што-небудзь зробяць з асіны, кажуць, трасецца, як асінавы лісток. Прыкладваюць раны алешынаю, лісцямі алешыны прыкладваюць скулы, як некалі называлі: “Скулы яна выцягвае”. Вот, і цяпер эхціолавая мазь, а некалі не зналі этае мазі, алешынаю выцягвалі. Прыложыш, яна ж ліпучая, лісток прыложыш, назаўтра змяні, і ўсё – выцягне гной.

Зёлкі свенцяць, перад святком. У нас празнік есць: свенцяць яблыкі, зёлкі, каточкі гэдакія, што есць каточкі, гэдакія зёлачкі свенцяць. Зельё кажуць, называюць: “Зельное, на Зельную, свенцяць этое зельейко. А перад гэтым тыдням свенцяць мёд”.

На Троіцу хату бярозкамі ўбіралі, трэба, каб стаялі на вуліцы дзве бярозкі, як уваходзіш. Бярозамі ўсыпана гэта самая хата, затыкалі некалі ж за бэлькі гэтыя бярозкі.

Бачыць у сне грыбы – это, як у дзяўчат, то хлопцаў будзе много; а як старыя сняць, Бог іх знае, кажуць, дзяцей будзе много. Грыбы сняць, грыбы і рыбу, то это будзе забярэмянееш і будуць дзеці.

## Пра жывёльны свет

А як першага бацяна убачыш – добро. Як яны ляцяць ужо гэтым ключыкам, то хрысціцца не можно. Чаго то яны баяцца гэтаго. Збіваюцца ў кучачку, у кучачку.

На Узвіжаннё вужы збіраюцца ў лесе спаць, іх тады німа чаго баяцца. Ліннё часам найдзеш, вуж жа на зіму ліняць, ён спаць кладзецца голы. Але з того лінёвішча, еслі ў каго падуча балезнь, трасе, надо высушыць, уцерці і дзве ложкі даць яму з’есці таго лінёвішча, і ўсё пройдзе.

Я бачыла адно сліўня, ён сляпы. Пасвілі каровы, адна жанчына яго яйцы пабіла, то, каб яна была адно, то ён бы яе заеў бы. Дагнаў, можа, весняў чатыры ці пяць, але мы, нас чатырох было. Слівень як укусіць чалавека, то ўсё. І мы павыломлівалі палкі з галіна. Ну, як заеў, укусіў бы, ды ўсё. Во гэдакі во, а тоненькі, як палец. Вот як гэты палец. А скурчыцца-скурчыцца-скурчыцца, і скача. Ён раз-два, скок-скок, і мы яго забілі, білі-білі-білі-білі. Пабілі яго на куске, і распалілі агонь, і ўкінулі яго ў агонь, а во – не ўспелі мы адысціся, жабаў з дзесяць сабралася, дасталі яго з того агню і вылячылі. То гэто праўда, я сама відзела.

Павука, даўнейшыя людзі казалі, мязіным пальцам задушы, то Бог здыме дзесяць грахоў. У шчупака крыж не ў галаве, пад барадою. Гэто ў іх гэдако свойство. Гэто, як рэжаце рыбу і ў малаку, той крыж, самы першы кусок з-пад бароды разлучы і ўгледзіш.

Ластаўка, гэта некалі пасловіца нашых дзядоў-прадзедаў была. Ластаўка – гэто чалавек. Хадзіў Бог па зямлі! А было цэлы мех хто-то пазьбіраў іх у мяшок, і хацеў удаліць гэтыя ўсе гады, усё недоброе, што паўзала па зямлі, а ластаўка хацела паглядзець, яна была дзеўчынаю, дык, як развязала, дак яны і выпырснулі ўсе з того мяшка. І Бог сказаў гэдак: “Цяпер ты хадзі і збірай”. І вот яна ходзіць і збірае. Ластаўка любую гадасць збірае.

## Пра лекаванне жывёлы

Бывае, карову, як яны кажуць, урочаць. Будзе, чыя карова дае много малака, ідзе, гляньце, дык яе гэты во сурочаць карову, стане малака не даваць.

Ад суроку малітву гаварылі, соллю абносілі. Соллю абнясуць, на хлеб пасыпяць, дадуць з’есці, а на тую соль загаворваць малітву. Некалі мама казала на мяне: “Калі будзеш выгаворваць, дак этыя грошы занясі ў цэркаў, бо это не ты памагаеш, а малітва памагае”. Дык я і ніколі. На хлеб, кажа, трэба табе, падзі пазыч. А гэтыя грошы нясі ў цэркаў, купі, свечку пастаў.

Ну, як паўрочыць хто, шукаюць тожа нечаго ад тых вачэй, абносяць якою соллю ці што. Бывае карова дае малако, не дала раптам, падзівіўся нехта.

Ласіцы былі.Такі звярок, а ён як дзе жыве ў хляве, знаеце што, ён не дасць каню, гэтой грыві, гэтум шэрсці ў яго калупаецца, то выдзя конь мокры із хлява. Вот у нас карова была, гэдака калмата чорна, вот выдзя рано гэдака мокра з хлява, як яна ў вадзе пабыла. Мусіць, па той шэрсці ў яе тая ласіца бегла. То я бачыла сколькі раз, яна будзе такой масці, як карова, будзя чорна з белым, будзя бело з рыжым, яна такая, як суслік.

Знаеце, это зловяць мышкаў, у жывое мышы вочы выпараць, і тыя вочы зашыць карове. Это некалі казалі, ад урокаў гэто, і вот катора карова ідзе з гэтум (гэдака ў яе на шыі пасак), і там тоё зашыюць, яна і ходзіць з ім.

## Пра ласку

Жыла ў нас ласка. Дзе ў каго кароўка, там і ласіца. Яна гэдака велічыні. Як кароўка перэсценька, то і ласіца пярэсценька, кароўка чорная і ласіца чорная.

Ласіцу біць нельзя, патаму што, як заб’еш, усё згіне. Яна нічога не рабіла. Яна, як хтонебудзь, бо есць людзі лядачые, врэдые, дак узялі за нарачно. Яна па карові ездзіць і карова пагібае.

## Пра русалак

Пра русалкі, то гаварылі. Русалкі – гэта, мусіць, у рэццы былі. Кажуць: "Не ідзі купацца!" Вечарам цёплая вада пасля работы, бегалі ж купацца пад Суньдзюкову яму, так кажуць: "Не хадзеце, бо там русалкі з'ядуць". Канешно, хто ўгледзіць, то, мусіць, будзе няшчасце.

## Пра люстэрка

Кажуць, неможно бярэменным у зеркало глядзецца. Дзе яно было, тое зеркало? Дзе яны былі? Хаця каб малелько было, каб нос паглядзеў.

І пакойніку нельзя, закрываюць і па сёняшні дзень. Ну, нельзя атражэннё, атражэннё ў зеркалах нельзя, гэто грэх бальшы. Нельзя, закрываюць, дзе якія зеркалы есць па хатах, усюды закрываюць. Часы астанаўліваюць і зеркало закрываюць.

Люстэркам варажылі, трэба, каб курыца ў зеркало паглядзелась. Гэто на Шчадрыца, насыплюць зярнят, кучачкаў насыплюць, чорную курыцу дастануць з падпечка, паставяць зеркало, трэба вады паставяць. Трэба, каб курыца зярня чыю кучачку, вот мая кучачка, твая кучачка, чыю кучачку курыца дзеўбане, пойдзе нап'еццa вады і ў зеркало паглядзіцца курыца, тады ты замуж пойдзеш у гэты год.

## Пра варожбы

Выразаеш малонку-малонку бумажачку і ставіш свечку, і яшчэ другую гэдаку – адна на хлопца, а другая на сябе. Гэто я, гэто мая, а гэто ён – кавалер. І як яны ходзяць-ходзяць, сышліся – значыць, ты выдзеш замуж, а еслі яны разышліся – не. Свечкі на вадзе ставілі. Ходзяць, во гэдак во лазяць. На Шчадрыца, на Андрэя? Я ўжо забылася. На Андрэя мы адно калэ лічылі. Прыдзеш вечарам позно, каб паляглі спаць. Во гэдак во ідзеш, абдымаеш, як можаш, і лічыш: "Ці кол, ці калец, ці мужык, ці ўдавец. Ці хлопец, ці ўдавец", – забываюся ўжо. Ну, і налічыш нешто ж паследняе. І тады яшчэ: "Дай, Божа, знаць з кім век каратаць". О, гэдак мы некалі гадалі.

Курэй кармілі. Варажылі гэто дзяўчата. Паложам засланку, я і сама была, збіраліся дзяўчата кампаніяй, паложам засланку і паставім люстэрко на той засланцы і тагды колькі нас, столькі кучак ячменю ці пшаніцы, ці чаго-небудзь, і тады курыцу пускаем, каб каторая рахманая. Тая курыца ходзіць, пусцім яе пасярэдзіне "ко-ко-ко-ко", кругом ходзіць, тады падзяўбе ў адной, падзяўбе ад другой, падзяўбе трэцюй, а чацвёртую возьме разграбе. Значыць, яна замуж не пойдзе. Варажылі на Шчадрыца, на Коляды. А Соня – была яна то ўжо старая дзеўка, але не было ёй з кім, мы яе прынялі ў сваю хеўру, і ў яе ніколі-ніколі курыца ні дзяўбла, возьме разграбе-разграбе лапкамі – і ўсё. Яна і замуж не пайшла.

Я служыла ў Крутом беразе, то гэто я помню, і мне было яшчэ чатырнаццаць гадоў. Мае гаспадыні дачка кажа: "Ніна, кажа, пойдзем з табою да Тоні варажыць". Кажу я: "А чаго я пайду з табою?" – "Пойдзем, бо я адна буду баяцца ісці". – "Ну, добро, пайду". Адзянуліся мы з ей у кажухе, авечу адзежу, адзянуліся і пайшлі да Тоні разам. Да Тоні было з паўкіламетры ісці. Это яе падруга была. Ну, і паставілі зеркало, насеялі попелу раней сіткам, каб не было нічога. Насеялі попелу, тады яго разгарнулі па цёмной бумазі той попел, тады паставілі зеркало на той попел, ну, і нічого. Сядзяць яны, гаворацъ, хто тут ужо будзе ісці. А во і я, а я ж, вядомо, маладая. А во ідзе. І скажыце, дзеткі, як паказвало ў том люстэрке, так і іспалнялосё. Трэба ж хлопца сасніць, пад падушку нож клалі. Гэто гадаеш, які будзе мужык. Тады пад голаў нож, я яго не клала, я баялася. Мама казала на мяне, устане – заржэжа ліхой той матэры. А дзеўкі клалі, каб угадаць, ці будзе мужык добры. Як нож… Ён заржавее адразу пад падушкаю, еслі будзе лядачы. Як не заржавее, будзе добры.

## Пра сны

Ну, гадзюку бачыць у сне – гэто плохо, гэто плахі чалавек, кажуць гэто, казалі некалі, а ваўка – гэто друг, сабаку – гэто тожа врэдны чалавек, а ваўка добро бачыць. А рыбу, кажуць, еслі бярэмянна жэншчына рыбу ўгледзіць, значыць дзіця будзя. Шчупак – то это мужскі род ці карась, а плотка – дзяўчынка.





## Як заблудзішся ў лесе

Пайшлі па мох і гэдак зблыталіся, што, о, гэдакі во кусочак і не маглі выбіцца на дарогу. Я кажу на яго: "Стой, я да таго, кажу, утамілася". Я стала, расчасала валасэ, гэто само першо лякарство. Расчасала валасэ, а ў мяне валасэ во гэдака, во былі. Заплялася, нават добро і не заплялася. Ён: "Скарэй-скарэй, бо я не ўспею". "А ты, кажу, перабуўся". – "Дык я добро абуты". – "Перабуйся". Ён перабуўся, я туфлі скінула злажыла, гэты во, ізноў злажыла. І во і выйшлі, чатыры шаге, на тую дарогу. А ён кажа: "А во наша дарожка". Гэто перша-перша лячэнне, як заблудзіссё ў лесе – расчасаўсё, перабуўсё і ўсё.

## Пра Дзяды

Пакідалі кашу ім. Як памрэ, бо я забудусё, мярцвіцу клалі на акне, само паследнё, канчаецца вячэра, бо гэто закон. Тагды паложаць на талерку этае кашы ячменнае, гэто законно, ячмень трэба, каб быў. І ставяць чарку гарэлкі на акно на покуць, кусок хлеба і усё, каб было чым закусіць, і скварку, бывало, кладуць. Усё на талерцы і тады, як сказаць, салфетачкаю накрываюць гэто ўсё. І рано як устануць – німа тэе салфетачкі. Было. Не ва ўсіх, але было.

## Як Бог пары складае

Тожа прычча гэдака была. Хадзіў Ісус Хрыстос па свеці, от некалі…ён быў на зямлі, патом вознёсся на небо. Ну, ён ідзе, а ляжыць мужчына, ён на яго пытаецца дарогу, каб яму паказаў… А ён, як ляжаў ногу, падняў і дарогу яму паказаў. Ён пайшоў далей. Ідзе далей, а жне жняя на полі. І гэдак спяшаецца, гэдак увіхаецца скорынько. Ён значыць сказаў, яна кінула серп і пабегла яму паказала. А ён кажа, гэто будзя пара, пара, пара. Адно будзя рухаво, а другоё не будзя. Як абое рухавыя будуць, то будуць вельмо багатыя, а як адно рухаво, а другоё ляніво, то будзя ўсё ўпарадку. Гэто гэдака прычча… Кажуць, Бог сем пар лапцей стаптаў пакуль пару сабраў.

## Пра вясельныя звычаі

Ну, некалі ж то прыходзілі ў сваты. Некалі прыходзілі бацьке ўперад, ідуць на догавар, тады ўжэ як тая нявеста сагласна, бутылку абвяжуць ужэ. Бывае хустку абвяжуць, рушнік нейкі, хто чым ужэ. І аддадуць ужо тым, сватом, а тады ж ужо тоё вяселлё дагаварваюцца, гатовяць вяселлё.

Як ужэ прыдзя жаніх да нявесты, ужэ жаніх сядзіць за сталом, а нявесту ўжо водзяць, і ўжэ маці благасловіць, расцілаюць скацерць такую белую, а бацьке садзяцца напроціў на столку. Стол стаіць, яны перад сталом садзяцца, расцілаецца скацерць, і маці з іконаю сядзіць. А дачка кленчыць на калені, прывядуць яе шафярэ пад рукі два, тады ўжэ бацька матку цалуе, яны яе благасловяць і садзяцца за стол. Тады будуць па чарцы і едуць пад вянец. Тады пасля прыедуць, маці на парозі страчае, абсыплюць зярном, ну, і заходзяць у хату, усіх гасцей прыглашаюць. Усё пражытоё, яно не забытоё…

Некалі як вяселлё, сундук той вязуць, шафа – той сундук, то вязуць падушкі ўжэ, вязуць, а мы дзець, за гэтым, каб нам кідалі цукеркі, каб кідалі, бежымо за гэтым, о. Ужэ як маладая прыдзя на быт, ужэ ж праводзяць там усе, і трэба, палагалася, каб цукеркі кідала ўсім.

## Пра паходжанне назвы вёскі

Вяліка Ліпа яна завецца патаму, што тут больш было ліпаў. Яно і сем'і, і ліпы. Наша ж вёска была ўсаджанааднымі ліпамі. От яна і Вяліка Ліпа. А ў Высокуй Ліпе – Высока Ліпа. Тамака высокія ліпы былі.

*Запісана ў в.Вялікая Ліпа*
*ад Верамейчык Соф'і Нікадзімаўны, 1925 г.н.*



# ФАЛЬКЛОРНАЯ ПРАКТЫКА Ў НЯСВІЖСКІМ РАЁНЕ: ПА СТАРОНКАХ РЭГІЯНАЛЬНАГА АРХІВА ВУЧЭБНА-НАВУКОВАЙ ЛАБАРАТОРЫІ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА

КАВАЛЁВА Рыма Мадэстаўна, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск, дацэнт кафедры тэорыі літаратуры, кандыдат філалагічных навук, дацэнт;
ПРЫЕМКА Вольга Віктараўна, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск, дацэнт кафедры тэорыі літаратуры, кандыдат філалагічных навук, дацэнт

У вучэбна-навуковай лабараторыі беларускага фальклору БДУ захоўваюцца фальклорна-этнаграфічныя матэрыялы з самых розных куткоў Беларусі. Даволі багата прадстаўлены і нематэрыяльныя культурныя скарбы аднаго з цікавейшых рэгіёнаў краіны – Нясвіжскага раёна.

Выязныя экспедыцыі ў Нясвіжскі раён студэнты і выкладчыкі філалагічнага факультэта БДУ здзяйснялі ў рамках абавязковай двухтыднёвай палявой вучэбнай практыкі па фальклору, якая была ўведзена на філалагічным факультэце БДУ на пачатку 1960-х гадоў дзякуючы намаганням кандыдатаў навук, дацэнта Веры Захаравай і прафесара Ніла Гілевіча. Першая з іх адбылася ў 1963 годзе, калі група студэнтаў-першакурснікаў пад кіраўніцтвам Ніла Сымонавіча Гілевіча збірала фальклорныя матэрыялы ў пазначаным раёне. Гэтыя запісы, таксама як і матэрыялы палявых экспедыцый 1964, 1969 і 1976 гадоў, захоўваліся ў асабістым архіве Ніла Гілевіча і потым былі передадзены ў вучэбна-навуковую лабараторыю беларускага фальклору БДУ.

Аналіз фальклорных матэрыялаў з фондаў рэгіянальнага архіву Мінскай вобласці, якія цяпер захоўваюцца ў вучэбна-навуковай лабараторыі беларускага фальклору пры кафедры тэорыі літаратуры БДУ, паказаў наступнае.

Агульная колькасць сабранага матэрыялу – амаль 4 500 фальклорных адзінак самых розных жанраў і відаў. Зафіксаваныя матэрыялы не абмежаваныя па ахопу адміністрацыйных адзінак: палявыя даследаванні праводзіліся ў горадзе Нясвіж, г. п. Гарадзея, вёсках Русакі, Аношкі, Логнавічы, Лань, Заельня, Зубкі, Смалічы, Быхаўшчына, Карацк, Ракавічы, Альхоўка, Казлы, Колкі, Каменка, Барацькаўшчына, Малаеды, Завітая, Лысіца, Макашы, Касновічы, Маяк, Маляўшчына, Зарэчча, Лявонавічы, Круты Бераг, Краснагоркі, Студзенкі, Квачы, Янчыцы, Андрушы, Малева, Карцэвічы, Юшэвічы, Саска Ліпка, Гусакі, Жанкавічы, Прасці, Амлынцы, Астраўкі, Вялікая Лысіца, Нялепава, Грыцы, Сейлавічы, Грыцкавічы, Затур'я, Еськавічы, Хвоева, Вужанка, Пагарэльцы, Сноў, Міцькавічы, Рудаўка, Альва, Слаўкава, Кіркаўшчына, Гусакі, Альбянка, Лычыцы, Стаўпішча, Караліна, Ухвала, Фальваркаўцы і інш.

З запісаў бачна, што ўзрост інфармантаў пад час экспедыцыі 1963 года быў вельмі паважаны: у некаторых год нараджэння пазначаны 1900-м, 1901-м, 1903-м, нават 1896- м. Калі прааналізаваць запісы, зробленыя ў Нясвіжскім раёне ў 2000-я гг., можна ўбачыць, што тут узрост інфармантаў «узвышаецца» і ніжэйшай часавай планкай з'яўляюцца ўжо 1930-я – 1950-я гады нараджэння. Хаця назіраюцца і выключэнні. Так, у 2003 г. студэнтка Антаніна Сурма зрабіла запісы ад жыхаркі вёскі Хвоева Ганны Адамаўны Курыла (1915 г. н.), якой на той момант было 88 гадоў! Супастаўленне новых запісаў з існуючымі паказала, што раней ад гэтага інфарманта творы не запісваліся. Такім чынам, названыя матэрыялы значна ўзбагацілі архіў лабараторыі, а не сталі паўтарэннем ужо запісанага, няглездзячы на тое, што запісаны яны былі ў вёсцы, якую студэнты-практыканты і раней не абміналі сваёй увагай.

Летапіс экспедыцый вучэбна-навуковай лабараторыі беларускага фальклору БДУ сведчыць аб наступным.

I. Агульныя фальклорныя экспедыцыі ў Нясвіжскі раён спецыяльна не ладзіліся. Пасля 1969 года, найбольш багатага па колькасці зробленых запісаў, фальклорныя матэрыялы з Нясвіжскага раёна ў архіў лабараторыі беларускага фальклору БДУ траплялі эпізадычна (1976, 1983, 1986, 1991,





1998 гг.), што было абумоўлена правядзеннем экспедыцый у іншых абласцях Беларусі, у тым ліку і ў іншых раёнах Мінскай вобласці. Кардынальна сітуацыя выправілася на пачатку новага стагоддзя, калі ў архіве з'явіліся фальклорныя запісы з Нясвіжскага раёна, зробленыя ў 2000, 2003, 2005, 2007, 2008 і 2009 гг. Гэта ўжо былі не планавыя або выязныя экспедыцыі студэнтаў і не разавыя паездкі, ажыццёўленыя супрацоўнікамі навукова-даследчай лабараторыі беларускага фальклору БДУ, а фальклорныя практыкі студэнтаў філалагічнага факультэта па месцы жыхарства. Дадзеная акалічнасць сведчыць на карысць таго, што такія студэнты добра ведалі носьбітаў фальклору і мелі магчымасць зафіксаваць самае «дарагое» для інфармантаў – творы, якія «чужым» не даверлі (замовы, галашэнні, плачы, духоўную паэзію).

II. Падчас планавай студэнцкай экспедыцыі былі зафіксаваны творы большасці жанравых разнавіднасцей сямейна-абрадавых вясельных песень, каляндарна-абрадавых і пазаабрадавых сацыяльных і бытавых, дзіцячага фальклору і малых жанраў – прыказак, прымавак, загадак. Значна менш запісана твораў казкавай і няказкавай прозы. У 2000-я гг. вопіс Нясвіжскага раёна, акрамя вышэйназваных жанраў, папоўніўся і новымі разнавіднасцямі песень. Так, збіральнікі звярнулі ўвагу на спадчыну перыяду Вялікай Айчыннай вайны (тылавыя песні, рэалістычную прозу – успаміны), творы гарадскога фальклору, у тым ліку гарадскіх субкультур («блатны», «фанацкі»), а таксама дыскурсіўную прозу (тлумачэнні сноў, прыкметы, адказы на пытанні праграмы-апытальніка). Такім чынам, параўнальны аналіз зафіксаваных на тэрыторыі Нясвіжскага раёна і захоўваемых ў вучэбна-навуковай лабараторыі беларускага фальклору БДУ фальклорных твораў паказаў, што жанрава-відавы склад адзінак фальклору характарызуецца яскравым дамінаваннем песенных твораў – каляндарна- і сямейна-абрадавых, пазаабрадавых бытавых, сацыяльных, featuretэматычных прыпевак. Дастаткова поўна прадстаўлены парэміялагічны фонд (прыказкі, прымаўкі, загадкі), сфера дзіцячага фальклору (калыханкі, пацешкі, дражнілкі, дзіцячыя гульні, лічылкі, «страшылкі»), часткова – замовы. Сустракаюцца творы перыяду Вялікай Айчыннай вайны, сярод якіх, акрамя песень, маюцца запісы няказкавай рэалістычнай прозы, у прыватнасці ўспаміны. Найменш зафіксавана празаічных жанраў казкавай і няказкавай фальклорнай прозы, а таксама духоўных вершаў і псальмаў; твораў народнай драмы зусім не выяўлена. Прычым увага збіральнікаў да твораў дыскурсіўнай прозы (ці адказаў інфармантаў на пытанні аб мясцовых звычаях, забабонах, перасцярогах, персанажах вышэйшай і ніжэйшай міфалогіі, будаўніцтве, арганізацыі хатняга побыту і многім іншым) з'яўляецца ў тых справаздачах студэнтаў, якія датуюцца 2000-мі гадамі. Дзякуючы гэтаму вопіс Нясвіжскага раёна вучэбна-навуковай лабараторыі беларускага фальклору БДУ папоўніўся запісамі некаторых відаў фальклорнай прозы, у большай ступені – каляндарна-святочнай і сямейна-абрадавай, у меншай – няказкавай, смехавай, магічнай. На жаль, зусім не сустракаюцца запісы міфалагічнай прозы (аб прадстаўніках вышэйшай і ніжэйшай міфалогіі). Акрамя таго, як паказваюць запісы, студэнты працягваюць актыўна запісваць фальклорныя творы ў вёсках, прычым дамінуюць у іх справаздачах усё роўна аўтэнтычныя песні розных жанраў, што сведчыць аб адзінстве развіцця і наследаванні фальклорнай традыцыі.



## КАЛЕКЦЫЯ ВУЧЭБНА-НАВУКОВАЙ ФАЛЬКЛОРНАЙ ЛАБАРАТОРЫІ ЎСТАНОВЫ АДУКАЦЫІ "БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ"

1960 -1970 гг.

### Каляндарна-абрадавая паэзія

**ЗАСЦІЛАЙЦЕ СТОЛЫ** (калядная)
Засцілайце столы,
Столы колядовы.
Радуйся, Мар'я,
Радуйся, зямля.
Сын Божы нарадзіўся,
І на зямлю пакланіўся.
Радуйся, Мар'я,
Радуйся, крэсная дзеўка,
Сын Божы нарадзіўся,
І на яслі палажыўся.
Радуйся, Мар'я,
Радуйся, крэсная дзеўка,
Рождэство тваё.
Нарадзіла Божа Маці
Сына рожджоного
Іесуса Хрышчоного.
Радуйся, Мар'я,
Радуйся, крэсная дзеўка,
Рождэство тваё.

**МАТКА ЮР'Я КЛІКАЛА** (юраўская)
Матка Юр'я клікала,
Гэй! Да падай, сынку, ключыкі:
І гэй! Да адамкнуці зямліцу,
Да выпусціці сваю расіцу.
Да на ціхое лецечко,
О гні! На буйнае жыцячко.
*Запісала Яроменак Тамара Анатольеўна ў в. Колкі Нясвіжскага раёна Мінскай вобласці ад Антановіч Антаніны Захараўны, 1901 г. н.*

### Сямейна-бытавая абрадавая паэзія

ВЯСЕЛЬНЫЯ ПЕСНІ

**СВАТКО НА ПАРОГ ЛЕЗЕ**
Сватко на парог лезе
Ды ў печ пазірае:
Ці луста капуста,
Ці вялікі гаршчок кашы.

**ЗАЖАДАЛА ДЗЕВАНЬКА**
Зажадала дзеванька
З зелляў вянок звіць.
Паслала свайго брацікa
У лес па каліну.
Яшчэ братко не з'язджае,
Ужо каліна адцвітае.
Няма з чаго вянка звіць.
*Запісана Грынкевіч Нінай Іванаўнай у в. Колкі Нясвіжскага раёна Мінскай вобласці ад Швайко Настассі Пятроўны, 1886 г. н.*

**ВЫ ДЗЕВАЧКІ, ДЫ НАШЫ СЯСТРЫЦЫ**
Вы дзевачкі, ды нашы сястрыцы,
Наша зямля ды прамяніца,
Ды не родзіць у нас пшаніца.
Мы ехалі ды каля броду,
Уваліўся наш піражок у воду.
Пабяжыце ды нашым слядком
Ды знайдзіце піражок з мядком.
*Запісала Гурко З. В. у в. Смалічы Нясвіжскага раёна Мінскай вобласці ад Чайкі Марыі Іванаўны, 1900 г. н.*

### Пазаабрадавыя песні

ЖАРТОЎНЫЯ ПЕСНІ

**ЗАХАДЗІЛІ ШУРЫ-БУРЫ**
Захадзілі шуры-буры,
Камарыка з дуба здулі.
Та дрыша Ванюша, ура, ура.
Упаў камар на памосце,
Пабіў свае рэбры-косці.
Та дрыша Ванюша, ура, ура.
Упаў камар на карэнне,
Пабіў свае калені.
Та дрыша Ванюша, ура, ура.
Прыляцела муха-маці
Камарочка ратаваці.
Та дрыша Ванюша, ура, ура.
Ой, камарык, родны браце,
Дзе ж мне цябе пахаваці?
Та дрыша Ванюша, ура, ура.
Ні хавайце пры даліне,
Бо вырыюць мяне свінні.
Та дрыша Ванюша, ура, ура.





Да пахавайце ў цёмным лесе
Пры зялёненькім арэсе.
Та дрыша Ванюша, ура, ура.
Прыдуць дзеўкі арэхі рваць,
Камарыка ўспамінаць.
Та дрыша Ванюша, ура, ура.
*Запісана Грынкевіч Нінай Іванаўнай у в. Колкі Нясвіжскага раёна Мінскай вобласці ад Швайко Настассі Пятроўны, 1886 г. н.*

БЫТАВЫЯ ПЕСНІ

**АХ, БЫСТРАЯ РЭЧАНЬКА**
Ах, быстрая рэчанька,
Да як табе не цяжанька
І з лукі ў луку йдучы,
Шоўкавую траву мнучы,
Жоўты пясок прамываючы,
Белы камень прабіваючы.
Дзіця маё маладое,
Да як табе да ні цяжанька
Ад свае маткі ідучы,
І к чужой прыхаджаючы,
Наравы ды наровячы,
Цяжкае дзело робячы,
Рано па воду ходзячы,
Раннюю росу гонячы,
І ціхага салавейку будзячы.
*Запісана Анішчыкам Іванам Іванавічам у в. Лявонавічы Нясвіжскага раёна Мінскай вобласці ад Бялаш Ганны Ігнатаўны, 1903 г. н.*

**1971-1980 гг.**

### Каляндарна-абрадавая паэзія

**І, ОЙ, ДАЙ БОЖА** (масленічная)
І, ой, дай Божа (2 р.)
Дробны дожджык.
І каб гэты снег,
Да сагнало.
І каб гэты снег (2 р.)
Да сагнало.
Нам на вясну
Паказало.

**Й МАТКА ЮР'Я КЛІКАЛА** (юраўская)
Й матка Юр'я клікала,
Эй, да падай, сынку, ключыкі,
Да падай, сынку, ключыкі,
Гэй, да адамкнуці зямліцу,
Да адамкнуці зямліцу.
Гэй, да выпусціці зосіцу,
Да выпусціці зосіцу,
Гэй, да на яркую пшаніцу.
*Запісала Рудаўская Алена Антонаўна ў в. Казлы Нясвіжскага раёна Мінскай вобласці ад Харлові ч Вольгі Данілаўны, 1900 г. н.*

### Сямейна-абрадавая паэзія

ВЯСЕЛЬНЫЯ ПЕСНІ

**ДА ПРЫЙШЛО ДЗІЦЯ З ВЯНЦА**
Да прыйшло дзіця з вянца,
Ні прамовіло слаўца.
Толькі яно да прамовіло:
– Пані мамачка мая,
Пані мамачка мая,
Да ўжэ ж я ні твая (2 р.),
Да ўжэ ж того я пана,
Да ўжэ ж того я пана,
Што пад шлюбам стаяла (2 р.)
Пярсценкі да мяняла (2 р.).

**ДА ХВАЛІЎСЯ, ДРУЖАТКО**
Да хваліўся дружатко,
Ён вельмі харош.
Ён харош,
Аж у яго доўгі нос.
Да пасытуе канапель,
Ніхай дзяўбе, як верабей.
Ніхай скача, як белка,
Ніхай плача, як дзеўка.

**ОЙ, СВАХА СВАСЕ ПАКАРЫЛАСЯ ЗНАВАГУ**
Ой, сваха свасе пакарылася знавагу,
Ой, каб не было і майму дзіцяці знявагі,
Каб ні стаяла і цёмнае ночы пад акном,
Каб ні ўціpала і дробных слёзачэк рукавом.
Ой, каб не была і падпаветачка-хатачка,
Каб не была, што суседачка мамачка.

**ОЙ, У ЛЕСЕ, У ЛЕСЕ МЯДЗВЕДЗЬ ЗЫКАЕ**
Ой, у лесе, у лесе мядзведзь зыкае,
Будзе табе, дзевачка, свякроў ліхая.
Да нехай ліхая, я сама такая.
Яна будзе крычаці, а я буду маўчаці,
Яна будзе гаварыці, а я буду наравіці.

**І ДЗЯКАВАЦЬ БОГУ**
І дзякаваць Богу
Да й за дабру,
Угожы, што у гэтым доме,
Гаспадар гожы.
Наварыў піва
І гарэлкі,
Частаваў госці
І суседачкі.
Да што ж мы ж спілі,
Прылівай, Божа,
Да што мы з'елі,
Прыспарай, Божа,
Дай, Божа, маладым,
Добрую долю.

**ОЙ, РОДЭ, РОДЭ**
Ой, родэ, родэ,
Родэ Богата,
Перапевайце
Быдлам рагатым.
А вы, сестрыцы,
Хоць па целіцы.
А вы, браткове,
Хоць па валові.
А вы, суседкі,
Хоць па ягняці,
Штоб мела танда,
Што выганяці.

*Запісала Рудаўская Алена Антонаўна ў в. Казлы Нясвіжскага раёна Мінскай вобласці ад Таляка Мікалая Макаравіча, 1896 г. н.*

**1981-1990 гг.**

**Каляндарна-абрадавая паэзія**

**УЗЫШЛО, УЗЫШЛО** (калядная)
Узышло, узышло
Тры месячыка,
Гэй, калядо, калядо.
Было ў маці тры сыночкі,
Гэй, калядо, калядо,
Паўставалі, паўмываліcь,
Гэй, калядо, калядо,
Паехалі аж да месца,
Гэй, калядо, калядо,
А на месцы тры таночкі,
Гэй, калядо, калядо,
Тры таночкі, ўсе дзявочкі,
Гэй, калядо, калядо,
Адзін любіць берасцянку,
Гэй, калядо, калядо,
Другі любіць кабрынянку,
Гэй, калядо, калядо,
Трэці любіць камянчынку,
Гэй, калядо, калядо.

**ОЙ, ЧЫЯ ТО ДАЧКА, ЯК ЯГАДАЧКА** (калядная)
Ой, чыя то дачка, як ягадачка?
Святы вечар добрым людзям.
Базылёва дачка, як ягадачка.
Святы вечар добрым людзям.
Яна ў сені ўвайшла – сені заззялі.
Святы вечар добрым людзям.
Яна ў хату ўвайшла – паны стаялі.
Святы вечар добрым людзям.
Паны стаялі, шапкі здымалі.
Святы вечар добрым людзям.
Ці ты цароўна, ці каралеўна?
Святы вечар добрым людзям.
Бацькава дачка красна панначка.
Святы вечар добрым людзям.
Мы ж цябе красну не зняважаем.
Святы вечар добрым людзям.
І са шчадрацом цябе вітаем:
Святы вечар добрым людзям.

**ДОБРЫ ВЕЧАР, ПАНЕ ГАСПАДАРУ** (калядная)
Добры вечар, пане гаспадару,
Ой, Каляда (2 р.),
Харошыя маеш ты сыночкі.
Ой, Каляда (2 р.),
А што ж яны ў цябе робяць?
Ой, Каляда (2 р.),
У святліцы золата важаць.
Ой, Каляда (2 р.),
Наважылі 30 пудоў і 4.
Ой, Каляда (2 р.),
Тыя 30 пудоў пану гаспадару далі.
Ой, Каляда (2 р.).
А тыя 4 нам, каляднічкам, і калядзе.
Ой, Каляда (2 р.).

**КАЛЯДКІ БЛІЗКА** (калядная)
Калядкі блізка,
Каўбаскі нізка.
Святы вечор добрым людзям.
Дайце каўбасу,
Я дадому панясу.





Святы вечор добрым людзям.
Дайце другую,
Я пашчадрую.
Святы вечор добрым людзям,
Дайце трэцюю,
Хоць авечую.
Святы вечор добрым людзям.
Дайце крывянку,
Я закіну пад лаўку.
Святы вечор добрым людзям.

**ХАДЗІЛА, МУДЗІЛА СЕМСОТ МАЛАЙЦОЎ** (шчадроўская)
Хадзіла, мудзіла семсот малайцоў,
Святы вечор,
Семсот малайцоў, сем гарных хлапцоў,
Святы вечор,
Ды прыблудзілі к цёмнаму лясу,
Святы вечор,
К цёмнаму лясу, к новаму двару,
Святы вечор,
К новаму двару, к слаўнаму пану,
Святы вечор,
К слаўнаму пану, пану Кастусю,
Святы вечор,
Ой, устань, не спі, слаўненькі пане,
Святы вечор,
Устань ды паглядзі, што ў небе гудзе.
Святы вечор,
Што ў небе гудзе, прачыстая ідзе,
Святы вечор,
Прачыстая ідзе жыта радзіці,
Святы вечор,
Жыта радзіці, статку пладзіці,
Святы вечор.

**ОЙ, ВЯСНА, ВЯСНА** (вяснянка)
Ой, вясна, вясна,
А што ты нам прынясла?
На травіцу расіцу,
На лясочак лісточак.
На дзевачак пекнату,
На хлопчыкаў мласнату.
Ой, вясна, вясна,
Вясна, вясна красна,
А што ж ты нам прынясла?
Старым бабкам па кіёчку,
Малодачкам па бердачку.
Ой, вясна, вясна,
А што ты нам прынясла?
Ой, дзяўчатам па вяночку,
А малодачкам па дзіцятку,
А старым бабкам па прызбачцы.
Ой, вясна, вясна,
А што ж ты нам прынясла?
Малойчыкам па брылёчку,
А мужчыначкам па сошаццы,
А старым дзядам па кіёчку.

**ІШЛА КУПАЛКА СЯЛОМ, СЯЛОМ** (купальская)
Ішла Купалка сялом, сялом,
Ой, рана, рана, рана, раненька.
Давала хлопцам чалом, чалом.
Ой, рана, рана, рана, раненька.
А чаго, хлопцы, вы сядзіцё?
Ой, рана, рана, рана, раненька.
А йдзіце, хлопцы, вы ў лясочак,
Ой, рана, рана, рана, раненька.
А там пад дубам кастры гараць.
Ой, рана, рана, рана, раненька.
А там Купалка красуецца.
Ой, рана, рана, рана, раненька.

**ТО-ТО ДЫ ПЯТРОВЫЯ НОЧЫ** (пятроўская)
То-то ды Пятровыя ночы,
Выпяклі ведзьме вочы, то-то-то,
То-то, каб ведзьма не хадзіла
І жыта не круціла, то-то-то
То-то, каб жыта не круціла,
І расы не збірала, то-то-то,
То-то, каб расы не збірала,
І ў гаршочках не варыла, то-то-то,
То-то, каб у гаршочках не варыла,
І дзяцей не карміла, то-то-то,
То-то, каб дзяцей не карміла,
І ведзьмят не пладзіла, то-то-то.

*Запісала Садоўская Анжаліка ў в. Еськавічы Нясвіжскага раёна Мінскай вобласці ад Новік Елізаветы Вінцэнтаўны, 1928 г. н.*

**Сямейна- абрадавая паэзія**

ВЯСЕЛЬНЫЯ ПЕСНІ

**БРАТ СЯСТРЫЦУ НА ПАСАД ВЯДЗЕ**
Брат сястрыцу на пасад вядзе
Да гібкую кладачку кладзе,
Кладачка, не ўгібніся,
А сястрыца, не ўлякніся (не спалохайся)
Кладачка ўгібнулася,

А сястрыца ўлякнулася,
Дай, Божа, маладым добрую долю.

**ХАДЗІЛА ДЗЕВАЧКА ПА ПОЛЮ**

Хадзіла дзевачка па полю,
Звіла сабе вяночак з куколю,
Да прасіла бацюшкі дзянёчка,
Пакасіць з куколю вяночка.
– Панасі, панасі, а ў вечар дзевачкам аддасі.
Яны табе па кветачцы разаўюць
І па песянцы спаюць.

**ЦІ Я ТАБЕ, МАМАЧКА, НАДАЕЛА**

Ці я табе, мамачка, надаела,
Што ты аддаеш мяне за дзеда,
Ці я табе кудзелькі не прала,
Ці я табе пасцелькі не слала,
Прала кудзельку тоненько,
Слала пасцельку мякенько.

*Запісала Рабко Святлана ў в. Казлы Нясвіжскага раёна Мінскай вобласці ад Ярош Ганны Іванаўны, 1921 г. н.*

**ОЛЕНЬ ПО БОРУ ХОДЗІЦЬ**

Олень по бору ходзіць (2 р.),
Ясенько за ім бродзіць (3 р.),
Стрэльбачку набівае (3 р.),
У аленя пападае.
Не папаў у аленя (2 р.),
То папаў у каменя.
Не папаў у аленіцу (2 р.),
А папаў у каменіцу.

*Запісала Рабко Святлана ў в. Казлы Нясвіжскага раёна Мінскай вобласці ад Аксяневіч Вольгі Сямёнаўны, 1917 г. н.*

РАДЗІННЫЯ ПЕСНІ

**НАРАДЗІЛА ТЫ МНЕ, МІЛА**

Нарадзіла ты мне, міла,
Сына буйна і красіва,
Сын наш будзе падрастаць,
А мы песенькі спяваць.
А цяпер, мая Таццяна,
Я табе адной спаю:
Ты красіва, ты кахана,
Я адну цябе люблю.
Крэпні, ты, мая радная,
Нічым сябе не трудзі,
А ў наступны год, мілая,
Яшчэ сына нарадзі.

**ЛЯЦІЦЬ БУСЛІК**

Ляціць буслік,
Клёкаць хоча,
Дзеўка плача,
Сына хоча.
Нарадзіла яна сына
Ды ў мужа папрасіла:
– Мужык мілы, мужык добры,
Хочу сыра, хочу мёду,
Каб я мёду паспытала,
Я бы зразу акрыяла.
– Гадуй, Божа, малое,
Каб на той год было другое.

*Запісала Рабко Святлана ў в. Казлы Нясвіжскага раёна Мінскай вобласці ад Аксяневіч Вольгі Сямёнаўны, 1917 г. н.*

**ОЙ-ЁЙ, УЧОРА, УЧОРА, КУМОЧКІ МАЕ**

Ой-ёй, учора, учора, кумочкі мае,
У нас радзінкі былі, ой-ей-е,
А сёння, мае ж вы кумочкі,
Мы на хрэсьбінкі прыйшлі, ой-лі-лі.
Не шкадуйце, мае кумочкі,
Па рубельчыку даць,
За гэты грошы мы, кумочкі,
Аж да серады будзем гуляць.
Не шкадуйце, мае кумочкі,
Па залатнічку даць,
То мы будзем, мае кумочкі,
Дзве нядзелечкі гуляць.

*Запісала Рабко Святлана ў в. Казлы Нясвіжскага раёна Мінскай вобласці ад Сокал Марыі Адамаўны, 1928 г. н.*

**Пазаабрадавая лірыка**

**ВАЛЫ МАЕ ПАЛАВУЯ**

Валы мае палавуя,
Да й чаго ж вы спахмурнеля?
Гэй, гэй, гэй,
Да й чаго ж вы спахмурнеля? (2 р.)
Да й таго ж мы спахмурнеля,
Што зялёна сеня еля,
Гэй, гэй, гэй,
Што зялёна сеня еля (2 р.),
Не зялёна сеня еля,
Да й тры разы ву Крым хадзеля,
Гэй, гэй, гэй,
Да й тры разы ву Крым хадзеля (2 р.),
Да й тры разы ву Крым хадзеля,
Ву Крым ішлі, цяжка везлі,
Гэй, гэй, гэй,
Ву Крым ішлі, цяжка везлі (2 р.),
Ву Крым ішлі, цяжка везлі,
З Крыму едуць да й рыкаюць,
Гэй, гэй, гэй,
З Крыму едуць да й рыкаюць (2 р.),
З Крыму едуць да й рыкаюць,
Пад шынкарку пад’язджаюць,
Гэй, гэй, гэй,
Пад шынкарку пад’язджаюць (2 р.),
Ты, шынкарка маладая,
Па чым у цябе пляшка гарэлкі,
Гэй, гэй, гэй,
Па чым у цябе пляшка гарэлкі (2 р.).

**ОЙ, ДУБРОВА, ТЫ ЗЯЛЁНА**

Ой, дуброва, ты зялёна,
Ой, дуброва, ты зялёна,
Цераз цябе шлях дарога,
Цераз цябе шлях дарога,
Цераз цябе купцы едуць,
Цераз цябе купцы едуць.
На дуброве дубры рэжуць (2 р.),
Па дуброве дым уецца (2 р.),
А ўсе мужы з вайны едуць (2 р.),
Майго мужа каня ведуць (2 р.),
Ву, салдаты, ву, жанеры (2 р.),
Дзе ву майго мужа дзелі (2 р.),
Дзе ву яго каня узялі? (2 р.),
Ўзялі каня на дуброве (2 р.),
Ляжыць мілы ў чыстым полі (2 р.).
Ў правай руцэ руж’е дзержыць (2 р.),
А леваю росы берэць (2 р.),
Да сэрданька палівае (2 р.),
Таварышам прамаўляе (2 р.),
Таварышы, братцы мае (2 р.),
Будзеце ў краі маім (2 р.),
Накажыце жане маёй (2 р.),
Няхай яна мяне не жджэ (2 р.),
Няхай яна замуж ідзе (2 р.),
Няхай ня йдзе за салдата (2 р.),
За салдатам гора ймецца (2 р.),
Не раз, не два наплачэцца (2 р.),
Няхай ідзе за жынера (2 р.),
За жынерам добра будзе (2 р.),
Яна мяне не забудзе (2 р.),
Яна мяне любіць будзе (2 р.).

*Запісала Садоўская Анжаліка ў в. Еськавічы Нясвіжскага раёна Мінскай вобласці ад Садоўскага П. В., 1941 г. н.*

**УСТАНУ Я**

Устану я,
Устану я ранюсенька,
Умыюся бялюсенька.
Умыюся,
Умыюся бялюсенька.
Выйду я на ганачак,
Выйду я,
Выйду я на ганачак,
Гляну я на зораньки,
Гляну я,
Гляну я на зораньки.
Мілы мой з вайны едзя,
Мілы мой,
Мілы мой з вайны едзя,
Коніка ў руках ведзя,
Коніка,
Коніка ў руках ведзя.
Я ж яму радай стала,
Я ж яму,
Я ж яму радай стала,
Я ж яго пераймала,
Я ж яго,
Я ж яго пераймала,
Коніка,
Коніка за грывачку,
Мілага за шынечку.
Коніку,
Коніку – аўса, сена,
З міленькім – сама села.
Коніка,
Коніка ў ва стаенку.
З міленькім ў ва спаленку.

**А ЗА ЛІХІМІ ЗА МАРОЗАМІ**

А за ліхімі за марозамі
Рутачка не ўсходзіць (3 р.),
А за людскімі за языкамі
Міленькі ня ходзіць (3 р.).
Ой, узыдзі, узыдзі,
Узыдзі, рутачка,
Ходзя завяжыся (3 р.),
Ой, прыдзі, прыдзі,
Прыдзі, міленькі,
Хоця пакажыся (3 р.).

**ЛЯЦЕЛІ ГУСКІ**

Ляцелі гускі радом, радом,
Гукнулі гускі разом, разом:
– Чаму, лясочак, не адзяешся,
Чаму, Іванька, не жэнішся,

Чаму, Іванька, не жэнішся?
– Як жа я магу жаніціся,
Як жа я магу жаніціся,
Дзевачка мала не вырасла,
Дзевачка мала не вырасла.
Гуляць на вулку не выходзіла,
Гуляць на вулку не выходзіла,
Русае коскі не выплятала.

*Запісала Садоўская Анжаліка ў в. Еськавічы Нясвіжскага раёна Мінскай вобласці ад Новік Елізаветы Вінцэнтаўны, 1928 г. н.*

### Фальклорная проза

**Легенда пра назву вёскі Казлы**

Дзе зараз стаіць вёска Казлы, раней быў лес, балоты і рэкі. У тых лясах вадзіліся козы. Вось таму і назвалі гэтую вёску Казлы.

*Запісала Патапенка Ю. У. у в. Казлы Нясвіжскага раёна Мінскай вобласці ад Галяка Мікалая Макаравіча, 1904 г. н.*

**Легенда пра назву вёскі Гусакі.**

Раней у вёсцы жыў дзядзька. І хадзіў ён неяк як гусак. Яго брат таксама хадзіў як гусь. А родных у іх было шмат. І яны засяліліся разам. Іх мянушка – Гусь. Калі прыйшлі палякі, то называлі людзей “геньсьмі”. А калі прыйшлі немцы, то назвалі жыхароў “гесамі”, а рускія назвалі “гесямі”. Таму ў гэтай вёсцы жывуць людзі з прозвішчам Гесь, а сама вёска называецца Гусакамі.

*Запісала Патапенка Ю. У. у в. Гусакі Нясвіжскага раёна Мінскай вобласці ад Гесь Яўгеніі Дзямену’еўны, 1922 г. н.*

### 1991 - 2000 год

### Каляндарна-абрадавая паэзія

**ПАЙШЛА КАЛЯДА ПА ДЗЯРЭЎНІ, КАЛЯДУЮЧЫ** (калядная)

Пайшла Каляда па дзярэўні, калядуючы,
А за ёю дзеўкі, да шчадруючы.
Пайшла Каляда ў першу хату,
А ў гэтай хаце куццю таўкуць.
Пайшла Каляда ў другуую-трэцюю хату,
А там сала шыпіць.
Пайшла Каляда ў чацверту хату,
Там золата і срэбра блішчыць.
Пайшла Каляда ў пяту хату,
А ў пятай хаце каўбасу пякуць.
Каўбасу пякуць, дык і нам жа дадуць,
Хоць чуць-чуць, але дадуць,
Каб сваты прыехалі па вашу дочку.

*Запісала Жалнярэвіч Наталля ў в. Гусакі Нясвіжскага раёна Мінскай вобласці ад Гесь Н. Я., 1936 г. н.*

**ОЙ, РАНА, ВЕЛЬМІ РАНА КУРЫ ЗАПЕЛІ** (шчадроўская)

Ой, рана, вельмі рана куры запелі,
Святы вечар. Вечар святы.
Я ж дык раней за Івана ўстаў,
У двары пахадзіў, кароў падаіў.
Кароў падаіў, дзяцей напаіў,
Званком пазваніў,
Званком пазваніў, хлопцаў разбудзіў.
Уставайце, хлопцы, коней сядлайце, да й ужо паедзем,
У чыста поле на пагулянне,
Дзеўку сватаці.
Да й высваталі дзеўку ў церамі.
Да й будзе мне, маладому, жана
Да й з церамам.
Святы вечар. Вечар святы.

*Запісала Жалнярэвіч Наталля ў в. Гусакі Нясвіжскага раёна Мінскай вобласці ад Буката Г. П., 1915 г. н.*

**СЁННЯ ЎНАЧЫ МАСЛЕНІЦА ПРЫЙШЛА** (масленічная)

Сёння ўначы Масленіца прыйшла,
Прыляцела ластаўка,
Села ды на жэрдачку,
Шчабятала вестачку.
Ластавіца песню спела,
Ды й назад у поле паляцела.
Даганяйце ў чыстым полі!
Да й спытайце ў яе,
Што робіцца на Нясвіжчыне.
Хлопцы жэняцца,
І дзеўкі замуж ідуць.

*Запісала Жалнярэвіч Наталля ў в. Гусакі Нясвіжскага раёна Мінскай вобласці ад Чурак А. С., 1910 г. н.*

**ПРЫДЗІ, ВЯСНА, ПРЫДЗІ, ВЯСНА** (вяснянка)

Прыдзі, вясна, прыдзі, вясна,
Прыдзі, прыдзі, красна,
К нам у таночак.
Прынясі нам збожжа,
Прынясі нам красак,
Каб было нам з чаго звіць вяночак.
Едзя вясна, едзя
На конях залатых
Дай у зялёных санях.
Едзя вясна, едзя,
Зямлю аручы,
Зямлю аручы, да й семя сеючы.
Вязе вясна, вязе красна
Ясныя дзянёчкі,
Да й частыя дожджычкі,
Высокія травы, яркія цвяточкі
Ды й нам на вяночкі.

*Запісала Жалнярэвіч Наталля ў в. Гусакі Нясвіжскага раёна Мінскай вобласці ад Гесь Н. Я., 1936 г. н.*

**ВОЛ БУШУЕ, ВЕСНУ ЧУЕ** (вяснянка)

Вол бушуе, весну чуе,
Вол бушуе, весну чуе,
Воран грача, сыра хоча,
Воран грача, сыра хоча,
Дзеўка плача, замуж хоча.
Не бушуй, волік, наарэшся,
Не бушуй, волік, наарэшся,
Не грач, воран, нажарэшся,
Не грач, воран, нажарэшся,
Не плач, дзеўка, нажывешся,
Не плач, дзеўка, нажывешся.

**ДАЙ НА ВЯЛІКДЗЕНЬ, НА ПЕРШЫ ДЗЕНЬ** (валачобная)

Дай на Вялікдзень, на першы дзень,
Ой, да віно зеляно.
Да ўсе ж, усе ж сваткі да гуляць пайшлі,
Ой, да віно зеляно.
Адзін толькі хлопяц да гуляць не йшоў,
Адзін толькі хлопяц да гуляць не йшоў,
Усё па мяжы хадзіў да жыцейка глядзеў,
Усё па мяжы хадзіў да жыцейка глядзеў,
Ой, да віно зеляно.

**ВЯЛІК СВЯТЫ НАМ ДЗЕНЬ НАСТАЎ** (валачобная)

Вялік святы нам дзень настаў,
Со слава з гробу восіял,
Хрыстос васкрэс (3 р.).
Ідзіце: дайце знаць о том,
Што Ісус Хрыстос із мёртвых встал,
Хрыстос васкрэс (3 р.).
Царжроны плакаць ліш пайшлі,
Што цело в гробе не нашлі,
Но смотрат в гроб,
Там нехто есць.

*Запісала Жалнярэвіч Наталля ў в. Гусакі Нясвіжскага раёна Мінскай вобласці ад Буката Г. П., 1915 г. н.*

**ОЙ ТЫ, ЮР’Я, МІКОЛА** (юраўская)

Ой ты, Юр’я, Мікола,
Абыдзі жыта наўкола.
Юр’я кажа, што абайду,
Мікола кажа, што пагляджу.
Юр’я кажа, што караніста,
Мікола кажа, што каласіста.
Юр’я кажа, што ў копачкі,
Мікола кажа, што ў торбачкі.

*Запісала Жалнярэвіч Наталля ў в. Гусакі Нясвіжскага раёна Мінскай вобласці ад Усовіч А. У., 1927 г. н.*

**ОЙ, СЯГОДНЯ КУПАЛО** (купальская)

Ой, сягодня Купало,
Заўтра Ян,
Да будзя вам, хлопчыкі,
Да ліхо вам.
А якоё ліхоё,
Такоё паганеце, сабачкі,
Да ў поле.
Да не много сабачак –
Дваццаць шэсць.
На ўсіх сабачках адна шэрсць.
– Адна сучка падласа –
Гэта вам, хлопчыкі, да на мясо,
Адна сучачка да рабая,
Гэта вам, хлопчыкі, маладая.
– Адзін сабачка да й рабы,
Гэта вам, дзяўчаткі, малады.

*Запісала Жалнярэвіч Наталля ў в. Гусакі Нясвіжскага раёна Мінскай вобласці ад Гапановіч П. В., 1915 г. н.*

**ПЯТРОВА НОЧКА НЕВЯЛІЧКА** (пятроўская)

Пятрова ночка невялічка,
Не выспалася да дзевачка,
Ягадкі збірала – драмала,
А я перабірала, ды заснула.
Як прыехаў міленькі, то не чула.
– Уставай, дзевачка,
Годзе табе спаць,
Пара табе, дзевачка,
Падаркі гатаваць.

– Мае падаркі не для цябе,
Мае падаркі для мяне.
*Запісала Жалнярэвіч Наталля ў в. Гусакі Нясвіжскага раёна Мінскай вобласці ад Буката Г. П., 1915 г. н.*

**ПЕРАГАНІ, БОЖА МОЙ, ХМАРКІ** (жніўная)
Перагані, Божа мой, хмаркі,
Ай-яй-яй, дай перагані, Божа, хмаркі
Ў чужую староначку,
Дзе пажалі, пакасілі
Да снапочкі павазілі.
А ў нас не жата ды не скошана,
А ў нас не жата, ды й не скошана,
Да ў гуменца яшчэ й не звожана,
Да ў гуменца яшчэ не звожана.

**ДЗЕВАНЬКА З ПОЛЯ ІШЛА** (жніўная)
Дзеванька з поля ішла,
За паясочкам сярпочак нясла,
За плячыма – калысачку,
А на руках – дзіцятачка,
Калысачка бяразова,
Дзіцятачка аднагадова.
*Запісала Жалнярэвіч Наталля ў в. Гусакі Нясвіжскага раёна Мінскай вобласці ад Лапцэвіч Л. І., 1916 г. н.*

### Сямейна-абрадавая паэзія

#### ВЯСЕЛЬНЫЯ ПЕСНІ

**ДЗЕ ТВАЯ, ДЗЕТАЧКА, РОДНАЯ МАТАЧКА**
– Дзе твая, дзетачка, родная матачка?
Чаму яна табе прыбору не прыбірае?
Чаму яна табе, маладая, да шлюбу не выпраўляе?
– Мая матачка за трыма замочкамі:
Першы замочак – зялёны дзярночак,
Другі замочак – жоўты пясочак,
А трэці замочак – цісавае досточка.
Зялёны дзярночак, адвярніся,
Жоўты пясочак, адсыпіся,
Прашу цябе, мамачка, прашу цябе, родная,
На сваё вяселле на сірочае.
Прыеду ў суботу вечар
Каравай рашчыняць,
А ў нядзелю рана –
Да шлюбу выпраўляць.

**ПАЙШОЎ НА ВЯСЕЛЛЕ НАШ СВАТОК**
Пайшоў на вяселле наш сваток,
Павязаўшы крыжом ручнічок.
Усе пра свата кажуць: “Сватка харош”.
А ў свата доўгі буслаў нос.
А ў свата лыса галава
Ды казліна рыжа барада.
Плавае па хаце як таран,
Лупае вачыма як баран.
Галавою, сватка, патрасі,
Маладзіцам чаркі паднясі.
Калі, сват, гарэлкі не дасі,
Караваю трасцу ты з’ясі.
*Запісала Круглік А. А. ў г. Нясвіж Мінскай вобласці ад Крыўко Серафімы Юльянаўны, 1928 г. н.*

#### ХРЭСЬБІННЫЯ ПЕСНІ

**А Ў СЕНЦАХ, СЕНЦАХ**
А ў сенцах, сенцах
Музыка грае,
А ў хатачцы, у святленькай
Хрэсьбінкі гуляюць.
За полагам, за полагам
Там радзіха ляжыць,
А ў галавах, а ў галавах
Кубак мёду стаіць.
Наша Анютачка, наша Анютачка
Вялікага роду.
Мы й нап’емся, наямося
Салодкага мёду.
*Запісала Жалнярэвіч Наталля ў в. Гусакі Нясвіжскага раёна Мінскай вобласці ад Буката Г. П., 1915 г. н.*

#### ПАХАВАЛЬНЫЯ ГАЛАШЭННІ

**А, ДАЧУШКА ТЫ МАЯ**
А, дачушка ты мая!
А, зязюлечка ты мая!
А, калі ж ты да мяне ў госцейкі прыйдзеш?
Ці зімою прыедзеш, ці ўлетку?
Ці зязюлькаю закукуешь?
Ці салавейкаю зашчабечаш?

**А, МАЯ МАМАЧКА-ЗЯЗЮЛЕЧКА**
А, мая мамачка-зязюлечка!
Нашто ты нас сіроткамі пакінула.
А, як выйдзем на вуліцу,
Дык і плакаць будзем,
Бо ўсе мамкі за ручкі дзетак водзяць,





А нашай мамачкі нідзе не відаць.
І болей нідзе не ўвідзімся мы:
Ні на вуліцы зялёненькай,
Ні ў кампаніі вясёленькай.

**А, МОЙ МІЛЕНЬКІ, А, МОЙ РОДНЕНЬКІ**
А, мой міленькі, а, мойродненькі,
А нашто ты нас пакінуў?
Да мы ж цябе глядзелі,
Да мы ж цябе слухалі.
Да ты ж мяне ўдавою зрабіў,
Да ты ж малых дзетак аставіў,
Дый на ногі іх яшчэ не паставіў.
А чаго ж ты зазлаваў на нас?
А чаго ж ты не гаворыш з намі!
*Запісала Жалнярэвіч Наталля ў в. Гусакі Нясвіжскага раёна Мінскай вобласці ад Чурак А. С., 1910 г. н.*

### Дзіцячы фальклор

#### КАЛЫХАНКІ

Люлі-люлі, падраў шуляк куры,
Няхай дзярэ гускі
Дзеткам на падушкі.

* * *
Баю-баю-баю,
Я катка налаю,
Каб сюда ён не хадзіў,
Маю дзетку не будзіў.

* * *
Баю-баю-баю,
Не лажыся з краю,
Прыдзя шэранькі ваўчок,
Схваціць дзетку за бачок.

* * *
Ну і рогі ў аленя:
Метраў два яны, не меней,
Ад такой пагрозы
Уцякаюць козы.
Баю-баю-бай.

* * *
А ты, коцік, не гуляй,
Начовачку выбірай,
Начовачкі слізкі,
Вядзерачкі блізкі.
Круг абарваўся,
А ты так астаўся.

* * *
Баю-баю-баінькі,
Прабяжалі заінькі.
– Ці спіць ваша дзетачка,
Дзетачка-малютачка?
– Ухадзіце, заінькі,
Не мяшайце баінькі.

* * *
А-а-а-а, малое,
А на лета-другое
Гэта будзе нянька,
А другое – лялька.
Гэта будзя калыхаць,
А малое будзя спаць.
Гэту будзям малаком,
А другую – кулаком.
*Запісала Жалнярэвіч Наталля ў в. Гусакі Нясвіжскага раёна Мінскай вобласці ад Жалнярэвіч Т. І., 1938 г. н.*

– Люлі-люлі, мой маленькі,
Закрый вочкі, пара спаць,
Вырасце, сынок, вялікі,
Пойдзем у армію служыць.
Сам таварыш Варашылаў
Будзе там цябе вучыць,
Злосны вораг за мяжою
Хоча зноў вайну адкрыць.
І ты будзеш, мой сынок,
Гэтых гадаў трапна біць.
Маці села над калыскай,
Стала сына калыхаць:
– Надышла ўжо і ночка,
Люлі-люлі, пара спаць.
*Запісала Жалнярэвіч Наталля ў в. Гусакі Нясвіжскага раёна Мінскай вобласці ад Гесь Н. Я., 1936 г. н.*

### Фальклорная няказкавая проза

**Легенда пра назву вуліцы Кітайшчына**

Ёсць у Грыцкевічах вуліца, якя называецца Кітайшчына. Яшчэ раней на гэтай вуліцы жыло шмат сем’яў з вялікай колькасцю дзяцей. Па вуліцы часта дзеці бегалі вялікімі чародамі. Менавіта таму і Кітайшчына. Гэта

цяпер Кітайшчына, а раней проста называлі Кітай.

*Запісала Морская Вольга Анатольеўна ў в. Грыцкевічы Нясвіжскага раёна Мінскай вобласці ад Шах Зінаіды Антонаўны, 1928 г. н.*

**Легенда пра назву вёскі Кіркаўшчына**

У вёсцы ў нас хто як гаворыць, а бацька мой мне расказаў, што раней, калі яшчэ былі паны, у нашым мястэчку жыў пан. Уся зямля: і Чанавічы, і Лань, і Кіркаўшчына, і Іванава, і Касмовічы, і Блячына – усё гэта была яго зямля. Работнікаў у яго было шмат, у кожнага была свая праца. Самыя працавітыя былі там, чалавек 20. Неяк адправіў ён іх, каб прыгатавалі зямлю сеяць. Узялі яны кіркі і лапаты і пайшлі. Доўга хадзілі яны туды зямлю рабіць, а калі пан памёр, там і аселі. Звалі іх “людзі з кіркамі”, а месца празвалі “Кіркаўшчына”.

*Запісала Боган В. І. ў в. Кіркаўшчына Нясвіжскага раёна Мінскай вобласці ад Буглай Зінаіды Міхайлаўны, 1925 г. н.*

## 2001-2012

### Каляндарна-абрадавая паэзія

**ШЧОДРЫ ВЕЧАР, ДОБРЫ ВЕЧАР**
(шчадроўская)

Шчодры вечар, добры вечар.
Рана Таня ўстала, касу расчасала.
Шчодры вечар, добры вечар.
Не давайце доўга стаяці,
Не давайце снега таптаці.
Баю-баю лышча – вынясіце нам піражочышча,
Кусок мяса, кальцо каўбаскі.
Шчодры вечар, добры вечар.

**А ЎЧОРА З ВЯЧОРА НАМ ЗОРКА СВЯЦІЛА** (калядная)

А ўчора з вячора нам зорка свяціла,
Маці Божая Сына нарадзіла,
Сына нарадзіла, у плёнкі спавіла,
Ангелаў прасіла калыхаці Сына:
– Калышыце Сына, спявайце пясёнкі,
Грайце музыкі, Новы год, Новы год,
Грайце музыкі.

**ВЯСНА, ВЯСНА КРАСНАЯ** (вяснянка)

Вясна, вясна красная!
Прыдзі, вясна,
З радасцю, радасцю,
З вялікай міластью,
Са льном высокім,
З корнем глыбокім,
З хлебам абільным!
Жаваранкі прыляцелі,
На галоўку дзецям селі.

**СЯГОДНЯ Ў НАС КУПАЛА**
(купальская)

Сягодня ў нас Купала,
Сам Бог агонь расклаў,
Усіх святых к сабе зазваў.
Толькі няма Ільі з Пятром,
Пайшоў Ілья каля жыта.

**ОЙ, МАЛАДАЯ МАЛАДЗІЦА**
(купальская)

Ой, маладая маладзіца,
Выйдзі на вуліцу,
Развядзі нам купальніцу.
Ой, як я магу выхадзіць,
У мяне дзіця маленькае?
Што дзіця пісне,
То кулаком сціснe,
Што дзіця квакне,
То кулаком гракне,
Некаму ўстаці, яго пакалыхаці.

**ОЙ, ЗАКАЦІЛАСЯ СОНЕЙКА**
(жніўная)

Ой, закацілася сонейка
Ды з гары ў даліну.
Ой, зрабі нам вячэраньку,
Няхай вечар дабрэй будзе.
Нахадзіліся ножанькі,
Ой, набраліся ручанькі,
Сярпы не жнуць – нажаліся,
Насвяціліся вочанькі
Аж да цёмнае ночанькі.

*Запісала Сурма Антаніна Іванаўна ў в. Хвоева Нясвіжскага раёна Мінскай вобласці ад Курыла Ганны Адамаўны, 1915 г. н.*





### Сямейна-абрадавая паэзія

ВЯСЕЛЬНЫЯ ПЕСНІ

**ЛЯЦЕЛІ ГУСАЧКІ ЦЕРАЗ САД**

Ляцелі гусачкі цераз сад,
Крыкнулі, гукнулі на ўвесь сад:
– Пара табе, Іначка, на пасад.
– Што ж вам, гусачкі, да таго,
Ёсць у мяне мамачка для таго,
Як скажа пайсці, я й пайду,
А скажа сесці, я й сяду,
А як дасць чарачку, я і вып’ю,
А за трэцюю дзенькую.
Дзенькую, мамачка, дзенькую,
Пасследнюю ночаньку начую,
А заўтра ўжо не прыду,
Не на адну, не на дзве.

**ЯК ПРЫЙШЛІ МЫ НА ЗРУЧЫНЫ**

Як прыйшлі мы на зручыны,
А там дзверы пазакручаны.
Пакуль дзверы адкруцілі,
Нашу Светачку зрабілі.
Зялёненькі падалешнічак,
Калі рос, калі раскідаўся (2 р.),
Калі ў веццяя браўся?
А я рос у вялікі пост.
Раскідаўся проці лецічка (2 р.),
Проці лецічка, проці цёплага.
Ты, Светачка, ты, малодыя,
Калі расла, калі разумнела? (2 р.).
А калі замуж паспела?
А я расла ў матулечкі,
Разумнела ў татулечкі.

**ДЗЯКУЙ, ДЗЯКУЙ, МАЯ МАМАЧКА**

Дзякуй, дзякуй, мая мамачка,
На твой род,
Чаму мяне не падзяржала
Яшчэ з год?
Ой, хай бы я русую касаньку
Часала,
Ой, хай бы я русую касаньку
Часала,
Ой, хай бы я русую касаньку
Часала,
Няхай бы я яшчэ з годзік
Гуляла...

**ЕЛКА НА ЕЛКУ НАХІЛІЛАСЯ**

Елка на елку нахілілася,
Сваха к свасе скланілася.
Елка на елку нахілілася,
Сваха к свасе скланілася.
– Штоб з майго да дзіцяці не глумілася.
– А ў мяне да чатыры бочкі,
Я ж іх на гарэліцы прап’ю,
Я ж іх на гарэліцы прап’ю,
Да тваему дзіцяці, да што хоч зраблю...

**БРАТ СЯСТРУ НА ПАСАД ВЯДЗЕ**

Брат сястру на пасад вядзе,
Вядзе, вядзе, да выпытвае:
– Сястрыца мая родная!
Мая родная,
Сястрыца мая родная!
Хто ў цябе надмілейшы?
Надмілейшы,
Хто ў цябе надмілейшы?
Хто ў цябе надвярнейшы,
Надвярнейшы,
Хто ў цябе надвярнейшы?
А ці бацька, а ці матка?
Ці матка,
А ці бацька, а ці матка?
А ці родненькі братка?
Братка,
А ці родненькі братка?
– Надвярнейшы мой брацюхна.
Мой брацюхна,
Надвярнейшы мой брацюхна.
Надмілейшы Іванка.

**ОЙ, БРАТ СЯСТРЫ**

Ой, брат сястры
Касу расплятаў,
І дзе тыя ўплёткі
Ты дзяваў?
І дзе тыя ўплёткі
Ты дзяваў?
А ці меншай сястры
На знак даў?
А ці меншай сястры
На знак даў:
– Вот табе, сястрыца,
Сястрын знак
Вот табе, сястрыца,
Сястрын знак.

**КАРАВАЙ**
Каравай, каравай, караваю,
А хто ж цябе задумаў?
А хто ж цябе задумаў?
А задумаў мяне хлопчык,
А задумаў мяне хлопчык
У чыстым полі аручы,
У чыстым полі аручы,
Ды пшанічаньку сеючы,
Ды пшанічаньку сеючы:
– Зарадзі ж, Божа, пшоначку,
Зарадзі ж, Божа, пшоначку,
Да на маладую жоначку.

*Запісала Кісун Ірына Вячаславаўна ў в. Сейлавічы Нясвіжскага раёна Мінскай вобласці ад Некраш Станіславы Браніславаўны, 1936 г. н.*

## ПАХАВАЛЬНЫЯ ГАЛАШЭННІ

**А, МАЯ МАМАЧКА**
А, мая мамачка,
Да што ж ты нам зрабіла,
Нашто ж ты нас кінула?
Да мы ўсе цябе просім:
Прыйдзі к нам на вячэрку.
Да ці ж ты не чуеш,
Ці ты зазлавалася,
Што ж к нам няйдзеш сёння?
...А цябе ж мы просім:
А ты ж нас не забывай,
А ты ж нам усё прашчай,
А ты нам усё раскажы,
А ты нам хоць сасніся.

**ДАЧУШКА МАЯ ЛЮБАЯ**
Дачушка мая любая,
А зрабіла мяне вяселейка пячальнае.
Нашы песні невясёлыя,
Нашы песні маркотныя,
А музыкі не іграюць,
А ні дзевачкі не скачуць,
А ўся наша бяседанька
Слёзкамі ўмываецца.

**ТАТАЧКА МОЙ**
Татачка мой,
Куды ж ты выбраўся ў далёкую дарогу?
А ты ж што не бачыш, што мы па табе плачам,
Што твае дочанькі ідуць і галосяць?
Чаго ж ты аставіў?
Чаго ж ты нас пакінуў?
Чаго ж ты з намі не захацеў жыць?
Да паследняя ў цябе дарога,
Да паследній пуць.
Закрываюцца сцежкі-дарожкі твае,
Сабраўся ты ў вялікую дарогу,
А больш мы не пабачым цябе.

*Запісала Кісун Ірына Вячаславаўна ў в. Сейлавічы Нясвіжскага раёна Мінскай вобласці ад Боўбель Аляксандры Панцялееўны, 1934 г. н.*

### Пазаабрадавая паэзія

## БЫТАВЫЯ ПЕСНІ

**КАЛІНА-МАЛІНА, КАЛІНА МАЯ…**
Каліна-маліна, каліна мая,
Да чаго, калінушка, рана расцвіла?..
Да чаго, калінушка, рана расцвіла?..
Матуля, матуля, матуля мая,
Не дадаўшы розуму, замуж аддала…
Не дадаўшы розуму, замуж аддала…
У чужую староначку, невядомую,
У нейкую чужую, невясёлую.
У нейкую чужую, невясёлую…
Покуль я ўсе звесці пераведала,
Да не раз я слёзкамі паабедала,
Да не раз я слёзкамі паабедала…
Каб я зрабілася зязюляй нагой,
Та я паляцела б да мамы радной,
Та я паляцела б да мамы радной.

*Запісала Дылейка Марыя Аляксандраўна ў г. Нясвіж ад Шыманскай Надзеі Аляксандраўны, 1944 г. н.*

### Фальклорная няказкавая проза

### Легенда пра назву вёскі Саска Ліпка

Саска Ліпка мае складаную назву. Першая частка Саска ўтварылася ад прозвішча пана Саса, які раней там жыў. Другая частка Ліпка дапаўняецца па аналогіі з іншымі назвамі вёсак раёна, напрыклад, Вялікая Ліпа, Высокая Ліпа, утвораных ад агульнага назоўніка ліпа (дрэва). Вельмі шмат ліп у той час было ў нашых мясцінах. Пан Сас атрымліваў вялікае задавальненне адпачываць пад гэтымі ліпамі. Вось адсюль і пайшла назва вёскі Саска Ліпка.

*Запісала Юрчанка Ганна Васільеўна ў в. Саска Ліпка Нясвіжскага раёна Мінскай вобласці ад Санько Веры Пятроўны, 1923 г. н.*





### Легенда пра назву вёскі Малева

Названа вёска Малева так, бо размешчана ў вельмі маляўнічым месцы: звілістая рачулка, густое кустоўе вербалозу, утульныя паплавы. А яшчэ некалі тут расло вельмі многа кветак мальвы. Надзвычай любілі гаспадыні ўпрыгожваць імі свае сядзібы. Вось і пайшла назва – Малева.

### Легенда пра назву вёскі Зязюлёўка

Зязюлёўка – невялікі лясок, што прымыкае да Карцэвіцкага лесу. У ляску гэтым больш чым дзе бяроз, асін, шмат клёнаў, рабін. Аблюбавалі яго зязюлі. Летам, калі ідзеш міма, абавязкова пачуеш шматгалосае “ку-ку”. Таму і назвалі мясціну Зязюлёўка.

### Легенда пра назву вёскі Карцэвічы

Раней на месцы, дзе размясцілася зараз вёска Карцэвічы, быў лес. Ён рос амаль каля самай ракі Уша. Сяляне лес карчавалі, апрацоўвалі пад поле, рабілі прыгодным для засеву. Але як ні стараліся, на полі было многа карчоў. З цягам часу тут пачалі будавацца людзі, узнікла вёска, якую пачалі называць Карцэвічы, ад слова корч, карчы, карчовае поле. Магчыма, першапачатковая назва гучала крыху інакш – Карчэвічы, а пасля ўжо – Карцэвічы.

*Запісала Юрчанка Ганна Васільеўна ў в. Малева Нясвіжскага раёна Мінскай вобласці ад Шах Зінаіды Антонаўны, 1928 г. н.*

### Легенда пра назву вёскі Квачы

Каля вёскі луга былі, балоты былі такія нізкія. І вось было многа забалочаных месцаў, вельмі многа было гэтых жабаў. Яны пад вечар па-ўсякаму квакалі. А па-польскаму называлі “квачэ”. І называлі дзярэўню Квачэ, Квачы. Квакалі жабы, і стала дзярэўня Квачы.

*Запісала Носава Аліна Васільеўна ў в. Квачы Нясвіжскага раёна Мінскай вобласці ад Яновіча Міхаіла Віктаравіча, 1930 г. н.*

### Легенда пра назву вёскі Ліпа

Ехаў пан на кані. Тады не было яшчэ назвы. Дык гэта ж даўным-даўно было. Бог ведае. Гэта ж не з маёй памяці. Прыпыніўся пан пад ліпамі. Адпачываць там стаў. Ці што там рабіў? Вось з-за гэтага і стала называцца вёска Ліпа, а далей гэта з Ліпы пан паехаў у Завушша, але гэта ўжо пытайцеся ў старэйшых.

Запісала Носава Аліна Васільеўна ў в. Квачы Нясвіжскага раёна Мінскай вобласці ад Санько Тэрэзы Іванаўны, 1939 г. н.



*Вольга Шынкарэнка*

# МУЗЫЧНА-ПЕСЕННЫ СКАРБ НАРОДНАЙ ДУШЫ

Наш неспакойны век, асабліва багаты на розныя палітычна-сацыяльныя, эканамічныя і экалагічныя катаклізмы, некаторыя відавочныя адмоўныя праявы глабалізацыі і ўрбанізацыі, дэмаграфічны крызіс, аксіялагічныя і іншага кшталту праблемы прымушаюць самым сур'ёзным чынам непакоіцца пра сучасны стан, захаванне і будучае нацыянальнай вусна-паэтычнай культуры. У тым ліку і яе песенных скарбаў, якія надзвычай шырока прадстаўлены ў розных рэгіёнах Беларусі. Уяўляецца цалкам апраўданым і своечасовым зварот да разгляду асаблівасцей структуры і вобразна-мастацкай сістэмы пазаабрадавай лірыкі абранага ў якасці ўлюбёнага месца самымі рознымі музамі Нясвіжскага краю. Тут літаральна ўсё дыхае вечнасцю, сівой мінуўшчынай, тут жывуць адданыя роднай зямлі, мове і наогул духоўнай спадчыне бацькоў працавітыя і выключна адораныя людзі.

Разважаючы пра выключнае багацце айчыннага народнага меласу, яго жанравую разнастайнасць і адметную жыватворную сілу, вядомы даследчык паэтыкі фальклору народны пісьменнік Беларусі Ніл Гілевіч з уласцівым яму эмацыянальным запалам адзначае: "Тысячы, тысячы песень!.. І кожная з іх пелася. І безліч разоў. Інačай – не выжыла б, не засталася б, не дайшла б да нас. Гэта ж не верш, што мог быць напісаны, і хоць яго ніхто не чытаў, але ён дзесьці захоўваўся і захаваўся да нашых дзён. У бібліятэцы, у архіве, у музеі. Фальклорная песня не так, як верш, нараджалася, не так уваходзіла ў жыццё і не так перадавалася наступным пакаленням людзей. Яна жыла, як жыве народны звычай, абрад. Як жыве мова, як жыве само жыццё, – з болем і з радасцю, з плачам і смехам, натуральна і штодзённа…" [1, с. 58].

Адразу трэба сказаць, што песенная пазаабрадавая лірыка на Нясвіжчыне і сёння актыўна функцыянуе, кожны раз натхнёна гучыць у жывым выкананні карэнных жыхароў і тых людзей, для якіх гэтая слынная зямля стала роднай не так даўно. Прычым па жанравых і ідэйна-тэматычных паказчыках сярод песеннай спадчыны рэгіёну колькасна пераважаюць творы сямейна-бытавога і любоўнага гучання.

У першай з названых груп аснову сюжэтнага дзеяння найбольш часта складае драматычная сітуацыя чалавечай і сацыяльнай неабароненасці, пакрыўджанасці жорсткім (як варыянты – гуляка, п'яніца) мужам ці ліхімі свёкрамі маладой жанчыны, якая па волі лёсу апынаецца на чужыне і вельмі сумуе па родных людзях ("Да ўжэ сонца за бор, за бор", "А ў полі бярозанька…" і інш.). Шукаючы спагады, падтрымкі і паразумення, яна звяртаецца да іх у думках ці з выражанай словамі слёзнанадрыўнай мальбой. Асабліва часта – да маці, бо менавіта яна ад прыроды, а то і на прыкладзе ўласнага лёсу ведае ўсе цяжкасці жаночай долі, адчувае цесную псіхаэмацыянальную сувязь з дачкой ("Бушавала сіня мора", "Ні высока сонца всходзя…" і інш.). Варта ўдакладніць наступнае. Прыроднымі вобразамі, якія ў песенных тэкстах для маладой жанчыны з'яўляюцца яе сімвалічнымі персаніфікаванымі адпаведнікамі або субяседнікамі, шчырымі дарадцамі, спагадлівымі маўклівымі слухачамі, сувязнымі паміж ёй і роднымі людзьмі і пры гэтым уваходзяць у склад паралелізмаў ці прадстаюць самастойнымі дзеючымі асобамі, выступаюць птушкі зязюля-кукушачка, салавей ("Зязюлечка мая, шэранькая", "Ляцела зязюля…", "Салавейка лугавы"); дрэвы бяроза, вярба, а яшчэ шырэй – каліна, вішня ("Бяроза мая каранiстая…", "Ой, вярба, вярба", "Каліна-маліна, каліна мая…", "Чырвоная вішня з-пад кораня выйшла…"), кветка ружы ("Як пайду я в сад зялёны…"). Семантычная пазначанасць чырвоным колерам апошніх з пералічаных раслін у дадзеным кантэксце звязана не столькі з традыцыйным увасабленнем імі прыгажосці і кахання, колькі "з крывавай небяспекай, парушэннем гармоніі, далучанасцю да іншасвету…" [2, с. 156]. Так, назіраючы за ружай, адпраўленай няшчаснай дзяўчынай па рацэ да родных з горкім напамінам пра сябе, яе маці з трывогай усклікае:

*"А нявже лі с ружы кветка*
*На вадзе патане,*





*А нявже лі маё дзетка*
*В чужыні прападзе!"*
*("Як пайду я в сад зялёны…" / Запісана ў г. Нясвіж ад Чарнюк Я. П., 1932 г.н.).*

Амябейная кампазіцыя працытаванай песні, афармленая праз апавядальную частку, маналогі дзеючых асоб у выглядзе некалькіх паралелізмаў, дзеяслоўных паўтораў, дазваляе яшчэ больш падкрэсліць вастрыню перажыванняў, стан адчаю лірычнай гераіні, перадаць яе непарыўную еднасць з чуйным, здольным на спагаду да жаночага гора, у адрозненне ад людзей на чужыне, прыроднараслінным светам у выглядзе зялёнага садавінаграда з салоўкамі, кветкі ружы, рачной вады.

Іншы раз, да прыкладу, у працяжнай песні "Каліна-маліна, каліна мая…", маладая жанчына дакарае маці за залішне ранняе і далёкае замужжа. Тым не менш яна гатова зрабіцца "зязюляй нагой", каб толькі дабрацца дадому.

*Каліна-маліна, каліна мая,*
*Да чаго, калінушка, рана расцвіла?..*
*Да чаго, калінушка, рана расцвіла?..*
*Матуля, матуля, матуля мая,*
*Не дадаўшы розуму, замуж аддала…*
*Не дадаўшы розуму, замуж аддала…*
*У чужую староначку, невядомую,*
*У нейкую чужую, невяселую.*
*У нейкую чужую, невяселую…*
*Покуль я ўсе звесці пераведала,*
*Да не раз я слёзкамі паабедала,*
*Да не раз я слёзкамі паабедала…*
*Каб я зрабілася зязюляй нагой,*
*Та я палящела б да мамы радной,*
*Та я палящела б да мамы радной.*
*(Запісана ў г. Нясвіж ад Шыманскай Н. А., 1944 г. н.).*

У рашучасці намеру гераіні пераконваюць такія фігуры паэтычнага сінтаксісу, як звароткі, рытарычныя пытанні, шматлікія інверсіі, двухрадковыя паўторы пачынаючы ўжо з уступнага паралелізму. Паводле меркавання С. Лазуціна, эмацыянальная карціна, народжаная з дапамогай гэтай паэтычнай фігуры, "стварае пэўны настрой і ў агульных рысах указвае на "чалавечы" змест песні" [3, с. 54]. Перадачу перажыванняў жанчыны падкрэсліваюць таксама сталыя і ў форме прыдатка эпітэты, памяншальналаскальныя формы слоў (калінушка, староначка, слёзкі). У песні "Бушавала сіня мора" (запісана ў в. Гусакі ад Еўнух М.), акрамя нагаданых сродкаў, такую функцыю выконваюць гіпербалы ("У моры дна да не відаць"), параўнанні ("Прыўзвяла, як трава")

Маці гераіні песні "Салавейка лугавы" (запісана ў г. Нясвіж ад Шыманскай Н. А., 1944 г. н.) ужо памерла, а таму не можа нічым, у тым ліку – навучыць працы, дапамагчы сваёй дачушцы, якая прыйшла на яе магілу з чужой стараны за парадай і якой нават прыгожыя спевы лугавой птушкі на золку дадаюць жалю. На слухача не меншае эмацыянальнае ўздзеянне аказвае выкарыстанне жанчынай адпаведнай зместу твора лексікі: салоўка, мамачка, даліначка, магілачка, белы ручкі, якіх ужо матулі не ўзняць. Меладычнасць тэксту ўтрымліваецца таксама за кошт анафар, аднатыпных сінтаксічных канструкцый, інверсій.

Адметна, што ў песні "Развяжыце мае крыльля…" (запісана ў г. Нясвіж ад Чарнюк Я. П., 1932 г.н.) гучыць той жа матыў вяртання на магілу маці. Але на гэты раз размова ідзе пра блуднага сына, які мае "заброшанаю долю" і да такой ступені "Нахадзіўся, набрадзіўся // Па беламу свету…", што просіць "маменьку радную" спачатку выслухаць яго, а потым назаўжды забраць да сябе.

Асэнсаваннем драматычнага лёсу старога чалавека вылучаецца сямейна-бытавая песня "Мама і дзеці". За выключэннем зачыннага паралелізму, некалькіх сталых і вобразнаэмацыянальных эпітэтаў (горкія слёзы, гарушчыя мамкі), эліпсісаў, бяззлучнікавасці, у лірычным і блізкім да балады творы вельмі эканомна выкарыстоўваюцца сродкі лексічнай, іншасказальнай і сінтаксічнай выразнасці. Такая ашчаднасць не перашкаджае разгорнутай і зменлівай падачы гісторыі пра самаахвярнае жыццё жанчыны, якая з узростам стала непатрэбная раней добраму сыну ("В зялёным гаёчку // Сухі дуб развіўся, // Быў добры сыночак, // Пакуль ажаніўся"), а яшчэ больш – яго ганарлівай жонцы. Асаблівую горыч выклікае той факт, што маці не знаходзіцца месца і ў хаце дачкі, хоць усё тут набыта за яе грошы. Эгаістычная і жорсткая, тая нават адмаўляецца памыць матулі адзенне і раіць ісці жыць у дом для састарэлых (у тэксце – "прэстарэлую хат-

ку”), папярэдне пакінуўшы усе грошы дзецям. У канцоўцы песні пасля папярэдніх апавядальных і апісальных частак, дыялогаў маці і дзяцей гучыць перасцярога для ўсіх маці, якія, безумоўна, не заслужылі таго, каб апынуцца ў такой жа горкай сітуацыі:

*Вот вам напаследак,*
*Што ночку не спалі*
*І дзяцей калыхалі,*
*Над малой калыскай*
*Песні распявалі.*
*(Запісана ў в. Новы Сноў ад Гацкевіч (Рак) Н. І., 1941 г. н.).*

Ужо па характару закранутых праблем і вобразным ладзе дадзенай песні можна меркаваць пра не зусім далёкую гісторыю яе ўзнікнення. Пэўнае пацвярджэнне таму і наступнае назіранне даследчыка пазаабрадавай паэзіі І. Гурскага, які зазначае: “Народ заўсёды з вялікай увагай і пашанай ставіўся да няпісаных правілаў-рэгламентацый унутрысямейных адносін: павагі да старэйшых, падпарадкавання галаве сям’і – гаспадару, клопатаў пра слабейшых і недарослых у сям’і, умеласці працаваць дружна гуртам і жыць у згодзе, але галоўнае – здольнасці шанаваць і любіць адзін аднаго” [4, с. 157].

Сюжэт некаторых песень Нясвіжчыны пабудаваны на размове сына і маці (“Усе лугі пакошаны” / Запісана ў в. Гусакі ад Хоміч Н. М., 1929 г. н.), сына і бацькі (“Нінакога мне не жаль” / Запісана ў в. Гусакі ад ад Гапановіч П. В., 1915 г. н.). У першай з іх маці мудра раіць сыну жаніцца па выбары сэрца, нават калі гэта бедная сірата, адзінай прывілеяй якой з’яўляецца харawство. У лірычным тэксце яго заўсёдная моц перадаецца праз антытэзу кароткаму веку багацця, што ў жыцці цалкам магчыма, а таксама сцісла пададзеныя мастацкія прыёмы сінекдахі і сталага эпітэта ў форме кароткага прыметніка – “чорны бровы”. У другім творы, дзе ўжываюцца паўторы двух і трох песенных радкоў, спалучаюцца ў адно пытанне-адказ, няўласна-простая і прамая мова герояў, сын выканаў волю бацькі, узяў багатую Мар’яну. Але яна не толькі не любіць Івана, але і гатовая здрадзіць яму з мельнікам.

Цікавымі падаюцца запісы песень, у якіх, нібы насуперак традыцыйнаму панаванню ў беларускай сям’і мужчынскага аўтарытэту, верхавенства атрымліваюць жанчыны, самі часта далёкія ад маральнай дасканаласці. Так, у творы “Прала б я кудзелечку” жонка прадстае гультайкай і п’яніцай, што асабліва асуджалася ў народзе. Ды, як гэта ні падаецца дзіўным, муж так моцна любіць жонку, што просіць дзяцей не перашкаджаць маці спаць пасля чарговага гуляння, гатовы аплочваць яе пазыкі карчмарам. Абурэнне гаспадара, праўда, задужа вытрыманае для такога напружанага моманту, праявіцца хіба толькі тады, калі ён даведаецца пра прапітага нядбайнай гаспадыняй рабочага пярэстага вала. Фармальна ж змену ў настроі героя перадае адсутнасць у лексіцы заключнай частцы тэксту раней частых памяншальных суфіксаў. Адметнай адзнакай структуры дадзенага твора з’яўляецца і чаргаванне ў кожнай страфе першых даўжэйшых і другіх карацейшых радкоў, заснаваных на супрацьпастаўленні. Пасля ўступнай часткі песні (“Прала б я кудзелечку, // Галава баліць, // Пайшла б да карчмачкі, // Мілы не вяліць”) ва ўсіх наступных катрэнах строга вытрымліваецца паўтор двух поўных апошніх радкоў, што значна павялічвае аб’ём твора і яго працяжнае гучанне:

*І як паехаў мой міленькі*
*У поле араць,*
*То я сваю кудзеліцу,*
*Палажыла спаць,*
*То я сваю кудзеліцу,*
*Палажыла спаць.*
*Ляжыць мая кудзеліца,*
*ды й надулася,*
*А я пайшла да карчомкі,*
*Ды й напілася.*
*А я пайшла да карчомкі,*
*Ды й напілася.*
*(Запісана ў в. Гусакі ад Бобік Г. У., 1927 г. н.).*

Блізкая па паводзінах да гераіні разгледжанага твора і дзеючая асоба песні “Абяшчаў мяшчанчук мяшчаначку ўзяці” (запісана ў в. Гусакі ад Бобік Г. У., 1927 г. н.), дзе дзеянне разгортваецца па прынцыпу ампліфікацыі згодна з паслядоўным ходам дзён тыдня і падкрэсліваецца анафарамі, эліпсісамі, паўторамі дзеясловаў, асобных радкоў. Жанчына не толькі безадказная ва ўчынках, а яшчэ і лупцуе гаспадара, здаецца, не збіраючыся





спыняцца ў гэтай справе і надалей. Той жа, у сваю чаргу, спяшаецца падзякаваць жонку за тое, што яна яго “памалу й біла”, і гатовы ў адказ паднесці ёй “шклянку рому і чарку піва”.

На камізме падманных узаемаадносін, што вынікаюць з-за неадпаведнасці інтарэсаў гуллівай маладой жонкі і старога мужа, які любіць спаць, заснаваны сюжэт жартоўнай песні “Усе людзі вячэраюць” (запісана ў в. Гусакі ад Бобік Г. У., 1927 г. н.). Пасля двухрадковага зачыну кожны наступны радок тэксту далей рэгулярна паўтараецца двойчы, а ў адным выпадку і тройчы. Твор гэткага ж гумарыстычнага гучання “Ажаніўся, ажаніўся стары дзед…”, запісаны ў в. Лань ад Булыгі (Есіс) Ніны Міхайлаўны, 1958 г. н., што раней пражывала ў в. Панач Клецкага раёна, змяшчае ў канцы пажаданне павучальнага зместу для старых жаніхоў: “Кабы не была бяды, не жаніцеся, дзяды”. Пры гэтым, магчыма, з мэтай свядомай актуалізацыі ўвагі на змесце выказвання праз змяншэнне яго аб’ёму, назіраецца выпадзенне аднаго з радкоў. І замест катрэна са строга вытрыманай рыфмоўкай ААбб, як гэта было ў папярэдніх пяці строфах, перад намі прадстае тэрцэт. У архітэктоніцы дадзенай частай песні асобна пададзеныя чатырохрадкоўі, у пачатку кожнага з якіх паўтараецца частка першага радка, што далей пашыраецца, звязваюцца ў адзінае цэлае дзякуючы энергічнаму і традыцыйна ўласціваму народнай лірыцы рэфрэнуприпеву ў форме выгукаў, паўтораў слоў і паўрадкоўяў з мужчынскімі клаўзуламі: “Ой, бяда, ой, бяда, бяда, бяда, бяда // А я дзеўка, а я дзеўка малада”.

Як вынікае з папярэдняга разгляду паэтычных тэкстаў, пазаабрадавая лірыка Нясвіжчыны мае досыць прадстаўнічы жанрава-відавы, тэматычны і сюжэтнакампазіцыйны характар. Пры тым, што нельга гаварыць пра выключную метафарычнасць прыведзеных твораў, а мы спыняліся толькі на разглядзе сямейна-бытавых песень, у іх паэтычнай сістэме ў дастатковай ступені прысутнічаюць сімвалы, непасрэдна звязаныя з вобразамі прыроднага свету, розныя формы пераносаў, эпітэтаў, гіпербал і літот, параўнанняў. Асабліва часта сустракаюцца ў творах паралелізмы. Тое можна сказаць і пра слоўныя, радковыя і шматрадковыя паўторы, падхопы, інверсіі, градацыю і ампліфікацыю, прыёмы бяззлучнікавасці і шматзлучнікавасці.

### Спіс выкарыстанай літаратуры:


1 Гілевіч, Ніл. Дык павіншуймася!.. / Ніл Гілевіч / Збор твораў: У 23-х тамах. – Т. 15. Проза. – Мінск: ТДА “Пантограф”, 2010. – 608 с. – С. 57 – 59.

2 Швед, І. А. Міфалогія колеру ў беларускай традыцыйнай духоўнай культуры: манаграфія / І. А. Швед; Брэсц. Дзярж. ун-т імя А. С. Пушкіна; навуковы рэд. А. С. Ліс. – Брэст: БрДУ, 2011. – 211 с. – С. 125 – 156.

3 Лазутин, С. Г. Поэтика русского фольклора: Учеб. пособ. для филол. фак.ун-тов и пед. ин-тов по спец. «Рус. яз. и лит-ра. – 2-е изд., испр. и доп. / С. Г. Лазутин. – М.: Высш. шк., 1980. – 208 с.

4 Гурскі, А. І. Семантыка і паэтыка сямейнай лірыкі / А. І. Гурскі / Пазаабрадавая паэзія / А. І. Гурскі, Г. А. Пятроўская, Л. М. Салавей; Навук. рэд. А. С. Фядосік. – Мінск: Бел. навука, 2002. – 564 с. – (Беларускі фальклор: Жанры, віды, паэтыка; Кн.3). – С. 157 – 242.




*Л.І. МАТУСЕВІЧ,*
*дырэктар Нясвіжскага*
*раённага цэнтра народнай творчасці*

# ПРОМЫСЛЫ І РАМЁСТВЫ НЯСВІЖСКАГА КРАЮ

У XVIII стагоддзі Нясвіж стаў цэнтрам мастацкіх промыслаў і прыкладнога мастацтва. Вырабы мясцовых майстроў і мануфактур былі вядомы за межамі княства. Іх набывалі нават каралеўскія двары Еўропы. Майстры і ўмельцы Нясвіжчыны стварылі свае традыцыі, адбіраючы і адшліфоўваючы лепшае, з пакалення ў пакаленне перадаючы яго ў спадчыну нашчадкам.

Людзі вераць легендам, бо легенды заўсёды прыгожыя. І чым больш у іх дабрыні, чым больш яны звязаны з любоўю да Радзімы, тым даўжэй яны жывуць. І ўсё ж самая першая легенда на зямлі з’явілася пра майстроўтворцаў.

Амаль у кожнай вёсцы ёсць людзі, якія ў сваіх работах увасобілі паэтычную прыгажосць і духоўнае багацце Нясвіжскага раёна. Сёння тут жывуць і працуюць звыш 400 майстроў – сапраўдных прадаўжальнікаў справы сваіх продкаў, дзейнічаюць 35 гурткоў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і 5 клубаў майстроў, адзін з якіх мае званне “народны”. Вырабы, створаныя рукамі ўмельцаў, з’яўляюцца ўпрыгожаннем шматлікіх выстаў, традыцыйных свят і абрадаў.

Здабыткі нашага краю – ткацтва, ручная вышыўка, саломапляценне, лозапляценне, выраб кашоў, ганчарства, роспіс і разьба па дрэве, выраб беларускай лялькі.

Майстры Нясвіжчыны – актыўныя ўдзельнікі раённых, абласных, рэспубліканскіх конкурсаў і фестываляў: “Саламяныя дзівосы”, “Сонечная цеплыня дрэва”, “Млечны шлях ад рук бабулі”, “Гліняны звон”, “Умельцы”, “Фальклорная талака”, “Велікодная пісанка”.

Напрыканцы 2011 года гасцінна расчыніў дзверы Нясвіжскі раённы Цэнтр народнай творчасці, які аб’яднаў людзей, што адраджаюць, развіваюць розныя народныя промыслы і рамёствы, захоўваюць унікальныя рэгіянальныя традыцыі, арганізоўваюць іх пераемнасць. Тут займаюцца салома- і бісерапляценнем, роспісам па дрэве, дэкупажам, даюць другое жыццё рэчам, танцуюць, спяваюць, ладзяць выставы, а таксама вядуць экспедыцыйна-даследчую дзейнасць. А праект па адраджэнні мясцовага танца “Ланскаякадрыля”, можа папоўніць спіс header матэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі.

З задавальненнем наведваюць жыхары горада і раёна персанальныя выставы народных умельцаў Нясвіжчыны ў салоне-галерэі “Скарбніца”, якая пачала сваё існаванне ў 2001 годзе. Штогод у ёй разгортваюцца дзясяткі экспазіцый розных майстроў, таксама ладзяцца выставы работ навучэнцаў школ і студый раёна. Тут вядзецца іх фотаархіў, у якім побач са здымкамі захоўваюцца газетныя артыкулы, біяграфіі ўдзельнікаў.

Работа загадчыка салона Віхровай А.К. і майстра-метадыста Емяльянавай С.Г. не абмяжоўваецца толькі выставачнай дзейнасцю: ліцэнзія дазваляе гандляваць прадметамі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Дзякуючы гэтаму, ажыццяўляецца падтрымка народных умельцаў, зацікаўленасць іх у новых творчых знаходках, а таксама далучаецца моладзь да традыцыйных рамёстваў.

“Дзякуй за таленты”, – такі запіс не адзіны ў кнізе водгукаў Цэнтра, і гэта сведчыць пра тое, што “Скарбніца” карыстаецца павагай у несвіжан і гасцей горада.

Сярод разнастайных промыслаў асаблівае месца адводзіцца таксама ганчарнай справе. Гэты від народнага мастацтва не набыў масавасці. Магчыма таму, што нясвіжская зямля не адметная запасамі добрай гліны. Тым не менш ганчарства тут жыве і сёння. Доказ гэтаму – існаванне ганчарнай майстэрні (згодна з мэтавай праграмай па адраджэнні і развіцці народнай творчасці на базе гісторыкакраязнаўчага музея Нясвіжа ў 2001 годзе адкрыта **ганчарная майстэрня).** У ёй працуюць 3 майстры ганчарнай справы – Мяленька І.А., Мяленька К.А., Несцяркова Т.А. і мастак-метадыст Галдзецкая І.Г. Усе яны неаднаразовыя ўдзельнікі “Глінянага звону”.

У чэрвені 2006 года на базе гісторыкакраязнаўчага музея ў Нясвіжы адкрыўся новы музейны аб’ект – “Кузня”. Тут можна ўбачыць драўляны будынак самой кузні, станок для падкоўвання коней, вазы і павець. За аснову ўзялі сапраўдную кузню, што знаходзілася на хутары, недалёка ад в. Лань. Яе адрэстаўравалі, і зараз яна працуе.

У зберажэнні і развіцці традыцыйных промыслаў і рамёстваў значную ролю адыгрываюць установы культуры, якія маюць куткі сялянскага побыту “Беларуская хатка”. Яны ёсць у Цэнтры народнай творчасці, Міцькавіцкім сельскім доме рамёстваў, Высокаліпскім СДК, Юшавіцкім СДК, Андрушоўскім СК, Вайнілавіцкім СК, Вялікаліпскім СК, Смаліцкім КБ, Качановіцкім КБ. Іх фонды працягваюць папаўняцца новымі прадметамі побыту нашых продкаў. Тут таксама праводзяцца адкрытыя пасяджэнні народных майстроў з удзелам моладзі.

У в. Міцькавічы ў 2000 годзе пачаў сваю дзейнасць **сельскі Дом рамёстваў,** дзе адраджаецца нацыянальна-культурная спадчына, захоўваюцца традыцыі і звычаі, народныя рамёствы беларусаў, адкрываюцца новыя магчымасці для дзяцей.

Зараз ім кіруе улюбёны ў сваю працу таленавіты і творчы чалавек – Леўшына Наталія Мікалаеўна. У Доме рамёстваў працуюць гурткі розных накірункаў: бісер, вышыўка, ткацтва, мяккая цацка, цестапластыка і іншыя Дзверы Дома рамёстваў заўжды адчынены для наведвальнікаў.

Нясвіжчына спрадвеку славіцца таленавітымі людзьмі. У кожным яе куточку ёсць свае ўмельцы, захавальнікі самабытнай культуры і мастацкіх каштоўнасцей. Майстры стварылі ў кожным з відаў сваю традыцыю, адбіраюць і адшліфоўваюць лепшае, каб перадаць яго ў спадчыну нашчадкам. Аб’ядноўвае таленавітых людзей, дае магчымасць раскрыць ім свае таленты, створаны ў 2000 годзе на базе Цэнтра культуры створаны клуб майстроў “Дыяменты Нясвіжскага краю”. У 2007 годзе гэтаму клубу прысвоена званне “народны” (кіруе ім майстар-інкрустатар Алена Мар’янаўна Івахніна, а метадыст клуба – Вікторыя Аляксандраўна Лукашэвіч – займаецца вышыўкай).

У складзе клуба “Дыяменты Нясвіжскага краю” больш за 40 майстроў розных узростаў і прафесій. Удзельнікі валодаюць рознымі відамі рамёстваў: роспісам па дрэве, керамікай, разьбярствам, макрамэ, вышыўкай, ручным вязаннем, аплікацыяй саломкай і саломапляценнем, лозапляценнем, фларыстыкай, бісерапляценнем, лепкай з цеста, энкаўстыкай, дэкупажам.

Найбольш актыўныя народныя майстры адзначаюцца кіраўніцтвам, а тым, хто толькі пачынае займацца ў клубе, аказваецца кваліфікаваная дапамога. Ва ўстановах культуры раёна і горада пастаянна ладзяццаяцца выставы работ умельцаў, якія актыўна ўдзельнічаюць у шматлікіх раённых, абласных і рэспубліканскіх мерапрыемствах.

2011 год быў аб’яўлены Годам традыцыйнага касцюма Міншчыны. На працягу ўсяго года вялася работа па даследаванні рэгіянальнага касцюма, вывучаліся характэрныя для рэгёна асаблівасці крою, тэхнікі ткацтва, вышыўкі і прыёмы аздаблення. Вынікам працы стаў удзел у абласным конкурсе “Традыцыйны касцюм Міншчыны”, на якім аўтарскі калектыў народнага клуба майстроў “Дыяменты Нясвіжскага краю” атрымаў дыплом 1-ай ступені ў намінацыі “Высокі ўзровень майстэрства ў засваенні народнага касцюма”.

Да нядаўняй пары саломапляценне ў Нясвіжскім раёне не было шырокараспаўсюджанай з’явай. Магчыма, гэты промысел так бы і застаўся ва ўспамінах, калі б у Мар’іну Горку на семінар па саломапляценні не трапіла шчырая працаўніца, жанчына з залатымі рукамі Вера Іванаўна Мацнева. Яна працавала ў Нясвіжскім раённым Цэнтры культуры і адпачынку кіраўніком гуртка дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, а з 1996 года займаецца саломапляценнем. Вырабы Веры Іванаўны ўвесь час упрыгожваюць святочныя выставы і збіраюць шмат аматараў прыгажосці. Яна неаднаразова прымала ўдзел у абласных святах-конкурсах “Саламяныя дзівосы”, дзе была адзначана дыпломамі і каштоўнымі падарункамі. На абласным фестывалі сямейнай творчасці, які праходзіў у Дзяржынску, яна стала лаўрэатам. 2000 год знамянальны для Веры Іванаўны яшчэ і тым, што яе прынялі ў Беларускі саюз майстроў народнай творчасці. Вырабы В.І. Мацневай з поспехам выстаўляліся на ўсебеларускім фестывалі нацыянальных культур у Гродне. Польша, Германія, Італія, Францыя, ЗША, Куба, Турцыя, Галандыя, нават Перу – такая геаграфія месцазнаходжання яе работ.

**Алена Хоміч** – вучаніца Веры Мацневай – у 2000 годзе прыйшла працаваць кіраўніком гуртка дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Ужо ў 1999 годзе Алена Анатольеўна таксама становіцца членам Беларускага Саюза майстроў народнай творчасці.

У 2004 годзе ёй давялося пабываць “Славянскім базары ў Віцебску”. У 2001 годзе ў Валожыне праходзіў фестываль-конкурс “Саламяныя дзівосы”, дзе Алена Хоміч атрымала дыплом за лепшую калекцыю хатніх работ. Вельмі цёпла прымалі яе і ў г. Пулавы (Польшча), а таксама на фестывалі беларускай культуры ў Беластоку.

У 2005 годзе ў пасёлку Чысць Маладзечанскага раёна яна стала двойчы лаўрэатам: заняла першае месца за арыгінальны падыход

у выкарыстанні традыцый народнага саломапляцення і за лепшую калекцыю хатніх работ.

Сёння ў яе добра наладжана работа з дзецьмі. Працуючы кіраўніком гуртка дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва “Залацістая саломінка” пры раённым Цэнтры культуры і адпачынку, яна за кароткі час далучыла малодшае пакаленне з усяго горада да саломапляцення.

Алена Анатолеўна некалькі гадоў таму асвоіла старадаўні від народнай творчасці – ткацтва паясоў (на дошчачцы і бердзечках), а зараз дзеліцца майстэрствам з іншымі, праводзячы майстар-класы. Таксама авалодала гільяшыраваннем (выпальванне па тканіне). Яе рукамі пашыты навагоднія касцюмы, уборы для ўдзельнікаў танцавальных калектываў. На велікодную выставу яек яна робіць вырабы з бісера, вышывае крыжыкам. За адметны талент і творчасць Алене Хоміч прысуджана га¬наровае званне “Народны майстар Беларусі”.

Расказ пра сучасных майстроў саломапляцення быў бы няпоўным, калі не ўспомніць яшчэ аднаго майстра – **Ларысу Гетнер.**

Нарадзілася яна ў сям’і настаўнікаў. Як і астатнія дзеці ў сям’і, пайшла па шляху бацькоў і ўсё жыццё аддала гэтай нялёгкай прафесіі. І толькі пасля выхаду на пенсію ў 1997 годзе пазнаёмілася з саломапляценнем, а праз два гады ў г. Узда на свяце-конкурсе “Саламяныя дзівосы” атрымала дыплом лаўрэата.

Удзел у міжнародным маладзёжным фестывалі мастацтва і спорту “Тэмп” прынёс Ларысе Паўлаўне званне лаўрэата на трох яго этапах сярод удзельнікаў Беларусі, Расіі і Украіны. У 2006 годзе – зноў перамога: несвіжская майстрыха – лаўрэат другой нацыянальнай выставы народнага майстэрства “Жывыя крыніцы”.

Яна займалася вышыўкай, вязаннем, спрабавала сябе нават у разьбе па дрэве. Але самае сур’ёзнае і любімае – гэта тое, чым яна займаецца цяпер, - саломапляценне. Яна робіць цудоўных лебедзяў для вяселля, і з яе лёгкай рукі ўсе маладыя сем’і жывуць шчасліва.

**Ларыса Гетнер,** удзельніца Беларускага Саюза майстроў народнай творчасці і народнага клуба майстроў – часты ўдзельнік выстаў не толькі раённага, абласнога, але і рэспубліканскага маштабу, прычым вяртаецца з іх заўсёды з дыпломамі і падарункамі. Шматлікія працы майстрыхі разлятаюцца ў розныя куткі свету: Амерыку, Бельгію, Польшчу, Іспанію, Італію, Казахстан.

Яшчэ адзін таленавіты майстар – **Вольга Сцепановіч.** Яна нарадзілася ў Нясвіжскім раёне ў в. Вялікая Ліпа, была піянерважатай, завочна скончыла педагагічны інстытут, працавала ў райкаме камсамола. Вялікую ролю ў яе творчым жыцці адыграла бабуля, якая на¬вучыла вязаць, вышываць крыжыкам. Макрамэ – гэта больш позні перыяд творчасці.

Выстаўляцца Вольга Уладзіміраўна пачала каля 20 гадоў назад. Адразу ў школе, потым на гарадскіх, абласных мерапрыемствах, дзе яе ўзнагароджвалі граматамі, дыпломамі, каштоўнымі падарункамі. Запрасілі майстрыху і на міжнародны фестываль мастацтваў “Славянскі базар” у Віцебску, дзе ад яе рушнікоў з чырвона-чорным арнаментам людзі не адводзілі вачэй, жадалі набыць. Яе работы таксама пабывалі на разнастайных выставах у Мінску, Слуцку, і, безумоўна ж, родным Нясвіжы. Сярод дасягненняў Вольгі Уладзіміраўны – званне лаўрэата ІІІ рэгіянальнага свята-конкурсу майстроў пляцення паясоў і вышыўкі “Умельцы” ў намінацыі “За беражлівае стаўленне да мясцовых традыцый, адраджэнне рэгіянальных тэхнік вышыўкі”.

Сёння майстар улюбёная ў беларускі ручнік. Рыхтуе дзецям і ўнукам пасаг. З’яўляецца членам Беларускага саюза майстроў народнай творчасці, “Народны майстар Беларусі” (ад 11.12.2012 г.). Яе непаўторныя ручнікі і пейзажныя вышыўкі ёсць у Маскве, Польшчы, Германіі.

Ткацтва – адзін з самых распаўсюджаных відаў беларускага народнага мастацтва, які бытаваў яшчэ і ў першыя пасляваенныя гады, што было выклікана жыццёвай неабходнасцю. Зусім нядаўна ўменне ткаць было абавязковым для кожнай сялянкі, і недарэмна асноўную частку пасагу дзяўчыны, што выходзіла замуж, складалі тканыя вырабы: адзенне, посцілкі, абрусы, ручнікі.

Сёння, калі мы маем магчымасць купіць у крамах розную тканіну і гатовую вопратку, гэты промысел перастаў быць масавым заняткам. Але нягледзячы на гэта, ткачыхі Нясвіжчыны ўкладаюць у сваю творчасць традыцыйныя матывы і каларыстыку, вялікую любоў і павагу.

Сярод усёй разнастайнасці вырабаў хоць і шмат запазычанняў, уплыву прамысловай прадукцыі, перайманняў з розных выданняў, можна вылучыць і тыпова мясцовыя традыцыйныя адметнасці, перш за ўсё ў ручніках. Адзін з пашыраных тыпаў – чатырохнітовыя двухуточныя вырабы белага колеру з дробнаўзорыстым рэльефным малюнкам, часцей “ёлачкай”. Па канцах некалькі безузорных чырвоных (часам з дадаткам чорнага і жоўтага) палос, якія паступова звужаюцца і разрэджваюцца да сярэдзіны. Другі традыцыйны тып мясцовых ручнікоў – пераборныя вырабы з бела-шэрымі матывамі геаметрычнага ці расліннага характару (ромб, разетка, зорка), якія раўнамерна размяшчаюцца па ўсім полі.

Вялікай разнастайнасцю вылучаюцца посцілкі і дываны **Міронччык Ірыны Пятроўны,** якая ў 2012 годзе заняла першае месца на абласным свяце-конкурсе ткацтва “Млечны шлях ад рук бабулі” у намінацыі “За дасканалае валоданне рознымі тэхнікамі ткацтва” (выткала перабіраны ручнік у 16-ць нітоў). Яе творы экспануюцца як на раённых і абласных, так і пастаянна дзеючых выставах у салоне-галерэі “Скарбніца”, на кірмашах, у якасці сувеніраў разыходзяцца па ўсім свеце.

Вядомы ў горадзе і за яго межамі цудоўны мастак **Васіль Васільевіч Івашка.**

У 1981 годзе скончыў Рэспубліканскую школу па музыцы і выяўленчым мастацтве “Аверлінг”, у 1991-м – мастацка-графічны факультэт Віцебскага педагагічнага інстытута. Работы Васіля Васільевіча можна ўбачыць у Нясвіжы і Гарадзеі. Яны пастаянна экспануюцца ў галерэі Саюза мастакоў Беларусі (Беларт), галерэі “Медэя” Цэнтральнага дома афіцэраў у Мінску. Персанальная выстава адбылася ў Віцебску. Вялікая колькасць работ мастака выстаўляецца ў розных гарадах Германіі, знаходзіцца ў прыватных калекцыях Польшчы.

У в. Сноў Нясвіжскага раёна, знакамітай далёка за межамі Беларусі і гаспадаркай, і творчымі людзьмі, стаіць дом, зроблены нібыта з вялізных фігур. Драўляныя вобразы створаны моцнай і ўпэўненай мужчынскай рукой **Алега Пракарыны,** які займаецца разьбой па дрэве вельмі даўно. Нягледзячы на недахоп часу, у яго душы не згасае прыгожая мелодыя, якая перадаецца ў кожны зроблены яго ўмелымі рукамі выраб з дрэва. Так з’яўляюцца цікавыя звяркі, рыбкі, міфічныя істоты. За апошнія гады ён зрабіў шмат пано з краявідамі Нясвіжа, вобразамі Маці Божай Вострабрамскай, Еўфрасінні Полацкай, Мікалая Цудатворца, а таксама працы з каменю і дрэва, творы жывапісу і графікі.

Такое асаблівае адметнае майстэрства ёсць і ў **Андрэя Жмурко.** За гэты час склаўся асаблівы творчы почырк. Вобразы ён бярэ звычайна з казак, паўсядзённага жыцця. Асноўны матэрыял для работы – выварагні дрэў.

Разам з традыцыйнымі відамі народнага мастацтва ўзнікаюць і новыя, якія сведчаць аб нязгасным таленце беларускага народа. Як не здзіўляцца незвычайным творам з палімернай гліны **А.Ф. Багнюк, Т.М. Шараметa.** Асаблівым попытам у апошні час карыстаюцца вырабы, выкананыя ў тэхніцы “валянне” Г.А. Еўдакімавай і “анкарс” Святланы Мельнікавай.

Наогул, як бы далёка ні крочыла тэхніка, якіх бы дасягненняў не давала ва ўсіх сферах вытворчасці электроніка, механічныя рукі, - жывыя рукі чалавека не могуць заставацца без справы.

Хай жа вечна жыве на зямлі, перадаецца з вуснаў у вусны, ад продкаў нашчадкам легенда аб людзях-майстрах, ладзях-творцах. І хай далёка славіцца сваімі майстрамі Нясвіжчына.

## ПАСЛЯСЛОЎЕ

Прапанаваная чытачам кніга, у якую ўвайшлі фальклорна-этнаграфічныя матэрыялы, запісаныя падчас фальклорных экспедыцый, уяўляе сабой комплекснае даследаванне фальклорна-этнаграфічнай спадчыны Нясвіжскага раёна. Змест кнігі складаюць матэрыялы архіваў ДНУ "Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі", вучэбна-навуковай фальклорнай лабараторыі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, УА "Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка". Прадстаўленыя ў кнізе архіўныя ўзоры вуснай народнай творчасці жыхароў Нясвіжчыны ахопліваюць значны часавы перыяд – з 60-х гадоў XX стагоддзя па пач. XXI стагоддзя.

Асноўныя матэрыялы – гэта палявыя экспедыцыйныя запісы студэнтаў і выкладчыкаў УА "Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Францыска Скарыны", які́м пашанцавала наведаць унікальныя па сваёй прыгажосці і багатыя на гістарычныя падзеі мясціны Нясвіжскага краю ўлетку 2012 года пры падтрымцы Нясвіжскага раённага выканаўчага камітэта. У фальклорна-этнаграфічнай экспедыцыі прымалі ўдзел выкладчыкі кафедры беларускай культуры і фалькларыстыкі доктар філалагічных навук, прафесар, загадчык кафедры Новак Валянціна Станіславаўна, кандыдат філалагічных навук, дацэнт Кастрыца Алена Аляксандраўна, кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры Вяргеенка Святлана Анатольеўна, старшы выкладчык кафедры Лебедзева Валянціна Міхайлаўна, кандыдат філалагічных навук, старшы выкладчык кафедры тэорыі і практыкі англійскай мовы УА "Мінскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт" Ізотава Вольга Вітальеўна, а таксама студэнты філалагічнага факультэта Аршанінава Кацярына, Аўдашкова Ірына, Акуліч Алена, Аляшкевіч Крысціна, Бахараў Іван, Багдановіч Анастасія, Барысенка Кацярына, Блізнец Юлія, Боева Кацярына, Бракарэнка Наталля, Выступава Сняжана, Грамадцова Аляксандра, Грынь Наталля, Грыцкова Святлана, Дулуб Алена, Жарабцова Таццяна, Забродзіна Марыя, Загорцава Таццяна, Зайцава Яна, Захарчук Вікторыя, Казека Алена, Камінская Карына, Капельчык Сяргей, Каралькова Святлана, Караткевіч Ала, Кужэльная Вольга, Лагун Вольга, Лазарэнка Марыя, Лукашова Крысціна, Манько Крысціна, Мацынкевіч Вікторыя, Машкова Вераніка, Назаранка Вікторыя, Нікалаенка Валерыя, Пакаташкіна Ірына, Піваварава Ганна, Пінчук Юлія, Пятрова Вікторыя, Пятрэнка Наталля, Скрабцова Марыя, Сусоева Аляксандра, Халязнікава Лаліта, Цімоніна Дзіяна, Чарнянок Сафія, Шапялевіч Ірына, Шэдава Надзея. Над прадстаўленымі на старонках кнігі матэрыяламі была праведзена скрупулёзная тэксталагічная работа. Тэксты пададзены ў першародным выглядзе з захаваннем асаблівасцей мясцовай гаворкі. Традыцыйная духоўная спадчына Нясвіжчыны – гэта самыя розныя фальклорныя жанры, лірычныя і апавядальныя, запісы звестак пра якія дэманструюць арганічную повязь язычніцкіх і хрысціянскіх элементаў, адметнасці праяў розных форм веравызнання ў фрагментах традыцыйнай культуры, а таксама рэгіянальна-лакальнае багацце фальклорна-этнаграфічных традыцый аднаго з цікавейшых па захаванасці народна-паэтычных скарбаў раёнаў Мінскай вобласці.

Мясцовыя жыхары, гасцінныя, шчырыя, добразычлівыя, з вялікай асалодай прыгадвалі, як яны замаўлялі хваробы, як калядавалі, вадзілі казу і мядзведзя, хадзілі з зоркай, чаму прывязвалі абрубак палена да нагі незамужняй дзяўчыны. Са шчырай захопленасцю ўспаміналі пра кукольнікаў, якія наведвалі хаты аднавяскоўцаў і падчас калядных святкаванняў, і на Вялікдзень, з усмешкай і гарэзлівасцю распавядалі пра варожбы, якія мелі ў іх жыцці вырашальнае значэнне. Давялося пачуць з вуснаў інфармантаў шмат цікавых прыкмет і павер'яў, якія арганічнай часткай увайшлі не толькі ў народны каляндар і ў цыклы сямейна-абрадавага комплексу, але і склалі вялікі звод няпісанай народнай мудрасці непасрэдна ў самім побыце і гаспадарчай дзейнасці чалавека.

Калектыў аўтараў выказвае словы шчырай падзякі старшыні Нясвіжскага райвыканкама Івану Іванавічу Крупко, дырэктару Цэнтра народнай творчасці Людміле Іванаўне Матусевіч і супрацоўнікам гэтай установы, начальніку аддзела ідэалагічнай работы Міхаілу Міхайлавічу Мацэлю, начальніку аддзела культуры Аляксандру Віктаравічу Круглiку і супрацоўнікам аддзелаў культуры і ідэалагічнай работы Нясвіжскага райвыканкама, а таксама ўсім жыхарам, якія з вялікай цеплынёй імкнуліся перадаць нам свае веды пра абрады, звычаі і песні сваёй роднай мясцовасці.







*С. І. Заяц*



*Ю. С. Руская*



Г. М. Шуковіч



А. А. Атрошчанка







Н. М. Булыга



Я. А. Вольчык



В. А. Высоцкая



З. В. Васільева



Я. У. Гадун







Н. І. Гацкевіч




Г. М. Дзішук



З. К. Жук



В. Ф. Драчан



Л. А. Драчан







Н. С. Драчан



Т. А. Камянка



Я. І. Кмета



Г. В. Каліноўская



Г. М. Ціўля



Е. І. Халецкая








С. Г. Чычко



С. А. Болтуць



С. М. Прахода



М. Д. Кузьміч



Т. Г. Кузьмова



Нясвіжскага краю напеў векавы



Г. В. Чумакоў



Т. А. Угляніца



А. В. Гаціла



А. І. Вольчык







Т. С. Высоцкая



Я. У. Галабурда



А. І. Гудзько



С. М. Захарэц



І. М. Драчан



В. П. Казей







Т. П. Карачун



Т. А. Плотнікава



Л. К. Ярмаліцкая




А. А. Каржанеўская







Т. Е. Роўба



К. І. Лукша



М. І. Петраш



Г. А. Халецкі



Шчурская



В. М. Сандрос







Т. А. Шумейка



І. І. Салавей

# ЗМЕСТ

**Іван Крупко**……5

**Алег Дземідзенка**……6

**Валянціна Новак.** Мясцовая спецыфіка каляндарна-абрадавага фальклору Нясвіжчыны……7
Каляндарна-абрадавы фальклор……12
Зімовы цыкл……12
Веснавы цыкл……39
Летні цыкл……67
Восеньскі цыкл……81

**Валянціна Новак.** Мясцовая спецыфіка сямейнай абраднасці……84
Сямейна-абрадавая паэзія……87
Радзінна-хрэсьбінная абраднасць……87
Вяселле……96
Пахавальная абраднасць і галашэнні……125

**Вольга Ізотава.** Сімволіка традыцыйнага вясельнага абрадава-паэтычнага комплексу Нясвіжскага раёна……135
**Святлана Вяргеенка.** "Ад Госпада Бога шчаслівa дарога" (замовы Нясвіжскага раёна)……139
Замовы……143
**Алена Кастрыца.** Свет прыкмет і павер'яў Нясвіжскага краю……150
Прыкметы і павер'і……154

**Алена Алфёрава.** Спрадвечная народная мудрасць (малыя фальклорныя жанры Нясвіжчыны)……166
Пазаабрадавая творчасць……168
Малыя фальклорныя жанры……169
Няказкавая проза……169
Дзіцячы фальклор……171
Прыпеўкі……173

**Аляксей Ненадавец.** Спадчына Нясвіжскага краю……177

**Алена Боганева.** Народная проза Нясвіжскага раёна……185
Народная Біблія……187
Легенды……189
Прымхліцы……192
Вусныя народныя апавяданні……194
Вераванні, звычаі……195
Жывёлы……197
Духі прыроды і гаспадаркі……198

**Таццяна Валодзіна, Таццяна Цяпкова.** З архіўных паліц.
(Фальклорная калекцыя ДНУ "Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі")……199





Каляндарна-абрадавы фальклор……200
Радзінна-хрэсьбінная абраднасць і паэзія……208
Пахавальная абраднасць……210
Казкі, легенды і паданні……211

**Вольга Кананец.** У вёсках майго дзяцінства……220

**Рыма Кавалёва, Волька Прыемка.** Фальклорная практыка ў Нясвіжскім раёне: па старонках рэгіянальнага архіва вучэбна-навуковай лабараторыі БДУ……226

Калекцыя вучэбна-навуковай фальклорнай лабараторыі УА "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт"……228

**Вольга Шынкарэнка.** Музычна-песенны скарб народнай душы……242

**Людміла Матусевіч,** дырэктар Нясвіжскага раённага цэнтра народнай творчасці Промыслы і рамёствы Нясвіжскага краю……246

Пасляслоўе……250

# Нясвіжскага краю напеў векавы

(Народная духоўная культура Нясвіжчыны)
Фальклорна-этнаграфічны зборнік
Пад агульнай рэдакцыяй прафесара В.С. Новак

Рэдактар: В. С. Новак
Камп'ютарная вёрстка: З. М. Клішэвіч

Подписано к печати 17.12.2012. Формат 60x84 1/8.
Бумага офсетная. Печать афсетная.
Усл. печ. л.31,75. Уч.-изд. л. 25,9.
Тираж экз. Заказ.

Издатель и полиграфическое исполнение:
МОУП "Несвижская укрупненная типография им. С. Будного".
ЛИ 02330/0552681 от 04.01.2010.
ЛП 02330/0150466 от 25.02.2009.

Ул. Гейсика, 1,
222603, Минская обл., г. Несвиж.
Тел.: 8(01770) 5-48-77